# Агляд-хроніка

**парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2004 годзе**

# УСТУП: абагульненьні і высновы

У 2004 годзе палітычная сітуацыя ў Беларусі ўплывала на далейшае пагаршэньне становішча з правамі чалавека і стасункі паміж асобай і дзяржавай. Пастаянныя і сьвядомыя парушэньні правоў чалавека зьяўляліся неабходнай перадумовай дзеля ўмацаваньня неабмежаванай дыктатарскай улады – уціск на чалавечыя правы фармаваў глебу да існаваньня аўтарытарызму і зьяўляўся спрыяльным асяродзьдзем да распаўсюду таталітарнай ідэалогіі.

У 2004 годзе на грамадзка-палітычную сітуацыю ў Беларусі вызначальны ўплыў аказала кампанія па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і правядзеньне рэспубліканскага рэферэндуму аб магчымасьці падаўжэньня паўнамоцтваў прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Патрэба скасаваньня канстытуцыйнага абмежаваньня колькасьці магчымых прэзідэнцкіх кадэнцыяў вызначала дзяржаўную палітыку і ўплывала на яе ва ўсіх сферах грамадзкага жыцьця. У галіне правоў чалавека гэты фактар праявіўся праз ўзмацненьне рэпрэсіяў супраць палітычных апанентаў і прававы перасьлед носьбітаў іншадумства, прыняцьце новых дыскрымінацыйных заканадаўчых актаў, далейшае абмежаваньне свабоды слова, парушэньне свабоды мірных сходаў і асацыяцыяў, стварэньне іншых перашкодаў для рэалізацыі асабістых свабодаў грамадзянаў Беларусі.

Грамадзяне Беларусі былі пазбаўленыя права ўдзельнічаць у кіраваньні дзяржавай праз сваіх свабодна абраных прадстаўнікоў. Праведзеныя выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў былі недэмакратычнымі і несвабоднымі, яны прайшлі па падрыхтаваным уладамі сцэнары і ў поўнай адпаведнасьці з выказанымі А. Лукашэнкам “пажаданьнямі”: сьпіс будучых парламентароў быў папярэдне сфармаваны з прыхільнікаў прэзідэнта, а сама працэдура галасаваньня стала толькі фармальнасьцю. Вынікі выбараў не адлюстроўвалі волі выбаршчыкаў, паколькі сама прэцэдура выбарчай кампаніі і галасаваньня не была арыентаваная на выяўленьне сапраўднай волі беларускага народу і не адпавядала нормам беларускага заканадаўства і міжнародным стандартам.

Беларускі аўтарытарны рэжым фактычна вольны ад дэмакратычных абмежавальнікаў сваёй улады. Ён прыцiскае ня толькі палітычныя і асабістыя грамадзянскія правы: абароненасьць сацыяльных правоў працоўных у Беларусі фактычна зруйнаваная праз адзяржаўленьне прафесійных саюзаў, разбурэньне сістэмы сацыяльнага партнёрства. У краіне адсутнічаюць акадэмічныя свабоды і ўведзеная адзіная дзяржаўная ідэалогія, несумяшчальная са свабодай меркаваньня і свабодай слова.

Улады не выконваюць сваіх абавязкаў згодна з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах і не зьвяртаюць увагі на крытыку, якая гучыць на адрас беларускага ўраду з боку міжнародных праваабарончых інстытуцыяў. Крытычныя рэзалюцыі па Беларусі, прынятыя Камісіяй па правах чалавека ААН у 2003 і 2004 гадах, ня толькі ня сталі падставай дзеля выпраўленьня становішча, але былі публічна названыя праявай палітычнага ціску на Беларусь за яе самастойную палітыку на міжнароднай арэне. Нягледзячы на тое, што чарговы даклад Рэспублікі Беларусь аб выкананьні гэтага Пакту за перыяд 1997-2001 гадоў мусіў быць прадстаўлены ў офіс Вярхоўнага камісара па правах чалавека яшчэ ўвосень 2001 году, да гэтага часу такі даклад ня зроблены. Невядома ці рыхтуецца гэты даклад альбо ці будзе рыхтавацца ў персьпектыве. Фактычна, беларускі ўрад імкнецца да мінімалізацыі кантактаў з міжнародным праваабарончым асяродзьдзем.

# ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЬЛЕД І АБМЕЖАВАНЬНІ ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ

У Беларусі дзеючая ўлада шырока карыстаецца сродкамі крымінальнага і адміністратыўнага перасьледу ў барацьбе са сваімі палітычнымі апанентамі. Гэта стала магчымым з-за таго, што ў краіне адсутнічае незалежны і справядлівы суд, адсутнічаюць механізмы аднаўленьня парушаных правоў і законных інтарэсаў грамадзянаў.

Крымінальная справа Міхаіла Марыніча ў 2004 годзе была найбольш гучным фактам ціску на палітычных апанентаў рэжыму. Міхаіл Марыніч – вядомы ў Беларусі грамадзкі дзеяч, былы кіраўнік Менскага гарадзкога выканаўчага камітэту, займаў пасаду міністра зьнешнеэканамічных зносінаў, зьяўляўся амбасадарам у Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі, быў дэпутатам Вярхоўнага Савету 12-га і 13-га скліканьняў. Апошнім часам зьяўляўся кіраўніком грамадзкага аб’яднаньня “Дзелавая ініцыятыва” і адным з лідэраў грамадзкага руху “За годнае жыцьцё”. Па меркаваньнях некаторых экспертаў, перасьлед Міхаіла Марыніча зьвязаны з ягоным намерам балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах 2006 году. Яшчэ да пачатку крымінальнага перасьледу, 13 красавіка 2004 году, Міхаіла Марыніча пакаралі адміністратыўным штрафам за дзейнасьць ад імя незарэгістраванага аб’яднаньня “За годнае жыцьцё”. Крымінальны перасьлед распачаўся 24 красавіка пасьля дагляду аўтамабіля М. Марыніча, у выніку якога было канфіскавана 90 тысячаў амерыканскіх даляраў. Уначы з 24 на 25 красавіка М. Марыніч быў дапытаны па факце знаходжаньня ў яго буйной сумы ў замежнай валюце і запрошаны на допыт у КДБ. 26 красавіка М. Марыніч быў арыштаваны і зьмешчаны ў ізалятар КДБ. У хуткім часе з санкцыі пракуратуры былі праведзеныя вобыскі ў памяшканьнях, якія належалі М.Марынічу і ягонай сям’і. Грошы не былі вернутыя Марынічу, але і не фігуравалі ў дакументах абвінавачаньня.

Спачатку крымінальная справа была ўзбуджаная па артыкуле 377 Крымінальнага кодэксу “Выкраданьне альбо пашкоджаньне дакументаў, штампаў і пячатак”, паколькі падчас вобыску ў спадара Марыніча былі канфіскаваныя дакументы, датычныя ягонай ранейшай дзейнасьці на пасадзе міністра і амбасадара. Далей сьледчыя КДБ узбудзілі крымінальную справу па артыкуле 295 Крымінальнага кодэксу “Незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, баепрыпасаў і выбуховых рэчываў”. Менавіта па гэтым крымінальным артыкуле Міхаілу Марынічу было прад’яўленае першапачатковае абвінавачаньне, па якім ён

знаходзіўся ў сьледчым ізалятары КДБ з красавіка і да канчатковага рашэньня суда, якое было агучанае 30 сьнежня, аднак суд зьняў з яго абвінавачаньне па дадзеным артыкуле.

Адзіным абвінавачаньнем Міхаілу Марынічу, якое падтрымаў суд, стала незаконнае прысвойваньне кампутараў і аргтэхнікі, знойдзеных падчас аднаго з вобыскаў у гаражы сына М. Марыніча. Кампутары і іншая аргтэхніка (разам – 17 адзінак), у крадзяжы якіх прызналі вінаватым Міхаіла Марыніча, належалі амерыканскай амбасадзе ў Беларусі, якая перадала іх у бязвыплатнае карыстаньне арганізацыі “Дзелавая ініцыятыва”. Амбасада Злучаных Штатаў ня мела прэтэнзіяў да спадара Марыніча – гэта было высьветлена і падчас папярэдняга сьледзтва, і было пацьверджана на судзе ў адмысловай заяве Дзярждэпартаменту Злучаных Штатаў. “Дзелавая ініцыятыва” таксама не выстаўляла маёмасных прэтэнзіяў, аднак, нягледзячы на гэта, 30 сьнежня суд Менскага раёну і гораду Заслаўля на чале з судзьдзёй Людмілай Даўжэнка прызнаў М. Марыніча вінаватым ў зьдзяйсьненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага артыкулам 210 Крымінальнага кодэксу, ч. 4 “Крадзёж шляхам выкарыстаньня службовага становішча ў асабліва буйным памеры” і прысудзіў яму пакараньне ў выглядзе 5 гадоў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці і забаронай займаць службовыя пасады на працягу пяці гадоў. Увесь ход сьледзтва і судовага разгляду дадзенай справы сьведчыў пра тое, што крымінальны перасьлед і асуджэньне Міхаіла Марыніча выкліканыя ягонай грамадзянскай пазіцыяй і актыўнай палітычнай дзейнасьцю. Дадзеная справа відавочна зьяўляецца прыкладам расправы над палітычным апанентам рэжыму.

Справы Валерыя Леванеўскага і Аляксандра Васільева — вядомых дзеячоў беларускага прадпрымальніцкага руху — сталі папярэджаньнем тым, хто меў намер крытыкаваць Лукашэнку і ягонае атачэньне. Гэтыя гарадзенскія бізнэсоўцы былі пакараныя пазбаўленьнем волі за абразу прэзідэнта літаральна напярэдадні абвяшчэньня рэферэндуму, а суд над імі і надзвычай жорсткія прысуды відавочна выконвалі функцыю запалохваньня. В. Леванеўскі і А. Васільеў арганізоўвалі некалькі маштабных акцыяў і страйкаў беларускіх прадпрымальнікаў, у тым ліку – дэманстрацыю ў Гародні 1 траўня 2004 году. Крымінальныя справы супраць В.Леванеўскага і А. Васільева былі ўзбуджаныя па артыкуле 368 Крымінальнага кодэксу, частка 2 — за зьдзяйсьненьне публічнай зьнявагі Лукашэнкі і абвінавачаньне яго ў злоўжываньні ўладай шляхам публікацыі ў першамайскіх улётках верша “Рахунак за камунальныя паслугі або “жыроўка”, дзе ў сатырычнай форме высьмейвалася дэмагогія некаторых палітыкаў і крытыкаваліся паездкі кіраўніка Беларусі на лыжныя курорты ў Аўстрыю. А. Васільева таксама абвінавацілі

па арт. 342 Крымінальнага кодэксу ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў 1 траўня, падчас якога быццам бы адбыліся грубыя парушэньні грамадзкага парадку. Судзьдзя суда Ленінскага раёну г. Гародні Дзьмітры Дземчанка 7 верасьня прызнаў В.Леванеўскага і А.Васільева вінаватымі і вынес прысуд аб пакараньні іх на два гады пазбаўленьня волі за зьнявагу прэзідэнта, а Васільева і за арганізацыю масавых беспарадкаў. Суд таксама спагнаў у даход дзяржавы як сродак зьдзяйсьненьня злачынства кампутары і іншую аргтэхніку, якая была канфіскаваная ў асуджаных падчас папярэдняга сьледзтва.

Адсутнасьць аб’ектыўнай і незалежнай судовай сістэмы (усе судзьдзі ў краіне прызначаюцца прэзідэнтам і могуць быць звольненыя са сваіх пасадаў прэзідэнтам) робіць магчымым падобнае выкарыстаньне механізмаў крымінальнага перасьледу дзеля барацьбы з палітычнымі апанентамі дзеючага рэжыму. Таксама пагроза крымінальнага перасьледу, асабліва па артыкулах Крымінальнага кодэксу 367 “Паклёп на адрас прэзідэнта”, 368 “Зьнявага прэзідэнта” і 369 “Зьнявага прадстаўніка ўлады” выкарыстоўваецца супраць крытыкаў існуючага рэжыму – праваабаронцаў, журналістаў, апазіцыйных палітыкаў.

Так, крымінальныя справы за зьнявагу альбо за паклёп на адрас прэзідэнта ў 2004 годзе былі ўзбуджаныя ў адносінах да палітыка Андрэя Клімава, лідэра Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі, журналісткі Ірыны Халіп, праваабаронцы, намесьніка старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Гары Паганяйлы, грамадзкай актывісткі Аксаны Новікавай і г.д. Ва ўсіх гэтых справах крымінальны перасьлед выконвае функцыю запалохваньня — падчас сьледзтва падазраваныя ці абвінавачаныя вымушаныя прыходзіць у пракуратуру альбо КДБ на допыты, а таксама ім пагражаюць вобыскі альбо арышты. Асобна адзначым, што абвінавачаньні ў паклёпе на адрас прэзідэнта і дзяржаўнай улады актыўна выкастоўваліся супраць кандыдатаў на парламенцкіх выбарах як падстава дзеля зьняцьця з перадвыбарчай гонкі (кандыдаты Марына Багдановіч, Алег Волчак, Аляксандр Цынкевіч). Таксама пад перасьледам апынуліся і іншыя ўдзельнікі выбарчых кампаніяў – сябры ініцыятыўных групаў па вылучэньні апазіцыйных кандыдатаў, давераныя асобы кандыдатаў, назіральнікі і журналісты.

Асобным асьпектам перадвыбарчай барацьбы ў Беларусі стала змаганьне за зьмяненьне выбарчага заканадаўства і за вызваленьне палітычных зьняволеных, што выявілася ў галадоўцы трох дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, да якой пазьней далучыліся і іншыя грамадзкія актывісты з усёй Беларусі (агульная колькасьць галадоўшчыкаў склала каля 20 чалавек).

Палітычныя рэпрэсіі былі скіраваныя ня толькі на палітычных апанентаў існуючага палітычнага рэжыму. Моцны ціск аказваўся на праваабаронцаў і на праваабарончыя арганізацыі. У 2004 годзе былі ўзбуджаныя крымінальныя справы супраць кіраўніка Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Процькі і бухгалтаркі БХК Тацяны Радкевіч на падставе быццам бы нявыплаты падаткаў з замежнай фінансавай дапамогі з боку Еўрапейскага саюзу, якая была атрыманая ў поўнай адпаведнасьці з нормамі беларускага заканадаўства. Пазьней гэтыя крымінальныя справы пасьля працяглага расьсьледваньня былі спыненыя. Асабліва часта падобны ціск альбо незаконныя арышты выкарыстоўваліся ў сувязі з распаўсюдам інфармацыі (напрыклад, праваабаронцаў Тацяну Рэвяку і Гары Паганяйлу затрымалі за распаўсюд афіцыйнай рэзалюцыі Савету Еўропы пра зьніклых асобаў у Беларусі).

Працягвае адбываць пакараньне ў турме гомельскі навуковец Юры Бандажэўскі, прызнаны вязьнем сумленьня.

У Беларусі па-ранейшаму актыўна выкарыстоўваюцца арышты, фізічная сіла і сьпецыяльныя сродкі супраць удзельнікаў мірных дэманстрацыяў. Найбольшая колькасьць мірных дэманстрантаў была затрыманая падчас акцыяў 1 траўня ў Гародні і ў Менску, 25 сакавіка ў Менску, 21 ліпеня ў Менску. Былі пакараныя арганізатары Чарнобыльскага шляху 26 красавіка. Напярэдадні выбараў масава і па ўсёй краіне міліцыянты затрымлівалі ўдзельнікаў перадвыбарчых кампаніяў апазіцыйных кандыдатаў у дэпутаты, саміх кандыдатаў, дасьледчыкаў, якія праводзілі экзіт-пул. Падчас мірных акцыяў пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму напрыканцы кастрычніка ў Менску праваахоўныя органы адзначыліся надзвычай жорсткімі дзеяньнямі ў дачыненьні да дэманстрантаў і затрыманых. Катаваньні былі ўжытыя асабіста кіраўніком Менскага АМАПу Юрыем Падабедам і ягонымі падначаленымі ў дачыненьні да Анатоля Лябедзькі, якому былі нанесеныя цялесныя пашкоджаньні. Асобы, якія зьбівалі апазіцыйнага палітыка, усім вядомыя, аднак ніякага пакараньня за свае дзеяньні яны не панесьлі. Наадварот, беларускія суды рэгулярна караюць адміністратыўнымі арыштамі і штрафамі ўдзельнікаў мітынгаў і дэманстрацыяў – суды па гэтай катэгорыі справаў часта зьяўляюцца ўсяго толькі фармальнасьцю. Праведзены Праваабарончым цэнтрам “Вясна” ў сакавіку і красавіку 2004 году маніторынг выкананьня права на справядлівы суд падчас разгляду справаў аб адміністратыўных правапарушэньнях выявіў, што судзьдзі па гэтай катэгорыі справаў не выконваюць нават базавых патрабаваньняў працэсуальнага заканадаўства.

Напярэдадні перагаласаваньня другога туру выбараў прэзідэнта Украіны ў Менску беспадстаўна былі затрыманыя некалькі дзесяткаў беларускіх грамадзянаў,

што накіроўваліся на Украіну ў якасьці міжнародных назіральнікаў. У складзе гэтай групы былі затрыманыя і некалькі дзесяткаў сяброў Праваабарончага цэнтру “Вясна”.

Адначасова ў Беларусі прымаюцца антыправавыя законы, якія ў далейшым дазваляюць сьпецслужбам і міліцыі парушаць правы чалавека, недатыкальнасьць прыватнага жытла і таямніцу прыватнага жыцьця ўжо "ў адпаведнасьці з законам". Прынятыя ў першым чытаньні зьмены ў Закон пра органы дзяржаўнай бясьпекі, якія значна пашыраюць паўнамоцтвы сьпецслужбаў у галіне парушэньня таямніцы прыватнага жыцьця, дазваляюць праслухоўваць прыватныя тэлефонныя размовы і пранікаць у прыватныя памяшканьні нават бяз санкцыі пракурора, а таксама ўводзяць адказнасьць за разгалошваньне асобаў даносчыкаў і негалосных асьведамляльнікаў, накіраваных сьпецслужбамі ў грамадзкія арганізацыі, палітычныя партыі, дзяржаўныя ўстановы і іншыя арганізацыі. Па асабістым загадзе А.Лукашэнкі Служба бясьпекі прэзідэнта далучылася да барацьбы супраць палітычных апанентаў, пры гэтым паўнамоцтвы яе ў гэтай сферы не зафіксаваныя заканадаўча.

Такім чынам, 2004 год быў адзначаны ўзмацненьнем ціску на асобаў, што адкрыта выказваюць нязгоду з афіцыйнай ідэалагічнай дактрынай, а таксама крытыкуюць палітыку Аляксандра Лукашэнкі. Відавочна, што асаблівы ціск аказваецца на тых асобаў, якія заявілі пра свой намер скласьці канкурэнцыю А. Лукашэнку на выбарах прэзідэнта ў 2006 годзе. Пры гэтым небясьпека пагражае ня толькі вядомым асобам і лідэрам грамадзкіх рухаў – усё часьцей улады пагражаюць шараговым носьбітам альтэрнатыўных ідэяў. Пашырэньне ў Беларусі таталітарнай ідэалогіі можа пакласьці канец існаваньню легальнай апазіцыі А. Лукашэнку, паколькі па сваім зьмесьце дадзеная ідэалогія цалкам грунтуецца на безальтэрнатыўным кульце асобы дзеючага прэзідэнта.

# АБМЕЖАВАНЬНЕ СВАБОДЫ СЛОВА

Барацьба са свабодай слова і вынішчэньне альтэрнатыўных крыніцаў інфармацыі заўжды была прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай палітыкі дзеючага рэжыму. Ужо з самага пачатку свайго знаходжаньня пры ўладзе Лукашэнка распачаў вайну з незалежнай прэсай, якую ён працягвае весьці і зараз. Наступствам гэтай дзесяцігадовай вайны стала фармаваньне ў Беларусі закрытага грамадзтва, арыентаванага на дзяржаўны кантроль за інфармацыяй і манаполіяй дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды.

Заканадаўчы клімат для медыяў у Беларусі зьяўляецца вельмі неспрыяльным. Працэдура рэгістрацыі медыяў дазваляе ўладам прадухіліць стварэньне непажаданых крыніцаў альтэрнатыўнай інфармацыі. Узгадненьне разьмяшчэньня газеты ў мясцовых выканаўчых органах дае магчымасьць для беспадстаўнай і нематываванай адмовы любому новастворанаму выданьню. Мясцовыя ўлады ў 2004 годзе адмовілі ў атрыманьні юрыдычнага адрасу рэдакцыям недзяржаўных газетаў "Афиша" са Смаргоні, "Новой газеты Сморгони", "Собственный комментарий", “Вольны горад” з Крычава. Нягледзячы на наяўнасьць у заканадаўстве гарантыяў журналісцкай дзейнасьці, рэальна журналісты робяцца безабароннымі перад адміністратыўным ціскам і перасьледам з боку ўладаў.

Фактар неспрыяльнага і двухсэнсоўнага заканадаўства ўзмацняецца яшчэ і тым, што гэтае заканадаўства трактуецца адвольна і часта выкарыстоўваецца дзеля ажыцьцяўленьня цэнзуры, а таксама зьнішчэньня непажаданых сродкаў масавай інфармацыі. У 2004 годзе з “белымі плямамі” выходзілі газеты “Вольнае Глыбокае” і “Витебский курьер”. З цэнзурай у друкарні сутыкнуліся выдаўцы ваўкавыскай "Местной газеты" – друкаваць гэтае выданьне адмовіліся друкарні ў Менску, Баранавічах і Слоніме. Зафіксаваныя неаднаразовыя выпадкі цэнзураваньня перадачаў расійскіх тэлевізійных каналаў, што трансьлююцца ў Беларусі. Усталяваны парадак распаўсюджваньня ў Беларусі выданьняў з замежных краінаў дазваляе цалкам кантраляваць гэты сегмент рынку: цяпер усе юрыдычныя асобы і прыватныя прадпрымальнікі, якія займаюцца распаўсюдам замежных СМІ, павінны ўзгадняць з Міністэрствам інфармацыі каталогі ці сьпісы гэтых выданьняў і прадстаўляць абавязковыя асобнікі – гэткі механізм фактычна зьяўляецца папярэдняй цэнзурай на распаўсюд замежных выданьняў.

Пастаянна цэнзураваліся выступы апазіцыйных кандыдатаў у дэпутаты на дзяржаўным радыё і тэлебачаньні, а таксама тэксты іх передвыбарчых улётак.

Дзяржаўныя друкарні падчас выбараў сьвядома выконвалі функцыю цэнзараў для матэрыялаў, якія замаўляліся апазіцыйнымі кандыдатамі.

У 2004 годзе на колькасьць зачыненых і прыпыненых газетаў у Беларусі наклаў свой адбітак фактар правядзеньня выбараў і рэферэндуму. Норма аб часовым прыпыненьні дзейнасьці СМІ выкарыстоўвалася ў дачыненьні да газетаў “Время”, “Навінкі”, “Предпринимательская газета”, "Згода", “Рабочая салідарнасьць”, "Вечерний Столин", "Мотор-Старз Ревю", "Криминальное обозрение", "Любой каприз", "Алло! Куплю, продам, меняю", "Версия", "Детективная газета". Часта прыпыненьне выданьня адбывалася з грубымі парушэньнямі закону (выпадкі з газетамі “Время” і “Новая газета Сморгони”). Літаральна за тыдзень да выбараў было прыпынена 12 выданьняў, што значна паўплывала на інфармацыйную прастору падчас выбараў, асабліва ў рэгіёнах Беларусі – былі зачыненыя “Молодёжный проспект”, “Неделя”, "Рэгіянальная газета", “Региональные ведомости”, “Народный предприниматель” і інш.

Чыняцца перашкоды ў распаўсюдзе незалежнай прэсы. Падчас выбарчай кампаніі былі зафіксаваныя сотні выпадкаў затрыманьня распаўсюднікаў незалежнай прэсы. У 2004 годзе ў Беларусі было ўведзенае ліцэнзаваньне распаўсюджаньня друкаваных выданьняў праз падпіску – гэткая дзейнасьць апынулася пад поўным кантролем дзяржаўнага манапаліста “Белпошты”. Увядзеньне ліцэнзаваньня на падпіску стала сур’ёзнай перашкодай для стварэньня паўнавартаснай сеткі распаўсюду недзяржанай прэсы. Зараз нават рэдакцыя газеты ня можа распаўсюджваць уласнае выданьне праз падпіску. Гэта стала балючым ударам па незалежнай прэсе, паколькі дзяржаўная служба дастаўкі вельмі часта ім нематывавана адмаўляе – у выніку падобнай адмовы незалежная “Белорусская деловая газета” страціла свае лідзіруючыя пазіцыі на газетным рынку. Дзяржаўныя прадпрыемствы адмаўляюцца прымаць у раздробны продаж папулярныя незалежныя газеты ("БДГ", "Белорусский рынок", "Белорусская газета" і інш.). Участак розьніцы "Белсаюздруку" ў Менску выдаў для кіяскёраў адмысловую "Памятку по выкладке дотируемых изданий на витрину". Паводле інструкцыі, кіяскёры павінныя "выкладывать газеты в первом ряду у торгового окна в следующем порядке: "Звязда", "Рэспубліка", "Советская Белоруссия", "Народная газета", "Культура", "ЛіМ", "Белорусская нива", "Голас Радзімы", "The Minsk Times", "Знамя юности", "Зорька", "Переходный возраст", "Раніца", "Сям’я", "Спортивная панорама". Акрамя таго, датаваныя газеты павінны вывешвацца на вітрыну сьпераду, а датаваныя "тоўстыя" часопісы – сьпераду выстаўляцца на паліцу. Такім

чынам, нават тыя выданьні, якія маюць магчымасьць прадавацца праз дзяржаўныя сеткі распаўсюду, не трапляюць на вітрыны кіёскаў альбо крамаў.

Адначасова супрацоўнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў прымусова абавязваюць выпісваць дзяржаўныя выданьні: прэзідэнт Лукашэнка паставіў за мэту давесьці наклад галоўнага прапагандысцкага выданьня "Советская Белоруссия" да 500 тысячаў, і гэтая мэта вымагае прымусовага распаўсюду дадзенага выданьня. Падобным чынам таксама распаўсюджваюцца і іншыя прапагандысцкія дзяржаўныя газеты, у тым ліку і выданьні абласных і раённых выканаўчых камітэтаў. Напрыклад, 15 сакавіка Глыбоцкі райвыканкам распаўсюдзіў ліст, якім да 19 сакавіка загадаў кіраўнікам мясцовых прадпрыемстваў аформіць ведамасную і індывідуальную падпіску на дзяржаўныя выданьні з вызначэньнем, якія і ў якой колькасьці газеты трэба выпісваць. Гэткая практыка распаўсюджаная па ўсёй Беларусі.

Папярэджаньні газетам за публікацыю крытычных матэрыялаў зьяўляюцца сродкам шантажу выданьняў, якія пад пагрозай магчымага закрыцьця вымушаныя зьмяняць рэдакцыйную палітыку. Пасьля выхаду нумару часопісу ARCHE, што быў прысьвечаны абмеркаваньню дзесяцігодзьдзя кіраваньня ў Беларусі А. Лукашэнкі, і шэрагу крытычных публікацыяў часопіса адносна распаўсюджаньня ў краіне ідэалогіі лукашызму, часопіс адмовіліся прадаваць дзяржаўныя крамы (гэта пераважная большасьць рынку) і газетныя кіёскі, заснавальнікам былі вынесеныя два папярэджаньні, з-за якіх часопіс можа спыніць сваё існаваньне. У студзені 2004 году па загадзе рэспубліканскай пракуратуры на менскай пошце быў затрыманы наклад часопіса "Асамблея", які рассылаўся ў запячатаных канвертах ад імя выдаўцоў — фізічных асобаў. Зафіксаваныя выпадкі канфіскацыі накладаў газетаў "День", "Время", "Неделя" і іншых выданьняў, асабліва падчас перадвыбарчай кампаніі.

Усе тэлеканалы знаходзяцца пад кантролем дзяржаўнай улады, а нешматлікія прыватныя і грамадзкія радыёстанцыі падлягаюць пастаяннай цэнзуры: цэнзуруюцца навіны і плэй-лісты. Некаторыя музычныя выканаўцы, у прыватнасьці, тыя, што прымалі ўдзел у канцэртах у падрымку апазіцыі, не трапляюць у эфір.

Маніторынг парушэньняў правоў СМІ сьведчыць аб паўсюдным парушэньні ў Рэспубліцы Беларусь права на доступ да інфармацыі. Артыкул 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам краіны права на атрыманьне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасьці дзяржаўных органаў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцьці. Тым ня менш, правы

журналістаў на атрыманьне інфармацыі пастаянна парушаюцца. У Смаргоні (Гарадзенская вобл.) 15 верасьня карэспандэнту “Новой газеты Сморгони” Ірыне Лугіной адмовілі ў інфармацыі пра дату адкрыцьця новага будынку ЗАГС і не дазволілі зрабіць фотаздымак яго інтэр’еру. Аднак найбольш часта права на атрыманьне журналістам інфармацыі парушаецца пры асьвятленьні падзеяў грамадзка-палітычнага жыцьця, судовых працэсаў гучнага ці палітычнага характару. 22 чэрвеня служба бясьпекі не прапусьціла ў будынак Дома ўраду акрэдытаванага пры Палаце прадстаўнікоў карэспандэнта “Радыё Свабода” Юрыя Сьвірко. Журналістцы Ірыне Макавецкай неаднаразова стваралі перашкоды ў асьвятленьні судовых працэсаў адкрытага характару і нават прыцягвалі да адказнасьці за спробу патрапіць на адкрыты судовы працэс. 28 чэрвеня супрацоўнік службы аховы суда Ленінскага раёна г. Гародні не дазволіў прайсьці ў будынак суда журналісту “Радыё Свабода” Сяргею Астраўцову і эксьперту ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Юрыю Тапарашаву.

Адным з эфектыўных сродкаў абмежаваньня доступу да інфармацыі зьяўляецца адмова ў акрэдытацыі ці пазбаўленьне акрэдытацыі. Такая практыка ўжываецца ў дачыненьні ня толькі да айчынных, але і да замежных СМІ. 30 ліпеня Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь пазбавіла акрэдытацыі чатырох супрацоўнікаў беларускага карпункту расійскага тэлеканалу “Россия”. Падставай да гэтага рашэньня стаў тэлерэпартаж аб вулічнай акцыі апазіцыі, прымеркаванай да дзесяцігодзьдзя прэзідэнцтва А. Лукашэнкі. Таксама былі дэпартаваныя з Беларусі прадстаўнікі французскага тэлеканалу, што асьвятлялі дзейнасьць моладзевай арганізацыі. Дэпартаваны вядучы аналітык газеты “Время” Міхаіл Падаляк.

У 2004 годзе неаднаразова фіксаваліся факты зьбіцьця журналістаў: былі зьбітыя супрацоўнікі расійскіх тэлекампаніяў Ren-TV і НТВ, журналіст Павел Шарамет. Падчас масавых акцыяў апазіцыі журналістаў зьбівалі і затрымлівалі як і ўдзельнікаў падзеяў – у Наваполацку падчас вулічнай акцыі ў гадавіну зьнікненьня экс-міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі быў затрыманы карэспандэнт “Радыё Свабода” Вінцэсь Мудроў. Журналістцы “Белорусской деловой газеты” Ірыне Макавецкай з Гомелю па тэлефоне пагражалі забойствам у сувязі з яе публікацыямі.

Журналістаў часта запрашаюць на “размовы” у КДБ і ў пракуратуру. Пасьля выкрыцьця ў прэсе фактаў фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму ўлады рэагавалі на такія публікацыі не праверкамі выкладзеных фактаў, а пагрозамі крымінальнага перасьледу за паклёп.

Акрамя таго, грамадзянскае заканадаўства дае шырокія магчымасьці для падачы неабрунтаваных і беспадстаўных зыскаў аб дыфамацыі, што разам з залежнасьцю суда і неаб’ектыўным разглядам судовых справаў гэтага тыпу дае дзяржаўным чыноўнікам моцную зброю ў барацьбе з крытычнымі выступамі ў прэсе. Летась судовыя справы з удзелам ці супраць сродкаў масавай інфармацыі былі рэгулярныя. Адным з яскравых прыкладаў таго, як зыск аб абароне гонару і годнасьці відавочна выкарыстоўваўся для зьнішчэньня непадкантрольнай уладам газеты, зьяўляўся выпадак з “Народнай воляй” па зыску былога кіраўніка дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Ягора Рыбакова. Падставай да канфлікту стаў надрукаваны ў 2001 г. артыкул "Элеонора Езерская: пять пудов любви я гарантирую". Я. Рыбакоў палічыў, што апублікаваныя ў ім зьвесткі не адпавядаюць рэчаіснасьці, а таксама зьневажаюць ягоныя гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю. Суд першай інстанцыі прызнаў патрабаваньні Рыбакова абгрунтаванымі. Калегія Менскага гарадзкога суда ня толькі адхіліла скаргі адказьнікаў, але і павялічыла суму кампенсацыі на карысьць Рыбакова. Пікантнасьць сітуацыі ў тым, што на момант вынясеньня судовага рашэньня Я.Рыбакоў знаходзіўся за кратамі па абвінавачаньні, зьвязаным з карупцыйнай дзейнасьцю падчас працы на пасадзе кіраўніка дзяржаўнага тэлебачаньня. З гэтай жа газеты спагнана 15 мільёнаў рублёў на карысьць бізнэсоўца Сяргея Атрошчанкі. “Белорусской деловой газете” прысуджана выплаціць 3 мільёны рублёў артысту Яўгену Крыжаноўскаму. Штотыднёвік “Свободные новости” абавязаны выплаціць былому супрацоўніку міліцыі больш за тры мільёны рублёў.

У той жа час дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі беспакарана распаўсюджваюць паклёпніцкую інфармацыю. На дзяржаўным тэлебачаньні быў прадэманстраваны цэлы серыял ананімнага аўтарства “Дарога ў нікуды”. Спробы праз суд дамагчыся высьвятленьня сапраўдных аўтараў серыялу не далі посьпеху. Намаганьні старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Процькі дамагчыся абвяржэньня хлусьлівых выказваньняў журналістаў дзяржаўнага тэлебачаньня і прыцягненьня да адказнасьці за парушэньне таямніцы прыватнага жыцьця з боку журналіста Юрыя Пракопава не прынесьлі плёну. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ў дзень выбараў і рэферэндуму сьвядома незаконна распаўсюджвалі агітацыйныя матэрыялы, у тым ліку – сумнеўныя дадзеныя праўрадавага экзіт-пула. Дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БелТА, газета “Советская Белоруссия” і іншыя дзяржаўныя выданьні таксама беспакарана парушалі Выбарчы кодэкс РБ праз публікацыю агітацыйных матэрыялаў замежных грамадзянаў.

Беларускі рэжым неаднаразова дэманстраваў намер узяць пад кантроль распаўсюджаньне інфармацыі праз Інтэрнэт, імкнецца абмежаваць доступ да непажаданых Інтэрнэт-рэсурсаў з беларускай тэрыторыі, аказвае ціск на журналістаў, што разьмяшчаюць інфармацыю на замежных Інтэрнэт-старонках. Публікацыі на Інтэрнэт-сайтах сталі падставамі да папярэджаньня шэрагу прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партыяў.

Зафіксаваныя выпадкі прыпыненьня дзейнасьці незалежных інфармацыйных Інтэрнэт-сайтаў у дзень выбараў, у тым ліку сайту Праваабарончага цэнтру “Вясна”. Тэхнічна гэткія перашкоды можа ствараць толькі нацыянальны аператар электрасувязі, дзяржаўнае прадпрыемства "Белтэлеком" — манапаліст на доступ да Інтэрнэту ў Беларусі. Некалькі разоў фіксаваліся хакерскія атакі на сайт Хартыі-97.

Новы закон аб СМІ, які ўтрымлівае значныя дадатковыя абмежаваньні свабоды слова, пакуль не прыняты. Але ягонае абмеркаваньне ў парламенце адбываецца без уліку меркаваньня прадстаўнікоў журналісцкай супольнасьці і грамадзкасьці. Існуючы праект закону прадугледжвае абавязковую рэгістрацыю сайтаў у Інтэрнэце – норма, якая дасьць уладам магчымасьць на законных падставах перасьледаваць стваральнікаў непажаданых сайтаў.

Такім чынам, можна прагназаваць, што ў бліжэйшы час адбудзецца дадатковая падрыхтоўка інфармацыйнага поля для правядзеньня агітацыйнай кампаніі прэзідэнта Лукашэнкі на выбарах 2006 году.

## АБМЕЖАВАНЬНЕ СВАБОДЫ АСАЦЫЯЦЫЯЎ

У 2004 годзе сітуацыя са свабодай асацыяцыяў у Беларусі не палепшылася. Прававы клімат дзеля стварэньня і дзейнасьці незалежных аб’яднаньняў грамадзянаў заставаўся неспрыяльным, а па некаторых пытаньнях заканадаўства і практыка дэманстравалі тэндэнцыю да яшчэ большага абмежаваньня свабоды асацыяцыяў.

Беларускае заканадаўства адносна няўрадавых асацыяцыяў зьяўляецца адным з самых жорскіх у параўнаньні з краінамі Еўропы і СНД. Грамадзянскі кодэкс прадугледжвае магчымасьць існаваньня некалькіх формаў некамерцыйных арганізацыяў – грамадзкія аб’яднаньні, рэлігійныя аб’яднаньні, фонды, установы, асацыяцыі і саюзы. З іх асноўнай формай няўрадавых арганізацыяў, заснаванай на сяброўскім удзеле, зьяўляецца грамадзкае аб’яднаньне, якое рэгулюецца сьпецыяльным законам "Аб грамадзкіх аб’яднаньнях" ад 1994 году са шматлікімі пазьнейшымі зьменамі і дапаўненьнямі. Аднак у пытаньнях стварэньня грамадзкіх аб’яднаньняў вызначальнымі прававымі актамі зьяўляюцца дэкрэты Прэзідэнта і Правілы рэгістрацыі, прынятыя Міністэрствам юстыцыі, якія значна зьмяняюць нормы, усталяваныя ў законе.

Сярод асноўных абмежаваньняў пры стварэньні няўрадавых арганізацыяў патрэбна адзначыць вялікую грашовую пошліну (звыш $220 для грамадзкіх аб’яднаньняў нацыянальнага ўзроўню і каля $100 для мясцовых грамадзкіх аб’яднаньняў), а таксама патрабаваньні аб наяўнасьці юрыдычнага адрасу ў адміністрацыйным памяшканьні – гэтае патрабаваньне цяжка выканальнае ва ўмовах татальнага кантролю дзяржавы за выкарыстаньнем нерухомасьці. Прадстаўленьне юрыдычнага адрасу (а гэта значыць – стварэньне альбо легальнае існаваньне няўрадавай арганізацыі) вельмі часта залежыць ад жаданьня дзяржаўных чыноўнікаў – у рэгіёнах гэта азначае неабходнасьць атрымаць папярэднюю згоду з боку дзяржаўнай улады для стварэньня грамадзкага аб’яднаньня альбо іншай няўрадавай арганізацыі. Неабходнасьць наяўнасьці юрыдычнага адрасу таксама выкарыстоўваецца дзеля барацьбы са структурамі апазіцыйных палітычных партыяў: фактычна, дзяржава ў любы момант можа адмяніць згоду на разьмяшчэньне арганізацыі па дадзеным юрыдычным адрасе і тым самым скасаваць партыйную структуру ў рэгіёне (у 2004 годзе было скасавана звыш 30 рэгіянальных аддзяленьняў палітычных партыяў). Партыя, якая ня мае зарэгістраванай арганізацыйнай структуры ў дадзеным горадзе альбо раёне, ня мае права ўдзельнічаць у выбарах, вылучаць кандыдатаў на выбарныя пасады, а пры

адсутнасьці партыйных структураў у большасьці абласьцей Беларусі можа паўстаць пытаньне пра ліквідацыю партыі. У кастрычніку і лістападзе 2004 году ўладамі была распачатая шырокамаштабная перарэгістрацыя юрыдычных адрасоў (завершыцца 1 лютага 2005 году), якая можа пацягнуць за сабой зьнікненьне шэрагу грамадзкіх аб’яднаньняў, а таксама большасьці мясцовых аддзяленьняў (гарадзкіх і раённых структураў) палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў.

У цяперашні час у Беларусі ўсталяваны дзяржавай ільготны тарыф для арэнды памяшканьняў для грамадзкіх аб’яднаньняў, аднак актыўна абмяркоўваецца адмена гэтай ільготы. Вынікам такой адмены можа стаць рэзкі рост кошту арэнды памяшканьняў і фактычная немагчымасьць аплаты памяшканьняў для няўрадавых арганізацыяў.

На практыцы пададзеныя для рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў дакументы праходзяць двайную эксьпертызу: юрыдычную ў рэгіструючым органе (Міністэрства юстыцыі для нацыянальных і абласныя ўпраўленьні юстыцыі для мясцовых грамадзкіх аб’яднаньняў) і палітычную ў не прадугледжанай законам і дэкрэтам Прэзідэнта Камісіі па рэгістрацыі і перарэгістрацыі. Гэты орган у складзе кіраўнікоў асноўных сілавых міністэрстваў і ведамстваў (КДБ, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства ўнутраных справаў і інш.) працуе пад шчыльным кантролем Адміністрацыі прэзідэнта, дае эксьпертнае заключэньне, якое не заснаванае на праве, зьяўляецца тайным і нематываваным і часта служыць падставай да адмовы ў рэгістрацыі грамадзкага аб’яднаньня. Такая сістэма рэгістрацыі вядзе да таго, што дзяржаўная рэгістрацыя грамадзкага аб’яднаньня робіцца магчымай толькі пры дэманстрацыі лаяльнасьці да існуючай улады і зацікаўленасьці дзяржаўных органаў у стварэньні такой арганізацыі. У сярэднім толькі 6% заявак аб стварэньні грамадзкіх аб’яднаньняў задавальняюцца ўладамі. Так, па афіцыйных дадзеных, у 2003 годзе з 1464 заявак на стварэньне грамадзкіх аб’яднаньняў было задаволена толькі 10 на стварэньне нацыянальных грамадзкіх аб’яднаньняў, 23 – міжнародных, 12 – абласных, 49 – раённых, гарадзкіх і іншых. У 2004 годзе гэткія прапорцыі захаваліся, а сістэма рэгістрацыі не зьмянілася: за перыяд са студзеня па верасень 2004 году было зарэгістравана толькі 60 новых грамадзкіх аб’яднаньняў. Усталяваны законам тэрмін разгляду пытаньня пра рэгістрацыю НДА на працягу 1 месяца рэальна ніколі не выконваецца, а вельмі часта гэты працэс зацягваецца на гады.

Судовае абскарджаньне незаконнай ці беспадстаўнай адмовы ў рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў у апошнія гады стала неэфектыўным – суды ніколі не становяцца на бок грамадзкіх аб’яднаньняў. Пры разглядзе спрэчак пра рэгістрацыю грамадзкіх аб’яднаньняў суды не кіруюцца патрабаваньнямі закону, якія

вызначаюць дастатковыя падставы для адмовы ў рэгістрацыі арганізацыі, а ўлічваюць нормы падзаконных актаў і неправавыя эксьпертныя заключэньні ўказанай Камісіі. Ні разу суды не выклікалі для дачы тлумачэньняў сяброў Камісіі. Напрыклад, у 2004 годзе суд без законных падставаў адмовіў у рэгістрацыі грамадзкага аб'яднаньня "Грамадзянская альтэрнатыва": арганізацыі адмовілі з-за таго, што ў яе Статуце былі палажэньні, якія "парушаюць закон" – у той час такія ж нормы былі ў статутах і іншых дзеючых арганізацыяў, што карыстаюцца падтрымкай уладаў.

У сферы міжсектаральнага ўзаемадзеяньня грамадзкія аб'яднаньні амаль пазбаўленыя магчымасьці рэальнага супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі: беларуская дзяржава арыентуецца на карпаратыўную мадэль супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасьцю, калі ў якасьці суб'ектаў для ўзаемадзеяньня выбіраюцца толькі асобныя (часьцей за ўсё кантралюемыя ці інсьпірумыя дзяржавай) грамадзкія аб'яднаньні. На ўзроўні мясцовых уладаў сітуацыя аналагічная.

У сферы законатворчай дзейнасьці грамадзкія аб'яднаньні не іграюць значнай ролі: іх ініцыятывы не прыводзяць да зьмены законаў у адпаведнасьці з іх інтарэсамі. Нават абмеркаваньне законапраекту пра новую рэдакцыю Закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях адбывалася ў 2004 годзе без уліку меркаваньняў грамадзкіх аб'яднаньняў. Любая нарматворчая актыўнасьць няўрадавых арганізацыяў успрымаецца як накіраваная на падрыў існуючага палітычнага рэжыму, калі не даказана адваротнае.

У сваёй дзейнасьці беларускія грамадзкія аб'яднаньні таксама сутыкаюцца са значнымі цяжкасьцямі, выкліканымі несприяльным заканадаўствам. Гэта вызначаецца дыскрымінацыйнай практыкай у дачыненьні да нелаяльных грамадзкіх аб'яднаньняў у сферы падаткаабкладаньня, магчымасьці атрыманьня дзяржаўных субсідыяў, магчымасьці арэнды памяшканьняў і набыцьця ўласнасьці.

Абмежаваньне на праваабарончую дзейнасьць няўрадавых арганізацыяў заканадаўча замацаванае ў Беларусі: напрыклад, дзейнічае палажэньне пра тое, што грамадзкія аб'яднаньні могуць выступаць у судзе і абараняць інтарэсы толькі сваіх сяброў. Неабходнасьць атрыманьня ліцэнзіі для выдавецкай, паліграфічнай дзейнасьці, аказаньня іншых паслугаў таксама не спрыяе ажыцьцяўленьню аб'яднаньнямі сваёй місіі. Пры гэтым назіраецца відавочная няроўнасьць грамадзкіх аб'яднаньняў: Беларускі Рэспубліканскі Саюз Моладзі і іншыя праўрадавыя грамадзкія арганізацыі атрымліваюць значныя грашовыя субсідыі і іншую

падтрымку з боку бюджэту, у той час як іншыя няўрадавыя грамадзкія аб’яднаньні такой падтрымкі пазбаўленыя. Створаныя дзяржавай псеўда-няўрадавыя арганізацыі ня толькі атрымліваюць шырокую матэрыяльную падтрымку і фінансавыя субсідыі, але таксама карыстаюцца ўладным рэсурсам: напрыклад, вельмі распаўсюджаным зьяўляецца прымусовы запіс ў БРСМ і ў дзяржаўную грамадзкую піянерскую арганізацыю.

Важным зьяўляецца існаваньне ў Беларусі закандаўчай забароны (праз дэкрэт прэзідэнта) на дзейнасьць ад імя незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў. За такую дзейнасьць усталяваная адміністратыўная адказнасьць у выглядзе штрафу ці арышту да 15 сутак. Гэты від адказнасьці прымяняўся на практыцы ў дачыненьні да актывістаў тых НДА, якія былі ліквідаваныя (забароненыя) ці не зарэгістраваныя. У 2004 годзе да адказнасьці ў форме штрафу ці арышту за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў былі прыцягнутыя звыш 20 чалавек — прадстаўнікі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”, моладзевага руху “Зубр”, Хартыі-97, грамадзкага аб’яднаньня “За годнае жыцьцё” і некаторых сацыяльных арганізацыяў. У дачыненьні да няўрадавых арганізацыяў выкарыстоўваецца таксама пагроза прыцягненьня да адміністратыўнай адказнасьці – у 2004 годзе падобныя выпадкі зафіксаваныя з актывістамі Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, Праваабарончага цэнтру “Вясна”, “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў”. Зараз у парламенце знаходзіцца на абмеркаваньні праект закона аб ўвядзеньні крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных альбо ліквідаваных грамадзкіх аб’яднаньняў – гэта можа ў хуткім часе яшчэ больш ускладніць грамадзкую дзейнасьць у Беларусі.

Пры гэтым дзяржаўныя органы актыўна ствараюць перашкоды для распаўсюду інфармацыі пра дзейнасьць няўрадавых ініцыятываў: акрамя ўказанай забароны на асьвятленьне дзейнасьці незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў, большасьць дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі ўвогуле ўстрымліваюцца ад падачы інфармацыі пра дзейнасьць непадкантрольных дзяржаве грамадзянскіх ініцыятываў і арганізацыяў.

У сферы магчымасьці ажыцьцяўленьня прадпрымальніцкай дзейнасьці грамадзкія аб’яднаньні ня маюць ніякіх ільготаў – іх эканамічная дзейнасьць рэгулюецца агульнаграмадзянскім і падатковым заканадаўствам. Такая сітуацыя пагаршаецца адсутнасьцю заканадаўства пра сацыяльную замову – грамадзкія аб’яднаньні не выступаюць у якасьці рэальнай крыніцы аказаньня паслугаў ці канкурэнта на рынку. Падаткаабкладаньне грамадзкіх аб’яднаньняў і прыбыткаў ад іх дзейнасьці ажыцьцяўляецца нараўне з іншымі суб’ектамі гаспадараньня.

Магчымасьць атрыманьня ахвяраваньняў для грамадзкіх аб'яднаньняў прадугледжаная законам, аднак для такіх унёскаў адсутнічаюць заканадаўчыя агульныя ільготы: вызваленьне выдаткаў на ахвяраваньні ад падаткаў дзейнічае толькі ў дачыненьні да вузкага кола канкрэтных ахвяравальнікаў для спартовых арганізацыяў. Наогул, няўрадавыя арганізацыі ня плацяць падаткаў з атрыманых ахвяраваньняў, аднак для ахвяравальнікаў гэта зьвязана з неабходнасьцю выплаты падаходнага падатку. Рэальна ахвяравальнік вымушаны плаціць падатак з той сумы, якую ён выдзяляе няўрадавай арганізацыі. Праверкі грамадзкіх аб'яднаньняў з боку рэгіструючых і фінансавых органаў зьяўляюцца важным сродкам кантролю за іх дзейнасьцю: практычна любая праверка можа пацягнуць за сабой санкцыі, а любая фінансавая дзейнасьць і атрыманьне ахвяраваньняў з-за мяжы могуць быць разгледжаныя як парушэньні.

Дэкрэт прэзідэнта № 24 ад 2003 году ўзмацніў кантроль за фінансаваньнем НДА з боку замежных крыніцаў. Па-ранейшаму неабходна атрымліваць дазвол ад Упраўленьня справамі прэзідэнта для выкарыстаньня замежных грантаў з папярэднім зацьвярджэньнем праграмы выкарыстаньня гэтых сродкаў. Павялічаная адказнасьць за парушэньне парадку выкарыстаньня грантаў, у тым ліку для замежных грамадзянаў, якія прадастаўляюць фінансавую дапамогу НДА, усталяваная магчымасьць дэпартацыі: у 2003 і 2004 гадах дэпартацыя за супрацоўніцтва з НДА была прымененая ў дачыненьні да некалькіх грамадзянаў Германіі, Вялікабрытаніі. Прадстаўнікам шэрагу замежных фондаў было адмоўлена ў праве наведаць Беларусь, у тым ліку і пры наяўнасьці сапраўднай беларускай візы. За атрыманьне фінансаваньня па праграме Еўрапейскіх супольнасьцяў TACIC (гэтыя праекты былі зацьверджаныя беларускім урадам) арганізацыям "Беларускі Хельсінкскі камітэт", "Воля да разьвіцьця" (Слонім) былі прад'яўленыя фінансавыя прэтэнзіі ў памеры некалькіх тысячаў даляраў. Супраць кіраўнікоў гэтых арганізацыяў Тацяны Процькі і Міхаіла Варанца былі ўзбуджаныя крымінальныя справы. Пазьней суд прызнаў дзейнасьць гэтых няўрадавых арганізацыяў правамоцнай і адмяніў падатковыя санкцыі.

Ліквідацыя і судовы перасьлед няўрадавых арганізацыяў маюць па-запраўдвы, карны характар – любое нязначнае парушэньне можа быць разгледжанае судом як грубае і стаць падставай дзеля ліквідацыі. Няўрадавыя арганізацыі безабаронныя перад правядзеньнем праверак органамі юстыцыі і вобыскаў з боку органаў крымінальнага перасьледу. Падчас выбарчай і рэферэндумнай кампаніі ўлетку і ўвосень 2004 году ад незаконных вобыскаў,ператрусаў і дзеяньняў міліцыі альбо сьпецслужбаў пацярпелі офісы шэрагу няўрадавых арганізацыяў і штаб-кватэры

ініцыятыўных групаў па вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты. Вобыскі былі зьдзейсьненыя ў офісах Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў у Менску, у офісе арганізацыі "Грамадзянскія ініцыятывы" ў Гомелі, у офісе ГА "Дзедзіч" у Берасьці, у офісах “Таварыства беларускай мовы”, “Таварыства беларускай школы”, “Фонду імя Льва Сапегі” ў Гародні, у офісе “Маладога Фронту” ў Жодзіне, Праваабарончага цэнтру “Вясна” ў Берасьці.

Пасьля выбараў быў абрабаваны будынак у Маладэчне, дзе месьцяцца філіі “Беларускага Хельсінкскага камітэту” і Праваабарончага цэнтру “Вясна”. Зафіксаваныя спробы пранікненьня ў офіс Аб’яднанай грамадзянскай партыі. Пры гэтым выпадкі ўзломаў офісаў няўрадавых арганізацыяў не расьсьледуюцца належным чынам.

У цэлым, існуючы прававы асяродак для дзейнасьці няўрадавых арганізацыяў неспрыяльны і скіраваны на ўціск арганізацыяў, незалежных ад дзяржаўных органаў. Заканадаўства і практыка спрыяюць выключна дзяржаўным грамадзкім аб’яднаньням.

Асобным асьпектам узаемаадносінаў няўрадавых арганізацыяў і дзяржаўных органаў зьўяляецца хваля судовых рашэньняў аб ліквідацыі самых вядомых і актыўных няўрадавых арганізацыяў праваабарончага, сацыяльнага, моладзевага накірунку. Як адзначае калегія Міністэрства юстыцыі ў сваёй пастанове ад 23 кастрычніка 2003 году №31, кампанія па ліквідацыі грамадзкіх аб’яднаньняў была распачатая з вуснага даручэньня Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: усе дзеяньні па надзвычайных праверках і ліквідацыі грамадзкіх аб’яднаньняў, што ажыцьцяўляліся Міністэрствам юстыцыі і ўпраўленьнямі юстыцыі аблвыканкамаў і Менгарвыканкаму, рабіліся ў выкананьне гэтага даручэньня. Вынікам гэтай акцыі, якая атрымала ў грамадзкім асяродку назву “зачыстка”, стала ліквідацыя некалькіх дзесяткаў грамадзкіх аб’яднаньняў, а сотням арганізацыяў былі вынесеныя папярэджаньні. Адначасова з тым была замаруджаная і ўскладненая рэгістрацыя новых арганізацыяў.

Непасрэдным выканаўцам гэтых даручэньняў зьяўляліся органы юстыцыі – Міністэрства юстыцыі на чале з міністрам Віктарам Галаванавым, падначаленыя яму ўпраўленьні юстыцыі. Вялікая роля адводзілася абласным судам і Вярхоўнаму суду, ад якіх патрабавалася згода на ліквідацыю грамадзкіх аб’яднаньняў і пацьверджаньне рашэньняў пра адмову ў рэгістрацыі новых арганізацыяў. Гэты механізм патрабаваў таксама спрыяльнага стаўленьня з боку пракуратуры. Функцыі кантролю за працэсам “зачысткі” былі ўскладзеныя на Адміністрацыю прэзідэнта і

“ідэалагічную вертыкаль”. У выніку ніводная арганізацыя ня здолела ў законным парадку адстаяць сваё права на існаваньне. Прававой падставай сталі новыя тлумачэньні ўжо існуючых актаў заканадаўства. Так, новае разуменьне органамі юстыцыі артыкулу 57 Грамадзянскага кодэксу, пацьверджанае ўсімі судамі, дазволіла ліквідаваць грамадзкія аб’яднаньні за дзейнасьць з неаднаразовымі альбо грубымі парушэньнямі заканадаўства. Сьпецыяльны парадак, прадугледжаны для ліквідацыі грамадзкіх аб’яднаньняў у Законе “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, які патрабуе папярэдняга вынясеньня папярэджаньняў, стаў фактычна неактуальным.

У 2004 годзе праз суд былі ліквідаваныя моладзевыя арганізацыі "Маладая Грамада", "Беларускае аб’яднаньне маладых палітыкаў", "Новая Група", праваабарончыя арганізацыі "Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў", "Цэнтр канстытуцыяналізму і параўнальна-прававых дасьледваньняў", навукова-дасьледчыя арганізацыі "Міжнародны інстытут палітычных дасьледваньняў" і "Беларуская інжынерная тэхналагічная акадэмія", жаночая арганізацыя "Ініцыятыва" і іншыя. У 2004 годзе спынілі сваё існаваньне 38 грамадзкіх аб’яднаньняў. Пры гэтым большасьць ліквідаваных арганізацыяў працягвалі сваю дзейнасьць, нягледзячы на страту легальнага статусу, аднак не маглі карыстацца магчымасьцю накіраваньня назіральнікаў на выбары і іншымі правамі, зьвязанымі з наяўнасьцю дзяржаўнай рэгістрацыі. Замест ліквідаваных арганізацыяў уладамі ствараюцца так званыя "дзяржаўныя грамадзкія аб’яднаньні" і іншыя НДА, якія кантралююцца дзяржавай і закліканыя ствараць ілюзію існаваньня грамадзянскай супольнасьці.

У 2004 годзе схема, апрацаваная ў дачыненьні да грамадзкіх аб’яднаньняў, была выкарыстаная Міністэрствам юстыцыі ў дачыненьні да палітычных партыяў. Так, Вярхоўным судом па зыску Міністэрства юстыцыі была ліквідаваная Беларуская партыя працы за парушэньні, зьвязаныя з правядзеньнем зьезду і выкарыстаньнем юрыдычнага адрасу. Партыям, што ўваходзілі ў Народную кааліцыю “Пяцёрка-плюс”, былі вынесеныя пісьмовы папярэджаньні за ўтварэньне незарэгістраванай асацыяцыі палітычных партыяў.

Прыняцьце ў першым чытаньні новых рэдакцыяў Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” і Закону “Аб палітычных партыях” можа яшчэ больш пагоршыць умовы існаваньня арганізацыяў і партыяў. У новым праекце Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” пашыраюцца кантрольныя паўнамоцтвы рэгіструючых органаў і ўводзіцца абавязковая штогадовая справаздачнасьць грамадзкіх аб’яднаньняў адносна сваёй актыўнасьці. Праект закону “Аб палітычных партыях” павышае мінімальна неабходную колькасьць сяброў для рэгістрацыі партыяў.

Адмова ў акрэдытацыі прадстаўніцтваў міжнародных арганізацыяў была выкарыстаная ў адносінах да прадстаўніцтва амерыканскага агенцтва Counterpart Alliance for Partnership.

Рэлігійныя аб’яднаньні пакутуюць ад наступстваў недэмакратычнага і дыскрымінацыйнага заканадаўства. Нетрадыцыйныя канфесіі і рэлігійныя аб’яднаньні падвяргаюцца абразам ня толькі праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, але і на старонках падручнікаў. У выніку кампаніі перарэгістрацыі рэлігійных арганізацыяў у 2004 годзе спынілі сваё існаваньне дзесяткі рэлігійных арганізацыяў і суполак.

## АБМЕЖАВАНЬНЕ АДУКАЦЫЙНЫХ СВАБОДАЎ І ПРАЦОЎНЫХ ПРАВОЎ

Улады імкнуцца да выкараненьня крыніцаў іншадумства ў дзяржаўных і ў недзяржаўных установах адукацыі. Гэта робіцца праз пашырэньне абавязковых прадметаў ідэалагічнага навучаньня (напрыклад, курсу “Асновы дзяржаўнай ідэалогіі”) і зьнішчэньне нелаяльных навучальных установаў. У краіне ўсталяваныя вельмі абмежаваныя акадэмічныя свабоды ў вышэйшых навучальных установах.

У 2004 годзе быў зачынены Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, дзе выкарыстоўваліся сучасныя еўрапейскія стандарты ў галіне адукацыі. Пасьля таго, як увесну 2004 году гэтая навучальная ўстанова з цяжкасьцю атрымала ліцэнзію на вядзеньне адукацыйнай дзейнасьці, у яе нечакана паўсталі праблемы з памяшканьнем. Універсітэт страціў свой будынак і ня мог болей працягваць навучальны працэс, а неўзабаве ўвогуле спыніў сваё існаваньне пасьля скасаваньня ліцэнзіі на права адукацыйнай дзейнасьці.

Прэзідэнт Лукашэнка адзначыў, што сапраўднай прычынай закрыцьця ЕГУ стала тое, што там распаўсюджваліся еўрапейскія каштоўнасьці і рыхтавалася эліта, якая ў будучыні магла б замяніць правячую наменклатуру.

У 2004 годзе таксама быў зачынены недзяржаўны Міжнародны гуманітарны інстытут. Габрэйскія арганізацыі расцанілі ліквідацыю Міжнароднага гуманітарнага інстытуту, у якім на кафедры юдаікі рыхтавалі сьпецыялістаў у галіне габрэйскай культуры, дыскрымінацыяй па нацыянальнай прыкмеце.

Ліквідаваны ў 2003 годзе Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа працягваў сваю дзейнасьць ў падпольлі. Нягледзячы на перасьлед з боку ўладаў і ціск на бацькоў ліцэістаў, быў набраны новы курс навучэнцаў і працягваліся заняткі.

У 2004 годзе ў Беларусі была працягнутая практыка пагаршэньня працоўных умоваў. Найбольш істотным парушэньнем працоўных правоў грамадзянаў стаў прымусовы і масавы перавод супрацоўнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў на кантрактную форму працы. Практыка выкарыстаньня Дэкрэту № 29 “Аб дадатковых мерах па ўдасканаленьні працоўных адносінаў, узмацненьні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны” сьведчыць пра тое, што наймальнікі вельмі часта ігнаруюць патрабаваньні заканадаўства пры ажыцьцяўленьні такіх пераводаў. Але самае горшае ў гэтай сітуацыі, што чалавек пры заключэньні такога кантракту робіцца безабаронным, залежным ад адміністрацыі прадпрыемства – ён практычна ня можа звольніцца па ўласным жаданьні, у той час як па ўмовах кантракту наймальнік можа скасаваць кантракт. Праз кантракты ўлады ствараюць зручную

сістэму кантролю над грамадзтвам, працоўнае месца чалавека становіцца сродкам палітычнага кантролю (падчас выбараў і рэферэндуму вельмі часта пагроза звальненьня ўжывалася ў дачыненьні да дэмакратычных актывістаў).

Дзяржава цалкам кантралюе працоўны рынак – большасьць прадпрыемстваў альбо зьяўляюцца дзяржаўнымі, альбо дзяржава мае ў іх вялікі капітал (ці гэтак званую “залатую акцыю”) і мае магчымасьць наўпрост уплываць на рашэньні. Па сутнасьці, кантроль за працоўнымі адносінамі стаў важным сродкам уціску на грамадзянскія свабоды і сродкам кантролю за грамадзкім жыцьцём з боку дзяржавы.

Адзяржаўленьне прафесійных саюзаў (яны фактычна пераўтварыліся ў орган дзяржаўнай улады, які дзейнічае разам з адміністрацыяй прадпрыемства) і ціск на нешматлікія незалежныя прафесійныя саюзы па-ранейшаму засталіся галоўнымі накірункамі дзяржаўнай палітыкі ў працоўнай сферы. Сістэма сацыяльнага партнёрства ў Беларусі ня дзейнічае з-за працэсу таталітарызацыі краіны. Адзіным сродкам змаганьня за выкананьне працоўных правоў сталі страйкі, якія, аднак, вельмі часта жорстка караюцца.

* * *

Пастаянныя і грубыя парушэньні грамадзянскіх і палітычных, а таксама сацыяльных, эканамічных і культурных правоў грамадзянаў Беларусі зьяўляюцца важным элементам усталяванага ў Беларусі аўтарытарнага рэжыму з таталітарнай ідэалогіяй. Парушэньні правоў і адсутнасьць механізмаў іх абароны, моцны ціск на айчынныя і замежныя праваабарончыя ініцыятывы дазваляюць захоўваць і ўзмацняць у Беларусі рэжым адзінаасобнай дыктатарскай улады. Такім чынам, прычыны нездавальняючага стану правоў чалавека ў Беларусі палягаюць у палітычным вымярэньні, зьяўляюцца сьвядомым элементам дзяржаўнай палітыкі. Выпраўленьне становішча ў сферы правоў чалавека ў Беларусі непазьбежна зьвязанае з вырашэньнем пытаньня пра палітычную ўладу ў краіне. Паляпшэньне выкананьня правоў чалавека і забесьпячэньне гарантыяў іх аднаўленьня магчымае толькі пры зьнікненьні ў Беларусі аўтарытарнай дыктатуры.

## СТУДЗЕНЬ

З пачатку году вывучэньне курсу ідэалогіі ўключанае ў праграмы перападрыхтоўкі беспрацоўных, якія доўгі час ня могуць знайсьці працу па ранейшай сьпецыяльнасьці. Уключэньне гэтага “важнейшага” прадмета павялічвае праграму навучаньня мінімум на паўмесяца. Навучэнцы і выкладчыкі абураюцца гэтым, але прадмет вывучаюць.

***1 студзеня*** – Новы год дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня Валерый Шчукін сустракаў на чыгуначным вакзале ў Полацку. Гэта была ягоная 111 ноч на вакзале пасьля таго, як 1 жніўня 2003 году яго пазбавілі прапіскі і выселілі з полацкага інтэрнату, дзе ён быў прапісаны шмат гадоў. У знак пратэсту палітык пачаў начаваць на мясцовым вакзале. Спачатку адміністрацыя чыніла перашкоды Шчукіну, яго абвінавачвалі ў хуліганстве, але пазьней да начлегаў прызвычаіліся і не перашкаджалі спаць на лаўцы. Валерый Шчукін мае сямёра ўнукаў і, натуральна, мог бы сустракаць Новы год разам з сям’ёй. Але начлегі на вакзале ў Полацку для яго прынцыповая справа. Валерый Шчукін зьбіраецца тут балатавацца дэпутатам на парламенцкіх выбарах, але, ня маючы прапіскі, ён мае мізэрныя шанцы быць зарэгістраваным выбарчай камісіяй.

***5 студзеня*** ў Белаазёрску (Берасьцейская вобласьць) узбуджаная крымінальная справа па нападзе на мясцовых сяброў Народнай Грамады – Яўгена і Наталю Акаронкаў. 2 студзеня ўвечары іх моцна зьбілі невядомыя асобы. У выніку лідэр белаазёрскіх сацыял-дэмакратаў Яўген Акаронка трапіў у шпіталь: у яго зламаныя рэбры і нос. Менш пацярпела ягоная жонка Наталя – дэпутат мясцовага гарсавету, прадстаўнік дэмакратычнай групы "Ініцыятыва". Наталя Акаронка гаворыць, што дзеяньні міліцыянтаў адразу пасьля здарэньня даюць падставы лічыць, што аб’ектыўнага сьледзтва па гэтай справе можа ня быць. Па словах Н. Акаронкі, адразу пасьля здарэньня міліцыянты затрымалі аднаго з тых, хто ўчыніў напад, аднак яго хутка адпусьцілі. Тым ня менш, Н. Акаронка будзе настойваць, каб усе асобы, якія бралі ўдзел у зьбіцьці яе мужа, былі знойдзеныя і пакараныя. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, распачатае сьледзтва па гэтай справе пакуль не разглядае версіі, што напад быў учынены паводле палітычных матываў. Міліцыянты называюць гэта звычайным хуліганствам.

***5 студзеня*** ў Менску каля ўніверсаму “Цэнтральны” двума супрацоўнікамі АМАПу былі затрыманыя Раман Казакевіч і Даша Малдаванава. Яны былі затрыманыя за распаўсюд паштовак з віншаваньнямі з Калядамі і Новым годам ад Еўрапейскай кааліцыі “Свабодная Беларусь”. Затрыманыя былі дастаўленыя ў РУУС

Цэнтральнага раёну, дзе ў адносінах да іх былі складзеныя пратаколы па арт.143 КаАП (парушэньне правілаў добраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў).

***9 студзеня*** адноўлены выпуск газеты "Салідарнасьць", апошні нумар якой выйшаў 12 сьнежня 2003 году. 17 сьнежня менскае УП "Сьветач", дзе друкавалася "Салідарнасьць", паведаміла редакцыі, што ня зможа далей выконваць свае абавязкі ў сувязі з перагрузкай магутнасьцяў. Цяпер газета друкуецца на Смаленскім паліграфкамбінаце ў Расіі.

У ноч на ***11 студзеня*** карэспандэнтка “БДГ” па Гомельскай вобласьці Ірына Макавецкая атрымала ананімную тэлефонную пагрозу. На працягу гадзіны невядомы мужчына тэлефанаваў ёй дахаты некалькі разоў, патрабуючы, каб Ірына перастала займацца журналістыкай, у адваротным выпадку пагражаючы “пахаваць” яе. Журналістцы ўдалося зрабіць дыктафонны запіс аднаго з тэлефанаваньняў. 11 студзеня яна падала заяву ў міліцыю і зьбіраецца дамагацца высьвятленьня асобы ананіма.

***13 студзеня*** Грамадзкае аб’яднаньне “Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны” (ТБМ) атрымала паведамленьне ад камунальных службаў аб разрыве кантракту на арэнду памяшканьня. ЖРЭА Партызанскага раёну г.Менску патрабуе, каб ТБМ за два месяцы пакінула сядзібу. Падставай да высяленьня ў дакуменце названы недахоп плошчаў дзеля разьмяшчэньня камунальнах службаў раёну. Старшыня ТБМ Алег Трусаў зьвязвае гэтыя падзеі наўпрост з дзейнасьцю арганізацыі, а недахоп памяшканьняў, на яго думку, гэта толькі нагода дзеля ціску. “Спробы нас зачыніць былі і год назад, калі мы атрымалі два папярэджаньні ад Мінюсту. Зараз на ТБМ ціснуць па схеме ліцэю – пазбавіць памяшканьня, а потым ліквідаваць”, — кажа Алег Трусаў. Дарэчы, на адрасе ТБМ зарэгістраваныя 2 газеты і 4 арганізацыі. Высяленьне азначае таксама і ліквідацыю юрыдычных адрасоў, што створыць шэраг праблемаў у дзейнасьці ня толькі ТБМ.

***14 студзеня*** ў Менску за правядзеньне несанкцыянаванага пікету насупраць будынку Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі затрыманы Якаў Гутман – старшыня зарэгістраванай у ЗША “Сусьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў”. Якаў Гутман спрабаваў разгарнуць плакат, на якім быў напісаны заклік да А. Лукашэнкі “Спыніць разбурэньне ў Беларусі габрэйскіх сьвятыняў, могілак, а таксама помнікаў ахвяраў Халакосту”. Я. Гутман быў дастаўлены ў Гарадзкі аддзел міліцыі. У гэты ж дзень судзьдзя суда Ленінскага раёну Алена Церашкова вынесла афіцыйнае папярэджаньне Якаву Гутману.

***14 студзеня*** ў Чыгуначным райаддзеле міліцыі г. Гомелю журналістцы “Белорусской деловой газеты” Ірыне Макавецкай у нефармальнай размове паведамілі, што ўзбудзіць крымінальную справу па факце пагрозаў яе жыцьцю няма магчымасьці. Прычына – адсутнасьць адмысловага артыкулу ў Крымінальным кодэксе, паводле якога было б пакараньне за пагрозы па тэлефоне. Для ўзбуджэньня справы пагроза павінна праявіцца ў нейкіх дзеяньнях.

***14 студзеня*** на прэс-канферэнцыі па выніках працы міністэрства ў 2003 годзе міністр унутраных справаў Беларусі Уладзімір Навумаў заявіў, што ён ня ведае, чаму прадстаўнік Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Хрыстас Пургурыдэс зрабіў выснову пра датычнасьць найвышэйшых кіраўнікоў Беларусі да палітычных зьнікненьняў. У. Навумаў сказаў: “Ён задаваў мне пытаньні, а я толькі адказваў, і мне цяжка меркаваць, чаму ён гэтак вырашыў”. Уладзімір Навумаў паведаміў, што ягоная размова са спадаром Пургурыдэсам доўжылася амаль паўтары гадзіны. Ён, аднак, адмовіўся апавядаць пра зьмест гэтай гутаркі, спаслаўшыся на ягоную дамову з Хрыстасам Пургурыдэсам. “Ён сам выказаў прозьбу: нашай гутаркі да таго, як ён з усімі сустрэнецца і зробіць свае высновы, асабліва не разгалошваць”, — сказаў Уладзімір Навумаў. Х. Пургурыдэс апублікаваў свой мемарандум пра палітычныя зьнікненьні ў Беларусі і зрабіў высновы, у прыватнасьці, паведаміў, што Уладзімір Навумаў не адразу прызнаў сапраўднасьць рапарту генерала Лапаціка, у якім у якасьці падазраваемых называецца Віктар Шэйман, а толькі пасьля прапановы правесьці графалагічную эксьпертызу. Пасьля гэтага, паводле спадара Пургурыдэса, Уладзімір Навумаў таксама заявіў, што нібыта генерал Лапацік памыліўся з версіяй, якую выказаў у сваім рапарце. Другі раз Уладзімір Навумаў згадваецца ў мемарандуме Хрыстаса Пургурыдэса ў сувязі са згадкай камандзіра САХРу Паўлічэнкі, які называўся падазраваемым у арганізацыі выкраданьня і забойстве Захаранкі, Ганчара і Красоўскага. Спадара Навумава спыталі і пра Паўлічэнку, чаму міністр не паўплываў на свайго падначаленага, каб той сустрэўся з Хрыстасам Пургурыдэсам. Уладзімір Навумаў узяў адказнасьць на сябе: “Што тычыцца падпалкоўніка Паўлічэнкі, то я, як міністр унутраных справаў, лічу, што я адказаў на ўсе пытаньні, якія былі да мяне і да маіх падначаленых, бо я адказваю і за іх”.

***15 студзеня*** Якаў Гутман абвясьціў галадоўку ў знак пратэсту супраць праяваў у Беларусі дзяржаўнага антысемітызму. Якаў Гутман гаворыць, што пайшоў на гэты крок, бо лічыць неабходным пратэставаць супраць праяваў дзяржаўнага антысемітызму і такім чынам.

***15 студзеня*** споўнілася 14 гадоў з дня ўтварэньня Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Я.Коласа. Навучэнцы, якія, нягледзячы на перашкоды з боку

дзяржаўных структураў, працягваюць навучаньне ў ім, выйшлі на Кастрычніцкую плошчу Менску, каб адсьвяткаваць гадавіну і сказаць уладам: "Мы ёсьць, мы будзем!"

***15 студзеня*** ў суд Ленінскага раёну г.Менску паступілі дзьве зыскавыя заявы аб абароне гонару, годнасьці, дзелавой рэпутацыі і кампенсацыі маральных стратаў, якія падалі ТАА "Альянс-медиа" (заснавальнік газеты "Обозреватель") і прадпрымальнік Сяргей Атрошчанка (шэф-рэдактар выданьня). Зыскоўцы выстаўляюць прэтэнзіі да рэдакцыі газеты "Народная воля" і патрабуюць выплаціць ім па кожным з зыскаў 50 мільёнаў рублёў. Падставай дзеля зыскаў да "Народнай волі" сталі дзьве публікацыі, што зьявіліся на старонках газеты ў 2003 годзе. 3 верасьня 2003 году ў выданьні быў апублікаваны артыкул Антона Кузьняцова пад назвай "Как "Обозреватель" Сергея Атрощенко по-бандитски обошёлся с Леонидом Левиным". Аўтар артыкулу аналізаваў канфлікт паміж рэдакцыяй "Обозревателя" і старшынём Саюзу габрэйскіх арганізацыяў і суполак Л. Левіным, які ўзьнік на падставе публікацыі ў гэтай газеце артыкулу "Депутаты Костян, Новосяд и Фролов – личностные антисемиты?". Сп. Левін палічыў, што аўтарка артыкулу сказіла сэнс ягонага інтэрв’ю і падзяліўся сваім меркаваньнем з "Народнай воляй". Са свайго боку, заснавальнікі ТАА "Альянс-медиа" палічылі, што газета "скарыстала ўзьніклае паміж імі і сп-м Левіным непаразуменьне і выкарыстала яго як сродак несумленнай барацьбы за чытацкую аўдыторыю". "Апублікаваньнем гэтага артыкулу нам былі нанесеныя маральныя страты, адказнасьць за якія павінна была несьці рэдакцыя газеты "Народная воля", – гаворыцца ў зыскавай заяве. Зыскоўца просіць суд "прызнаць ушчамляльнымі для гонару, годнасьці, зьневажальнымі для дзелавой рэпутацыі газеты "Обозреватель" назву артыкулу і некалькі фразаў з яго, абавязаць "Народную волю" абвергнуць гэтыя выказваньні і апублікаваць свае прабачэньні, а таксама спагнаць з адказьніка грашовую кампенсацыю на карысьць рэдакцыі "Обозревателя" ў памеры 50 млн. рублёў. Другі артыкул, які стаў падставай да зыску, зьявіўся ў "Народнай волі" 26 лістапада і называўся "Какому бизнесу в Беларуси жить хорошо?". Яго аўтарка – журналістка Марына Коктыш – прасіла беларускіх эканамістаў пракаментаваць інтэрв’ю Сяргея Атрошчанкі агенцтву "Інтэрфакс", у якім ён заявіў, што "ў Беларусі выдатныя ўмовы для бізнэсу". Шэраг выказваньняў С. Атрошчанка палічыў наўпроставымі зьнявагамі ў свой адрас: да прыкладу, "Атрощенко не заинтересован, чтобы Беларусь поднялась выше шкловского уровня развития бизнеса"; "высказывание Атрощенко за пределами здравого смысла... Я не понимаю таких патриотических повизгиваний..." і г.д. У зыскавай заяве С. Атрошчанка нагадвае, што ён, як грамадзянін Рэспублікі Беларусь, "мае права свабодна выказваць сваё асабістае меркаваньне па любым пытаньні". У той жа час

ён лічыць, што, апублікаваўшы выказваньні ягоных апанентаў, "Народная воля" "ўшчаміла яго гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю і нанесла маральныя страты". Зыскоўца просіць суд абавязаць "Народную волю" апублікаваць "рэдакцыйнае прызнаньне" і спагнаць з адказьніка на яго карысьць 50 мільёнаў рублёў.

***15 студзеня*** сваю трэцюю гадавіну адзначыў рух супраціву "Зубр". Некалькі нацыянальных бел-чырвона-белых сьцягоў зьявіліся ў Баранавічах над галоўнымі вуліцамі гораду. Бел-чырвона-белыя палотнішчы былі вывешаныя на правадах паміж дзевяціпавярховымі будынкамі над вуліцамі Прытыцкага і Чарнышэўскага. Расклейка ўлётак з лагатыпам руху "Зубр" і лозунгам "Жыве Беларусь!" адбылася ў розных рэгіёнах Беларусі. 15 і 16 студзеня яны зьявіліся ў Стоўбцах (Менская вобласьць). Актывісты руху расклейвалі іх на аўтобусных прыпынках, слупах і дошках аб`яваў у цэнтры іншых населеных пунктаў. Асаблівая ўвага адводзілася чыгуначным вакзалам і рынкам.

***16 студзеня*** адміністрацыя Беларускага дзяржаўнага моладзевага тэатру (БДМТ) звольніла старшыню прафкаму Марыну Дудараву ў сувязі з заканчэньнем тэрміну кантракту. Аднак старшыня Менскай абласной арганізацыі Уладзімір Мамонька перакананы, што Дудараву звольнілі за прафсаюзную дзейнасьць.

***16 студзеня*** стала вядома, што ў бліжэйшы час тэлекампанія НТВ зможа зноў адчыніць карпункт у Менску. Перамовы аб гэтым праходзяць у Маскве. Нагадаем, што карпункт НТВ у Менску быў зачынены ў ліпені 2003 году рашэньнем Савету міністраў Беларусі, а да таго 28 чэрвеня МУС Беларусі прыняў рашэньне аб дэпартацыі з краіны ўласнага карэспандэнта НТВ Паўла Селіна.

***16 студзеня*** асуджаную ў красавіку 2003 году на ўмоўны тэрмін пакараньня па крымінальнай справе за абразу прэзідэнта А.Лукашэнкі Аксану Новікаву выклікалі ў суд Савецкага раёну г.Менску дзеля разгляду адміністратыўнай справы, датычнай затрыманьня яе 24 лістапада падчас акцыі супраць магчымага рэферэндуму аб падаўжэньні прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі. У той дзень было затрымана 17 чалавек. А.Новікаву адпусьцілі з РУУС, выпісаўшы позву ў суд на 25 лістапада. А.Новікава вырашыла не зьяўляцца ў суд. Сваю пазіцыю яна патлумачыла наступным чынам: "Я не пайду туды добраахвотна. Калі рэжым незаконны, то і патрабаваньні яго незаконныя, і выконваць іх добраахвотна няма неабходнасьці"... 16 студзеня суд вынес рашэньне – аштрафаваць А. Новікаву на 250 базавых адзінак.

***16 студзеня*** ў Менску былі затрыманыя Аляксей Контар і Павел Юхневіч — актывісты руху "Зубр", якія распаўсюджвалі газету "Супраціў" каля пераходу станцыі метро "Пушкінская". Маладых людзей даставілі ў пакой міліцыі на станцыі метро. Адзін з супрацоўнікаў міліцыі пагражаў ужыць сілу супраць затрыманых, калі яны ня скажуць, дзе друкавалася газета. Пасьля іх адвезьлі ва УУС Менскага метрапалітэну (пр. Ф. Скарыны, дом 6). Праз некаторы час затрыманых адпусьцілі, бо газета мела выходзячыя дадзеныя.

***16 студзеня*** ў Сьветлагорску выйшаў апошні нумар недзяржаўнай газеты "Регион-вести". Гэта быў чацьвёрты запар нумар выданьня, які прапаноўваў сваім чытачам толькі расклад тэлевізійных праграмаў. Але нават у такім выглядзе выданьне ня трапіла да падпісчыкаў: сьветлагорскае аддзяленьне "Гомельаблпошты" паведаміла рэдакцыі пра скасаваньне дамовы на распаўсюд газеты. З новага году адзінае ў Сьветлагорску недзяржаўнае інфармацыйнае выданьне "Регион-вести" распаўсюджвалася толькі сярод падпісчыкаў. Іх колькасьць на пачатак году скарацілася амаль утрая. У штаце газеты працуюць толькі аператар кампутарнага набору і вёрсткі. Галоўны рэдактар "Регион-вестей" Мікола Паседзька сьцьвярджае, што рэдакцыя была вымушаная друкаваць выключна тэлепраграмы, бо сьветлагорскі райвыканкам забараніў кіраўніцтву друкарні прымаць у вытворчасьць усе іншыя інфармацыйныя матэрыялы пад назвай "Регион-вести". Першы намесьнік старшыні Сьветлагорскага райвыканкаму Яўген Ждановіч катэгарычна абвергнуў гэтую інфармацыю, заявіўшы, што райвыканкам "такімі справамі не займаецца". Сьветлагорская друкарня зьяўляецца камунальнай уласнасьцю гораду і наўпрост падпарадкоўваецца раённаму выканаўчаму камітэту. У ёй друкуецца толькі адно выданьне – газета мясцовага заводу "Хімвалакно", якая выходзіць адзін раз на 2 тыдні, а прадпрыемству даводзіцца жыць з дробных разавых замоваў. "Відавочна, што самой друкарні няма сэнсу адмаўляцца ад кліентаў", — упэўненыя ў рэдакцыі "Регион-вестей". Нагадаем таксама, што ў кастрычніку 2003 г. быў спынены продаж газеты "Регион-вести" у крамах Сьветлагорскага раённага спажывецкага таварыства. Па сьведчаньнях супрацоўнікаў таварыства, загад прыбраць газету з крамаў яны атрымалі "зьверху" пасьля таго, як старшыня райвыканкаму Баляслаў Пірштук убачыў газету ў адной з вясковых крамаў. Супрацоўнікі рэдакцыі прыгадваюць, што яшчэ ўлетку 2003 г. "Регион-вести" перажывалі сапраўдны ўздым. Выданьне павялічыла аб’ём, зьмяніла дызайн, пачало выходзіць у двух колерах, пераехаўшы са Сьветлагорскай друкарні ў больш сучасную Рэчыцкую. У газеты зьявіліся пазаштатныя аўтары, больш разнастайныя матэрыялы і, у выніку, вырасла колькасьць чытачоў. Аднак у верасьні, спаслаўшыся на вялікую загружанасьць у сувязі з "сезоннай працай па выпуску календароў",

рэчыцкае паліграфічнае прадпрыемства "Тытул" скасавала дамову з выданьнем. Усе спробы дамовіцца з іншымі рэгіянальнымі друкарнямі скончыліся безвынікова. З верасьня па сьнежань "Регион-вести" друкаваліся ў Менску. Гэта, аднак, паўплывала на рэзкае павелічэньне выдаткаў на друк і перавозкі, а таксама на сам графік выхаду газеты: яна стала трапляць да чытачоў значна пазьней за іншыя мясцовыя выданьні і страціла шмат чытачоў. "Гэта прамы палітычны ўціск, – лічыць галоўны рэдактар газеты Мікола Паседзька. – Да нашай газеты даўно "прыглядаліся", але асабліва ўлады актывізаваліся пасьля таго, як мы пачалі цікавіцца дзейнасьцю мясцовага кіраўніцтва. Усе карныя загады яны аддаюць у вуснай форме, каб вонкава выглядала, што наша газета закрылася сама".

У ***сярэдзіне студзеня*** ў Смаргоні супрацоўнікі падатковай інсьпекцыі двойчы канфіскоўвалі ў грамадзкіх распаўсюднікаў недзяржаўную "Местную газету" і ўсе грошы ад яе продажу. Гаворка ідзе пра версію выданьня, у якой зьмяшчаліся матэрыялы журналістаў прыпыненай "Новой газеты Сморгони". 15 студзеня ўвечары інсьпектары затрымалі траіх распаўсюднікаў "Местной газеты", а 16 -- яшчэ аднаго. На ўсіх іх былі складзеныя пратаколы за гандаль без ліцэнзіі. Падатковыя інсьпектары спасылаюцца на рашэньне Смаргонскага райвыканкаму ад 18 сьнежня, які ўвёў новыя правілы разноснага гандлю і выключыў з пераліку дазволеных для продажу тавараў друкаваныя выданьні. Між тым, 15 студзеня рэдакцыя "Местной газеты" атрымала ад райвыканкаму асартыментны пералік тавараў для разноснага гандлю, у якім згадваліся бланкавая прадукцыя, папера, канцтавары, кнігі і газеты. Заснавальнік "Новой газеты Сморгони" Рамуальд Улан сьцьвярджае, што распаўсюднікі маюць адпаведныя ліцэнзіі. Ён мяркуе, што затрыманым гандлярам цяпер пагражаюць адміністратыўныя штрафы. "Гэткую пільную ўвагу падаткавых органаў прыцягваюць чамусьці толькі распаўсюднікі "Местной газеты", якая друкуе матэрыялы журналістаў "Новой газеты Сморгони", — заўважае Р. Улан. Недзяржаўная "Местная газета", якая дагэтуль выдавалася толькі ў Ваўкавыску, пачала штотыдзень друкаваць дадатковы нумар для Смаргоні з сярэдзіны лістапада 2003 г., пасьля таго, як на пачатку кастрычніка Міністэрства інфармацыі прыпыніла выхад "Новой газеты Сморгони" на тры месяцы.

***19 студзеня*** стала вядома, што Інсьпекцыя падаткаў і збораў Маскоўскага раёну г.Менску налічыла Беларускаму Хельсінкскаму камітэту штраф на суму 380 мільёнаў рублёў (176 тысячаў даляраў). Калі суд, куды зьбіраецца зьвярнуцца БХК са скаргаю, пакіне рашэньне падаткавікоў у сіле, праваабарончая арганізацыя можа спыніць сваё існаваньне. Кіраўніцтва Беларускага Хельсінкскага камітэту лічыць выстаўленыя падатковымі органамі санкцыі супраць арганізацыі парушэньнем

міжнародных пагадненьняў, падпісаных урадам Беларусі. Сума, якую патрабуюць выплаціць падаткавікі, перавышае ўсе фінансавыя паступленьні, атрыманыя БХК за ўвесь час існаваньня. Беларускі Хельсінкскі камітэт абскардзіў выстаўленыя санкцыі ў тых жа падатковых органах. Калі яны будуць працягваць настойваць на сваім, БХК зьвернецца ў суд.

***19 студзеня*** прайшла прэзентацыя Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Партыя БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Партыя камуністаў Беларуская і Беларуская партыя працы абвясьцілі аб супольнай стратэгіі на сёлетніх парламенцкіх выбарах. Лідэры партыяў Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Станіслаў Шушкевіч, Сяргей Калякін і Аляксандр Бухвостаў падпісалі Мемарандум, у якім абвешчаныя агульныя падыходы да выбарчай кампаніі. На прэзентацыю ў зале Міжнароднага адукацыйнага цэнтру сабраліся вядомыя і паважаныя ў краіне людзі. Вітаць кааліцыю ў Беларусь прыехалі дэпутаты польскага Парламенту, а таксама дэпутат Сейму Літвы Вацлаў Станкевіч. Пачатае фармаваньне адзінага сьпісу кандыдатаў. У аснову пакладзеная формула "110+110". Гэта значыць, што на кожнай з акругаў будзе не адзін, а два дэмакратычныя кандыдаты, і ў выпадку, калі асноўнага "здымуць", яго будзе каму замяніць. Лідэры "Пяцёркі-плюс" спадзяюцца, што да іх далучацца кааліцыя "Свабодная Беларусь", наваствораны моладзевы блок і жаночая кааліцыя.

***20 студзеня*** судзьдзя Менскага гарадзкога суда Аксана Будоўская перанесла разгляд справы аб ліквідацыі ГА "Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў" на 28 студзеня. Падставай стала скарга аб'яднаньня на ўпраўленьне юстыцыі. Працэс ліквідацыі будзе працягнуты пасьля разгляду скаргі. Супраць такога разьвіцьця працэсу пратэставаў прадстаўнік зыскоўцы, сьпецыяліст упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму сп. Шчарбовіч. На ягоную думку, "Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў" наўмысна зацягвае час. Старшыня праўленьня ГА "Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў" Алена Танкачова думае інакш: "Нягледзячы ні на што, мы будзем прымаць усе магчымыя прававыя метады, каб супрацьстаяць гэтай несур'ёзнай і непрыемнай сітуацыі. І мы зробім усё, каб паказаць абсурднасьць таго, якім чынам збудаваная ўся гэта сістэма".

***20 студзеня*** начальнік 2 аддзяленьня міліцыі Чыгуначнага раёну г.Гомелю В.Стрыгалёў паведаміў журналістцы "Белорусской деловой газеты" Ірыне Макавецкай, што міліцыянты высьветлілі, хто пагражаў ёй. Гэта 25-гадовы супрацоўнік Гомельскага тэлерадыёаб'яднаньня Вячаслаў Булкін. І ўсё ж журналістцы "БДГ" І.Макавецкай адмовілі ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па

факце тэлефонных пагрозаў. Праваахоўныя органы ня ўбачылі складу злачынства ў дзеяньнях "ананіма" В.Булкіна. У тлумачальнай запісцы, якую давялося напісаць сп-ру Булкіну ў аддзяленьні міліцыі, ён заявіў, што тэлефанаваў Ірыне "з мэтай выказаць сваё меркаваньне", без злога намеру і тым болей без намеру расправіцца з журналісткай. Матывы сваіх дзеяньняў ён патлумачыў тым, што Ірына зьяўляецца супрацоўніцай апазіцыйнай газеты і распаўсюджвае інфармацыю, якая "не адпавядае рэальнаму жыцьцю". Ён таксама прызнаўся, што асабіста з Ірынай не знаёмы, і ўзяў на сябе абавязак больш не турбаваць яе. Гэтыя тлумачэньні, відавочна, апраўдалі яго ў вачах супрацоўнікаў праваахоўных органаў, аднак журналістка абураная тым, што яны не жадаюць прыцягваць да адказнасьці пагражальніка. Акрамя таго, яна сумняваецца ў самастойнасьці яго дзеяньняў: сп. Булкін нумар тэлефону Ірыны, па ўласным прызнаньні, знайшоў у базе дадзеных на працы. Гэта, на думку журналісткі, сьведчыць пра наяўнасьць "злога намеру".

***21 студзеня*** сайт "Хартыі-97" атакаваны хакерамі. Атака абылася пасьля таго, як на Інтэрнэт-старонцы "Хартыі-97" было апублікаванае журналісцкае дасьледаваньне Антона Мельнічука "Беларускія карані гандляроў дзіцячай парнаграфіяй", што мела вялікі розгалас. Атака была ўчыненая шляхам імітацыі вялізнай колькасьці наведваньняў на сайт, які ў выніку блакуецца. У прэс-цэнтры "Хартыі-97" паведамілі, што Антон Мельнічук – гэта псеўданім журналіста, які прадставіў ім сваё расьсьледваньне, але раскрываць, хто хаваецца за гэтым псеўданімам, тут не зьбіраюцца. Гэта робіцца з мэтай бясьпекі, паколькі ў артыкуле выкрываюцца злачынныя метады беларускіх гандляроў дзіцячай парнаграфіяй, частка з якіх ужо арыштаваная сьпецслужбамі ЗША, Францыі і Іспаніі. Пра гэтыя арышты, пра менскую фірму "Рэгпэй", якая ўдзельнічала ў распаўсюджаньні платных дзіцячых парнаграфічных матэрыялаў, пра адмываньне грошай ад гэтага бізнэсу паведамлялі многія беларускія і замежныя СМІ. У артыкуле Антона Мельнічука на сайце "Хартыі-97" былі апублікаваныя новыя прозьвішчы і новыя зьвесткі пра арганізатараў гэтага злачыннага бізнэсу ў Беларусі, пра іх сувязі з супрацоўнікамі праваахоўных органаў, пра схемы адмываньня злачынна зробленых грошай у адпаведных структурах у Латвіі і Расіі ды іншыя падрабязнасьці гэтага чорнага бізнэсу.

***21 студзеня*** стала вядома, што на менскай пошце затрыманы наклад часопісу "Асамблея". Гэтае выданьне традыцыйна рассылаецца грамадзкім аб'яднаньням у запячатаных канвертах ад імя выдаўцоў – фізічных асобаў. Такім чынам, фактычна адбылася перлюстрацыя прыватнай карэспандэнцыі і яе цэнзура па палітычных матывах. Часопіс грамадзкіх актывістаў "Асамблея" выдаецца з 1997 году. Ён

прысьвечаны жыцьцю і дзейнасьці грамадзкіх аб’яднаньняў Беларусі і зьяўляецца адзіным агульнанацыянальным выданьнем падобнага накірунку. 10 студзеня выдаўцы “Асамблеі” падрыхтавалі да рассылкі чарговы тэматычны нумар свайго часопісу — “НДА і выбары”. Чытачам былі прапанаваныя аналітычныя матэрыялы, прысьвечаныя магчымаму ўдзелу грамадзкіх аб’яднаньняў у будучай выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў. Таксама быў зьмешчаны адкрыты ліст няўрадавых арганізацыяў да міністра юстыцыі Галаванава з прапановай добраахвотна сысьці ў адстаўку. “Цьвіком” нумару можна назваць гэтак званы “шэры сьпіс” — прозьвішчы судзьдзяў, пракурорскіх работнікаў і сьпецыялістаў органаў юстыцыі, якія нясуць персанальную адказнасьць за палітычныя рэпрэсіі супраць няўрадавых арганізацыяў. Сітуацыю каментуе юрыст Юры Чавусаў, які займаецца абаронай няўрадавых арганізацыяў: “На маю думку, у дадзеным выпадку мы маем справу з класічным парушэньнем таямніцы прыватнай перапіскі. На пошце былі затрыманыя і, магчыма, прагледжаныя лісты прыватных асобаў, якія былі накіраваныя ў сотні няўрадавых арганізацыяў па ўсёй краіне. Зараз супрацоўнікі пошты адмаўляюцца даваць тлумачэньні і прапануюць зьвяртацца па ўсіх пытаньнях у пракуратуру”. Гэта, напэўна, першы выпадак такога масавага затрыманьня прыватнай карэспандэнцыі ў найноўшай гісторыі Беларусі. Некалькі сотняў лістоў з “недазволенай” інфармацыяй не дайшлі да адрасатаў.

***21 студзеня*** прэзідэнт Сусьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў Якаў Гутман быў затрыманы міліцыяй непадалёку ад рэзідэнцыі Аляксандра Лукашэнкі, дзе пратэставаў супраць праяваў у Беларусі дзяржаўнага антысемітызму. Якаў Гутман апрануў куртку з надпісам “Аляксандр Рыгоравіч, на вас ляжыць асабістая адказнасьць за разбурэньне габрэйскіх сьвятыняў” і выйшаў да будынку адміністрацыі прэзідэнта. Спадар Гутман так патлумачыў мэту сваёй акцыі: “Я хачу папярэдзіць Аляксандра Рыгоравіча аб ягонай адказнасьці за разбурэньне габрэйскіх сьвятыняў. І дамагчыся нейкіх перамоваў у тых пытаньнях, якія я ўздымаю. Разбурэньне сінагогаў, могілак, помнікаў ахвярам Халакосту...”. Прэзідэнт “Сусьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў” паведаміў, што два гады таму ў Менску была зьнішчаная сінагога па вуліцы Дзімітрава, цяпер разбураецца Халодная сінагога на Нямізе. У Мазыры вядзецца будаўніцтва на двух могілках, там жа ўлады ліквідавалі памятны знак ахвярам Халакосту. Нядаўна былі часткова разбураныя габрэйскія могілкі ў Рагачове, а ў Гародні падчас рэканструкцыі стадыёну, што стаіць на былых кладах, парэшткі памерлых былі проста выкінутыя на сьметнік. Супраць усяго гэтага і пратэстуе Якаў Гутман. Ён таксама актыўна падтрымлівае зварот шасьці амерыканскіх кангрэсмэнаў да кампаніяў “Mc-Donalds” і “Coca-Cola” з заклікам не

спансараваць Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі, пакуль ня спыніцца зьнішчэньне габрэйскіх магілаў у Гародні.

***22 студзеня*** Гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства “Гароднааблсаюздрук”, нягледзячы на заключаную дамову, адмовілася ўзяць на рэалізацыю першы нумар газеты “День”. Супрацоўнікі рэдакцыі даставілі газету ў аддзел эксьпедыцыі “Гароднааблсаюздруку”, аднак кіраўнік аддзелу Яніна Дзікевіч адмовілася прыняць наклад газеты. У сваёй адмове яна спаслалася на загад намесьніцы начальніка ГРУП “Гароднааблсаюздрук” Галіны Макарэвіч. Усе спробы галоўнага рэдактара “Дня” Міколы Маркевіча знайсьці Г.Макарэвіч скончыліся безвынікова.

***22 студзеня*** сваякі зьніклых зьвярнуліся ў КДБ Беларусі з заявай аб узбуджэньні крымінальнай справы супраць шэрагу службовых асобаў. Сваякі зьніклых прасілі ўзбудзіць крымінальную справу паводле прыкметаў злачынства, у якім падазраюць Генеральнага пракурора Віктара Шэймана, былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Сівакова і дзеючага міністра Уладзіміра Навумава, былога камандзіра САХРу Дзьмітрыя Паўлічэнку ды некаторых іншых асобаў. Сваякі лічаць, што яны могуць быць вінаватыя ў зьнікненьні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага. 3 лютага тэрмін разгляду заявы скончыўся, але ў КДБ на яе не адрэагавалі. Паводле кіраўніка цэнтру сувязяў з грамадзкасьцю КДБ Аляксандра Базанава, адказ на заяву рыхтаваўся, але яму невядома, гатовы ён ці нават ужо накіраваны адрасатам. Аляксандр Базанаў запэўніў, што ў КДБ не зьбіраюцца парушаць тэрмінаў рэагаваньня на падобныя дакументы.

***22 студзеня*** кіраўнікі евангельскіх дэнамінацыяў Беларусі зьвярнуліся да міністраў адукацыі і юстыцыі краіны са скаргай на неправамоцныя дзеяньні прадстаўнікоў Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі. Прычынай звароту сталі шматлікія выпадкі, калі насуперак волі і жаданьням навучэнцаў школ і ВНУ прымушалі ўступаць у гэтую арганізацыю. Ліст падпісалі епіскап Саюзу хрысьціянаў веры Евангельскай С. Хоміч, епіскап Саюзу Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў М. Сінкавец, епіскап Канферэнцыі цэркваў Хрысьціянаў адвентыстаў Сёмага дня М. Астроўскі, ад аб’яднаньня Грамадаў хрысьціянаў Поўнага Евангельля А. Саковіч. Кіраўнікі дэнамінацыяў адзначаюць, што апошнім часам да іх пачалі прыходзіць скаргі бацькоў на дзейнасьць БРСМ. Пры агітацыі выкарыстоўваецца “добраахвотна-прымусовы” прынцып, а таксама тлумачыцца, што сябрам БРСМ лягчэй паступіць у дзяржаўныя ВНУ і атрымаць жыльлё. Веруючыя лічаць, што трывога бацькоў небеспадстаўная. "У адной са школаў Менску казалася, што прымаць будуць толькі “лепшых” вучняў. Такія матывы закладаюць аснову да падзелу вучняў на “лепшых” і “горшых” паводле сяброўства ў грамадзкай арганізацыі. Гэта зьяўляецца

дыскрымінацыяй, а значыць, парушае правы дзяцей, гарантаваныя заканадаўствам," – гаворыцца ў звароце. Таксама зазначана, што сітуацыя адмоўна ўплывае на разьвіцьцё псіхікі дзяцей і фармаваньне асобы, пазбаўляе права самастойнага выбару поглядаў, перакананьняў і жыцьцёвага шляху. "Усялякая дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў павінна грунтавацца на заканадаўстве і пры гэтым не парушаць законныя правы і інтарэсы грамадзянаў. Зьвяртаем увагу на зьмест часткі другой арт. 4 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзе запісана, што "Ідэалогія палітычных партыяў, рэлігійных або іншых грамадзкіх аб'яднаньняў, сацыяльных групаў ня можа ўсталёўвацца ў якасьці абавязковай для грамадзянаў," – пішуць кіраўнікі евангельскіх цэркваў. Веруючыя просяць міністэрствы адукацыі і юстыцыі РБ прыняць неабходныя захады да прадухіленьня неправамоцнай дзейнасьці, якая парушае правы грамадзянаў.

***23 студзеня*** актывістка руху супраціву "Зубр" непаўнагадовая Юлія Бандарэнка была зьбітая падчас разгону акцыі "Час адказваць", якая прайшла ў Менску ля будынку пракуратуры. "Падчас акцыі да мяне падыйшоў падпалкоўнік міліцыі, сказаў "Пройдёмте", а потым схапіў мяне і пацягнуў у "варанок". Каля машыны я адчула моцны ўдар у твар. У прытомнасьць прыйшла толькі ў машыне. З вуснаў цякла кроў", — расказала Юлія Бандарэнка журналістам.

***23 студзеня*** суд Маскоўскага раёну Менску не задаволіў скаргу лідэра жодзінскай філіі Партыі БНФ Аляксея Лапіцкага і каардынатаркі Праваабарончага цэнтру "Вясна" Сьвятланы Лапіцкай на дзеяньні старшыні Цэнтрвыбаркаму Лідзіі Ярмошынай падчас выбараў у мясцовыя Саветы 2003 году.

***24 студзеня*** міліцыя і АМАП разагналі рок-канцэрт, які меў адбыцца ў менскім клубе "NEW CLUB". Было затрымана 50 чалавек. Удзел у канцэрце павінны былі прыняць гарадзенскія гурты "КальЯН" і "PET NIHIL", якія вядомыя сваімі антыфашысцкімі перакананьнямі.

***23-24 студзеня*** ў Менску адбыўся Форум праваабаронцаў, адным з арганізатараў якога выступіла Міжнародная Федэрацыя Правоў Чалавека. У Форуме прынялі ўдзел больш за 150 беларускіх праваабаронцаў, прадстаўнікі міжнародных і замежных праваабарончых арганізацыяў, а таксама міжнародных органаў, якія займаюцца праблемамі правоў чалавека. Пра сітуацыю з правамі чалавека гаварылі, акрамя беларускіх выступоўцаў, прадстаўнікі буйнейшых праваабарончых арганізацыяў: Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека, Міжнароднай Лігі Правоў Чалавека, Міжнароднай Амністыі, Human Rights Watch. У працы Форуму прынялі ўдзел актывісты праваабарончых арганізацыяў з Чэхіі, Расіі, Швецыі, Польшчы,

Літвы, Украіны, Малдовы. Міжнародныя еўрапейскія органы былі прадстаўленыя выступамі супрацоўнікаў Генеральнага дырэктарату па правах чалавека Рады Еўропы, Генеральнага дырэктарату па зьнешніх сувязях Еўрапейскай камісіі Еўрапейскага Саюзу, Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. З кароткім дакладам выступіў таксама кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску амбасадар Эберхард Хайкен. У працы Форуму прыняў удзел вядомы расійскі праваабаронца Сяргей Кавалёў. Асноўная практычная праца Форуму праводзілася ў шасьці групах, дзе абмяркоўваліся пытаньні нацыянальных механізмаў абароны правоў і свабодаў чалавека; канстытуцыйных гарантыяў і механізмаў рэалізацыі выбарчых правоў; гвалтоўных зьнікненьняў; рэальных магчымасьцяў дзейнасьці СМІ; свабоды мірных сходаў і асацыяцыяў, а таксама лінгвістычныя правы. Форумам была прынятая Рэзалюцыя, а па выніках працы выпрацаваныя рэкамендацыі беларускім праваабаронцам, прадстаўнікам міжнароднай супольнасьці і афіцыйным уладам Беларусі.

***25 студзеня*** актывіст руху “Зубр” Аляксандр Сіліцкі быў затрыманы ў Смалявічах за распраўсюд газеты "Супраціў". Неягледзячы на тое, што выданьне мае выходныя дадзеныя, супрацоўнік міліцыі ў цывільным канфіскаваў 30 асобнікаў газеты, якія Аляксандр Сіліцкі не пасьпеў раздаць.

***26 студзеня*** суд Цэнтральнага раёну г.Менску вынес рашэньне па адміністратыўнай справе актывіста руху “Зубр” Рамана Казакевіча. Ён аштрафаваны на 20 базавых велічыняў за ўдзел у пікеце, які адбыўся 23 студзеня каля будынку пракуратуры. Удзельнікі пікету трымалі партрэты зьніклых палітыкаў і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага, а таксама плакат “Лукашэнка, Шэйман, Сівакоў! Час адказваць!” Амаль усе ўдзельнікі акцыі былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі, але на разгляд у суд накіравалі толькі справу Р. Казакевіча, а ў камісію па справах непаўнагадовых — Юліі Бандарэнкі, бо менавіта яны трымалі плакат.

***26 студзеня*** Грамадзкая ініцыятыва “За свабоднае веравызнаньне” прадставіла вынікі маніторынгу рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі за жнівень 2002 – сьнежань 2003. Матэрыялы, аб’яднаныя пад вокладкай “Белай кнігі”, уключаюць у сябе 10 разьдзелаў. Гэта перапіска рэлігійных арганізацыяў з дзяржаўнымі структурамі, артыкулы і інтэрв’ю ў прэсе, рэакцыя на падпісаньне пагадненьня паміж беларускай дзяржавай і праваслаўнай царквой, міжнародныя дакументы і заявы па рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі. Другая частка “Белай кнігі” (першая была выдадзеная ў жніўні 2002 г.) складаецца з 370 старонак і зьяўляецца “фундаментальным і адзіным дакументам, які паказвае розныя вымярэньні рэлігійнага жыцьця Беларусі за апошні час”. На прэзентайцыі кнігі выступілі трэці сакратар амбасады ЗША ў Беларусі Ян

Тэрнэр, дэпутат Палаты прадстаўнікоў РБ Сьвірыд, грамадзкі дзеяч Іван Саверчанка, юрыст Сяргей Шаўцоў. Іван Саверчанка прапанаваў стварыць грамадзкую камісію пры дзяржаўным Камітэце па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў, якая б займалася праблемамі дачыненьняў рэлігійных арганізацыяў і дзяржавы.

***26 студзеня*** кіраўніцтва евангельскіх цэркваў заявіла, што занепакоенае ўсё больш частымі фактамі абмежаваньня магчымасьці дзецям прысутнічаць на набажэнствах і навучацца рэлігіі. Так, у лістападзе 2003 году ў Наваградку мясцовыя органы ўлады чынілі перашкоды мясцовай грамадзе евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў праводзіць заняткі з дзецьмі, а кіраўніцтва школаў выклікала дзяцей на “выхаваўчыя” гутаркі, катэгарычна забараняючы ім прыходзіць у царкву, і пагражала бацькам штрафамі. Між іншым, нават дзеючы закон аб свабодзе сумленьня патрабуе згоды бацькоў толькі ў выпадку выкананьня рэлігійных абрадаў для дзяцей, якія не дасягнулі 15 гадоў, пры гэтым не ўдакладняючы форму згоды (пісьмовая ці вусная). Ёсьць важкія падставы казаць, што дадзеныя выпадкі не зьяўляюцца асабістай ініцыятывай чыноўнікаў на месцах. Так, напрыклад, Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў РБ накіраваў у кастрычніку 2003 г. у Нясьвіжскі райвыканкам ліст, у якім зьвяртае ўвагу, што ў раёне “маюць месца выпадкі ажыцьцяўленьня рэлігійнай дзейнасьці шэрагу пратэстанцкіх грамадаў па-за межамі ўсталяванай іх статутамі тэрыторыі, правядзеньне несанкцыянаваных рэлігійных мерапрыемстваў у грамадзкіх месцах, навучаньне непаўнагадовых рэлігіі бяз згоды бацькоў”. У сувязі з гэтым “Камітэт лічыць неабходным актывізаваць працу Камісіі спрыяньня кантролю за выкананьнем заканадаўства аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях” і рэкамендуе “ўзмацніць кантроль за дзейнасьцю рэлігійных арганізацыяў (рэгулярныя наведваньні набажэнстваў і сходаў, сустрэчы і гутаркі з кіраўніцтвам і актывам, прафілактычныя гутаркі з растлумачэньнем палажэньняў заканадаўства, праверкі разьмеркаваньня гуманітарнай і дабрачыннай дапамогі, справаводзтва і выкананьня статутаў, а таксама набажэнстваў, абрадаў і цырымоніяў на прадмет выяўленьня непаўнагадовых, якія прысутнічаюць (навучаюцца) без пісьмовай згоды бацькоў".

***26 студзеня*** ўнітарнае камунальнае прадпрыемства "Мазырскі камунальнік" запатрабавала ад лідэра зарэгістраванай у ЗША "Сусьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў" Якава Гутмана кампенсаваць расходы на знос мемарыяльнага знаку, узьведзенага на месцы самаспаленьня габрэяў восеньню 1941 году. У канцы лістапада 2003 году Я.Гутман без узгадненьня з уладамі Мазыра на свае сродкі ўстанавіў у горадзе памятны знак. Сярод загінулых быў і ягоны дзед Нісель Гутман. Аднак у сьнежні па рашэньні гарадзкіх уладаў мемарыяльны знак быў зьнесены,

пасьля чаго Я.Гутман правёў два несанкцыянаваныя пікетаваньні каля будынку Адміністрацыі прэзідэнта РБ і тыднёвую галадоўку. У дадатак Я.Гутман атрымаў ад кіраўніцтва УП “Мазырскі камунальнік” рахунак на 212 238 рублёў. У выпадку адмовы ад выплаты, кіраўніцтва прадпрыемства абяцае зьвярнуцца ў суд.

***28 студзеня*** Крычаўскі райвыканкам адмовіў ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” у пастаноўцы на ўлік мясцовай суполкі. Падставай дзеля гэтага, як сьцьвярджаюць службоўцы, зьяўляецца адсутнасьць сярод пададзеных дакументаў пратаколу паседжаньня Рады арганізацыі. Аднак самі крычаўскія БАЖаўцы з гэтым ня згодныя. “Усе дакументы былі складзеныя згодна з дзеючым заканадаўствам. Рэгістрацыйны пакет быў падрыхтаваны ў адпаведнасьці з усімі патрабаваньнямі”, – кажуць сябры арганізацыі. Супрацьстаяньне мясцовай “вертыкалі” і журналістаў цягнецца з моманту спробы БАЖаўцамі зарэгістраваць у Крычаве незалежнае выданьне “Уласны каментар”. Па словах журналістаў, чыноўнікі ўсяляк марудзілі справу, шукаючы фармальныя прычыны.

***28 студзеня*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" накіравала афіцыйныя лісты пракурору Гомельскай вобласьці А. Палавінку і начальніку УУС па Гомельскай вобласьці В. Яромкіну. Сябры БАЖ просяць забясьпечыць належны кантроль за правядзеньнем усебаковага, поўнага і аб’ектыўнага дасьледваньня ўсіх абставінаў інцыдэнту з журналісткай "БДГ" Ірынай Макавецкай. Аўтары звароту выказваюць неразуменьне з нагоды адмовы гомельскай міліцыі ўзбудзіць крымінальную справу па факце тэлефонных пагрозаў, якія атрымала І. Макавецкая ў ноч на 11 студзеня. Разам з тым, БАЖ вітае рашэньне пракуратуры Чыгуначнага раёну г. Гомелю аб адмене гэтай пастановы і накіраваньні матэрыялаў для далейшай праверкі. "Правы журналіста і гарантыі яго абароны прадугледжваюцца шэрагам заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь", — падкрэсьліваюць аўтары звароту. Яны ўзгадваюць артыкул 48 Закону "Аб друку і іншых СМІ", паводле якога "стварэньне перашкодаў у той ці іншай форме з боку грамадзянаў, службовых асобаў дзяржаўных органаў і арганізацыяў законнай дзейнасьці журналістаў цягне дысцыплінарную, адміністратыўную, крымінальную і іншую адказнасьць". Сябры БАЖ прыгадваюць артыкул 198 Крымінальнага кодэксу "Стварэньне перашкодаў законнай прафесійнай дзейнасьці журналіста", які прадугледжвае пакараньне аж да абмежаваньня альбо пазбаўленьня волі тэрмінам да 3 гадоў. Аўтары звароту мяркуюць, што ў інцыдэнце з І. Макавецкай прысутнічаюць прыкметы гэтага злачынства. БАЖ зьвяртае ўвагу пракуратуры і міліцыі на тое, што гэты інцыдэнт "выйшаў далёка за рамкі міжасабовых стасункаў двух супрацоўнікаў СМІ" і выклікаў вялікі розгалас. "Мы зьвяртаемся да Вас з прозьбай забясьпечыць належны кантроль за правядзеньнем

усебаковага, поўнага і аб’ектыўнага дасьледваньня ўсіх абставінаў дадзенага інцыдэнту", — гаворыцца ў дакуменце.

***29 студзеня*** ліквідаваная яшчэ адна беларуская праваабарончая арганізацыя – “Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў”. Судзьдзя Аксана Будоўская задаволіла зыск упраўленьня юстыцыі, у якім сьцьвярджаецца, што таварыства неаднаразова парушыла Закон “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” і ўласны Статут. Разгляд справы аб ліквідацыі “Незалежнага таварыства прававых дасьледваньняў” працягваўся ў Менскім гарадзкім судзе ўсяго некалькі гадзінаў. Старшыня арганізацыі Алена Танкачова так пракаментавала рашэньне Менгарсуда: “Я перакананая ў тым, што нас вырашылі ліквідаваць выключна таму, што мы занялі актыўную пазіцыю ў справе абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзкіх арганізацыяў, якія трапілі ў сітуацыю ліквідацыі. Калі гэта адзіная падстава дзеля ліквідацыі, то я магу сказаць, што нашая дзейнасьць — законная. Гэта нармальны элемент дзейнасьці ў рамках мэтаў і задачаў нашай арганізацыі. Гэта тое, дзеля чаго мы ў 1996 годзе ствараліся. І калі нас за гэта ліквідуюць, значыць, такі час і такая краіна”. “Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў” зьбіраецца абскарджваць гэтае рашэньне ў Вярхоўным судзе, але Алена Танкачова гаворыць, што яна і яе калегі гатовыя дзейнічаць і без дзяржаўнай рэгістрацыі.

***29 студзеня*** Аксана Новікава атрымала штраф 3 500 000 (гэта каля 1 600 даляраў) за правядзеньне несанкцыянаванага пікету. Нагадаем, што Аксана напярэдадні Новага году перад будынкам Фрунзенскага суда Менску стала з плакатам: “Нам патрэбны суд прысяжных”. Яе затрымалі і склалі пратакол за правядзеньне недазволенага ўладамі пікету.

***29 студзеня*** каля пяці гадзінаў вечара на цэнтральнай плошчы г. Барысаву тры актывісты моладзевага руху “Зубр” раздавалі жыхарам інфармацыйны бюлетэнь Праваабарончага цэнтру “Вясна” “Права на волю”. Калі ў маладых людзей заставалася некалькі дзесяткаў газетаў, яны былі затрыманыя групай людзей у цывільным на чале з намесьнікам начальніка мясцовага ўпраўленьня міліцыі Уладзімірам Падабедам. Затрыманыя Аляксандр Казакоў, Аляксандр Пералыгін і Павел Паддубны былі дастаўленыя ў ГУУС г. Барысаву. Там на іх былі складзеныя пратаколы за парушэньне арт. 172 КаАП РБ, а праз дзьве гадзіны маладыя людзі былі адпушчаныя.

## ЛЮТЫ

З ***1 лютага*** індывідуальныя прадпрымальнікі больш ня могуць ажыцьцяўляць функцыі рэдакцыі сродка масавай інфармацыі. Усе, хто жадае зарэгістраваць новае выданьне альбо перарэгістраваць ранейшае, павінныя ствараць альбо заключаць дамову аб выкананьні рэдакцыйных функцыяў з нейкаю іншаю юрыдычнай асобаю.

***1 лютага*** некалькі сотняў чалавек ўзялі ўдзел у мітынгу пратэсту ў Гомелі, які праходзіў пад лозунгамі "Сьвятло і цяпло – у кожны дом і па даступным кошце!", "Спачатку рост заробку і пенсіяў, а потым — павышэньне тарыфаў!", "НЕ платнай медыцыне!", "НЕ абнішчаньню народу!". Мітынг стаў і прэзентацыяй Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс", у якой удзельнічалі Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Юры Хадыка.

***2 лютага*** рэктар Белдзяржуніверсітэту Васіль Стражаў падпісаў загад аб ліквідацыі Міжнароднага гуманітарнага інстытуту пры БДУ. Габрэйскія арганізацыі расцэньваюць ліквідацыю адзінай навучальнай установы, у якой на кафедры юдаікі рыхтавалі сьпецыялістаў у галіне габрэйскай культуры, дыскрымінацыяй паводле нацыянальных прыкметаў. Загад рэктара БДУ Васіля Стражава аб ліквідацыі Інстытуту зьявіўся пасьля такога ж загаду Міністэрства адукацыі. Ніякіх тлумачэньняў з боку Міністэрства адукацыі ці рэктарату БДУ аб прычынах ліквідацыі інстытуту няма. Міжнародны гуманітарны інстытут быў заснаваны пяць гадоў таму і існаваў за кошт спонсараў, якія зацікаўленыя ў аднаўленьні ў Беларусі габрэйскай адукацыі. За грошы спонсараў адрамантавалі будынак Інстытуту, набылі новае абсталяваньне і кампутарную тэхніку. Апроч таго, замежнікі абяцалі 30 мільёнаў даляраў на будаўніцтва новых карпусоў Інстытуту і інтэрнатаў. Загад міністра адукацыі Аляксандра Радзькова аб ліквідацыі Інстытуту напачатку новага навучальнага году стаў нечаканасьцю для кіраўніцтва БДУ. Пры былым рэктары Аляксандры Казуліну на вучонай радзе была створаная камісія, якой даручылі весьці перамовы з міністэрствам. Дасягнулі толькі дамоўленасьці аб тым, што кафедра юдаікі застанецца, але на адным з факультэтаў БДУ. Габрэйскія арганізацыі абураюцца рашэньнем уладаў і зьвяртаюцца да беларускай грамадзкасьці і ў міжнародныя структуры. У 2003 годзе мусіў адбыцца першы выпуск Інстытуту. Рэктарат распарадзіўся, каб выпускнікам выдалі дыпломы аб заканчэньні факультэту міжнародных адносінаў БДУ. Студэнты пакуль на вакацыях і ніяк не адрэагавалі на гэтую навіну. У Беларусі з 1938 году няма ніводнай габрэйскай школы і ніводнай сярэдняй сьпецыяльнай установы, дзе б выкладаліся дысцыпліны ў галіне габрэйскай культуры. Закрыцьцё Інстытуту, дзе рыхтавалі навукоўцаў,

сьпецыялістаў-перакладчыкаў і кадры для працы ў сінагогах, на думку прадстаўнікоў габрэйскіх арганізацыяў, зьяўляецца моцным ударам па ўсёй габрэйскай адукацыі ў Беларусі. Саюз Беларускіх габрэйскіх грамадзкіх арганізацыяў і абшчынаў распаўсюдзіў заяву з нагоды ліквідацыі Міжнароднага гуманітарнага інстытуту (МГІ). "Загад міністра ня толькі не абгрунтаваны, але і ня мае матывацыяў. Гэта дае падставу для высновы, што ліквідацыя МГІ зьвязаная з праявай грубага суб’ектывізму супрацоўнікаў міністэрства", — адзначана ў дакуменце. Заяву падпісаў старшыня Рады габрэйскіх абшчынаў Беларусі Леанід Левін.

***2 лютага*** адзін з заснавальнікаў гомельскай моладзевай арганізацыі “Гарт” Арцём Бурыла аштрафаваны на 50 базавых велічыняў за ўвоз у Беларусь састарэлых улётак. А. Бурылу затрымалі на пункце пропуску “Новая Гута” беларуска-украінскай мяжы, калі той вяртаўся з Украіны. У багажніку яго машыны мытнікі знайшлі 2 566 улётках чатырох відаў. Галоўны інсьпектар атраду гомельскай мытні Аляксандр Ісачэнка аднёс улёткі да друкаваных выданьняў, якія ня могуць у такой колькасьці выкарыстоўвацца як прыватная маёмасьць. Па арт. 193-9 ч.1 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях на А.Бурылу, які не аформіў улёткі ў грузавой мытнай дэкларацыі, быў складзены пратакол. Арцём Бурыла патлумачыў, што знойдзеныя ўлёткі – макулатура: грамадзкае галасаваньне, датычнае магчымага трэцяга прэзідэнцкага тэрміну Лукашэнкі, на якое запрашалі ўлёткі, адбылося ў Гомелі яшчэ 7 лістапада 2003 году. У машыне пацярпелы вазіў улёткі таму, што “захоўваць іх дома не дазваляла сям’я, а выкінуць было шкада”. Тым ня менш, судзьдзя Яраслаў Парэмскі абвесьціў пастанову аб прыцягненьні да адказнасьці Бурылы. Пры гэтым аштрафаванага не запрасілі з калідору ў кабінет судзьдзі. Як заявіў сакратар, “Бурыла спазьніўся, таму пастанова была абвешчаная без яго”. У пастанове напісана, што Арцём Бурыла вёз улёткі на грузавым аўтамабілі “ЗИЛ-130” на 5 тыдняў пазьней за рэальную дату, што ўлёткі “имеют значительную материальную ценность”, што Бурыла, які выступаў у судзе адзін, сваю віну прызнаў. Пацярпелы выказвае недаўменьне адносна прыведзеных у пастанове фактаў і катэгарычна з імі не пагаджаецца: “Насамрэч я ехаў на легкавым аўтамабілі, віну сваю аспрэчваў, у судзе выступаў разам з прадстаўніком, а кошт улётак ня вызначыў ні мытнік, ні суд. У падобным хадайніцтве нам адмовілі”, — тлумачыць Арцём.

***2 лютага*** ў судзе Маскоўскага раёну г. Берасьця распачаўся судовы працэс па зыску Ніны Давыдоўскай, якая не пагадзілася з рашэньнем адміністратыўнай камісіі Маскоўскага раёну г.Берасьця ад 19 сьнежня 2003 году, дзе яна была аштрафаваная на 49 000 рублёў згодна ч.3 арт.172 КаАП РБ "распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем вызначанага парадку і ня маючых выходных дадзеных,

зьмест якіх накіраваны на прычыненьне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзянаў". Нагадаем, 10 сьнежня Ніна Юліянаўна распаўсюджвала ўлёткі-віншаваньні з нагоды чарговай гадавіны прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Паседжаньне пачалося толькі а дзесятай гадзіне і праходзіла пад старшынствам судзьдзі І.Клышпач. Ня ўсе жадаючыя змаглі прысутнічаць пры разглядзе справы – судзьдзя выдаліла ўсіх грамадзянаў, што прыйшлі на суд, матывуючы гэта адсутнасьцю месцаў. Некалькі грамадзянаў на той падставе, што судзьдзя парушыла канстытуцыйны прынцып адкрытасьці судоў, зьвярнуліся да старшыні суда с вуснай скаргай на дзеяньні судзьдзі Клышпач. Інтарэсы спадарыні Давыдоўскай прадстаўляў юрыст Уладзімір Малей, сябра Праваабарончага цэнтру "Вясна". Бок адказчыка прадстаўляла сакратар адміністратыўнай камісіі Маскоўскага раёну г. Берасьця Людміла Малевіч. Судзьдзя выслухала меркаваньне грамадзкага прадстаўніка, які засьведчыў, што парушэньня ўстаноўленага парадку друку няма: улётка выдадзеная накладам 200 асобнікаў, выходныя дадзеныя ёсьць, ніякім чынам зьмест улёткі ня можа быць накіраваны на шкоду дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, а наадварот, ва ўлётцы зьвяртаецца ўвага на законныя правы грамадзянаў, гарантаваныя Канстытуцыяй РБ. 3 лютага было агучанае рашэньне — спадарыня Давыдоўская павінна выплаціць штраф 49 тысячаў рублёў. Такім чынам, суд не задаволіў скаргу Ніны Давыдоўскай, і яна заявіла пра намер абскарджваць гэтае рашэньне ў абласным судзе.

***2 лютага*** больш за дваццаць віцебскіх прадпрымальнікаў сабраліся ў памяшканьні крытага рынку “Мішэль” і абвясьцілі пачатак бестэрміновай галадоўкі. Усе прадпрымальнікі — сябры грамадзкай арганізацыі “Персьпектыва”, прычым пераважная большасьць тых, хто наважыўся галадаць – жанчыны. Прадпрымальнікі патрабуюць адмены распараджэньняў аблвыканкаму ды гарвыканкаму пра ўвядзеньне касавых апаратаў, наяўнасьці 70% беларускіх тавараў у гандлёвым асартыменце, адмены наданьня крытым рынкам гораду статусу гандлёвых цэнтраў. А таксама яны патрабуюць пакараньня тых адказных асобаў, якія замінаюць разьвіцьцю прыватнага бізнэсу ў Віцебску

***3 лютага*** на калегіі, прысьвечанай вынікам працы органаў юстыцыі ў 2003 годзе, міністр юстыцыі РБ Віктар Галаванаў сказаў, што толькі 10 грамадзкіх арганізацыяў нацыянальнага ўзроўню зарэгістраваныя на працягу году. Міністр адзначыў, што ўсяго было пададзена 1464 матэрыялы на рэгістрацыю грамадзкіх аб’яднаньняў, з іх зарэгістравана 94 (6%), у тым ліку 23 – са статусам міжнародных. Паводле стану на 1 студзеня 2004 году, у Беларусі зарэгістраваныя 18 палітычных партыяў, 52 рэспубліканскія прафсаюзы, 2214 іншых грамадзкіх аб’яднаньняў. Віктар

Галаванаваў адзначыў, што ў 2003 годзе быў узмоцнены кантроль за дзейнасьцю няўрадавых арганізацыяў, былі праведзеныя паглыбленыя праверкі 81 грамадзкага аб’яднаньня. Па выніках праверак органы юстыцыі за розныя парушэньні вынесьлі на адрас кіруючых органаў гэтых структураў 810 пісьмовых папярэджаньняў, што ў 6 разоў больш аналагічнага паказьніку 2002 году. Па накіраваных у суды матэрыялах былі прынятыя рашэньні пра ліквідацыю 51 грамадзкага аб’яднаньня. “Нашыя органы юстыцыі зараз ужо можна называць не рэгіструючымі, а ліквідуючымі. 10 зарэгістраваных арганізацыяў нацыянальнага ўзроўню за цэлы год! Гэта параўнальна з той колькасьцю “грамадзкіх аб’яднаньняў”, што рэгістравалася за савецкім часам”, – каментуе дадзеныя Міністэрства юстыцыі Юры Чавусаў, каардынатар Сістэмы калектыўнай абароны грамадзкіх арганізацыяў. Ю. Чавусаў упэўнены, што беларускія ўлады “самі перахітрылі сябе”. “Не абцяжараныя неабходнасьцю азірацца на рэгіструючы орган, грамадзкія актывісты пойдуць да насельніцтва, пашыраць сваю дзейнасьць, – кажа спадар Чавусаў. – У 2003 годзе дзякуючы Мінюсту “трэці сектар” пазбавіўся ілюзіяў наконт магчымага супрацоўніцтва з дзяржавай, адкінуты прэч страх страціць легальны статус”.

***3 лютага*** Наталя Каляда, якая разьмяшчае свае артыкулы на сайце “Хартыі’97”, аштрафаваная на 20 базавых велічыняў. На думку пракуратуры і суда, такая дзейнасьць Наталі зьяўляецца парушэньнем адміністратыўнага кодэксу. Судзьдзя Наталя Вайцяховіч разглядала пастанову намесьніка генеральнага пракурора Мікалая Купрыянава, згодна з якой суду прапанавалі распачаць адміністратыўную справу супраць Наталі Каляды. Пракуратура палічыла, што разьмяшчэньне артыкулаў на сайце “Хартыі’97” зьяўляецца дзеяньнем ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Наталю Каляду затрымалі 10 сьнежня 2003 году на акцыі “Мы памятаем!”. Яна прад’явіла журналісцкае пасьведчаньне і паведаміла міліцыянтам, што прысутнічала на акцыі як журналістка, каб напісаць артыкул, які потым будзе на сайце “Хартыі’97”. Міліцыянты на наступны дзень узялі пісьмовыя тлумачэньні, а праз нейкі час Наталю выклікалі ў рэспубліканскую пракуратуру. Судзьдзя Наталя Вайцяховіч высьвятляла, што такое грамадзянская ініцыятыва і ці зьяўляецца “Хартыя’97” грамадзкай арганізацыяй. Заслухаўшы ўсе аргументы, судзьдзя пакарала журналістку штрафам на 20 базавых велічыняў (каля 150 даляраў ЗША). Намесьнік старшыні БХК Гары Паганяйла абараняў Наталю ў судовым працэсе. На ягоную думку, у Цэнтральным судзе з падачы пракуратуры створаны судовы прэцэдэнт, які можа мець сур’ёзныя наступствы для арганізацыяў, якія не зарэгістраваныя ў Мінюсьце, але маюць свой сайт.

***3 лютага*** распаўсюджваць газету “День” адмовіліся ўсе арганізацыі, нават тыя, з якімі існавала дамова. Таму выданьне пакуль ня можа трапіць да шырокага чытача. Наклад першага нумару газеты быў аддрукаваны ў Смаленску, паколькі беларускія друкарні не згадзіліся друкаваць “День”. Гарадзенскі абласны “Белсаюздрук” стаўся адзінай арганізацыяй, якая напачатку пагадзілася распаўсюджваць газету “День”, аднак калі наклад даставілі ў эксьпедыцыю, газету там браць адмовіліся. Рэдакцыя зьвярнулася да службовай асобы, якая адказвае за распаўсюд. Галоўны рэдактар Мікола Маркевіч гаворыць: “Мне наўпрост патлумачылі, што кіраўніцтву гарадзенскага “Аблсаюздруку” паступіў тэлефонны загад з Міністэрства інфармацыі газету на распаўсюд ня браць”. Калі Маркевіч зьвярнуўся ў Міністэрства інфармацыі, там усяляк абвяргалі такое абвінавачаньне. Начальнік галоўнага аналітычнага ўпраўленьня Міністэрства інфармацыі Уладзімір Матусевіч расцэньвае тое, што ўсе арганізацыі адмаўляюцца распаўсюджваць газету “День”, наступным чынам: “Гэта пытаньне двух суб’ектаў гаспадараньня, што яны падпісваюць і што выконваюць. Ёсьць заканадаўства, і сітуацыя павінна вырашацца толькі ў адпаведнасьці з заканадаўствам. Ёсьць органы, якім нададзена права вырашаць: што законна, а што незаконна. Гэта крышку ня наша кампетэнцыя”. Атрымліваецца, што ніхто не бярэ адказнасьці за тое, што наклад афіцыйна зарэгістраванай газеты ўсе ўстановы, у тым ліку недзяржаўныя, адмаўляюцца распаўсюджваць, нават маючы падпісаную з рэдакцыяй дамову. Рэдакцыя спрабуе распаўсюджваць у Гародні першы нумар газеты “День” уласнымі сіламі.

***3 лютага*** судовая пастанова аб прыцягненьні юрыста Праваабарончага цэнтру "Вясна" Уладзіміра Лабковіча да адміністратыўнай адказнасьці за ўдзел у акцыі пратэсту пасьля ліквідацыі арганізацыі адмененая ў сувязі з адмовай судзьдзі весьці працэс на беларускай мове. Старшыня Менскага гарадзкога суда М. Ардзяка адмяніў пастанову судзьдзі Ленінскага раёну Д. Жданка. Нагадаем, што пасьля ліквідацыі арганізацыі ў Вярхоўным судзе 28 кастрычніка 2003 году сябры "Вясны" наладзілі акцыю пратэсту і селі проста на падлогу ў зале судовых паседжаньняў. Восем сяброў Праваабарончага цэнтру былі пакараныя штрафамі за гэтую акцыю па арт. 166 КаАП РБ — "непадпарадкаваньне законным патрбаваньням супрацоўнікаў міліцыі". Сярод асуджаных быў і юрыст "Вясны" Уладзімір Лабковіч. Падчас разгляду ягонай адміністратыўнай справы судзьдзя Дзьмітры Жданок адмовіў у хадайніцтве аб прадастаўленьні перакладчыка на беларускую мову, чым парушыў канстытуцынае права "правапарушальніка" карыстацца роднай мовай. Гэтыя дзеяньні судзьдзі Уладзімір Лабковіч абскардзіў у Менскім гарадзкім судзе, і пастанова аб прыцягненьні яго да адміністратыўнай адказнасьці была адмененая, а справа накіраваная на новы разгляд. У пастанове Менскага гарадзкога суда сказана:

"Пастанова падлягае адмене па наступных падставах: згодна з арт. 247 КаАП РБ, асоба, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасьці, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, даваць тлумачэньні, прадстаўляць доказы, заяўляць хадайніцтвы, пры разглядзе справы карыстацца юрыдычнай дапамогай адваката, выступаць на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка, калі не валодае мовай, на якой вядзецца вытворчасьць, абскарджваць пастанову па справе. У сваёй скарзе Лабковіч У. М. указвае, што судом яму было нематывавана адмоўлена ў прадстаўленьні перакладчыка. Как бачна з пратаколу судовага паседжаньня, на пытаньне судзьдзі Лабковіч У.М. патлумачыў: "Я не магу аб’ектыўна ўсё разумець, паколькі не разумею па-руску. Бытавую лексіку я разумею, а што тычыць прававаых тэрмінаў, то яны мне незразумелыя". Такім чынам, судом парушанае права Лабковіча У.М. карыстацца паслугамі перакладчыка, што цягне за сабой адмену пастановы".

***4 лютага*** старшыню беларускага стачкама прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага выклікалі ў Ленінскі РУУС г. Гародні дзеля дачы тлумачэньняў. Прычынай да выкліку стала сьпецыяльнае даручэньне пракурора Гарадзенскай вобласьці, да якога быў прыкладзены ліст В.Леванеўскага з віншаваньнямі з Новым годам прадстаўнікам дыпламатычнага корпусу Украіны, які рассылаўся ўсім дыпламатычным прадстаўніцтвам Беларусі. В.Леванеўскі напісаў скаргу ў пракуратуру Гарадзенскай вобласьці, зьвязаную з парушэньнем ягоных правоў на таямніцу перапіскі.

***4 лютага*** нумар недзяржаўнай газеты "Вольнае Глыбокае" за студзень быў адцэнзураваны кіраўніцтвам друкарні ў Маладэчне. З бачынаў выданьня без дазволу рэдакцыі быў выдалены матэрыял, прысьвечаны зьезду Партыі БНФ. Супрацоўнікі друкарні ліквідавалі паведамленьне пра зьезд Партыі БНФ, а замест яго разьмясьцілі на другой паласе газеты рэкламны блок з тэлефонамі рэкламнага аддзелу газеты і подпісам "Тут магла быць ваша рэклама". Штотыднёвік, наклад якога складае 3,5 тысячы асобнікаў, распаўсюджваецца ў заходніх раёнах Віцебскай вобласьці.

***4 лютага*** Смаргонскі раённы суд адмовіўся прыцягваць да адміністратыўнай адказнасьці распаўсюднікаў недзяржаўнай "Местной газеты". Судзьдзя Ала Кіндра разгледзела пратаколы супрацоўнікаў падатковай інсьпекцыі, якія ў сярэдзіне студзеня затрымалі гандляроў нібыта за парушэньні правілаў разноснага гандлю, аднак не знайшла ў дзеяньнях распаўсюднікаў ніякіх парушэньняў. Нагадаем, 15 — 16 студзеня падатковыя інсьпектары затрымалі чатырох гандляроў "Местной газеты", склаўшы на іх пратаколы за гандаль без ліцэнзіі. Аднак у судзе

высьветлілася, што распаўсюднік газеты, прадпрымальніца Вольга Куняўская, мае ліцэнзію на продаж газеты ў вызначаных месцах. Акрамя гэтага, суд выявіў шэраг парушэньняў у афармленьні пратаколаў падатковымі інсьпектарамі.

***4-5 лютага*** ў Бруселі адбыўся Кангрэс Еўрапейскай Народнай Партыі, на якім была прынятая адмысловая Рэзалюцыя па Беларусі, дзе сказана: “Прымаецца да ўвагі той факт, што нядаўна быў зьменены Закон аб палітычных партыях і грамадзкіх арганізацыях, новыя правілы якога ўціскаюць названыя вышэй інстытуцыі і не адпавядаюць асноўным нормам міжнароднага права. Шэраг няўрадавых арганізацыяў быў закрыты (адным з найбольш драматычных было закрыцьцё “Вясны” – Праваабарончага цэнтру), некаторым партыям і шматлікім няўрадавым арганізацыям было адмоўлена ў рэгістрацыі без дастаткова ўважлівых прычынаў”. ЕНП выказала таксама глыбокую заклапочанасьць тым, што “працягваецца працэс закрыцьця і ціску на палітычныя і грамадзкія арганізацыі, якія дзейнічаюць у адпаведнасьці з прынцыпамі дэмакратыі; існуюць абмежаваньні, скіраваныя супраць незалежных СМІ, арышты і закрыцьцё незалежных газетаў; адбываецца прыгнячэньне сістэмы нацыянальнай адукацыі і закрыцьцё незалежных навучальных установаў; не праводзяцца рынкавыя рэформы, прадэклараваныя ў розных пагадненьнях і ў афіцыйным курсе ўладаў; адсутнічаюць дэмакратычна абраныя органы ўлады, якія рэпрэзентуюць свабодную волю грамадзянаў, якая выражаецца праз выбары”.

***5 лютага*** распачалі страйк наваполацкія прадпрымальнікі — гандляры рэчавых кірмашоў. Гэтая акцыя ў падтрымку патрабаваньняў віцебскіх калегаў, якія пачалі галадоўку.

***5 лютага*** віцебскі апазіцыянер Уладзімір Плешчанка аштрафаваны на 2 мільёны 800 тысячаў рублёў. У. Плешчанку затрымалі з плакатам “Збор подпісаў у суд супраць саюзнае дамовы, незаконна падпісанай Аляксандрам Лукашэнкам”.

***5 лютага*** Менскі гарадзкі суд не задаволіў скаргу актывіста “Маладога Фронту” Артура Фінькевіча, які патрабаваў “адмяніць пастанову па справе аб адміністратыўным правапарушэньні суда Савецкага раёну г. Менску ад 27.11.2003 як не заснаваную на законе”. Старшыня Менскага гарадзкога суда М. Ардзяка паведаміў А.Фінькевічу, што скарга не задаволеная па наступных падставах: “Довады скаргі ў тым, што вы незаконна прыцягнутыя да адміністратыўнай адказнасьці, бо лічыце, што ўчынілі расьцягнутае ў часе правапарушэньне, і ўжо былі 13 лістапада прыцягнутыя да адміністратыўнай адказнасьці за аналагічнае правапарушэньне, учыненае Вамі правапарушэньне не зьяўляецца расьцягнутым у

часе, бо па дадзенай справе яно было перапыненае 10 лістапада 2003 году, а па іншай справе – 12 лістапада 2003 году. Адміністратыўнае пакараньне на Вас накладзенае ў адпаведнасьці з ч.2 ст.167-1КаАП, з улікам дадзеных, якія харатарызуюць Вашую асобу, канкрэтных абставінаў справы”. Нагадаем, што 27 лістапада 2003 году судзьдзя суда Савецкага раёну Р. Казадаеў вынес рашэньне па справе А.Фінькевіча — 15 сутак адміністратыўнага арышту. Рашэньне было вынесенае ў той самы дзень, калі скончыўся тэрмін папярэдняга зьняволеньня. Перад гэтым 13 лістапада А.Фінькевіч быў асуджаны на 15 сутак арышту за распаўюд улётак з заклікам прыходзіць на акцыю, накіраваную супраць падаўжэньня прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А.Лукашэнкі. Пасьля сканчэньня першых 15 сутак А.Фінькевіч так і ня выйшаў на волю – са сьпецпрыёмніку яго адразу адвезьлі ў РУУС Савецкага раёну, дзе быў складзены пратакол па арт. 167.1 КаАП. ч. 2. за распаўсюд улётак, за якія ён быў затрыманы напачатку лістапада за тыдзень да таго, як яго першы раз асудзілі. На падставе гэтага пратаколу Р.Казадаеў зноў вынес рашэньне пра 15 сутак адміністратыўнага арышту, бо А.Фінькевіч зьяўляўся заяўляльнікам акцыі “НЕ – трэцяму рэферэндуму”. А 18 сьнежня Артур Фінькевіч атрымаў рашэньне адміністратыўнай камісіі Заводзкага раёну ад 12 сьнежня, у якім паведамляецца, што ён аштрафаваны на 60 тысячаў за “распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем устаноўленага парадку” (арт. 172 ч.3 КаАП РБ). Гэта быў першы прэцэдэнт, калі чалавека асудзілі тройчы за адныя і тыя ж дзеяньні.

***5 лютага*** Міністэрства інфармацыі прыпыніла тэрмінам на 1 месяц выхад недзяржаўнай газеты “Згода”. Пра гэта 6 лютага даведаўся заснавальнік выданьня Аляксей Кароль у друкарні “Плутас-маркет”, дзе ў яго адмовіліся прыняць у друк чарговы нумар выданьня. Крыху пазьней ён атрымаў па пошце два загады, падпісаныя міністрам Уладзімірам Русакевічам: аб вынясеньні папярэджаньня і аб прыпыненьні газеты тэрмінам на 1 месяц. Падставай дзеля вынясеньня папярэджаньня і прыпыненьня газеты сталі “грубыя парушэньні заканадаўства”, якія, па меркаваньні міністра, на працягу доўгага часу дапускала рэдакцыя. Па-першае, ёй інкрымінуюць зьмену юрыдычнага адрасу без адпаведнага паведамленьня ў Міністэрства інфармацыі (арт. 11 Закону аб друку). Па-другое, газету абвінавачваюць у тым, што яна выдаецца толькі на рускай і беларускай, а не на ўсіх мовах, пералічаных у яе рэгістрацыйным пасьведчаньні. Але гэта – ня ўсе парушэньні, якія, на думку міністра, дапусьціла рэдакцыя. “Заснавальнік газеты “Згода” грамадзянін Кароль А.С. выконвае функцыі рэдакцыі ў якасьці індывідуальнага прадпрымальніка, але ў выходных дадзеных газеты рэдактарам указваецца іншая асоба – Алесь Здвіжкоў, што парушае артыкулы 19, 20 Закону аб друку”, – гаворыцца ў загадзе У. Русакевіча. Акрамя гэтага, міністр знайшоў у

афармленьні выходных дадзеных газеты некалькі парушэньняў міждзяржаўнага стандарту ДАСТ. Заснавальнік газеты А.Кароль упэўнены, што выстаўленыя да выданьня прэтэнзіі – толькі фармальныя падставы дзеля карных захадаў. Газета “Згода” выдаецца з 1992 году і зарэгістраваная як незалежны інфармацыйна-аналітычны штотыднёвік. Са сьнежня 2003 году выданьне павялічыла аб’ём і наклад: замест 8 палосаў пачала выходзіць на 16 накладам 3 050 асобнікаў замест 2 500. Газета рабіла ўхіл на аналітычныя матэрыялы па актуальных эканамічных і палітычных праблемах. На думку А. Караля, увагу Міністэрства інфармацыі магла прыцягнуць публікацыя ў апошнім нумары газеты, якая называлася “Газ, трубы і інтэграцыя”. Як паведаміў А. Кароль, рэдакцыя будзе на працягу месяца прыводзіць свае дакументы ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі Міністэрства. “Аднак у нас няма ўпэўненасьці, што гэта будуць апошнія “зачэпкі”, каб ня даць нам выходзіць”, – зазначыў ён.

***5 лютага*** стала вядома, што беларускія ўлады аказваюць ціск на баптысцкіх пастараў, прымушаючы іх выплочваць штрафы за кіраўніцтва рэлігійнымі арганізацыямі. Падобныя абвінавачаньні вылучаныя супраць трох пастараў: Віктара Яўцюхова, Алега Курносава і Канстанціна Ерамеева.

***6 лютага*** суд Маскоўскага раёну Берасьця адхіліў скаргу старшыні гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Ніны Давыдоўскай на рашэньне адміністратыўнай камісіі Маскоўскага раёну. Паводле гэтага рашэньня спадарыню Давыдоўскую забавязалі сплаціць штраф 49 тысячаў рублёў за распаўсюд друкаванай прадукцыі, якая ня мае выходых зьвестак і “шкодзіць дзяржаўным інтарэсам”. Такой прадукцыяй міліцыянты палічылі ўлёткі, што сябры Партыі БНФ раздавалі 10 сьнежня 2003 году, у Міжнародны дзень правоў чалавека, каля берасьцейскага заводу “Цьветатрон”. Улёткі ўтрымлівалі заклік да рабочых адстойваць свае правы.

***6 лютага*** дзевяты нумар адной з найстарэйшых у Беларусі недзяржаўных газет “Витебский курьер” выйшаў з “белай плямай” замест тэлепраграмы. У гэтым жа выпуску рэдакцыя выступіла з адмысловым зваротам да чытачоў, у якім патлумачыла прычыны таго, што адбылося. Найперш у сваім звароце рэдакцыя характарызуе агульную сітуацыю, якая склалася на інфармацыйным полі Беларусі: гэта эканамічны і палітычны ціск на недзяржаўныя СМІ, ліквідацыя грамадзкіх арганізацыяў, скарачэньне вяшчаньня расійскіх тэлеканалаў і радыёстанцыяў і г.д. У адным шэрагу з гэтымі падзеямі рэдакцыя “Витебского курьера” разглядае і рашэньне калегіі Адміністрацыі прэзідэнта ад 27 кастрычніка 2003 году перадаць усе правы на распаўсюд праграмы тэлеперадачаў шэрагу каналаў дзяржаўнаму агенцтву БелТА. “Такім чынам, створаная чарговая дзяржманаполія”, – гаворыцца ў звароце.

Журналісты распавядаюць, як на працягу студзеня рэдакцыя “Витебского курьера” марна дамагалася заключэньня з БелТА дамовы на атрыманьне праграмы тэлеперадачаў асноўных эфірных тэлеканалаў. 3 лютага рэдакцыя нарэшце атрымала дамову на люты 2004 году, дзе фігуравала сума – 5 мільёнаў 25 тысячаў беларускіх рублёў за месяц. (Дагэтуль рэдакцыя плаціла за тыя ж паслугі каля 100 тысячаў рублёў). “Гэта месячны заробак усіх нашых супрацоўнікаў, альбо кошт месячнай рэалізацыі газеты”, – гаворыцца ў звароце да чытачоў. “Працаваць без заробку ў супрацоўнікаў нашай рэдакцыі няма магчымасьці – ва ўсіх сем’і, а купляць “Витебский курьер” па 1000 рублёў за нумар узьнікне жаданьне не ва ўсіх... У чарговы раз улада жорстка ўказвае жабракам-беларусам, што яны павінны слухаць, што глядзець і што чытаць. Мы працягнем барацьбу за нашы з Вамі канстытуцыйныя правы і спадзяемся, што нашы паважаныя чытачы набываюць “Курьер” ня толькі з-за праграмы тэлеперадачаў, і ўлады ў гэтым выпадку пралічыліся”.

***6 лютага*** Міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў" выступіла з заявай пратэсту з нагоды прыцягеньня да адміністратыўнай адказнасьці журналісткі Наталі Каляды, якая займаецца інфармацыйным напаўненьнем сайту "Хартыі-97". "Усё, што зьдзейсніла Каляда – выказалася супраць бясконцых парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, – лічаць "Рэпарцёры бяз межаў". – Караючы яе за напісаньне артыкулаў у Інтэрнэце, судзьдзя ... дае трывожны сігнал праваабаронцам і журналістам". "Рэпарцёры" адзначаюць, што ў Беларусі, дзе незалежная прэса знаходзіцца пад пастаянным уціскам з боку ўладаў, Інтэрнэт застаецца бадай адзінай крыніцай неадцэнзураванай інфармацыі. "Мы рашуча асуджаем гэтую спробу зьнішчыць свабодную прэсу ў Інтэрнэце", – гаворыцца ў заяве арганізацыі.

***6 лютага*** на сесію Гарадзенскага абласнога Савету не пусьцілі двух журналістаў — Андрэя Пачобута з газеты “День” і Ніну Палуцкую, якая працуе ў Інтэрнэт-выданьні belarusfree.org. Ім паказалі сьпіс дапушчаных на паседжаньне карэспандэнтаў, які падпісаў начальнік упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Уладзімір Амелька. У гэтым сьпісе былі толькі прадстаўнікі дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. На сесіі галоўным пытаньнем была справаздача за мінулы год старшыні аблвыканкаму Уладзіміра Саўчанкі.

***9 лютага*** старшыня гомельскага аддзяленьня РГА “Прававая ініцыятыва” Леанід Судаленка выказаў намер пачаць збор подпісаў за адхіленьне ад тэлеэфіру “гэтак званага праваабаронцы Яўгена Новікава”, калі гэта дабраахвотна ня зробіць сама Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія. У адкрытым лісьце, дасланым Судаленкам на адрас НДТРК, амбасады Чэшскай Рэспублікі і СМІ, нагодай да патрабаваньня стала ўбачаная ім 29 студзеня па Першым нацыянальным канале

перадача Я.Новікава, прысьвечаная правам чалавека ў Чэхіі. “У глыбока зьняважлівай форме аўтар перадачы прыпісвае чэшскаму народу амаральныя і супрацьзаконныя дзеяньні. (...) Пасьля яе прагляду ў мяне склалася пачуцьцё сораму за нашае, на маю думку, звар’яцелае тэлебачаньне”, – піша Судаленка. Зьвяртаючыся да амбасады Чэхіі і ўсяго чэшскага народу, Судаленка прыносіць свае прабачэньні “за тое, што адбываецца на дзяржаўным тэлебачаньні Беларусі”.

***9 лютага*** ў Барысаве адбыўся мітынг індывідуальных прадпрымальнікаў, якія пратэставалі супраць фінансавага ўціску. Каля трохсот удзельнікаў санкцыянаванага Барысаўскім гарвыканкамам мітынгу сабралася на гарадзкім стадыёне. Паводле арганізатараў акцыі, яе правядзеньне было выкліканае паглыбленьнем канфлікту паміж прадпрымальнікамі і ўладамі. Лідэр барысаўскіх бізнэсоўцаў Віктар Гарбачоў абвясьціў удзельнікам, што ў краіне распачынаецца новая хваля эканамічнага ціску на дробны бізнэс, якую справакавалі прынятыя летась прэзідэнцкі дэкрэт пра ліцэнзаваньне і пастанова ўраду пра новыя правілы гандлю на рынках. Прамоўца зазначыў, што ўвядзеньне згаданых актаў выкліча масавае банкруцтва дробных бізнэсоўцаў. Паводле ягоных словаў, першымі гэта зразумелі гандляры Віцебску, якія выказалі свой пратэст, абвесьціўшы галадоўку. Лідэр грамадзкага аб’яднаньня “Персьпектыва” Анатоль Шумчанка распавёў барысаўчанам пра сустрэчу з галадоўнікамі, якія, паводле ягоных словаў, маюць патрэбу ў падтрымцы сваіх дзеяньняў. Ён зьвярнуў увагу на тое, што без такой падтрымкі пагроза банкруцтва можа напаткаць бізнэсоўцаў любога іншага рэгіёну, у тым ліку Барысаву. А таму, паводле спадара Шумчанкі, беларускія прадпрымальнікі мусяць аб’яднацца, каб разам супрацьдзейнічаць уладам. Лідэр “Персьпектывы” заклікаў барысаўскіх гандляроў узяць актыўны ўдзел у агульнанацыянальным аднадзённым страйку. Удзельнікі барысаўскага мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой заклікалі ўлады скасаваць новаўвядзеньні, скіраваныя на зьнішчэньне ў Беларусі дробнага прадпрымальніцтва.

***9 лютага*** стала вядома, што адзін з еўрапейскіх судоў распачне справу супраць кіраўнікоў Беларусі, якія падазраюцца ў арганізацыі зьнікненьняў вядомых у краіне людзей. Пра гэта Сьвятлана Завадзкая паведаміла пасьля сваёй паездкі ў Бельгію. Сьвятлана Завадзкая кажа, што распачынаць судовую справу аб зьнікненьнях у адным з еўрапейскіх судоў было немагчыма без кансультацыяў з уплывовымі еўрапейскім палітыкамі. Сьвятлана Завадзкая цягам трох папярэдніх дзён мела сустрэчы ў Брусэлі з уплывовымі дэпутатамі Еўрапарламенту. Сярод іх былі Элізабэт Шродтэр, Ян Вірсма, Барт Стайс ды іншыя палітыкі. Падчас сустрэч з імі былі абмеркаваныя магчымасьці слуханьняў у Еўрапарламенце праблемы палітычных

зьнікненьняў у Беларусі, а таксама арганізацыйныя ды фінансавыя акалічнасьці будучага судовага працэсу над беларускімі кіраўнікамі, якія, магчыма, датычныя да зьнікненьняў. Калі адзін з еўрапейскіх судоў пачне слуханьні справаў зьніклых беларускіх апазіцыянераў, то падазраваемых беларускіх кіраўнікоў могуць затрымаць у любой з еўрапейскіх краінаў і пад прымусам даставіць на працэс. Сваякі зьніклых дамагаюцца, каб гэтая працэдура была зробленая адносна Віктара Шэймана, Юрыя Сівакова, Уладзіміра Навумава, Дзьмітрыя Паўлічэнкі ды некаторых іншых асобаў.

***10 лютага*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" атрымала з Пракуратуры РБ адказ на свой запыт з просьбай патлумачыць сітуацыю з распаўсюдам праграмы перадачаў беларускіх тэлеканалаў. Начальнік упраўленьня Пракуратуры І.К.Падамацька праінфармаваў БАЖ пра тое, што перанакіроўвае зварот арганізацыі ў Дэпартамент антыманапольнай і цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі РБ. Сп. Падамацька просіць гэтае ведамства паведаміць аб выніках дасьледваньня аўтару звароту – намесьніку старшыні БАЖ Андрэю Бастунцу.

***10 лютага*** рэсурсны цэнтр “Усяслаў Чарадзей” у Наваполацку атрымаў пісьмовае папярэджаньне ўпраўленьня юстыцыі. Недзяржаўная арганізацыя парушыла заканадаўства, бо не знаходзіцца па месцы свайго юрыдычнага адрасу. Калі на працягу некалькіх тыдняў пытаньне з новым юрыдычным адрасам ня будзе вырашана, то рэгістрацыя “Усяслава Чарадзея” будзе скасаваная, і арганізацыя ў персьпектыве можа быць ліквідаваная.

***10 і 11 лютага*** была паралізаваная праца Інтэрнэт-сайту "Хартыі’97". "У нас няма наўпроставых доказаў, але ёсьць усе падставы меркаваць, што правядзеньне атакі санкцыянаванае і падтрымліваецца беларускімі ўладамі", – гаворыцца ў адмысловым паведамленьні на сайце "Хартыі’97". Пра гэта паведамілі 12 лютага журналісты, здолеўшы аднавіць працу сайта. 10 лютага раніцай кампанія-хостэр, у якой базуецца сайт "Хартыі’97", зафіксавала 980 тысячаў запытаў да рэсурсу з розных IP-адрасоў, разьмешчаных па ўсім сьвеце. У выніку кампанія вымушаная была прыпыніць абслугоўваньне сайту, і ён быў недаступны для карыстальнікаў на працягу двух дзён. "Хартыя’97" нагадвае, што першая хваля атакі на рэсурс пачалася 20 студзеня, пасьля разьмяшчэньня на ім артыкулу пра беларускіх гандляроў дзіцячай парнаграфіяй. Зараз супрацоўнікі сайту бачаць у дзеяньнях невядомых хакераў ня толькі жаданьне абмежаваць распаўсюд інфармацыі аб фігурантах гэтага бізнэсу, але і намер "разабрацца" з папулярным беларускім Інтэрнэт-рэсурсам. Журналісты нагадваюць, што каля тыдня таму менскі суд аштрафаваў іх калегу Наталю Каляду, палічыўшы, што падрыхтоўка і распаўсюд журналісткай інфармацыі

на сайце "Хартыі-97" ёсьць дзейнасьць ад імя незарэгістраванай структуры. Яны таксама зьвяртаюць увагу на тое, што новая хваля атакі на сайт супала з міжнародным форумам у Рызе, у якім бралі актыўны ўдзел прадстаўнікі беларускай апазіцыі. Усё гэта, на іх думку, сьведчыць пра пачатак "шырокамаштабнай інфармацыйнай "зачысткі" у віртуальнай прасторы Белнэту".

***11 лютага*** Камітэт выкананьня пакараньняў амніставаў Аксану Новікаву. Цэнтральны суд Менску 4 красавіка 2003 пакараў Аксану Новікаву за абразу прэзідэнта. А.Новікава 17 кастрычніка 2002 году на Кастрычніцкім пляцы раздавала ўлёткі, у якіх сьцьвярджалася, што Аляксандр Лукашэнка і кіраўнікі сілавых ведамстваў мелі дачыненьне да выкраданьня людзей. Суд не выклікаў ніводнага сьведкі, якіх прапанавала абарона, і пакараў Аксану Новікаву за абразу прэзідэнта двума гадамі пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на два гады. Аксана Новікава, нягледзячы на пакараньне, і далей удзельнічала ў вулічных апазіцыйных акцыях. Двойчы яна самастойна правяла пікеты і за гэта панесла адміністратыўную адказнасьць. За парушэньні Адміністратыўнага кодэксу Аксану маглі накіраваць адбываць пакараньне ў жаночую калонію, але чыноўнікі ўлічылі тое, што яна мае маленькае дзіця і ўжылі для маладой маці амністыю.

***11 лютага*** заснавальнік і рэдактар недзяржаўнай газеты "Вечерний Столин" Аляксандр Ігнацюк атрымаў па пошце папярэджаньне і загад аб прыпыненьні выданьня на тры месяцы. Абодва дакументы падпісаныя міністрам інфармацыі Уладзімірам Русакевічам. На думку міністра, выданьне груба парушала дзеючае заканадаўства: у прыватнасьці, артыкулы 30 і 11 Закону аб друку і некалькі пастановаў Савету Міністраў. Газету абвінавачваюць у тым, што ў нумарах 42 і 44 за 2003 г. "рэкламныя матэрыялы перавышаюць 30% аб’ёму нумароў", хаця "газета не зарэгістраваная ў якасьці сьпецыялізаванага сродку масавай інфармацыі для паведамленьняў і матэрыялаў рэкламнага характару". Другая прэтэнзія да газеты тычыцца зьмены яе тэматыкі і мовы без пісьмовага інфармаваньня рэгіструючага органу. (У папярэджаньні гаворыцца, што выданьне зьмяніла тэматыку "з вытворча-практычнай і для вольнага часу на масава-палітычную", а замест рускай і беларускай моваў перайшло на рускую, не паведаміўшы пра гэта ў месячны тэрмін Міністэрству інфармацыі).На падставе гэтага міністр Русакевіч 5 лютага вынес газеце папярэджаньне, а 6 лютага падпісаў загад аб яе прыпыненьні на 3 месяцы. Нагадаем: 26 лютага 2003 г. выпуск газеты "Вечерний Столин" ужо прыпыняўся на тры месяцы па загадзе міністра інфармацыі М. Падгайнага пасьля таго, як газеце былі вынесеныя 2 папярэджаньні за парушэньне арт. 5 Закону аб друку. Аднак з 28 красавіка выхад газеты быў адноўлены: міністр інфармацыі задаволіў заяву А.

Ігнацюка аб зьняцьці з газеты карных санкцыяў з прычыны цяжкага фінансавага становішча выданьня. Нагадаем таксама, што 26 сьнежня 2003 году суд Столінскага раёну прызнаў заснавальніка газеты "Вечерний Столин" Аляксандра Ігнацюка вінаватым у парушэньні арт. 369 КК РБ – "зьнявага прадстаўніка ўлады" – і абавязаў яго выплаціць былому старшыні райвыканкаму Уладзіміру Пашкевічу грашовую кампенсацыю ў памеры 30 базавых велічыняў.

***11 лютага*** менскія ўлады не далі дазволу актывістам «Маладога Фронту» на правядзеньне 14 лютага ў цэнтры гораду шэсьця з нагоды Дня сьвятога Валянціна. Чыноўнікі матывуюць сваё рашэньне тым, што закон забараняе праводзіць масавыя вулічныя мерапрыемствы паблізу будынкаў дзяржаўных установаў і дыпламатычных місіяў. Нягледзячы на забарону, маладафронтаўцы зьбіраюцца правесьці шэсьце менавіта ў цэнтры Менску.

***12 лютага*** стала вядома, што былому рэктару Гомельскага медыцынскага інстытуту Юрыю Бандажэўскаму на год зьменшанае васьмігадовае пакараньне. Між тым, палітыкі ў Еўропе і сьвеце патрабуюць увогуле вызваліць Юрыя Бандажэўскага, якога лічаць пацярпелым за свае перакананьні. Тое, што Юрыю Бандажэўскаму зьменшылі пакараньне паводле чарговай амністыі, пацьвердзілі ў менскай калоніі на Кальварыйскай вуліцы, дзе адбывае тэрмін былы рэктар. “Звычайна такіх зьвестак мы не даем, але зробім выключэньне. Адносна Бандажэўскага рашэньне вось толькі прынятае. Яшчэ адзін год яму скасавалі. Можаце парадаваць сваякоў, яны пра гэта пакуль ня ведаюць”, — сказаў супрацоўнік калоніі. Жонка Юрыя Бандажэўскага Галіна, атрымаўшы навіну пра зьмяншэньне тэрміну пакараньня мужа, адразу пачала лічыць, колькі яму яшчэ засталося: “Дзьве амністыі ўжо прайшлі, былая амністыя і гэта, такім чынам, ад васьмі гадоў адняць два — гэта шэсьць. З іх тры гады ён адседзеў — гэта палова тэрміну, таму ён можа прэтэндаваць на зьмену меры ўтрыманьня, – сказала Галіна Бандажэўская”. У менскай калоніі сапраўды пацьвердзілі, што справу Юрыя Бандажэўскага суд можа перагледзець і зьмяніць яму рэжым пакараньня. Прыкладам, турэмнае зьняволеньне могуць замяніць на гэтак званую “хімію”. Дакладна калі гэта адбудзецца, не паведамілі, але сказалі, што звычайна мінае няшмат часу. Між тым, шматлікія праваабарончыя арганізацыі сьвету і вядомыя палітыкі працягваюць патрабаваць апраўданьня і вызваленьня Юрыя Бандажэўскага, бо лічаць, што ён пацярпеў за свае навуковыя погляды на чарнобыльскую праблему, якія разыходзіліся з афіцыйнай пазіцыяй беларускіх уладаў. На гэта беларускія ўлады адказваюць заявамі пра тое, што Бандажэўскі — звычайны хабарнік, якога напаткала справядлівае судовае пакараньне. Пра гэта, у прыватнасьці, паведамляецца ў

нядаўнім адказе беларускага ўраду на запыт Камітэту правоў чалавека ААН. Вядома, што былы рэктар гэтак і не прызнаў сябе вінаватым і, не атрымаўшы абароны ў судах вышэйшых інстанцыяў, зьвярнуўся са скаргай у Камітэт правоў чалавека ААН. Камітэт зрабіў запыт беларускаму ўраду адносна скаргі Бандажэўскага, і вось нядаўна стала вядома пра афіцыйны адказ беларускага ўраду. Гары Паганяйла, абаронца Бандажэўскага ў судах, азнаёміўся з гэтым дакументам і лічыць яго вельмі фармальным. Паводле Гары Паганяйлы, беларускія чыноўнікі цалкам абышлі ўвагай скаргі Юрыя Бандажэўскага на парушэньні ягоных правоў. Гары Паганяйла пералічвае сьпіс гэтых парушэньняў: “Гэта незаконны арышт, утрыманьне ва ўмовах, якія мы лічым катаваньнем і прыніжэньнем ягонага чалавечага гонару і годнасьці. Акрамя таго, былі дапушчаныя парушэньні ягонага права на абарону, права на незалежны і аб’ектыўны суд, права на абскарджаньне прысуду”.

***12 лютага*** аўтарытэтная міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International распачала акцыю ў падтрымку зьняволенага прафесара Юрыя Бандажэўскага. Amnesty International зьвярнула ўвагу на пагаршэньне стану здароўя Бандажэўскага і заклікала дасылаць лісты на імя Аляксандра Лукашэнкі і іншых кіраўнікоў. Зварот праваабарончай арганізацыі распаўсюджаны па электроннай пошце, а таксама зьмешчаны на вэб-сайце Amnesty International. Amnesty International цытуе ліст зьняволенага прафесара: “Я вельмі ўдзячны, што пра мяне не забываюцца. Мой стан здароўя не найлепшы, я ў дэпрэсіі... Лекі не дапамагаюць і даюць шмат пабочных эфектаў, у тым ліку і алергію. У мяне не засталося ніякіх сілаў”, – гэтак пісаў прафесар Бандажэўскі сваёй жонцы Галіне з турмы.

***12 лютага*** ў Беларусі прайшоў аднадзённы папераджальны агульнанацыянальны страйк прадпрымальнікаў. У страйку прынялі ўдзел больш за 20 тысячаў прадпрымальнікаў. Акцыя прайшла ў знак салідарнасьці з трыццацьцю віцебскімі прадпрымальнікамі, якія ўжо 12 дзён трымаюць галадоўку ў сувязі з тым, што віцебскія чыноўнікі вырашылі надаць усім рынкам статус гандлёвых цэнтраў, што пацягнула павышэньне коштаў арэнды, канфіскацыю тавараў, абавязковае ўвядзеньне касавых апаратаў. З прычыны такіх дзеяньняў абсалютная большыня прадпрымальнікаў можа стаць банкрутамі, хаця ўжо цяпер яны нясуць вялікія страты. Найбольшая актыўнасьць была праяўлена на адкрытых рынках ў Гародні, Менску і Віцебску. Рынак "Дынама" ў Менску не працаваў цалкам. Таксама ў Менску ня выйшлі на працу прадпрымальнікі на рынках “Ждановічы”, “Уручча”, “Свэлта”, “Чэрвеньскі” і інш. Калі ўлады ня выканаюць патрабаваньне прадпрымальнікаў правесьці з імі перамовы да 20 лютага, прадпрымальнікі з 1 сакавіка абвесьцяць бестэрміновы страйк з нявыплатай адзінага падатку ды іншых плацяжоў.

***12 лютага*** гарадзенскіх журналістаў Анджэя Пісальніка (газета "День") і Ірыну Чарняўку ("Белорусская газета") выдалілі з залы, дзе праходзіла нарада Упраўленьня інфармацыі Гарадзенскага аблвыканкаму з удзелам намесьніцы міністра інфармацыі Ліліі Ананіч. Карэспандэнтку Юлію Дарашкевіч увогуле не пусьцілі ў памяшканьне, дзе праходзіла мерапрыемства. Журналісты рыхтуюць скаргу ў пракуратуру на дзеяньні чыноўнікаў. За апошні тыдзень гэта ўжо другі выпадак у Гародні, калі чыноўнікі Упраўленьня перашкаджаюць прадстаўнікам недзяржаўнай прэсы выконваць прафесійныя абавязкі. На нарадзе абмяркоўваўся план мерапрыемстваў па ідэалагічнай рабоце на бягучы год. Акрамя супрацоўнікаў Упраўленьня інфармацыі аблвыканкаму, на сустрэчы прысутнічалі галоўны рэдактар газеты "Вечерний Гродно" А. Кучынскі, дырэктар Гарадзенскай тэлерадыёкампаніі "Гродно" У. Пярцоў, карэспандэнт агенцтва БелТА Р.Салата, а таксама рэдактары дзяржаўных газетаў і кіраўнікі аддзелаў інфармацыі райвыканкамаў вобласьці – агулам каля 50 чалавек. На ўваходзе ў залу паседжаньняў Анджэя Пісальніка і Ірыну Чарняўку затрымаў намесьнік кіраўніка Упраўленьня інфармацыі Павел Скрабко, які заявіў, што гэта – "унутранае мерапрыемства" і запатрабаваў, каб яны пакінулі будынак аблвыканкаму. Аднак журналісты спасłаліся на закон аб друку, які дае ім права прысутнічаць на гэткіх сустрэчах без запрашэньня, і прайшлі ў залу. Тады П.Скрабко выклікаў міліцыянта з аховы будынку аблвыканкаму, па патрабаваньні якога А.Пісальнік пакінуў залу. І. Чарняўка заставалася ў памяшканьні да пачатку паседжаньня. Кіраўнік Упраўленьня інфармацыі Уладзімір Амелька прапанаваў прысутным прагаласаваць за выдаленьне журналістаў з залы. Прапанову падтрымалі сем чалавек, аднак сп. Амелька абвесьціў, што рашэньне прынятае "адзінагалосна". І.Чарняўка падпарадкавалася, папярэдзіўшы, што запатрабуе выпіску з пратаколу з вынікамі галасаваньня.

***13 лютага*** ўласнага карэспандэнта “Белорусской деловой газеты” па Гомельскай вобласьці Ірыну Макавецкую выклікалі ў абласную пракуратуру. Начальнік аддзелу агульнага нагляду за законнасьцю па выкананьні прававых актаў Аляксандр Елісееў зачытаў ёй тэкст папярэджаньня, вынесенага пракурорам вобласьці Алегам Палавінкам. Выдаць дакумент журналістцы сп. Елісееў адмовіўся, аднак пагадзіўся зачытаць яго для дыктафоннага запісу. Падставай дзеля вынясеньня папярэджаньня стаў артыкул І. Макавецкай “Виконт” не вписался в белорусскую действительность”, які зьявіўся ў “БДГ” №104 ад 10.12.2003 г. Пракурор мяркуе, што ў гэтай публікацыі журналістка парушыла арт. 5 Закона “Аб друку і іншых СМІ”, а таксама арт. 9 Закону “Аб судавытворчасьці і статусе судзьдзяў у РБ”. Пракурор сьцьвярджае, што І. Макавецкая “апублікавала матэрыялы судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі і паставіла пад сумнеў... яго незалежнасьць і

законнасьць вынесенага рашэньня ... па справе аб банкруцтве ТАА “BST Ltd.” Пракурор папярэдзіў журналістку, што “ў выпадку далейшага парушэньня заканадаўства І. Макавецкая можа быць прыцягнутая да ўстаноўленай законам адказнасьці”. Зазначым, што за гэтую ж публікацыю Міністэрства інфармацыі РБ вынесла папярэджаньне рэдакцыі “БДГ” яшчэ 30 студзеня 2003 году. Міністр Уладзімір Русакевіч палічыў, што газета парушыла арт. 5 Закона аб друку, апублікаваўшы матэрыялы судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі.

***14 лютага*** ў Менску ў восьмы раз прайшла акцыя маладафронтаўцаў, прысьвечаная Дню сьвятога Валянціна. Акцыя прайшла пад лозунгам: “Мы любім Еўропу! Мы любім Беларусь!”. Першыя затрыманьні ўдзельнікаў адбыліся на плошчы Свабоды. Каля дванаццаці гадзінаў да лідэра «Маладога Фронту» Паўла Севярынца падышлі супрацоўнікі міліцыі і зацягнулі яго ў мікрааўтобус, які ўнутры быў зроблены як “аўтазак”. У аўтобусе ўжо знаходзіліся два арыштаваныя – Алесь Васілеўскі і Арцём Літвінаў. Яшчэ адзін хлопец крыкнуў “Ганьба!”, і яго тут жа затрымалі. Гэта быў Андрэй Шыбко. Потым падышоў Барыс Гарэцкі з кветкамі ў руках, і яго таксама арыштавалі. Крыху пазьней затрымалі дзяўчыну – Юлю Сіповіч. Усяго было затрымана 6 чалавек – П.Севярынец, Б.Гарэцкі, А. Васілеўскі, А.Літвінаў, А.Шыбко, Ю.Сіповіч. Іх адвезьлі ў Цэнтральны РУУС, дзе ўзялі тлумачальныя, склалі пратаколы па арт. 167 КаАП (парушэньне парадку правядзеньня масавых акцыяў) і ў 15.00 адпусьцілі.

***17 лютага*** ў Менску затрыманыя актывісты руху "Зубр" – Люба Кучынская і Аляксей Контар, якія расклейвалі ўлёткі на прасьпекце Скарыны. Супрацоўнікі міліцыі ў цывільным затрымалі іх і даставілі ў РУУС Партызанскага раёну Менску, дзе пратрымалі гадзіну і адпусьцілі без складаньня пратаколу. Распаўсюд друкаванай прадукцыі “зубраўцы” правялі таксама ў Івацэвічах, Бярозе, Баранавічах і Слоніме. Сотні ўлётак са словамі "Он должен уйти!" зьявіліся ў гэтых гарадах. Актывісты “Зубра” расклеілі іх каля крамаў, рынкаў, на чыгуначных станцыях і аўтавакзалах, у цэнтры гэтых населеных пунктаў. Таксама ўлёткі былі расклееныя ў вагонах дызельных цягнікоў, якія ходзяць з Баранавічаў на Ваўкавыск і Гародню праз Слонім.

У ***ноч з 17 на 18 лютага*** супрацоўнікі міліцыі Ленінскага РУУС г. Гародні спрабавалі патрапіць у кватэру лідэра страйкавага камітэту прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага нібыта дзеля ўручэньня яму позвы. Валерыя Леванеўскага дома ў гэты час не было.

***18 лютага*** суд Ленінскага раёну Менску прыняў рашэньне спагнаць з рэдакцыі "Народнай волі" пакрыцьцё судовых выдаткаў і аплату паслугаў адваката ТАА

"Альянс-медиа". Акрамя гэтага, газету абавязалі надрукаваць абвяржэньне артыкулу, які стаў падставай да зыску. Судзьдзя Валянціна Зянькевіч адхіліла патрабаваньне ТАА "Альянс-медиа" аб кампенсацыі маральных стратаў у памеры 50 млн. рублёў. Разгляд зыску аб абароне гонару, годнасьці, дзелавой рэпутацыі і кампенсацыі маральных стратаў ТАА "Альянс-медиа" (заснавальнік газеты "Обозреватель") да рэдакцыі газеты "Народная воля" пачаўся 16 лютага. Падставай да канфлікту стаў артыкул Антона Кузняцова "Как "Обозреватель" Сергея Атрощенко по-бандитски обошёлся с Леонидом Левиным", які зьявіўся на старонках выданьня 3 верасьня 2003 году. Аўтар артыкулу аналізаваў канфлікт паміж рэдакцыяй "Обозревателя" і старшынёй Саюзу яўрэйскіх арганізацыяў і абшчынаў Л. Левіным, які ўзьнік на падставе публікацыі артыкулу "Депутаты Костян, Новосяд и Фролов — личностные антисемиты?". Сп. Левін палічыў, што журналістка "Обозревателя" сказіла сэнс яго інтэрв’ю і падзяліўся сваім меркаваньнем з "Народнай воляй". Адзін з прадстаўнікоў "Народнай волі" ў судзе, намесьнік старшыні ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" А.Бастунец лічыць, што суд ня даў належнай ацэнкі дзеяньням рэдакцыі "Обозревателя" ў дачыненьні да Л.Левіна і неабгрунтавана палічыў ацэначныя меркаваньні журналіста "не адпаведнымі рэчаіснасьці зьвесткамі". "Рашэньне суда дае і іншыя падставы для абскарджаньня. Але канчатковую ацэнку гэтай судовай пастановы можна будзе даць пасьля атрыманьня яе матывавальнай часткі", – кажа юрыст. На думку А. Бастунца, судовае рашэньне варта абскардзіць у Менскі гарадзкі суд.

***19 лютага*** каля будынку Адміністрацыі прэзідэнта РБ затрыманая Аксана Новікава, якая раздавала чыноўнікам зварот ад грамадзянаў, што пратэстуюць супраць дзейнасьці уладаў па зносу прыватнага сектару і парушэньня жыльлёвых правоў. Пад зваротам, які раздавала Аксана Новікава, стаялі больш за 100 подпісаў грамадзянаў. Аксана Новікава была дастаўленая ў ГАМ Ленінскага раёну №1. Адносна яе быў складзены пратакол па арт.172 КоАП (распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем усталяванага парадку і ня маючых выходных дадзеных, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзянаў). Пасьля складаньня пратаколу Аксану Новікаву адпусьцілі. Ёй пагражае папярэджаньне альбо штраф да 5 базавых велічыняў.

***19 лютага*** ў пракуратуру г. Наваполацку быў выкліканы праваабаронца Зьміцер Салаўёў. Прычынай выкліку стаў ліст, што прыйшоў у пракуратуру з гарвыканкаму, у якім сьцьвярджалася, што ў горадзе дзейнічаюць структуры незарэгістраваных арганізацыяў і згадваўся Праваабарончы цэнтр “Вясна”. У якасьці

доказу быў прыкладзены мясцовы праваабарончы бюлетэнь “Наша права”. Прадстаўнікі пракуратуры патрабавалі ад Зьміцера Салаўёва тлумачэньняў. “Мне паказалі гэтую заяву з гарвыканкаму і папрасілі даць тлумачэньні, – гаворыць Зьміцер Салаўёў. – Спасылаючыся на арт. 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, я адмовіўся даваць інфармацыю, якая можа быць скарыстаная супраць мяне”.

***19 лютага*** Вышэйшы гаспадарчы суд РБ адхіліў зыск смаргонскай прадпрымальніцы Вольгі Куняўскай да Гарадзенскага аблвыканкаму. В. Куняўская спрабавала абскардзіць рашэньне аблвыканкаму па адмове ў рэгістрацыі яе прыватнага ўнітарнага прадпрыемства "Регион-пресс". Агучыўшы рашэньне, судзьдзя Людміла Калеснікава паведаміла толькі, што вынясе "прыватнае вызначэньне" на адрас Гарадзенскага аблвыканкаму за тое, што чыноўнікі не ўказалі прычыны адмовы ў рэгістрацыі "Регион-пресс", а таксама пратэрмінавалі адказ прадпрымальніцы. Разгляд справы пачаўся 13 студзеня, але пасьля гэтага суд двойчы адкладаўся. У выніку гэтую справу запатрабаваў Вышэйшы гаспадарчы суд. Нагадаем: у пачатку сакавіка 2003 году Вольга Куняўская, жонка выдаўца "Новой газеты Сморгони" Рамуальда Улана, зьвярнулася з заявай аб рэгістрацыі прыватнага ўнітарнага выдавецкага прадпрыемства "Регион-пресс" у Гарадзенскі аблвыканкам, аднак чыноўнікі адмовілі ёй без тлумачэньня прычынаў. Раней Гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці па зыску Смаргонскага райвыканкаму ануляваў рэгістрацыю індывідуальнага прадпрымальніка Р.Улана. Пасьля гэтага прадпрымальнік заявіў, што плануе аднавіць выхад "Новая газета Сморгони" праз рэгістрацыю юрыдычнай асобы, якая возьме на сябе функцыі рэдакцыі.

***19 лютага*** Вышэйшы гаспадарчы суд РБ адмовіў рэдакцыі “Белорусской деловой газеты” ў зыску да Міністэрства інфармацыі. Журналісты дамагаліся адмены папярэджаньня, вынесенага газеце 26 сьнежня 2003 году. Падставай дзеля вынясеньня папярэджаньня сталі адразу тры артыкулы журналіста Сяргея Сацука “Ушёл через окно. Серийный маньяк разрушил миф о неприступности “американки” (“БДГ” ад 24 верасьня 2003 г. №82), “Один против всех” (“БДГ” ад 1 кастрычніка 2003 г. №84) і “Покушение, которого не было” (“БДГ” ад 12 лістапада №96). Міністэрства палічыла, што ў згаданых публікацыях былі распаўсюджаныя “не адпаведныя рэчаіснасьці зьвесткі”, што зьяўляецца парушэньнем арт. 32 Закону аб друку. Вынясеньне папярэджаньня было ініцыявана Камітэтам дзяржаўнай бясьпекі, які зьвярнуўся ў Міністэрства інфармацыі і “прадаставіў яму матэрыялы”. Міністэрства інфармацыі ў гэтай сітуацыі па сутнасьці ўзяло на сябе функцыі суда, мяркуе прадстаўнік газеты ў судзе Андрэй Бастунец: паводле заканадаўства аб друку, асобы або ўстановы, чые правы закранула не адпаведная рэчаіснасьці

апублікаваная інфармацыя, павінны патрабаваць яе абвяржэньня праз зварот у рэдакцыю, а ў выпадку адмовы дамагацца гэтага праз суд. А. Бастунец таксама зьвяртае ўвагу на тое, што ўсе тры артыкулы былі напісаныя ў жанры журналісцкага расьсьледваньня. “Рэакцыя КДБ зьяўляецца паказьнікам стаўленьня дзяржаўных органаў да гэтага накірунку журналістыкі,” — лічыць юрыст. Судовае рашэньне ўступіла ў законную сілу і можа быць абскарджанае толькі ў парадку нагляду. Такім чынам, на рахунку “БДГ” зараз тры папярэджаньні, два з якіх суд пакінуў у сіле, а трэцяе (вынесенае за парушэньне арт. 5 Закону аб друку) рэдакцыя яшчэ будзе аспрэчваць.

***20 лютага*** ў судзе Ленінскага раёну г. Менску павінен быў адбыцца разгляд адміністратыўнай справы юрыста Праваабарончага цэнтру “Вясна” Уладзіміра Лабковіча. Нагадаем, што судовая пастанова аб прыцягненьні У. Лабковіча да адміністратыўнай адказнасьці была адмененая з-за адмовы судзьдзі весьці працэс на беларускай мове. Але судзьдзя Алена Церашкова са словамі “Так вы еще не освоили русского языка?” перанесла разгляд адміністратыўнай справы Уладзіміра Лабковіча на 4 сакавіка. Нагадаем пра абставіны, якія пацягнулі за сабой прыцягненньне Уладзіміра Лабковіча, прафесійнага юрыста, да адміністратыўнай адказнасьці. У кастрычніку 2003 году ў Вярхоўным судзе Рэспублікі Беларусь разглядалася грамадзянская справа аб ліквідацыі адной з найбольш уплывовых праваабарончых арганізацыяў у краіне – Праваабарончага цэнтру “Вясна”. 28 кастрычніка арганізацыя рашэньнем судзьдзі Валянціны Кулік была ліквідаваная, і сябры "Вясны" ў знак пратэсту селі проста на падлогу ў зале судовых паседжаньняў. За дадзенае “правапарушэньне” восем сяброў Праваабарончага цэнтру былі пакараныя штрафамі па арт. 166 КаАП РБ — "непадпарадкаваньне законным патрбаваньням супрацоўнікаў міліцыі", сярод іх – і юрыст Уладзімір Лабковіч. Разглядалі матэрыялы адміністратыўных правапарушэньняў праваабаронцаў судзьдзі суда Ленінскага раёну г. Менску Алена Церашкова, Аляксандр Шылько і Дзьмітры Жданок. Як вельмі часта бывае ў выпадках, калі судзяць апазіцыйных ці грамадзкіх дзеячоў, судзьдзі вялі працэс па-руску, “правапарушальнікі” гаварылі па-беларуску. Трэба адзначыць, што Праваабарончы цэнтр “Вясна” заўсёды вылучаўся сваім беларускамоўным воблікам, і нават працэс па закрыцьці арганізацыі ў Вярхоўным судзе праводзіўся па-беларуску. У адміністратыўным судзе старшыня “Вясны” Алесь Бяляцкі і юрыст Уладзімір Лабковіч запатрабавалі забясьпечыць іх перакладчыкамі. Судзьдзя Аляксандр Шылько, які вёў справу Бяляцкага, хадайніцтва задаволіў, а вось Дзмітрый Жданок, безумоўна, кваліфікаваны юрыст — законнае патрабаваньне “правапарушальніка” праігнараваў, пры гэтым у абразьлівай форме запатрабаваў, каб Лабковіч размаўляў па-руску, чым парушыў ня толькі

канстытуцыйнае права на карыстаньне роднай мовай (дзяржаўнай!), але і права на абарону. Магчыма, з-за гэтага ўпартага патрабаваньня праваабаронцы да судзьдзі выконваць закон ён і пакараньне атрымаў у два разы большае – штраф памерам 10 базавых велічыняў, у той час, як усе астатнія ўдзельнікі акцыі пратэсту – па 5 базавых велічыняў. Парушэньне судзьдзёй сваіх правоў Уладзімір Лабковіч абскардзіў у Менскім гарадзкім судзе, і пастанова аб прыцягненьні яго да адміністратыўнай адказнасьці была адмененая, а справа накіраваная на новы разгляд. У пастанове Менскага гарадзкога суда за подпісам старшыні М. Ардзякі сказана: "Пастанова падлягае адмене па наступных падставах: Згодна з арт. 247 КаАП РБ асоба, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказанасьці, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, даваць тлумачэньні, прадастаўляць доказы, заяўляць хадайніцтвы, пры разглядзе справы карыстацца юрыдычнай дапамогай адваката, выступаць на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка, калі не валодае мовай, на якой вядзецца вытворчасьць, абскарджваць пастанову па справе. У сваёй скарзе Лабковіч У. М. указвае, што судом яму было нематывавана адмоўлена ў прадастаўленьні перакладчыка. Як бачна з пратаколу судовага паседжаньня, на пытаньне судзьдзі Лабковіч У.М. патлумачыў: "Я не магу аб’ектыўна ўсё разумець, паколькі не разумею па-руску. Бытавую лексіку я разумею, а што тычыць прававых тэрмінаў, то яны мне незразумелыя". Такім чынам, судом парушанае права Лабковіча У.М. карыстацца паслугамі перакладчыка, што цягне за сабой адмену пастановы".

***20 лютага*** Пракуратура РБ выставіла афіцыйнае абвінавачаньне былому старшыні Белтэлерадыёкампаніі Ягору Рыбакову. Абвінавачаньне прад’яўленае ў адпаведнасьці з артыкулум 430 ч.3 КК РБ – атрыманьне хабару асобай, якая займае адказную пасаду. Гэтае злачынства караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін ад 7 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасьці альбо без канфіскацыі і з пазбаўленьнем права займаць пэўныя пасады альбо займацца пэўнай дзейнасьцю. Дарэчы, праз паўгоду пасьля прыходу Ягора Рыбакова сябры прафбюро Дырэкцыі персьпектыўнага вяшчаньня, якое аб’ядноўвала ўсіх творчых супрацоўнікаў БТ, накіравалі ліст у шэраг структураў з патрабаваньнем зьняць спадара Рыбакова з займаемай пасады. У выніку "службовага расьсьледваньня" з працы былі звольненыя ўсе падпісанты ліста. Ягор Рыбакоў быў земляком і стаўленікам Аляксандра Лукашэнкі і праводзіў на дзяржаўным тэлебачаньні выключна палітыку прэзідэнта.

***20 лютага*** Галоўнае гаспадарчае ўпраўленьне справамі прэзідэнта РБ адмовіла без абгрунтаваньня прычынаў у працягу дамовы арэнды Беларускаму кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў. Незалежны прафцэнтр расцэньвае гэта як палітычную

правакацыю напярэдадні прыезду ў Беларусь камісіяў МАТ і Еўрасаюзу па расьсьледваньні парушэньняў правоў працоўных і прафсаюзаў у нашай краіне.

***22 лютага*** больш за сто чалавек сталі ўздоўж прасьпекту Скарыны ў Менску ад Галоўпаштамту да Кастрычніцкай плошчы з партрэтамі зьніклых Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзьмітрыя Завадзкага, а таксама Генадзя Карпенкі. Маладыя людзі стаялі тварам да праезнай часткі з інтэрвалам 2-3 метры.

***23 лютага*** актывісты «Маладога Фронту» арганізавалі пікет каля амбасады Злучаных Штатаў Амерыкі ў Менску з мэтай прыцягнуць увагу афіцыйных асобаў ЗША да праблемы праяваў у Беларусі дзяржаўнага антысемітызму. Дзевяць актывістаў «Маладога Фронту», а таксама прэзідэнт "Сусьветнага згуртаваньня беларускіх габрэяў" Якаў Гутман трымалі плакат з надпісам: "Лукашэнка руйнуе помнікі ахвярам Халакосту. Прэзідэнт Буш, дапамажыце захаваць гістарычную спадчыну габрэйскага, беларускага і амерыканскага народаў!". Маладафронтаўцы падрыхтавалі таксама зварот да прэзідэнта Злучаных Штатаў Джорджа Буша, які быў перададзены ў амбасаду ЗША. У звароце маладафронтаўцы зьвяртаюць увагу прэзідэнта ЗША на тое, што прапаганда ксенафобіі і руйнаваньне габрэйскіх помнікаў сталі ў Беларусі цягам апошніх 10 гадоў звычайнай практыкай. Яны просяць Джорджа Буша зрабіць усё магчымае, каб беларускія ўлады спынілі акты дзяржаўнага антысемітызму. Акцыя працягвалася некалькі хвілінаў, пасьля чаго да яе ўдзельнікаў падышлі міліцыянты і заявілі, што ўсе яны затрыманыя за правядзеньне несанкцыянаванага пікету.

***23 лютага*** Тобіяс Люнгваль атрымаў у беларускай амбасадзе ў Стакгольме ўязную беларускую візу, а 24 лютага праз Вену накіраваўся ў Менск. Пра тое, што адбылося ў міжнародным аэрапорце "Менск-2", швецкі журналіст распавёў: "Падчас праверкі майго пашпарту ўзьнікла тое, што называюць кампутарнымі праблемамі. Памежнік глядзіць на кампутар, потым у нейкія паперы, выклікае начальніка зьмены. Паказвае яму на экран і нешта шэпча. Начальнік зьмены ўзяў мой пашпарт, некуды пайшоў. Я даволі доўга чакаў, пакуль ён вернецца. Ён вярнуўся і паведаміў, што мне забаронены ўезд у Беларусь, і што я мушу гэтым жа самалётам вярнуцца ў Вену. Я спытаўся, на якой падставе мне забаранілі патрапіць у Беларусь. Яны гэтага мне не змаглі растлумачыць альбо не захацелі". Супрацоўнік прэс-цэнтру Дзяржаўнага камітэту памежных войскаў Беларусі Уладзімір Несьцяровіч растлумачыў, што згодна з міжнароднай практыкай, краіна, якая забараніла ўезд камусьці на сваю тэрыторыю, можа не тлумачыць матывы такога рашэньня. Тобіяс Люнгваль – добры знаўца беларускіх справаў. У 2003 годзе ў Швецыі накладам 3000 асобнікаў выйшла ягоная кніга, прысьвечаная Беларусі. У ёй ёсьць і асабістыя

назіраньні (аўтар 18 разоў прыязджаў у Беларусь), і шматлікія інтэрв’ю, і разважаньні. Калі ў Белаазёрску напрыканцы кастрычніка і пачатку лістапада 2003 году праходзілі паўторныя выбары ў мясцовы Савет, спадар Люнгваль, які да таго ж зьяўляецца сябрам міжнароднай рады лібэральнай партыі Швецыі, прыехаў сюды як назіральнік. Ён быў гатовы адказаць на любыя пытаньні беларускіх судзьдзяў у Белаазёрску, аднак зрабіць гэта яму не дазволілі. Тобіяс Люнгваль быў запрошаны ў якасьці сьведкі на судовы працэс у Белаазёрску, зьвязаны з давыбарамі ў гарадзкі Савет. Суд мусіў пачацца 25 лютага, а спадар Люнгваль ня быў дапушчаны на тэрыторыю Беларусі 24 лютага.

***23 лютага*** бел-чырвона-белы штандар быў вывешаны актывістамі руху “Зубр” у мікраёне Сухарава ў Менску. Сьцяг быў замацаваны на дроце над вуліцай на вышыні дванаццаціпавярховага дому. Палотнішчы, вывешаныя “зуброўцамі” такім чынам раней, улады не маглі зьняць на працягу некалькіх сутак і нават тыдняў.

***23 лютага*** Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 111 "Аб удасканаленьні кадравага забесьпячэньня ідэалагічнай работы ў Рэспубліцы Беларусь". Згодна Указу, персанальную адказнасьць за стан ідэалагічнай работы ў калектывах будуць несьці кіраўнікі арганізацыяў.

***24 лютага*** ў Віцебску за несанкцыянаванае пікетаваньне затрымалі сяброў КХП БНФ Уладзіміра Плешчанку і Аляксандра Салаўяна. Яны былі затрыманыя за плакаты, з якімі выйшлі да кіраўніцтва мясцовай "вертыкалі". Спадар Плешчанка трымаў у руках абвестку “Збор подпісаў супраць саюзнае дамовы, незаконна падпісанай Аляксандрам Лукашэнкам”, а Аляксандр Салаўян – плакат “Сходзіў на выбары – падтрымаў існуючы рэжым”. Прачытаўшы гэтыя словы, патрульныя міліцыянты спачатку перапісалі іх на паперку ды на колькі хвілінаў ад’ехалі. Вярнуўшыся, як лічыць спадар Плешчанка, пасьля кансультацыі з начальствам, яны загадалі абодвум апазіцыянерам ехаць з імі ў пастарунак. Спадара Хамайду, які стаяў побач ды распаўсюджваў “БДГ”, міліцыянты хацелі забраць таксама, аднак нехта з іх запярэчыў: маўляў, колькі разоў яго ўжо затрымлівалі, а потым даводзілася выпускаць нават не складаючы пратаколу, бо распаўсюд газетаў не зьяўляецца адміністратыўным правапарушэньнем. Уладзіміра Плешчанку і Аляксандра Салаўяна завезьлі ў Чыгуначны райаддзел міліцыі ды склалі пратакол за несанкцыянаванае пікетаваньне.

***24 лютага*** Зьміцеру Салаўёву патэлефанаваў маёр Кудзінаў і выклікаў у апорны пункт міліцыі. У міліцыі З.Салаўёву паказалі заяву з гарвыканкаму, у якой патрабавалася прыцягнуць праваабаронцу да адміністратыўнай адказнасьці ў сувязі

з тым, што ў горадзе дзейнічаюць незаконныя структуры ліквідаванага Праваабарончага цэнтру “Вясна”. Як доказ да заявы зноў была прышпіленая копія праваабарончага бюлетэню “Наша права” з рэкламай: “У выпадку парушэньня вашых правоў зьвяртайцеся па бясплатную дапамогу да праваабаронцы З.Салаўёва”. Зьміцер Салаўёў адмовіўся ад усялякіх каментароў, спаслаўшыся на арт. 27 Канстытуцыі РБ .

***24 лютага*** ў Менску па ініцыятыве амбасадара Германіі Хельмута Фрыка і ў супрацоўніцтве з дабрачынным фондам “Дзецям Чарнобыля” адбылася дыскусія па чарнобыльскай тэматыцы. На ёй, у прыватнасьці, абмяркоўвалася праграма CORE (”Супрацоўніцтва дзеля рэабілітацыі”), якая будзе ажыцьцяўляцца з удзелам ААН, Еўрасаюзу і беларускіх уладаў. Першы этап праграмы пачынаецца ў чатырох беларускіх раёнах – Брагінскім, Чачэрскім, Столінскім і Слаўгарадзкім. Прадстаўнікі ААН і краінаў Еўрасаюзу выказаліся ў часе дыскусіі за далучэньне да гэтай праграмы як мага большай колькасьці няўрадавых арганізацыяў. Аднак, як заявіў старшыня дабрачыннага фонду “Дзецям Чарнобыля” Генадзь Грушавы, “дзяржава ў нас пабудаваная такім чынам, што дыялогу, узаемадзеяньня ці рэальнага ўдзелу ў абмеркаваньні рашэньняў грамадзкасьць прыняць ня можа. У гэтай сувязі праграма CORE можа аказацца цалкам падмятай пад стандарты адміністраваньня, і добрая ідэя не прывядзе да пазітыўнага выніку. Дзяржаўныя структуры пакуль яшчэ не гатовыя да рэальнага партнёрства з грамадзянскай супольнасьцю. А ў пытаньні Чарнобыля такое партнёрства зьяўляецца галоўнай умовай рэалізацыі такіх выдатных праграмаў, як CORE". Па словах Г.Грушавога, праграма больш дэкларуе ўдзел мясцовага насельніцтва і грамадзкіх арганізацыяў, чым рэальна яго гарантуе. У структурах, якія ствараюцца ў рамках праграмы CORE, нават намінальна не прысутнічае хоць бы адна беларуская грамадзкая арганізацыя. Мясцовыя і рэспубліканскія ўлады манапольна будуць вызначаць накірунак працы. Улады не імкнуцца да супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасьцю і, больш за тое, пасьпешліва спрабуюць стварыць псеўдаграмадзкія арганізацыі, імкнуцца схаваць інфармацыю. Напрыклад, галоўны ўрач адной з менскіх паліклінікаў забараніў сваім урачам пад пагрозай звальненьня ўдзельнічаць у чарнобыльскай дыскусіі, ініцыяванай амбасадарам Германіі.

***24 лютага*** Міністэрства інфармацыі зьвярнулася да БелТА з просьбай патлумачыць новы парадак і ўмовы публікацыі ў СМІ праграмаў тэлеперадачаў. Пра гэта паведаміў намесьнік міністра Сяргей Булацкі ў афіцыйным адказе на запыт ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ) адносна сітуацыі з распаўсюдам праграмы перадачаў беларускіх тэлеканалаў. "На гэты момант адказу па згаданым

пытаньні ў наш адрас не паступіла", — гаворыцца ў лісьце намесьніка міністра. Нагадаем: 23 студзеня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" накіравала ў Пракуратуру РБ, Міністэрства эканомікі і Міністэрства інфармацыі афіцыйныя запыты з просьбай праясніць сітуацыю з распаўсюдам праграмы перадач беларускіх тэлеканалаў і паведаміць, якія захады гэтыя структуры будуць рабіць, каб не дапусьціць парушэньня беларускага антыманапольнага заканадаўства і заканадаўства ў галіне коштаўтварэньня. 10 лютага БАЖ атрымаў ліст з Пракуратуры, у якім паведамлялася, што зварот арганізацыі перанакіраваны ў Дэпартамент антыманапольнай і цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі РБ. Адказу ад гэтай структуры не паступіла. Цяпер за адзін і той жа "асноўны пакет тэлепраграмаў" БелТА выстаўляе розным рэдакцыям розныя кошты, якія вагаюцца ад 100 тысячаў да больш як 5 мільёнаў рублёў.

***24 лютага*** Міжнародная Ліга Правоў Чалавека зьвярнулася да Аляксандра Лукашэнкі з адкрытым лістом, у якім выказала занепакоенасьць сітуацыяй вакол недзяржаўнай газеты "БДГ". У прыватнасьці, нядаўнім рашэньнем Вышэйшага гаспадарчага суда, які пакінуў у сіле папярэджаньне выданьню. "Гэта чарговая атака на газету, якой ужо вынесеныя некалькі папярэджаньняў", – гаворыцца ў звароце Лігі. Арганізацыя заклікае А. Лукашэнку спыніць уціск незалежных СМІ і забясьпечыць журналістам магчымасьць свабодна працаваць.

***24 лютага*** стала вядома, што Галандзкае аддзяленьне Міжнароднай Амністыі сабрала больш за 250 тысячаў подпісаў у падтрымку праваабаронцаў. Пачынаючы з 10 сьнежня 2003 году, Дня Сусьветнай Дэкларацыі Правоў Чалавека, Галандзкае аддзяленьне Міжнароднай Амністыі зьбірала подпісы ў абарону праваабаронцаў ва ўсім сьвеце – мужчынаў і жанчын, якія паасобку альбо разам з іншымі прапагандуюць і абараняюць сусьветна прызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды. У многіх краінах яны шмат чым рызыкуюць у сваёй дзейнасьці. Адной з такіх краінаў была Беларусь. 24 лютага, у 11.30 раніцы, дэлегацыя Міжнароднай Амністыі прыехала ў Беларускую амбасаду. Скрыня стаяла на тратуары перад амбасадай. Прадстаўнік амбасады, які адчыніў дзьверы, адмовіўся прымаць якія-небудзь петыцыі. Ён патлумачыў, што факты пра Беларусь, узгаданыя Амністыяй у сваіх публікацыях, не адпавядаюць сапраўднасьці. Таму амбасада ня бачыць ніякай прычыны, чаму яны мусяць прыняць подпісы. Ён таксама заявіў, што пытаньні правоў чалавека зьяўляюцца “унутранай справай” краіны. У адказ на пытаньне, ці магчыма абмеркаваць пытаньні праваабаронцаў у Беларусі, што выклікаюць занепакоенасьць Міжнароднай Амністыі, у бліжэйшай будучыні, ён сказаў што не ўпаўнаважаны даваць каментары па гэтым пытаньні.

***24 лютага*** ўпраўленьне Дэпартаменту фінансавых расьсьледваньняў Камітэту дзяржаўнага контролю працягнула расьсьледваньне нібыта нявыплаты падаткаў Беларускім Хельсінкскім камітэтам. Старэйшы інсьпектар упраўленьня А. Курто выклікаў да сябе позвамі старшыню БХК Тацяну Процьку і бухгалтара Тацяну Руткевіч на гутарку.

***25 лютага*** ў Берасьці пад пагрозай ліквідацыі апынулася арганізацыя Свабоднага прафсаюзу Беларускага, што дзейнічае ў мясцовым дзяржаўным універсітэце. Ініцыятыва ліквідаваць суполку Свабоднага прафсаюзу ва ўніверсітэце належыць мясцовай падатковай інсьпекцыі. Гэтая ўстанова некалькі месяцаў правярала прафсаюзную арганізацыю. Ніякіх фінансавых парушэньняў падаткоўцы не знайшлі, і фармальнай падставай дзеля ліквідацыі была прызнаная адсутнасьць сталага юрыдычнага адрасу. Яшчэ два гады таму кіраўніцтва ўніверсітэту пазбавіла суполку Свабоднага прафсаюзу магчымасьці весьці сваю дзейнасьць на тэрыторыі навучальнай установы. Увесь гэты час прафсаюзная арганізацыя была зарэгістраваная ў будынку, які належыць незалежнай газеце "Брестский курьер". Аднак зараз і ў падатковай інсьпекцыі, і ў раённай адміністрацыі лічаць такую рэгістрацыю несапраўднай і абавязваюць прайсьці яе зноў. Кіраўнік прафсаюзнай суполкі Валянцін Лазарэнкаў лічыць, што дзеля гэтага няма ніякіх праваых падставаў. Сёлета ўніверсітэцкая прафсаюзная суполка адзначыць дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня. Нягледзячы на ціск з боку адміністрацыі навучальнай установы, сябрамі Свабоднага прафсаюзу застаюцца 50 выкладчыкаў універсітэту.

***26 лютага*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" атрымала адказ з Міністэрства эканомікі на свой запыт датычна новага парадку публікацыі ў СМІ праграмы тэлеперадачаў. "У выпадку прымяненьня УП "БелТА" да розных рэдакцыяў няроўнага падыходу Міністэрства эканомікі разгледзіць матываваны зварот любога суб’екта гаспадараньня аб парушэньні яго законных правоў", — гаворыцца ў лісьце намесьніка міністра Уладзіміра Адашкевіча. Міністэрства нагадвае, што суб’екты гаспадараньня "маюць права прадастаўляць пакупніку скідкі з адпускнога кошту", распрацоўваючы і зацьвярджаючы іх самастойна. Тым ня менш, "ужываныя скідкі павінны быць адзінымі для ўсіх пакупнікоў незалежна ад формаў уласнасьці". У. Адашкевіч таксама спасылаецца на Закон "Аб супрацьдзеяньні манапалістычнай дзейнасьці і разьвіцьці канкурэнцыі", які не дапускае дзеяньняў, накіраваных на абмежаваньне канкурэнцыі шляхам парушэньня правоў іншых суб’ектаў гаспадараньня на свабодную канкурэнцыю.

***26 лютага*** Генеральная пракуратура РБ адмяніла пастанову аб прыпыненьні крымінальнай справы ў адносінах да намесьніцы рэдактара "Белорусской деловой

газеты" Ірыны Халіп за публікацыю паўтары гады таму ў дадатку “БДГ. Для служебного пользования” артыкулу "Афганские борзые". У артыкуле І. Халіп распавядала пра абставіны крымінальнай справы былога прэзідэнта канцэрну “Белдзяржхарчпрам” Віктара Казекі і ягонага сына – былога начальніка аддзелу збыту аб’яднаньня "Крышталь" Андрэя Казекі, якіх асудзілі за хабарніцтва і раскраданьне дзяржаўнай маёмасьці. І.Халіп абвінавачваюць у паклёпе на Генеральнага пракурора Віктара Шэймана. Справу І. Халіп вядзе сьледчы па важнейшых справах пракуратуры г.Менску Віктар Фешчанка. Пастанова аб прыпыненьні крымінальнай справы ў адносінах да Ірыны Халіп, якая была ўзбуджаная па арт. 188 ч.2 КК РБ (паклёп, які ўтрымліваецца ў публічным выступе альбо ў дукаваным ці публічна дэманстраваным творы, альбо ў сродках масавай інфармацыі, альбо спалучаны з абвінавачаньнем ва ўчыненьні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства) была адмененая ў 2003 годзе. Па версіі І. Халіп, пракуратура вырашыла дачакацца вынясеньня прысуду па справе герояў яе матэрыялу. І вось праз больш чым паўгады пасьля вынясеньня прысудаў Віктару і Андрэю Казекам Генеральная пракуратура ўзнавіла вытворчасьць па справе І.Халіп і накіравала яе на дасьледваньне ў пракуратуру г.Менску. Па інфармацыі журналісткі, гэтую справу гарадзкая пракуратура намераная давесьці да суда. Намесьніку рэдактара “БДГ” пагражаюць выпраўленчыя працы на тэрмін да двух гадоў, арышт на тэрмін да шасьці месяцаў, абмежаваньне волі на тэрмін да трох гадоў, пазбаўленьне волі на тэрмін да двух гадоў. 26 лютага журналістку дапыталі. Ірына Халіп пракаментавала аднаўленьне яе крымінальнай справы наступным чынам: ”Існуе некалькі версіяў таго, што адбылося. Гэта можа быць асабістая помста з боку пракурорскіх супрацоўнікаў. Мне ж удалося здабыць доказы таго, што Генеральны пракурор Віктар Шэйман – “дах” для крымінальнага лікёра-гарэлачнага бізнэсу. Магчыма, гэта помста за мае артыкулы ў расійскай "Новой газете". Паколькі ў беларускіх пракурораў няма рычагоў узьдзеяньня на расійскую прэсу, яны вырашылі націснуць на мяне, выкарыстоўваючы артыкул у “БДГ” паўтарагадовай даўніны”.

***26 лютага*** адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху, старшыня РГА "Персьпектыва" Анатоль Шумчанка быў выкліканы ў РУУС Першамайскага раёну г.Менску дзеля “прыватнай гутаркі”.

***28 лютага*** міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў, выступаючы на адкрыцьці Рэспубліканскага студэнцкага форуму ў Менску, заявіў, што "ідэалогія – абавязковы элемент функцыянаваньня дзяржавы, а таму ўдзяляць ёй увагу неабходна ўсім". У ВНУ за ідэалагічнай работай павінны сачыць рэктары і дэканы.

## САКАВІК

***1 сакавіка*** Зьміцер Салаўёў, які зьяўляўся прадстаўніком Праваабарончага цэнтру “Вясна” у г. Наваполацку, быў выкліканы позвай у пракуратуру гораду, дзе яму паведамілі, што ў выпадку “ажыцьцяўленьня дзейнасьці ад імя незарэгістраванага грамадзкага аб’яднаньня “Праваабарончы цэнтр “Вясна” і ў выпадку ўчыненьня якіх-небудзь дзеяньняў ад імя названай арганізацыі ён можа быць прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасьці па арт. 167.10 КаАП РБ”. Дзьмітрыю Салаўёву паведамілі, што пракуратура атрымала інфармацыю з Наваполацкага гарвыканкаму і ўпраўленьня юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму, што ў сьнежні 2003 году-студзені 2004 распаўсюджвалася друкаванае выданьне, у якім утрымлівалася інфармацыя аб працягу дзейнасьці ГА “Праваабарончы цэнтр “Вясна” і друкаваліся матэрыялы ад імя гэтай структуры. У паведамленьні, падпісаным старшынёй Наваполацкага гарывыканкаму Уладзімірам Камаровым, сказана, што “выкладзеныя вышэй абставіны ўказаваюць пра намер ажыцьцяўляць дзейнасьць ад Праваабрончага цэнтру “Вясна”, які не зарэгістраваны ў адпаведным парадку”. Дзьмітрый Салаўёў лічыць дадзенае рашэньне пракуратуры цалкам незаконным, паколькі ён выступаў у згаданым “друкаваным выданьні” (бюлетэні) ў якасьці асобы, а не прадстаўніка арганізацыі. Дз. Салаўёў успрымае ціск на яго з боку пракуратуры і гарывканкаму як спробу запалохаць і жаданьне спыніць ягоную праваабарончую дзейнасьць. “Усе гэтыя падзеі знаходзяцца ў адным шэрагу з іншымі выпадкамі ціску на праваабаронцаў у нашай краіне”, — пракаментаваў ён гэтую падзею.

***1 сакавіка*** суд Першамайскага раёну г. Менску пачаў разгляд зыску Беларускага Хельсінкскага камітэту і Тацяны Процькі да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. На першым нацыянальным тэлеканале (БТ) 2 лістапада 2003 году ў праграме “В центре внимания” быў паказаны негатыўны сюжэт пра БХК, Тацяну Процьку і іншых праваабаронцаў. Рада БХК зьвярнулася да кіраўніцтва НДТРК з прапановай прынесьці прабачэньні і абвергнуць несапраўдныя зьвесткі, якія ганьбяць дзелавую рэпутацыю БХК, гонар і годнасьць ягонага кіраўніка – Тацяны Процькі. Аднак кіраўніцтва БТ адмовілася, і БХК быў вымушаны зьвярнуцца ў суд. Адказчыкам па справе прызнаная Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, вядучы тэлепраграмы Сяргей Хамянтоўскі і аўтар тэксту Юры Пракопаў. БХК заяўляе таксама пра працяг кампаніі па дыскрэдытацыі праваабаронцаў, пра што сьведчыць выхад у эфір 29 лютага 2004 году чарговай праграмы “В центре внимания”, у якой БХК абвінавацілі ў нявыплаце падаткаў, указалі непраўдзівыя зьвесткі пра даходы супрацоўнікаў БХК і маёмасьці Тацяны Процькі.

***2 сакавіка*** Магілёўскі гарвыканкам адмовіў у правядзеньні сацыяльнага мітынгу “з-за адсутнасьці поўных зьвестак аб арганізатарах, прадугледжаных арт.5 Закону РБ “Аб сходах, вулічных шэсьцях, дэманстрацыях і пікетаваньнях”. Заяўлены на 6 сакавіка мітынг меўся адбыцца ў знак пратэсту супраць росту цэнаў на камунальныя паслугі, зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва, беспрацоўя, скарачэньня працоўных месцаў, пагаршэньня прававога стану прадпрымальнікаў. Арганізатары мітынгу – Сяргей Фамін (Свабодны прафсаюз Беларускі), Уладзімір Шанцаў (Аб’яднаная грамадзянская партыя), Рыгор Костусеў (Партыя БНФ) – кажуць пра нахабнае парушэньне канстытуцыйнага права і запэўніваюць, што мітынг усё адно адбудзецца.

***2 сакавіка*** ў Баранавічах адбылася падзея, што стала сенсацыяй, якая абляцела ўсю Беларусь: сябры суполкі БРСМ (прапрэзідэнцкага Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі) з мясцовага каледжу лёгкай прамысловасьці ў поўным складзе, на чале са сваім кіраўніком Мікітам Сасімам, уступілі (перайшлі) ў апазіцыйны моладзевы рух супраціву "Зубр". Рэакцыя ўладаў на гэта была хуткаю. Адразу пачаліся спробы зьмяніць сітуацыю, запалохаць новых "зуброўцаў" і рэпрэсіі супраць іх.

***2 сакавіка*** папярэджаньне ад упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму атрымала менскае гарадзкое грамадзкае аб’яднаньне “Дыярыюш”, якое займаецца культурна-адукацыйнай дзейнасьцю ў беларускай сталіцы. Прычынай папярэджаньня стала сяброўства іншагародняга прадстаўніка ў арганізацыі. Як паведаміла старшыня арганізацыі Ларыса Андросік, у склад “Дыярыюша” сапраўды ўваходзіў жыхар Астрашыцкага гарадка. Аднак сябрам арганізацыі ён быў даўно, і падчас перарагістрацыі ў юрыстаў з гэтай нагоды прэтэнзіяў не было. Нядаўна гэты чалавек зьехаў з Менску, і на перавыбарчым сходзе быў выключаны з сяброў арганізацыі. А літаральна праз пару дзён з упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму паступіла папярэджаньне. Па словах Л. Андросік, яна проста не пасьпела прынесьці выпіску з пратаколу сходу ў адпаведную інстанцыю. Старшыня арганізацыі выказала надзею, што пасьля яе звароту ва ўпраўленьне юстыцыі папярэджаньне будзе скасаванае.

***2 сакавіка*** з нагоды 62-ой гадавіны зьнішчэньня ў менскім гета 5 тысячаў габрэяў ля мемарыялу “Яма” адбыўся жалобны мітынг, у якім узялі ўдзел каля пяцідзесяці чалавек. Сярод іх — вязьні менскага гета, габрэі, якія перажылі Халакост, і тыя, хто нарадзіліся пасьля другой сусьветнай вайны. Аўтар мемарыялу “Яма”

архітэктар Леанід Левін кажа, што 2 сакавіка — гэта сьвяты дзень: “Гэты дзень стаў сьвятым днём, я мяркую, ня толькі для габрэяў, але і для ўсіх жыхароў Менску, таму што мы жылі ўсе ў адным горадзе. Гэта ня значыць, што толькі 5 тысячаў чалавек было зьнішчана. У менскім гета забілі каля 100 тысячаў габрэяў. А калі сюды дадаць яшчэ 50 тысячаў габрэяў, якіх прывезьлі з Еўропы… А калі сказаць пра ўсіх габрэяў, якія былі зьнішчаныя на Беларусі ў гады вайны, то гэта 800 тысячаў чалавек”. Ушанаваць памяць забітых у менскім гета габрэяў прыйшлі кіраўнікі дыпламатычных місіяў ЗША, краінаў Эўрасаюзу, Літвы і Латвіі. Сярод выступоўцаў на жалобным мітынгу ў мемарыяле “Яма” не было ніводнага прадстаўніка афіцыйных уладаў Беларусі.

***2 сакавіка*** суд Першамайскага раёну г.Менску вынес рашэньне аб спыненьні адміністратыўнай справы адносна Анатоля Шумчанкі – старшыні Рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня “Персьпектыва”, у сувязі з адсутнасьцю складу правапарушэньня. Нагадаем, што справа Анатоля Шумчанкі разглядалася па арт 167-1 ч.2 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў) за арганізацыю несанкцыянаванага сходу, які быццам бы адбыўся 24 лютага на рынку “Уручча-3”. У якасьці адваката ў працэсе ўдзельнічаў Аляксандр Галіеў.

***2 сакавіка*** стала вядома, што мясцовыя ўлады ў Берасьцейскай і Гарадзенскай абласьцях пачалі зьбіраць зьвесткі пра распаўсюднікаў рэгіянальных газетаў. Некалькі недзяржаўных выданьняў атрымалі з райвыканкамаў запыты "аб прадастаўленьні зьвестак" пра юрыдычных асобаў і прыватных прадпрымальнікаў, якія займаюцца распаўсюдам друкаваных выданьняў, іхнія адрасы і рэквізіты дакументаў, якія дазваляюць ажыцьцяўляць гандаль друкаванай прадукцыяй. У канцы лютага гэткія запыты атрымалі галоўны рэдактар газетаў "Ляхавіцкі час" і "Intex-press" з Баранавічаў Уладзімір Янукевіч і галоўны рэдактар "Местной газеты" (Ваўкавыск) Андрэй Шантаровіч. Ляхавіцкі і Ваўкавыскі райвыканкамы кіраваліся загадамі з аблвыканкамаў, якія прадпісвалі сабраць гэтыя зьвесткі да 1 сакавіка. У лістах таксама ўтрымлівалася спасылка на прэзідэнцкі Указ №516 ад 24 верасьня 2001 г., паводле якога "на Міністэрства інфармацыі РБ ускладзенае дзяржаўнае рэгуляваньне ў галіне перадачы і распаўсюду інфармацыі". Намесьнік старшыні Ляхавіцкага райвыканкаму Мікалай Куліцкі запэўніў, што запыт тычыцца ня толькі недзяржаўных, але і дзяржаўных выданьняў (у прыватнасьці, газеты "Ляхавіцкі весьнік"). Сітуацыю каментуе юрыст ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Ірына Карамышава: "Па-першае, у адпаведнасьці з артыкулум 13 Канстытуцыі РБ, дзяржава гарантуе свабоднае ажыцьцяўленьне прадпрымальніцкай дзейнасьці, якая не супярэчыць закону. Па-другое, паводле арт. 58 Канстытуцыі, ніхто ня можа

быць змушаны да выкананьня абавязкаў, не прадугледжаных Законам. Паводле прэзідэнцкага Указу №516 і Палажэння аб Мінінфармацыі, на яго сапраўды ўскладзеная функцыя рэгуляваньня ў галіне перадачы і распаўсюду інфармацыі. Аднак гэтая функцыя не абазначае татальнага кантролю за суб'ектамі гаспадараньня, якія распаўсюджваюць перыёдыку. Гэтаксама не ўскладзена такая функцыя і на мясцовыя органы ўлады. Да таго ж, у лістах, якія прыйшлі ў рэдакцыі газетаў, ніяк не тлумачыцца неабходнасьць атрыманьня такой інфармацыі".

***3 сакавіка*** ў Баранавічах у каледжы лёгкай прамысловасьці падчас паседжаньня суполкі праўрадавага Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі быў зьмешчаны са сваёй пасады старшыня Мікіта Сасім, па ініцыятыве якога суполка далучылася да апазіцыйнага руху "Зубр". На паседжаньні не было кворуму для прыняцьця рашэньня, але прысутнічалі першы сакратар суполкі БРСМ Берасьцейскай вобласьці, а таксама сакратар гарадзкой суполкі БРСМ г. Баранавічы. Па словах Мікіты Сасіма, на паседжаньне прыйшло менш за 40 чалавек пры неабходнай колькасьці 60. Мікіта Сасім палічыў сход неправамоцным і пакінуў яго.

***3 сакавіка*** гарадзенскі прадпрымальнік Дзьмітрый Іваноўскі абвясьціў галадоўку. Дзьмітрыю Іваноўскаму прысудзілі 10 сутак арышту за арганізацыю "мітынгу маўчаньня" прадпрымальнікаў, які адбыўся 1 сакавіка побач з аблвыканкамам. Каля 500 прадпрымальнікаў моўчкі пратэставалі супраць пагаршэньня ўмоваў працы. Дзьмітрыя Іваноўскага сярод іх не было. Напярэдадні акцыі яго затрымалі з улёткамі, у якіх прадпрымальнікаў запрашалі прыйсьці на "мітынг маўчаньня". За ўлёткі спадара Іваноўскага пакаралі штрафам у адну базавую велічыню ў Кастрычніцкім раённым судзе гораду. А пасьля мітынгу запрасілі ў Ленінскі раённы аддзел міліцыі, каб абвінаваціць у арганізацыі акцыі, на якой сам ён наогул не прысутнічаў. 3 сакавіка судзьдзя Ленінскага суда Наталя Козел палічыла, што ён быў арганізатарам "мітынгу маўчаньня" і пакарала яго дзесяцьцю суткамі арышту. У судовай зале спадар Іваноўскі заявіў, што абвяшчае галадоўку.

***3 сакавіка*** абнародаваны дакумент, які рэкамендуе мясцовым уладам узмацніць кантроль за дзейнасьцю рэлігійных арганізацыяў. Дакумент падпісаны намесьнікам старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Савеце Міністраў РБ Уладзімірам Ламекам. У кожным рэгіёне Беларусі дзейнасьць рэлігійных арганізацыяў у дадзены момант курыруецца ня толькі самастойнымі сьпецыялістамі, але і шэрагам камісіяў, якія прызваныя сачыць за выкананьнем закону пра рэлігіі. Уладзімір Ламека падкрэсьліў, што дадзеныя камісіі абавязаныя актывізаваць працу, якая садзейнічае ўрэгуляваньню рэлігійнай сітуацыі ў краіне.Камісіі павінны больш уважліва кантраляваць дзейнасьць абшчынаў розных

канфесіяў, асабліва пратэстанцкіх і каталіцкіх прыходаў, што прадугледжвае рэгулярнае наведваньне службаў і сустрэчаў з кіраўніцтвам рэлігійных арганізацыяў. У абавязкі мясцовай адміністрацыі ўваходзіць таксама праверка дзейнасьці незарэгістраваных рэлігійных арганізацыяў: у дадзеных выпадках камісіі маюць права забараніць правядзеньне набажэнстваў, адукацыйную працу і г.д. Па меркаваньні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў, камісіі абавязаныя ўдзяляць асаблівую ўвагу выкарыстаньню замежных моваў падчас набажэнстваў: перавага павінна аддавацца беларускай і рускай мовам.

***4 сакавіка*** суд Ленінскага раёну г. Менску прыняў рашэньне спагнаць з газеты "Народная воля" 15 мільёнаў рублёў на карысьць прадпрымальніка Сяргея Атрошчанкі ў якасьці кампенсацыі маральных стратаў. Судзьдзя Вера Тупік абавязала рэдакцыю на працягу двух тыдняў пасьля ўступленьня рашэньня ў законную сілу апублікаваць абвяржэньне зьвестак, распаўсюджаных у артыкуле "Какому бизнесу в Беларуси хорошо?", спагнаць з адказьнікаў 165 тысячаў рублёў на пакрыцьцё судовых выдаткаў і 700 тысячаў рублёў на аплату паслугаў адваката зыскоўцы. "Народная воля" зьбіраецца абскарджваць судовае рашэньне ў Менскім гарадзкім судзе.

***4 сакавіка*** стала вядома, што дэпутатку Белаазёрскага гарсавету Наталю Акаронка спрабуюць зрабіць вінаватай у гісторыі, калі быў моцна зьбіты яе муж – кіраўнік гарадзкой арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада). Нагадаем, што два месяцы таму ў Белаазёрску быў зьдзейсьнены напад на кіраўніка мясцовай філіі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Яўгена Акаронка і ягоную жонку Наталю, якая зьяўляецца дэпутатам гарадзкога Савету. Асабліва цяжкія пашкоджаньні тады атрымаў спадар Акаронка, які патрапіў шпіталь. Паводле гэтага здарэньня мясцовай пракуратурай распачатая крымінальная справа. Адначасова белаазёрская міліцыя высьвятляе іншыя падрабязнасьці бойкі. З папярэдніх высноваў вынікае, што сярод тых, каго могуць прыцягнуць да адказнасьці, і Наталя Акаронка, якая таксама пацярпела ад нападу і была ініцыятарам міліцэйскага разьбіральніцтва. Сёлета гэта ўжо ня першая непрыемнасьць для Наталі. У студзені дэпутатку Белаазёрскага гарадзкога Савету пазбавілі працы ў мясцовай школе. Падставай для звальненьня названы ўдзел у сесіі гарсавету, якую ініцыявалі апазіцыйныя дэпутаты. Прадстаўнікі ўлады тую сесію ў лістападзе 2003 году байкатавалі і дачакаліся паўторных выбараў, пасьля якіх апазіцыя пазбавілася большасьці ў мясцовым Савеце.

***4 сакавіка*** стала вядома, што лідэр “Сусьветнага згуртаваньня беларускіх габрэяў” Якаў Гутман зьязджае на сталае жыхарства ў ЗША ў знак пратэсту супраць

палітыкі дзяржаўнага антысемітызму, якую праводзяць цяперашнія ўлады Беларусі. Якаў Гутман заявіў, што застаецца грамадзянінам Беларусі, але будзе мець сталае жыхарства ў Нью-Ёрку да тае пары, пакуль ня зьменіцца цяперашняе палітычнае кіраўніцтва краіны. Паводле словаў спадара Гутмана, у Нью-Ёрку стала дзейнічае беларуская габрэйская суполка, праз якую ён намерваецца зьвяртацца да ўраду ЗША з просьбай абараніць спадчыну свайго народу ў Беларусі. Нагадаем, што Якаў Гутман – адзін з нямногіх, хто актыўна выступаў супраць разбурэньня будынку былой менскай сінагогі, габрэйскіх могілак у шмат якіх гарадах Беларусі, пратэставаў супраць выданьня антысеміцкай літаратуры. Спадар Гутман кажа, што звыклай зьявай апошніх гадоў становіцца неабходнасьць для людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй пакідаць Беларусь.

***4 сакавіка*** ў судзе Ленінскага раёну г. Менску адбыўся новы разгляд адміністратыўнай справы юрыста Праваабарончага цэнтру “Вясна” Уладзіміра Лабковіча. Судзьдзя Алена Церашкова вынесла рашэньне — штраф у памеры 10 базавых адзінак.

***5 сакавіка*** Гарадзенскі гарвыканкам адмовіў у рэгістрацыі Фонда рэгіянальнага разьвіцьця "Ратуша". Яго мелі намер стварыць актывісты ліквідаванага аднайменнага грамадзкага аб’яднаньня. Прычына адмовы — памылкі ў пададзеных рэгістрацыйных дакументах.

***5 сакавіка*** каля прахадной Менскага аўтазаводу 20 актывістаў АГП на працягу паўгадзіны раздалі рабочым пасьля зьмены тысячы ўлётак “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”.

***5 сакавіка*** адміністрацыя Баранавіцкага каледжу распачала моцны ціск на навучэнцаў, якія далучыліся да моладзевага руху “Зубр”. Навучэнцы, не зважаючы на гэта, працягваюць акцыі пратэсту. Адміністрацыя разгарнула супраць руху “Зубр” моцную контрпрапаганду. Ноччу ў цэнтры Баранавічаў зноў зьявіліся графіці ды ўлёткі руху “Зубр”. А ў першай палове дня зуброўцы ў некалькіх месцах гораду раздавалі сваю газету “Супраціў”. Паводле словаў удзельнікаў акцыі, да гэтай справы далучаюцца ўсё новыя і новыя людзі. Такім чынам, нягледзячы на ціск з боку ўладаў, зуброўскі рух у Баранавічах шырыцца. Паводле зьвестак менскага каардынатара руху “Зубр” Яўгена Афнагеля, акцыі ў падтрымку баранавіцкіх сяброў будуць ладзіцца ў многіх гарадах Беларусі. Некалькі сотняў улётак пра баранавіцкія падзеі былі распаўсюджаныя зуброўцамі ў Барысаве. Між тым, улады таксама не сядзяць склаўшы рукі. Вось што распавёў адзін навучэнец каледжу: “У каледжы гавораць пра “Зубр”, што гэта неафашысцкая арганізацыя, што сябры гэтай

арганізацыі псуюць помнікі, разрываюць магілы ды прыстасоўваюць іх пад прыбіральні. А дзеці бацькам заганяюць пад пазногці гарачыя іголкі, абліваюць іх вадой у моцны мароз ды спускаюць з ледзяных горак”.

***5 сакавіка*** ў Менск для здымкаў на Беларускім тэлебачаньні павезьлі пятнаццаць навучэнцаў Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці. Папярэдне з імі праведзены інструктаж, скіраваны на тое, каб публічна асудзіць дзейнасьць сяброў БРСМ, што далучыліся да руху “Зубр”, выдаць падзеі апошніх дзён за правакацыю.

***5 і 6 сакавіка*** былі затрыманыя 10 актывістаў руху “Зубр”. Яшчэ трое былі затрыманыя 7 сакавіка. А 8 сакавіка – двое, у тым ліку старшыня мясцовай арганізацыі БРСМ Мікіта Сасім. Прычыны затрыманьняў міліцыянты называлі розныя: ад праверкі дакументаў да падазрэньня ў крымінальных злачынствах. 7 сакавіка пры затрыманьні трох актывістаў моладзевага руху ў іх узялі адбіткі пальцаў і зьнялі на відэакамеру. Адзін з супрацоўнікаў міліцыі сказаў, што калі “зубры” не супакояцца, на іх будуць “вешаць” крымінальныя справы. Пасьля гэтага на актывістаў былі складзеныя пратаколы за парушэньне арт. 167.10 КаАП (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Усяго за 5-8 сакавіка ў Баранавічах былі затрыманыя 15 актывістаў руху “Зубр”.

***6 сакавіка*** на чарговым Кангрэсе FIDH (Міжнародная Федэрацыя Правоў Чалавека са штаб-кватэрай у Парыжы) было прынятае рашэньне аб тым, што Праваабарончы цэнтр “Вясна” становіцца асацыяваным сябрам FIDH. FIDH – адна з самых уплывовых міжнародных федэрацыяў – была створаная ў 1922 годзе і аб’ядноўвае 116 праваабарончых арганізацыяў з больш чым 100 краінаў сьвету. Кангрэс адбываўся 2-6 сакавіка ў сталіцы Рэспублікі Эквадор — Кіта. Адкрывалі Кангрэс старшыня FIDH Сідзікі Каба і лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне правоў чалавека праваабаронца з Ірану Шырын Эдабі. У працы Кангрэсу прымаў удзел юрыст Праваабарончага цэнтру “Вясна” Валянцін Стэфановіч, які пасьля вяртаньня ў Беларусь адзначыў: “Для “Вясны” ўступленьне ў FIDH мае вялікае значэньне. Перадусім гэта ацэнка нашай актыўнай працы. Нас прынялі, нягледзячы на тое, што арганізацыя нашая ліквідаваная судом, а па Статуце FIDH сябрам Федэрацыі можа быць толькі зарэгістраваная арганізацыя. Для “Вясны” зрабілі выключэньне, улічваючы сітуацыю, якая склалася з закрыцьцём недзяржаўных арганізацыяў у Беларусі”.

***6 сакавіка*** пасьля месячнага перапынку пабачыў сьвет чарговы нумар недзяржаўнага штотыднёвіка "Згода". Рэдакцыя газеты адрэагавала на заўвагі, якія

далі Міністэрству інфармацыі нагоду прыпыніць выданьне. Чарговы нумар "Згоды" выйшаў у ранейшым аб'ёме ў менскай друкарні "Плутос-маркет" і паступіў да чытачоў праз сетку "Белсаюздруку", "Белпошты" і ўласных распаўсюднікаў газеты. 5 лютага Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне і прыпыніла тэрмінам на 1 месяц выхад газеты. Выданьне абвінавацілі ў тым, што яно зьмяніла юрыдычны адрас, не паведаміўшы пра гэта ў Міністэрства інфармацыі ў належны тэрмін, а таксама ў тым, што яно выдаецца толькі на дзьвюх мовах замест некалькіх, пералічаных у рэгістрацыйным пасьведчаньні (арт. 11 Закона аб друку). Акрамя гэтага, міністэрства заявіла, што рэдакцыя парушыла артыкулы 19, 20 Закону аб друку: у той час як ІП Аляксей Кароль выконвае функцыі рэдакцыі, у выходных дадзеных газеты рэдактарам указаны Алесь Сдвіжкоў. Цягам месяца рэдакцыя "Згоды" падала ў Міністэрства інфармацыі заявы на ўнясеньне ў рэгістрацыйнае пасьведчаньне газеты зьменаў датычна юрыдычнага адрасу і моваў выданьня. Гэтаксама былі прыведзеныя ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі дзяржаўнага стандарту выходныя зьвесткі газеты. Цяпер галоўным рэдактарам "Згоды" зьяўляецца А. Кароль. Газета "Згода" выдаецца з 1992 г. і зарэгістраваная як незалежны інфармацыйна-аналітычны штотыднёвік. Са сьнежня 2003 г. выданьне павялічыла аб'ём і наклад: замест 8 палосаў пачала выходзіць на 16 накладам 3 050 асобнікаў замест 2 500.

***8 сакавіка*** ў Гародні Іван Раман вяртаўся каля 20.00 дамоў, каля пад'езду яго спынілі невядомыя і зацягнулі ў аўтамабіль. Івана Рамана моцна ўдарылі па галаве, пасьля чаго ён страціў прытомнасьць. Іван Раман прыйшоў у сябе праз паўгадзіны на пустцы ў супрацьлеглым канцы гораду, зьбіты – сіняк пад вокам, выбітае плячо і разьбітае калена. У лістападзе 2003 году адміністрацыяй Гарадзенскага заводу агрэгатаў Іван Раман быў звольнены за прафсаюзную дзейнасьць.

***9 сакавіка*** лідэр ячэйкі БРСМ і актывіст "Зубра" Мікіта Сасім і актывісты моладзевага руху Андрэй Чыж і Кацярына Кю былі затрыманыя каля гадзіны дня падчас распаўсюду газетаў у баранавіцкім каледжы лёгкай прамысловасьці. Маладыя людзі былі дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі, дзе на іх былі складзеныя пратаколы аб парушэньні арт. 156 КаАП РБ (дробнае хуліганства). Каля пяці гадзінаў "зуброўцаў" адвезьлі ў суд, аднак суды над імі не адбыліся, таму маладыя людзі правялі ноч у камеры.

***9 сакавіка*** ў памяшканьне, дзе працуе Зьміцер Салаўёў, які зьяўляўся прадстаўніком Праваабарончага цэнтру "Вясна" ў Наваполацку, прыйшлі супрацоўнікі падатковай інсьпекцыі гораду А.Яловік і Л. Кадушка. Яны мелі на руках "предписание" на правядзеньне пазапланавай рэйдавай праверкі. Падаткавікі

намерваліся правесьці праверку “дзейнасьці, зьвязанай з прыёмам наяўных грашовых сродкаў ад пакупнікоў (кліентаў), з вытворчасьцю прадукцыі, выкананьнем работ, аказаньнем паслугаў” і г.д. Зьміцер Салаўёў адмовіўся ўпусьціць у сваё памяшканьне супрацоўнікаў падатковай інсьпекцыі, матывуючы тым, што гаспадарчай дзейнасьцю ён не займаецца і ніякіх аперацыяў з наяўнымі і безнаяўнымі грашыма ў дадзеным памяшканьні не зьдзяйсьняе. Салаўёў прадставіў падаткавікам неабходныя дакументы дзеля доказу сваіх словаў. У выніку быў складзены “Акт наведваньня “гр-на Салаўёва Д.С.” Нагадаем, што гэта ўжо ня першая спроба ціску на праваабаронцу. Перад гэтым ён ужо выклікаўся ў міліцыю і пракуратуру, дзе яго папярэдзілі аб магчымасьці адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай (ліквідаванай) структуры.

***9 сакавіка*** ў Менску затрыманыя трое актывістаў моладзевага руху супраціву “Зубр”. Любоў Кучынская, Раман Казакевіч і Наста М. раздавалі газеты “Супраціў” і ўлёткі з інфармацыяй аб падзеях у Баранавічах у галоўным корпусе БДУ. Праз некалькі хвілінаў яны былі затрыманыя міліцыяй, якую выклікалі супрацоўнікі ўнутранай аховы навучальнай установы. Дзяўчат адпусьцілі на месцы, а Раман Казакевіч быў дастаўлены ў апорны пункт на вуліцы Бабруйскай.

***10 сакавіка*** стала вядома, што віцебскіх школьнікаў прымушаюць падпісвацца на дзяржаўныя выданьні. У пералік рэкамендаваных аддзеламі адукацыі газетаў і часопісаў, на якія павінны падпісацца школьнікі, увайшлі “Советская Белоруссия” і дзяржаўная гарадзкая газета “Віцьбічы”. Школьнікі мусяць зьбіраць грошы на калектыўную падпіску. У сярэднім кожны вучань мусіць ахвяраваць на гэта ад 500 да 1 тысячы рублёў. У сьпісе “рэкамендаваных” выданьняў няма ніводнага выданьня на беларускай мове, нават рэспубліканскай газеты для дзяцей ды падлеткаў “Раніца”. Затое ў адной са школаў таго ж Першамайскага раёну вучням пачатковых класаў загадана зьбіраць грошы на падпіску часопіса “Беларуская думка” — колішняга “Коммуниста Белоруссии”. Зразумела, што 6–9 гадовыя дзеці чытаць такі часопіс ня будуць.

***10 сакавіка*** баранавіцкія актывісты моладзевага руху супраціву “Зубр” Мікіта Сасім і Андрэй Чыж пакараныя Баранавіцкім гарадзкім судом арыштамі на 10 і 7 сутак адпаведна. Такое пакараньне маладыя апазіцыянеры панесьлі за распаўсюд газетаў у Баранавіцкім каледжы лёгкай прамысловасьці. Судзьдзя Баранавіцкага гарадзкога суда адмовіла ў прадастаўленьні адваката Мікіту Сасіму і Андрэю Чыжу.

***10 сакавіка*** кіраўніцтва Саюзу цэркваў Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў накіравала ліст пратэсту супраць парушэньня правоў вернікаў на адрас прэзідэнта

Аляксандра Лукашэнкі ды іншых кіраўнікоў Беларусі. Ад уладаў вернікі патрабуюць унесьці зьмены ў “Закон аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях”. Прычына — шматлікія факты ўмяшальніцтва ўладаў у дзейнасьць пратэстанцкіх цэркваў. “Закон аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях” сябры Саюзу евангельскіх цэркваў называюць варожым у адносінах да сваёй канфесіі, а свой калектыўны зварот-пратэст — апошняй спробай давесьці гэта найвышэйшым уладам краіны. Гэткія заявы вернікі падмацоўваюць шматлікімі прыкладамі. Старшыня Саюзу Мікалай Сінкавец кажа: “У Наваградку ёсьць група людзей, якіх аштрафавалі за тое, што яны маліліся ў прыватным доме. Мы паскардзіліся ў суд, але суд толькі пацьвердзіў, што дзеяньні ўладаў адпавядаюць закону. У Шчучыне гэтаксама ёсьць група людзей, на Каляды да іх прыйшлі ўчастковы, прадстаўнікі ўладаў і зрабілі папярэджаньне. У Кобрынскім раёне ва ўсіх агульнаадукацыйных школах правялі апытаньне, ці ходзяць дзеці ў нядзельныя школы, прасілі называць імя і прозьвішча выкладчыка. Гэта — відавочнае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы царквы”. Каб гэткіх праблемаў не ўзьнікала, вернікі-пратэстанты патрабуюць зьмяніць закон у частцы, якой рэгламентаваная тэрыторыя дзейнасьці евангельскіх цэркваў, умовы рэгістрацыі першасных суполак, месцы багаслужбаў, а таксама абмежаваць правы кантрольных органаў. Акрамя таго, кіраўніцтва зьвязу просіць Аляксандра Лукашэнку аб сустрэчы, каб абмеркаваць іншыя праблемы. Вернікі-пратэстанты кажуць, што звароты ў розныя дзяржаўныя структуры вынікаў ня мелі.

***10 сакавіка*** каля 50 чалавек прынялі ўдзел у акцыі "СТОП лукамол!", якая адбылася ў Барысаве на цэнтральнай плошчы. Аляксандр Моніч зачытаў зварот да ўладаў з патрабаваньнем спыніць прымусовы прыём моладзі ў праўрадавы Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. На сьнезе перад вокнамі барысаўскага камітэту БРСМ актывісты "Зубра" напісалі метровымі літарамі "СТОП лукамол!", пасьля адбылося сімвалічнае спальваньне ўлётак з эмблемай БРСМ. Пасьля заканчэньня акцыі супрацоўнікі міліцыі затрымалі лідэра барысаўскіх "Зуброў" Аляксандра Моніча, удзельніка Еўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" Зьміцера Бародку і грамадзкага актывіста Ігара Ледніка. У ГУУС з затрыманых былі ўзятыя тлумачальныя і складзеныя пратаколы па арт.167-1 КаАП (парушэньне ўсталяванага парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

***11 сакавіка*** ў Менску затрыманы супрацоўнікамі АМАП актывіст руху “Зубр” Іван Васікаў. Хлопца затрымалі падчас распаўсюду чарговага нумару газеты “Супраціў”. Актывісты руху "Зубр" раздавалі газету ў цэнтры Менску, у раёне станцыі метро “Кастрычніцкая”. Івана Васікава даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе на

яго быў складзены пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных.

***11 сакавіка*** калегія Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь пад старшынствам судзьдзі Яхнавец разгледзела касацыйную скаргу ГА “Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў” на рашэньне Менскага гарадзкога суда, які 29 студзеня прыняў рашэньне аб ліквідацыі гэтай арганізацыі. Бок упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму, па ініцыятыве якога і было ліквідаванае Менскім гарадзкім судом грамадзкае аб’яднаньне, быў прадстаўлены сьпецыялістам упраўленьня А. Шчарбовічам. Пазіцыю “Незалежнага таварыства прававых дасьледваньняў” пераканаўча асьвятлялі старшыня арганізацыі Алена Танкачова і юрыст Алеся Відрук. Нягледзячы на відавочную абгрунтаванасьць доказаў юрыстаў “Незалежнага таварыства прававых дасьледваньняў”, калегія Вярхоўнага суда прыняла рашэньне адмовіць у задавальненьні скаргі і пакінуць рашэньне Менскага гарадзкога суда ў сіле. Пры гэтым калегія зьмяніла прычыну ліквідацыі арганізацыі: калі Менскі гарадзкі суд палічыў, што дастатковай прычынай дзеля спыненьня дзейнасьці аб’яднаньня зьяўляецца “прадстаўленьне інтарэсаў няўрадавых арганізацыяў” падчас судовых працэсаў сябрамі “Незалежнага таварыства прававых дасьледваньняў”, то калегія Вярхоўнага суда ўбачыла “парушэньне тэрыторыі” дзейнасьці арганізацыі – менавіта гэтыя словы прагучалі з вуснаў судзьдзі Яхнавец. Падтрымаць сяброў праваабарончай арганізацыі прыйшлі шматлікія прадстаўнікі беларускіх грамадзкіх арганізацыяў, офісу АБСЕ у Менску, прысутнічалі СМІ. Нагадаем, што судовае рашэньне аб ліквідацыі было прынятае на падставе артыкулу 29 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, а менавіта “паўторнае на працягу году ўчыненьне дзеяньняў, за якія было вынесенае пісьмовае папярэджаньне”. Матывуючы абгрунтаванасьць рашэньня, суд у рэзалюцыйнай частцы рашэньня ўказаў, што прадстаўнікі Грамадзкага аб’яднаньня “Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў” у 2003 годзе прымалі ўдзел у судовых справах у Гарадзенскім абласным судзе (ліквідацыя Гарадзенскага абласнога ГА “Ратуша”, адмова ў рэгістрацыі Смаргонскага ГА “Дом правоў чалавека”) і Віцебскім абласным судзе (ліквідацыя ГА “Цэнтр моладзевых ініцыятываў “Контур”). Менавіта гэтыя падставы палічаныя законнымі і дастатковымі для ліквідацыі.

***11 сакавіка*** старшыня Канстытуцыйнага суда Рыгор Васілевіч абвясьціў заключэньне, паводле якога суд лічыць магчымым увядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне альбо поўнае скасаваньне сьмяротнай кары. Ён дадаў, што адпаведнае рашэньне могуць прыняць кіраўнік дзяржавы і парламент. Адразу пасьля вынясеньня вердыкту ініцыятар запыту ў Канстытуцыйны суд дэпутат Палаты

прадстаўнікоў Андрэй Нарэйка сказаў: “Я, вядома ж, задаволены. Я лічу, што гэта максімальна добрае рашэньне. Я думаю, што трэба зьвярнуцца ў Палату прадстаўнікоў у рамках рашэньня Канстытуцыйнага суда аб унясеньні зьменаў у Крымінальны кодэкс. Цяпер стаіць пытаньне аб парламенце — ці падтрымаюць мяне мае калегі?” Такім чынам, 11 сакавіка зьявіліся юрыдычныя падставы для таго, каб працягваць барацьбу за ўвядзеньне мараторыю на пакараньне сьмерцю альбо нават скасаваньне сьмяротнай кары. Пры гэтым варта нагадаць: паводле вынікаў так званага рэферэндуму 1996 году 80 адсоткаў насельніцтва выказалася супраць адмены пакараньня сьмерцю. Але ў заключэньні Канстытуцыйнага суда згадваецца, што, па-першае, галасаваньне мела толькі рэкамендацыйны характар, а па-другое, у той час у беларускім заканадаўстве не было такой сур’ёзнай альтэрнатывы, як пажыцьцёвае зьняволеньне. Рашэньні Канстытуцыйнага суда, згодна з законам, зьяўляюцца канчатковымі, абскарджаньню і апратэставаньню не падлягаюць. А што будзе, калі, напрыклад, большасьць Палаты прадстаўнікоў не падтрымае заключэньня суда? Сябра Канстытуцыйнага суда першага складу прафесар, доктар юрыдычных навук Міхаіл Пастухоў сказаў: “Адбудзецца тое, што адбудзецца: пытаньне ня будзе вырашанае. Яно можа станоўча вырашыцца толькі пры ўмове, што бу-дзе папярэдне ўзгодненае з кіраўніком дзяржавы. Больш за тое, калі Лукашэнка асабіста ініцыюе гэтую праблему перад дэпутатамі, тады яна, безумоўна, вырашыцца”.

***12 сакавіка*** былы начальнік менскага СІЗА Алег Алкаеў, які пяць гадоў узначальваў каманду, што выконвала сьмяротныя прысуды, распавёў, як у Беларусі выконваюцца сьмяротныя прысуды.Толькі пасьля ад’езду ў Германію былога начальніка менскага сьледчага ізалятару Алега Алкаева грамадзкасьць Беларусі даведалася, што паводле сваёй пасады ён узначальваў адмысловую каманду, якая выконвала сьмяротныя прысуды ў Беларусі. Усе абставіны і выканаўцы гэтай працы засакрэчаныя. Аднак Алег Алкаеў не ганарыцца, што пяць гадоў выконваў ролю кіраўніка “расстрэльнай” каманды. Ён лічыць сьмяротнае пакараньне негуманным і шкодным ва ўсіх сэнсах. Алег Алкаеў распавёў, як у Беларусі выконваюцца сьмяротныя прысуды. “У адпаведнасьці з Крымінальным кодэксам, асуджанага на сьмерць заводзяць у адмысловае памяшканьне, яму зачытваюць указ прэзідэнта аб адмове ў памілаваньні альбо, калі ён не зьвяртаўся з такім хадайніцтвам, палажэньне аб невыкарыстаньні памілаваньня — і потым цягам трыццаці секундаў-хвіліны гэтага чалавека ўжо няма. Мы робім усё гэтак, каб вязень дадаткова не пакутаваў. Ён спадзяецца, што ў яго яшчэ ёсьць нейкі час, быццам яго кудысьці павязуць. На справе ў суседнім памяшканьні нечакана робіцца стрэл у галаву, пасьля чаго доктар канстатуе сьмерць, і адбываецца пахаваньне”. Сваякам целаў

пакараных не выдаюць, як не паведамляюць і месца пахаваньня. Алег Алкаеў перакананы, што гэта негуманна, у тым ліку і адносна выканаўцаў прысудаў, якія ў сувязі з гэтай сакрэтнасьцю маральна яшчэ больш пакутуюць: “Для нас гэта дадатковыя турботы, абсалютна. Трэба кансьпіратыўна выязджаць, хаваць так, каб ніхто не зразумеў, не здагадаўся, ня бачыў. Гэта даволі складана, больш падыходзіць да нейкага дэтэктыву. Быццам гэта не выкананьне дзяржаўнага прысуду, а нейкая мафіёзная разборка. Атрымліваецца, што ўсё робіцца як сярод злодзеяў”. Былы начальнік менскага сьледчага ізалятару Алег Алкаеў паведаміў пра сумныя лёсы значнай часткі міліцыянтаў, якія выконвалі сьмяротныя прысуды. Многія з іх становяцца хранічнымі алкаголікамі, і амаль ніхто не дажывае да старасьці. Прычына ў моцным псіхалагічным стрэсе, які перажываюць гэтыя людзі, і адсутнасьці для іх сістэмы медыцынскай рэабілітацыі: “Вялікія страты для псіхікі церпяць тыя, хто выконвае сьмяротныя прысуды. Пытаньні рэабілітацыі ў нас увогуле не стаяць, акрамя сумнавядомых ста грамаў. Тым больш, што выгляд гэтых злачынцаў варты жалю ў момант выкананьня прысуду. Акрамя спачуваньня, ён нічога не выклікае”. Алег Алкаеў перакананы, што сьмяротную кару ў Беларусі даўно трэба адмяніць, і выказваецца за тэрміновы мараторый на сьмяротную кару да прыняцьця адпаведнага закону: “Беларусь — гэта ня тая краіна, дзе самыя апантаныя злачынцы, і маё меркаваньне, што чым хутчэй сьмяротную кару адменяць, тым лепей. Тым больш, што яна не выконвае ніякай выхаваўчай ролі, бо ўсё робіцца ў сакрэце. Шмат хто дагэтуль лічыць, што ніякага расстрэлу няма, людзей быццам некуды вывозяць, робяць аперацыі, трансплантацыю органаў ды іншае”.

***12 сакавіка*** лідэра барысаўскіх "зуброў" Аляксандра Моніча звольнілі з Барысаўскага заводу агрэгатаў, дзе ён працаваў кандытарам. Прычынай звальненьня стаў ягоны ўдзел у акцыі “Стоп лукамол”.

***12 сакавіка*** Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, урад і аб’яднаньне наймальнікаў падпісалі генеральную дамову пра супрацоўніцтва на 2004–2005 гады. Падпісаньне дакументаў прайшло без уліку прапановаў незалежных прафсаюзных аб’яднаньняў.

***15 сакавіка*** ў Баранавічах мусілі адбыцца суды над актывістамі "Зубра" Аляксем Ляўковічам, Настай Васіленка, а таксама Мікітам Сасімам. Маладыя людзі абвінавачваюцца ў парушэньні артыкулу 167-10 КаАП (дзеяньні ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Сасім, Ляўковіч і Васіленка былі затрыманыя 8 сакавіка, калі міліцыянты заўважылі на іх значкі з лагатыпам "Зубра". Судзьдзя Мікалай Кміта, які разглядаў справы, адправіў пратаколы ў міліцыю на дапрацоўку.

Дарэчы, гэты ж судзьзя прысудзіў Сасіму 10 сутак арышту 10 сакавіка. Мікіта быў дастаўлены ў суд з ізалятару часовага ўтрыманьня, дзе ён адбывае прысуд.

***15 сакавіка*** Чыгуначны суд г.Віцебску вынес папярэджаньні актывістам Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі Уладзіміру Плешчанку і Аляксандру Салаўяну. Суд прайшоў адразу пасьля затрыманьня апазіцыянераў каля будынку аблвыканкаму, куды яны выйшлі на акцыю. А.Салаўян трымаў плакат: “Схадзіў на выбары – падтрымаў рэжым”, а Уладзімір Плешчанка – аб’яву: “Збор подпісаў супраць саюзнай дамовы, незаконна падпісанай Аляксандрам Лукашэнкам”.

***16 сакавіка*** актывіст руху "Зубр" Сяргей Палішчук быў выкліканы ў камісію па справах непаўнагадовых Баранавіцкага ГУУС. Вучань каледжу лёгкай прамысловасьці быў затрыманы ў ноч на 15 сакавіка па падозраньні ў нанясеньні графіці.

***16 сакавіка*** ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі (прыватныя і дзяржаўныя) увялі ў навучальныя планы абавязковы курс "Основы идеологии белорусского государства", разьлічаны на 24 навучальныя гадзіны (16 лекцыяў і 8 семінараў). Вынікам курсу стане залік па ідэалогіі.

***16 сакавіка*** Пракуратура Беларусі ўзбудзіла крымінальную справу супраць старшыні АГП Анатоля Лябедзькі за “распаўсюд заведама ілжывых зьвестак пра прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку”. Кіраўнік прэс-цэнтру пракуратуры Юры Азаронак паседаміў, што крымінальная справа ўзбуджаная пасьля аналізу інтэрв’ю Лябедзькі, якое трансьлявалася 21 лютага ў праграме “Зеркало” тэлеканалу "Россия" і "Намедни" тэлеканалу НТВ. Справа ўзбуджаная па арт. 367 ч. 2 КК Беларусі. А. Лябедзьку пагражае пакараньне да пяці гадоў турмы.

***16 сакавіка*** выйшаў на волю актывіст руху "Зубр" Андрэй Чыж, які быў асуджаны да адміністратыўнага арышту тэрмінам 7 дзён за тое, што раздаваў улёткі ў Баранавіцкім каледжы лёгкай прамысловасьці. Разам з Чыжом быў арыштаваны сакратар суполкі БРСМ, якая перайшла ў "Зубр".

***16 сакавіка*** ў Баранавіцкім дзяржаўным каледжы лёгкай прамысловасьці былі затрыманыя два актывісты руху “Зубр” Зьміцер Шчэпаў і Наста Васіленка за тое, што раздавалі навучэнцам другі нумар інфармацыйнага бюлетэня “Зубр-Баранавічы”. У ГУУСе на маладых людзей былі складзеныя пратаколы за парушэньне арт. 167-10 КаАП (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Адразу пасьля гэтага іх павезлі ў суд. На судовым паседжанні, якое цягнулася прыкладна паўгадзіны,

судзьдзя Баранавіцкага гарадзкога суда Кучыева палічыла віну маладых людзей даказанай і прызначыла пакараньне -- 10 базавых велічыняў кожнаму.

***17 сакавіка*** намесьніка кіраўніка офісу АБСЕ ў Менску выклікалі ў Міністэрства замежных справаў Беларусі, каб выказаць незадаволенасьць фактам удзелу кіраўніка офісу, амбасадара Хайкена ў працы канферэнцыі, зладжанай латвійскім урадам. Пра гэты факт на сесіі для журналістаў паведаміла прэс-сакратар офісу АБСЕ Хайдзі Сьміт. Яна зазначыла, тым ня менш, што Эберхард Хайкен будзе працягваць браць удзел у падобных мерапрыемствах і надалей.

***17 сакавіка*** Гаспадарчы суд Гомельскай вобласьці прыпыніў разгляд зыску жаночага аб’яднаньня “Ініцыятыва” да Гомельскага райвыканкаму, які адмовіў жаночай арганізацыі ў рэгістрацыі юрыдычнага адрасу ў прыватным доме ў вёсцы Яроміна.

***17 сакавіка*** ўвечары судовы выканаўца суда Чыгуначнага раёну г.Гомелю Сяргей Цяцера апісаў маёмасьць карэспандэнткі "Белорусской деловой газеты" па Гомельскай вобласьці Ірыны Макавецкай. Гэткім чынам ён выканаў рашэньне суда Кастрычніцкага раёну Менску ад 1 кастрычніка 2003 году, які пастанавіў спагнаць з журналісткі на карысьць сьледчага Пракуратуры РБ Вячаслава Цераховіча 300 тысячаў рублёў. Судовы выканаўца апісаў мэблю і некаторыя прадметы побыту ў кватэры журналісткі, ацаніўшы іх у 410 тысячаў рублёў. Агульная сума, якую судовы выканаўца павінен спагнаць з журналісткі, складае каля 500 тысячаў рублёў. Акрамя кампенсацыі зыскоўцу, журналістка павінна заплаціць 82 тысячы рублёў дзяржпошліны; яшчэ 5% ад спагнанай сумы каштуе "прымусовае выкананьне прысуду"; 20% складзе камісійны збор пры продажы маёмасьці; акрамя гэтага, журналістцы належыць аплаціць працу грузчыкаў і транспартаваньне рэчаў у сьпецыялізаваную краму. Пакуль што апісаныя рэчы застаюцца "на адказным захаванні" ў І. Макавецкай. Нагадаем: старэйшы сьледчы па асабліва важных справах Пракуратуры РБ В. Цераховіч зьвярнуўся ў суд з зыскам аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі яшчэ ў 2002 г. Ён аспрэчваў некалькі публікацыяў І. Макавецкай у "БДГ" за 2001-2002 гг., што тычыліся расьсьледваньня крымінальнай справы былога рэктара Гомельскага медінстытуту Юрыя Бандажэўскага і прарэктара гэтай установы Уладзіміра Раўкова. Зыскоўца патрабаваў абвергнуць распаўсюджаныя зьвесткі і кампенсаваць ягоныя маральныя страты сумаю ў 10 мільёнаў рублёў. Судовы разбор справы доўжыўся больш за год.

***17 сакавіка*** Дэпартамент фінансавых расьсьледваньняў узбудзіў крымінальную справу супраць старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Працькі і

бухгалтара арганізацыі Тацяны Рудкевіч. Тацяну Процьку і Тацяну Рудкевіч абвінавачваюць у нявыплаце падаткаў на суму 78 мільёнаў рублёў. Раней падатковая інсьпекцыя правярала фінансавую дзейнасьць БХК — тады палічылі, што арганізацыя павінна выплаціць падаткі разам з пеняй памерам 375 мільёнаў рублёў.

***18 сакавіка*** каля 22 гадзінаў адбылася спроба пранікненьня ў гарадзенскі офіс газеты “День”. Зламысьнікамі, якіх затрымаў выкліканы выпадковым сьведкам нарад міліцыі, паводле папярэдняй інфармацыі, аказаліся супрацоўнікі ўпраўленьня Камітэту дзяржаўнай бясьпекі па Гарадзенскай вобласьці.

***18 сакавіка*** ў пракуратуры г. Менску старшыня АГП Анатоль Лябедзька атрымаў на рукі пастанову аб узбуджэньні крымінальнай справы “па факце распаўсюду ў СМІ заведама ілжывых, ганьбячых прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зьвестак, зьвязаных з абвінавачаньнем ва ўчыненьні цяжкіх і асбліва цяжкіх злачынстваў”. Анатоль Лябедзька заявіў, што калі справа будзе даведзеная да суда, ён дасьць доказы, што пацьвярджаюць інфармацыю, якая прагучала 21 лютага ў тэлепраграме “Зеркало” расійскага каналу РТР.

***18 сакавіка*** за нявыплату падаткаў з тэхнічнай дапамогі, атрыманай па праграме TACIC, арыштаваная маёмасьць слонімскага грамадзкага аб’яднаньня "Воля да разьвіцьця". Як паведаміў старшыня аб’яднаньня Міхась Варанец, прэтэнзіі, прад’яўленыя да яго арганізацыі, цалкам супадаюць з тымі, што падаткавыя органы выставілі ў адносінах да Беларускага Хельсінкскага камітэту.

***19 сакавіка*** высьветлілася, што супрацоўнікаў КДБ, якія назвалі сябе Аляксандрам Вашкевічам і Віктарам Макаравым, што былі затрыманыя ўвечары 18 сакавіка пры спробе ўзламаць офіс газеты "День", у Ленінскім РУУС Гародні няма. Па інфармацыі дзяжурнага Ленінскага РУУС, іх няма таксама ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Ніхто са службовых асобаў РУУС не пракаментаваў журналістам той факт, што затрыманыя на месцы злачынства людзі былі выпушчаныя на волю.

***19 сакавіка*** Гарадзенская міліцыя адмовілася распачаць крымінальную справу адносна спробы пранікненьня ў памяшканьне, дзе знаходзіцца рэдакцыя газеты “День”.

***22 сакавіка*** ўлады Белаазёрску не дазволілі правесьці ў мясцовым Палацы культуры семінар, прысьвечаны рэфармаваньню жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Прычынай забароны стала тое, што ініцыятыва па правядзеньні семінару зыходзіла ад апазіцыйных дэпутатаў мясцовага Савету.

***22 сакавіка*** ў Наваполацку зьявіліся першыя ахвяры ўсеагульнай кантрактызацыі. Адміністрацыя мясцовай цеплаэлектрацэнтралі папярэдзіла кіраўнікоў ячэйкі Свабоднага прафсаюзу, што кантракт з імі працягнуты ня будзе. Пісьмовыя папярэджаньні аб гэтым атрымалі старшыня прафарганізацыі Вадзім Духоменка, а тасама два сябры прафсаюзу Юры Абухаў і Юры Гайчанка. Усе яны адпрацавалі на ТЭЦ не адзін дзесятак гадоў і маюць высокую кваліфікацыю.

***22 сакавіка*** ў царкве мястэчка Бобр, што ў Крупскім раёне Меншчыны, быў пашкоджаны насьценны росьпіс, які зрабіў мастак Алесь Пушкін. У сцэне, якая распавядае пра біблейскі сюжэт страшных пакутаў на тым сьвеце грэшных душаў, замаляваныя вобразы двух персанажаў, падобных на Аляксандра Лукашэнку і мітрапаліта Філарэта.

***22 сакавіка*** адбыўся педсавет у баранавіцкім каледжы лёгкай прамысловасьці, на якімом абмяркоўвалі актывістку руху "Зубр" Кацярыну Банкевіч, затрыманую разам з Мікітам Сасімам за раздачу інфармацыйнага бюлетэню "Зубр-Баранавічы". Непаўнагадовую Кацярыну Банкевіч, якую заканадаўства не дазваляе пасадзіць у турму, педсавет каледжу вырашыў умоўна выключыць з каледжу.

***23 сакавіка*** ў Слоніме былі затрыманыя міліцыяй прадстаўнікі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” – намесьніца Першага сакратара Партыі камуністаў Беларускай Алена Скрыган, старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка і сябра Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Паўлаў. Яны прыехалі ў Слонім па запрашэньні дэпутата мясцовага Савету Івана Шэгі на сустрэчу з выбаршчыкамі. Планавалася правесьці сустрэчу ў школе, але яна аказалася зачыненай. Было вырашана праводзіць сустрэчу ў школьным двары, на лаўках. Як толькі менскія госьці пакінулі сустрэчу, іх затрымала міліцыя і канваявала да раённага аддзелу ўнутраных справаў. Каля РАУСу пратрымалі дзьве з паловай гадзіны, забралі пашпарты і спрабавалі зацягнуць у памяшканьне, каб скласьці пратаколы – прысутныя адмовіліся. У рэшце рэшт, вярнулі пашпарты, але папярэдзілі, што будуць складзеныя пратаколы паводле артыкулу Адміністратыўнага кодэксу 167-1 (парушэньне парадку арганізацыі мітынгаў і сходаў).

***23 сакавіка*** Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў чарговы зыск рэдакцыі "Белорусской деловой газеты" да Міністэрства інфармацыі. Журналісты спрабавалі аспрэчыць папярэджаньне, якое міністэрства вынесла газеце 30 студзеня.

***24 сакавіка*** каля 60 ліцэістаў сталі ўздоўж прасьпекту Францішка Скарыны насупраць універсаму “Цэнтральны”, сьпяваючы “Гаўдэамус” і трымаючы ў руках плакаты. Завершылася акцыя мастацкім перфомансам у парку імя Горкага. Падчас

акцыі да ліцэістаў падышлі міліцыянты і пачалі забіраць плакаты. Потым затрымалі бацьку ліцэіста Яўгена Грыневіча Юрыя, які стаяў побач з дзецьмі і рабіў фотаздымкі. Міліцыянты адвялі Юрыя Грыневіча ў гарадзкі аддзел міліцыі, што на вуліцы Леніна. Падчас акцыі ліцэістаў здымалі на відэакамеру людзі ў цывільным. Калі па завяршэньні перфомансу большасьць ліцэістаў пакінулі парк імя Горкага, міліцыянты затрымалі пяцёх навучэнак ліцэю — Адэлю Дубавец, Юлю Бандарэнку, Вольгу Кавалёву, Марылю Васючэнку, Тацяну Абрамчук, а таксама трох дзяўчынак, якія назіралі за перфомансам у парку. Пазьней усіх затрыманых выпусьцілі, пратрымаўшы пэўны час у апорным пункце міліцыі Партызанскага раёну.

***25 сакавіка*** сябры Беларуска-Еўрапейскага Задзіночаньня зладзілі ў Бруселі пікет у гонар сьвяткаваньня 86-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Пікет адбыўся насупраць галоўнага ўваходу ў будынак Еўрапарламенту. У сувязі з тым, што ў гэты дзень адбылося паседжаньне Савету Еўрапарламенту, пікет вызваў вялікую зацікаўленасьць прысутных. У час размовы, якая адбылася паміж пікетоўцамі і ўдзельнікамі паседжаньня, стала вядома аб тым, што актывізаваліся абмеркаваньні аб больш хуткай інтэграцыі Беларусі ў Еўрасаюз. З боку праваахоўнікаў Бруселю была выказаная добразычлівасьць і разуменьне ў справах палітычнай сітуацыі ў Беларусі.

***25 сакавіка*** судовым выканаўцам Бярозаўскага раённага суда Аленай Курыловіч была апісаная маймасьць журналісткі рэгіянальнай “Газеты для вас” Тамары Шчапёткінай.

У ***ноч на 25 сакавіка*** актывісты барысаўскага аддзяленьня руху “Зубр” вывесілі бел-чырвона-белыя сьцягі на цэнтральных вуліцах гораду. Акцыя была прысьвечаная 86-й гадавіне Беларускай Народнай Рэспублікі.

***25 сакавіка*** судовая калегія па грамадзянскіх справах Берасьцейскага абласнога суда ў складзе Дзьмітрука Г.Р., Усьцімчук Н.С. і Чэбушавай Н.С. не задаволіла скаргу старшыні Берасьцейскай арганізацыі Партыі БНФ Ніны Давыдоўскай, аштрафаванай за распаўсюд 10 сьнежня 2003 году ўлётак-віншаваньняў з Міжнародным днём правоў чалавека. 19 сьнежня 2003 году адміністратыўная камісія Маскоўскага раёну Берасьця прыцягнула да адказнасьці Ніну Давыдоўскую ў выглядзе штрафу ў памеры 49.000 рублёў за парушэньне ч. 3 арт. 172 КаАП РБ. Ніне Давыдоўскай ставілася ў віну тое, што яна “каля прахадной заводу “Цьветатрон” распаўсюджвала ўлёткі, выробленыя з парушэньнем вызначанага парадку і ня маючых выходных дадзеных, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку і законным інтарэсам грамадзянаў”.

***25 сакавіка*** сьвяткаваньне Дня Волі ў Менску праходзіла нібы ва ўмовах акупацыі. У другой палове дня цэнтр Менску быў запоўнены міліцыянтамі і амапаўцамі, якія адсочвалі людзей з бел-чырвона-белымі кветкамі ў руках. Першыя затрыманьні адбыліся на Кастрычніцкай плошчы сталіцы. Валянцін Баранаў, Дзяніс Буйніцкі і Вячаслаў Сіўчык трымалі плакаты “Жыве БНР”, “Жыве незалежная Беларусь” і “Беларусы маюць права абіраць уладу”. Каб застацца на Кастрычніцкай плошчы, яны прыкавалі сябе ланцугамі да слупоў асьвятленьня ўздоўж праспекту Скарыны. Аднак міліцыянты іх вызвалілі з ланцугоў і адвезьлі ў Цэнтральны РУУС. "Людзі ў цывільным" пачалі зьбірацца да 17-й гадзіны на пляцы Волі. Адзін з іх пачаў выказваць прэтэнзіі маладому хлопцу, які прыйшоў туды ў камуфляжы з нашыўкай, на якой былі выява бел-чырвона-белага сьцягу ды надпіс “Узброеныя сілы Беларусі”. Калі на пляцы Волі сабралася больш за 100 чалавек, чацьвёра ў цывільным схапілі мужчыну ды пацягнулі ў міліцэйскую машыну, што выклікала пратэсты прысутных і крыкі. Калі на пляц Волі прыйшлі прадстаўнік Партыі БНФ Вінцук Вячорка і праваабаронца Алесь Бяляцкі, трое людзей у цывільным накінуліся на А.Бяляцкага, павалілі і пачалі цягнуць у машыну. Затым арыштавалі і В. Вячорку. Далей зачыстку на пляцы Волі распачалі амапаўцы. Большую частку людзей выціснулі ў бок станцыі метро “Няміга”. Іншыя пайшлі па вуліцы Інтэрнацыянальнай да помніка Янку Купалу, але па дарозе некаторых таксама затрымалі. Усяго ў Цэнтральны РУУС г. Менску было дастаўлена больш за дзесяць чалавек. Пасьля свайго вызваленьня Вінцук Вячорка заявіў, што ў пастарунку выявілася — арыштамі займаліся амапаўцы з Расіі, якія прыехалі ў Беларусь на "стажыроўку". Пакуль затрыманых адвозілі ў міліцыю, астатнія прайшлі з пляцу Волі ў парк імя Янкі Купалы. Людзі ўскладалі кветкі да помніка Купалу і сьпявалі. Завяршыліся сьвяткаваньні ў Менску ў Доме літаратара вечарынай з удзелам паэтаў і пісьменьнікаў. Пікеты і мітынгі адбыліся ў гэты дзень ва ўсіх абласных гарадах Беларусі і большасьці раённых. Дзень Волі адзначалі беларусы таксама ў многіх еўрапейскіх сталіцах.

***25 сакавіка*** на пляцы Волі ў Менску былі затрыманыя:

1. Алесь Бяляцкі — старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” (пры затрыманьні зьбілі з ног і працягнулі па зямлі);
2. Валянцін Стэфановіч — юрыст Праваабарончага цэнтру “Вясна” (быў затрыманы, калі кінуўся на дапамогу А.Бяляцкаму);
3. Вінцук Вячорка – страшыня Партыі БНФ;
4. Валянцін Мацкевіч;
5. Уладзімір Кішкурна – старшыня Менскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ;

6. Андрэй Козел – намесьнік старшыні Менскай гарадзкой арганізацыі АГП;
7. Рыгор Кійко;
8. Яўген Скочка;
9. Вячаслаў Сіўчык;
10. Дзяніс Буйніцкі;
11. Вячаслаў Баранаў;
12. Алег Гнедчык.

Сьведчаньні Андрэя КОЗЕЛА, затрыманага і зьбітага 25 сакавіка на плошчы Свабоды ў Менску: “На плошчу Свабоды я прыехаў прыкладна ў 16.50. На той момант там прысутнічала каля 40 чалавек, якія прыйшлі сьвяткаваць Дзень Волі, і каля 40 "людзей у цывільным". Праз некалькі хвілінаў палкоўнік Гірэль з двума брытагаловымі людзьмі ў цывільным падышлі да маладых людзей (14-16 гадоў) і ў агрэсіўнай форме пачалі загадваць ім пакінуць тэрыторыю плошчы. Я падышоў да палкоўніка і запытаўся, чаго менавіта ён жадае і чаму чапляецца да моладзі. Гірэль пачаў мяне прымушаць пакінуць плошчу, на што я адказаў, што як грамадзянін РБ магу знаходзіцца дзе заўгодна і калі заўгодна. Афіцэр стаў лаяцца матам і загадаў двум брытагаловым, якія былі каля яго, схапіць мяне. Брытагаловыя імгненна заламалі мне рукі і павялі да "варанка", але ў гэты момант на нас зьвярнулі ўвагу іншыя прысутныя на плошчы, яны абступілі цесным колам брытагаловых. Падышлі журналісты, якія пачалі цікавіцца прычынай майго затрыманьня, на што Гірэль нічога дакладнага ня змог сказаць — і ў выніку ім давялося адпусьціць мяне. Праз пяць хвілінаў зьявіліся калоны АМАПу, якія прайшлі па вуліцы Інтэрнацыянальнай да скрыжаваньня з плошчай Свабоды і там, расьцягнуўшыся ў ланцуг, пайшлі на людзей. Пачалі падымаць людзей, якія сядзелі на лаўках і, мажліва, ніякага дачыненьня да сьвяткаваньня ня мелі. У той момант я, у знак супраціву, сеў на плошчы і працягваў сядзець, пакуль мяне сілай не паднялі і не заламалі рукі. Адразу мной занялося трое амапаўцаў, якія, правёўшы метраў дзесяць, перадалі мяне брытагаловым у цывільным, тым самым, што затрымлівалі мяне раней. Яны павялі мяне ў накірунку да метро "Няміга", дзе стаяў амапаўскі ЗІЛ (па дарозе да аўтобуса адзін з іх некалькі разоў ударыў мяне ў жывот). Кінуўшы ў грузавік, пачалі зьбіваць мяне: білі па твары, па нырках, жываце і руках. Прычым адбывалася ўсё вельмі жорстка і адзін з іх — чалавек невысокага росту — доўгі час паўтараў: "Ды мы такіх, як ты, у Чачні...". Праз пэўны час яны пачалі з яшчэ большай злосьцю зрываць з маіх плячэй нашыўкі з бел-чырвона-белым сьцягам і "Пагоняй". Праз некалькі хвілінаў у грузавік прывялі жанчыну сярэдняга ўзросту — Веру, якая жадала разрадзіць абстаноўку і разьвешвала кветачкі па амапаўскім аўтобусе. На тэлефон некалькі разоў тэлефанавалі розныя людзі, і пасьля таго, як я сказаў аднаму журналісту, што

мяне зьбівалі, амапавец выхапіў у мяне тэлефон. Прыкладна праз пяць хвілінаў прыйшла рота АМАПу, і мяне перавялі ва УАЗ, у якім сядзеў нейкі афіцэр АМАПу, які доўгі час расказваў, што ў нас "харошая" ўлада і ўвесь народ яна задавальняе. Потым мяне адвезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе павялі ў актавую залу, у якой знаходзілася ўжо чалавек пятнаццаць затрыманых, сярод якіх былі вядомыя мне Вінцук Вячорка, Валянцін Стэфановіч і інш. Мяне адразу пацягнулі на допыт... Дзесьці ў 19.50 мяне адпусьцілі, і я выйшаў з будынку. Мне было досыць цяжка рухацца і цяжка дыхаць. Была толькі адна думка: "Заўтра трэбаісьці на медэксьпертызу".

У ***ноч з 27 на 28 сакавіка*** ў в. Хаціслаў Маларыцкага раёну невядомымі быў зьдзейсьнены напад і абрабаваньне малітоўнага дому Хрысьціянаў веры Евангельскай. У будынку былі павыбіваныя шыбы, скрадзены гадзіньнік, літаратура і канцтавары для нядзельнай школы, кінапраектар. Пра напад на царкву было паведамлена ў праваахоўныя органы. На падставе заявы праводзіцца сьледзтва. Ад 2000 году, калі быў набыты будынак, і ў ім рэгулярна два разы на тыдзень пачалі праводзіцца набажэнствы, гэта ўжо шосты выпадак нападу, прычым некалькі разоў гэта былі відавочныя акты вандалізму, калі злачынцы аблівалі фарбай царкоўныя лавы, катэдру, падлогу. “Пазалетась, – распавядае пастар царквы Вячаслаў Рагацэвіч, – меў месца падобны выпадак, але злодзеяў так і не адшукалі. Цяпер сьледчы вылучае версію, што той, хто зьдзейсьніў ці зьдзесьнілі напад, – людзі рэлігійныя, таму што адзіная каштоўнасьць, якая была некранутая і пакінутая ў царкве – келіх і чаша для прычасьця з выявай ўкрыжаваньня. Але рабаваньне зьдзейсьненае, і гэты факт кажа сам за сябе, што камусьці не падабаецца, што ў Хаціславе ёсьць Дом малітвы, ёсьць вернікі пратэстанты, і такія напады зьдзяйсьняюцца наўмысна.”

***26 сакавіка*** сямёра затрыманых удзельнікаў мітынгу, які адбыўся ў Салігорску 25 сакавіка, выкліканыя ў Салігорскі суд. Пяцёх пакаралі штрафамі, аднаму далі папярэджаньне, яшчэ аднаго чалавека чакае суд. Сярод затрыманых чацьвёра — сябры Салігорскай філіі КХП-БНФ, двое — сябры Аб’яднанай грамадзянскай партыі і адна дзяўчына — выпадковая сьведка падзеі. Два чалавекі атрымалі штрафы ў памеры 100 базавых велічыняў кожны, трох аштрафавалі на сумы ад 20 да 25 базавых велічыняў. Аднаму затрыманаму вынесьлі папярэджаньне. Затрыманьні адбыліся 25 сакавіка ў часе несанкцыяванага мітынгу ў цэнтры Салігорску. Мітынг прайшоў пад сацыяльнымі лозунгамі. Удзельнікі пратэставалі супраць кантрактнае сістэмы і вялікіх камунальных плацяжоў, якія не адпавядаюць пенсіям.

***26 сакавіка*** звольнены з працы старшыня суполкі Свабоднага прафсаюзу Полацкай цеплаэлектрацэнтралі Алег Шайтар. Звольнены працаваў старэйшым машыністам катлатурбіннага цэху.

***28 сакавіка*** на памежным пераходзе “Каменны лог” быў затрыманы актывіст «Маладога Фронту» Зьміцер Дашкевіч. Беларускія мытнікі пратрымалі яго тры гадзіны і канфіскавалі некаторыя дакументы і агітацыйныя матэрыялы.

***29 сакавіка*** кіраўнік Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі быў выкліканы ў рэспубліканскую пракуратуру на “гутарку” да пракурора Новікава, які займаецца пытаньнямі дзейнасьці грамадзкіх арганізацыяў, палітычных партыяў, рэлігійных арганізацыяў, СМІ. Размова была нядоўгай, ніякія запісы не вяліся. Пракурор задаў некалькі пытаньняў, датычных дзейнасьці Бяляцкага ў няўрадавых арганізацыях – у якіх арганізацыях ён бярэ ўдзел, ці мае дачыненьне да Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў і яе часопісу. Асабліва цікавіла пракурора Новікава, ці шмат Алесь Бяляцкі бывае за мяжой, бо ўбачыў у ягоным пашпарце шмат візаў і пячатак, а таксама – за якія сродкі ён жыве. Алесь Бяляцкі адказаў, што, згодна з артыкулам 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ён мае права не даваць інфармацыі, якая можа быць скарыстаная супраць яго. Пракурор на гэта адзначыў, што яшчэ, магчыма, знойдзецца нітачка, за якую ён пацягне, і іх размова з праваабаронцам працягнецца. Напярэдадні гэты ж пракурор выклікаў некалькі чалавек, пазначаных у рэдакцыі часопісу “Асамблея”, якія былі дапытаныя на прадмет сваёй датычнасьці да гэтага часопісу. У выпадку ж з Бяляцкім пытаньні закранаалі значна шырэйшае кола праблемаў, у тым ліку нават асабістага жыцьця, што, бясспрэчна, зьяўляецца перавышэньнем паўнамоцтваў спадара Новікава. Бяляцкі лічыць, што пракуратура атрымала пэўны сацыяльны заказ, і асноўная прычына ягонага выкліку ў пракуратуру зьвязаная з агульным ціскам на няўрадавыя арганізацыі, які ўзмацніўся апошнім часам.

***29 сакавіка*** Amnesty International распаўсюдзіла адмысловую справаздачу, у якой адзначаецца, што абаронцы правоў чалавека ў Беларусі ўвесь час мусяць змагацца з перашкодамі, якія паўстаюць з боку дзяржавы – іх перасьледуюць і запалохваюць. "Беларускія праваабаронцы ўсё часьцей робяцца ахвярамі ціску і запалохваньня з боку ўладаў", – такая выснова зробленая ў адмысловай справаздачы праваабарончай арганізацыі. У дакуменце адзначаецца, што шмат праваабарончых арганізацыяў у Беларусі былі ліквідаваныя “на падставе сумнеўных законаў і палажэньняў”, а прысуды аб ліквідацыі выносіліся судамі, “незалежнасьць якіх неаднаразова ставілася пад сумнеў міжнароднай супольнасьцю”. У справаздачы

адзначаюцца істотныя абмежаваньні на свабоду слова ў Беларусі, выказваецца меркаваньне, што наступнай ахвярай стануць Інтэрнэт-выданьні.

***30 сакавіка*** Інтэрнэт-сайт Міжнароднай Лігі Правоў Чалавека belarusup-date.org зьмясьціў эксклюзіўнае інтэрв’ю з Хрыстасам Пургурыдэсам – парламентаром Рады Еўропы, аўтарам справаздачы аб зьніклых лідэрах беларускай апазіцыі. Паводле словаў сп. Пургурыдэса, найбольшай перашкодай пры падрыхтоўцы яго дасьледваньня была немагчымасьць сустрэцца з некаторымі асобамі, што мелі дачыненьне да справы. Характарызуючы агульную сітуацыю, у якой апынуліся беларускія СМІ, сп. Пургурыдэс адзначыў: "Сёньня праца ў беларускіх незалежных медыях патрабуе вялікай мужнасьці... Мяркую, пакуль міжнародная супольнасьць уважліва сочыць за падзеямі ў Беларусі, рэжым ня зможа паўтарыць тое, што ён зрабіў з Завадзкім. Але ня могуць быць выключаныя аўтакатастрофы... альбо сардэчныя прыступы..." У канцы інтэрв’ю Хрыстас Пургурыдэс выказаў упэўненасьць у неабходнасьці ўвядзеньня санкцыяў супраць беларускага рэжыму.

Напрыканцы сакавіка ўсе ўпраўленьні і аддзелы інфармацыі абласных, гарадзкіх, раённых выканкамаў, а таксама мясцовых раённых адміністрацыяўператвораныя ва ўпраўленьні і аддзелы ідэалагічнай працы. Гэтую інфармацыю пацьвердзілі адразу ў некалькіх аблвыканкамах. Зьмены праведзеныя ў адпаведнасьці з прэзідэнцкім Указам №111 "Аб удасканаленьні кадравага забесьпячэньня ідэалагічнай працы ў Рэспубліцы Беларусь", прынятым у лютым. Калі інфармацыйныя аддзелы ўваходзілі ў сістэму Мінінфармацыі, то новыя ідэалагічныя структуры падпарадкоўваюцца Адміністрацыі прэзідэнта. Структуру і штаты супрацоўнікаў упраўленьняў (аддзелаў) ідэалагічнай працы выканкамы павінны былі зацьвердзіць да 1 красавіка "з улікам колькасьці насельніцтва", але "ў межах агульнай колькасьці супрацоўнікаў". У новых упраўленьнях пакуль працуюць тыя ж людзі, што дагэтуль працавалі ва ўпраўленьнях інфармацыі. Тым часам, афіцыйныя дакументы (Палажэньні), якія павінныя вызначыць функцыі новых структураў, пакуль знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі. Раней дзейнасьць упраўленьняў інфармацыі аблвыканкамаў рэгламентавалася адпаведным палажэньнем, зацьверджаным пастановай Міністэрства інфармацыі 10 студзеня 2002 г. Пасьля зьяўленьня Указу №111 гэты дакумент фактычна перастае дзейнічаць. Акрамя гэтага, страчваюць актуальнасьць некаторыя палажэньні загаду Міністэрства інфармацыі ад 27 траўня 2003 г. №94, паводле якіх прызначэньні кіраўнікоў упраўленьняў інфармацыі аблвыканкамаў узгадняліся з міністрам інфармацыі. Цяпер кандыдатуры кіраўнікоў упраўленьняў ідэалагічнай працы аблвыканкамаў і Менгарвыканкаму зацьвярджае Адміністрацыя прэзідэнта. У сваю чаргу,

кандыдатуры кіраўнікоў ідэалагічных аддзелаў органаў выканаўчай улады ніжэйшага ўзроўню ўзгадняюцца з аблвыканкамамі. Узгадненьне кандыдатураў павінна адбыцца да 1 траўня. Гэткім жа чынам зьмяніўся і парадак зацьвярджэньня кандыдатураў на пасады галоўных рэдактараў дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Патэнцыйныя кіраўнікі агульнанацыянальных і абласных СМІ, за выключэньнем тых, каго прызначае асабіста прэзідэнт, цяпер павінны праходзіць працэдуру ўзгадненьня ў Адміністрацыі прэзідэнта. Узгадняць кандыдатуры галоўных рэдактараў мясцовых СМІ, заснаваных гарвыканкамамі, райвыканкамамі і мясцовымі адміністрацыямі ў гарадах, будуць аблвыканкамы.

## КРАСАВІК

***2 красавіка*** ў суд Цэнтральнага раёну Менску накіраваная скарга на старшыню КДБ Беларусі Леаніда Ерына. Скаргу падпісалі сваякі зьніклых апазіцыянераў Сьвятлана і Вольга Завадзкія, Зінаіда Ганчар і Ірына Красоўская. Ад імя Вольгі Захаранкі скаргу падпісаў яе прадстаўнік, праваабаронца Алег Волчак. Аўтары скаргі просяць суд прыцягнуць Леаніда Ерына да адказнасьці паводле артыкулу пра ўкрывальніцтва злачыннай дзейнасьці. Яны лічаць, што Леанід Ерын сьвядома не выконвае сваіх абавязкаў у раскрыцьці злачынстваў супраць Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Нагадаем, яшчэ напрыканцы студзеня сваякі зьніклых апазіцыянераў зьвярнуліся ў КДБ з просьбай распачаць расьследаваньне справаў пра зьнікненьні Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага, якія раней вяла пракуратура. Сваякі палічылі, што ў сьледчых пракуратуры няма шанцаў на высьвятленьне праўды ў тым ліку таму, што адным з асноўных падазраваемых у справах яны лічаць дзеючага Генеральнага пракурора Віктара Шэймана. Аднак з КДБ сваякам зьніклых нават не адказалі. Прадстаўнік сем’яў Гары Паганяйла сьцьвярджае, што заява сваякоў зьніклых была пададзеная непасрэдна ў прыёмную КДБ і адпаведным чынам афармленая. Адказ на яе мусілі даць яшчэ месяц таму. Гары Паганяйла мяркуе, што справы пра зьнікненьні ў КДБ гэтак і не заводзілі. Вядома, што сваякі зьніклых апазіцыянераў плануюць падаць у міжнародны суд на вышэйшых беларускіх чыноўнікаў, якіх падазраюць ва ўтойваньні злачынцаў. Дзеля гэтага нібыта падабраны суд адной з еўрапейскіх краінаў. Але пакуль ня страчаныя магчымасьці знайсьці праўду ў сваёй краіне. Цяпер сваякі Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага будуць чакаць, як прарэагуе на іх абвінавачаньні на адрас старшыні КДБ Леаніда Ерына Цэнтральны суд Менску.

***2 красавіка*** амбасада Рэспублікі Польшча ў Беларусі выступіла з заявай з нагоды выхаду ў эфір Першага нацыянальнага тэлеканалу праграмы "Права человека – взгляд в мир". "Беларускае дзяржаўнае тэлебачаньне вуснамі вядомага прапагандыста Яўгена Новікава... абразіла польскі народ і ўлады, калі назвала Рэспубліку Польшча, бліжэйшую суседку Беларусі, "марыянетачнай дзяржавай", – гаворыцца ў заяве. У заяве падкрэсьліваецца, што тэлепраграма выйшла "ў той самы дзень, калі прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі прыняў амбасадара Рэспублікі Польшча ў Беларусі, пра што ўсё тое ж дзяржаўнае тэлебачаньне паведаміла як пра галоўную палітычную падзею дня". Амбасада Рэспублікі Польшча нагадвае, што "Польшча зьяўляецца краінай, у якой улады выбіраюцца абсалютна дэмакратычным шляхам, зьяўляецца здаўна паўнапраўным сябрам Рады Еўропы, краінай, у якой жыхары нават самага невялікага пасёлку і вёскі маюць непасрэдны і выключны

ўплыў на тое, хто засядае ў іх мясцовых органах улады і якія прымае рашэньні ад іх імя, нарэшце – краінай, якая ажыцьцяўляе суверэнную зьнешнюю палітыку". На думку заяўнікаў, згадваньне Польшчы як "марыянетачнай дзяржавы" "зьяўляецца сапраўдным паклёпам". "Марыянетачным зьяўляецца, безумоўна, сам журналіст, які выконвае, праўдападобна, палітычны заказ колаў, зацікаўленых у пагаршэньні польска-беларускага супрацоўніцтва", – гаворыцца ў заяве. "У сьвятле гэтых падзеяў спадара Новікава ўспрымаем ня толькі як падбухторшчыка варожых адносінаў да палякаў, але і як правакатара, чые дзеяньні скіраваныя непасрэдна супраць палітыкі беларускіх уладаў, якія імкнуцца палепшыць клімат нашых двухбаковых адносінаў". Амбасада Польшчы выказвае надзею, што "падобнага тыпу скандальныя выказваньні ў далейшым ня будуць мець месца на экранах Беларускага дзяржаўнага тэлебачаньня".

***5 красавіка*** ўпраўленьне юстыцыі Гомельскага аблвыканкаму адмовілася зарэгістраваць новае абласное грамадзкае аб’яднаньне “Грамадзянская альтэрнатыва”. Ягонымі заснавальнікамі выступілі 200 грамадзянаў рэгіёну. Большасьць з іх — сябры ліквідаванага ўладамі аб’яднаньня “Грамадзянскія ініцыятывы”. Абласное ўпраўленьне юстыцыі не задаволіла тое, што новае аб’яднаньне мае намер уступаць у міжнародныя арганізацыі і займацца выдавецкай дзейнасьцю. Яшчэ адна прэтэнзія датычыць семантыкі словаў “гуманітарны” і “гуманістычны”. Істотным парушэньнем упраўленьне палічыла не пазначаны нумар пакою ў гарантыйным лісьце на разьмяшчэньне юрыдычнага адрасу. Упраўленьне не прымала афіцыйнага рашэньня адносна рэгістрацыі “Грамадзянскай альтэрнатывы” тры з паловай месяцы, хаця статутныя дакументы, паводле беларускага заканадаўства, павінны разглядацца на працягу 30 дзён. Старшыня навага аб’яднаньня Уладзімір Кацора вымушаны быў ня толькі дасылаць запыт ва ўпраўленьне юстыцыі, але і скардзіцца ў пракуратуру Рэспублікі Беларусь і Міністэрства юстыцыі. Стала вядома таксама, што Камітэт ААН па пытаньнях правоў чалавека прыняў да разгляду скаргу ліквідаванага ўладамі грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянскія ініцыятывы”. У лісьце з Вены кіраўніку “Ініцыятываў” Віктару Карніенку паведамілі, што ў адпаведнасьці з правіламі копія скаргі накіраваная для ацэнкі беларускаму ўраду. Урад павінен даць адказ Камітэту ААН пра ліквідаваньне аб’яднаньня на працягу шасьці месяцаў.

***5 красавіка*** з адкрытым лістом да аўтара і вядучага праграмы "Права человека – взгляд в мир" Першага нацыянальнага тэлеканалу Беларусі зьвярнуўся амбасадар Францыі ў нашай краіне Стэфан Шмялеўскі. “Мае калегі, амбасадары, кіраўнікі дыпламатычных місіяў дзяржаваў-сяброў Еўрапейскага Саюзу (Вялікабрытаніі,

Германіі, Італіі, Швецыі) і ўступаючых у яго дзяржаваў (Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі, Чэхіі, Эстоніі) і я асабіста ўважліва глядзім цыкл перадачаў "Права человека – взгляд в мир", — піша Шмялеўскі. – Я адрасую вам гэты ліст таксама і ад іх імя”. “Ведайце, – зьвяртаецца дыпламат да журналіста, — што не падман і не падача скажоных фактаў, якія ўтрымліваюцца ў вашых праграмах, выклікаюць зьдзіўленьне. Куды б ні накіравала нас нашае прафесійнае жыцьцё, мы даўно на розных геаграфічных шыротах сутыкаемся з прапагандысцкай хлусьнёй незалежна ад яе палітычнай афарбоўкі. Што нас зьдзіўляе, дык гэта тое, што сёньня і зараз зьяўляецца магчымай зьнявага беларускіх тэлегледачоў, якія ўводзяцца ў зман з дапамогай хлусьні”. У якасьці прыкладу Шмялеўскі прыводзіць перадачу ад 26 лютага, у якой Новікаў абвінаваціў ягонага суайчыньніка, генеральнага сакратара Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека Філіпа Кальфаяна “ў закліку да быццам бы ўзброенага супраціву супраць парушэньняў правоў чалавека”, што, як піша амбасадар, “вядома, не адпавядае рэчаіснасьці”. “У сваёй праграме вы папракаеце мяне і дзесяць маіх калегаў у тым, што мы прынялі ўдзел у адкрыцьці міжнароднай канферэнцыі па правах чалавека пад Менскам і заклікаеце МЗС Беларусі прачытаць нам сур’ёзную лекцыю, бо лічыце, што падобныя паводзіны быццам бы супярэчаць правілам дыпламатычнага этыкету”. ”А колькі працы вам каштавала праілюстраваць вышэйзгаданы тэзіс і ваш зварот да Міністэрства замежных справаў вашай краіны! – працягвае Шмялеўскі. – Вы зьвяртаецеся да мантажу кадраў, якія адзьнятыя на іншых мерапрыемствах. (...) Ці, напрыклад, абвінавачаньне ва ўдзеле ў вулічных дэманстрацыях суправаджаецца паказам майго службовага аўтамабілю. Аднак гэта больш ня мой аўтамабіль, гэта – былы службовы аўтамабіль майго папярэдніка, які прададзены амбасадай ужо некалькі гадоў таму”. Акрамя таго, па меркаваньні амбасадара, Новікаў зрабіў “абсурднае параўнаньне” самагубства брытанскага эксьперта ў галіне зброі масавага зьнішчэньня доктара Келі і “нявысьветленых зьнікненьняў” Віктара Ганчара ці Юрыя Захаранкі. “Я хацеў бы нагадаць вам, што з пункту гледжаньня такіх замежных назіральнікаў, як мы, беларускай публіцы ўласьцівая сталасьць меркаваньняў і здольнасьць граматна весьці дыскусіі на любыя тэмы. Любы журналіст, варты гэтага імя, у такой краіне, як вашая, якая разьмешчаная на мяжы з пашыраным Еўрапейскім Саюзам, павінен быў бы хутчэй спрыяць дадзеным дыскусіям, чым губляць час на рыторыку, якая засталася ў мінулым, прынамсі ў тых краінах Еўропы, якія суседнічаюць з Беларусьсю”, — піша ў заключэньні Шмялеўскі.

***5 красавіка*** ўпраўленьне юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму вынесла пісьмовае папярэджаньне моладзеваму грамадзкаму аб’яднаньню “Верас”. Рашэньне прынятае па выніках праверкі недзяржаўнай арганізацыі, якая працягвалася больш

за 3 месяцы. Асноўныя прэтэнзіі чыноўнікаў такія: паводле статуту “Верас” ня меў права ладзіць “круглы стол” па міжнацыянальных адносінах у рэгіёне і ня можа займацца валанцёрскай дзейнасьцю. Згаданае мерапрыемства адбылося ў Віцебску 3 сьнежня 2003 году ў межах праекту “Роўнасьць. Талерантнасьць. Павага”. У ім удзельнічалі прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў, актывісты мясцовых недзяржаўных арганізацыяў і журналісты. Падчас “круглага стала” аналізаваліся міжнацыянальныя стасункі ў Віцебску, выказваліся прапановы па паляпшэньні становішча ў гэтай сферы. Яшчэ адным фактам, які разглядаецца ўпраўленьнем юстыцыі як парушэньне закону, зьяўляецца стварэньне на базе грамадзкай арганізацыі мясцовага валанцёрскага цэнтру (МВЦ), які зьяўляецца структурным падразьдзяленьнем “Верасу”. У межах МВЦ маладыя людзі займаюцца дабрачыннай сацыяльнай дзейнасьцю.

***5 красавіка*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне рэдакцыі недзяржаўнай "Местной газеты". Выданьне абвінавачваюць у парушэньні артыкулаў 11 і 26 Закону аб друку, а таксама ў невыкананьні шэрагу патрабаваньняў, датычных афармленьня газеты. Асноўная прэтэнзія да рэдакцыі заключаецца ў тым, што яна не паведаміла пісьмова Міністэрству інфармацыі пра зьмяненьне перыядычнасьці выпуску газеты: замест 2 разоў яна пачала выходзіць тройчы на тыдзень. Паводле папярэджаньня, выданьне таксама пашырыла тэрыторыю распаўсюду "на Ваўкавыск, Масты, Сьвіслач, Бераставіцу, Зэльву і Смаргонь", не праінфармаваўшы пра гэта рэгіструючы орган.

***5 красавіка*** кіраўнікі «Маладога Фронту» правялі прэс-канферэнцыю па спробах КДБ вербаваць моладзь. Паводле словаў П.Севярынца і А.Шэіна, якія прывялі шмат прыкладаў, гэтыя спробы пачасьціліся асабліва апошнім часам.

***6 красавіка*** Менская транспартная пракуратура ўзбудзіла супраць Аксаны Новікавай крымінальную справу па арт. 367 ч.2 КК Рэспублікі Беларусь — паклёп на прэзідэнта Беларусі. Справа ўзбуджаная за тое, што 5 красавіка, знаходзячыся ў тунелі №2 станцыі Менск-Пасажырскі, Аксана Новікава “публічна дэманстравала ўлёткі, вырабленыя памнажальным спосабам, раздаючы іх мінакам. Названыя ўлёткі ўтрымліваюць паклёпніцкія, заведама ілжывыя зьвесткі, якія ганьбяць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спалучаныя з абвінавачаньнем у асабліва цяжкіх злачынствах”. Справа ўзбуджаная транспартным пракурорам саветнікам юстыцыі А.М. Лашыным.

***6 красавіка*** супрацоўнікі КДБ спрабавалі завербаваць старшыню Мастоўскай раённай арганізацыі «Маладога Фронту» 25-гадовага Зьміцера Кухлея. Зьміцер быў

затрыманы на чыгуначным вакзале ў Лідзе. Міліцыянты абшукалі рэчы і забралі частку накладу незарэгістраванага праваабарончага выданьня. Гэта адбылося 21 сакавіка. А неўзабаве яго запрасілі на гутарку два супрацоўнікі КДБ. Гутарка адбылася ў будынку раённай газеты. У хлопца пацікавіліся палітычнай арыентацыяй, сталі распытваць пра “Малады Фронт”. Па словах Зьміцера, дзесьці ў сярэдзіне размовы яны прапанавалі яму супрацоўнічаць з імі. Перад гэтым адзін з іх дастаў кніжачку з законам аб дзейнасьці Камітэту дзяржбясьпекі і зачытаў вытрымкі: што гэта ўсё законна, што ён можа з імі супрацоўнічаць — па асабістым жаданьні. А таксама — што за гэта прадугледжаныя стымулы, грашовыя ды іншыя. Маладафронтавец адказаў, што з КДБ супрацоўнічаць ня будзе.

***6 красавіка*** Пракуратура Рэспублікі Беларусь зноў прыпыніла расьсьледваньне крымінальнай справы аб выкраданьні журналіста Дзьмітрыя Завадзкага, які бясьсьледна зьнік 7 ліпеня 2000 году. Пра гэта паведаміў прадстаўнік Сьвятланы Завадзкай юрыст Гары Паганяйла. У паведамленьні аб прыпыненьні крымінальнай справы, якое падпісана намесьнікам начальніка аддзелу па расьсьледваньні справаў аб арганізаванай злачыннасьці і карупцыі Пракуратуры РБ Іванам Бранчэлем, гаворыцца, што крымінальная справа прыпыненая 31 сакавіка “ў сувязі з невыяўленьнем бяз вестак зьніклай асобы”. Расьследваньне справы аб выкраданьні журналіста прыпыненае ня першы раз. Апошні раз яна была ўзноўленая 10 сьнежня 2003 году. Родныя Дзьмітрыя Завадзкага не разумеюць, навошта ўлады ўзнаўлялі расьсьледваньне.

***6 красавіка*** ў Менску на Кастрычніцкай плошчы прайшла акцыя “Ланцуг неабыякавых людзей”, прысьвечаная пятай гадавіне з дня сьмерці віцэ-сьпікера парламенту Генадзя Карпенкі. Падчас раздачы ўлётак два чалавекі былі затрыманыя міліцыянтамі.

***6 красавіка*** сын старшыні агульнанацыянальнага страйкавага камітэту Беларусі Валерыя Леванеўскага быў затрыманы ў Гародні. Уладзімір Леванеўскі распаўсюджваў на рынку “Карона” ўлёткі і бюлетэнь “Прадпрымальнік”. Да яго падыйшлі людзі ў цывільным, якія прадставіліся “службай аховы рынку”, але адмовіліся паказаць дакументы. У.Леванеўскага даставілі ў Ленінскі РУУС Гародні, дзе на яго склалі пратакол. Праз дзьве гадзіны Леванеўскага адпусьцілі, у яго канфіскавалі ўсе ўлёткі і бюлетэні.

***7 красавіка*** ўвечары быў затрыманы наклад газеты "День" на пасту ДАІ каля Іўя падчас перавозкі газеты ў Гародню са Смаленскай друкарні. 4 800 асобнікаў газеты знаходзяцца ў Іўеўскім РАУСе. Прыватную машыну Міхася Белакоза, які перавозіў

наклад адзінаццатага нумару "Дня", спынілі ў 20.30 на Іўеўскім пасту ДАІ, што на паўдарозе ад Менску да Гародні. Супрацоўнікі ДАІ адразу выклікалі аператыўную групу, якая і прыняла рашэньне аб затрыманьні накладу. Па словах Белакоза, супрацоўнікі апергрупы склалі толькі пратакол агляду месца здарэньня, у якім не пазначылі прычыну затрыманьня газеты. Супрацоўнік адзелу па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі (АБЭЗ), які ўваходзіў у склад групы, адмовіўся назваць сваё прозьвішча. Праз гадзіну Белакоза адпусьцілі. Пры гэтым яму не далі ніводнага дакументу аб затрыманьні газеты. Як паведаміў дзяжурны Іўеўскага РАУС Нехвядовіч, 4800 асобнікаў газеты былі затрыманыя па прычыне таго, што "ўсе суправаджальныя дакументы выклікаюць сумненьні ў іх сапраўднасьці". Па словах рэдактара газеты Міколы Маркевіча, дакументы былі афармленыя належным чынам. Тыдзень таму наклад дзесятага нумару газеты ўжо затрымлівалі на тым самым Іўеўскім пасту ДАІ, але пасьля гадзіннага разьбіральніцтва машына з накладам тады была адпушчаная.

***7 сакавіка*** заснавальнік і галоўны рэдактар "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч накіраваў міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу афіцыйны запыт з просьбай патлумачыць сутнасьць выстаўленых прэтэнзіяў. З ягоных словаў, у рэгістрацыйным пасьведчаньні выданьня гаворыцца, што "Местная газета" мае права распаўсюджвацца па ўсёй Беларусі. У лісьце таксама згадваецца дзяржаўнае раённае выданьне "Наш час", якое афармляе выходныя зьвесткі гэтаксама, як і "Местная газета", аднак не прыцягвае ўвагі ўладаў.

***7 красавіка*** Аксана Новікава была выкліканая ў транспартную пракуратуру на папярэдні допыт – для высьвятленьня дэталяў справы. Сьледчы транспартнай пракуратуры Юры Надольскі ўдакладняў, хто раздаваў улёткі антыпрэзідэнцкага зьместу, колькі ўсяго было ўлётак, дзе яны былі зробленыя. Калі будзе наступны допыт, невядома, але Аксана Новікава застаецца падазраваемай па крымінальнай справе аб паклёпе ў адносінах прэзідэнта А.Лукашэнкі (арт.367.ч.2 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь). Нагадаем, што ў лютым 2004 году Камітэт выкананьня пакараньняў амніставаў Аксану Новікаву, якую ў красавіку 2003 году за абразу прэзідэнта пакаралі двума гадамі пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на два гады.

***7 красавіка*** ў Гародні пасьля сустрэчы грамадзкасьці з прадстаўнікамі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”, якія прыехалі з Менску, міліцыянты затрымалі аўтамабіль з улёткамі, які належыць кіраўніку абласной арганізацыі АГП Уладзіміру Чырвоненку. Гэта адбылося прыблізна ў 20 гадзінаў. Міліцыянты абшукалі машыну. У машыне Чырвоненкі былі знойдзеныя і канфіскаваныя каля 6 тысячаў улётак "Пять шагов к лучшей жизни" і календары з лагатыпам "Пяцёркі-плюс". У РАУС

супрацоўнікі міліцыі пералічылі ўлёткі і склалі пратакол. Міліцыя яшчэ затрымала чатырох чалавек, якіх таксама даставілі ў Ленінскі РАУС.

***7 красавіка*** ў Баранавіцкім каледжы лёгкай прамысловасьці звольненая з працы намесьнік дырэктара па выхаваўчай рабоце Н.А.Качура. Дырэктар каледжу атрымаў вымову. Кіраўніцтва пакаранае за тое, што ячэйка БРСМ перайшла ў апазіцыйны рух “Зубр”.

***8 красавіка*** Наваполацкія ўлады сарвалі сустрэчу вядомага мовазнаўцы і грамадзкага дзеяча, старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі са студэнцтвам. Сустрэча мелася адбыцца ў памяшканьні бібліятэкі імя Якуба Коласа, падчас якой мовазнаўца зьбіраўся прачытаць студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэту мясцовага ўніверсітэту і ўсім зацікаўленым рэферат на тэму “Праблемы рэфармаваньня беларускага правапісу і пашырэньня сферы ўжытку беларускай мовы ў сучасных умовах”.

***8 красавіка*** больш за дзесяць актывістаў Свабоднага прафсаюзу Беларускага правялі на прахадной аб’яднаньня "Полацкшкловалакно" інфармацыйную акцыю ў падтрымку Віктара Стукава, апаратара 7 цэху прадпрыемства, які ён атрымаў паведамленьне пра звальненьне. Адпрацаваўшы дваццаць гадоў апаратарам у цэху са шкоднымі ўмовамі працы, спадар Стукаў апынуўся за заводзкай прахадной – да таго ж прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасьці.

***8 красавіка*** Дзяржаўны рэгістр кінавідэафільмаў Міністэрства культуры адмовіў незалежнай студыі “Тацяна” ў выдачы пракатнага пасьведчаньня на паказ дакументальнага фільму пра жыцьцё і творчасьць Васіля Быкава “Доўгая дарога дадому... Рэквіем”. Міністэрскія чыноўнікі, забараняючы паказ кінафільму на тэрыторыі Беларусі, спасылаюцца на тое, што кінастужка нібыта можа адмоўна паўплываць “на маральна-этычныя асновы жыцьця беларускага народу”. Аднак аўтары і галоўныя героі фільма перакананыя, што сапраўднай прычынай ёсьць страх перад вышэйшымі ўладамі Беларусі, якія негатыўна ставяцца да Васіля Быкава.

***8 красавіка*** пракуратура Ленінскага раёну Гародні вынесла папярэджаньне галоўнаму рэдактару недзяржаўнай газеты "Биржа информации" Алене Раўбецкай за парушэньне артыкулу 5 Закона аб друку. Гэтую інфармацыю пацьвердзіў старэйшы сьледчы пракуратуры палкоўнік юстыцыі Аляксандр Абрамовіч. Галоўнага рэдактара папярэдзілі за тое, што газета нібыта распаўсюдзіла інфармацыю ад імя незарэгістраванай партыйнай структуры. Падставай дзеля папярэджаньня сталі дзьве публікацыі, якія зьявіліся ў газеце 29 студзеня і 18 сакавіка і належалі кіраўніку гарадзенскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі. Першы

артыкул называўся "Мы не строим воздушных замков" і быў прысьвечаны ўтварэньню партыйнай каліцыі "Пяцёрка-плюс"; у другой публікацыі ("Нокаут в первом раунде") аўтар дзяліўся ўражаньнямі ад назіраньня за выбарамі ў Расіі. 7 красавіка галоўнага рэдактара газеты Алену Раўбецкую выклікалі ў раённую пракуратуру і паведамілі, што па факце зьяўленьня гэтых публікацыяў праводзіцца праверка. Ініцыявала гэтую праверку абласная пракуратура, якая палічыла, што "Биржа информации" распаўсюдзіла інфармацыю ад імя незарэгістраванай структуры. Сьледчы раённай пракуратуры А. Абрамовіч, які гутарыў з А. Раўбецкай, спасылаўся на рашэньне ўпраўлення юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму, якое ў жніўні 2003 году адмовіла ў рэгістрацыі Гарадзенскай суполцы АГП. Раўбецкая, са свайго боку, даводзіла, што Аб’яднаная грамадзянская партыя зарэгістраваная ў Міністэрстве юстыцыі, а мясцовыя аддзяленні структуры, паводле Закону "Аб партыях", абавязаныя толькі падаць дакументы для "пастаноўкі на ўлік" у мясцовых органах улады. Гэтыя аргументы яны выклала ў тлумачальнай нататцы, якую прынесла ў пракуратуру 8 красавіка. Аднак высьветлілася, што папярэджаньне ёй ужо вынесена. А. Раўбецкая зьбіраецца дамагацца яго адмены праз суд.

***8 красавіка*** галоўны рэдактар "Народнай волі" Іосіф Сярэдзіч накіраваў БелТА адказ, у якім выказаў гатоўнасьць разгледзець прапановы наконт пакету з 9 праграмаў, у публікацыі якіх зацікаўленая газета. (БелТА ж прапануе выданьню толькі пакет коштам 5 млн. 025 тыс. рублёў, у які ўваходзяць некалькі дзесяткаў праграмаў тэлеканалаў з анонсамі). "З нагоды Вашых сьцьверджаньняў, што ў газеце "Народная воля" неаднаразова беспадстаўна (г.зн., без заключэньня адпаведнай дамовы) дапускалася публікацыя праграмаў тэлеканалаў, лічу неабходным патлумачыць, што гэта не парушае патрабаваньняў дзеючага заканадаўства РБ. Паводле заканадаўства, праграма тэле- і радыёперадачаў, як інфармацыя пра час іх выхаду ў эфір, не зьяўляецца аб’ектам аўтарскага права. Такая інфармацыя... можа быць свабодна апублікаваная ў любых газетах, калі толькі яна не суправаджаецца творамі, ахоўваемымі аўтарскім правам (напрыклад, анонсамі). У сувязі з гэтым Вашыя прэтэнзіі лічу неабгрунтаванымі", — гаворыцца ў пасланьні.

***9 красавіка*** ў цэнтры Менску супрацоўнікі міліцыі арыштавалі трох актывістаў руху "Зубр". Раман Казакевіч і Канстанцін Л. былі затрыманыя на прасьпекце Машэрава падчас расклейкі плакатаў на тумбах для аб`яваў. Яшчэ адзін актывіст руху "Зубр", непаўнагадовы Алег Радзюк, быў затрыманы на станцыі метро "Пушкінская" таксама за расклейку ўлётак. Яго даставілі ў аддзяленьне міліцыі і склалі ў дачыненьні ягоных бацькоў пратакол па артыкуле 162 КаАП (невыкананьне бацькоўскіх абавязкаў). У гэты ж дзень у Баранавічах актывіст "Зубра" Артур

Гайдукевіч быў затрыманы ў цэнтры гораду за тое, што ў яго на вопратцы быў значок з лагатыпам руху. У аддзяленьні міліцыі на яго склалі пратакол па артыкуле 167-2 КаАП РБ (выкарыстаньне незарэгістраванай сімволікі). Праз некалькі гадзінаў ён быў адпушчаны.

***9 красавіка*** ў ходзе падрыхтоўкі да чарговага паседжаньня Камісіі па правах чалавека Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў прадстаўнікі шэрагу дзяржаваў выступілі з прапановай аб увядзеньні пасады сьпецыяльнага дакладчыка ААН па правах чалавека ў Беларусі. Такім чынам, Беларусь патрапляе ў адзін шэраг з такімі краінамі, дзе парушаюцца правы чалавека, як М’янма, Конга, Сьера-Леонэ, Куба і Судан. У парадку дня сесіі Камісіі стаіць пытаньне аб парушэньнях правоў чалавека ў Беларусі. У сваёй рэзалюцыі ад 17 красавіка 2003 году "Стан правоў чалавека ў Беларусі" Камісія абвесьціла аб сваім намеры вярнуцца да беларускага пытаньня.

***9 красавіка*** суд Першамайскага раёну г. Менску адхіліў зыск Рады Беларускага Хельсінкскага камітэту і яго старшыні Тацяны Працькі да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі. Суд вырашыў, што журналісты БТ не зьне546жалі гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі сяброў БХК, бо "нейтральна выкладалі сутнасьць праблемы". Адказьнікі пры абвяшчэньні судовага рашэньня не прысутнічалі. Падставай дзеля зыску аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі Т. Працькі і рэпутацыі БХК стаў сюжэт, паказаны па Першым нацыянальным тэлеканале 2 лістапада 2003 году ў праграме "В центре внимания". Дзейнасьць БХК, Тацяны Працькі і іншых праваабаронцаў падавалася ў ім у негатыўным сьвятле: у прыватнасьці, аўтары праграмы намякалі на нямэтавае выкарыстаньне арганізацыяй буйной сумы грошай. Адказьнікамі па справе выступалі НДТРК, вядучы тэлепраграмы "В центре внимания" Сяргей Хамянтоўскі і аўтар сюжэту Юры Пракопаў. Судзьдзя Аніскевіч вырашыў, што распаўсюджаныя ў праграме зьвесткі ня могуць быць прызнаныя зьневажальнымі, паколькі яны ня ўтрымлівалі наўпроставых зьнявагаў у адрас зыскоўцаў, не парушалі "нормаў літаратурнай рускай мовы" і ўяўлялі сабою "нейтральнае выкладаньне пункту гледжаньня журналістаў". Каментуючы вынікі суда, прадстаўнік зыскоўцаў у судзе Гары Паганяйла заявіў, што "суд у чарговы раз выканаў замову выканаўчай улады". Напрацягу 10 дзён зыскоўцы зьбіраюцца абскардзіць гэтае рашэньне ў Менскі гарадзкі суд. "Мы павінныя выкарыстаць усе законныя спосабы і метады абароны сваіх правоў. Астатняе – на сумленьні судоў", – заявіў Г. Паганяйла. У тым жа Першамайскім раённым судзе знаходзіцца яшчэ адзін зыск – аб парушэньні немаёмасных правоў і кампенсацыі маральных стратаў Тацяны Працькі і яе мужа Дзьмітрыя Козыра. Падставай дзеля зыску стаў яшчэ адзін выпуск праграмы "В

центре внимания", прадэманстраваны па БТ 29 лютага, у якім вялася гаворка пра прыбытку супрацоўнікаў арганізацыі і асабістую маёмасьць Т. Працькі.

***9 красавіка*** Полацкі гарадзкі суд вынес афіцыйныя папярэджаньні актывістам Свабоднага прафсаюзу Уладзіміру Антановічу і Віктару Стукаву, якія былі затрыманыя 8 красавіка. Уладзіміру Антановічу і Віктару Стукаву інкрымінаваўся ўдзел у несанкцыянаваным пікетаваньні (арт. 167-1 КаАП РБ).

***9 красавіка*** Міністэрства юстыцыі завяршыла праверку дзейнасьці Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. Паводле яе вынікаў складзены сьпіс выяўленых парушэньняў заканадаўства. Міністэрства юстыцыі палічыла парушэньнем тое, што некаторыя літаратары стала жывуць за межамі Беларусі, а на ўваходзе вісіць “няправільны” герб. Міністэрства юстыцыі абвінавачвае Саюз пісьменьнікаў у тым, што “пры ўваходзе ў памяшканьне, дзе знаходзіцца юрыдычны адрас аб’яднаньня, маецца шыльда з указаньнем назвы, не адпавядаючай зарэгістраванай, і больш таго, з выкарыстаньнем былога дзяржаўнага гербу Рэспублікі Беларусь”. Парушэньнямі названа таксама тое, што Саюз прыняў у свае шэрагі беларускіх літаратараў, якія стала жывуць за межамі краіны, і што сябры Саюзу нерэгулярна сплачваюць штогадовыя сяброўскія складкі. За гэтыя парушэньні Міністэрства юстыцыі вынесла пісьмовае папярэджаньне, у якім сказана, што пры наяўнасьці паўторных на працягу году парушэньняў, за якія ўжо выносілася пісьмовае папярэджаньне, арганізацыя будзе ліквідаваная.

***12 красавіка*** ў Полацкім гарадзкім судзе была разгледжаная справа актывістаў руху “Зубр”. Анастасія Васіленка, Яўген Афнагель і Мікіта Сасім былі затрыманыя 12 красавіка ў Полацку і абвінавачаныя ў расклейцы ўлётак. Пасьля затрыманьня яны былі дастаўленыя ў Полацкі ГАУС, дзе на іх былі складзеныя пратаколы згодна з артыкулум 167-10 КаАП (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), а адтуль -- у суд. Судовае паседжаньне вяла судзьдзя Ірына Дародка. Судзьдзя не задаволіла хадайніцтва "зуброўцаў", каб іх правы падчас судовага паседжаньня прадстаўляў праваабаронца Зьміцер Салаўёў. Сваю адмову яна матывавала тым, што ў адміністратыўным працэсе могуць удзельнічаць толькі адвакаты. Спасылкі на Канстытуцыю і Пастанову пленуму Вярхоўнага суда, дзе тлумачыцца магчымасьць прысутнасьці прадстаўнікоў, судзьдзя пакінула па-за ўвагай. У выніку судовага паседжаньня Мікіта Сасім атрымаў штраф у памеры 10 базавых адзінак (190 000 рублёў). Яўген Афнагель і Анастасія Васіленка атрымалі папярэджаньні. Канфіскаваныя бел-чырвона-белыя сьцягі і друкаваныя матэрыялы былі прызнаныя рэчавымі доказамі і асуджаным ня вернутыя.

***13 красавіка*** суд Ленінскага раёну Менску пакараў Міхаіла Марыніча штрафам у дзесяць базавых велічыняў за публікацыю ў газеце "Народная воля". Спагнаньне (гэта прыблізна 90 даляраў ЗША) вынесьлі за тое, што ў артыкуле "Калапс?", які надрукаваны ў газеце "Народная воля", Міхаіл Марыніч называе сябе сябрам грамадзкай арганізацыі "За годнае жыцьцё". Гэтая арганізацыя пакуль не зарэгістраваная Міністэрствам юстыцыі, хаця адпаведныя дакументы туды пададзеныя. На пытаньне судзьдзі Дзьмітрыя Жданка, якім чынам так атрымалася, Міхаіл Марыніч спаслаўся на тэхнічную памылку: маўляў, пры перадрукоўцы тэксту выпадкова зьнікла слова "аргкамітэту". Пра гэта спадар Марыніч яшчэ раней паведаміў Міністэрству юстыцыі.

***13 красавіка*** Праваабарончы цэнтр "Вясна" падаў скаргу ў Камітэт па правах чалавека ААН. Скарга пададзеная ад імя старшыні Рады аб'яднаньня Алеся Бяляцкага і яшчэ 9 сяброў аб'яднаньня. Прайшло ўжо больш за паўгады з таго моманту, калі судзьдзя Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Валянціна Кулік вынесла рашэньне аб ліквідацыі Грамадзкага аб'яднаньня "Праваабарончы цэнтр "Вясна". Рашэньне, якое было вынесенае 28 кастрычніка 2003 году, уступіла ў дзеяньне адразу з моманту яго абвяшчэньня ў судзе. Згодна з дзеючым ГПК Рэспублікі Беларусь, рашэньне Вярхоўнага суда зьяўляецца канчатковым і абскарджаньню ў парадку касацыі не падлягае. Менавіта таму цяпер, калі прадстаўнікі "Вясны" скарысталі ўсе магчымасьці абароны на нацыянальным узроўні (якіх было зусім няшмат – адна наглядная скарга на імя старшыні Вярхоўнага суда), падрыхтаваная скарга ў Камітэт па правах чалавека ААН. Гаворыць юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна": "Мы спадзяемся на справядлівы разгляд нашай скаргі ў сапраўды незалежных міжнародных структурах. У скарзе ўказаныя асноўныя парушэньні нацыянальнага і міжнароднага заканадаўства, якія былі дапушчаныя падчас разгляду справы ў Вярхоўным судзе. У тым ліку ч.1 арт.14, ч.1 і 2 арт.22, арт 26 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, які быў ратыфікаваны нашай краінай. Асноўныя парушэньні, на думку "вясноўцаў", – парушэньне права на свабоду асацыяцыі і права на справядлівае судовае разбіральніцтва незалежным судом. Мы спадзяемся на справядлівы разгляд справы. Хаця разумеем, што ў выпадку станоўчага для нас рашэньня ўлады Беларусі не адновяць рэгістрацыю "Вясны" і праігнаруюць рашэньне Камітэту па правах чалавека ААН. Усё адно – для нас гэта будзе маральная перамога, пацьверджаньне нашай праваты на самы высокім міжнародным узроўні".

***13 красавіка*** родныя зьніклых беларускіх палітыкаў і журналіста накіравалі ў Камісію па правах чалавека ААН, дзе праходзяць слуханьні па Беларусі, просьбу

выкарыстаць усе магчымыя сродкі ціску на беларускія ўлады. Маці зьніклых беларускіх палітыкаў Валянціна Ганчар, Ульляна Захаранка, жонка Віктара Ганчара Зінаіда і маці зьніклага журналіста Вольга Завадзкая перадалі ліст у Камісію па правах чалавека ААН праз запрошанага на слуханьні старшыню Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алеся Бяляцкага. У сваім лісьце яны пішуць: “Мы, маці і жонкі зьніклых беларускіх палітыкаў і журналіста Зінаіда Ганчар, Валянціна Ганчар, Вольга Завадзкая, Ульляна Захаранка, цалкам падтрымліваем Рэзалюцыю ААН аб парушэньнях правоў чалавека ў Беларусі ад 17 красавіка 2003 году. Мы ўдзячныя за вашую заклапочанасьць лёсамі нашых родных. Мы інфармуем вас пра тое, што за мінулы з часу прыняцьця Рэзалюцыі год не адбылося ніякіх зьменаў са справамі аб гвалтоўных выкраданьнях апанентаў рэжыму. Вашыя заклікі аб звальненьні ці часовым адхіленьні ад займаемых пасадаў прадстаўнікоў праваахоўных органаў, якія, магчыма, датычныя да зьнікненьняў (ці адвольных пакараньняў сьмерцю) да правядзеньня належнага расьсьледваньня, не прынятыя пад увагу. Таксама не прынятыя ўсе неабходныя захады дзеля поўнага і аб’ектыўнага расьсьледваньня гвалтоўных выкраданьняў нашых родных і пакараньня вінаватых. Мы просім вас выкарыстаць усе сродкі ціску на ўлады Беларусі, якія ёсьць у вашай кампетэнцыі, з мэтай выкананьня імі абавязацельстваў перад грамадзянамі сваёй краіны, а таксама міжнароднымі абавязацельствамі, узятымі на сябе Рэспублікай Беларусь. Мы ўдзячныя вам за разуменьне той сітуацыі, у якой апынуліся нашыя сем’і, і верым, што дзеяньні, якія вы прадпрымаеце, дапамогуць выявіць праўду пра тое, што здарылася з нашымі роднымі і блізкімі. Бо, нягледзячы на тое, што прайшло ўжо шмат часу з моманту выкраданьня, мы працягваем чакаць і спадзявацца”. Родныя зьніклых спадзяюцца, што ў Рэзалюцыі, якая будзе прынятая ў Жэневе, будзе адлюстраванае і становішча з іх правамі і правамі іх родных.

***13 красавіка*** старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі быў запрошаны на сустрэчу з Нобелеўскай лаўрэаткай міру 2003 году, прэзідэнтам Цэнтру абароны правоў чалавека ў Іране Шырын Эбадзі. Падчас сяброўскай гутаркі Алесь Бяляцкі праінфармаваў спадарыню Эбадзі пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. Дасягнутае папярэдняе пагадненьне аб прыезьдзе Шырын Эбадзі ў Беларусь у 2005 годзе.

***13 красавіка*** ў Жэневе ў Палацы Нацыяў паралельна з працаю Камісіі па правах чалавека ААН адбыўся брыфінг “Правы чалавека ў Беларусі”. На брыфінгу прысутнічалі прадстаўнікі афіцыйных дэлегацыяў краінаў і НДА, якіх зацікавіла гэтая тэматыка. З апісаньнем сітуацыі ў галіне абароны правоў чалавека ў Беларусі выступілі старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі, Генеральны

сакратар FIDH (Міжнародная Федэрацыя Правоў Чалавека) Філіп Кальфаян, прадстаўнік Міжнароднай Лігі Правоў Чалавека ў Жэневе Аляксей Каратаеў. Падчас брыфінгу Ф. Кальфаян прадставіў даклад Міжнароднай юрыдычнай назіральнай місіі “Беларусь – ліквідацыя незалежнай грамадзянскай супольнасьці” па выніках візіту назіральнай місіі FIDH у Беларусь у кастрычніку 2003 году.

***13 красавіка*** Міжнародная Федэрацыя Правоў Чалавека (FIDH) прапанавала Камісіі ААН па правах чалавека запатрабаваць ад беларускага ўраду зноў надаць легальны статус тым няўрадавым арганізацыям, якія былі забароненыя падчас “зачысткі" 2003 году. У афіцыйнай заяве, накіраванай FIDH у Камісію, выказваецца занепакоенасьць няспынным перасьледам няўрадавых арганізацыяў у Беларусі. Сярод іншага ў заяве асуджаюцца дэкрэты прэзідэнта, што істотна абмяжоўваюць правы няўрадавых арганізацыяў, і кампанія па юрыдычнай ліквідацыі няўрадавых арганізацыяў. FIDH даводзіць да ведама Камісіі сьпіс арганізацыяў, ліквідаваных у 2003 годзе, і называе дзеяньні, якія сталі падставамі дзеля ліквідацыі (праваабарончая дзейнасьць, аказаньне юрыдычнай дапамогі грамадзянам, назіраньне за выбарамі). Дзеля ўплыву на становішча ў Беларусі, апроч іншага, FIDH прапануе Камісіі запатрабаваць ад беларускага ўраду вярнуць легальны статус юрыдычна ліквідаваным у 2003 годзе арганізацыям і надалей прызнаваць ролю няўрадавых арганізацыяў і праваабаронцаў у грамадзкім разьвіцьці. Прапановы FIDH як арганізацыі, якая валодае сьпецыяльным кансультатыўным статусам пры Камісіі, маюць істотнае значэньне для сяброў Камісіі. Таму цалкам верагодна, што ў выніковай рэзалюцыі Камісіі будзе зьмешчаная прапанова аб аднаўленьні законнага статусу ліквідаваных НДА.

***14 красавіка*** старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі правёў працоўную сустрэчу са Сьпецыяльным прадстаўніком Генеральнага сакратара ААН па праваабаронцах Хінай Джылані. Размова ішла пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, якая значна пагоршылася за апошні год. Алесь Бяляцкі прывёў новыя факты закрыцьця няўрадавых арганізацыяў у Беларусі, узбуджэньня крымінальных справаў за крытыку беларускіх уладаў з боку апазіцыйных палітыкаў і праваабаронцаў, перасьлед моладзі і прафсаюзаў. Хіна Джылані выказала шчырую зацікаўленасьць у новай інфармацыі з Беларусі і паведаміла, што яе офіс вельмі ўважліва адсочвае сітуацыю з правамі чалавека ў нашай краіне. Спадарыня Джылані праінфармавала, што яна ўжо некалькі разоў на працягу апошняга часу зьвярталася да беларускіх уладаў з просьбай узгадніць яе паездку ў Беларусь, але не атрымала станоўчага адказу. Тым ня менш, яна будзе і надалей рабіць актыўныя захады, каб паўплываць на сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. У гэты ж дзень, 14 красавіка,

адбылася сустрэча А. Бяляцкага з Оліў Мур, прадстаўніцай Ірландзкай місіі ў Камісіі па правах чалавека, адказнай за прадстаўленьне Рэзалюцыі аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Ірландыя старшынствуе ў Еўрасаюзе, і праект Рэзалюцыі падтрымліваецца ўсімі сябрамі ЕС. Была абмеркаваная сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі і адзначанае яе значнае пагаршэньне за апошні год.

***14 красавіка*** ў судзе Цэнтральнага раёну г. Менску адбыўся суд па адміністратыўнай справе актывісткі моладзевага руху супраціву “Зубр” Дар’і Малдаванавай, якая была затрыманая 13 красавіка каля 17 гадзінаў за тое, што разам з іншымі актывістамі вывешвала ў раёне Нямігі ў Менску шасьціметровы плакат “Он должен уйти”. Судзьдзя Наталя Вайцяховіч прызнала 18-гадовую Дар’ю Малдаванаву вінаватай у парушэньні арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў) і вынесла рашэньне аштрафаваць на 20 базавых велічыняў (380 тысячаў рублёў).

***14 красавіка*** перад пачаткам заняткаў на аграрна-тэхнічным факультэце БДАТУ (аграрна-тэхнічны ўнiверсiтэт) да Сержука Семянюка падышоў намесьнік дэкана факультэта, які паведаміў, што хоча пагутарыць з ім наконт пропускаў заняткаў і магчымых наступстваў з гэтага. Але калі яны зайшлі ў дэканат, намесьнік дэкана паказаў Сержуку на двух асобаў у цывільным, якія жадаюць паразмаўляць з ім. Асобы не прадставіліся, а толькі паведамілі, што зьяўляюцца супрацоўнікамі КДБ. Незнаёмыя адразу ж пачалі задаваць пытаньні, датычныя дзейнасьці “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў” (ЗБС) у апошнія месяцы. Найбольш іх цікавіла праваабарончая кампанія ЗБС “Адкрыты студэнцкі форум. Думкі ўслых”, у межах якой 22 красавіка павінен адбыцца бясплатны рок-канцэрт для студэнтаў, а ў траўні – міжнародная канферэнцыя па правах студэнтаў. Запытваліся аб кіраўніцтве арганізацыі і замежных партнёрах, прасілі назваць імёны і краіны, з якімі працуе ЗБС. Сяржук адмовіўся адказваць на пытаньні незнаёмых людзей. Ён лічыць, што гэта была няўдалая спроба сьпецслужбаў паўплываць на ягоную грамадзкую актыўнасьць і дзейнасьць ЗБС у цэлым. За апошні месяц гэта не адзінкавы выпадак спробаў сьпецслужбаў і адміністацыяў ВНУ рабіць уціск на сяброў ЗБС. Так, кіраўнікоў рэгіянальных суполак ЗБС выклікаюць у дэканаты, дзе папярэджваюць аб санкцыях за грамадзкую дзейнасьць. Выданьне суполкі ЗБС у БДПУ “Танкісты” (наклад 299 асобнікаў), якое распаўсюджваецца ў педагагічным універсітэце, было разгледжанае прадстаўнікамі адміністрацыяў ВНУ на семінары па ідэалагізацыі ў Менску. Адзін з прарэктароў беларускай ВНУ (у мэтах бясьпекі ён прасіў не называць сваё імя і месца працы) распавёў, што на гэтым семінары была асобная секцыя па абмеркаваньні дзейнасьці ЗБС і шляхоў уціску на арганізацыю. У сувязі з гэтымі

падзеямі Рада ЗБС заявіла, што, нягледзячы ні на якія пагрозы, уціск і бязглуздыя абвінавачаньні, ЗБС будзе працягваць змагацца за правы як сваіх сяброў, так і іншых студэнтаў, ніводзін з якіх не застанецца без дапамогі ў выпадку несправядлівага стаўленьня адміністрацыі навучальнае ўстановы і іншых структураў.

***14 красавіка*** "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" ў сваім лісьце на імя міністра адукацыі РБ Аляксандра Радзькова заявіла, што на дзяржаўным цэнтралізаваным тэставаньні дыскрымінуюць беларускамоўных выпускнікоў. Тэставыя заданьні для выпускнікоў падрыхтаваныя толькі на рускай мове. Гэтым, заяўляюць тэбээмаўцы, Міністэрства адукацыі парушыла цэлы шэраг артыкулаў дзеючага заканадаўства, якое гарантуе школьнікам роўныя лінгвістычныя магчымасьці ў сферы адукацыі, — у прыватнасьці, артыкул 6 Закону аб мовах і артыкул 50 Канстытуцыі. Яшчэ да пачатку цэнтралізаванага дзяржаўнага тэставаньня ТБМ накіравала міністру адукацыі свой пратэст у сувязі з тым, што тэставыя заданьні складзеныя толькі па-руску. У атрыманым адказе за подпісам дырэктара Рэспубліканскага інстытуту кантролю ведаў Міхаіла Фяськова чыноўнікі заяўляюць, што тэставаньне добраахвотнае, а таму, маўляў, калі не разумееце па-руску, можаце не праходзіць тэсты. Цяпер тэбээмаўцы патрабуюць ад міністра службовага разьбіральніцтва сітуацыі. Нагадаем, што па-беларуску цяпер у краіне працуе чвэрць школаў. Гэта пераважна вясковыя школы, выпускнікам якіх Аляксандр Лукашэнка абяцаў стварыць ільготныя ўмовы пры паступленьні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

***14 красавіка*** ў Вярхоўным судзе разглядаўся зыск Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі РГА "Беларускае аб'яднаньне маладых палітыкаў". Падставамі для ліквідацыі Мінюст называе неадпаведнасьць юрыдычнага адрасу фактычнаму месцазнаходжаньню. Да таго ж арганізацыі інкрымінуюць несваечасовае зьмяненьне назвы кіраўніка арганізацыі: прэзідэнта на старшыню БАПМ памяняў толькі ў сьнежні 2003 году. Па словах старшыні арганізацыі Аляксандра Цынкевіча, Мінюст спасылаецца яшчэ і на тое, што калісь пячатка арганізацыі не адпавядала стандартам МУС. Але ж гэтую неадпаведнасьць сябры арганізацыі выявілі і выправілі па ўласнай ініцыятыве. Аб'яднаньне маладых палітыкаў за ўвесь час існаваньня ад 2000 году не атрымлівала пісьмовых папярэджаньняў. У студзені 2004 году пасьля правядзеньня паседжаньня кіруючага органу ў Міністэрства юстыцыі былі накіраваныя дакументы з просьбай аб унясеньні ў Статут зьменаў, датычных юрыдычнага адрасу і назвы кіраўніка. Мінюст зьмены не зарэгістраваў, а адразу накіраваў зыск аб ліквідацыі ў Вярхоўны суд.

***14 красавіка*** падчас раздачы ўлётак “Пяць крокаў да лепшага жыцьця” каля прахадной Менскага заводу калёсных цягачоў затрыманыя два актывісты АГП Віталь Рымашэўскі і Юры Бычкоўскі. Затрыманыя былі дастаўленыя ў аддзел міліцыі Заводзкага РУУС, дзе быў складзены акт аб канфіскацыі ў іх друкаванай прадукцыі.

***15 красавіка*** суд Савецкага раёну г.Менску выклікаў Віктара Ганчара позвай на слуханьні ў якасьці адказчыка ў сувязі з нявыплатай камунальных плацяжоў. Такія ж позвы атрымалі ягоныя жонка і сын. Зьніклы палітык і ягоныя блізкія павінны зьявіцца менавіта ў той суд, які ў сьнежні 2002 году прызнаў Віктара Ганчара бяз вестак адсутным. Справа аб нявыплаце камунальных плацяжоў мае пачатак з 7 верасьня 2003 году, калі ў дзень нараджэньня Віктара Ганчара на тэхнічным паверсе дому, дзе жыве сям’я, адбыўся пажар, у выніку якога была цалкам папсаваная праводка, шпалеры, падлога, не зачыняліся нават уваходныя дзьверы. Каб кампенсаваць нанесеную шкоду, раённая адміністрацыя прыняла рашэньне дазволіць УП ЖРЭО Савецкага раёну г. Менску правесьці рамонт кватэры за кошт сродкаў бягучага рамонту і зацьвердзіла рахунак на 1 млн.320 тыс. рублёў. Аднак час ішоў, грошы не выплочваліся, а паколькі Зінаіда Ганчар была вымушаная самастойна зрабіць рамонт, яна вусна дамовілася са ЖРЭО, што вызначаныя грошы ёй кампенсуюць за кошт нявыплаты камунальных плацяжоў. Таму Зінаіда Ганчар і не плаціла на працягу апошніх месяцаў, але калі плацяжоў накапілася на суму 414 тыс. рублёў, яе разам з мужам і сынам выклікалі ў суд, які павінен пачацца 19 красавіка (хаця гэта выходны дзень). Зінаіда Ганчар зьбіраецца пайсьці ў суд і разам са сваім адвакатам Паўлам Сапелкам падаць сустрэчны зыск.

***15 красавіка*** стала вядома, што газета "Віцебская трыбуна", якая апошнім часам выходзіла як рэгіянальнае выданьне і была адзінай недзяржаўнай газетай у Воршы ды Аршанскім раёне, пазбаўленая ліцэнзіі. Пра гэта калектыў рэдакцыі даведаўся цалкам выпадкова, калі прыйшоў час узнаўляць дамову з друкарняй. У друкарню дакумент пра скасаваньне прыйшоў поштай яшчэ ў сярэдзіне лютага, аднак рэдактару "Віцебскай трыбуны" Сяргею Серабро пра скасаваньне ліцэнзіі не паведамілі, тым самым пазбавіўшы яго права абскардзіць адпаведную пастанову Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у судзе. У якасьці афіцыйнай падставы для пазбаўленьня ліцэнзіі ўказаная ліквідацыя заснавальніка — Цэнтру моладзевых ініцыятываў "Контур". Аднак "Контур" быў ліквідаваны яшчэ летась, а пастанова пра скасаваньне ліцэнзіі зьявілася толькі праз сем месяцаў. Таму ў рэдактара "Віцебскай трыбуны" ёсьць падставы меркаваць, што выданьне пазбавілі ліцэнзіі за падтрымку вядомай акцыі пратэсту віцебскіх прадпрымальнікаў: на сайце газеты зьмяшчалася

хроніка іх галадоўкі, фотаздымкі да іншыя матэрыялы. Галадоўка доўжылася з 2 да 14 лютага, і роўна праз дзень ліцэнзія "Віцебскай трыбуны" была скасаваная.

***15 красавіка*** ў Жэневе Камісія ААН па правах чалавека ўхваліла Рэзалюцыю, якая асуджае парушэньні правоў чалавека ў Беларусі. Камісія стварыла пасаду сьпецыяльнага дакладчыка па Беларусі, які павінен вывучыць сітуацыю з правамі чалавека ў краіне і даць справаздачу на наступнай сесіі. Старшыня Праваабарончага цэнтру "Вясна" Алесь Бяляцкі так пракаментаваў гэтую падзею: "Рэзалюцыя па Беларусі прымаецца ўжо другі раз. Нагадаю, што летась Камісіяй па правах чалавека ААН таксама была прынятая Рэзалюцыя па Беларусі, што было дастаткова вялікай нечаканасьцю. Як лічаць краіны, якія вынесьлі і прынялі гэтую Рэзалюцыю, сітуацыя з правамі чалавека за апошні год у Беларусі не палепшылася. Ініцыятарамі гэтай Рэзалюцыі зьяўляюцца краіны Еўрасаюзу і ЗША. У ёй ідзе гаворка пра дастаткова агульныя і вядомыя рэчы, прынамсі ў нас у Беларусі: пра той ціск, які аказваюць улады на разьвіцьцё няўрадавых арганізацыяў, пра палітычнае жыцьцё дэмакратычных партыяў Беларусі, пра нежаданьне расьсьледаваць справы зьніклых. Згадваецца таксама і тое, якія праблемы мае цяпер Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і закрыцьцё Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа. Найбольш цікавым зьяўляецца ў гэтай Рэзалюцыі (і гэта моцна адрозьнівае яе ад папярэдняй, леташняй Рэзалюцыі) тое, што ў шостым пункце прапануецца ўвесьці пасаду сьпецыяльнага дакладчыка па правах чалавека ў Беларусі ад Камісіі па правах чалавека ААН. Хачу заўважыць, што такая пасада звычайна прызначаецца толькі ў краінах з татальным парушэньнем правоў чалавека. Я думаю, гэта ёсьць наступны крок, які паказвае ўсё большую занепакоенасьць сусьветнай супольнасьці сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі". За Рэзалюцыю прагаласавалі 23 краіны, супраць – 13, а 17 краінаў устрымаліся.

***15 красавіка*** гарадзенскае грамадзкае аб'яднаньне "Бацькаўшчына" атрымала ліст ад дырэктара УЖРЭП Ленінскага раёну А. Літвіна, які загадаў арганізацыі вызваліць памяшканне да 15 траўня. "Падставай для скасаваньня дамовы зьяўляецца разьмяшчэньне гарадзенскага офісу газеты "День" у нежылых памяшканьнях... без дазволу адпаведных службаў", — гаворыцца ў пасланьні. "Бацькаўшчыну" абвінавачваюць у тым, што яна здала арандаванае памяшканьне ў субарэнду без пісьмовага дазволу арандадаўцы (УЖРЭП Ленінскага раёну) і адпаведнага рашэньня гарвыканкаму. Калі цягам месяца арганізацыя ня выедзе з займаных памяшканьняў, камунальнікі пагражаюць падаць у суд. Старшыня праўлення "Бацькаўшчыны" і галоўны рэдактар "Дня" і М. Маркевіч разглядае гэты канфлікт у адным шэрагу з нядаўнім затрыманьнем накладу газеты ў Іўі і спробай

узламаць дзьверы ў офіс. Ён сьцьвярджае, што субарэнды памяшканьня ні юрыдычна, ні фактычна не было. "День" арандуе памяшканьне ў Менску, а прэтэнзіі камунальнікаў, магчыма, выкліканыя тым, што сярод сяброў "Бацькаўшчыны" шмат журналістаў газеты "День".

***16 красавіка*** рашэньнем Вярхоўнага суда Беларусі ліквідаванае Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне “Новая група”. Падставай дзеля ліквідацыі стала неадпаведнасьць юрыдычнага адрасу рэальнаму. “Новая група” займалася валанцёрскай дзейнасьцю і была ў Беларусі прадстаўніком сусьветнай арганізацыі “Міжнародная грамадзянская служба”, якая мае больш за 80-гадовую гісторыю.

***16 красавіка*** журналістку бярозаўскай “Газеты для вас” Тамару Шчапёткіну прыцягнулі да адказнасьці за тое, што яна публічна агучыла інфармацыю, што старшыня ўчастковай камісіі прыцягвалася да судовай адказнасьці за парушэньні выбарчага заканадаўства. Падзея, якая пацягнула за сабой грамадзянскі зыск у адносінах да журналісткі бярозаўскай “Газеты для вас” Тамары Шчапёткінай, адбылася 23 лістапада 2003 году – падчас давыбараў у Белаазёрскі Савет дэпутатаў. На выбарчым участку Тамара Шчапёткіна ў прысутнасьці прадстаўнікоў АБСЕ, Нацыянальнага сходу, швецкага журналіста Тобіаса Люнгваля і іншых людзей сказала, што старшыня ўчастковай камісіі Ніна Пратасевіч “была судзімая судом” за парушэньні выбарчага заканадаўства, якія яна зьдзейсьніла падчас выбараў у мясцовыя Саветы ўвесну (3 сакавіка 2003 году), а зараз зноў узначальвае камісію. Журналістка пацікавілася ў Н.Пратасевіч, як так сталася, што кіраўнік участковай камісіі, якая парушае заканадаўства, зноў узначальвае камісію. Да таго ж, Тамара Шчапёткіна паведаміла прысутным, што і старшыня раённай камісіі Мядзьведзь прыцягвалася да адміністратыўнай адказнасьці за парушэньні выбарчага заканадаўства падчас мясцовых выбараў, а потым зноў была зацьверджаная старшынёй раённай камісіі. За гэтыя словы спадарыня Ніна Пратасевіч і падала зыск на журналістку. Гэта яна палічыла “распаўсюдам інфармацыі, якая абражае гонар і годнасьць” (арт. 153 ч. 1 Грамадзянскага кодэксу РБ). У рэшце рэшт судзьдзя Алена Нямкова прыняла бок зыскоўцы і задаволіла (часткова) зыск Пратасевіч, адзначыўшы: “суд прыйшоў да высновы, што Шчапётктна, не валодаючы сьпецыяльнымі юрыдычнымі ведамі, сказіўшы сапраўднае становішча, распаўсюдзіла аб Пратасевіч зьвесткі аб яе судзімасьці, якія не адпавядаюць рэчаіснасьці” і абавязала журналістку прынесьці публічнае выбачэньне Пратасевіч перад працоўным калектывам Белаазёрскай гімназіі і спагнаць у кошт кампенсацыі маральнай шкоды 300 000 тысячаў рублёў і дзяржпадатак 190 000 рублёў.

***17 красавіка*** пракурор Баранавічаў Аляксандр Смаль вынес папярэджаньні галоўнаму рэдактару грамадзка-палітычнага штотыднёвіка “Intex-press” Уладзіміру Янукевічу і карэспандэнту гэтага выданьня Марыне Куліковай. Журналістаў абвінавачваюць у парушэньні ч.1 артыкулу 34 Канстытуцыі РБ, а таксама артыкулаў 32 і 40 Закона аб друку. Папярэджаньне было вынесенае на падставе скаргі ў пракуратуру старшыні баранавіцкага гарвыканкаму Віктара Дзічкоўскага. Незадаволенасьць кіраўніка гарадзкога выканаўчага камітэту выклікаў артыкул "Скандал в благородном семействе" (№11 ад 11.03.2004г.), які распавядаў пра далучэньне адной з баранавіцкіх ячэек БРСМ да незарэгістраванага моладзевага руху "Зубр". Пракурор А. Смаль палічыў, што журналісты "не праверылі сапраўднасьць атрыманых зьвестак". 1 красавіка пракуратура Баранавічаў ужо спрабавала выклікаць да сябе аўтарку згаданага артыкулу, аднак візіт не адбыўся з прычыны адсутнасьці пісьмовага запрашэньня. Гэта ня першы выпадак прыцягненьня да адказнасьці журналістаў недзяржаўных медыяў нібыта за распаўсюд інфармацыі ад імя незарэгістраваных структураў. Журналісты “Intex-press” зьбіраюцца абскарджваць папярэджаньні.

***17 красавіка*** ў Новарэчыцкім мікрараёне планаваўся мітынг "За паляпшэньне ўмоваў жыцьця і дабрабыт". На мітынгу павінны былі выступіць лідэры партыяў Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". У горадзе Рэчыца зьявілася некалькі тысячаў улётак з інфармацыяй пра пададзеную заяўку і пра "Пяцёрку-плюс". Аднак гарадзкія ўлады без важкіх юрыдычных падставаў адмовілі заяўніку, старшыні Рэчыцкай арганізацыі Партыі БНФ Валерыю Пуціцкаму ў правядзеньні акцыі. Кіраўніцтва ўстановы, дзе Пуціцкі працуе інжынерам, накіравала яго на цэлы дзень на працу на буравую, каб ня мог зьявіцца на месцы меркаванага мітынгу.

***17-18 красавіка*** ў Наваполацку адбыўся міжнародны семінар “Пытаньні талерантнасьці ў беларускім грамадзтве і сьвеце”. Арганізатарамі яго выступілі Праваабарончы цэнтр “Вясна” і швецкая арганізацыя “Svenska Freds”. Гэтая арганізацыя за сваю больш як 120-гадовую гісторыю двойчы была ўзнагароджаная Нобелеўскай прэміяй міру. У працы семінару ўзялі ўдзел у асноўным прадстаўнікі праваабарончых і іншых грамадзкіх арганізацыяў Віцебскай вобласьці. Галоўным пытаньнем было абмеркаваньне праблемы талерантнасьці ў Беларусі.

***17 і 18 красавіка*** з 17.00 да 20.30 у Беларусі быў адключаны тэлеканал “Россия”. Гэтае рашэньне было прынятае Міністэрствам сувязі быццам бы ў сувязі з пазапланавымі рамонтнымі работамі. Між тым, прэс-служба тэлеканалу “Россия” абвяргае гэтае сьцьверджаньне і зьвязвае адключэньне каналу з тым, што напярэдадні ў праграме “Вести” прайшлі анонсы перадачаў “Зеркало” і “Вести

недели", асноўная тэма якіх -- палітыка беларускіх уладаў. Менавіта абвестка пра матэрыялы праграмы, дзе планавалася даволі жорсткае абмеркаваньне палітыкі Аляксандра Лукашэнкі, і выклікала так званую "прафілактыку".

***18 красавіка*** ў аддзел заступніцтва Міжнароднай Рады цэркваў евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў з Беларусі паступіла паведамленьне ад веруючых, у якім яны пішуць, што 17 красавіка ў 11 гадзінаў група хрысьціянаў-баптыстаў з гарадоў Мазыра, Берасьця і Маларыты, папярэдне паведаміўшы адміністрацыі гарадзкой бальніцы Мазыра, пачалі на тэрыторыі бальніцы віншаваць наведвальнікаў і хворых з Велікоднымі сьвятамі. Жадаючым раздаваліся кнігі Новага запавету. Мерапрыемства мела мірны характар, аднак прадстаўнік адміністрацыі забараніў яго і выклікаў міліцыю.

***21 красавіка*** ў офіс да Зьміцера Салаўёва прыйшлі супрацоўнікі інсьпекцыі Міністэрства па падатках і зборах па г. Наваполацку. А.Яловік і Л. Кадушка ў прысутнасьці Салаўёва склалі пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні – парушэньні падаткавага заканадаўства, у якім сказана, што "09.04.04 Салаўёў не дазволіў правесьці кантрольныя мерапрыемствы і выявіць, ці ажыцьцяўляецца камерцыйная (прадпрымальніцкая) дзейнасьць у памяшканьні, якое сам уладальнік называе "Офіс Зьміцера Салаўёва". Адказнасьць за дадзенае правапарушэньне прадугледжаная ў памеры ад 10 да 50 базавых велічыняў". Нагадаем, што 9 сакавіка ў памяшканьне, дзе працуе Зьміцер Салаўёў, які зьяўляўся прадстаўніком Праваабарончага цэнтру "Вясна" ў Наваполацку, таксама прыходзілі супрацоўнікі падаткавай інсьпекцыі гораду А.Яловік і Л. Кадушка. Яны мелі на руках "предписание" на правядзеньне няпланавай рэйдавай праверкі. Падаткавікі намерваліся правесьці праверку "дзейнасьці, зьвязанай з прыёмам наяўных грашовых сродкаў ад пакупнікоў (кліентаў), з вытворчасьцю прадукцыі, выкананьня работ, аказаньнем паслугаў" і г.д. Зьміцер Салаўёў адмовіўся ўпусьціць у памяшканьне супрацоўнікаў падаткавай інсьпекцыі, матывуючы тым, што гаспадарчай дзейнасьцю ён не займаецца і ніякіх аперацыяў з наяўнымі і безнаяўнымі грашыма ў дадзеным памяшканьні не зьдзяйсьняе. Салаўёў прадставіў падаткавікам неабходныя дакументы дзеля доказу сваіх словаў. Гэта была ўжо ня першая спроба ціску на праваабаронцу. Перад гэтым ён ужо выклікаўся ў міліцыю і пракуратуру, дзе яго папярэдзілі аб магчымасьці адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай (ліквідаванай) структуры.

***21 красавіка*** Чыгуначны суд Гомелю не задаволіў зыск падпісчыка "Белорусской деловой газеты" Уладзіміра Кацоры пра спагнаньне з прадпрыемства "Гомельаблпошта" маёмаснай і маральнай шкоды за спыненьне дастаўкі згаданага

выданьня. Уладзімір Кацора спрабаваў праз суд вярнуць 38 тысячаў рублёў за падпіску на “БДГ” і спагнаць на карысьць газеты паўмільёны рублёў за нанесеную яму маральную шкоду. Пошта, як лічыць спадар Кацора, пазбавіла яго крыніцы інфармацыі. Судзьдзя Мальцаў вырашыў накіраваць зыск падпісчыка Уладзіміра Кацоры ў Ленінскі суд сталіцы, дзе знаходзіцца рэспубліканскае прадпрыемства “Белпошта”. Паводле судзьдзі, менавіта “Белпошта” распарадзілася не дастаўляць газету падпісчыкам. Уладзімір Кацора выставіў зыск аддзяленьню сувязі №18, якое прымала грошы на дастаўку “БДГ”. На першым паседжаньні высьветлілася, што аддзяленьне сувязі ня мае статусу юрыдычнай асобы і ня можа быць адказчыкам. Судзьдзя Мальцаў пагадзіўся, што і прадпрыемства “Гомельаблпошта” ня можа адказваць за дзеяньні “Белпошты”.

***22 красавіка*** Вярхоўны суд прыняў рашэньне аб ліквідацыі “Беларускага аб’яднаньня маладых палітыкаў”. Суд пагадзіўся фактычна з ўсімі абвінавачаньнямі, што выставіла гэтай грамадзкай арганізацыі Міністэрства юстыцыі. Судзьдзя Філіманіхіна прызнала абгрунтаванымі абвінавачаньні Міністэрства юстыцыі ў адрас “Беларускага аб’яднаньня маладых палітыкаў” і прыняла рашэньне ліквідаваць арганізацыю. Яна прызнала парушэньнем заканадаўства тое, што аб’яднаньне два гады фактычна ня мела юрыдычнага адрасу, доўгі час карысталася пячаткай неадпаведнага ўзору і несваечасова зьмяніла назву пасады кіраўніка арганізацыі з “прэзідэнта” на “старшыню”. Прадстаўнікі БАМП спрабавалі падаць у Вярхоўны суд сустрэчны зыск супраць Міністэрства юстыцыі, але ім у гэтым адмовілі. Старшыня аб’яднаньня Аляксандр Цынкевіч сказаў, што, нягледзячы на ліквідацыю, актывісты аб’яднаньня не зьбіраюцца спыняць сваёй грамадзкай і палітычнай дзейнасьці.

***22 красавіка*** родныя зьніклых беларускіх палітыкаў і журналіста падтрымалі Рэзалюцыю Камісіі па правах чалавека ААН і прызначэньне сьпецдакладчыка па Беларусі. У сваім лісьце яны выказваюць надзею, што “выкладзеныя ў Рэзалюцыі патрабаваньні стануць кіраўніцтвам да дзеяньня для беларускіх уладаў”. У лісьце, адрасаваным у Камісію па правах чалавека ААН, Зінаіда Ганчар ад сябе і ад імя мацярок выкрадзеных Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Дзьмітрыя Завадзкага напісала: “Мы выказваем удзячнасьць за прынятую вамі 15 красавіка 2004 году чарговую Рэзалюцыю аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі. Мы ўдзячныя вам, што праблема з гвалтоўнымі зьнікненьнямі нашых родных, палітычных апанентаў існуючага рэжыму і журналіста, працягвае гучаць на такім высокім узроўні, і да нашай бяды не застаюцца абыякавымі ўсё больш людзей у розных краінах сьвету. Мы спадзяемся, што выкладзеныя ў Рэзалюцыі патрабаваньні будуць нарэшце пачутыя і ня толькі прынятыя да ўвагі, але і стануць кіраўніцтвам да

дзеяньня для беларускіх уладаў. Мы падтрымліваем ваша рашэньне аб прызначэньні сьпецдакладчыка, з якім мы радыя будзем сустрэцца ў Беларусі і больш поўна распавесьці пра тое, што адбылося з нашымі роднымі і як вядзецца сьледзтва”.

***22 красавіка*** Вярхоўны суд Беларусі ліквідаваў адразу дзьве незалежныя арганізацыі — “Беларускі цэнтр канстытуцыяналізму і параўнальна-прававых дасьледваньняў” і “Міжнародны інстытут палітычных дасьледваньняў”. Абедзьве арганізацыі — дасьледчыя, але ў галінах, вельмі блізкіх да рэальнай палітыкі. Першая вядомая сваім супрацоўніцтвам з Радай Еўропы ў галіне правоў чалавека. За сем гадоў сваёй дзейнасьці “Беларускі цэнтр канстытуцыяналізму і параўнальна-прававых дасьледваньняў” правёў некалькі канферэнцыяў па гэтых праблемах, надрукаваў 30 кніг. Сярод іх такія вядомыя працы, як “Адмена сьмяротнага пакараньня ў Рэспубліцы Беларусь” і “Палітычныя партыі ў Рэспубліцы Беларусь”. Навукоўцы з “Міжнароднага інстытуту палітычных дасьледваньняў” вывучалі праблемы бясьпекі, міжнародных адносінаў, асаблівасьці палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Абедзьве арганізацыі ліквідаваныя паводле ініцыятывы Міністэрства юстыцыі. У адным выпадку кантралёры з Мінюсту знайшлі хібы ў рэгістрацыйных дакументах, у другім – высьветлілі, што насуперак закону юрыдычны адрас знаходзіцца на прыватнай кватэры. Супрацоўнік “Міжнароднага інстытуту палітычных дасьледваньняў” А. Фёдараў не выключае, што ліквідацыя арганізацыяў зьвязаная з падрыхтоўкай уладаў Беларусі да палітычных кампаніяў: да парламенцкіх выбараў і магчымага рэферэндуму аб зьменах у Канстытуцыі адносна трэцяга прэзідэнцкага тэрміну.

***22 красавіка*** арганізатар мітынгу, які адбыўся ў Слоніме з нагоды 86-х угодкаў БНР, кіраўнік раённай арганізацыі БНФ “Адраджэньне” Іван Бедка атрымаў у судзе папярэджаньне. Іван Бедка меў афіцыйны дазвол на правядзеньне мітынгу, аднак міліцыянты склалі на яго два пратаколы. Першы — наконт выкарыстаньня бел-чырвона-белага сьцягу. У другім напісалі, што Партыя БНФ у Слоніме не зарэгістраваная, таму мітынг быў несанкцыянаваны. У судзе Іван Бедка патлумачыў, што падаваў заяву на правядзеньне мерапрыемства не ад партыі, а грамадзкае аб’яднаньне БНФ “Адраджэньне” ў горадзе якраз зарэгістраванае. Судзьдзя Тамара Хамянец зазначыла, што тут на самой справе няма парушэньня па артыкуле 167-10 КаАП РБ, які мае на ўвазе дзеяньні ад імя “незарэгістраванай арганізацыі”. Аднак палітыка папярэдзілі па артыкуле 167-2 КаАП РБ — “карыстаньне незарэгістраванай сімволікай”.

***23 красавіка*** Наваполацкі гарвыканкам забараніў мітынг з удзелам прадстаўнікоў передвыбарчага блоку “Пяцёрка-плюс”. Заяўка на правядзеньне мітынгу была пададзеная яшчэ 6 красавіка. Ён мусіў адбыцца на пляцы ля гарадзкога палацу культуры, які вызначаны гарадзкімі ўладамі дзеля падобных акцыяў, аднак падавальнік заяўкі, праваабаронца Зьміцер Салаўёў, атрымаў афіцыйную паперу аб забароне мерапрыемства. Прычына забароны ў лісьце тлумачыцца так: “Да заявы не прыкладзенае абавязацельства ў пісьмовай форме арганізатара альбо асобы, адказнай за арганізацыю і правядзеньне масавага мерапрыемства, па арганізацыі і правядзеньні масавага мерапрыемства”. Паводле спадара Салаўёва, гэта супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе грамадзянам свабоду правядзеньня сходаў і мітынгаў.

***23 красавіка*** у Тацяны Процькі, старшыні грамадзкай арганізацыі “Беларускі Хельсінкскі камітэт”, узятая падпіска аб нявыезьдзе. Пра гэтае рашэньне Т.Процьцы паведаміў сьледчы А. Залеўскі. Напярэдадні БХК падаў зыск у Гаспадарчы суд Менску аб прызнаньні рашэньня інсьпекцыі Міністэрства падаткаў і збораў па Маскоўскім раёне сталіцы аб накладаньні санкцыяў на БХК цалкам несапраўдным. Міжнародная Хельсінкская Федэрацыя лічыць, што крымінальная справа супраць БХК мае яўную палітычную матывацыю і заклікае зьняць усе абвінавачаньні з праваабаронцаў.

***25 красавіка*** на рынку ў Лідзе быў затрыманы Уладзімір Леванеўскі — сын старшыні агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага.

***26 красавіка*** старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка выказаў намер ад імя партыі падаць заяву ў суд на Беларускае телебачаньне за хлусьлівыя зьвесткі ў адрас партыі, якія прагучалі ў адной з перадачаў адносна пазіцыі па чарнобыльскай праблеме. В. Вячорка сказаў: “Кожны, хто ведае гісторыю чарнобыльскага пытаньня, ведае таксама, што зрабіў Беларускі Народны Фронт дзеля зьмяншэньня наступстваў бяды, а што пасьля нарабіў Лукашэнка з памагатымі. Менавіта БНФ прымусіў улады прызнаць, што адбылася катастрофа і ўрэшце прыняць гэтак званую канцэпцыю беларускіх навукоўцаў – спыніць выраб харчовай прадукцыі ў забруджаных раёнах, з найбольш заражаных перасяліць людзей”.

***26 красавіка*** стала вядома, што гарадзкую філію “Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны” ў Гародні высяляюць з памяшканьня. Пакінуць месца таварыства павінна праз месяц, інакш яго прымусяць гэта зрабіць праз гаспадарчы суд. Старшыня арганізацыі ТБМ Мікола Маркевіч быў зьдзіўлены, калі даведаўся пра

высяленьне, паколькі таварыства своечасова заплаціла за арэнду. У жыльлёва-эксплуатацыйным прадпрыемстве Ленінскага раёну Гародні яму выдалі афіцыйную паперу з такім зьместам: дамова аб арэндзе з ТБМ скасоўваецца, бо ў арандаваным памяшканьні без дазволу месьціцца офіс газеты “День”, якую рэдагуе Маркевіч.

***26 красавіка*** ў дачыненьні да кіраўніка слонімскага грамадзкага аб’яднаньня “Воля да разьвіцьця” Міхася Варанца ўзбуджаная крымінальная справа па артыкуле 243 “Ухіленьне ад выплаты падаткаў”. 27 красавіка Міхась Варанец быў выкліканы да сьледчага для допыту ў якасьці падазраваемага. Падставай дзеля ўзбуджэньня справы стала тое, што “Воля да разьвіцьця” нібыта парушыла парадак выкарыстаньня грашовых сродкаў, атрыманых у якасьці фінансавай дапамогі па праграме TACIS у 2003 годзе. Сродкі, выдзеленыя ГА “Воля да разьвіцьця” дзеля рэалізацыі праекту “Падлеткавы клуб “Сьвятліца”, згодна з пагадненьнем паміж урадам Беларусі і Еўракамісіяй, былі першапачаткова вызваленыя ад усіх падаткаў і плацяжоў у бюджэт. Аднак слонімская падатковая інсьпекцыя вырашыла кіравацца не міжнародным пагадненьнем (якое мае большую сілу за любыя ўнутрыбеларускія законы і падзаконныя акты), а інструкцыямі, якія прадугледжваюць выплату падаткаў з усіх праграмаў замежнай бязвыплатнай дапамогі. З-за нібыта нявыплаты падаткаў 16 сакавіка была канфіскаваная маёмасьць ГА “Воля да разьвіцьця”, і на арганізацыю накладзеныя штрафныя санкцыі на суму больш за 15 тысячаў даляраў. З улікам таго, што памер нібыта нясплочаных падаткаў падпадае пад вызначэньне буйнога, слонімская фінансавая міліцыя ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненьні да кіраўніка арганізацыі сп. Варанца. Частка першая арт. 243 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін да трох гадоў. Адначасова з гэтым М.Варанец накіраваў у суд Слонімскага раёну скаргу на незаконныя дзеяньні лейтэнанта фінансавай міліцыі Уладзіміра Юрчакі, які аказваў на яго псіхалагічны ціск і парушаў ягоныя працэсуальныя правы. Дадзеная крымінальная справа зьяўляецца аналагам той, якая ўзбуджаная ў адносінах да старшыні РГА “Беларускі Хельсінкскі камітэт” Тацяны Процькі і бухгалтара арганізацыі Тацяны Рудкевіч. Іх таксама абвінавачваюць ў парушэньні парадку выкарыстаньня грошай, атрыманых па праграме TACIS.

***26 красавіка*** ў Менску адбыўся традыцыйны "Чарнобыльскі шлях". Каля тысячы чалавек сабралася на плошчы Якуба Коласа. Удзельнікі шэсьця і мітынгу трымалі плакаты з надпісамі: “Час скончыць эпоху палітычнага Чарнобылю”, “Спыніць выраб радыёактыўных прадуктаў” і інш., у якіх асуджаліся апошнія выступы А. Лукашэнкі, які наведаў пацярпелыя пасьля аварыі на ЧАЭС раёны і заявіў, што там "чыста і можна вырошчваць цыбулю". Міліцыянты папярэджвалі, што збор на плошчы Якуба

Коласа забаронены. Але масавых затрыманьняў не было. Пасьля таго, як людзі паспрабавалі пачаць рух, зьявіліся амапаўцы, якія перакрылі шлях у бок цэнтру гораду. Яны ж паспрабавалі затрымаць лідэра АГП Анатоля Лябедзьку, але гэта ім не ўдалося. Калона па прасьпекце Ф. Скарыны накіравалася да Акадэміі навук. Пасьля павароту з прасьпекту на вуліцу Сурганава начале калоны зьявіўся жалобны звон, які заўсёды гучаў падчас гэтых акцыяў, а потым і абраз – арганізатары шэсьця напачатку пабойваліся, што яго могуць канфіскаваць. На вуліцы Сурганава калона, да якой увесь час далучаліся людзі, упершыню выйшла на праезную частку, бо на ходніку зьмясьціцца не змагла. На рагу вуліцаў Сурганава і Карастаянавай акадэмік Іван Нікітчанка прапанаваў ушанаваць памяць ахвяраў Чарнобылю хвілінай маўчаньня. Ён нагадаў пра наступствы катастрофы для здароўя беларускага народу. Потым выступілі Аляксандр Дабравольскі, Вінцук Вячорка і інш. Арганізатарам шэсьця міліцыянты адразу ж уручылі позвы ў РАУС на раніцу 27 красавіка. Сярод тых, хто атрымаў позвы – Людміла Гразнова (АГП), Алесь Міхалевіч (намесьнік старшыні Партыі БНФ), Павел Знавец (БСДГ), Генадзь Быкаў (старшыня Свабоднага прафсаюзу).

***26 красавіка*** перад пачаткам акцыі “Чарнобыльскі шлях” Управа Партыі БНФ была заблакаваная асобамі ў цывільным, якія перашкаджалі выезду транспарату і затрымлівалі людзей, што выходзілі з будынку. Спачатку каля Управы быў затрыманы польскі журналіст, які паказаў журналісцкае пасьведчаньне і быў адпушчаны. А ў 18.00 быў арыштаваны актывіст Партыі БНФ Андрэй Сухаверхі. Калі А.Сухаверхі выязджаў са двара, на ягоную машыну накінуліся людзі ў цывільным і спрабавалі спыніць яе, пры гэтым ніякіх пасьведчаньняў не паказвалі. Адзін з іх ударыўся аб капот машыны, якая рухалася на самай мінімальнай хуткасьці. А.Сухаверхі адразу спыніў машыну, калі зьявіліся супрацоўнікі ДАІ. У А.Сухаверхага забралі правы кіроўцы і пакінулі яго машыну на стаянцы Савецкага РУУС дзеля “правядзеньня экспертызы”. А.Сухаверхі быў дастаўлены ў РУУС Савецкага раёну, дзе склалі пратакол з абвінавачваньнем ва “ўчыненьні ДТП”.

***26 красавіка*** ў Віцебску былі затрыманыя 11 удзельнікаў акцыі, прысьвечанай гадавіне Чарнобыльскай катастрофы. Сярод затрыманых: старшыня гарадзкой арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Алена Залеская і актывісты гэтай партыі – Эла Канавалава і Уладзімір Семенчукоў. Былі затрыманыя некалькіх мінакоў, якія далучыліся да калоны ў час акцыі. Такім чынам былі затрыманыя пенсіянерка Роза Пушкарова і карэспандэнт Радыё Палонія Юрась Сьцяпанаў, у якога знайшлі недзяржаўныя друкаваныя выданьні. З тае самае прычыны затрымалі і сябра КХП-БНФ Яна Таўпыгу, які прайшоў разам з удзельнікамі акцыі усяго некалькі

метраў, і студэнта медыцынскага ўніверсітэту Кастуся Кузьняцова – пра яго міліцыянты сказалі, што ён стаяў побач ды замінаў ім працаваць. Яшчэ двум сябрам АГП – Фёдару Бакунову ды Сяргею Катушову – супрацоўнікі міліцыі на вуліцы наладзілі асабісты ператрус: у іхнім адзеньні ды рэчах яны таксама шукалі ўлёткі. Бо паводле супрацоўнікаў міліцыі, гэтыя ўлёткі ўтрымліваюць непажаданую інфармацыю пра наступствы Чарнобылю. На ўсіх затрыманых склалі пратаколы за адміністратыўнае парушэньне – удзел у несанкцыянаванай акцыі.

***26 красавіка*** Менскі гарадзкі суд адхіліў касацыйную скаргу рэдакцыі газеты "Народная воля", якая дамагалася адмены рашэньня суда Ленінскага раёну ад 18 лютага. Тады суд часткова задаволіў зыск ТАА "Альянс-медиа" (заснавальнік газеты "Обозреватель") аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі, абавязаўшы рэдакцыю выданьня надрукаваць абвяржэньне артыкулу Антона Кузняцова "Как "Обозреватель" Сергея Атрощенко по-бандитски обошёлся с Леонидом Левиным". Акрамя гэтага, суд абавязаў рэдакцыю пакрыць судовыя выдаткі і аплаціць паслугі адваката зыскоўцаў. Першапачаткова ТАА "Альянс-медиа" патрабаваў спагнаць з рэдакцыі яшчэ і 50 млн. рублёў у якасьці кампенсацыі маральных стратаў.

У ***ноч з 26 на 27*** красавіка быў арыштаваны Міхаіл Марыніч – былы міністр зьнешнеэканамічных сувязяў Беларусі, былы пасол Беларусі ў Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі. 26 красавіка Міхаіл Марыніч ў 15.00 быў запрошаны на допыт у Камітэт дзяржаўнай бясьпекі. Увечары пачаўся вобыск на дачы, пасьля якога быў канфіскаваны архіў, а М.Марыніч затрыманы па падазрэньні ва ўчыненьні крымінальнага злачынства.

***27 красавіка*** ў Гародні пакаралі арыштам Дзьмітрыя Іваноўскага — намесьніка старшыні грамадзкага аб’яднаньня прадпрымальнікаў “Персьпектыва”. Суд палічыў яго актыўным удзельнікам вулічнага сходу прадпрымальнікаў 26 красавіка і прысудзіў 15 сутак арышту.

***27 красавіка*** судзьдзя суда Савецкага раёну г. Менску Наталя Скугарава вынесла рашэньне па адміністратыўнай справе Андрэя Козела — 7 сутак арышту. Актывіст Аб’яднанай грамадзянскай партыі Андрэй Козел быў затрыманы ўвечары 26 красавіка, пасьля заканчэньня акцыі “Чарнобыльскі шлях”, і правёў ноч у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на вул. Акрэсьціна ў Менску. Яго абвінавацілі ў парушэньні арт 167.-1 ч.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавага мерапрыемства). Гэты артыкул прадугледжвае наступныя пакараньні – папярэджаньне, штраф ад 20 да 150 базавых велічыняў і арышт ад 3 да 15 сутак.

***27 красавіка*** судзьдзя суда Савецкага раёну г. Менску Руслан Казадаеў заслухаў 6 сьведкаў па справе Людмілы Гразновай. Л. Гразнова не аспрэчвала свой удзел у несанкцыянаваным шэсьці. Яна абуралася рапартамі супрацоўнікаў міліцыі, у якіх было запісана, што Гразнова нібыта крычала, заклікала станавіцца ў калону і размахвала рукамі. Людмілу Гразнову абвінавацілі ў парушэньні артыкулу 167.1 ч.2 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Руслан Казадаеў аштрафаваў Людмілу Гразнову на 225 базавых велічыняў (каля 2 000 даляраў ЗША).

***27 красавіка*** аднаго з арганізатараў акцыі “Чарнобыльскі шлях”, намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча абвінавацілі ў парушэньні артыкулу 167.1 ч.2 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Судзьдзя суда Савецкага раёну г. Менску Аксана Рэлява вынесла прысуд – арышт на 10 сутак. Ня ўсе арганізатары акцыі прыйшлі згодна з позвамі ў міліцыю. Павел Знавец прынцыпова вырашыў не ісьці. Генадзь Быкаў прыйшоў, але міліцыянты ўзялі ў яго тлумачэньні, прагледзелі відэастужку і адпусьцілі. Справа ў тым, што спадар Быкаў быў на плошчы ля каменю ахвярам Чарнобыльскай катастрофы і ў шэсьці ня ўдзельнічаў.

***27 красавіка*** падчас сходу ў вёсцы Струга начальнік аддзелу інфармацыі Маларыцкага райвыканкаму Сяргей Строк заявіў, што Партыя БНФ у гады вайны была на баку фашысцкай Германіі. Сходы ў вёсках Струга і Пажэжын Берасьцейскай вобласьці адбыліся па ініцыятыве дэпутата Маларыцкага раённага Савету Уладзіміра Малея, маёра запасу, які 21 год праслужыў у ракетных войсках стратэгчічнага прызначэньня, а зараз зьяўляецца сябрам Партыі БНФ. У. Малей паведаміў мясцовым жыхарам, што яны маюць магчымасьць праз мясцовы рэферэндум прадухіліць будаўніцтва на мяжы Берасьцейскага і Маларыцкага раёнаў могільніку забруджанага радыяцыяй грунту з Берасьцейскага аб’екту “802”. Пасьля выступіў начальнік аддзелу інфармацыі Маларыцкага райвыканкаму Сяргей Строк, які заявіў што ня варта слухаць апазіцыю. Сяргей Строк заявіў: “Я вам скажу болей: “Гэты таварыш (калі яго можна назваць таварышам) Уладзімір Малей — сябра Партыі БНФ. Гэтая партыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі вы былі маладыя, была на баку фашысцкай Германії”. Між тым, БНФ быў створаны ў 1988 годзе — праз 43 гады пасьля заканчэньня вайны. Прысутныя на сходзе актывісты незарэгістраванага моладзёвагу руху “Зубр” пацікавіліся, дзе Сяргей Строк працаваў раней, на што той адказаў, што “па адукацыі ён гісторык”.

***27 красавіка*** ў Берасьці падчас раздачы інфармацыйных матэрыялаў затрыманыя чатыры сябры гарадзкой арганізацыі Беларускай сацыял-

дэмакратычнай партыі (Народная грамада). Інфармацыйныя матэрыялы, якія сацыял-дэмакраты распаўсюджвалі сярод берасьцейцаў, тычыліся дзейнасьці БСДП (Народная грамада), адносінаў гэтай партыі да Еўрасаюзу і сьвяткаваньня 1 траўня як Дня барацьбы працоўных за свае правы. Акрамя затрыманьня сяброў БСДП(НГ), якіх абвінавацілі ў распаўсюдзе незарэгістраванай друкаванай прадукцыі, міліцыянты вырашылі канфіскаваць партыйныя ўлёткі.

***27 красавіка*** судзьдзя Івацэвічскага раёну Юры Янчук часткова задаволіў зыск былога памочніка пракурора Бярозаўскага раёну Федчанкі да рэгіянальнай “Газеты для вас” і журналісткі Тамары Шчапёткінай. Зыск тычыўся абароны гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі былога памочніка пракурора Бярозаўскага раёну Федчанкі і кампенсацыі маральнай шкоды. За надрукаваныя ў газеце артыкулы і распаўсюджаныя зьвесткі зыскоўца патрабаваў спагнаць з рэдакцыі кампенсацыю ў памеры 10 млн. рублёў і 1 млн. рублёў з журналісткі. Суд вырашыў спагнаць з Т.Шчапёткінай 40 тыс. рублёў і дзяржпошліну 95 тыс., а з “Газеты для вас” -- адпаведна 400 тыс. рублёў і 95 тыс. рублёў.

***27 красавіка*** сябры Аб’яднанай грамадзянскай партыі Фёдар Бакуноў і Сяргей Катушонак трапілі ў нейрахірургічнае аддзяленьне віцебскага абласнога шпіталю пасьля нападу чатырох невядомых людзей у цывільным. Спадары Бакуноў ды Катушонак распавялі, што па сканчэньні чарнобыльскай жалобнай акцыі яны вярталіся з офісу гарадзкой арганізацыі АГП, куды заносілі сімвалічны чарнобыльскі звон. Каля васьмі вечара на мосьце імя Блахіна, недалёка ад кінатэатру “Беларусь”, каля іх спынілася цёмная іншамарка, з якой выйшлі чацьвёра невядомых. Двое з іх засталіся каля машыны, астатнія нібыта прайшлі ўздоўж іх. Апошняе, што памятаюць Фёдар Бакуноў ды Сяргей Катушонак — моцны ўдар па галаве, нанесены ў патыліцу. Апрытомнелі яны толькі праз некалькі гадзінаў на бязьлюдным пустыры недалёка ад месца нападу. Выпадковы кіроўца дапамог ім дабрацца да шпіталю, адкуль ужо ўраньні яны змаглі датэлефанавацца да сваякоў. Ф. Бакуноў і С. Катушонак заявілі пра зьдзейсьнены на іх напад у міліцыю.

***28 красавіка*** раніцай у КДБ былі выкліканыя сыны М. Марыніча Павел і Ігар. Пасьля размоваў з імі сьледчыя правялі ператрус у гаражы П. Марыніча. Ператрус працягваўся больш за тры гадзіны і завяршыўся канфіскацыяй некаторых дакументаў арганізацыі “Дзелавая ініцыятыва”, якой кіраваў М. Марыніч. П. Марыніч паведаміў пра размову адваката і бацькі са сьледчымі КДБ. Падчас гэтай размовы экс-міністр патлумачыў паходжаньне нібыта знойдзеных у яго на лецішчы 90 тысячаў даляраў, двух пісталетаў і сакрэтных дакументаў.

***28 красавіка*** стала вядома, што рэгіянальнай гомельскай газеце "Вольны час" адмовілі ў супрацоўніцтве тры друкарні: рэчыцкае прадпрыемства "Тытул", гомельская друкарня "Палесдрук" і менская "Сьветач". Усе яны спасылаюцца альбо на вялікую загружанасьць, альбо на праблемы з абсталяваньнем. Аднак заснавальнік і галоўны рэдактар газеты Уладзімір Вербавікоў лічыць, што яго выданьне не бяруць у друк з палітычных меркаваньняў. Апошні нумар недзяржаўнага штотыднёвіка "Вольны час" пабачыў сьвет у жніўні 2003 году. Пэўны час газета не выходзіла з фінансавых прычынаў.

***28 красавіка*** ў Страсбургу Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы (ПАРЕ) прыняла Рэзалюцыі па Беларусі. У Рэзалюцыях, прынятых большасьцю галасоў удзельнікаў, парламентарыі патрабавалі ад беларускіх уладаў адстаўкі Генеральнага пракурора Віктара Шэймана і правядзеньня “сапраўды незалежнага расьсьледваньня” выпадкаў зьнікненьня людзей. ПАРЕ заклікала беларускія ўлады спыніць практыку перасьледу незалежных СМІ і журналістаў, унесьці ў заканадаўства зьмены, якія адпавядаюць міжнародным дэмакратычным прынцыпам і захоўваць фундаментальныя правы і свабоды.

***29 красавіка*** ў Гародні міліцыянты затрымалі двух сыноў і дачку Валерыя Леванеўскага — кіраўніка незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў Беларусі. Затрыманых пасадзілі ў адну машыну і даставілі ў Ленінскі райаддзел міліцыі для разьбіральніцтва. Кацярыне Леванеўскай — 17 гадоў, а яе братам Уладзіміру і Дзьмітрыю — 18 і 20 гадоў. Уладзімір Леванеўскі з братам і сястрой раздавалі на рынку “Карона” ўлётку з паведамленьнем пра страйк прадпрымальнікаў, які плануецца ў траўні, ва ўлётцы быў таксама заклік прыйсьці 1 траўня на мітынг.

***29 красавіка*** МЗС Польшчы распаўсюдзіў заяву з нагоды затрыманьня ў Менску польскага вайсковага аташэ палкоўніка Казімера Віташчыка. У заяве, гаворыцца, што беларускія сьпецслужбы затрымалі палкоўніка Віташчыка з парушэньнем Жэнеўскай канвенцыі. “Затрыманьне польскага дыпламата ў Менску адбылося з парушэньнем міжнародных дамоўленасьцяў, якія падпісала Беларусь. Амбасадар Польшчы ў Беларусі ўжо накіраваў да менскіх уладаў пратэст па справе затрыманьня палкоўніка Казімежа Віташчыка”, – гаворыцца ў заяве МЗС Польшчы. Польскае зьнешнепалітычнае ведамства інфармуе таксама, што палкоўнік Віташчык быў тэрмінова выкліканы для высьвятленьня ўсіх акалічнасьцяў здарэньня ў Варшаву, дзе цяпер і знаходзіцца. Амбасадар Польшчы ў Беларусі Тадэвуш Паўляк таксама паведаміў, што затрыманьне польскага аташэ адбылося з парушэньнем канвенцыяў, што датычаць дыпламатаў.

***29 красавіка*** Міністэрства інфармацыі РБ вынесла афіцыйнае папярэджаньне газеце "Прессбол" за публікацыю коміксаў “пра Сашу і Сірожу”. Маляваў іх мастак-авангардыст Аляксей Хацкевіч, а тэксты складаў сам галоўны рэдактар "Прессбола" Уладзімір Беражкоў. Як кажа Беражкоў, газеце паставілі ў віну, што персанажы коміксаў размаўляюць па-руску няправільна. Рэдактар вырашыў не “падстаўляць” пад удар газету і коміксы больш не друкаваць.

## ТРАВЕНЬ

***1 траўня*** Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) разам са сваімі саюзнікамі па Еўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" адсьвяткавалі Дзень Працы. У гэтым годзе сацыял-дэмакратычнае сьвята набыло яшчэ адно важнае значэньне – 1 траўня нашыя суседзі -- Польшча, Літва, Латвія -- сталі часткай Еўрапейскага Саюзу. Актывісты менскай гарадзкой арганізацыі БСДП (НГ) і маладыя сацыял-дэмакраты ўдзельнічалі ў санкцыянаванай Менгарвыканкамам маёўцы ў парку Янкі Купалы. Каля помніка вялікаму паэту яны разгарнулі бела-чырвона-белыя сьцягі, а таксама сьцягі Еўрасаюзу. Людзям раздавалі літаратуру пра Еўрапейскі Саюз. Сацыял-дэмакратаў падтрымалі моладзевыя рухі "Малады Фронт" і "Зубр", Партыя жанчын “Надзея”, Еўрапейскі Рух і Еўрапейскі Дом. Дзеяньні сацыял-дэмакратаў выклікалі неадэкватную рэакцыю ўладаў. Невядомыя ў цывільным напалі на ўдзельнікаў акцыі. Людзей зьбівалі, адбіралі ў іх сьцягі і лозунгі. Некаторых маладых людзей, якія трымалі сьцягі Еўрасаюзу і нацыянальныя сьцягі, схапіўшы за рукі і ногі, цягнулі ў міліцэйскія машыны. Рабіліся спробы адабраць сьцягі БСДП (НГ), але сацыял-дэмакратам удалося абараніць сваю сімволіку. Былі затрыманыя пяць удзельнікаў маёўкі, у тым ліку -- намесьнік старшыні грамадзкага аб’яднаньня "Маладыя сацыял-дэмакраты", сябра Управы Еўрапейскага Руху Павел Гормаш. Пазьней яму было прад’яўленае абвінавачаньне ў “распаўсюдзе ўлётак, якія заклікаюць да ўступленьня ў Еўрасаюз”. Акцыі сацыял-дэмакратаў прайшлі таксама ў буйных гарадах Беларусі.

***1 траўня*** ў Гародні лідэр агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерый Леванеўскі быў затрыманы каля пад’езду ўласнага дому. Яго спыніў незнаёмы мужчына, які прадставіўся супрацоўнікам міліцыі і папрасіў прайсьці з ім у аддзяленьне міліцыі. У аддзяленьні міліцыі “Дзевятоўка” ў Валерыя Леванеўскага былі забраныя грошы і пашпарт, затым яго накіравалі ў ізалятар часовага ўтрыманьня Ленінскага РУУС г. Гародні. Затрыманы павінен знаходзіцца пад вартай да 3 траўня, калі будзе разглядацца справа па факце распаўсюду ім ўлётак. Нагадаем, што В. Леванеўскі запрашаў жыхароў гораду прыняць удзел у санкцыянаваным мітынгу 1 траўня.

***1 траўня*** ў Гародні за ўдзел у акцыі пратэсту, арганізаванай агульнанацыянальным страйкамам прадпрымальнікаў, быў затрыманы і асуджаны на на пяць сутак прадпрымальнік з Узьбекістану. Прадпрымальнік прасіў не называць яго імя, каб пазьбегнуць рэпрэсіяў. Гэты чалавек быў затрыманы асобамі ў цывільным пасьля таго, як заступіўся за дзяўчыну, якую міліцыянеры спрабавалі

зацягнуць у машыну. У выніку грамадзяніна Узьбекістану абвінавацілі ў парушэньні двух артыкулаў Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях – 166, 167 (непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі і ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах) і арыштавалі на пяць сутак.

***1 траўня*** пачалася падпісная кампанія на другое паўгодзьдзе. Аднак калі дагэтуль можна было падпісацца ня толькі на пошце, а і ў незалежных кампаніях, то цяпер дзяржава манапалізуе і гэты рынак. Ад 1 траўня кожны, хто зьбіраецца зарабляць на падпісцы, мусіць мець адмысловую ліцэнзію. Аднак час ідзе, а Міністэрства сувязі так нікому і не дазволіла стварыць канкурэнцыю дзяржаўнаму манапалісту ў гэтай галіне — “Белпошце”. У апошнія дні мінулага году быў прыняты закон “Аб паштовай сувязі”, у якім упершыню зрабілі неабходным ліцэнзаваньне паслугаў паштовай сувязі, а менавіта — правядзеньне падпіскі на перыядычныя выданьні і дастаўку іх чытачам. Але толькі ў канцы красавіка недзяржаўныя арганізацыі, якія дагэтуль займаліся падпіскай, атрымалі лісты з патрабаваньнямі “ўдакладніць намеры”. Найперш Міністэрства сувязі запатрабавала ўзгадніць зьмест падпіснога каталогу, асобна пералічыць замежныя выданьні, якія плануецца распаўсюджваць на тэрыторыі Беларусі, а таксама распавесьці, якім чынам будзе ажыцьцяўляцца дастаўка газетаў ды часопісаў у сельскую мясцовасьць. Усіх папярэдзілі, што ў другім паўгодзьдзі падпісваць чытачоў на друкаваныя выданьні можна толькі ў тым выпадку, калі маецца адпаведная ліцэнзія. Дагэтуль кожная рэдакцыя самастойна вырашала праблему распаўсюду. “Беларуская асацыяцыя журналістаў” з гэтай нагоды ўжо накіравала ліст у Міністэрства сувязі. Журналісцкая арганізацыя спасылалася на Закон “Аб друку”, дзе наўпрост напісана: кожная рэдакцыя мае права распаўсюджваць сваё выданьне самастойна альбо паводле дамоваў з іншымі арганізацыямі — як дзяржаўнай формы ўласнасьці, так і прыватнай. Адказ быў катэгарычны — ад гэтага часу на ўсю дзейнасьць мусіць быць дазвол. Як стала вядома, паседжаньне адмысловай камісіі, якая будзе вырашаць лёс недзяржаўных фірмаў, што займаюцца падпіскай, прызначанае на сярэдзіну траўня. Варта нагадаць яшчэ некаторыя асьпекты эканамічнага ціску на недзяржаўную прэсу. Выдаткі “Белпошты” на дастаўку дзяржаўных выданьняў пакрываюцца з бюджэту, а незалежныя выданьні плацяць за гэтую паслугу напоўніцу. Кошты дзяржаўных друкарняў для незалежных выданьняў вышэйшыя, чым для дзяржаўных. Акрамя таго, нягледзячы на наяўнасьць недзяржаўных кампаніяў-распаўсюднікаў, магчымасьць данесьці тое ці іншае выданьне да самых аддаленых і маленькіх населеных пунктаў краіны ёсьць толькі ў "Белпошты". Апрача таго, неабходна ўзгадаць і неаднаразовыя выпадкі ўжываньня гэтак званага

"адміністратыўнага рэсурсу" пры правядзеньні падпісной кампаніі, калі ўлады прымушаюць розныя ўстановы падпісвацца на дзяржаўную прэсу.

***1-2 траўня*** ў Менску адбыўся V Кангрэс Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Беларусі. У ім узялі ўдзел 260 чалавек, з іх — 220 дэлегатаў. На Кангрэсе актыўна абмяркоўваўся ўдзел няўрадавых арганізацыяў у парламенцкіх выбарах 2004 году. Большасьць удзельнікаў форуму пагадзілася з тым, што супрацоўніцтва з палітычнымі структурамі падчас будучай выбарчай кампаніі неабходнае.

***2 траўня*** дзяржаўнае тэлебачаньне ў сюжэце пра Міхаіла Марыніча паведаміла некаторыя падрабязнасьці ягонай справы. На БТ сьцьвярджаюць, што частка знойдзеных у Міхаіла Марыніча 90 тысячаў даляраў нібыта фальшывыя. Было паведамлена і пра 4 кампутары, знойдзеныя ў гаражы Марыніча. Паводле тэлежурналістаў, знойдзеныя ў гаражы кампутары Міхаілу Марынічу перадала амерыканская амбасада для стварэньня рэгіянальнай сеткі арганізацыі “Дзелавая ініцыятыва”.

У пачатку траўня Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы заслухала даклад Хрыстаса Пургурыдэса і ўхваліла рэкамендацыі Камітэту Міністраў наконт санкцыяў супраць Беларусі. Як паведаміла супрацоўніца сакратарыяту гэтага Камітэту, вырашана, што беларускае пытаньне будзе разгледжанае на адным з бліжэйшых паседжаньняў Камітэту Міністраў. Ухваленыя ПАРЕ рэзалюцыі і рэкамендацыі з патрабаваньнем адстаўкі Генпракурора Беларусі Віктара Шэймана, правядзеньня незалежнага расьсьледваньня справаў зьніклых і судовых працэсаў над датычнымі да гэтых зьнікненьняў беларускімі чыноўнікамі, накіраваныя ў выканаўчы орган Рады Еўропы.

***3 траўня*** лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька быў выкліканы ў РУУС Савецкага раёну г. Менску для допыту ў якасьці правапарушальніка. Выклік зьвязаны з падзеямі 26 красавіка, калі ў сталіцы Беларусі праходзіў “Чарнобыльскі шлях”. А. Лябедзька не зьяўляўся заяўляльнікам акцыі, ня ўдзельнічаў у шэсьці, хаця прысутнічаў на плошчы Якуба Коласа. У РУУС А. Лябедзька зьявіўся, але падчас складаньня пратаколу аб правапарушэньні (арт. 167.1 КаАП РБ) высьветлілася, што зьмест рапартоў, складзеных супрацоўнікамі міліцыі, не супадае з відэаздымкамі акцыі. Такім чынам, пратакол аб правапарушэньні А. Лябедзькі ня быў складзены, а сам ён быў адпушчаны.

***3 траўня*** суд Ленінскага раёну г. Гародні вынес рашэньне пра адміністратыўны арышт (15 сутак) старшыні страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага. Яго

васемнаццацігадовы сын Уладзімір Леванеўскі арыштаваны на 13 сутак. Трое сутак адміністратыўнага арышту за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў прысудзілі васемнаццацігадоваму Аляксандру Траяну. Ён вучыцца ў школе разам з Уладзімірам Леванеўскім.

***3 траўня*** суд Савецкага раёну г. Менску ў адносінах маладафронтаўца Зьміцера Дашкевіча вынес рашэньне — 15 сутак адміністратыўнага арышту за ўдзел у акцыі “Чарнобыльскі шлях”. Рашэньне прымала судзьдзя Натальля Скугарава. Зьміцера Дашкевіча затрымалі 1 траўня ў скверы Янкі Купалы, калі маладафронтаўцы разгарнулі расьцяжку з надпісам “Малады Фронт”. Яго даставілі ў РУУС Савецкага раёну і склалі пратакол за ўдзел у “Чарнобыльскім шляху”, пасьля адвезьлі ў сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік на вуліцы Акрэсьціна і трымалі пад вартай да суда

***3 траўня*** ў Асіповічах супрацоўнікамі КДБ быў затрыманы актывіст руху "Зубр" Міхаіл Н. Хлопец расклейваў улёткі з лагатыпам руху і нумарам кантактнага тэлефону ў цэнтры гораду. Супрацоўнікі міліцыі даставілі Міхаіла ў вайсковую частку, на тэрыторыі якой знаходзіцца мясцовае ўпраўленьне Камітэту дзяржбясьпекі. Там з ім размаўляў чалавек, які прадставіўся Ігарам Анатольевічам. Ён цікавіўся колькасьцю ўдзельнікаў "Зубра" ў Асіповічах, дзейнасьцю руху па краіне, крыніцамі фінансаваньня. Пасьля таго, як малады чалавек сказаў, што ён не валодае гэтай інфармацыяй, супрацоўнік КДБ прапанаваў яму заводзіць як мага больш знаёмстваў з актывістамі руху і перадаваць інфармацыю яму. На разьвітаньне “кадэбэшнік” пакінуў хлопцу нумар свайго працоўнага і мабільнага тэлефонаў і прапанаваў званіць "пры неабходнасьці". Пасьля гэтага ў Міхаіла ўзялі пісьмовыя тлумачэньні і адпусьцілі, пратрымаўшы паўтары гадзіны.

***4 траўня*** моладзевае грамадзкае аб’яднаньне “Верас” падало скаргу ў Віцебскі абласны суд на дзеяньні ўпраўленьня юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму. Прадстаўнікі грамадзкага аб’яданьня лічаць, што вынесенае ўпраўленьнем пісьмовае папярэджаньне ад 25 сакавіка, дзе “Верасу” інкрымінуецца парушэньне Закону “Аб грамадзкіх арганізацыях” і Статута, неабгрунтаванае. У прыватнасьці, у зыскавой заяве МГА “Верас” цалкам абвяргае абвінавачаньне ўпраўленьня юстыцыі, што арганізацыя ня мела права ладзіць у межах праекту “Роўнасьць. Талерантнасьць. Павага.” “круглы стол” па міжнацыянальных адносінах. Прадстаўнікі “Верасу” лічаць надуманай і “незразумелай” гэтую прэтэнзію аблвыканкамаўскіх юрыстаў. На думку актывістаў аб’яднаньня, “з тэксту папярэджаньня немагчыма ўсьвядоміць, якая менавіта норма заканадаўства (пункт, артыкул, назва нарматыўна-прававога акта)” ці палажэньне Статута моладзевага

аб’яднаньня былі парушаныя. “Верасоўцы” не пагаджаюцца са сьцьверджаньнем рэгіструючага органу, быццам распрацоўка праектаў зьменаў заканадаўства не адпавядае статутным мэтам і задачам арганізацыі. На думку заяўляльнікаў, упраўленьне юстыцыі ня мае рацыі і ў тым, што расцэньвае як парушэньне закону стварэньне на базе грамадзкага аб’яднаньня мясцовага валанцёрскага цэнтру, які зьяўляецца структурным падразьдзяленьнем “Вераса”. МВЦ узьнікл на падставе пункту 2.2 Статуту арганізацыі. МГА “Верас” просіць суд прызнаць папярэджаньне незаконным і адмяніць яго.

***5 траўня*** Наваполацкі гарадзкі выканаўчы камітэт афіцыйна адмовіўся перарэгістраваць першасныя суполкі Свабоднага прафсаюзу работнікаў цеплаэлектрацэнтралі і ААТ “Нафтан”. Адмоўлена таксама ў перарэгістрацыі рэгіянальнай арганізацыі згаданага прафсаюзу. Нагодаю дзеля такога рашэньня сталіся недакладнасьці ў афармленьні адпаведных дакументаў. Тым часам старшыня рэгіянальнай Полацка-Наваполацкай арганізацыі СПБ Уладзімір Антановіч лічыць, што адмова юрыдычна нічым не матываваная, і з гэтай нагоды зьбіраецца зьвярнуцца ў суд. Полацка-Наваполацкая “рэгіяналка” была зарэгістраваная ў Наваполацкім гарвыканкаме 3 траўня 2000 году. У зьвязку з унесенымі ў Статут СПБ зьменамі і дадаткамі, узьнікла патрэба перарэгістрацыі першасных суполак. Пры гэтым працэс перарэгістрацыі доўжыцца ўжо дзевяць месяцаў, і кожны раз работнікі гарвыканкаму знаходзяць хібы ў афармленьні пададзеных дакументаў. У гэты ж дзень спадар Антановіч падаў у гарвыканкам заяўку на правядзеньне 20 траўня мітынгу пратэсту супраць перасьледу ўладамі актывістаў Свабоднага прафсаюзу. Нагадаем, што апошнім часам у рэгіёне звольненыя з працы тры кіраўнікі першасных арганізацыяў СПБ.

***5 траўня*** ў Баранавіцкім дзяржаўным каледжы лёгкай прамысловасьці запланавана правядзеньне педсавету. Адзіным пытаньнем педсавету зьяўляецца выключэньне Мікіты Сасіма з навучальнай установы. Фармальнай прычынай выключэньня зьяўляюцца пропускі заняткаў: па словах кіраўніцтва, 10 сутак арышту не зьяўляюцца ўважлівай прычынай. Нагадаем, што ў сярэдзіне сакавіка Мікіта Сасім быў пакараны Баранавіцкім гарадзкім судом 10-сутачным арыштам за распаўсюд газет на тэрыторыі каледжу. Рашэньне суда было выкананае цалкам, з-за чаго моладзевы актывіст ня змог наведваць заняткі. Між тым, Мікіта Сасім – адзін з лепшых студэнтаў каледжу, за апошні семестр у яго адна сямёрка і дзве васьмеркі, астатнія адзнакі – дзевяткі і дзесяткі. “У кіраўніцтва каледжу ня можа быць прэтэнзіяў да маіх адзнакаў. Я і мае сябры ўпэўненыя, што магчымае выключэньне –

гэта помста ўладаў і адміністрацыі каледжу за тое, што мы адкрыта выступілі супраць БРСМ”, — гаворыць Мікіта Сасім.

***5 траўня*** ў Менску і шэрагу іншых гарадоў Беларусі інваліды-калясачнікі правялі пікеты ў знак пратэсту супраць парушэньня сваіх правоў. Акцыя была прымеркаваная да Міжнароднага дня салідарнасьці інвалідаў розных краінаў за роўныя правы, супраць дыскрымінацыі. Лідэры асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў, якія ладзілі пікеты, заявілі, што становішча інвалідаў у Беларусі штогод пагаршаецца. Больш за дваццаць чалавек у інвалідных вазках выстраіліся ўздоўж менскай плошчы Бангалор, каб нагадаць уладам аб праблемах інвалідаў — адсутнасьці належнага сацыяльнага, медыцынскага забесьпячэньня, магчымасьці працаўладкаваньня. У руках удзельнікі акцыі трымалі плакаты, на якіх было напісана: “Мы хочам працаваць”, “Улады і ЖЭСы глухія да нашых праблемаў, “Дзяржаўная сістэма супраць інвалідаў”.

***6 траўня*** ў судзе Першамайскага раёну Менску распачаліся слуханьні па зыску Тацяны Процькі і яе мужа Дзьмітрыя Козыра да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі і тэлежурналіста Юрыя Пракопава аб кампенсацыі маральных стратаў. Зыскоўцы патрабуюць з адказьнікаў выплаціць ім па 35 млн. рублёў за тое, што тыя парушылі таямніцу іх прыватнага жыцьця. Падставай дзеля зыску стаў сюжэт у тэлепраграме "В центре внимания", прадэманстраваны па Першым нацыянальным тэлеканале ўвечары 29 лютага і паўтораны раніцай 1 сакавіка. У матэрыяле, аўтарам якога выступаў Юры Пракопаў, вялася гаворка пра прыбыткі і маёмасьць некаторых прадстаўнікоў беларускіх палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў — у тым ліку кіраўніцы Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Процькі і яе мужа, кіраўніка фермерскай гаспадаркі "Забалацьце" Смалявіцкага раёну Дзьмітрыя Козыра. У прыватнасьці, у сюжэце быў прадэманстраваны дом і аўтамабілі, якія нібыта належаць гэтай сям’і, а ў аўтарскім тэксьце названая буйная сума грошай, нібыта эквівалентная месячнаму заробку старшыні БХК. Зыскоўцы лічаць, што тым самым НДТРК і Юры Пракопаў парушылі Канстытуцыю РБ і Інструкцыю аб рэжыме доступу да дакументаў, якія ўтрымліваюць таямніцу прыватнага жыцьця грамадзянаў (дакумент зацьверджаны Камітэтам па архівах і справаводзтве 3 ліпеня 1996 г.). "Да тых зьвестак, якія маюць грыф "таямніца асабістага жыцьця", допуск абмежаваны, — патлумачыў прадстаўнік Тацяны Процькі Гары Паганяйла. — Іх можна атрымаць, толькі падаўшы запыт у адпаведныя органы: суд, пракуратуру, органы расьсьледваньня. Іншым грамадзянам гэткая інфармацыя не выдаецца, бо артыкулы 28, 29 Канстытуцыі гарантуюць таямніцу асабістага жыцьця. Зьвесткі, прадэманстраваныя па БТ, якраз належаць да гэтай катэгорыі". 6

траўня ў судзе зыскоўцы абверглі большасьць агучаных у сюжэце фактаў. Адказьнік ня змог прадаставіць доказаў праўдзівасьці распаўсюджанай ім інфармацыі і адмовіўся паведаміць крыніцу, якая дала яму зьвесткі аб прыбытках спн. Процькі. Акрамя гэтага, высьветлілася, што здымачная група знаходзілася на прыватнай тэрыторыі бяз ведама і без дазволу гаспадара; у якасьці "ілюстрацыі" да сваіх словаў пра маёмасьць Т. Процькі і Дз. Козыра Ю. Пракопаў зьняў чужую машыну. Тым ня менш, тэлежурналіст упэўнены, што ў ягоным сюжэце "датычна зыскоўцаў інфармацыя была нейтральнай". Прадстаўнік НДТРК Андрэй Іваноў лічыць, што заявы зыскоўцаў пра маральныя пакуты "беспадстаўныя". "Цяжка вызначыць, дзе пачынаецца і дзе сканчаецца асабістае жыцьцё", — сказаў сп. Іваноў. Разам з тым ён прызнаўся, што "не чытаў" Інструкцыі Камітэту па архівах і справаводзтве. Пераглядзеўшы сюжэт і выслухаўшы абодва бакі, судзьдзя Ананіч вырашыла перанесьці слуханьні на 5 чэрвеня. Судзьдзя таксама прапанавала зыскоўцам добраахвотна прадаставіць зьвесткі аб сваіх прыбытках і маёмасьці.

***6 траўня*** Хілары Клінтан, Эдвард Кэнэдзі і яшчэ дзесяць амерыканскіх сенатараў зьвярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай спыніць працы па рэканструкцыі гарадзенскага стадыёну “Нёман”. На іх думку, толькі асабістае ўмяшальніцтва прэзідэнта можа спыніць той здзек з людскіх парэшткаў, які адбываецца ў Гародні. Самога факту іх звароту аказалася дастаткова, каб экскаватары зьніклі са стадыёну, а на вуліцы Новай, куды вывозілася зямля, перамешаная з людскімі косткамі, ізноў пачаліся працы па вывазу глебы на габрэйскія могілкі.

***6 траўня*** Бараўлянскі сельскі выканаўчы камітэт даў дазвол на стварэньне дружыны для патруляваньня ўрочышча Курапаты. З такой прапановай да бараўлянскіх уладаў яшчэ ў сакавіку зьвярнулася Менская абласная арганізацыя Партыі БНФ. Па інфармацыі Партыі БНФ, у дружыну ўвайшло больш за 100 чалавек, кіраўніком прызначаны сябра Сойму Ўладзімір Кішкурна. “Зараз абаронцы Курапатаў будуць мець афіцыйны статус. Мы плануем наладзіць дзяжурства. Дружыньнікі будуць мець права прыцягнуць да адказнасьці і скласьці пратакол на парушальнікаў заканадаўства”, – сказаў Юрась Зянковіч, в. а. старшыні Менскай абласной арганізацыі Партыі БНФ.

***7 траўня*** каля 14 гадзінаў дня ў трохпакаёвую кватэру Леванеўскіх хацелі трапіць людзі, якія сказалі, што яны з КДБ. Іх не пусьцілі. У хаце знаходзіліся 12-гадовы Антон, 17-гадовая Кацярына — дзеці Леванеўскага -- і ягоная цешча Галіна. Праз некаторы час прыбылі амапаўцы — людзі ў чорных і белых шапках-масках. Яны ўзламалі падвойныя дзьверы і ўвайшлі ў кватэру. Адразу пачаўсяператрус. Дома

засталіся цешча і дачка Валерыя Леванеўскага — сына Антона адаслалі на вуліцу разам з сабакам-ратвейлерам, якога трымае сям’я.Ператрус цягнуўся шэсьць гадзінаў і скончыўся каля 21 гадзіны. КДБ прымушала даваць паказаньні супраць свайго бацькі 17-гадовую Кацярыну Леванеўскую. Пасьля заканчэньняператрусу яе забралі ў абласную ўправу КДБ. У кватэры была канфіскаваная ўся кампутарная тэхніка. Старэйшы сын, Зьміцер Леванеўскі, якому 20 гадоў, таксама быў дастаўленьны ў КДБ. Каля 15 гадзінаў міліцыянты затрымалі Аляксандра Васільева — паплечніка Валерыя Леванеўскага, і на ягонай кватэры таксама пачаліператрус. А 17-й гадзіне ў яго канфіскавалі кампутары сына і дачкі, некаторыя дакументы. А.Васільеў паведаміў, штоператрус робіцца на падставе распачатай крымінальнай справы аб распаўсюдзе друкаванай прадукцыі, у якой абражаюцца гонар і годнасьць прэзідэнта Лукашэнкі.

***7 траўня*** Міхаілу Марынічу прад’яўленае абвінавачаньне ў незаконным захоўваньні зброі. Гэта адзінае, у чым вырашылі абвінаваціць сьледчыя КДБ былога міністра і амбасадара Міхаіла Марыніча пасьля дзесяці дзён утрыманьня яго ў сьледчым ізалятары КДБ. Раней заяўлялі, што Міхаіл Марыніч падазраецца ў захоўваньні сакрэтных дакументаў і збыце фальшывых даляраў. Сьледзтва супраць Міхаіла Марыніча працягваюць сьледчыя КДБ, ён па-ранейшаму ўтрымліваецца ў ізалятары КДБ “амерыканка”. Паводле словаў адваката Веры Страмкоўскай, якая абараняе Міхаіла Марыніча, ён не прызнае сябе вінаватым і тлумачыць перасьлед палітычнымі прычынамі. Міхаіл Марыніч падаў скаргу ў пракуратуру Беларусі на дзеяньні сьледчых КДБ.

***7 траўня*** ў Іўеўскім райаддзеле міліцыі склалі адміністратыўны пратакол на галоўнага рэдактара газеты “День” Міколу Маркевіча, паколькі ў газеце згаданы незарэгістраваны страйкам прадпрымальнікаў Беларусі. Усяго складзеныя два пратаколы. Адзін на выдаўца таварыства “День-пресс” будзе накіраваны ў абласны Дзяржкантроль. Нібыта няслушна была афармленая таварна-транспартная накладная на дастаўку газеты з смаленскай друкарні ў Гародню. Галоўны рэдактар гаворыць, што згодна з Законам аб друку, арыштаваць наклад можна толькі паводле рашэньня суда, якое набыло правамоцнасьць. Што датычыць другога пратаколу — на самога М.Маркевіча, дык яшчэ напярэдадні ў іўеўскай міліцыі зьбіраліся складаць пратакол зусім на іншую асобу — на таго, хто вёз газету ў Гародню. Арыштаваны на пачатку красавіка нумар газеты “День” атрымалі толькі падпісчыкі. У ім сапраўды зьмешчанае меркаваньне Валерыя Леванеўскага — кіраўніка незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў. Спадар Леванеўскі паведаміў, што

рыхтуецца акцыя пратэсту прадпрымальнікаў 1 траўня. Самога яго ў гэты дзень затрымалі, а потым далі 15 сутак арышту.

***7 траўня*** Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт спыніў сваю фінансавую дзейнасьць, а з 10 траўня павінен спыніцца адукацыйны працэс. Гэтыя дзеяньні кіраўніцтва ЕГУ выкліканыя тым, што Міністэрства адукацыі не падоўжыла навучальнай установе ліцэнзіі на права далейшай працы. Выкладчыцкі калектыў універсітэту заяўляе, што гэткім чынам міжнароднаму іміджу Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту будзе прычыненая істотная шкода, а студэнты намерваюцца абараняць Alma Mater і адстойваць свае права на навучаньне. Згодна з прэзідэнцкім Дэкрэтам, да 1 траўня Міністэрства адукацыі мусіла завершыць пераліцэнзаваньне ўсіх навучальных установаў краіны. Аднак па завяршэньні гэтага тэрміну Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт не атрымаў афіцыйнага паведамленьня ні пра падаўжэньне, ні пра закрыцьцё ліцэнзіі. А бяз гэтага дакументу ўсялякая дзейнасьць незаконная. Паводле словаў прарэктара ўніверсітэту Уладзіміра Дунаева, супраць навучальнай установы ўлады выкарыстоўваюць таксама іншыя сродкі ціску. Да прыкладу, адміністрацыя прэзідэнта заблакавала грошы на навучаньне, дасланыя еўрапейскімі грантадаўцамі. У абарону ЭГУ выступіла Рада Міністраў Еўрасаюзу, якая накіравала найвышэйшым уладам Беларусі ліст пратэсту. Аднак у Міністэрстве замежных справаў выказваць сваю пазіцыю адносна гэтых падзеяў адмаўляюцца. Ва ўніверсітэце ж перакананыя, што падзеі зьвязаныя са спробай вышэйшых уладаў зьняць з пасады рэктара ЕГУ, прафесара Анатоля Міхайлава. Нагадаем, што пакінуць кіраўнічую пасаду ВНУ спадару Міхайлаву яшчэ ў пачатку году прапанаваў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Тады ў абарону універсітэту выступілі амбасадары шэрагу еўрапейскіх краінаў.

***7 траўня*** Наваполацкага праваабаронцу Зьміцера Салаўёва аштрафавалі на 10 базавых велічыняў у інсьпекцыі Міністэрства па падатках і зборах па г.Наваполацку. 5 траўня па месцы прапіскі Зьміцера Салаўёва прыйшла тэлеграма, у якой паведамлялася, што ён 7 траўня абавязаны зьявіцца ў інсьпекцыю Міністэрства па падатках і зборах па г.Наваполацку. За атрыманьне тэлеграмы прымусілі распісацца маці Зьміцера. Рашэньне пра штраф было вынесенае на падставе таго, што Зьміцер Салаўёў не пусьціў прадстаўнікоў падатковай інсьпекцыі ў свой офіс. У пратаколе было сказана наступнае: “09.04.04 Салаўёў не дазволіў правесьці кантрольныя мерапрыемствы і выявіць, ці ажыцьцяўляецца камерцыйная, прадпрымальніцкая дзейнасьць у памяшканьні, якое сам уладальнік называе “Офіс Зьміцера Салаўёва”. Адказнасьць за дадзенае правапарушэньне прадугледжаная ў памеры ад 10 да 50 базавых велічыняў”. Падаткавікі намерваліся правесьці праверку “дзейнасьці,

зьвязанай з прыёмам наяўных грашовых сродкаў ад пакупнікоў (кліентаў), з вытворчасьцю прадукцыі, выкананьня работ, аказаньнем паслугаў" і г.д. Зьміцер Салаўёў адмовіўся ўпусьціць у памяшканьне супрацоўнікаў падатковай інсьпекцыі, матывуючы тым, што гаспадарчай дзейнасьцю ён не займаецца і ніякіх аперацыяў з наяўнымі і безнаяўнымі грашыма ў дадзеным памяшканьні ня робіць.

***7 траўня*** падчас акцыі "Мы памятаем", прысьвечанай 5-ай гадавіне зьнікненьня экс-міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, на Кастрычніцкай плошчы ў цэнтры беларускай сталіцы зьявілася група маладых людзей з фашысцкай арганізацыі РНЕ (Русское Национальное Единство) са свастыкамі. Юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна" Валянцін Стэфановіч аднаго з іх падвёў да супрацоўніка міліцыіі. Супрацоўнік міліцыі ня стаў затрымліваць маладога фашыста, а толькі параіў апрануць куртку, каб ствастыка не была бачная. Такія чынам, у Беларусі за незарэгістраваную сімволіку затрымліваюць толькі апанентаў рэжыму. А напярэдадні сьвята Перамогі 9 траўня міліцыя дазваляе неанацыстам хадзіць па цэнтры Менску з фашысцкай сімволікай.

***7 траўня*** споўнілася пяць гадоў з моманту зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў Беларусі Юрыя Захаранкі. Лёс ягоны па-ранейшаму застаецца невядомым. Увечары на Кастрычніцкай плошчы ў Менску сабраліся неабыякавыя людзі, якія жадаюць ведаць праўду аб тым, што здарылася з вядомымі ў Беларусі дзеячамі апазіцыі. Роўна пяць гадоў таму зьнік генерал Юры Захаранка, былы міністр унутраных справаў Беларусі, вядомы грамадзкі дзеяч, сябра Палітрады Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Літаральна некалькі сотняў метраў не дайшоў ён да свайго дому. З таго часу пра лёс Юрыя Захаранкі нічога невядома. Зьнікненьне Ю.Захаранкі стала першым у серыі загадкавых здарэньняў, што адбыліся ў Беларусі. У тым жа 1999 годзе ў верасьні зьніклі выконваючы абавязкі старшыні Вярхоўнага Савету 13 скліканьня Віктар Ганчар і ягоны сябра прадпрымальнік Анатоль Красоўскі, а ў ліпені 2000 – аператар расійскай тэлекампаніі ОРТ Дзьмітрый Завадзкі. 7 траўня на Кастрычніцкую плошчу ў Менску прыйшлі грамадзяне з плакатамі-партрэтамі Ю.Захаранкі і іншых зьніклых. Акцыі пад назовам "Мы памятаем" прайшлі і ў іншых гарадах Беларусі.

У Наваполацку падчас акцыі, прысьвечанай пятай гадавіне зьнікненьня экс-міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі было затрымана 9 чалавек. У адносінах 8 з іх былі складзеныя пратаколы па арт. 167-1. ч.1 КаАП РБ – удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве. Пікетаваньне адбывалася ў цэнтры гораду на плошчы Будаўнікоў. Удзельнікі акцыі трымалі ў руках партрэты зьніклых бяз вестак.

Сярод затрыманых:

1. Зьміцер Салаўёў;
2. Ігар Сухарукаў;
3. Сяргей Забродзкі;
4. Валеры Шэўчэнка;
5. Вінцэсь Мудроў;
6. Аляксандр Цярэнцьеў;
7. Аляксей Трубкін;
8. Ігар Макану;
9. Ігар Валяеў.

***8 траўня*** Аксана Новікава была выкліканая ў Менскую траспартную пракуратуру дзеля знаёмства з матэрыяламі справы ў якасьці абвінавачваемай. 11 траўня з матэрыяламі справы азнаёміцца адвакат Аксаны Новікавай. Нагадаем, 6 красавіка Менская транпартная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу ў сувязі з тым, што 5 красавіка, знаходзячыся ў тунэлі №2 станцыі Менск-Пасажырскі, Аксана Новікава раздавала ўлёткі, у якіх сьцьвярджалася, што А. Лукашэнка і кіраўнікі беларускіх сілавых ведамстваў маюць адносіны да выкраданьня людзей і іншых парушэньняў закону.

***10 траўня*** Наваполацкі гарадзкі суд перанёс на 11 траўня судовы разгляд справаў удзельнікаў акцыі “Мы памятаем”. З Менску дзеля абароны затрыманых прыехаў адвакат, але старшыня Наваполацкага гарадзкога суда перанёс разгляд адміністратыўных справаў быццам бы за-за таго, што не зьявіліся сьведкі-міцыянеры, якія зьдзяйсьнялі затрыманьне.

***10 траўня*** гаспадарчы суд Гомельскай вобласьці не задаволіў зыск грамадзкага жаночага аб’яднаньня “Ініцыятыва” да Гомельскага райвыканкаму. Жаночае аб’яднаньне “Ініцыятыва” дамагалася ў судзе адмены рашэньня Гомельскага райвыканкаму. Апошні дазволіў, а потым адмовіўся ўзгадніць новы юрыдычны адрас жаночай арганізацыі ў прыватным доме ў вёсцы Яроміна. Падчас папярэдніх судовых разьбіральніцтваў высьветлілася, што райвыканкам і Яроменскі сельсавет адмову прымалі на падставе сфальшаваных сьведчаньняў і дакументаў. Гаспадарчы суд доўгі час не прымаў рашэньня. Судзьдзя Валянціна Пугачова тлумачыла зыскоўцам, што ня можа гэтага зрабіць. У Жыльлёвым кодэксе не сказана дакладна пра разьмяшчэньне юрыдычных адрасоў у жылых памяшканьнях. Судзьдзя накіравала запыт у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, але адтуль адказалі, што гэта ня іхняя кампетэнцыя. Атрымаўшы такі адказ, судзьдзя Валянціна Пугачова

7 траўня адхіліла зыск жаночай арганізацыі "Ініцыятыва" да райвыканкаму. Адсутнасьць юрыдычнага адрасу пагражае арганізацыі закрыцьцём.

***10 траўня*** кіраўніку грамадзкай арганізацыі "Дзелавая ініцыятыва", былому амбасадару, экс-міністру зьнешнеэканамічных сувязяў Міхаілу Марынічу адмоўлена ў хадайніцтве аб зьмяненьні меры стрыманьня.

***11 траўня*** ў Наваполацкім гарадзкім судзе пачаліся суды над удзельнікамі акцыі "Мы памятаем". Першай суд разгледзеў справу Аляксандра Цярэнцьева. Судзьдзя апраўдаў А. Цярэнцьева ў сувязі з адсутнасьцю ў яго дзеяньнях складу правапарушэньня. Адміністратыўная справа Вінцэся Мудрова спыненая таксама ў сувязі з тым, што ў яго дзеяньнях суд ня ўбачыў складу правапарушэньня. Апраўданыя таксама Сухарукаў Ігар, Шэўчэнка Валеры, Салаўёў Дзьмітры, Трубкін Аляксей, Забродзкі Сяргей. Прадстаўнікамі ўдзельнікаў акцыі ў працэсах былі юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна" Уладзімір Лабковіч і адвакат Аляксандр Галіеў.

***11 траўня*** ў Віцебску на помніку пісьменьніку Уладзіміру Караткевічу, што стаіць у скверы каля плошчы Леніна, зьявілася выява свастыкі і нецэнзурныя словы. Чыноўнікі з гарвыканкаму лічаць, што гэта звычайнае хуліганства падлеткаў. Прадстаўнікі літаратурнага і мастацкага асяродкаў не выключаюць, што гэты ўчынак мае палітычны характар і зьвязаны з дзейнасьцю ў Віцебску фашыстоўскай арганізацыі РНЕ.

***11 траўня*** ў Гомельскім абласным судзе разглядаўся зыск кіраўнікоў аб'яднаньня "Грамадзянская альтэрнатыва" да ўпраўленьня юстыцыі, якое адмовілася зарэгістраваць грамадзкае аб'яднаньне. Заснавальнікамі яго выступілі звыш 200 грамадзянаў рэгіёну, пераважна сябры ліквідаванага ўладамі ўплывовага аб'яднаньня "Грамадзянскія ініцыятывы". На судзе прадстаўнікі ўпраўленьня юстыцыі Тамара Стрыжнева і Андрэй Міцкевіч у якасьці аргументаў адмовы больш зьвярталіся да тлумачальных слоўнікаў, нейкай асаблівай логікі, высноваў рэспубліканскай камісіі, чым да заканадаўчых актаў. Яны не змаглі нават патлумачыць, чаму ў грамадзкага аб'яднаньня не адпавядаюць законам і дэкрэтам аднолькавыя палажэньні са статутам афіцыйнай арганізацыі – Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі. Зыскоўца і старшыня незарэгістраванага аб'яднаньня "Грамадзянская альтэрнатыва" Уладзімір Кацора лічыць адмову ў рэгістрацыі палітычна матываванай: "Доказы супрацоўнікаў упраўленьня юстыцыі заснаваныя на эмоцыях, а не на законах. Гэта палітычныя матывы. Хутка выбары, грамадзкія аб'яднаньні выставяць назіральнікаў. Гэта пагроза для ўладаў. І яны ўжо цяпер гэтую пагрозу імкнуцца ліквідаваць альбо не дапусьціць". Падчас судовага

разьбіральніцтва судзьдзя Леанора Буянкова вынесла папярэджаньне заснавальніку аб`яднаньня і зыскоўцу Леаніду Судаленку. Нечаканай на судзе была прапанова ўпраўленьня юстыцыі прыкласьці да справы супольны ліст паўдзесятка настаўнікаў з Добрушскага раёну, у якім настаўнікі нібыта адмаўляліся ад свайго заснавальніцтва новай арганізацыі. Цікава, што ліст гэты ня згадваўся ў афіцыйнай адмове ўпраўленьня юстыцыі пра рэгістрацыю. Зыскоўцы прасілі выклікаць у суд аўтараў ліста, паколькі маюць у дакументах асабістыя подпісы гэтых настаўнікаў як заснавальнікаў “Грамадзянскай альтэрнатывы”. Судзьдзя Буянкова не задаволіла хадайніцтва. Яна вырашыла наогул адхіліць зыск да ўпраўленьня юстыцыі.

***11 траўня*** сьледчыя КДБ правялі ў Гародні ператрусы ў трох дэмакратычных арганізацыях. Сьледчыя КДБ шукалі, дзе магла быць надрукаваная першатравеньская ўлётка з вершам, у якім КДБ ўбачыў абразу на адрас прэзідэнта Лукашэнкі. А 15-й гадзіне каманда супрацоўнікаў КДБ завітала на вуліцу Карла Маркса, 11, дзе месьцяцца грамадзкія арганізацыі. У пакоі ТБМ робіцца газета “День”, а яе галоўны рэдактар Мікола Маркевіч адначасова ўзначальвае і філію “Таварыства беларускай мовы”. Ператрус доўжыўся чатыры гадзіны. У 19.15 выйшлі спачатку міліцыянты, потым супрацоўнікі КДБ у цывільным вынесьлі ўсе чатыры сістэмныя блокі рэдакцыі газеты. Паназіраць сабралася публіка, усё гэта фатаграфавалі нямецкія журналісты, якія апынуліся ў Гародні. А аператар КДБ запісваў на відэастужку ўсіх прысутных. Калі ператрусы зьвязаныя з крымінальнай справай па факце абразы прэзідэнта Лукашэнкі паводле ўлёткі, то якое да гэтага маглі мець дачыненьне “Таварыства беларускай мовы” і газета “День”? Сьледчы КДБ Фядулаў патлумачыў Міколу Маркевічу, што нібыта сябры ТБМ кантактавалі з Валерыем Леванеўскім — кіраўніком страйкаму прадпрымальнікаў, якога затрымалі і пасадзілі на 15 сутак якраз за распаўсюд гэтых улётак. З аднаго боку на гэтых улётках надрукавана фота самога Леванеўскага і заклік прыйсьці 1 траўня на мітынг пратэсту, з другога — вершык, які ў КДБ прачыталі і знайшлі нібыта абразу прэзідэнта Лукашэнкі. У вершы адзін раз згадваецца слова “прэзідэнт”. Сьледчы лічыць, што сябры ТБМ маглі дапамагчы Леванеўскаму памножыць улётку. Ператрусы адбыліся таксама ў “Таварыстве беларускай школы” (ТБШ) і “Фондзе імя Льва Сапегі”, якія знаходзяцца ў іншых месцах. У ТБШ нічога не забралі, а вось “Фонд імя Льва Сапегі” мае страты. Кіраўнік філіі Фонду Уладзімір Хільмановіч сказаў, што КДБ канфіскавала ў іх кампутарную тэхніку і адну кніжку — пад назвай “Зямля сьвятога Лукі” гарадзенскага паэта Алеся Чобата, якая выдадзеная ў перакладзе на польскую мову.

***11 траўня*** стала вядома, што сарваны запланаваны на 14 траўня рок-канцэрт салідарнасьці з Беларускім ліцэем. Дырэктар клубу “Рэактар” Аляксей Кучко за тры дні да акцыі паведаміў, што канцэрт з праграмы здымае, не падаўшы ніякіх тлумачэньняў. На канцэрце мусілі выступіць вядомыя беларускія рок-каманды, музыкі, журналісты і ліцэісты з прээнтацыяй уласнага музычнага дыску пад назовам “Я люблю ліцэй: Веру ў Цябе”. Ліцэісты даслалі запрашэньні амбасадарам, вядомым пісьменьнікам, навукоўцам – усім, хто дапамагаў і дапамагае ім.

***12 траўня*** суд Савецкага раёну аштрафаваў старшыню Аб’яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Анатоля Лябедзьку на 100 базавых велічыняў (1 млн. 900 тыс. рублёў) за ўдзел 26 красавіка ў акцыі “Чарнобыльскі шлях”, прысьвечанай чарговай гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

***12 траўня*** сына лідэра агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага – Уладзіміра Леванеўскага — аштрафавалі на 95 тысячаў рублёў. Такое рашэньне было прынятае адміністратыўнай камісіяй Ленінскага раёну г.Гародні. Уладзіміру Леванеўскаму далі максімальна магчымы штраф за парушэньне арт. 172 ч.3 КаАП РБ (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных).

***12 траўня*** офіс АБСЕ ў Менску назваў "паклёпніцкім" дакументальны фільм "Дарога ў нікуды", які быў прадэманстраваны па Першым нацыянальным тэлеканале 11 траўня. Пра гэта сказана ў адмысловым паведамленьні, распаўсюджаным прэс-службай прадстаўніцтва. Офіс АБСЕ заклікаў Нацыянальную дзяржаўную тэлерадыёкампанію прытрымлівацца стандартаў прафесійнай журналісцкай працы і прадаставіць героям праграмы магчымасьць выказацца ў адказ. Кіраўнік офісу АБСЕ амбасадар Эберхард Хайкен назваў фільм "адкрытым паклёпам на адрас вядучых апазіцыйных палітыкаў". "Я лічу, што гэты фільм не адпавядае стандартам непрадузятай прэзентацыі матэрыялу і прынцыпам палітычнага плюралізму", – заявіў ён. "Офіс АБСЕ расцэньвае зьмест праграмы як відавочную спробу падарваць аўтарытэт палітычнай апазіцыі напярэдадні парламенцкіх выбараў", — гаворыцца ў паведамленьні. У 40-хвілінным фільме расповяд пра цяперашніх лідэраў беларускай апазіцыі перамяжоўваўся фрагментамі кінахронікі пра дзейнасьць фашыстаў падчас другой сусьветнай вайны.

***13 траўня*** Салігорскі суд апраўдаў актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі, якія ў пятую гадавіну зьнікненьня Юрыя Захаранкі бралі ўдзел у акцыі “Хочам ведаць праўду”. Судзьдзя Салігорскага гарадзкога суда Аксана Каляда апраўдала пяцёх сяброў салігорскай філіі АГП: Ларысу Алешку, Марыю Волчак, Аляксея

Прыходзьку, Яўгена Валодзьку і Зьміцера Ларыёнава. Як вынікае з судовага рашэньня, акцыя “Хочам ведаць праўду”, падчас якой 7 траўня актывісты АГП трымалі партрэты Юрыя Захаранкі ды іншых зьніклых, прайшла ў Салігорску без парушэньня дзеючага заканадаўства.

***14 траўня*** лідэру агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыю Леванеўскаму працягнулі тэрмін адміністратыўнага арышту на трое сутак. Рашэньне было прынятае адміністратыўнай камісіяй Ленінскага раёну г. Гародні. Пасьля вынясеньня рашэньня Валеры Леванеўскі быў дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Прычынай працягу тэрміну затрыманьня зьяўляецца высьвятленьне дадатковых абставінаў. Нагадаем, што Валеры Леванеўскі быў арыштаваны на 13 сутак за арганізацыю мітынгу ў Гародні 1 траўня.

***14 траўня*** ў Магілёве падчас распаўсюду газеты “Время” быў затрыманы старшыня абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Уладзімір Шанцаў. У. Шанцава даставілі ў РУУС Ленінскага раёну, дзе канфіскавалі 100 асобнікаў газеты.

***14 траўня*** пярвічная прафсаюзная арганізацыя работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці, аўтамабілебудаваньня, металаапрацоўкі, іншых галінаў народнай гаспадаркі на Менскім навукова-вытворчым прадпрыемстве “КБТМ-ОМО” гвалтоўна пераведзеная ў Беларускі прафсаюз работнікаў прамысловасьці. 4 траўня тут адбыўся прафсаюзны сход, на якім сябры прафсаюзу не пагадзіліся з прапановай прадстаўнікоў адміністрацыі перавесьці іх арганізацыю ў лаяльны ўладзе прафсаюз прамысловасьці. Праз некалькі дзён па ініцыятыве дырэктара “КБТМ-ОМО” Мацюшкова В.Я., кіраўнікоў падразьдзяленьняў і службаў прадпрыемства была падрыхтаваная прафсаюзная канферэнцыя, на якую абралі “патрэбных” дэлегатаў. Яны прагаласавалі за пераход арганізацыі ў прафсаюз прамысловасьці.

***15 траўня*** актывісты галандзкага аддзяленьня праваабарончай арганізацыі “Міжнародная Амністыя” правялі ў цэнтры горада Наатдорп збор подпісаў пад петыцыяй да беларускіх уладаў з заклікам распачаць сапраўднае расьсьледваньне справаў зьніклых людзей у Беларусі. Людзі актыўна ставілі свае подпісы і выказвалі спачуваньне народу Беларусі, а таксама надзею, што сітуацыя ў найбліжэйшы час зьменіцца. Усяго пад петыцыяй было сабрана 518 подпісаў.

***16 траўня*** ў Барысаве былі затрыманыя шэсьць актывістаў моладзевага руху “Зубр”, якія раздавалі зарэгістраваную газету “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” “Наша слова”. У Барысаўскім ГУУС на двух з затрыманых быў складзены пратакол за парушэньне арт. 172 КаАП РБ (распаўсюд друкаванай

прадукцыі без выходных дадзеных), нягледзячы на тое, што выходныя дадзеныя на газеце былі. Затрыманых адпусьцілі праз тры гадзіны.

***16 траўня*** падчас сустрэчы з грамадзянамі раёну "Рэчыца" нарадам міліцыі Ленінскага РАУС г. Берасьця быў затрыманы сакратар Берасьцейскага абкаму Партыі камуністаў Беларускай Мікалай Шыкеля. У яго былі канфіскаваныя 10 партыйных улётак. Мікалай Шыкеля быў дастаўлены ў Ленінскі РАУС г. Берасьця, дзе на яго склалі пратакол аб парушэньні ч.3 арт. 172 КаАП РБ (распаўсюд друкаваных выданьняў, вырабленых з парушэньнем вызначанага парадку, якія ня маюць выходных дадзеных, сутнасьць якіх накіраваная на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму ладу). Мікалай Шыкеля, у мінулым намесьнік начальніка крымінальнай міліцыі УУС Берасьцейскага аблвыканкаму, падпалкоўнік міліцыі ў запасе абураны дзеяньнямі "калегаў", якія тлумачылі, што выконваюць загад. Ён упэўнены, што "шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму ладу, правам і законным інтарэсам грамадзянаў" не наносіць і лічыць, што "выкананьне загадаў" ягонымі былымі калегамі ў парушэньне дзеючага заканадаўства — гэта злачынства. 27 траўня адміністратыўная камісія Ленінскага раёну г. Берасьця разгледзела справу аб парушэньні Мікалаем Шыкелем ч.3 арт. 172 КаАП РБ за распаўсюд улётак Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс" – "Пяць крокаў да лепшага жыцьця". Інтарэсы М.Шыкелі прадстаўляў юрыст Уладзімір Малей. Мікалай Шыкеля са сваім прадстаўніком заявілі, што зьмест улётак не наносіць шкоды дзяржаўнаму ладу, а таму справу трэба спыніць згодна з арт. 227 КаАП РБ -- за адсутнасьцю складу правапарушэньня. Старшыня адміністратыўнай камісіі Вячаслаў Хафізаў прыняў рашэньне вынесьці пакараньне Мікалаю Шыкелю ў выглядзе папярэджаньня. М. Шыкеля ня згодны з пакараньнем і зьбіраецца абскардзіць рашэньне ў судзе.

***18 траўня*** Валеры Леванеўскі быў разьмешчаны ў СІЗА г. Гародні на два месяцы. Яму прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 368 ч.2 КК РБ – публічная зьнявага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***18 траўня*** менская друкарня "Сьветач" адмовілася друкаваць "Новую газету Сморгони", выпуск якой быў адноўлены пасьля працяглага перапынку. Заснавальнік выданьня Рамуальд Улан вымушаны шукаць іншую друкарню. Часова замест "Новой газеты Сморгони" выходзіў смаргонскі выпуск ваўкавыскай "Местной газеты". У "Сьветачы" адбілі апошні смаргонскі нумар, і Рамуальду Улану сказалі, што друкаваць "Новую газету Сморгони" ня будуць. Выпуск "Новой газеты Сморгони" прыпыніла сем з паловай месяцаў таму Міністэрства інфармацыі. Цяпер Рамуальд Улан зноўку зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік і шукае месца, дзе можна было б друкаваць сваю газету. Што датычыць сталічнай друкарні "Сьветач",

дык яе кіраўніцтва раней адмовілася друкаваць таксама незалежную газету “День”, хаця з рэдакцыяй была нават падпісаная афіцыйная дамова. “День” друкуюць у Смаленску. Ня выключана, што і смаргонскую газету давядзецца вазіць туды, калі ня ўдасца знайсьці агульнай мовы з беларускімі друкарнямі.

***18 траўня*** ў Наваполацкім гарадзкім судзе адбыўся разгляд скаргі Зьміцера Салаўёва на рашэньне Наваполацкага гарвыканкаму аб забароне мітынгу, у якім планавалі браць удзел лідэры Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Правядзеньне мітынгу было заяўленае на 22 траўня. На яго зьбіраліся прыехаць лідэры Народнай кааліцыі. Наваполацкі гарвыканкам забараніў мітынг на той падставе, што нібыта заява ня ўтрымлівала неабходных вычарпальных зьвестак. Падчас судовага разьбіральніцтва сьпецыяліст ідэалагічнага аддзелу гарвыканкаму Клопава (менавіта яна рыхтавала адмову), сказала, што да заявы не былі прыкладзеныя дамовы з мясцовым аддзелам дэпартаменту аховы МУС дзеля забесьпячэньня правапарадку і з мясцовым тэрытарыяльна-медыцынскім аб’яднаньнем на арэнду машыны "хуткай дапамогі". Але нідзе ў Законе "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" канкрэтна ня вызначана, што арганізатар мусіць складаць дамовы з вышэйзгаданымі арганізацыямі на ахову парадку і медыцынскае абслугоўваньне. Клопава таксама палічыла, што арганізатары мусілі даць абяцаньне прыбраць пасьля мітынгу плошчу. Пры гэтым яна не патлумачыла, чаму арганізатары павінны выконваць працу гарадзкіх прыбіральшчыкаў. Яшчэ ў адказе гарвыканкаму была фраза: "К заявлению не приложено обязательство в письменной форме организатора (организаторов) или лица (лиц), ответственного (ответственных) за организацию и проведение массового мероприятия, по организации и проведению массового мероприятия". Насамрэч, у Законе маецца такая фармулёўка, але калі ўважліва прачытаць артыкул 4, будзе зразумела, што не заўжды гэта патрэбна, бо акцыя заяўлялася не ад імя партыі ці аб’яднаньня, а арганізатар З.Салаўёў паставіў свой подпіс пад заявай. Трэба дадаць, што адказ аб забароне мітынгу быў адпраўлены толькі 19.04.2004 г. (зыходзячы з паштовага штэмпелю на канверце, далучанага да матэрыялаў справы) -- за 3 дні да мяркуемай даты мітынгу, хаця Закон патрабуе пісьмова папярэдзіць арганізатараў як мінімум за 5 дзён. Клопава патлумачыла, што ліст быў укінуты ў паштовую скрыню яшчэ 16.04.2004. У судовых спрэчках юрыст гарвыканкаму Лабанок заявіў, што надалей яны павінны больш адказна ставіцца да адсылкі карэспандэнцыі. У выніку судзьдзя Пётр Ляўчонак прыняў рашэньне аб адхіленьні скаргі Салаўёва, матывуючы тым, што ў заяве не былі пазначаныя ўсе неабходныя дадзеныя, у прыватнасьці, пра медыцынскае абслугоўваньне і прыборку тэрыторыі.

***18 траўня*** ў гаспадарчы суд г. Менску была пададзеная зыскавая заява аб абароне дзелавой рэпутацыя Партыі БНФ. Прычынай сталі паклёпніцкія выказваньні вядучага праграмы “В центре внимания” Юрыя Пракопава ў эфіры Беларускага тэлебачаньня, якія прагучалі напярэдадні Чарнобыльскага шляху. Сутнасьць выказваньняў у тым, што старшыня партыі Вінцук Вячорка ў выпадку дасягненьня ўлады спыніць фінансаваньне ўсіх чарнобыльскіх праграмаў. Партыя БНФ праз суд патрабуе абвегнуць гэтыя словы ў эфіры БТ і прызнаць іх не адпавядаючымі рэчаіснасьці. Вінцук Вячорка мае намер запатрабаваць ад БТ суму маральнай кампенсацыі. З падобнымі патрабаваньнямі ў гэты ж дзень была пададзеная яшчэ адна зыскавая заява ў суд Маларыцкага раёну Берасьцейскай вобласьці супраць начальніка аддзелу інфармацыі Маларыцкага райвыканкаму С.Строка, які заявіў, што ў гады вайны Партыя БНФ супрацоўнічала з фашыстамі. Інтарэсы Партыі БНФ у гэтых судовых працэсах Сойм Партыі БНФ даручыў прадстаўляць юрыстам Уладзіміру Лабковічу і Валянціну Стэфановічу.

***18 траўня*** Мікола Маркевіч падаў у пракуратуру Гарадзенскай вобласьці скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў абласнога УКДБ, якія тыдзень таму ўчыніліператрус у офісе гарадзенскага аддзяленьня ТБМ, забраўшы дакументы і аргтэхніку. Сп. Маркевіч, які зьяўляецца старшынём аддзяленьня і галоўным рэдактарам газеты "День", лічыць, штоператрус рабіўся з грубымі парушэньнямі заканадаўства. Ён патрабуе вярнуць канфіскаваныя рэчы і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці. У скарзе на імя пракурора Гарадзенскай вобласьці Васіля Літвінава пералічаны шэраг парушэньняў, якія, на думку М. Маркевіча, дапусьцілі супрацоўнікі УКДБ. Ён зьвяртае ўвагу на неадпаведнасьць паміж заяўленай мэтайператрусу і рэальнымі дзеяньнямі групы.Ператрус праводзіўся ў межах крымінальнай справы, заведзенай па факце распаўсюду ў Гародні ў канцы красавіка "антыпрэзідэнцкіх" улётак, аднак супрацоўнікі УКДБ найперш цікавіліся файламі, якія зьявіліся пасьля 7 траўня. "Гэта дае падставы для высновы, што ператрус быў толькі нагодай дзеля вырашэньня іншых задачаў, не зьвязаных з расьсьледваньнем крымінальнай справы. Магчыма, супрацоўнікі УКДБ мелі на мэце стварэньне перашкодаў маёй прафесійнай дзейнасьці", – сказаў М. Маркевіч, маючы на ўвазе сваю рэдактарскую працу ў газеце "День".

***18 траўня*** Менская транспартная пракуратура адмовіла Аксане Новікавай у хадайніцтве аб спыненьні ўзбуджанай у адносінах да яе крымінальнай справы. Такую пастанову вынес старэйшы сьледчы Менскай транспартнай пракуратуры, юрыст другога класу Юрый Надольскі, разгледзеўшы матэрыялы крымінальнай справы абвінавачваемай. Адначасова Ю. Надольскі вынес пастанову аб перадачы

крымінальнай справы Новікавай менскаму транспартнаму пракурору дзеля накіраваньня ў суд.

***19 траўня*** ў Менску адбыўся "круглы стол" на тэму “Рэзалюцыі Камісіі па правах чалавека ААН і ПАРЕ пра правы чалавека ў Беларусі – новыя задачы і магчымасьці”. "Круглы стол" быў арганізаваны Беларускім Хельсінкскім камітэтам, да ўдзелу ў ім былі запрошаныя прадстаўнікі рэгіянальных аддзяленьняў БХК ды іншых праваабарончых арганізацыяў, у тым ліку Праваабарончы цэнтр “Вясна”, “Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў”, “Прававая дапамога насельніцтву”. Усе гэтыя арганізацыі, за выключэньнем БХК, зьяўляюцца юрыдычна ліквідаванымі. Быў запрошаны прадстаўнік Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь, але ён праігнараваў гэтае мерапрыемства. Былі запрошаныя і выступілі дарадца Прадстаўніка ААН у Беларусі Уладзімір Шчэрбаў, амбасадар Францыі ў Беларусі Стэфан Шмялеўскі, кіраўнік Офісу АБСЕ ў Менску Эберхард Хайкен. Выступы С.Шмялеўскага і Э. Хайкена мелі дастаткова жорсткі характар і цалкам адпавядалі Рэзалюцыям, якія былі прынятыя ў апошнія часы і Арганізацыяй Аб’яднаных Нацыяў, і Парламенцкай Асамблеяй Рады Еўропы. Адбылася дыскусія, асноўнай мэтай якой было абмеркаваньне пазіцыяў праваабарончых арганізацыяў і тых дзеяньняў, якія яны павінны падтрымаць у сувязі са зьяўленьнем Рэзалюцыяў, прынятых ААН і ПАРЕ. Беларускія праваабаронцы абмяркоўвалі, на што павінны зьвярнуць увагу ў першую чаргу праваабарончыя арганізацыі краіны. Па выніках працы "круглага стала" прынятая Рэзалюцыя.

***20 траўня*** інсьпектар па аператыўнай рабоце Слонімскай фінансавай міліцыі Уладзімір Юрчак прыцягнуты да матэрыяльнай адказнасьці за неправамоцныя дзеяньні па справе кіраўніка грамадзкага аб’яднаньня “Воля да разьвіцьця” Міхася Варанца. У канцы сакавіка ён двойчы выклікаў Міхася Варанца дзеля высьвятленьня сітуацыі адносна “нявыплаты” грамадзкім аб’яднаньнем “Воля да разьвіцьця” падаткаў па Праграме TACIS. Пры гэтым У.Юрчак дапусьціў шэраг парушэньняў: не растлумачыў сп.Варанцу ягоных правоў, аказваў псіхалагічны ціск, пагражаў і інш. Інфармацыя, атрыманая Юрчаком падчас папярэдняга расьследваньня, стала падставай дзеля ўзбуджэньня 23 красавіка супраць М.Варанца крымінальнай справы за “ўхіленьне ад уплаты падаткаў шляхам утойваньня”. Міхась Варанец падаў скаргу на дзеяньні Юрчака ва Упраўленьне дэпартаменту фінансавых расьследваньняў Камітэту дзяржкантролю па Гарадзенскай вобласьці. 20 траўня старшыня Дэпартаменту паведаміў, што У.Юрчак “прыцягнуты да матэрыяльнай адказнасьці”. “Хочацца верыць, што рашэньне абласнога ўпраўленьня Дэпартаменту фінансавых расьследваньняў у дачыненьні да Юрчака ня вымушанае рэагаваньне

на маю скаргу, а прынцыповая пазіцыя”, – пракаментаваў пакараньне чыноўніка Міхась Варанец.

***20 траўня*** супрацоўнік КДБ у Глыбокім правёў допыт двух актывістаў моладзевага руху “Зубр”. Актывісты руху “Зубр” былі затрыманыя ў гора-дзе Глыбокае супрацоўнікамі міліцыі падчас расклейкі ўлётак з лагатыпам руху “Зубр” і дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі, дзе чалавек, які назваўся Іванам Генадзьевічам, задаваў пытаньні аб паходжаньні друкаванай прадукцыі і аб планах руху. Не атрымаўшы адказаў, ён стаў пагражаць, што маладыя людзі будуць арыштаваныя на 15 сутак.

***20 траўня*** актывістка “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў” (ЗБС) з Наваполацку была выкліканая ў дэканат інжынерна-будаўнічага факультэту Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту, дзе ў яе адбылася размова з дэканам факультэту Бакатовічам. Дэкан пытаўся пра дзейнасьць ЗБС: што за арганізацыя, чым займаецца, хто старшыня, колькасьць сяброў, з якіх факультэтаў, адкуль грошы на дзейнасьць... Распытваў таксама пра маючую адбыцца выставу “Голая студэнцкая праўда”, якую плануюць правесьці сябры Наваполацкага ЗБС (у якасьці адрасоў дзеля кантактаў былі пададзеныя і зьвесткі пра гэтую дзяўчыну): дзе выстава будзе праводзіцца і адкуль грошы на яе правядзеньне. Дэкан Бакатовіч папрасіў прынесьці Статут ЗБС, каб больш даведацца пра дзейнасьць арганізацыі, а потым папярэдзіў дзяўчыну, каб не займалася больш такой дзейнасьцю, бо могуць быць непажаданыя для яе наступствы. Варта адзначыць, што Бакатовіч толькі два тыдні таму заняў пасаду дэкана інжынерна-будаўнічага факультэту.

***20 траўня*** ў Менску былі затрыманыя актывісты руху “Зубр” Юля Гарачка і Артур Гайдукевіч. Іх затрымалі падчас распаўсюду газеты “Супраціў” на прасьпекце Францыска Скарыны ў Менску і даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе канфіскавалі газеты і прымусілі пісаць тлумачальныя.

***20 траўня*** Міністэрства адукацыі выказала намер узмацніць кантроль за працаўладкаваньнем выпускнікоў дзяржаўных ВНУ, якія навучаліся за кошт бюджэту. Прынятае рашэньне, што калі такі выпускнік адмаўляецца ехаць працаваць па месцы дзяржаўнага разьмеркаваньня, то будзе пазбаўлены дыплому ці мусіць вярнуць дзяржаве грошы, якія дзяржава выдаткавала на яго адукацыю. Пра гэта паведаміў першы намесьнік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук. Ён сказаў, што гэтае рашэньне было прынятае паводле загаду кіраўніка дзяржавы. Цяпер сярэднія выдаткі на навучаньне студэнта ў беларускім дзяржаўным ВНУ складаюць прыкладна 1200 даляраў на год.

***24 траўня*** лідэры Народнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс" заклікалі спыніць рэпрэсіі ў Гародні. У адмысловай заяве асуджаюцца дзеяньні супрацоўнікаў КДБ у адносінах да актывістаў гарадзенскай філіі “Фонду імя Льва Сапегі”, Культурна-асьветніцкага фонду “Бацькаўшчына", журналістаў газеты "День" і Інтэрнэт-газеты "Пагоня". У заяве, у прыватнасьці, прыводзяцца факты незаконныхператрусаў на прыватных кватэрах, канфіскацыі нумароў газеты, кампутарных дыскаў і дакументаў. "Заяўляем рашучы пратэст супраць цкаваньня сяброў дэмакратычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, а таксама журналістаў Гародні. Патрабуем спыніць незаконныя дзеяньні і вярнуць канфіскаваную маёмасьць уладальнікам", – гаворыцца ў заяве.

***24 траўня*** Павел Марыніч, сын арыштаванага КДБ экс-міністра і надзвычайнага паўнамоцнага амбасадара Міхаіла Марыніча, запатрабаваў вяртаньня кампутараў, канфіскаваных пасьля арышту ягонага бацькі. Сваё патрабаваньне ён матываваў тым, што кампутары ня маюць адносінаў да абвінавачаньня, якое прад’яўленае Міхаілу Марынічу.

***24 траўня*** ў гарадзкой пракуратуры г. Менску быў дапытаны лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька па крымінальнай справе аб паклёпе на прэзідэнта. Справа ўзбуджаная ў сакавіку па арт. 367 Крымінальнага кодэксу на падставе інтэрвью А.Лябедзькі праграме “Зеркало” на расійскім телеканале РТР з крытыкай прэзідэнта Беларусі. Па словах А. Лябедзькі, сьледчы задаў шэраг пытаньняў, на частку з якіх адказы былі дадзеныя, на іншыя партыйны лідэр абавязаўся адказаць пасьля атрыманьня дадатковай інфармацыі з Мінфіну і ўраду. Пытаньні датычацца грошай, якія, па меркаваньні эксьпертаў, знаходзяцца ў “ценявым” бюджэце і не падвяргаюцца грамадзкаму і парламенцкаму кантролю.

***25 траўня*** ў раёне плошчы Якуба Коласа ў Менску позна ўвечары былі затрыманыя за распаўсюд улётак непаўнагадовыя Максім Громаў і Кацярына Клімко. Пры затрыманьні Максім Громаў быў зьбіты. У адносінах маладых людзей былі складзеныя пратаколы за парушэньне арт. 143 КаАП РБ (антысанітарыя). Назаўтра зранку М.Громава і К.Клімко па дарозе на вучобу забралі ў міліцыю, дзе яны правялі ноч. РУУС Савецкага раёну г.Менску пачало падрыхтоўку да ўзбуджэньня супраць іх крымінальных справаў.

***25 траўня*** кіраўніцтва Бараўлянскага сельвыканкаму адмяніла сваё рашэньне аб стварэньні добраахвотнай народнай дружыны, якая павінна была ахоўваць мемарыял Курапаты. Чыноўнікі сьцьвярджаюць, што рашэньне не адпавядала ўрадаваму палажэньню аб дружынах. Кіраўніцтва Бараўлянскага сельскага выканкаму спачатку пагадзілася з прапановай Менскай абласной арганізацыі Партыі

БНФ стварыць добраахвотную дружыну, якая б ахоўвала Курапаты. Але калі дружыньнікі з БНФ, Партыі Свабоды і руху “Зубр” прыйшлі патруляваць урочышча, міліцыянты паказалі ім іншы дакумент. Старшыня Бараўлянскага сельвыканкаму Пётр Лапшын адмяніў сваё ж рашэньне на той падставе, што нібыта ніхто з курапацкіх дружыньнікаў не жыве і не працуе на тэрыторыі Бараўлянскага сельсавету. Кіраўнік дружыны Уладзімір Кішкурна сказаў, што, нягледзячы на рашэньне ўладаў, дружыньнікі будуць патруляваць Курапаты.

***25 траўня*** адбыўся суд, які пакінуў меру стрыманьня для старшыні страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага ранейшай. Валеры Леванеўскі і ягоны адвакат Аляксандр Бірылаў падалі скаргу на меру стрыманьня для абвінавачанага. Леванеўскага пасадзілі ў сьледчы ізалятар на два месяцы — на час, пакуль сьледзтва па ягонай справе будзе праводзіць Ленінская раённая пракуратура гораду. Такім чынам, ён надалей застанецца ў сьледчым ізалятары гарадзенскай турмы.

***25 траўня*** сьледчыя, якія вядуць справу Міхаіла Марыніча, адхілілі шэраг паручыцельстваў, якія падалі вядомыя ў Беларусі асобы з просьбай да суда вызваліць Марыніча з-пад варты. Аб вызваленьні Міхаіла Марыніча праз асабістыя паручыцельствы хадайнічалі Ўладзімір Ганчарык, былыя судзьдзі Канстытуцыйнага суда Валер Фадзееў і Міхаіл Пастухоў, кіраўнік аб’яднаньня “Альтэрнатыва 21” Сяргей Балыкін, рэдактар “Белорусской деловой газеты” Сьвятлана Калінкіна, прафесар Гяоргі Лепін. Тым часам чарговыя паручыцельствы за экс-міністра падалі дэпутаты парламенцкай групы “Рэспубліка” Валер Фралоў, Уладзімір Парфяновіч, Сяргей Скрабец і дэпутат Уладзімір Навасяд. Людміла Гразнова сабрала подпісы 32 еўрапейскіх палітыкаў з аб’яднаньня Еўрапейскі Рух. Паводле Людмілы Гразновай, у гэтым звароце да беларускіх уладаў зьмешчанае патрабаваньне вызваліць Міхаіла Марыніча, а таксама спыніць перасьлед апазіцыйных палітыкаў, грамадзкіх аб’яднаньняў і незалежных медыяў.

***26 траўня*** завяршыўся суд па скарзе моладзевага грамадзкага аб’яднаньня “Верас” на дзеяньні ўпраўленьня юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэту. Актывістам аб’яднаньня не ўдалося аспрэчыць абгрунтаванасьць папярэджаньня, вынесенага правазнаўцамі аблвыканкаму. Яшчэ адным фактам, што разглядаўся ўпраўленьнем юстыцыі як парушэньне заканадаўства, стала стварэньне структурнага падразьдзяленьня недзяржаўнай арганізацыі – дабрачыннага мясцовага валанцёрскага цэнтру. Падчас працэсу старшыня моладзевага аб’яднаньня Яраслаў Манцэвіч абвергнуў усе абвінавачаньні ўпраўленьня юстыцыі, спасылаючыся на строгае выкананьне “верасоўцамі” палажэньняў уласнага Статуту і беларускага заканадаўства. У сваю чаргу адказчык, галоўны сьпецыяліст

рэгістрацыйна-прававога сектару ўпраўленьня юстыцыі аблвыканкаму Валеры Шутаў не пагадзіўся з пазіцыяй НДА і абгрунтаваў прэтэнзіі, выказаныя ў папярэджаньні. Нагадаем, напрыканцы сакавіка ўпраўленьне юстыцыі прыслала першае пісьмовае папярэджаньне моладзеваму грамадзкаму аб’яднаньню “Верас”, зробленае па выніках трохмесячнай праверкі. “Верасоўцы” перакананыя, што юрыдычны кантроль за іх дзейнасьцю праводзіўся па рэкамендацыі супрацоўнікаў аддзелу інфармацыі гарвыканкаму, якія былі незадаволеныя вынікамі “круглага стала” па міжнацыянальных адносінах, што прайшоў у межах праекту “Роўнасьць. Талерантнасьць. Павага”. Назіральнікі адзначаюць, што “ў цэлым разгляд справы быў хутчэй падобны на працэс над “Верасам”. Таму, відаць, і ня дзіва, што судзьдзя Тацяна Парфёнава вынесла рашэньне, якое пакінула ў сіле папярэджаньне ўпраўленьня юстыцыі”. Аднак “верасоўцы” лічаць, што справа не была разгледжаная належным чынам. Яны зьбіраюцца дабівацца адмены папярэджаньня ў Вярхоўным судзе Беларусі.

***26 траўня*** стала вядома, што кватэру экс-старшыні рэспубліканскага моладзевага грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянскі форум” (г.Гомель) Івана Няверава абшукалі невядомыя, якія прадставіліся супрацоўнікамі міліцыі. Вобыск адбыўся яшчэ 18 траўня, але спадар даведаўся пра гэта толькі праз тыдзень, калі вярнуўся з Вільні, дзе браў удзел у семінары. Як распавёў сп.Няверуў, дзьверы двум невядомым у міліцэйскай форме і двум у цывільным адчыніла ягоная маці Наталя Іванаўна. Невядомыя сказалі ёй, што шукаюць прыстасаваньне для ўгону аўтамабіляў, чым нібыта займаецца яе сын, і паказалі ордэр на вобыск, дзе былі ўказаныя дадзены адрас, але абсалютна чужое прозьвішча. “Маці не змагла ім супрацьстаяць – адзін з невядомых увесь час трымаў дзьверы нагой, а астатнія паўтаралі, што вобыск праводзіцца “ў інтарэсах сьледзтва”, - кажа Іван Няверуў. Вобыск цягнуўся каля гадзіны. Маці Івана Няверава адзначыла, што невядомых цікавілі кнігі сына і кампутар, які яны самі ўключылі. Таксама невядомыя цікавіліся ўстаноўчымі дакументамі палітычнай партыі Свабода і прагрэс, стварэньнем якое займаецца сп.Няверуў. Па словах Івана Няверава, ён зьвярнуўся ва ўпраўленьне ўнутраных справаў Гомельскага аблвыканкаму, каб удакладніць, ці насамрэч у іх працуе чалавек, прозьвішча якога ўказанае ў пратаколе вобыску. Але ў аддзяленьні яму адказалі, што такі ў іх не працуе. “Тады я зьвярнуўся ў пракуратуру Чыгуначнага раёну. Але пракурор Леанід Лашкін адмовіўся прыняць заяву”, - распавёў І.Няверуў. Ён лічыць, што падобным чынам дзейнічалі супрацоўнікі сьпецслужбаў. “Я думаю, гэта апрабоўваўся новы від “зачыстак”, якія ўлады пачынаюць ужываць напярэдадні парламенцкіх выбараў”, - пракаментаваў сітуацыю І. Няверуў.

***26 траўня*** адміністратыўная камісія Ленінскага раёну Гародні пакарала галоўнага рэдактара газеты "День" Міколу Маркевіча штрафам у памеры адной базавай велічыні (19 тысячаў рублёў) і канфіскацыяй накладу газеты. Камісія палічыла, што рэдактар вінаваты ў незаконным распаўсюдзе друкаванага выданьня (ч. 3 арт. 172 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях). Паводле гэтага артыкулу, незаконным лічыцца распаўсюд выданьняў, выробленых з парушэньнем усталяванага парадку, якія ня маюць выдавецкіх зьвестак і зьмест якіх можа нанесьці шкоду дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзянаў. (Прэтэнзіі работнікаў міліцыі выклікала публікацыя меркаваньня кіраўніка прадпрымальніцкага страйкаму Валерыя Леванеўскага, які разважаў пра тое, ці могуць беларусы бараніць свае правы шляхам актыўнага пратэсту. Гэты матэрыял быў расцэнены як патэнцыйна небясьпечны). Мікола Маркевіч сьцьвярджае, што прыцягнуты да адказнасьці незаконна, бо не займаецца распаўсюдам газеты "День". Распаўсюду выданьня ўвогуле не было, бо міліцыянты затрымалі наклад раней, чым газета трапіла да распаўсюднікаў. Дарэчы, нягледзячы на тое, што наклад газеты "День" быў затрыманы на Іўеўскім пасту ДАІ 7 красавіка, пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні міліцыя склала толькі 29 красавіка. Паводле М.Маркевіча, наклад газеты быў выраблены ў адпаведнасьці з усімі патрабаваньнямі заканадаўства і меў усе выдавецкія зьвесткі, як і патрабуе Закон аб друку. Зьмест газеты ні грамадзкаму парадку, ні правам грамадзянаў не пагражаў, а меркаваньне В.Леванеўскага было выказанае ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй і не было заклікам да незаконных дзеяньняў. На думку намесьніка старшыні ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" юрыста Андрэя Бастунца, артыкул 172 КоАП, паводле якога быў пакараны М.Маркевіч, наогул не датычыць дзейнасьці сродкаў масавай інфармацыі. Ён вызначае адказнасьць за парушэньне правілаў распаўсюду ўлётак і г. д., а адказнасьць за парушэньне заканадаўства аб СМІ вызначаецца артыкулум 172-1. "Паводле арт. 25 Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі", канфіскацыя накладу ці часткі накладу прадукцыі СМІ можа адбыцца толькі на падставе рашэньня суда, — кажа А. Бастунец. — У выпадку з газетай "День" атрымалася, што рашэньне адміністратыўнай камісіі аб канфіскацыі накладу выданьня фактычна адмяніла дзеяньне Закону аб друку". М.Маркевіч плануе абскардзіць рашэньне камісіі ў судзе.

***26 траўня*** вядомы журналіст расійскага тэлеканалу ОРТ Павел Шарамет заявіў пра стварэньне Камітэту грамадзкай абароны Міхаіла Марыніча. Заснавальнікі Камітэту лічаць, што рэпрэсіі да Міхаіла Марыніча працягваюць шэраг дзеяньняў, якія прадпрымаліся супраць Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Генадзя Карпенкі і іншых апазіцыянераў. Паводле Паўла Шарамета, Камітэт грамадзкай абароны

Міхаіла Марыніча створаны, каб узмацніць голас пратэсту супраць палітычных рэпрэсіяў у Беларусі.

***27 траўня*** пракуратура Маларыцкага раёну адмовіла дэпутату мясцовага раённага Савету Уладзіміру Малею ва ўзбуджэньні крымінальнай справы ў адносінах да начальніка аддзелу інфармацыі Маларыцкага райвыканкаму Сяргея Строка, які публічна заявіў, што Партыя БНФ у гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічала з фашыстамі. Між тым, Беларускі Народны Фронт (БНФ) быў створаны ў 1988 годзе — праз 43 гады пасьля заканчэньня вайны. У пастанове аб адмове ва ўзбуджэньні крымінальнай справы сказана, што Строк С.І. патлумачыў, што сэнс ягонага выступу быў у тым, каб “людзі ведалі, хто такі Малей У.У. і якую партыю ён прадстаўляе, правёў аналогію паміж нацыяналістамі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і Партыяй БНФ, якая адносіцца да беларускай апазіцыі і зьяўляецца спадкаемцай беларускіх нацыяналістаў. (...) Свае словы пра тое, што Партыя БНФ падтрымлівала фашысцкую Германію ў часы Вялікай Айчыннай вайны, Строк С.І. патлумачыў так: выказаўся памылкова, бо яго ўвесь час перабівалі і гаварыць было складана. І ўвогуле, сваім выступам ён не прыніжаў гонару і годнасьці Малея У.У. і "не перасьледаваў такую мэту".

***27 траўня*** пацьвердзілася, што РУУС Савецкага раёну г. Менску вядзе падрыхтоўку да ўзбуджэньня крымінальных справаў супраць двух непаўнагадовых -- Максіма Громава і Кацярыны Клімко, затрыманых позна ўвечары 25 траўня ў раёне плошчы Якуба Коласа.

З ***28 траўня*** менская друкарня "Сьветач" скасавала дамову з рэдакцыяй недзяржаўнай ваўкавыскай "Местной газеты". Рэдакцыя атрымала ліст з паведамленьнем аб скасаваньні дамовы. У якасьці прычыны "Сьветач" называе фінансавую запазычанасьць рэдакцыі. 26 траўня друкарня павінна была выпусьціць апошні нумар выданьня. Аднак у гэты дзень галоўнаму рэдактару выданьня Андрэю Шантаровічу патэлефанаваў начальнік вытворчасьці Сяргей Чаргінец і заявіў, што "ня можа прапусьціць" адну з публікацыяў, прапанаваўшы замяніць яе на іншую. Гаворка ішла пра артыкул аб карупцыі ў ваўкавыскай падатковай інсьпекцыі. Сп. Шантаровіч адмовіўся мяняць матэрыял і прапанаваў друкарні пакінуць на яго месцы "белую пляму". Праз гадзіну начальнік вытворчасьці паведаміў, што нумар цалкам зьняты з друку. Друкарні ў Менску, Баранавічах і Слоніме, у якія ўжо зьвярнуўся галоўны рэдактар "Местной газеты", таксама адмовіліся супрацоўнічаць з рэдакцыяй. "Сьветач" выпускаў "Местную газету" на працягу амаль усяго апошняга году. Па словах галоўнага рэдактара, увесь гэты час разьлікі з друкарняй вяліся з невялікім спазьненьнем, і ў апошні час нічога ў гэтым плане не зьмянілася. Адной з

прычынаў адмовы ад супрацоўніцтва А. Шантаровіч лічыць серыю вострых публікацыяў аб працы падатковай інсьпекцыі, першая з якіх зьявілася тыдзень таму. Сп. Шантаровіч кажа, што са зьяўленьнем яго газеты ў 2001 г. у мясцовай "раёнкі" істотна зьнізіўся наклад. "Відавочна, улады не выконваюць "ідэалагічную праграму", і таму вырашылі змагацца з канкурэнтамі іншым спосабам", – рэзюмуе А. Шантаровіч.

***31 траўня*** маці Кацярыны Клімко была выкліканая ў педагагічны каледж, дзе вучыцца дзяўчына. Дырэктар навучальнай установы Меншчыкава Надзея Іванаўна прапанавала ёй забраць дакументы дачкі з каледжу адразу пасьля летняй сесіі. У іншым разе яна паабяцала выгнаць Кацярыну з каледжу. На наступны дзень з дзяўчынай на гэтую тэму таксама размаўляў намесьнік дырэктара па выхаваўчай працы Сташулёнак Іван Іванавіч, які пацьвердзіў рашэньне Меншчыкавай.

***31 траўня*** калегія грамадзянскіх справаў Вярхоўнага суда разгледзела скаргу на рашэньне па справе Ягор Рыбакоў супраць “Народнай волі” і зьмяніла некаторыя сумы спагнаньняў. Для былой тэлевядучай Элеаноры Язерскай і журналісткі газеты Марыны Коктыш судовая калегія зрабіла саступку — замест 3 мільёнаў рублёў з кожнай будзе спагнаны 1 мільён. Для “Народнай волі” штраф пакінуты ранейшы — 50 мільёнаў рублёў. Нагадаем, што Ягор Рыбакоў падаў у суд на газету і журналістаў яшчэ ў 2003 годзе. Тагачасны старшыня Белтэлерадыёкампаніі палічыў, што яго абразілі ў публікацыі ў “Народнай волі” двухгадовай даўніны. Размова ішла пра інтэрв’ю з Элеанорай Язерскай, у якім тэлевядучая казала, што тэлебачаньне пры новым кіраўніцтве ператварылася ў руіны і называла прозьвішчы людзей, у сьмерці якіх, на яе думку, вінаватыя кіраўнікі тэлебачаньня. Ленінскі раённы суд Менску часткова задаволіў зыск Ягора Рыбакова, а праз два месяцы Менскі гарадзкі суд падчас касацыйнага разгляду справы яшчэ і павялічыў спагнаньні. Пры гэтым на пачатку 2004 году Ягор Рыбакоў быў арыштаваны паводле падазраньняў у злоўжываньнях і хабарніцтве і знаходзіцца ў сьледчым ізалятары КДБ. Рэдактар “Народнай волі” Іосіф Сярэдзіч застаўся рашэньнем судзьдзяў не задаволены і заявіў, што зьбіраецца яго абскарджваць, у тым ліку звяртацца ў Камітэт па правах чалавека ААН.

## ЧЭРВЕНЬ

***1 чэрвеня*** бацькоў Максіма Громава выклікала на размову дырэктар Менскага прафесійна-тэхнічнага каледжу лёгкай прамысловасьці Жураўская, дзе навучаецца хлопец. Яна паведаміла, што ў хуткім часе будзе разглядацца магчымасьць яго выключэньня, і прапанавала забраць дакументы. Нагадаем, што за апошні час гэта ня першы выпадак спробы выключэньня з навучальнай установы за палітычную дзейнасьць. Месяц таму з баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці хацелі выключыць Мікіту Сасіма, але пасьля некалькіх акцыяў у падтрымку актывіста “Зубра” гэта рашэньне было адмененае.

***1 чэрвеня*** намесьніка старшыні “Маладога Фронту” Яўгена Скочку затрымалі на беларуска-літоўскай мяжы. Мытнікі канфіскавалі ў Яўгена Скочкі 14 асобнікаў праграмы выбарчага блоку “Маладая Беларусь” і столькі ж асобнікаў праекту палітычнай рэформы, які прапануе гэты блок. Паводле Яўгена Скочкі, мытнікам не спадабалася, што ў праграме быў пункт аб зьмене ўлады ў Беларусі. Маладафронтавец ехаў у Вільню на семінар разам са сваімі сябрамі. Пакуль правяралі Яўгена Скочку, рэйсавы аўтобус зьехаў, і Яўгену давялося дабірацца самастойна.

***1 чэрвеня*** калектыў Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа правёў сход ля брамы зачыненага будынку ліцэю. З гэтага часу бацькі ліцэістаў штодня зьбіраюцца стаяць у пікеце ля брамы, а з 15 чэрвеня да іх далучацца навучэнцы. Дырэктар ліцэю Уладзімір Колас выказаў усім падзяку. Навучэнец трэцяга курсу Франак Вячорка — старшыня вучнёўскай рады -- распавёў, што пяць-сем чалавек будзе дзяжурыць каля ліцэю штодзень, каб папярэдзіць нейкія дзеяньні ўладаў па разбурэньні будынку. Ён таксама сказаў, што ліцэісты не губляюць надзеі і спадзяюцца калі-небудзь вярнуцца сюды і праводзіць заняткі. У двары ліцэю і на вуліцы Кірава было некалькі дзесяткаў міліцыянтаў у форме і ў цывільным. Яны не разганялі ліцэйскага сходу, а толькі назіралі за прысутнымі. Выкладчыкі падсумавалі вынікі здачы навучэнцамі экстэрнату. Яны прыйшлі да высновы, што ў школах дзеці атрымалі адзнакі вышэйшыя за тыя, якія ім паставілі падчас унутраных ліцэйскіх экзаменаў. У ліцэі ідуць уступныя экзамены. Нягледзячы на экстрэмальную сітуацыю, многія бацькі выказалі жаданьне аддаць сваіх дзяцей вучыцца на першы курс.

***1 чэрвеня*** ў Менскім гаспадарчым судзе пачаўся разгляд зыску Беларускага Хельсінкскага камітэту да падатковай інсьпекцыі Маскоўскага раёну Менску, якая

дамагаецца выплаты падаткаў і штрафных санкцыяў больш як на 75 тысячаў даляраў. Праваабаронцы лічаць прэтэнзіі неабгрунтаванымі. Калі гэта ня ўдасца даказаць у судзе, кіраўніцтва БХК сядзе на лаву падсудных. Нагадваем, пракуратура ўжо завяла крымінальную справу супраць старшыні БХК Тацяны Процькі і галоўнага бухгалтара арганізацыі Тацяны Руткевіч. Ім за нявыплату падаткаў пагражае некалькі гадоў турмы і канфіскацыя маёмасьці. Вядзе працэс у Менскім гаспадарчым судзе судзьдзя Аксана Міхнюк. Яна пачала з высьвятленьня пазіцыяў па праблеме нявыплаты падаткаў. Адказчык — падатковая інсьпекцыя Маскоўскага раёну — не аспрэчвае права БХК на ільготы, але заяўляе, што кіраўніцтва арганізацыі ня выканала належнай працэдуры іх атрыманьня. “Яны маглі атрымаць вызваленьне ад падаткаў, але не атрымалі. Прычынай ёсьць іх бязьдзеяньне”, — заявіла суду прадстаўніца падатковай інсьпекцыі. Яна прывяла прыклад, калі адно прадпрыемства з Гародні нават "заднім чыслом" афарміла ільготу, і забраныя ўжо падаткі яму былі вернутыя. У Беларускім Хельсінкскім камітэце лічаць такі шлях непрымальным і незаконным. У БХК спасылаюцца на дамову паміж Беларусьсю і ўрадам Еўрапейскага Саюзу, якая прадугледжвае аказаньне грашовай дапамогі Беларусі на розныя мэты па праграмах TACIS пры абавязковай умове вызваленьня ад падаткаў. Сярод праграмаў — як пабудова мытных тэрміналаў на мяжы з краінамі Еўрасаюзу, так і разьвіцьцё грамадзянскай супольнасьці. Менавіта рэалізацыяй такіх грамадзянскіх праграмаў займаліся праваабаронцы з БХК. Яны заўважаюць, што калі цяпер суд вырашыць браць з іх падаткі, гэта будзе фактычным скасаваньнем ранейшых міжнародных дамоваў і паставіць крыж на будучых праграмах дапамогі Беларусі. На судовым паседжаньні таксама высьветліліся цікавыя тэхнічныя акалічнасьці канфлікту. У прыватнасьці, стала відавочна, што расійскі пераклад дамовы аб аказаньні дапамогі па праграмах TACIS, якім карысталіся ў падатковай інсьпекцыі, істотна розьніцца ад ангельскага арыгіналу. Судзьдзя абвесьціла перапынак, каб было падрыхтаванае заключэньне адмысловага перакладчыка, а таксама быў зроблены пераклад іншых істотных дакументаў.

***2 чэрвеня*** ў Менску быў затрыманы актывіст моладзевагу руху “Зубр” Аляксей Ляўковіч. У 10 гадзінаў раніцы супрацоўнікі Заводзкага РУУС прыйшлі на завод МАЗ, дзе Аляксей працуе наладчыкам і даставілі маладога чалавека ў РУУС Савецкага раёну, адмаўляючыся назваць прычыну затрыманьня. Да чатырох гадзінаў дня малады чалавек сядзеў у дзяжурнай частцы. Супрацоўнікі міліцыі нічога яму не тлумачылі, толькі казалі, каб пачакаў, "пакуль ім зоймуцца". Затым Ляўковіча адвялі да сьледчага Яцына, які паведаміў яму, што той дастаўлены ў РУУС дзеля допыту па крымінальнай справе, узбуджанай у адносінах да Кацярыны Клімко і Максіма

Громава за надпісы "Свабоду Марынічу!". Допыт цягнуўся больш за дзьве гадзіны, і выйшаў Аляксей з пастарунку толькі пасьля шасьці гадзінаў вечару.

***2 чэрвеня*** палітзьняволенага прафесара Юрыя Бандажэўскага перавялі на вольнае пасяленьне. Яго перавезьлі з менскай турмы ў адну з былых вайсковых казармаў, што на Гарадзеншчыне. Пра гэта паведаміла жонка прафесара Галіна. Везьлі яго ў цягніку “па этапу” ажно тры дні, цягам падарожжа тры разы правяралі рэчы. Рэжым утрыманьня Юрыя Бандажэўскага аблегчаны ў адпаведнасьці з заканадаўствам, бо ён адбыў у турме палову свайго васьмігадовага тэрміну зьняволеньня. Камітэт выкананьня пакараньняў мог перавесьці яго на пасяленьне яшчэ ў пачатку году, але дацягнуў да лета. Пасьля апошняй сустрэчы з мужам Галіна Бандажэўская адбыла ў Францыю з вялікай групай чарнобыльскіх дзяцей, якія накіраваліся на аздараўленьне. Тым часам у Францыі праходзіць грамадзкая акцыя ў падтрымку прафесара Бандажэўскага. Болей за 14 тысячаў чалавек падпісалася пад маніфестам з патрабаваньнем да беларускіх уладаў вызваліць прафесара, як мага хутчэй даць яму магчымасьць вярнуцца ў навуковую супольнасьць і працягваць дасьледваньні ў галіне ўплыву радыяцыі на здароўе чалавека. Французскія праваабаронцы зазначаюць, што спадар Бандажэўскі мае права на агульную амністыю, якая нядаўна была абвешчаная ў Беларусі. Цяпер яны распачалі новую акцыю — рассылкі электронных лістоў пад назвай “Прафесар Бандажэўскі ў турме” з мэтай дадатковага ціску на беларускія ўлады. Пакуль спадар Бандажэўскі быў у турме, яго абралі ганаровым грамадзянінам французскага гораду Клермон-Феран, пабрацім Гомелю.

***2 чэрвеня*** вязень сьледчага ізалятару КДБ Міхаіл Марыніч атрымаў адказ на сваю просьбу аб вяртаньні яму 90 тысячаў даляраў, якія былі адабраныя ў яго 24 красавіка, за два дні да затрыманьня. Сьледчы напісаў Міхаілу Марынічу, што ягоная просьба ня можа быць задаволеная. Прычынаў ён не паведаміў. Адметна, што Міхаіл Марыніч названы ў гэтым лісьце “сьведкам”. У справе аб фальшывых далярах ён сапраўды лічыцца сьведкам, але ніякіх сьледчых дзеяньняў з ім у гэтай справе не вядзецца. Міхаіл Марыніч і ягоныя абаронцы склалі чарговую скаргу на незаконнае затрыманьне. Раней падобная скарга накіроўвалася ў пракуратуру, але не была задаволеная. Гэтая разам скарга накіраваная ў Цэнтральны суд Менску. Былы міністр просіць суд адмяніць пастанову аб ягоным утрыманьні пад вартай на той падставе, што прад’яўленае яму абвінавачаньне прадугледжвае, што на час сьледзтва з яго могуць узяць падпіску аб нявыезьдзе.

***3 чэрвеня*** трое дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі абвясьцілі бестэрміновую галадоўку з мэтай дабіцца ўнясеньня зьменаў у Выбарчы

кодэкс. Валерый Фралоў, Уладзімір Парфяновіч і Сяргей Скрабец лічаць, што зьмены павінны датычыць фармаваньня выбарчых камісіяў, якое, па іх меркаваньні, павінна быць “адкрытым і зразумелым для кожнага грамадзяніна, а таксама гарантаваць удзел розных палітычных партыяў і рухаў”, пашырэньня паўнамоцтваў назіральнікаў. Акрамя таго, галадаючыя дэпутаты патрабуюць адмяніць працэдуру датэрміновага галасаваньня. Галадоўку дэпутаты намераныя правесьці ў сваіх кабінетах. 4 чэрвеня да галадоўшчыкаў-парламентароў далучыліся Марына Багдановіч, Генадзь Ананіч, з 5 чэрвеня – Уладзімір Чырвоненка, з 6 чэрвеня – Юры Істомін, з 7 чэрвеня – Уладзімір Радзівончык, з 8 чэрвеня – Віктар Івашкевіч, з 10 чэрвеня – Уладзімір Цыбульскі.

***3 чэрвеня*** стала вядома, што на Берасьцейшчыне ўлады адмаўляюцца рэгістраваць мясцовыя суполкі палітычных партыяў. Гэта можа прывесьці да таго, што падчас выбарчай кампаніі апазіцыйным партыям ня будзе дазволена вылучаць сваіх кандыдатаў у дэпутаты. Паводле новых патрабаваньняў, рэгістраваць партыйную суполку ў жылым памяшканьні дазволена толькі ў будынках, дзе ёсьць ня больш за адну кватэру. Але і ў гэтым выпадку пытаньне пра юрыдычны адрас мусіць быць узгодненае з мясцовымі ўладамі. Начальнік упраўленьня юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму Сяргей Кулак сьцьверджае, што правілы рэгістрацыі суполак палітычных партыяў уведзеныя яшчэ ў 2000 годзе і апошнім часам не зьмяніліся. Спадар Кулак ня бачыць ніякай сувязі паміж цяжкасьцямі з рэгістрацыяй партыйных суполак і маючымі адбыцца выбарамі ў Палату прадстаўнікоў, а таксама заяўляе пра адсутнасьць праблемаў у дачыненьнях абласнога ўпраўленьня юстыцыі з прадстаўнікамі палітычных партыяў. Між тым, пра цяжкасьці з рэгістрацыяй мясцовых суполак паведамляюць ня толькі берасьцейскія сацыял-дэмакраты, але і прадстаўнікі Партыі БНФ і некаторых грамадзкіх аб’яднаньняў.

***3 чэрвеня*** Грамадзкае аб’яднаньне гарадзенскіх літоўцаў “Тэвінэ” абвясьціла, што ня будзе ўдзельнічаць у пятым Усебеларускім фэсьце нацыянальных культураў, які адбудзецца ў Гародні. Тым самым літоўцы выказалі свой пратэст супраць дзеяньняў мясцовых уладаў. Год таму мясцовыя ўлады не дазволілі адзначыць каля гарадзенскага помніка вялікаму князю Вітаўту ўгодкаў Грунвальдзкай бітвы. Заяву падавалі супольна літоўцы, палякі і гарадзкая арганізацыя БНФ. Улады спасляліся на тое, што побач з помнікам знаходзіцца аварыйны мост, які вядзе ў Стары замак, гаспадаром якога калісьці быў сам Вітаўт. Скарга ў суд на гарвыканкам выніку не дала. Старшыня аб’яднаньня літоўцаў “Тэвінэ” Альгіс Дзіргінчус сказаў, што сябры аб’яднаньня падтрымалі яго і разам вырашылі, што “Тэвінэ” у афіцыйным фэсьце ўдзельнічаць ня будзе. Яны лічаць, што ўлады ня могуць вызначаць за літоўцаў —

што ім сьвяткаваць, а што не. Грунвальдзкую гадавіну тым болей адзначаюць літоўцы ва ўсім сьвеце.

***3 чэрвеня*** міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч падпісаў загад аб прыпыненьні выхаду газеты "Рабочая салідарнасьць" на тры месяцы. Падставай стала папярэджаньне за тое, што рэдакцыя быццам бы парушыла закон аб друку. Папярэджаньне і загад міністра падпісаныя ў адзін дзень. Пра іх існаваньне галоўны рэдактар газеты Мікалай Галко даведаўся 4 чэрвеня ў друкарні "Чырвоная зорка", калі прыйшоў забіраць наклад чарговага нумару. Дырэктар друкарні сказаў, што ён шкадуе, што ня можа друкаваць газету, для яго таксама гэта матэрыяльная страта. Выданьне мела двух заснавальнікаў — Беларускі прафсаюз работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня і Беларускую партыю працы. Як гаворыцца ў папярэджаньні, яшчэ 12 сакавіка 2004 году ў Міністэрства інфармацыі паступіла адмова прафсаюзу ад правоў заснавальніка. У такім выпадку Беларуская партыя працы павінна была ўнесьці зьмены ў пасьведчаньне аб рэгістрацыі газеты. Як сьцьвярджаюць чыноўнікі, газета гэтага не зрабіла, чым і правінілася. Выдаўцы газеты лічаць беспадстаўнымі прэтэнзіі міністэрства, бо пытаньне аб зьмене юрыдычнага адрасу якраз разглядаецца ў Менскім гарвыканкаме, куды адпаведныя дакументы пададзеныя яшчэ ў сакавіку. Справа зацягвалася наўмысна, чыноўнікі патрабавалі нават падаць ім канцэпцыю газеты, а нядаўна даслалі паперу, што ў сувязі з новымі абставінамі працягваюць разгляд просьбы.

***4 чэрвеня*** ў Крычаўскім раённым судзе разглядаўся зыск прадпрымальніка і грамадзкага актывіста Уладзіміра Кудраўцава да мясцовай вертыкалі. Крычаўскі прадпрымальнік больш за год спрабуе зарэгістраваць газету "Уласны каментар". Аднак Крычаўскі райвыканкам сваім рашэньнем адмовіўся ўзгадніць юрыдычны адрас рэдакцыі. У студзені Вышэйшы гаспадачы суд адмяніў рашэньне раённай улады, аднак чыноўнікі дагэтуль на гэта не адрэагавалі і нават не вярнулі зыскоўцу судовай пошліны. Гэта стала падставай для новага звароту ў суд. На судовым слуханьні сутнасьць зыска Уладзіміра Кудраўцава не была разгледжананая. Прадстаўнік Крычаўскага райвыканкаму зьвярнуўся з хадайніцтвам: паводле яго, такая справа ня можа разглядацца ў раённым судзе. Судзьдзя пагадзіўся, што прадпрымальніку трэба зьвярнуцца з зыскам у гаспадарчы суд. Прадстаўнік Уладзіміра Кудраўцава праваабаронца Мікалай Маторанка ня згодны з такім вызначэньнем і будзе яго абскарджваць, а таксама выказаў гатоўнасьць перадаць зыск крычаўца ў Магілёўскі абласны гаспадарчы суд.

***4 чэрвеня***, пасьля амаль месячнага перапынку, Першамайскі раённы суд Менску аднавіў разгляд зыску старшыні БХК Тацяны Процькі і яе мужа Дзьмітрыя Козыра да Беларускага тэлебачаньня і аглядальніка Юрыя Пракопава. Спадарыня Процька і спадар Козыр абвінавачваюць БТ і Юрыя Пракопава ва ўмяшальніцтве ў іх прыватнае жыцьцё. Аўтары зыску і іх прадстаўнік Гары Паганяйла працягвалі даводзіць, што Юры Пракопаў 29 лютага ў праграме “В центре внимания” распаўсюдзіў зьвесткі, што тычацца прыватнага жыцьця. У сюжэце быў паказаны дом старшыні Хельсінкскага камітэту, паведамлялася пра яе высокую зарплату, а таксама было сказана, што сям’я Процькі і Козыра нібыта маюць 15 дарагіх коней, лазьню і шыкоўную машыну. Паводле зыскоўцаў, у сваім сюжэце Юры Пракопаў распаўсюдзіў няпраўдзівыя зьвесткі. У іх няма 15 дарагіх коней, шыкоўнага джыпу і лазьні. Але найбольш Тацяну Процьку і Дзьмітрыя Козыра абурыла тое, што Юры Пракопаў здымаў іх маёмасьць без адпаведнай згоды і намякаў, што ўсё гэта куплена на заходнія грошы, якія выдаткоўваліся Хельсінкскаму камітэту. Зыскоўцы прадаставілі суду дакументы, паводле якіх іх маёмасьць набытая законна і на ўласныя грошы. Юры Пракопаў вінаватым сябе не прызнае і гаворыць, што зьняты ім сюжэт адпавядае інфармацыйнай палітыцы БТ. Рашэньне па гэтай справе павінна быць вынесенае 7 чэрвеня.

***4 чэрвеня*** ўвечары ў Магілёве прайшоў мітынг, арганізатарамі якога выступілі лідэры магілёўскіх суполак Партыі БНФ, Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады і Партыі працы. Магілёўскія ўлады дазволілі правесьці мітынг на адкрытай пляцоўцы каля дому культуры заводу. У мітынгу брала ўдзел, паводле прыблізных падлікаў, больш за сотню чалавек. Ён доўжыўся паўтары гадзіны. Магілёўцы выказалі свой пратэст супраць масавага прымушальнага пераводу наёмных работнікаў на кантрактную сістэму працы. Людзі, якія бралі слова, зьвязвалі перавод на кантракты з палітычнай сітуацыяй у краіне і магчымым рэферэндумам аб працягу прэзідэнцкага тэрміну. Прамовы на мітынгу ілюстравалі плакаты і карыкатуры, якія зрабілі магілёўскія маладафронтаўцы. Хаця ў гэтую моладзевую арганізацыю ўваходзяць у большасьці студэнты, яны ўсё ж прысьвяцілі наглядную агітацыю асноўнай тэме мітынгу — кантрактнай сістэме, дэвіз — “Сем разоў падумай і адзін раз падпішы”.

***5 чэрвеня*** старшыню гарадзенскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Уладзіміра Чырвоненку суд аштрафаваў за непадпарадкаваньне міліцыі. Амаль два месяцы таму міліцыянты затрымалі аўтамабіль Чырвоненкі з улёткамі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. Улёткі міліцыянты зьнішчылі, а на Чырвоненку склалі пратакол аб непадпарадкаваньні.

Маўляў, ён не дазваляў адчыніць салон машыны без прысутнасьці панятых і без складаньня пратаколу. Судзьдзя па адміністратыўных справах Вікторыя Прысада палічыла гэта правапарушэньнем і аштрафавала кіраўніка партарганізацыі АГП на 7 базавых велічыняў, гэта — 133 тысячы рублёў.

***5 чэрвеня*** ў Гародні судзьдзя Вікторыя Прысада аштрафавала 18-гадовага Алеся Курсевіча на 5 базавых велічыняў. 4 чэрвеня а 1-й гадзіне ночы міліцыянты затрымалі яго з 17-гадовым сябрам, якога адпусьцілі. На суседняй вуліцы на сьцяне будынка адміністрацыі Ленінскага раёну міліцыянты знайшлі напісанае чорнай фарбай слова “Зубр”. Аднак судзьдзя нават не пацікавілася ў маладога чалавека — ці мае ён дачыненьне да надпісу, і адразу прысудзіла штраф.

***6 чэрвеня*** ў цэнтры Менску былі затрыманыя журналісты здымачнай групы расійскай тэлекампаніі Ren-TV. Журналістка REN-TV Алена Слаў і аператар Аляксей Пакроўскі запісвалі інтэрв’ю на Кастрычніцкай плошчы каля рэкламнага экрану ОНТ. У якасьці выступоўцаў былі запрошаныя Кацярына Клімко і Максім Громаў, супраць якіх былі заведзеныя крымінальныя справы за палітычнае графіці "Свабоду Марынічу!". Непадалёку ад месца здымкаў стаялі двое маладых людзей, якія спачатку выдавалі сябе за цікаўных гледачоў. Праз некаторы час яны падышлі да тэлежурналістаў і, прадэманстраваўшы пасьведчаньні супрацоўнікаў АМАПу, заявілі, што праводзіць тэлездымкі ў цэнтры Менску забаронена, бо тут "шмат рэжымных аб’ектаў": маўляў, дзеля гэтага трэба мець адмысловы дазвол Службы бясьпекі прэзідэнта. Прад’яўленыя дакументы аб акрэдытацыі здымачнай групы пры беларускім МЗС амапаўцы назвалі фальшывымі і настойліва прапанавалі журналістам, а таксама і ўдзельнікам інтэрв’ю паехаць разам з імі ў РУУС Цэнтральнага раёну. Потым быў затрыманы яшчэ адзін актывіст "Зубра" Яўген Афнагель. У РУУС журналісты пачалі тэлефанаваць у консульства Расіі, у прэс-службу МУС і іншыя ўстановы, пасьля чаго іх адразу ж адпусьцілі. Сяброў "Зубра" пратрымалі ў аддзяленьні каля дзьвюх гадзінаў, пасьля чаго адпусьцілі без складаньня пратаколаў. Па словах маладых людзей, у якасьці галоўнай прычыны затрыманьня ім назвалі інтэрв’ю, якое тыя давалі расійскаму тэлеканалу. Алена Слаў упэўненая, што амапаўцы мелі сьпецыяльную апаратуру для праслухоўваньня размоваў на адлегласьці. Яна ўражаная фамільярнасьцю супрацоўнікаў праваахоўных органаў, якія адмовіліся назваць журналістам свае прозьвішчы, пажадаўшы застацца "Валеркам" і "Стасікам".

Аналагічны выпадак з умяшальніцтвам АМАПу ў працу тэлежурналістаў адбыўся днямі і са здымачнай групай расійскага тэлеканалу ТВЦ. Журналістка Вера Дашкевіч і аператар Уладзімір Андронаў праводзілі ў цэнтры Менску (у раёне

рэстарану "МакДональдз") апытаньне на тэму сімволікі на беларускіх грашовых купюрах. Патрульныя АМАПу падышлі да аператара і пачалі высьвятляць, пра што пытаюцца ў мінакоў. Адзін з іх прыгразіў забраць у журналістаў стужку, "калі пытаньні ня будуць адпавядаць тэме праграмы".

***7 чэрвеня*** суд Першамайскага раёну (судзьдзя Ананіч) адхіліў у поўным аб’ёме зыск старшыні БХК Тацяны Процькі і яе мужа Дзьмітрыя Козыра да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі і тэлежурналіста Юрыя Пракопава. Зыскоўцы патрабавалі кампенсацыі маральных стратаў за тое, што тэлевізійшчыкі парушылі таямніцу іх прыватнага жыцьця. Яны прадставілі шэраг дакументаў, якія даказвалі, што здымачная група БТ знаходзілася на тэрыторыі прыватнай гаспадаркі без дазволу яе ўладальнікаў. Акрамя гэтага, зыскоўцы падалі дакументальныя доказы пагаршэньня стану ўласнага здароўя і здароўя сваіх блізкіх пасьля выхаду ў эфір згаданай праграмы. Усе гэтыя дакументы былі далучаныя судом да справы, але ніяк не паўплывалі на яго рашэньне. "Вынесшы гэткае рашэньне, суд фактычна прызнаў, што агучаныя ў праграме зьвесткі не зьяўляліся таямніцай прыватнага жыцьця. Такім чынам, і памеры заробку, і наяўнасьць маёмасьці — гэта больш не таямніца, а інфармацыя агульнага карыстаньня! — рэзюмуе намесьнік кіраўніка БХК Гары Паганяйла, які рэпрэзентаваў інтарэсы Т. Процькі ў судзе. — Для нас зразумела, што сёньня, калі грамадзянін Беларусі ўступае ў канфлікт з прадстаўніком улады, разьлічваць на рэальную абарону сваіх правоў яму не даводзіцца, нягледзячы на тое, што гэтае права гарантавана яму Канстытуцыяй". Тым ня менш, зыскоўцы зьбіраюцца абскарджваць рашэньне Першамайскага райсуда ў судовую калегію.

***7 чэрвеня*** дэпутатаў-галадоўшчыкаў і актывістаў АГП, якія трымаюць палітычную галадоўку, наведалі амбасадары краінаў Еўрасаюзу: Польшчы, Літвы, Чэхіі, Славаччыны, Швецыі, Нямеччыны, Францыі, Вялікабрытаніі, а таксама кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску, прадстаўнікі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”, група прадпрымальнікаў. Усе яны выказалі галадоўнікам падтрымку і разуменьне іх патрабаваньняў. Амбасадары краінаў Еўрасаюзу правялі гадзінную гутарку з галадоўнікамі. Прадстаўнік Францыі Стэфан Шмялеўскі, зьвяртаючыся да дэпутатаў Валерыя Фралова, Сяргея Скрабца і Уладзіміра Парфяновіча, заявіў, што вылучаныя імі патрабаваньні “цалкам супадаюць з еўрапейскімі чаканьнямі” наконт пабудовы дэмакратычнай Беларусі. У гэты ж дзень галадоўнікаў наведалі прадстаўнікі прадпрымальніцкай ініцыятывы “Персьпектыва” з многіх гарадоў Беларусі. Яны заявілі пра поўную падтрымку “мужных дзеяньняў дэпутатаў”. У вячэрняй прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў двары дома па Казарменным завулку ў Менску, не змаглі ўзяць удзелу два галадоўнікі – актывісты АГП Марына Багдановіч і Генадзь

Ананьеў. Яны не пакідаюць межаў кватэры Валерыя Фралова, дзе праходзіць агульная галадоўка, бо на вуліцы іх можа затрымаць міліцыя, каб даставіць у суд за суботняе ўсталяваньне ў гэтым двары намётаў.

***7 чэрвеня*** галоўны рэдактар прафсаюзнай газеты "Рабочая салідарнасьць" Мікалай Галко зьвярнуўся да міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча з просьбай перагледзець рашэньне аб прыпыненьні выданьня на 3 месяцы. Ён лічыць, што дапушчанае рэдакцыяй парушэньне не заслугоўвае такога жорсткага пакараньня. Журналісты газеты заяўляюць, што не зьбіраюцца спыняць працу: яны плануюць публікаваць свае матэрыялы ў весьніку, які будзе выходзіць накладам 299 асобнікаў.

***8 чэрвеня*** галадоўнікаў наведаў амбасадар ЗША Джордж Крол. У афіцыйным паведамленьні амбасады ён назваў справядлівымі патрабаваньні галадоўнікаў і зноў заклікаў беларускія ўлады прывесьці выбарчае заканадаўства і працэдуры ў адпаведнасьць з нормамі АБСЕ, выконваць грамадзянскія і чалавечыя правы арыштаванага Міхаіла Марыніча.

***8 чэрвеня*** ў кватэру старшыні Віцебскай абласной арганізацыі АГП Генадзя Ананьева, які знаходзіцца ў Менску, пачалі тэлефанаваць невядомыя асобы з мэтаю высьветліць падрабязнасьці асабістага жыцьця ягоных сваякоў. Паводле словаў Людмілы Ананьевай, цікаўнасьць да іх сям’і праявілася адразу пасьля таго, як яе муж, Генадзь Ананьеў далучыўся да менскіх галадоўнікаў. Аднак напачатку гэта ня выклікала ў яе асаблівых падазрэньняў, бо супрацоўнікі міліцыі, якія прыходзілі да яе ў кватэру, патлумачылі свой візіт праверкай нейкага “сігналу грамадзкасьці” – нібыта ім стала вядома, што тут незаконна гандлююць сьпіртовымі напоямі. Спадарыні Людміле стала вядома, што невядомыя асобы зьвярталіся і да суседзяў, але ўжо з іншымі пытаньнямі: іх цікавіла, хто прапісаны ў кватэры, дзе працуюць сваякі спадара Ананьева, ці добранадзейная гэтая сям’я, і ў якой школе навучаецца іх дзіця. Невядомыя асобы задавалі падобныя пытаньні і па тэлефоне, таму Людміла Ананьева, баючыся за сваіх блізкіх, мусіла зьвярнуцца па дапамогу да юрыста Алега Граблеўскага. Ён параіў не адчыняць дзьверы невядомым асобам, а ў выпадку вострае небясьпекі паабяцаў неадкладна прыехаць. Спадарыня Ананьева перакананая, што раптоўная цікаўнасьць праваахоўных органаў да іх сям’і зьвязаная менавіта з удзелам мужа ў галадоўцы пратэсту, а таму яна не выключае магчымасьці любога кшталту правакацыяў з боку аршанскіх міліцыянтаў.

***8 чэрвеня*** міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў" звярнулася з адкрытым лістом да беларускага міністра інфармацыі ў сувязі з прыпыненнем прафсаюзнай газеты "Рабочая салідарнасьць". Арганізацыя лічыць, што

прыпыненьне выданьня зьяўляецца "часткай сістэматычных рэпрэсіяў супраць незалежнай і апазіцыйнай прэсы"."Рэпарцёры" нагадваюць, што ў штогадовым дакладзе за 2004 год яны выступілі з асуджэньнем захадаў адміністратыўнага ціску з боку беларускіх уладаў на незалежную прэсу. Яны акцэнтуюць увагу на тым, што імя А. Лукашэнкі фігуруе сярод 37 дзяржаўных кіраўнікоў, якіх "Рэпарцёры" лічаць ворагамі прэсы. Паводле падлікаў арганізацыі, у 2003 годзе ў Беларусі больш як 10 газетаў падвергліся перасьледу, больш за 15 незалежных выданьняў былі прыпыненыя, а некалькі арганізацыяў, што абаранялі правы СМІ, былі зачыненыя.

***9 чэрвеня*** ў Бялынічах затрыманыя магілёўскія прадстаўнікі кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. У раённым цэнтры Магілёўскай вобласьці міліцыянты затрымалі кіраўнікоў абласных арганізацыяў: Партыі БНФ – Рыгора Костусева, АГП – Уладзіміра Шанцава, Партыі працы – Галіну Лісіцыну і сябра ПКБ Анатоля Заўялава. Паводле словаў Рыгора Кастусёва, іх затрымалі ў двары шматпавярховага дому, дзе прадстаўнікі палітычных партыяў пачалі размову з жыхарамі Бялынічаў і толькі пасьпелі раздаць людзям некалькі асобнікаў газеты “Время” і ўлётак кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. Бялыніцкія міліцыянты даставілі палітыкаў з Магілёва ў пастарунак і сказалі ім, што гэта зроблена дзеля высьвятленьня асобаў.

***9 чэрвеня*** прэс-служба Адміністрацыі прэзідэнта распаўсюдзіла інфармацыю пра сутрэчу прэзідэнта Лукашэнкі з распрацоўшчыкамі Працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях. У ходзе гэтай сустрэчы прэзідэнт выказаў меркаваньне, што пераход да разгляду большасьці адміністратыўных правапарушэньняў судовымі органамі зьяўляецца неапраўданай мерай. “Распрацоўшчыкі кодэксу не ўлічылі, што судовая працэдура больш складаная, чым, напрыклад, разгляд адміністратыўнай справы ў міністэрстве, яна патрабуе большых выдаткаў і большых ведаў ад удзельнікаў працэсу, — гаворыцца ў паведамленьні прэс-службы прэзідэнта. – Гэткае кардынальнае зьмяненьне працэсу разгляду справаў аб адміністратыўных правапарушэньнях, па сутнасьці, разбурае сістэму, да якой прызвычаіліся грамадзяне краіны.” Акрамя таго, прэзідэнт выказаў занепакоенасьць магчымай перазагружанасьцю судоў адміністратыўнымі справамі. У сувязі з выкладзеным Праваабарончы цэнтр “Вясна” лічыць неабходным адзначыць, што толькі разгляд адміністратыўных справаў справядлівым судом можа быць сапраўднай гарантыяй выкананьня правоў грамадзянаў. Сябры Праваабарончага цэнтру “Вясна” прымалі непасрэдны ўдзел у тысячах адміністратыўных працэсаў як у судах, так і ў несудовых органах, і падчас большасьці гэтых працэсаў былі зафіксаваныя грубыя і сістэмныя парушэньні працэсуальных правоў грамадзянаў. Такая сітуацыя абумоўленая ў тым ліку і састарэлым

заканадаўствам – зараз у краіне дзейнічае Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэньнях, прыняты ў 1984 годзе — гэта самы стары з дзеючых кодэксаў. Таму прыняцьце сучаснага і прагрэсіўнага Працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях, са справядлівай працэдурай судовага разгляду адміністратыўных справаў, заснаванай на павазе да правоў грамадзянаў магло б стаць важным крокам па набліжэньні Беларусі да прававой дзяржавы. Ва ўмовах, калі ў Беларусі штогод фіксуецца да пяці мільёнаў адміністратыўных правапарушэньняў, па якіх у якасьці правапарушальнікаў фігуруюць тысячы грамадзянаў – дэлегаваньне паўнамоцтваў па разглядзе адміністратыўных справаў органам выканаўчай улады можа стварыць умовы для працягваньня прававога свавольства. Гэта можа павялічыць памеры парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі. Таму Праваабарончы цэнтр “Вясна” расцэньвае імкненьне да абмежаваньня паўнамоцтваў суда ў разглядзе адміністратыўных справаў як неабгрунтаваны і шкодны для грамадзтва крок.

***9 чэрвеня*** пакараньне ў выглядзе двух з паловай гадоў абмежаваньня волі вынес Кастрычніцкі суд Менску Аксане Новікавай. Яе прызналі вінаватай у паклёпе на Аляксандра Лукашэнку. Нагадаем, Аксану затрымалі 5 красавіка на чыгуначным вакзале падчас распаўсюду ўлётак, зробленых на ўзор міліцэйскіх абвестак пра вышук небясьпечнага злачынцы. Пад фотаздымкам Аляксандра Лукашэнкі быў надрукаваны сьпіс артыкулаў крымінальнага кодэксу, якія, на думку аўтара, ён парушыў. У судзе Аксана папрасіла спыніць справу, бо згодна з Дэкларацыяй правоў чалавека яна мае права на распаўсюд інфармацыі. У выпадку адмовы яна папрасіла дапытаць у якасьці сьведкаў Генеральнага пракурора Віктара Шэймана, былога Генпракурора Алега Бажэлку, міністра МУС Уладзіміра Навумава, экс-міністра Юрыя Сівакова, Зьміцера Паўлічэнку, Івана Ціцянкова, а таксама Хрыстаса Пургурыдэса, Анатоля Лябедзьку, Аляксандра Дабравольскага і прадстаўнікоў “Газпраму”, каб тыя патлумачылі датычнасьць Аляксандра Лукашэнкі да тых злачынстваў, якія Аксана пералічыла ва ўлётцы. Апроч таго, яна папрасіла выклікаць у суд самога пацярпелага – Аляксандра Лукашэнку. Судзьдзя адхіліла ўсе хадайнцтвы. Яна патлумачыла, што судзяць не Аляксандра Лукашэнку, а Аксану Новікаву. Замест гэтых сьведкаў спадарыня Басько апытала жанчыну-міліцыянтку, якая абшукала Аксану пасьля затрыманьня, і міліцыянта, які дзяжурыў на вакзале ў той дзень. Прадстаўнік пракуратуры Дыяна Глушкова на зьмест улёткі не зьвярнула ўвагі і спаслалася на прэзумпцыю невінаватасьці: маўляў, нельга называць чалавека злачынцам, пакуль няма прысуду. Гэта быў адзіны аргумент. Аксана Новікава мае дачку Рыяну, якой нядаўна споўнілася тры гады, і чакае дзіця. Адвакат Аксаны Новікавай Павел Сапелка найбліжэйшым часам падасьць скаргу ў гарадзкі суд.

***10 чэрвеня*** каля 400 чалавек узялі ўдзел у вулічнай акцыі "Ланцуг неабыякавых чытачоў" у падтрымку газеты "Народная воля" на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. А 18-й гадзіне людзі з асобнікамі "Народнай волі" ў руках сталі ў ланцуг уздоўж праспекту Ф. Скарыны, расьцягнуўшыся ад вуліцы Энгельса да Палацу прафсаюзаў. За акцыяй назіралі дзесяткі супрацоўнікаў міліцыі і АМАПу, аднак ніхто з яе ўдзельнікаў ня быў затрыманы. Людзі, што сабраліся на плошчы, не трымалі ніякіх лозунгаў, сьцягоў і не выступалі з публічнымі прамовамі, а толькі стаялі з газетамі ў руках. Сярод удзельнікаў акцыі былі такія вядомыя асобы, як былы кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Ганчарык, літаратары Уладзімір Някляеў, Ніл Гілевіч, сьпявачка Кася Камоцкая, старшыня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Жана Літвіна, праваабаронцы Валеры Шчукін, Людміла Гразнова, палітыкі Мікола Статкевіч, Юры Хадыка, Андрэй Саньнікаў ды іншыя. З-за затрымак на літоўска-беларускай мяжы не змаглі ўзяць удзелу ў акцыі кіраўнікі перадвыбарчай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Сярод тых, хто прыйшоў падтрымаць газету, было таксама шмат шараговых чытачоў "Народнай волі", у тым ліку і з рэгіёнаў. Галоўны рэдактар "Народнай волі" Іосіф Сярэдзіч прайшоў уздоўж усяго ланцуга, каб паціснуць кожнаму з удзельнікаў акцыі руку і падзякаваць за падтрымку. Журналістам ён у чарговы раз заявіў, што не дапусьціць спыненьня выхаду газеты, але і не зьбіраецца выплочваць кампенсацыю Ягору Рыбакову. Пра ход акцыі і паводзіны яе ўдзельнікаў падрабязна дакладалі за іх сьпінамі па рацыі людзі ў цывільным. На супрацьлеглым баку праспекту, з боку прэзідэнцкай рэзідэнцыі, на працягу ўсёй акцыі стаяў міліцэйскі ланцуг, а па баках "неабыякавых чытачоў" "ахоўвалі" па некалькі амапаўцаў. Акцыя на Кастрычніцкай плошчы доўжылася амаль гадзіну. Каля 19.00 частка ўдзельнікаў пачала разыходзіцца, а некаторыя з газетамі ў руках рушылі на завулак Казарменны, каб асабіста выказаць падтрымку галадоўнікам з дэпутацкай групы "Рэспубліка" і тым, хто да іх далучыўся. Ідэя правядзеньня акцыі ў падтрымку "Народнай волі" зьявілася пасьля таго, як 31 траўня калегія Вярхоўнага суда пакінула бяз зьменаў суму кампенсацыі (50 мільёнаў рублёў, альбо каля 23 тысячаў даляраў), якую "Народная воля" мусіць выплаціць былому кіраўніку БТ Ягору Рыбакову, які знаходзіцца ў сьледчым ізалятары па абвінавачаньні ў атрыманьні хабару. Апошняй судовай інстанцыяй, якая можа зьмяніць рашэньне калегіі Вярхоўнага суда, зьяўляецца прэзідыюм ВС.

***10 і 11 чэрвеня*** міліцыянты ў Віцебску затрымлівалі Барыса Хамайду на той час, пакуль Аляксандр Лукашэнка браў удзел у семінары для мясцовых кіраўнікоў. Паводле словаў Хамайды, у адказ на пытаньне: “За што вы мяне столькі часу трымалі ў пастарунку?” ён пачуў ад міліцыянтаў адказ: “За тое, што вы ня радыя прыезду Лукашэнкі”. Нічым іншым затрыманьні не былі абгрунтаваныя – нават не

складаліся пратаколы пра парушэньне грамадзкага парадку. Б. Хамайда правёў у міліцэйскім пастарунку амаль восем гадзінаў.

***11 чэрвеня*** ў Менску затрыманы Анатоль Шумчанка – лідэр грамадзкага аб’яднаньня “Персьпектыва". А.Шумчанка быў затрыманы з улёткамі, якія заклікалі прадпрымальнікаў да страйку ў падтрымку галадуючых дэпутатаў і актывістаў палітычных партыяў. У адносінах да А.Шумчанкі складзены пратакол па арт. 172 КаАП Рэспублікі Беларусь (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных).

***11 чэрвеня*** Горацкая раённая адміністратыўная камісія прысудзіла актывісту мясцовага “Клубу выбарцаў” Дзям’яну Франкоўскаму штраф за распаўсюд улётак Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. Падставай дзеля адміністратыўнага разьбіральніцтва паслужыла скарга старшыні Горацкага саюзу ветэранаў сп.Маркоўскага. Ён папрасіў міліцыянтаў разабрацца з дзейнасьцю мясцовай моладзі, якая раздае матэрыялы “Пяцёркі-плюс”, і прыклаў некалькі сабраных ім улётак, на якіх не былі пазначаныя выходныя зьвесткі. Акрамя таго, сп.Маркоўскі праявіў зайздросную інфармаванасьць, дакладна ўказаўшы каардынатара кампаніі распаўсюду па Горках Дзям’яна Франкоўскага. У выніку камісія пастанавіла спагнаць з абвінавачанага штраф у памеры адной базавай велічыні (19 000 руб.) паводле часткі 3 артыкулу 172 КаАП РБ (парушэньне парадку выпуску друкаванай прадукцыі).

***11 чэрвеня*** судзьдзя Жлобінскага раённага суда Зоя Ласоўская адхіліла зыск актывіста Аб’яднанай грамадзянскай партыі, былога дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня Марата Афанасьева да адміністрацыі Беларускага металургічнага заводу. Спадар Афанасьеў прад’явіў зыск дырэкцыі за дыскрымінацыю яго як працаўніка. У сакавіку дырэкцыя заводу ў адзін дзень вынесла Афанасьеву, як начальніку бюро, адразу тры пакараньні. У іх ліку і скарачэньне ягонай пасады. Марат Афанасьеў лічыць дзеяньні адміністрацыі заводу палітычна матываваным перасьледам.

***11 чэрвеня*** адзін з галадоўнікаў Валеры Фралоў, у якога раней быў інфаркт, а цяпер пачалося павышэньне ціску, быў абсьледаваны ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры “Кардыялогія”. Лекары зафіксавалі адхіленьні ў працы сэрца, якія сьведчаць пра ішэмію, і парэкамендавалі спыніць галадоўку. Аднак спадар Фралоў вырашыў працягваць сваю акцыю пратэсту разам з астатнімі галадоўнікамі.

***11 чэрвеня*** Цэнтральны суд Менску не задаволіў скаргу аб зьмене меры стрыманьня для Міхаіла Марыніча. Скарга аб зьмене меры стрыманьня для Міхаіла Марыніча разглядалася за зачыненымі дзьвярыма. Ужо праз гадзіну судзьдзя Вера

Грабоўская-Дайнека таксама за зачыненымі дзьвярыма абвесьціла сваё рашэньне — скарга адваката Веры Страмкоўскай не задаволеная. Такім чынам, Міхаіла Марыніч і надалей застаецца ў сьледчым ізалятары КДБ “амерыканка”, дзе яго трымаюць з 26 красавіка.

***12 чэрвеня***, на дзясяты дзень галадоўкі ў Менску дэпутатаў Валерыя Фралова, Уладзіміра Парфяновіча і Сяргея Скрабца разам з актывістамі партый АГП і БНФ, да галадоўнікаў у Менску далучыліся грамадзяне ў Жодзіне, Наваполацку і Віцебску. У Віцебску пяцёра партыйных актывістаў далучыліся да галадоўкі пратэсту. У Наваполацку трое грамадзянаў Аляксандр Цярэнцьеў, Ігар Сухарукаў і Уладзімір Цыбульскі працягваюць галадоўку на кватэры старшыні Наваполацкай арганізацыі АГП. У Жодзіне галадоўку працягвае Зьміцер Чарткоў, сябра Маладой Грамады. У сувязі з пагаршэньнем стану здароўя праз два дні тут спыніла галадоўку сябра АГП Ірына Валчаніна.

***14 чэрвеня*** гаспадарчы суд пачаў высьвятляць, чаму падатковая інсьпекцыя не палічыла абгрунтаванай аплату камандзіровачных стратаў для назіральнікаў на парламенцкіх выбарах 2000 году. Тады дзесяткі прадстаўнікоў ад БХК выправіліся назіраць за выбарамі ў сельскай мясцовасьці. Аплата камандзіровачных для гэтых людзей была запланаваная ў гранце, які выдаткавалі еўрапейскія структуры ў рамках праграмы TACIS. Пазьней падатковая інсьпекцыя Маскоўскага раёну Менску палічыла, што гэтыя грошы атрыманыя як прыбытак, і таму з іх трэба сплачваць падаткі. А за нявыплату падаткаў супраць старшыні БХК Тацяны Працькі і галоўнага бухгалтара грамадзкага аб’яднаньня была ўзбуджаная крымінальная справа. Працэс паводле зыску БХК супраць падатковай інсьпекцыі адкладзены на няпэўны час.

***14 чэрвеня*** ў гарадзкой пракуратуры Менску адбыўся новы допыт кіраўніка Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі паводле крымінальнай справы аб паклёпе на прэзідэнта. Крымінальны перасьлед лідэра АГП распачаты пасьля ягонага інтэрв’ю праграме “Зеркало” расійскага тэлеканалу РТР. У сваім выступе спадар Лябедзька крытыкаваў кіраўніка Беларусі за фармаваньне ценявога бюджэту, за замоўчваньне праўды пра зьніклых беларускіх палітыкаў, а таксама за ўтойваньне грошай ад продажу зброі. Гэтым разам допыт лідэра АГП доўжыўся больш за дзьве гадзіны. Анатоль Лябедзька сказаў, што прапанаваў сьледзтву шэраг дадатковых матэрыялаў, якія пацьвярджаюць праўдзівасьць ягоных выказваньняў. Анатоль Лябедзька па-ранейшаму кажа пра палітычную матываванасьць крымінальнай справы і сьцьвярджае, што, акрамя прапанаваных сьледзтву дакументаў, ён мае шэраг іншых фактаў, якія намерваецца скарыстаць у выпадку, калі справа дойдзе да суда. Адвакат палітыка Павел Сапелка таксама не выключае

магчымасьці перадачы крымінальнай справы ў суд. Але як адвакат ён лічыць, што юрыдычна абгрунтаваным рашэньнем было б спыненьне сьледзтва. Калі крымінальная справа ўсё ж будзе даведзеная да суда, то паводле артыкулу 367 Крымінальнага кодэксу, на падставе якога яна распачатая, палітыку пагражае пазбаўленьне волі тэрмінам да пяці гадоў. У падтрымку лідэра АГП выступаюць прадстаўнікі сацыял-дэмакратычных партыяў шэрагу краінаў, якія сабралі некалькі тысячаў подпісаў пад зваротам з патрабаваньнем спыніць перасьлед Анатоля Лябедзькі.

***14 чэрвеня*** ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце скончылася атэстацыйная праверка, арганізаваная Міністэрствам адукацыі. Нягледзячы на станоўчыя водгукі аб працы ЕГУ сяброў камісіі, яе старшыня заявіў, што ўніверсітэт атэстацыю не прайшоў. Супрацоўнікі ЕГУ лічаць гэта чарговым захадам улады ў барацьбе з універсітэтам. У працы атэстацыйнай камісіі Мінадукацыі, якая 17 дзён правярала працу Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, бралі ўдзел 56 эксьпертаў. Падчас выніковага паседжаньня большасьць сяброў камісіі ў цэлым далі станоўчую ацэнку працы калектыву ЕГУ і ўзроўню ведаў студэнтаў. Зусім іншую пазіцыю заняў старшыня атэстацыйнай камісіі Уладзімір Самусевіч. Гэты чыноўнік ня лічыць магчымым атэставаць ЕГУ. Прычынай такога рашэньня стала тое, што атэстацыю не прайшоў факультэт эканомікі. Падчас атэстацыйнага іспыту адзін з пяці студэнтаў гэтага факультэту атрымаў нездавальняючую адзнаку і панізіў ніжэй за норму адсотак пасьпяховасьці студэнтаў усяго універсітэту.

***15 чэрвеня*** Менскі гарадзкі суд адхіліў скаргу на незаконнае ўтрыманьне Міхаіла Марыніча ў сьледчым ізалятары КДБ. Адвакат Вера Страмкоўская зьвярнула ўвагу на юрыдычныя акалічнасьці, якія мусілі ўлічыць судзьдзі падчас разгляду яе скаргі на незаконнае ўтрыманьне Міхаіла Марыніча. Адвакат спасылалася на Крымінальны кодэкс, паводле якога ўтрыманьне Марыніча за кратамі не адпавядае цяжкасьці выстаўленага яму абвінавачаньня. Вера Страмкоўская ўказвала таксама на працэсуальныя парушэньні з боку сьледчых і пракурора Анатоля Ліскі. Адвакатка зьбіраецца абскардзіць гэтае рашэньне ў Вярхоўным судзе.

***15 чэрвеня*** 32-гадовы актывіст Аб’яднанай грамадзянскай партыі Алесь Карніенка быў выкліканы ў суд Заводзкага раёну Менску. Судовы выканаўца Сяргей Веташкін нагадаў, што спадар Карніенка павінен заплаціць штраф 1 мільён 650 тысячаў рублёў (гэта прыкладна 800 даляраў), які быў накладзены на яго за арганізацыю 7 лістапада 2003 году ў Гомелі акцыі грамадзкага галасаваньня адносна трэцяга прэзідэнцкага тэрміну Аляксандра Лукашэнкі. Алесь патлумачыў чыноўніку, што ён беспрацоўны і ня мае грошай, каб аплаціць такі вялікі штраф. Судовы

выканаўца патлумачыў, што апісаньне маёмасьці спадара Карніенкі па гэтай справе абавязковае.

***15 чэрвеня*** за распаўсюд друкаванай прадукцыі ў розных месцах Менску былі затрыманыя трое актывістаў руху "Зубр”. Аляксей Ляўковіч і Зьміцер Шчэпаў раздавалі яе ля выхаду з метро "Кастрычніцкая". Да іх падышлі два супрацоўнікі АМАП, якія не прадставіліся і адвялі ў арку бліжэйшага дому. Там амапаўцы і затрыманыя знаходзіліся амаль гадзіну, пакуль за імі не прыехала машына. “Зуброўцаў” даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну. Там іх пратрымалі яшчэ амаль гадзіну і пасьля таго, як яны адмовіліся даваць тлумачэньні, адпусьцілі. Яшчэ адзін удзельнік руху, Павел Юхневіч, быў затрыманы падчас распаўсюду газетаў на станцыі метро "Пушкінская". Яго даставілі ў апорны пункт міліцыі №108, дзе выпісалі позву ў РУУС Фрунзенскага раёну на 16 чэрвеня.

***15 чэрвеня*** ў раёне Камароўскага рынку былі затрыманыя актывісты руху “Зубр” Аляксей Шыдлоўскі і Аляксандр Атрошчанкаў. У апорным пункце міліцыі ў іх канфіскавалі друкаваныя выданьні.

***16 чэрвеня*** ў Наваполацкім гарадзкім судзе разглядаўся зыск былога начальніка зьмены Наваполацкай цеплаэлектрацэнтралі Вадзіма Духаменкі да адміністрацыі ЦЭЦ адносна ягонага звальненьня з прадпрыемства. Вадзім Духаменка ўзначальваў заводзкую суполку Свабоднага прафсаюзу, 1 траўня быў звольнены з працы. Такі ж лёс напаткаў і сяброў Рады прафсаюзнай арганізацыі Юрыя Гайчанку і Юрыя Обухава. Вёў судовае паседжаньне непасрэдна старшыня гарадзкога суда Пятро Ляўчонак. Спадар Духаменка быў звольнены з працы пасьля таго, як адміністрацыя ЦЭЦ адмовілася працягнуць з ім працоўны кантракт, аднак, паводле калектыўнай дамовы, яго ня мелі права звальняць як кіраўніка прафсаюзнай арганізацыі і сябра іншых выбарных органаў, у тым ліку -- камісіі па працоўных спрэчках. Разгледзеўшы ўсе абставіны справы, суд канстатаваў, што звальненьне адбылося не па ініцыятыве прадпрымальніка, а з прычыны сканчэньня кантракту і на гэтай падставе прызнаў звальненьне адпаведным заканадаўству.

***17 чэрвеня*** генеральны сакратар Інтэрполу Роналд Ноўбл падчас сваіх сустрэчаў у Менску з высокімі службовымі асобамі краіны заявіў, што Інтэрпол таксама шукае зьніклых беларускіх палітыкаў. Роналд Ноўбл прапанаваў кіраўніцтву беларускай міліцыі накіраваць свайго супрацоўніка ў цэнтральнае бюро Інтэрполу для працы ў тым ліку паводле гэтых справаў. Беларускі міліцыянт можа працаваць у аддзеле барацьбы з арганізаванай злачыннасьцю, пошуку тых, хто схаваўся ад суда, альбо ў аддзеле пошуку зьніклых.

***17 чэрвеня*** суд у Бярозе не задаволіў зыску дэпутаткі Белаазёрскага гарсавету Наталі Акаронка аб скасаваньні вынесенай ёй вымовы, на падставе якой яна была звольненая з працы. Наталя Акаронка, якая працавала ў Белаазёрскай школе №3 настаўніцай, вымову ад дырэктара школы атрымала летась у лістападзе. Дэпутатку гарсавету пакаралі за тое, што яна брала ўдзел у сесіі гарадзкога Савету.

***17 чэрвеня*** ў Беларусі адбыўся палітычны страйк прадпрымальнікаў, праведзены грамадзкім аб'яднаньнем "Персьпектыва" ў знак салідарнасьці з галадоўнікамі парламенцкай групы "Рэспубліка" і іх паплечнікаў. Паводле арганізатараў, акцыя суправаджалася ціскам уладаў на актывістаў прадпрымальніцкага руху, асабліва моцным у Менску. Тым ня менш, у страйку ўзялі ўдзел большасьць гандляроў шэрагу буйных сталічных рынкаў, а таксама прадпрымальнікі ўсіх абласных цэнтраў і такіх буйных гарадоў як Бабруйск, Пінск, Салігорск, Полацк. Усяго ў Беларусі, паводле зьвестак арганізатараў, страйкавалі каля 80 тысячаў чалавек у дваццаці гарадах краіны. У Гомелі за ўдзел у акцыі міліцыя затрымала Тацяну Марчанку і яе калегу Уладзіміра Няпомняшчых. У пастарунку на іх складзеныя пратаколы паводле часткі 1 артыкулу 167 — парушэньне парадку правядзеньня сходаў і мітынгаў.

***17-18 чэрвеня*** ў Кіеве прайшлі Міжнародныя грамадзкія слуханьні "Палітычныя зьнікненьні і па-засудовыя сьмяротныя пакараньні ў Рэспубліцы Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіне. Абарона ахвяраў: міжнародныя і нацыянальныя механізмы". Афіцыйнымі арганізатарамі Міжнародных грамадзкіх слуханьняў зьяўляюцца: Камітэт Вярхоўнай Рады Украіны па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю і карупцыяй і Віньніцкая праваабарончая група. Месца правядзеньня Міжнародных слуханьняў – канферэнц-зала Вярхоўнай Рады Украіны. У слуханьнях узялі ўдзел Сьпецыяльны дакладчык Камітэту па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека ПАСЕ Хрыстас Пургурыдэс, Тацяна Цэрмачыч (Савет Еўропы), Упаўнаважаны Вярхоўнай Рады Украіны па правах чалавека Н.І. Карпачова, Старшыня Камітэту Вярхоўнай Рады Украіны па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю і карупцыяй В.Н. Стратовіч, дэпутат Вярхоўнай Рады Рыгор Амельчанка, Сяргей Кавалёў і Валянцін Гефтэр (Расійская Федэрацыя), прадстаўнікі Міжнароднай Амністыі і Хьюман Райтс Вотч. З беларускага боку ў слуханьнях узялі ўдзел Зінаіда Ганчар, Вольга Захаранка, Вольга Завадзкая, прадстаўнікі праваабарончых арганізацыяў і СМІ.

***18 чэрвеня*** намесьніку старшыні страйкаму прадпрымальнікаў краіны Аляксандру Васільеву прад'явілі абвінавачаньне ва ўчыненьні крымінальнага злачынства — "публічная абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спалучаная з абвінавачаньнем ва ўчыненьні цяжкага злачынства". Месяц таму такое ж

абвінавачаньне выставілі Валерыю Леванеўскаму — старшыні страйкаму прадпрымальнікаў, якога трымаюць у сьледчым ізалятары. Аляксандра Васільева прызналі падазраваемым па гэтай справе, а праз два дні — абвінавачваемым. У пастанове сьледчага пракуратуры Альфрэда Танкевіча сказана, што спадар Васільеў разам са сваім знаёмым Леванеўскім “вырабіў кампутарна-капіравальным спосабам мноства ўлётак з тэкстам на расійскай мове ў выглядзе звароту да грамадзянаў”. Далей гаворыцца, што яны распаўсюдзілі гэтыя ўлёткі ў Гародні. Што да сутнасьці абвінавачаньня: маўляў, тэкст мае яўна абразьлівы характар. Абразьлівасьць гэтая “ў прыніжэньні гонару і годнасьці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь", ва ўчыненьні цяжкага злачынства — "злоўжываньні ўладай службовай асобай, якая займае адказнае становішча”. Гэта частка другая артыкулу 368 Крымінальнага кодэксу. Ніякай канкрэтыкі адносна тэксту няма. Варта нагадаць, што ва ўлётцы быў надрукаваны сатырычны вершык, у якім ёсьць безназоўны персанаж. Сьледчыя лічаць, што персанаж гэты — сам Аляксандр Лукашэнка. Падставай дзеля гэтага стала адзінае беларускае слова “кіраваць” у расійскамоўным вершы. Пра гэта сказалі Валерыю Леванеўскаму, які сядзіць у сьледчым ізалятары. Яго затрымалі перад першамайскім мітынгам, на якім прадпрымальнікі запатрабавалі адстаўкі прэзідэнта Лукашэнкі. Аляксандр Васільеў называе прад’яўленае яму абвінавачаньне абсурдным. Адносна намесьніка кіраўніка страйкаму прынятая мера стрыманьня — падпіска аб нявыезьдзе.

***18 чэрвеня*** сябры “Маладога Фронту” арганізавалі ў Берасьці пікет у падтрымку патрабаваньняў, якія вылучылі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, што трымаюць галадоўку. Пікет ладзіўся ў цэнтры Берасьця на вуліцы Савецкай каля кінатэатру “Беларусь”. Удзельнікі акцыі трымалі ў руках плакат, на якім было напісана: “Дэпутаты Фралоў, Парфяновіч і Скрабец. Яны могуць памерці. 16-ты дзень галадоўкі”. Сябры “Маладога Фронту” распаўсюджвалі сярод мінакоў улёткі, у якіх падрабязна паведамлялася пра патрабаваньні дэпутатаў, што абвесьцілі галадоўку. Асаблівая ўвага ва ўлётцы зьвярталася на тое, што галадоўнікі зьвяртаюцца да беларускага народу з просьбай не дапусьціць канстытуцыйнага перавароту і выступіць супраць рэферэндуму аб падаўжэньні паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. Пікет працягваўся паўтары гадзіны, міліцыянтаў на месцы акцыі не было.

***21 чэрвеня***, пасьля 18 дзён галадоўкі пратэсту, дэпутаты Валеры Фралоў, Уладзімір Парфяновіч, Сяргей Скрабец, а таксама актывісты АГП і БНФ заявілі пра спыненьне акцыі і пераход да іншых метадаў барацьбы за свабодныя выбары, супраць беззаконьня. На думку Валерыя Фралова, пэўных вынікаў галадоўнікам удалося дамагчыся, паколькі ў гэты дзень ім патэлефанавалі кіраўнікі камісіяў

Палаты прадстаўнікоў і паведамілі, што на наступны дзень на сесіі будзе разглядацца іх законапраект. Дэпутаты Валеры Фралоў, Уладзімір Парфяновіч і Сяргей Скрабец зьбіраюцца пайсьці ў Палату прадстаўнікоў, каб адстаяць свае прапановы па зьмене Выбарчага кодэксу. Уладзімір Парфяновіч зазначыў, што група “Рэспубліка” не хацела б, каб калегі-дэпутаты ацанілі іх галадоўку як ціск. Да пазітыўных вынікаў галадоўкі пратэсту Валеры Фралоў аднёс міжнародную падтрымку ўдзельнікаў акцыі, кансалідацыю актыўных і канструктыўных сілаў Беларусі, актывізацыю беларускага грамадзтва. Негатыўным вынікам акцыі дэпутат Сяргей Скрабец лічыць поўнае ігнараваньне патрабаваньняў дэпутатаў з боку кіраўніцтва парламенту і краіны. Ніхто нават не пацікавіўся станам здароўя дэпутатаў-галадоўнікаў. Да іншых негатыўных вынікаў акцыі Сяргей Скрабец аднёс поўнае замоўчваньне ў дзяржаўных СМІ.

***21 чэрвеня*** ў Наваполацкім гарадзкім судзе завяршыўся судовы разгляд скаргі праваабаронцы Зьміцера Салаўёва да Інсьпекцыі па падатках і зборах па гораду Наваполацку. Суд вынес рашэньне на карысць праваабаронцы. Нагадаем, што Дзмітрый Салаўёў быў аштрафаваны на 190 000 рублёў за тое, што не пусьціў супрацоўнікаў Інсьпекцыі ў свой офіс. За гэта на Зьміцера Салаўёва быў складзены адміністратыўны пратакол, у якім пазначалася, што Салаўёў перашкодзіў правядзеньню праверкі. У ходзе судовага разьбіральніцтва высьветлілася, што прадпісаньне на правядзеньне праверкі было аформлена некарэктна, а таксама высьветлілася тое, што для правядзеньня праверкі не было законных падставаў. Судзьдзя Баднарчук Альбіна Леанідаўна вынесла рашэньне: дзеяньні супрацоўнікаў Інсьпенкцыі прызнаць неправамоцнымі, адміністратыўную справу ў адносінах да Зьміцера Салаўёва спыніць, а выплачаныя штраф і судовую пошліну спагнаць з Іньспекцыі па падатках і зборах па гораду Наваполацку.

***21 чэрвеня*** з Беларусі дэпартаваны журналіст недзяржаўнай газеты "Время" грамадзянін Украіны Міхаіл Падаляк. Журналістам, палітыкам і грамадзкім дзеячам, якія сабраліся на вакзале перад адпраўленьнем цягніка "Менск-Адэса", не дазволілі разьвітацца з калегам. Вокны былі шчыльна зацягнутыя ралетамі, а ў купэ, дзе ўтрымліваўся М. Падаляк, упусьцілі толькі журналістаў БТ. Падставай дзеля дэпартацыі Падаляка стала тое, што ён "зьяўляецца арганізатарам выпуску газеты "Время", артыкулы, апублікаваныя ў якой, утрымліваюць заклікі да кансалідацыі радыкальнай апазіцыі з мэтай супрацьдзеяньня дзяржаўным органам Беларусі, што можа прывесьці да дэстабілізацыі грамадзянскай згоды і палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы". Рашэньне прынятае ў адпаведнасьці з пунктам 2 артыкулу 25 Закону "Аб прававым становішчы замежных грамадзянаў і асобаў без грамадзянства, якія

жывуць на тэрыторыі Беларусі" і Палажэньнем аб парадку дэпартацыі замежных грамадзянаў і асобаў без грамадзянства. Журналісту нельга ўязджаць на тэрыторыю Беларусі на працягу 5 гадоў. Як распавяла сабраным на платформе жонка М. Падаляка Ірына (грамадзянка Беларусі), каля 7 раніцы 21 чэрвеня да іх у кватэру пачалі настойліва званіць. Калі гаспадары адчынілі дзьверы, у памяшканьне ўвайшлі прыкладна 8 чалавек – міліцыянты і людзі ў цывільным, сярод якіх быў таксама чалавек з відэакамерай. Яны далі журналісту 15 хвілінаў на тое, каб сабраць рэчы, загадалі ўзяць з сабой грошы і павезьлі ў невядомым накірунку. Наконт далейшых планаў сям'і Падаляк Ірына пакуль ня можа сказаць нічога канкрэтнага: яны з мужам не пасьпелі нават перамовіцца. Яна паведаміла, што ў Міхаіла на Украіне жывуць бацькі, але не пажадала ўдакладніць, у якім раёне. Нагадаем, што М. Падаляк – трэці замежны журналіст, дэпартаваны з Беларусі за апошнія гады.

***21 чэрвеня*** ў Менску абрабаваная кватэра папулярнай журналісткі газеты “Народная воля” Марыны Коктыш. У карэспандэнткі скрадзеныя грошы і ўпрыгожаньні. Рабаўнікі таксама прагледзелі ўсе працоўныя нататнікі журналісткі, адзін з іх парвалі.

***21 чэрвеня*** паўсотні навучэнцаў Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа зладзілі пікет на прасьпекце Францыска Скарыны. Апоўдні ліцэісты падышлі да брамы зачыненага ліцэю, пастаялі некалькі хвілінаў і пайшлі на прасьпект Францішка Скарыны. Там яны сталі жывым ланцугом ад рэстарацыі “Patio-Pizza” да Кастрычніцкага пляцу. Усе трымалі плакаты. Сярод іх былі такія: “Нам патрэбны ўласны дах над галавой”, “Дзеці – не біямаса”, “Вярніце наш ліцэй!”. Да акцыі далучыліся некалькі бацькоў ліцэістаў. Міліцыянты папярэдзілі дзяцей, што наступны раз, калі тыя будуць ладзіць пікет, абавязкова іх затрымаюць.

Раніцай ***22 чэрвеня*** каля будынку Дому ўраду быў затрыманы карэспандэнт Радыё Свабода Юры Сьвірко. Журналіст спрабаваў трапіць на паседжаньне сесіі Палаты прадстаўнікоў на падставе афіцыйнай акрэдытацыі, аднак на ўваходзе быў спынены міліцыяй. Ю. Сьвірко паказаў пропуск на ўваход у Палату з пячаткай службы бясьпекі і пазнакай "сапраўдны да 31 сьнежня 2004 г.", а таксама пасьведчаньне аб рэгістрацыі Радыё Свабода ў МЗС, сапраўднае да 9 красавіка 2005 году. Убачыўшы назву радыё, ахоўнік у форме службы бясьпекі прэзідэнта заявіў, што яго не прапусьцяць. Карэспандэнт уключыў дыктафон і спытаўся, на якой падставе яму забаронены ўваход у Палату прадстаўнікоў, але ахоўнік забраў у журналіста дыктафон і выбег з будынку. Пасьля гэтага Сьвірко адразу схапілі людзі ў цывільным, заламалі рукі і выпіхнулі з будынку. Супрацоўнік службы бясьпекі зьнішчыў запісы на дыктафоне журналіста і толькі пасьля гэтага аддаў яму.

Сьведкамі гэтых падзеяў сталі кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску Эберхард Хайкен і кіраўніца дэлегацыі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ Ута Цапф. Спн. Цапф заявіла, што "такога яна яшчэ ніколі ня бачыла". Ю. Сьвірко зноў паспрабаваў прайсьці ў будынак, аднак на ўваходзе невядомы чалавек у цывільным забраў у яго абодва акрэдытацыйныя пасьведчаньні, заявіўшы, што яны цяпер несапраўдныя, і загадаў "ачысьціць памяшканьне". Калі Юры Сьвірко папрасіў яго паказаць пасьведчаньне, да ўваходу ў Дом ураду падбеглі 6 чалавек у цывільным, схапілі журналіста і пацягнулі ў машыну УАЗ з чырвоным міліцэйскім нумарам МН 0773. У машыне Ю. Сьвірко забаранілі тэлефанаваць і адказваць на тэлефанаваньні. Начальнік групы запытаўся ў журналіста, дзе ён жыве. "Мы вас туды зараз адвязем, – паабяцаў ён. – І за гэта грошы ня возьмем – лічыце, што гэта таксі". Юры Сьвірко назваў вуліцу Энгельса, і аўтамабіль давёз яго да рэдакцыі газеты "Народная воля", дзе карэспандэнта Свабоды выпусьцілі на волю.

***22 чэрвеня*** Палата прадстаўнікоў адхіліла папраўкі ў Выбарчы кодэкс, прапанаваныя дэпутатам Валерыем Фраловым. Патрабаваньне зьмены выбарчага заканадаўства было адным з пунктаў патрабаваньняў галадоўнікаў. Законапраект падтрымалі толькі 8 членаў Палаты, супраць прагаласавалі 71 дэпутат. Абмеркаваньне доўжылася тры гадзіны, у дыскусіі ўзялі ўдзел 32 дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

***22 чэрвеня*** ў гаспадарчым судзе Гарадзенскай вобласьці распачаўся разгляд скаргі Грамадзкага аб’яднаньня “Воля да разьвіцьця” да інсьпекцыі Міністэрства па падатках і зборах Слоніма. Грамадзкае аб’яднаньне патрабуе адмяніць рашэньне інсьпекцыі аб спагнаньні з арганізацыі падаткаў за сродкі, атрыманыя ад Еўрапейскай камісіі ў межах праграмы тэхнічнай дапамогі TACIS. Падчас разгляду было высьветлена, што да “справы TACIS” мае непасрэднае дачыненьне Камітэт дзяржбясьпекі. Падчас судовага паседжаньня судзьдзя Алег Кадач адхіліў хадайніцтва аб далучэньні да матэрыялаў справы дакументаў, якія сьведчаць на карысьць грамадзкага аб’яднаньня і знаходзяцца ў гаспадарчым судзе Менску ў межах аналагічнай справы па зыску Беларускага Хельсінкскага камітэту. Таксама судзьдзя адмовіўся далучаць да матэрыялаў справы вынікі заключэньня сьпецыяліста Беларускай гандлёва-прамысловай палаты па тэксьце міжнароднай дамовы, што рэгулюе выдзяленьне сродкаў у межах праграмы TACIS. У сваю чаргу, Слонімская падатковая інсьпекцыя прадставіла ў суд тлумачэньне абставінаў, што сталі падставай для праверкі арганізацыі і накладаньні на яе фінансавых санкцыяў. У прыватнасьці, адзначаецца, што “пажаданьне” зьвярнуць увагу падатковай інсьпецыі да ГА“Воля да развіцьця” было выказанае непасрэдна органамі КДБ.

***23 чэрвеня*** Беларускі Хельсінкскі камітэт выйграў судовы працэс супраць падатковай інсьпекцыі Маскоўскага раёну Менску. Суд пастанавіў адмяніць рашэньне аб спагнаньні з БХК падаткаў і штрафаў на больш чым 70 тысячаў даляраў. Між тым крымінальная справа супраць кіраўнікоў БХК ня спыненая. Судзьдзя Аксана Міхнюк з Менскага гаспадарчага суда пастанавіла цалкам задаволіць зыск Беларускага Хельсінкскага камітэту да падатковай інсьпекцыі Маскоўскага раёну Менску. Судзьдзя адмяніла рашэньне падатковай інсьпекцыі супраць БХК, а таксама абавязала спагнаць з падаткавікоў 190 тысячаў рублёў дзяржаўнай пошліны, якія праваабаронцы мусілі заплаціць пры звароце ў суд. Прадстаўніца падатковай інсьпекцыі Маскоўскага раёну, якая прайграла справу ў судзе, ня здолела адказаць на пытаньне, ці будзе яе арганізацыя абскарджваць рашэньне судзьдзі Аксаны Міхнюк у Вышэйшым гаспадарчым судзе.

***24 чэрвеня*** ў Наваполацку падчас распаўсюду ўлётак з тэкстам супраць трэцяга прэзідэнцкага тэрміну былі затрыманыя тры актывісты мясцовай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Сярод затрыманых:

1. Зьміцер Салаўёў, праваабаронца;
2. Іна Барысевіч, сябра Наваполацкага ЗБС;
3. Аляксей Трубкін, сябра Партыі БНФ.

Арыштаваныя былі дастаўленыя ў Наваполацкі ГАУС, дзе іх пратрымалі дзьве гадзіны. У затрыманых канфіскавалі ўлёткі, але адміністратыўных пратаколаў ня склалі. Быў складзены толькі пратакол выманьня ў Зьміцера Салаўёва ўлётак, але копіі дадзенага пратаколу Салаўёву ня выдалі.

***24 чэрвеня*** ў Ленінскую пракуратуру Гародні выклікалі дзяцей і жонку Валерыя Леванеўскага для дачы паказаньняў у якасьці сьведкаў па крымінальнай справе аб публічнай абразе прэзідэнта Лукашэнкі. Абвінавачанымі па гэтай справе зьяўляюцца сам кіраўнік незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў краіны Валеры Леванеўскі, які сядзіць у гарадзенскім сьледчым ізалятары, і ягоны намесьнік Аляксандр Васільеў. Сьледчы пракуратуры паведаміў Леванеўскім, што яны могуць адмовіцца даваць паказаньні супраць сваіх сваякоў. І ўсе яны: сыны Валерыя — Дзьмітрый, Уладзімір, дачка Кацярына і жонка Марына выкарысталі гэтую магчымасьць і даваць паказаньні адмовіліся.

***24 чэрвеня*** ў Менску былі затрыманыя два актывісты руху "Зубр". Яны расклейвалі плакаты з лагатыпам руху і нумарам кантактнага пэйджэру на тумбах для аб`яваў. На вуліцы Багдановіча іх затрымалі патрульныя міліцыянты і адвезлі ў РУУС Савецкага раёну. Там яны знаходзіліся амаль гадзіну. Пасьля аднаго з “зуброў”

даставілі ў бліжэйшы апорны пункт міліцыі, дзе на яго быў складзены пратакол па артыкуле 143 КаАП (антысанітарыя). “Зубра” адпусцілі толькі ў 12 гадзінаў ночы. Увесь час, які ён знаходзіўся ў апорным пункце, супрацоўнікі міліцыі адмаўляліся даваць інфармацыю пра затрыманага іншым актывістам руху, якія чакалі яго ля ўваходу.

***25 чэрвеня*** за раздачу дзевятага нумару інфармацыйнага бюлетэню "Супраціў" было затрымана трое актывістаў руху "Зубр" каля Беларускага ўніверсітэту культуры. У падземным пераходзе яны былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі. “Зуброў” даставілі ў апорны пункт міліцыі на вуліцы Сьвярдлова, дзе пратрымалі тры гадзіны.

***25 чэрвеня*** Віцебскі абласны выканаўчы камітэт палічыў правамоцнай адмову Наваполацкага гарвыканкаму ў рэгістрацыі структураў Свабоднага прафсаюзу Беларускага. Наваполацка-Полацкая рэгіянальная арганізацыя Свабоднага прафсаюзу Беларускага, а таксама яе падразьдзяленьні — “пярвічкі” на ААТ “Нафтан” і Наваполацкай ЦЭЦ амаль год ня могуць зарэгістравацца ў мясцовых органах улады. Пафаб’яднаньне страціла юрыдычны статус у выніку кампаніі па перарэгістрацыі. У 2003 годзе прафсаюзьнікі некалькі разоў падавалі ў Наваполацкі гарвыканкам усе неабходныя для рэгістрацыі паперы. Аднак улады адмовіліся надаваць арганізацыі афіцыйны статус, бо, маўляў, ёсьць праблемы з дакуметамі. У лісьце, які прыслаў на імя старшыні СПБ Генадзя Быкава начальнік упраўленьня юстыцыі аблвыканкаму Віктар Пранік, адзначаецца, што “рашэньне прынятае гарвыканкамам у адпаведнасьці з патрабаваньнямі дзеючага заканадаўства”.

***25 чэрвеня*** на два месяцы працягнутае ўтрыманьне пад вартай Міхаіла Марыніча. На такі ж тэрмін працягнутае расьсьледваньне справы былога міністра. Адвакаты М. Марыніча заявілі, што будуць абскарджваць гэтае рашэньне ў судзе.

***25 чэрвеня*** ў Страсбургу закончылася чарговая сесія Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы, на пленарных паседжаньнях якой беларускае пытаньне не закраналася. Аднак па-за межамі сесійнае залы адбыліся кансультацыі сяброў Камітэту па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека з прадстаўнікамі Камітэту правоў чалавека парламентароў МПС — Міжпарламенцкага саюзу, у якім прадстаўлены Нацыянальны сход Беларусі. Нягледзячы на тое, што сьпікер Палаты прадстаўнікоў РБ Вадзім Папоў на чале беларускіх дэлегацыяў часта бывае на паседжаньнях МПС, пасьля дакладу Хрыстаса Пургурыдэса адмысловы камітэт МПС, які створаны для абароны членаў парламентаў, займецца справай Віктара Ганчара, дэпутата Вярхоўнага Савету Беларусі 12-га і 13-га скліканьняў. Як чакаецца, праз тыдзень будзе абнародаваная супольная дэкларацыя двух камітэтаў — ПАРЕ і МПС

— па справе зьнікненьня Віктара Ганчара. Мяркуецца, што ў дэкларацыі будзе выказанае патрабаваньне звальненьня Генеральнага пракурора Беларусі Віктара Шэймана, і Нацыянальны сход, які не адрэагаваў на такі ж заклік з боку ПАРЕ, будзе вымушаны даць адказ Міжпарламенцкаму саюзу. Другой галоўнай беларускай падзеяй у Страсбургу стала абмеркаваньне наступстваў дакладу спадара Пургурыдэса пра зьніклых з выканаўчым органам Рады Еўропы. Камітэт міністраў папрасіў сакратарыят Камітэту падрыхтаваць прапановы, якія будуць разгледжаныя на наступным паседжаньні.

***25 чэрвеня*** Міністэрства юстыцыі накіравала ў Вярхоўны суд зыск з патрабаваньнем ліквідаваць Беларускую партыю працы. Лідэр партыі Аляксандр Бухвостаў і ягоныя калегі па Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” лічаць, што ўлады напярэдадні выбараў распачалі працэс зьнішчэньня апазіцыйных партыяў. Паводле інфармацыі, перададзенай прэс-службай Мінюсту дзяржаўнаму агенцтву БелТА, Беларуская партыя працы нібыта парушыла заканадаўства падчас разьмяшчэньня сваіх кіруючых органаў, арганізацыйных структураў у Віцебску, Гародні і іншых рэгіёнах. Партыю таксама абвінавачваюць у недакладных зьвестках, перададзеных Мінюсту, ігнараваньні патрабаваньняў гэтага міністэрства ды “іншых грубых парушэньнях”. Старшыня Партыі працы Аляксандр Бухвостаў назваў наступныя прэтэнзіі Мінюсту: “Цяпер яны ставяць пытаньне, што партыя ўваходзіць у склад Народнай кааліцыі. Мы ім патлумачылі, што ў Народную кааліцыю ўваходзяць сябры партыі, якія рыхтуюцца да выбараў. А партыя, як структура, не ўваходзіць ні ў якія незарэгістраваныя кааліцыі. Потым яны інкрымінуюць тое, што мы падпісалі ліст у абарону газеты “Народная воля”. Што мы распаўсюджваем платформу Народнай кааліцыі. Я думаю, што на нашай партыі спрабуюць адпрацаваць удар па ўсіх палітычных партыях”. Лідэр Беларускай партыі працы лічыць, што ініцыятыва ўладаў непасрэдна зьвязаная з выбарамі ў Палату прадстаўнікоў: “Пачынаецца ліквідацыя палітычных партыяў, гэта значыць, усталяваньне поўнай дыктатуры. Я думаю, яны абралі нашую партыя таму, што яна, можа, не такая вялікая, як Партыя камуністаў ці Аб’яднаная грамадзянская. Можа, яны лічаць, што мы “слабое зьвяно” сярод апазіцыйных партыяў. Альбо гэта падкопы Фэдерацыі прафсаюзаў — тых людзей і структураў, якія змагаюцца супраць незалежнага рабочага і прафсаюзнага руху. Тут супалі інтарэсы многіх — каб ліквідаваць нашую арганізацыю”. Апошнім часам чыноўнікі Мінюсту выяўляюць інтарэс да дзейнасьці БСДГ, БНФ ды іншых апазіцыйных партыяў. Станіслаў Шушкевіч і Вінцук Вячорка не выключаюць, што напярэдадні выбараў улады паспрабуюць ліквідаваць і іншыя апазіцыйныя партыі. Партыя працы дзейнічае ў Беларусі з 1993 году і налічвае ў сваіх шэрагах прыкладна дзьве з паловай тысячы сяброў. Гэта фактычна першая спроба ўладаў ліквідаваць

зарэгістраваную партыю. Праўда, у 1999 годзе праз суд былі ліквідаваныя Сялянская, Нацыянальна-дэмакратычная партыі, Партыя здаровага сэнсу, Усебеларускага адзінства і згоды, Хрысьціянска-дэмакратычная злучнасьць ды іншыя. Але гэтыя партыі ня мелі дастатковай колькасьці сяброў і не прайшлі дзяржаўнай перарэгістрацыі.

***26 чэрвеня*** ў Гародні падчас апытаньня адносна трэцяга тэрміну прэзідэнцтва А.Лукашэнкі затрыманыя актывісты АГП Вадзім Іодзель, Яўген Лукша і Віталь Філіповіч. Яны былі дастаўленыя ў Кастрычніцкі РАУС, дзе быў складзены пратакол аб іх затрыманьні. Ім былі ўручаныя позвы з патрабаваньнем зьявіцца 28 чэрвеня ў Кастрычніцкі РАУС г. Гародні. У выходныя дні ў Гародні, Ваўкавыску і Віцебску прайшоў альтэрнатыўны рэферэндум, арганізаваны актывістамі АГП. Галоўнае пытаньне заключалася ў наступным: “Ці згодныя вы з тым, каб адна і тая ж асоба займала прэзідэнцкую пасаду больш за 2 тэрміны запар?”. З 3922 чалавек, якія прынялі ўдзел у імправізаваным галасаваньні, супраць трэцяга тэрміну выказаліся 3613. Гэта складае больш за 92% ад агульнай колькасьці прыняўшых удзел у рэферэндуме. Дадзеная акцыя выклікала адпаведны рэзананс у праваахоўных органаў .

***27 чэрвеня*** ў раёне парку імя Горкага г. Менску падчас распаўсюду друкаванай прадукцыі быў затрыманы непаўнагадовы Зьміцер Кучынскі. Ён быў дастаўлены ў апорны пункт аховы грамадзкага парадку №70 Партызанскага РУУС, дзе на яго быў складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па арт. 172 ч.3 КаАП РБ. Пры гэтым затрыманаму не былі растлумачаныя ягоныя правы, прадугледжаныя арт. 247 КаАП, не паведамілі аб затрыманьні бацькам, спрабавалі правесьці дагляд асабістых рэчаў без складаньня пратаколу і пратаколу аб выманьні друкаванай прадукцыі. Калі Зьміцер указаў супрацоўнікам міліцыі на іх незаконныя дзеяньні, капітан міліцыі, які не назваў сваё прозьвішча, нанёс яму некалькі ўдараў у вобласьць галавы, а таксама некалькі ўдараў па целе. У сваёй заяве ў пракуратуру Партызанскага раёну Зьміцер напісаў: “Сьведкам майго зьбіцьця капітанам міліцыі стаў Аляксандр Шэлег, які знаходзіўся ў гэты момант у памяшканьні, дзе ўсё адбывалася”. Зьміцер Кучынскі запатрабаваў правесьці пракурорскую праверку ўказаных фактаў, устанавіць асобу капітана міліцыі, які яго зьбіў, і прыцягнуць яго да ўсталяванай законам адказнасьці.

***28 чэрвеня*** чатыром палітычным партыям у Віцебску загадана вызваліць арэндаваныя офісы. Разам з гарадзкімі арганізацыямі Аб’яднанай грамадзянскай партыі, Ліберальна-дэмакратычнай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) загад пра

вызваленьне з арэндаваных плошчаў атрымала і няўрадавая арганізацыя “Самакіраваньне і грамадзтва”. Грамадзкія і партыйныя актывісты лічаць, што пазбаўленьне офісаў непасрэдна зьвязанае з падрыхтоўкай уладаў да парламенцкіх выбараў. У адміністратыўным будынку па вуліцы Герцэна, дом 10/7, які належыць будаўнічаму трэсту №9, палітычныя партыі бесьперашкодна арандавалі памяшканьні цягам мінулых чатырох гадоў. 27 чэрвеня кіраўнікі гарадзкіх арганізацыяў АГП, ЛДПБ, БСДГ і БСДП (НГ) атрымалі лісты за подпісам генеральнага дырэктара Валянціна Козічкіна, дзе паведамляецца пра скасаваньне дамоваў арэнды і загад вызваліць памяшканьні цягам наступных дзесяці дзён — з прычыны таго, што цяпер гаспадары будуць выкарыстоўваць іх дзеля ўласных патрэбаў. Даведацца пра планы будаўнічага трэсту адносна вызваленых памяшканьняў не ўдалося. Партыйныя кіраўнікі падрыхтавалі палітычную заяву на імя кіраўніцтва гораду ды вобласьці, дзе пішуць пра тое, што іх сьвядома пазбаўляюць магчымасьці існаваньня. Тым часам па віцебскім тэлебачаньні ўжо прайшла аб’ява пра тое, што будаўнічы трэст №9 гатовы здаць шэраг памяшканьняў у арэнду новым гаспадарам.

***28 чэрвеня*** суд Маларыцкага раёну абвесьціў папярэджаньне дэпутату мясцовага райсавету, юрысту Праваабарончага цэнтру “Вясна”, сябру Партыі БНФ Уладзіміру Малею. Пакараньне вынесенае за правядзеньне ў вёсцы Струга сустрэчы з выбаршчыкамі, якая тычылася будаўніцтва паблізу гэтага населенага пункту могільніку радыёактыўных адкідаў. Сустрэча дэпутата была ўспрынятая мясцовымі міліцыянтамі, а пазьней і судом як несанкцыянаваны сход, за што дэпутат мусіць несьці адміністратыўную адказнасьць. Насуперак нормам заканадаўства справа разглядалася ў адсутнасьць спадара Малея, які паведаміў, што ня зможа ў вызначаны час прысутнічаць у судзе. Дарэчы, падчас правядзеньня сходу ў вёсцы Струга знаходзіліся і прадстаўнікі Маларыцкага райвыканкаму, якія нічога не казалі пра парушэньне закону. Таму Уладзімір Малей лічыць, што вынесенае пакараньне мае іншую прычыну. "Гэтая адміністратыўная справа, – кажа У. Малей, – заведзеная праз паўтары месяцы пасьля таго, як усё адбылося. Я мяркую, што матывам зьяўленьня яе сталася тое, што Партыя БНФ падала ў суд на начальніка аддзелу інфармацыі Маларыцкага раёну спадара Строка за тое, што ён сказаў, што Партыя БНФ у гады Вялікай Айчыннай вайны была на баку фашысцкай Германіі”. Як помста дэпутату і зьявілася гэтая адміністратыўная справа.

***28 чэрвеня*** за распаўсюд новага выпуску газеты "Зубр" у Менску былі затрыманыя Павел Юхневіч, Кацярына Сьмірнова, Люба Кучынская і Раман Казакевіч. Юхневіча затрымалі на станцыі метро "Усход", астатнія — у раёне станцыі "Інстытут культуры". У дачыненьні ўсіх затрыманых былі складзеныя пратаколы па

артыкуле 172 КаАП (парушэньне заканадаўства аб СМІ). Праз некаторы час усе былі вызваленыя.

***28 чэрвеня*** дэпутаты групы "Рэспубліка" Валеры Фралоў, Сяргей Скрабец, Уладзімір Парфяновіч падалі заяўку ў Менгарывканкам на правядзеньне ў Менску 21 ліпеня акцыі, прысьвечанай 10-гадоваму праўленьню краінай прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Сярод заяўнікаў таксама лідэр грамадзянскай ініцыятывы "Мы памятаем" Ірына Красоўская, сябра "Зубра" Мікіта Сасім і сустаршыня Рады беларускай інтэлігенцыі Уладзімір Колас. А 18-й гадзіне 21 ліпеня дэпутаты "Рэспублікі" плануюць сабраць грамадзянаў на плошчы Якуба Коласа ў Менску. Адсюль дэманстранты павінны накіравацца на плошчу Бангалор, дзе адбудзецца мітынг і канцэрт. Паводле Сяргея Скрабца, заяўка на правядзеньне акцыі пададзеная загадзя, каб ва ўладаў быў час падумаць, як дапамагчы ў правядзеньні дэманстрацыі, мітынгу і канцэрту. Заяўнікі разьлічваюць на ўдзел як мінімум тысячы чалавек.

***29 чэрвеня*** дэпутаты групы "Рэспубліка" Валеры Фралоў і Сяргей Скрабец падчас свайго візіту ў Бабруйск вымушаныя былі сустрэцца з выбаршчыкамі і грамадзкімі актывістамі гораду на плошчы Перамогі, паколькі ім адмовілі ў памяшканьні. Як паведаміў лідэр бабруйскай арганізацыі АГП Уладзімір Куртукоў, кіраўніцтва гатэлю "Бабруйск", дзе была зарэзерваваная для сустрэчы з выбаршчыкамі актавая зала, у апошні момант адмовіла дэпутатам. На вечаровай сустрэчы на плошчы, у якой бралі ўдзел каля трох дзесяткаў бабруйчанаў, вялася гаворка пра сітуацыю ў краіне. Таксама дэпутаты сустрэліся з прыватнымі прадпрымальнікамі на гарадзкім рынку ў Бабруйску.

***29 чэрвеня*** Міхаіл Марыніч зьвярнуўся з адкрытым лістом да старшыні КДБ Леаніда Ерына і Генпракурора Віктара Шэймана. Былы амбасадар і міністр заклікаў гэтых кіраўнікоў служыць закону, а не злачынным загадам. Міхаіл Марыніч у сваім адкрытым лісьце да Леаніда Ерына і Віктара Шэймана абвінавачваў іх у пасобніцтве дыктатуры, якая ўсталёўваецца ў Беларусі. "Вы лепш за іншых дзяржаўных чыноўнікаў ведаеце, да чаго прывяла краіну дыктатарская палітыка. Да беззаконьня, росквіту карупцыі і хабарніцтва ва ўсіх структурах улады і бізнэсу", — піша Міхаіл Марыніч. Паводле ягонага перакананьня, у падобных умовах прэзідэнт мусіць пайсьці ў адстаўку, але ў Беларусі замест гэтага робіцца ўсё, каб незаконна працягнуць ягоныя паўнамоцтвы. Ён мяркуе, што Леанід Ерын і Віктар Шэйман баяцца выконваць закон і спыніць перасьлед тых, хто супрацьстаіць дыктатарскім памкненьням "аднаго чалавека". Былы міністр і амбасадар выказвае сваю версію таго, з якой прычыны ўлады перасьледуюць асабіста яго. "Уладзе не падабаецца, што я адкрыта выступаю супраць дэградацыі краіны, заклікаю адысьці ад палітычнай

і эканамічнай бездані, ад галечы і самаізаляцыі, патрабую раскрыць народу праўду пра тое, чаму бяз сьледзтва і суда зьнікаюць вядомыя апаненты ўлады”, — сьцьвярджае ў сваім лісьце Міхаіл Марыніч. “Чаму ж вы гэтак мяне баіцеся, што ўтрымліваеце за кратамі ўсялякімі, нават незаконнымі сродкамі?” — пытае Міхаіл Марыніч старшыню КДБ Леаніда Ерына і Генеральнага пракурора Віктара Шэймана. Далей Міхаіл Марыніч папярэджвае гэтых кіраўнікоў, што пакідае за сабой права распачаць галадоўку, калі яго ня выпусьцяць на волю.

***29 чэрвеня*** ўступіў у законную сілу прысуд Аксане Новікавай — цяжарную жанчыну могуць адправіць на “хімію” адбываць пакараньне за паклёп на прэзідэнта. Аксана будзе абскарджваць дзеяньні Кастрычніцкага суда г. Менску. Аксана Новікава прынесла ў суд скаргу на судовае рашэньне, але ўзяць яе адмовіліся, спаслаўшыся на тое, што прысуд — два з паловай гады абмежаваньня волі за паклёп на прэзідэнта — з гэтага дня ўступіў у законную сілу. Аксана сьцьвярджае, што падала ў суд папярэднюю скаргу на судовае рашэньне, і яе зарэгістравалі. Але калі яна прынесла канчатковую скаргу, ёй паведамілі, што, паколькі ніхто ня скардзіўся, прысуд ужо набыў законную сілу. Аксана Новікава лічыць, што суд наўмысна пайшоў на такі крок: “18 чэрвеня я занесла ў суд Кастрычніцкага раёну папярэднюю скаргу. Цяпер мне нахабна кажуць у вочы, што я ніколі нічога не падавала, таму прысуд уступіў у законную сілу і я не магу яго ўжо абскардзіць. У мяне такое адчуваньне, што яны наўмысна згубілі маю скаргу, каб суд набыў законную сілу, і каб я паехала адбываць пакараньне на “хімію”. Зараз я падам яшчэ адну скаргу з заявай на працяг тэрміну абскарджаньня ў зьвязку з тым, што яны згубілі скаргу. Падам яшчэ і наглядную скаргу на дзеяньні Кастрычніцкага суда ў вышэйшыя інстанцыі”. Паводле заканадаўства, цяжарную жанчыну, якая яшчэ і выхоўвае маленькае дзіця, ня могуць караць “хіміяй”. Але ў судовых дакументах няма зьвестак аб цяжарнасьці Аксаны. Цяпер гарадзкі суд мусіць разгледзець наглядную скаргу — і адмяніць прысуд раённага суда альбо з ім пагадзіцца.

***30 чэрвеня*** міліцыянты ўварваліся ў кватэру каардынатара “Зубра” Яўгена Афнагеля. Пяць чалавек на чале з участковым А. Скуратовічам схапілі Афнагеля на лесьвічнай пляцоўцы, гвалтам забралі ў яго ключы ад кватэры і ўвайшлі ў яе. У кватэры адбыўся вобыск. Ордэр на вобыск не прад’яўляўся, прычына гвалтоўных дзеяньняў не тлумачылася. Два чалавекі апранутыя ў цывільнае, астатнія – у міліцэйскай форме. Ніхто, акрамя ўчастковага, не прадставіўся, невядома таксама, супрацоўнікамі якога РУУС яны зьяўляюцца.

***30 чэрвеня*** ўрад прапанаваў папраўкі да законаў “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” і “Аб палітычных партыях”, якія пагаршаюць і без таго няпростае становішча

недзяржаўных арганізацыяў. Пра гэта казалі некаторыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падчас абмеркаваньня зьменаў і дапаўненьняў да згаданых законаў. Напрыклад, партыям, якія ўжо ўваходзяць у нейкія саюзы ці асацыяцыі, патрэбна будзе абавязкова зарэгістраваць у Міністэрстве юстыцыі новыя фармаваньні, хаця паасобку кожная з іх ужо прайшла гэтую складаную працэдуру. Міністр юстыцыі Беларусі Віктар Галаванаў, які ад імя ўраду абгрунтоўваў неабходнасьць зьмяненьня заканадаўства, казаў, што з моманту прыняцьця законаў прайшло амаль 10 гадоў. За гэты час Аляксандр Лукашэнка выдаў чатыры дэкрэты, якія тычацца грамадзкіх аб’яднаньняў і палітычных партыяў, і, маўляў, патрэбна перанесьці іх палажэньні ў закон. Міністр скардзіўся, што дзеючую цяпер норму, паводле якой партыю ці аб’яднаньне можна закрыць толькі калі яна атрымае два пісьмовыя папярэджаньні за год, таксама патрэбна зрабіць больш жорсткай. З прынцыпова новага спадар Галаванаў прапанаваў толькі адно: увесьці норму аб прыпыненьні дзейнасьці арганізацыі альбо партыі тэрмінам да шасьці месяцаў. Падчас дэбатаў амаль ніхто з дэпутатаў не падтрымаў прапановы ўраду. Але калі справа дайшла да галасаваньня, то неабходную норму — 56 галасоў абодва законапраекты атрымалі: 58 — аб грамадзкіх арганізацыях і 76 — аб палітычных партыях.

У чэрвені ўлады працягвалі наступ на незалежныя выданьні: чыноўнікі мясцовай “вертыкалі” ў рэгіёнах Беларусі арганізоўвалі масавую падпіску на дзяржаўныя газеты і забаранялі распаўсюд незалежных. Цягам апошняй падпісной кампаніі кожны супрацоўнік гарадзкой пошты Пінску мусіў падпісаць людзей на 27 асобнікаў газеты “Советская Белоруссия”. Каму гэтага зрабіць не ўдавалася, у таго вылічвалі адпаведную суму з заробкаў — і паштарам заставалася толькі падпісваць аплачаныя квіткі на сваякоў, знаёмых і суседзяў. Таксама падчас гэтай падпісной кампаніі слуцкім школьнікам забаранілі чытаць “Нашу Ніву”. Акрамя таго, паводле прэзідэнцкага дэкрэту аб ліцэнзаваньні, ад 1 траўня ўсе суб’екты гаспадараньня, якія займаюцца распаўсюдам перыёдыкі, мусяць мець на гэта адпаведную ліцэнзію. Аднак у такой ліцэнзіі было адмоўлена ўсім незалежным распаўсюднікам, і цяпер манапольнае права на дастаўку газетаў маюць толькі дзяржаўныя “Белпошта” і “Белсаюздрук”. Праваабаронцы перакананыя, што перасьлед незалежнага друку зьвязаны з хуткімі парламенцкімі і прэзідэнцкімі выбарамі.

## ЛІПЕНЬ

***1 ліпеня*** стала вядома, што беларускія габрэйскія арганізацыі дзеля змаганьня з пагрозай пашырэньня антысемітызму ствараюць антыфашысцкі камітэт. Пра гэта паведаміў віцэ-прэзідэнт Саюзу беларускіх габрэйскіх аб'яднаньняў і грамадаў Якаў Басін. Габрэйскія арганізацыі Беларусі неаднаразова скардзіліся на апаганьваньне габрэйскіх могілак, адкрыты продаж юдафобскай літаратуры. Іх занепакоіла закрыцьцё адзінага ў краіне ВНУ, дзе вывучалася юдаіка. Якаў Басін заявіў, што беларуская пракуратура і КДБ недастаткова рашуча змагаюцца з праявамі неафашызму, са скінхедамі, якія дзейнічаюць у Беларусі абсалютна адкрыта. Спадар Басін лічыць, што скінхеды маюць у краіне калі не адкрытую падтрымку, то прынамсі цярпімасьць з боку дзяржавы. “Гісторыя ХХ стагодзьдзя сьведчыць пра тое, што цярпімае стаўленьне да неанацысцкіх тэндэнцыяў у дзяржаве раней ці пазьней вядзе да незваротных наступстваў, разбуральных зьяваў у грамадстве і ў рэшце да шматлікіх чалавечых ахвяраў”, – гаворыцца ў звароце Саюзу габрэйскіх арганізацыяў. У гэты ж час выдавецтва ЗАТ “Праваслаўная ініцыятыва”, вядомае сваёй кнігай “Война по законам подлости”, што абразіла пачуцьці беларускіх габрэяў і стала прадметам шматлікіх судовых разьбіральніцваў, выпусьціла яшчэ дзьве навінкі аналагічнага зьместу. Новыя кніжкі “Праваслаўнай ініцыятывы” можна вольна купіць у кнігарні “Праваслаўная кніга” ў цэнтры Менску. Першая — аўтарства Андрэя Кураева пад назвай “Как делают антисемитизм”. Яна аздобленая выразна антыгабрэйскімі карыкатурамі — сярод якіх, напрыклад, стылістычнае абазначэньне фашызму і сіянізму як дзьвюх галінак аднаго дрэва. Другая кніга завецца “Нет плохих народов”. У ёй, напрыклад, сьцьвярджаецца, што сістэма першых гадоў савецкай улады была пабудаваная паводле ўзору габрэйскага кагалу.

***1 ліпеня*** Палата прадстаўнікоў Беларусі ў апошні дзень сеіі прыняла ў першым чытаньні закон “Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь”. Гэта – ня першая версія закону аб КДБ: такі закон у 1993 годзе прыняў Вярхоўны Савет 12 скліканьня. Тады дэпутатам апазіцыі БНФ удалося заблакаваць шэраг палажэньняў, якія надавалі КДБ надзвычайныя функцыі. Супраць цяперашняга законапраекту прагаласавалі толькі тры дэпутаты. Адзначым, што закон пакуль ня дзейнічае – ён прыняты ў першым чытаньні. У другім чытаньні яго, верагодна, будзе прымаць наступны склад Палаты прадстаўнікоў. Паводле новага законапраекту, супрацоўнікі КДБ маюць права ўзломваць дзьверы бяз санкцыі пракурора – гэтую санкцыю “чэкісты” могуць атрымаць пазьней, на працягу дваццаці чатырох гадзінаў. Прычым тычыцца гэта ня толькі памяшканьняў, якія належаць грамадзянам Беларусі альбо беларускім установам і арганізацыям. Паводле артыкулу 14 Закону, супрацоўнікі

КДБ могуць пранікаць у службовыя памяшканьні замежных дзяржаваў, якія вядуць выведку і могуць нанесьці шкоду інтарэсам бясьпекі Беларусі. Крытэрыі гэтай шкоды, натуральна, будзе вызначаць сам КДБ. Новы беларускі закон дазваляе агентам КДБ “укараняцца” ў арганізацыі і фірмы, у тым ліку і прыватныя, пад прыкрыцьцём звычайнага працаўладкаваньня. Прычым калі нехта публічна раскрые агента – дык за гэта ён рызыкуе панесьці крымінальную адказнасьць паводле артыкулу 18 гэтага Закону.

***1 ліпеня*** ў 23.20 Валерыя Фралова і кіроўцу ягонага аўтамабіля зьбілі ў пад’езьдзе дому па Казарменным завулку ў Менску, дзе знаходзіцца службовая кватэра дэпутата. Як толькі Фралоў і ягоны кіроўца ўвайшлі ў пад’езд, на іх накінуліся невядомыя ў аднолькавых чорных масках. Білі па галаве, твары, нырках, рэбрах. Падчас зьбіцьця скінулі на падлогу паштовую скрынку. Кіроўцу выбілі зуб, у Фралова адабралі партфель, у якім знаходзіліся дакументы і кнігі, партманэ і пашпарт. Хто мог арганізаваць напад і зьбіцьцё? Вось як адказвае на гэтае пытаньне сам дэпутат: “Калі сёньня раніцай, да пятай гадзіны, мы былі ў міліцыі, нас спыталі: а ці былі ў ваш адрас пагрозы? Я адказаў: “Так, былі. Летась Аляксандр Рыгоравіч сказаў мне, што месца мне ў Беларусі ня будзе, што парубім як капусту”. Я думаю, што гэтыя пагрозы пачалі ператварацца ў жыцьцё. Мабыць, гэта рэалізацыя ягоных словаў. Але мы зусім не зьдзіўляемся, таму што за намі ўвесь час сочаць, праслухоўваюць”. Паводле словаў спадара Фралова і кіраўніка дэпутацкай групы “Рэспубліка” Сяргея Скрабца, з якім генерал 1 ліпеня лётаў у Маскву, і ў сталіцы Расіі іх адсочвалі чатыры чалавекі ў цывільным з тэлекамерай. За два дні да гэтага Валерыя Фралова папярэдзілі, што супраць яго рыхтуецца правакацыя, раілі ўзяць ахову. Аднак займець ахову дэпутат не пасьпеў. Пракуратура Ленінскага раёну г.Менску ўзбудзіла крымінальную справу па факце нападу на дэпутата Палаты прадстаўнікоў Валерыя Фралова і ягонага кіроўцу. Справа заведзеная па артыкуле 206 ч. 2 (рабаваньне).

***1 ліпеня*** апеляцыйная рада пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасьці пакінула ў сіле сваё рашэньне, прынятае ў сьнежні 2003 году, аб тым, што таварны знак "Народная воля" належыць прадпрымальніку Сяргею Атрошчанку. Такім чынам, С. Атрошчанка цяпер можа запатрабаваць ад газеты "Народная воля" зьмяніць назву. Аднак галоўны рэдактар газеты Іосіф Сярэдзіч рашуча заяўляе, што не дазволіць насіць гэтае імя "ніводнаму нягодніку". Прадстаўнікі УП "Народная воля" зьбіраюцца аспрэчваць гэтае рашэньне ў вышэйшых інстанцыях. Разгляд скаргі распачаўся 30 чэрвеня. Прадстаўнікі УП "Народная воля" — патэнтны павераны Эдуард Сьвідэрскі і камерцыйны дырэктар УП Яўгенія Церахава — заявілі, што лічаць рэгістрацыю тавarнага знаку памылкай. "Гэта — фірмовае найменьне, якое

абараняецца ў адпаведнасьці з артыкулум 50 Грамадзянскага кодэксу, -— падкрэсьлівае Э. Сьвідэрскі. — Паводле гэтага артыкулу, І. Сярэдіч мае выключнае права на фірмовае найменьне. У іерархіі заканадаўчых актаў Грамадзянскі кодэкс стаіць вышэй за Закон аб таварных знаках". "Народная воля" была зарэгістраваная Іосіфам Сярэдзічам як сродак масавай інфармацыі амаль 9 гадоў таму, і за гэты час ніхто не аспрэчыў яго аўтарства. Тое, што С. Атрошчанка ведаў пра існаваньне гэтага "брэнду" на момант рэгістрацыі таварнага знаку, у прадстаўнікоў "Народнай волі" не выклікае сумневаў: прадпрымальнік ужо тады падаў некалькі судовых зыскаў супраць газеты. Паводле новага Закону "Аб таварных знаках", які пачаў дзейнічаць з 1 студзеня 2004 г., С. Атрошчанка ня змог бы зарэгістраваць "брэнд" "Народная воля" на сябе: Закон забараняе рэгістраваць таварны знак, які супадае з назвай СМІ, бяз згоды яго заснавальніка. У папярэднім дакуменце такой нормы не было. Прадстаўнікоў "Народнай волі" насьцярожвае тое, наколькі аператыўна Атрошчанка пасьпеў скарыстаць стары Закон: рэгістрацыя заняла ў яго тры дні, тады як у іншых выпадках заключэньня эксьпертнай камісіі даводзіцца чакаць каля году. "Іміджу газеты нанесеныя істотныя страты, таму што ўладальнік таварнага знаку цяпер можа зьвярнуцца ў адпаведныя органы, каб спыніць выхад газеты з назвай "Народная воля", — кажа кіраўнік Цэнтру прававой абароны СМІ пры ГА БАЖ Міхаіл Пастухоў. Ён лічыць рашэньне апеляцыйнай рады палітычна матываваным. "Цяпер, па аналогіі з гэтай працэдурай, вы можаце зарэгістраваць, напрыклад, таварны знак CNN альбо Forbes — і не пусьціць у Беларусь гэтыя СМІ, — папярэджвае Э. Сьвідэрскі. — Калі ў вас на руках пасьведчаньне на таварны знак, то вы можаце каго заўгодна не пусьціць на гэты рынак.

***1 ліпеня*** ў Менску быў гвалтоўна затрыманы старшыня грамадзкага аб'яднаньня прадпрымальнікаў “Персьпектыва” Анатоль Шумчанка. Інцыдэнт адбыўся на рынку “Ракаўскі кірмаш”. Кіраўнік “Персьпектывы” Анатоль Шумчанка прыехаў сюды дзеля абароны правоў прадпрымальніцы Ліліі Шымановіч. Адміністрацыя рынку пачала перасьлед удзельніцы прадпрымальніцкага страйку 17 чэрвеня, што адбыўся ў падтрымку дэпутатаў-галадоўнікаў. Прадпрымальніцы было абвешчана пра спыненьне дамовы на арэнду гандлёвай плошчы. Ініцыятыва Шумчанкі вярнуць актывістцы “Персьпектывы” працоўнае месца была прыпыненая гвалтам. Потым высьветлілася, што гвалтоўныя дзеяньні супраць Шумчанкі былі ўчыненыя аховай адміністрацыі рынку. Дырэктар “Ракаўскага кірмашу” Аляксандр Сінькоў лічыць, што вінаваты ў канфлікце сам лідэр “Персьпектывы”: “Шумчанка груба сфальсіфікаваў факты, — кажа ён, — бо абвінаваціў адміністрацыю прадпрыемства, якое я ўзначальваю, у многіх фактах. І замест прадпрымальнікаў зьбіралі подпісы ў гандляроў. Як высьветлілася, зьбіралі проста так, на паперу гэтыя

подпісы”. Каля гадзіны ахова рынку трымала спадара Шумчанку ў падвале. Заклікі мясцовых гандляроў вызваліць яго адміністрацыя рынку праігнаравала. На волю прадпрымальніцкі лідэр быў выпушчаны толькі пасьля зьяўленьня міліцыянта. Вось як пракаментаваў інцыдэнт сам спадар Шумчанка: “Калі ахова звычайнага рынку заломвае рукі чалавеку па палітычных матывах, то гэта характарызуе нашу краіну. Лічу, што гэта — надзвычайны выпадак”.

***2 ліпеня*** жыхара Міёраў Віктара Шульгу затрымалі за распаўсюд улётак з партрэтамі зьніклых беларускіх палітыкаў. У пастарунку яго абшукалі, не паказаўшы дазволу на асабістыператрус, і запатрабавалі прадставіць рэгістрацыйныя дакументы раённай партыйнай суполкі. Міліцыянты пакінулі сабе копіі сьпісаў усіх сяброў АГП на Міёршчыне, а рэшту ўлётак з партрэтамі Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага канфіскавалі. Цяпер, на думку спадара Шульгі, прозьвішчы партыйцаў супрацоўнікі міліцыі перададуць у райвыканкам, і ня выключана, што неўзабаве сябры АГП будуць мець праблемы на працы, асабліва з улікам цяперашняе кантрактнае сістэмы. Што да самога Віктара Шульгі, то пратакол пра ягонае затрыманьне ўжо перададзены на разгляд раённае адміністратыўнае камісіі. Прычым міліцыянты папярэдзілі, што будуць настойваць, каб яго пакаралі грашовым штрафам.

***2 ліпеня*** ў Быхаве (Магілёўская вобласьць) міліцыянты затрымалі старшыню абласной арганізацыі АГП Уладзіміра Шанцава і сакратара Магілёўскага абкаму ПКБ Анатоля Заўялава. Прадстаўнікі палітычных партыяў, якія ўваходзяць у Народную кааліцыю “Пяцёрка-плюс”, прыехалі ў райцэнтр для сустрэчы з быхаўскім актывам. Аднак перад гэтым магілёўцы раздавалі кааліцыйныя ўлёткі мінакам на вуліцы, і ў гэты момант міліцыянты затрымалі іх. На Анатоля Заўялава, які меў пры сабе амаль паўтары тысячы асобнікаў улётак, складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні.

***2 ліпеня*** за распаўсюд друкаванай прадукцыі былі затрыманыя чатыры актывісты руху "Зубр" — Дар’я Малдаванава і Кацярына С. у Менску, а Алена Шпіронак і Юлія Аўгусьціновіч у Баранавічах.

***3 ліпеня*** за распаўсюд друкаванай прадукцыі была затрыманая актывістка "Зубра" Любоў Кучынская. Яна была дастаўленая ў Цэнтральны РУУС г. Менску. Там яе пратрымалі больш за дзьве гадзіны.

***3 ліпеня*** ў Наваполацку актывістамі кааліцыі “Пяцёрка-плюс” было зладжанае грамадзкае галасаваньне па пытаньні трэцяга прэзідэнцкага тэрміну. Падчас галасаваньня два актывісты былі затрыманыя міліцыяй. У пастарунак патрапілі

актывіст кааліцыі “Пяцёрка-плюс” Алесь Карніенка, які напярэдадні прыехаў у Наваполацак з Гомелю, і навапалачанін Аляксей Лукашэвіч. На абодвух былі складзеныя пратаколы адносна парушэньня артыкулу 167 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях.

***5 ліпеня*** Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджаньні тром апазіцыйным партыям – Партыі БНФ, АГП і БСДГ. Партыя БНФ атрымала папярэджаньне за заклікі прыняць удзел у акцыі “Ланцуг неабыякавых чытачоў” у абарону газеты “Народная воля”. У папярэджаньні за подпісам першага намесьніка міністра юстыцыі РБ А.С. Петраша, атрыманым Соймам Партыі БНФ, сказана (правапіс дакументу і дапушчаныя памылкі захоўваюцца): “На падставе прадстаўленай у Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь інфармацы устаноўлена, што Народная кааліцыя “5+”, куды уваходзіць і Партыя “Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада”, праз два нумары газеты “Народная воля” незаконна прызывала грамадзян Беларусі да ўдзелу у правядзеньні 10 чэрвеня 2004 г. у 18 гадзінаў на плошчы Кастрычніцкай рэвалюцыі несанкцыяніраванага пікета “Ланцуг неабыякавых чытачоў” у абарону газеты апублікаванага праз газеты “Народная воля”. У вызначаны час несанкцыяніраваны пікет адбыўся, у якім удзельнічала і партыя. Заявы ад арганізатараў на правядзеньне азначанага мерапрыемства ў Менскі гарвыканкам не паступала і адпаведнага рашэньня па дазволу не выносілася. Гэтымі дзеяньнямі парушаны патрабаванні арт. 8 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”, паколькі да атрыманьня дазвола на правядзеньне масавага мерапрыемства яго арганізатар (арганізатары), а таксама іншыя асобы не маюць права аб’яўляць у сродках масавай інфармацыі аб даце, месцы і часу яго правядзеньня, вырабляць і распаўсюджваць з гэтай мэтай лістоўкі, плакаты і іншыя матэрыялы. Пры такіх абставінах і кіруючыся артыкулумі 32, 33 і 34 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб палітычных партыях” Сойму Партыі БНФ выносіцца пісьмовае папярэджаньне”.

***5 ліпеня*** Мінюст ад Партыі БНФ запатрабаваў падаць дакументы на рэгістрацыю свайго сяброўства ў кааліцыі. Партыя БНФ атрымала ліст з Мінюсту за подпісам першага намесьніка міністра А.С. Петраша (на рускай мове), у якім сказана: “Зыходзячы з паведамленьняў СМІ і сеткі Інтэрнэт, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь створаная і дзейнічае Народная кааліцыя “5+”, куды ўваходзіць і Партыя БНФ. Згодна з тлумачальным слоўнікам рускай мовы С.І. Ожэгава і Н.Ю.Шведавай, кааліцыя – гэта аб’яднаньне, саюз (дзяржаваў, партыяў) дзеля дасягненьня агульнай мэты. Аналагічнае тлумачэньне даецца і ў іншых слоўніках. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь дазваляе ствараць саюзы (асацыяцыі) партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў і

іншых юрыдычных асобаў. Дзейнасьць незарэгістраваных саюзаў (асацыяцыяў) забароненая. Пры такіх абставінах Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь прапануе Сойму партыі прыняць адпаведнае рашэньне і юрыдычна аформіць (інстытуцыяналізаваць) дзейнасьць "Народнай кааліцыі "5+" – прадставіўшы дакументы пра яе рэгістрацыю ў рэгіструючы орган да 15.08.2004. Адначасова прапануем прыпыніць свой удзел у дзейнасьці незарэгістраванага фармаваньня да вырашэньня пытаньня аб ягонай рэгістрацыі ва ўсталяваным парадку. У адваротным выпадку Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь будзе разглядаць удзел партыі ў дзейнасьці вышэйзгаданага аб'яднаньня як грубае парушэньне заканадаўства аб палітычных партыях". Аналагічны ліст атрыманы і Аб'яднанай грамадзянскай партыяй.

***5 ліпеня*** галадаўшых дэпутатаў пазбавілі прэміі. Па распараджэньні старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзіма Папова былыя галадоўнікі, дэпутаты Валеры Фралоў, Сяргей Скрабец і Уладзімір Парфяновіч, у адрозьненьні ад іншых дэпутатаў, не атрымалі прэміяў. У адпаведным распараджэньні Папова гаворыцца, што "за неналежнае выкананьне дэпутацкіх абавязкаў, якое выявілася ў адсутнасьці без уважлівай прычыны на паседжаньнях пастаянных камісіяў Палаты, пазбавіць прэміі за чэрвень (35% ад службовага акладу, гэта прыкладна 200 тысячаў рублёў) Фралова, Скрабца і Парфяновіча". Падставай для гэтага рашэньня сталі службовыя запіскі старшыняў трох пастаянных камісіяў Лектарава, Кісялёва і Бікініна. Паводле Скрабца, гэтае рашэньне мае палітычныя падставы, бо некаторыя з дэпутатаў паўгоду ня ходзяць на сходы, нарады, а некаторых нават яны ня ведаюць у твар. Тым ня менш, іх прэміі не пазбавілі.

***5 ліпеня*** з офісу, які месьціцца ў нямецкім горадзе Эсьлінгене і які ўзначальвае ўдава вядомага беларускага палітыка Генадзя Карпенкі Людміла Карпенка, у Беларусь накіравана 70 пісьмовых папярэджаньняў аб крымінальнай адказнасьці за парушэньне заканадаўства аб выбарах. Атрымальнікі лістоў розныя — ад старшыні Цэнтрвыбаркаму да службовых асобаў выканкамаў рознага ўзроўню, якія адказныя за арганізацыю і правядзеньне выбарчых кампаніяў. Папярэджаньне за №1 пайшло на адрас старшыні Цэнтрвыбаркаму.

***6 ліпеня*** Партыя БНФ выказала сваю нязгоду з вынесеным Мінюстам папярэджаньнем. У Вярхоўны суд ужо падрыхтаваная скарга. Партыя БНФ аспрэчвае папярэджаньне па наступных падставах: 1. Партыя БНФ не арганізоўвала і не прымала ўдзелу ў несанкцыянаваным пікеце 10.06.2004 г. Адпаведнымі органамі партыі не прымаліся рашэньні аб падтрымцы мерапрыемства, якое адбылося 10.06.2004 г. у г. Менску. 2. З тэксту пісьмовага папярэджаньня ня бачна, якія

дзеяньні Партыі БНФ сталі падставай дзеля вынясеньня дадзенага папярэджаньня. На падставе вышэйзгаданага і кіруючыся ч.3 артыкулу 34 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб палітычных партыях”, Партыя БНФ просіць адмяніць папярэджаньне, а таксама ў працэсе падрыхтоўкі да судовага разгляду прадставіць інфармацыю, якая стала падставай дзеля вынясеньня папярэджаньня партыі.

***7 ліпеня*** Праваабарончы цэнтр “Вясна” зьвярнуўся да Прэзідэнта Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека (FIDH) сп. Сідзікі Каба з просьбай аказаць дапамогу і даць юрыдычную кансультацыю па пытаньні магчымасьці ўзбуджэньня працэдуры крымінальнага перасьледу службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, якія падазраюцца ў выкраданьнях і магчымых па-засудовых пакараньнях палітычных апанентаў рэжыму А.Лукашэнкі.

***7 ліпеня*** Камітэт па правах чалавека ААН, згодна з палажэньнямі Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, зарэгістраваў скаргу сяброў Грамадзкага аб’яднаньня “Праваабарончы цэнтр “Вясна” на рашэньне Вярхоўнага суда РБ аб ліквідацыі аб’яднаньня. Скарга зарэгістраваная за №1296/2004. У межах працэдуры Камітэт па правах чалавека ААН накіраваў запыт да прадстаўнікоў афіцыйных уладаў Рэспублікі Беларусь, у якім запатрабаваў прадставіць каментары і інфармацыю, датычную дадзенай справы. Беларускія ўлады павінны даць адказ Камітэту на працягу 6 месяцаў. Нагадаем, што Грамадзкае аб’яднаньне “Праваабарончы цэнтр “Вясна” было ліквідаванае па зыску Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь рашэньнем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 28 кастрычніка 2003 г.

***7 ліпеня*** а 8-й гадзіне раніцы трое невядомых напалі на дэпутата Вярхоўнага Савету 12 скліканьня, актывіста рабочага руху Сяргея Антончыка. Напад адбыўся на аўтамабільнай стаянцы, дзе звычайна спадар Антончык пакідае на ноч свой аўтамабіль. У Менскім гарадзкім аддзеле міліцыі капітан Аляксандр Дрозд выдаў Сяргею Антончыку квіток уведамленьня №1318, што сьведчыць пра тое, што міліцыя зафіксавала гэты выпадак. Сяргей Антончык зьвязвае напад на сябе з той працай, якую ён цяпер робіць і якая накіраваная на падрыхтоўку да выбараў — парламенцкіх і прэзідэнцкіх.

***7 ліпеня*** супрацоўнікі Праваабарончага цэнтру “Вясна” прэзентавалі вынікі Праграмы маніторынгу выкананьня права на справядлівае судовае разьбіральніцтва падчас разгляду справаў аб адміністратыўных правапарушэньнях. Падчас прэзентацыі каардынатар праграмы Юры Чавусаў паведаміў, што маніторынг ладзіўся ў 12 судах Менску, Берасьця, Віцебску, Наваполацку і Полацку. За гэты час было адсочана 533 адміністратыўныя справы. Значная частка іх разглядалася з

істотнымі парушэньнямі заканадаўства, пра якія казалася на прэзентацыі. Каардынатар праграмы маніторынгу па г.Менску Уладзімір Лабковіч сказаў, што ў парушэньне ўсіх нормаў адміністратыўнага заканадаўства Беларусі адміністратыўныя судзьдзі ўжо нават пачалі выязджаць па месцы пражываньня правапарушальніка і там разглядаць справы. Гэта, па ягоных словах, пазбаўляе правапарушальніка магчымасьці ня тое што прыцягваць да ўдзелу ў працэсе адваката, але і проста зьвяртацца да сьведак. Вельмі часта адміністратыўныя справы разглядаюцца ў адсутнасьці правапарушальніка, і суды завочна прызнаюць чалавека парушальнікам і прыцягваюць да адказнасьці. “Цяпер адміністратыўная адказнасьць замест таго, каб быць сродкам захаваньня правапарадку ў грамадзтве, зьяўляецца сродкам запалохваньня палітычных апанентаў існуючай улады і сродкам задавальненьня эканамічных інтарэсаў дзяржавы праз папаўненьне бюджэту за кошт адміністратыўных штрафаў”, — кажа каардынатар праграмы маніторынгу Юры Чавусаў. Па выніках маніторынгу выдадзеная брашура, якая зьмяшчае рэкамендацыі па паляпшэньні становішча з разглядам адміністратыўных справаў. Яна будзе адасланая ва ўсе суды Беларусі. Выдаўцы спадзяюцца, што вынікі маніторынгу дапамогуць судам больш пісьменна разглядаць адміністратыўныя справы, паспрыяюць выкананьню правоў чалавека падчас разгляду справаў гэтай катэгорыі. Таксама вынікі маніторынгу будуць прэзентаваныя і дэпутатам Палаты прадстаўнікоў 3 скліканьня. Праваабаронцы разьлічваюць, што іх прапановы будуць падтрыманыя падчас разгляду парламентам новага Адміністратыўнага кодэксу. У сувязі з гэтым прысутны на прэзентацыі намесьнік старшыні Партыі БНФ і мяркуемы кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” Алесь Міхалевіч заявіў, што ён і “дэпутаты, якія будуць абраныя ад кааліцыі, зробяць усё дзеля выкананьня рэкамендацыяў праваабаронцаў, датычных разгляду адміністратыўных справаў у нашай краіне”.

***9 ліпеня*** ў Праваабарончы цэнтр “Вясна” зьвярнулася жыхарка Гомелю Іна Рудзяк, якая паскардзілася на тое, што на працягу доўгага часу ніяк ня можа патрапіць на асабісты прыём да старшыні Гомельскага аблвыканкаму для вырашэньня пытаньняў, якія закранаюць яе законныя інтарэсы. Чыноўнікі выканкаму дасылалі ёй адпіскі, але ж да старшыні выканкаму так і не дапусьцілі. Як высьветлілася пры больш дакладным азнаямленьні з матэрыяламі перапіскі Іны Рудзяк з Гомельскім аблвыканкамам, праблема была значна сур’ёзней. Інструкцыя, зацьверджаная Гомельскім аблвыканкамам, утрымлівала нормы, якія абмяжоўваюць законныя правы грамадзянаў. Па дадзеным факце грамадзянцы Іне Рудзяк была аказаная дапамога па афармленьні звароту ў Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь. Сітуацыю каментуе юрыст Валянцін Стэфановіч: “Пытаньне

арганізацыі прыёму грамадзянаў у Гомельскім аблвыканкаме рэгулюецца Інструкцыяй, якая была зацьверджаная гэтым жа выканкамам 17 красавіка 2003 г. за № 267. У пункце 9 дадзенай Інструкцыі ўтрымліваецца патрабаваньне, каб грамадзяне запісваліся на асабісты прыём да старшыні аблвыканкаму толькі на падставе пісьмовага звароту, прычым патрабаваньні, зьмешчаныя ў гэтым звароце, павінны быць законныя і ня вырашыныя адпаведнымі службовымі асобамі. Гэта значыць, што грамадзяне ня могуць проста так запісацца на прыём да старшыні аблвыканкаму, яны павінныя напісаць заяву, у якой даказаць, што іх патрабаваньні маюць законны характар. Вельмі зручная сістэма каб адкідаць людзей, не займацца рэальным вырашэньнем іх пытаньняў, а спускаць ўсё па бюракратычнай лесьвіцы. Акрамя таго, па такім самым пытаньні ёсьць рашэньне Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 2004 г. Дадзенае рашэньне прызнала аналагічны пункт Палажэньня аб парадку прыёму грамадзянаў у Менскім гарвыканкаме не адпавядаючым Закону Рэспублікі Беларусь "Аб звароце грамадзянаў". З моманту прыняцьця гэтага рашэньня дадзены пункт Палажэньня Менгарвыканкаму перастаў дзейнічаць, а 7 траўня 2004 г. Менгарвыканкам сваім рашэньнем адмяніў яго і ўнёс адпаведныя зьмены ў сваё Палажэньне. Цяпер менчукам ня трэба пісьмова даказваць законнасьць сваіх патрабаваньняў, каб сустрэцца са старшынём Менгарвыканкаму. А вось жыхарам Гомельскай вобласьці і Гомелю трэба. Хаця, згодна з ч.2 арт.9 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб Канстытуцыйным судзе ў Рэспубліцы Беларусь", нормы, аналагічныя прызнаным неканстытуцыйнымі, таксама павінны спыняць сваю дзейнасьць. Гэта значыць, што Гомельскі аблвыканкам павінен вынесьці рашэньне і ўнесьці адпаведныя зьмены ў сваю Інструкцыю. Я цалкам дапускаю, што і ў іншых аблвыканкамах дзейнічаюць падобныя Інструкцыі, якія абмяжоўваюць законныя правы грамадзянаў."

***9 ліпеня*** Міністэрства юстыцыі Беларусі накіравала афіцыйны запыт у адрас аб'яднанага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці і аўтасельгасмашу з патрабаваньнем пацьвердзіць юрыдычную правамоцнасьць выхаду прафаб'яднаньня са складу Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У міністэрскім запыце таксама гаворыцца пра неабходнасьць афіцыйнага пацьверджаньня колькасьці сяброў аб'яднанага прафсаюзу, хоць ад часу ягонай рэгістрацыі мінула каля двух месяцаў. Сустаршыня прафсаюзу Генадзь Фядыніч мяркуе, што гэтае патрабаваньне мае на мэце ліквідацыю прафсаюзу.

***9 ліпеня*** галоўны рэдактар газеты "День" Мікола Маркевіч накіраваў скаргу ў Гарадзенскі абласны суд з просьбай скасаваць рашэньне Ленінскага раённага суда Гародні, які прызнаў законнымі дзеяньні адміністратыўнай камісіі. Нагадаем, што

камісія пакарала Маркевіча нібыта за распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак, а таксама ўзаконіла канфіскацыю газетнага накладу міліцыянтамі. 4800 асобнікаў газеты канфіскавалі ў красавіку на трасе Менск-Гародня супрацоўнікі Іўеўскага паста дарожнай міліцыі. Адміністратыўная камісія падтрымала складзены міліцыянтамі пратакол, нягледзячы на тое, што артыкул Адміністратыўнага кодэксу ў ім быў выкарыстаны неабгрунтавана. Маркевіча пакаралі за распаўсюд друкаваных выданьняў, а газета зьяўляецца сродкам масавай інфармацыі. Да таго ж, на момант затрыманьня накладу гэты нумар яшчэ не пасьпелі распаўсюдзіць. Мікола Маркевіч падаў таксама скаргі на рашэньні гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці, паводле якіх грамадзкае аб’яднаньне “Бацькаўшчына” і гарадзкую арганізацыю “Таварыства беларускай мовы” зьбіраюцца выселіць з памяшканьняў. Іх абвінавацілі ў парушэньні дамовы аб арэндзе, бо ў памяшканьнях нібыта працавала рэдакцыя газеты “День”. Кіраўніком гэтых арганізацыяў зьяўляецца Мікола Маркевіч. Скаргі накіраваныя ў касацыйную інстанцыю гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці.

***12 ліпеня*** ў Менску была затрыманая актывістка руху "Зубр" Наста Васіленка, якая распаўсюджвала ў метро газету "Освобождение". У адносінах да яе складзены пратакол па арт. 166 КаАП (непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі).

***12 ліпеня*** ў Вярхоўным судзе Рэспублікі Беларусь пачаўся разгляд зыску Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі Партыі працы. У судовым зыску Міністэрства юстыцыі гаворыцца, што Беларуская партыя працы несвоечасова зьмяніла свой юрыдычны адрас, неналежным чынам аформіла рэгістрацыю рэгіянальных структураў і дапусьціла іншыя “грубыя парушэньні заканадаўства”. Але 12 ліпеня ў Вярхоўным судзе да разгляду зыску справа не дайшла. Лідэр Партыі працы Аляксандр Бухвостаў заявіў два хадайніцтвы. Першае – аб недаверы судзьдзі Ганьне Сакалоўскай. (У 1999 годзе яна падтрымала рашэньне Мінюсту адмовіць у рэгістрацыі Асацыяцыі прафсаюзаў прамысловасьці, многія сябры якой зьяўляюцца актывістамі Партыі працы). Спадар Бухвостаў прапанаваў таксама перанесьці разгляд справы на больш позьні тэрмін, каб мець магчымасьць падрыхтавацца да працэсу. Першае хадайніцтва судзьдзя адхіліла, другое задаволіла і прызначыла наступнае паседжаньне на 30 ліпеня. Аляксандр Бухвостаў называе гэтую справу палітычнай і ініцыяванай напярэдадні выбараў кіраўніцтвам Федэрацыі прафсаюзаў ды Адміністрацыяй прэзідэнта. Занепакоенасьць спробай ліквідацыі Партыі працы выказала амбасада ЗША ў Беларусі.

***12 ліпеня*** да 15 жніўня працягнуты тэрмін утрыманьня пад вартай лідэра агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага, які знаходзіцца пад вартай з 18 траўня, калі прадпрымальніку было прад'яўленае абвінавачаньне ў парушэньні арт. 368 ч.2 Крымінальнага кодэксу – "публічная абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". Тэрмін ўтрыманья пад вартай працягнуты "у інтарэсах сьледзтва".

***12 ліпеня*** судом Першамайскага раёну г. Менску адмоўлена Партыі БНФ ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы па зыску да Белтэлерадыёкампаніі і журналіста Юрыя Пракопава за паклёпніцкія выказваньні ў адрас Партыі БНФ, якія прагучалі ў эфіры 25 красавіка 2004 году. Журналіст Ю. Пракопаў сьцьвярджаў, што як толькі Партыя БНФ прыйдзе да ўлады, адразу спыняцца праграмы дапамогі людзям, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У сваёй адмове суд спасылаецца на пастанову Пленуму Вярхоўнага суда, якая прадугледжвае дзелавую рэпутацыю як якасьць, якая замацаваная толькі за суб'ектамі гаспадаркі і толькі ў сувязі з ажыцьцяўлеўньнем гаспадарчай дзейнасьці з боку іншых суб'ектаў гаспадарчай дзейнасьці альбо грамадзянаў. Такім чынам, з пункту гледжаньня суда, Партыя БНФ як некамерцыйная юрыдычная асоба (як і любая партыя) наогул ня мае дзелавой рэпутацыі, што, безумоўна зьяўляецца незаконным, дыскрымінацыйным у адносінах да Грамадзянскага кодэксу, які прадугледжвае роўную правinduздольнасьць усіх юрыдычных асобаў. Рашэньне суда Першамайскага раёну будзе аспрэчвацца ў Калегіі па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда.

***12 ліпеня*** ў судзе Цэнтральнага раёну г. Менску адбыўся разгляд скаргі на ўтрыманьне пад вартай Міхаіла Марыніча. Судзьдзя Леанід Ясюкевіч скаргу не задаволіў, нягледзячы на довады адвакатаў, якія перакананыя, што Міхаіла Марыніча ўтрымліваюць у сьледчым ізалятары КДБ незаконна.

***12 ліпеня*** гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці задаволіў зыск грамадзкага аб'яднаньня “Воля да разьвіцьця”. Рашэньне падатковай інсьпекцыі па г.Слоніме аб спагнаньні з арганізацыі падаткаў у памеры 15 млн. рублёў за сродкі, атрыманыя ад Еўрапейскай камісіі ў межах праграмы тэхнічнай дапамогі TACIS, адмененае. Судзьдзя Алег Кадач абавязаў падатковую інсьпекцыю кампенсаваць судовыя выдаткі. Судзьдзя Алег Кадач далучыў рашэньне па аналагічнай справе грамадзкага абъяднаньня “Беларускі Хельсінкскі камітэт”. Тым ня менш, падатковыя органы выяўляюць намер падаць касацыйную скаргу на рашэньне гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці – пра гэта паведамілі прадстаўнікі слонімскай падатковай інсьпекцыі. Таксама стала вядома, што пададзеная ўжо касацыйная скарга на рашэньне па справе БХК. У сувязі з адменай рашэньня падатковай інсьпекцыі

крымінальная справа, узбуджаная супраць кіраўніка арганізацыі “Воля да разьвіцьця” Міхася Варанца, мусіць быць спыненая за адсутнасьцю складу злачынства.

***12 ліпеня*** ў Берасьці былі затрыманыя 4 юнакі: Павел Хівук, Павел Дземідзюк, непаўнагадовы Міхась Ільын і Алесь Вашчулка. Каля кінатэатру "Беларусь" яны распаўсюджвалі газеты "Зубр", "Освобождение" і кнігу "Беларусь: нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі". Акцыя працягвалася нядоўга: ужо праз 15 хвілінаў невядомы ў цывільным выклікаў міліцыю. Пакуль чакалі патрульную машыну хлопцы здолелі патэлефанаваць на "Вясну" і паведаміць аб сваім затрыманьні. У сваім рапарце адзін з міліцыянтаў, які праводзіў затрыманьне, напісаў: “Распространяли литературу политического характера”. Пасьля гэтага затрыманых адвезьлі ў Ленінскі РАУС г. Берасьця, дзе былі канфіскаваныя 150 газетаў "Зубр" і 10 брашураў, затым затрыманых адпусьцілі.

***13 ліпеня*** Ларысе Бухаленка, якая мае намер балатавацца на выбарах у Палату прадстаўнікоў, пазваніў начальнік аддзелу грамадзкай бясьпекі ГУУС г. Наваградку Кярлецкі А., які прапанаваў ёй прыйсьці ў ГУУС каб “паразмаўляць” наконт яе палітычнай актыўнасьці. Сп-ня Бухаленка адмовілася ісьці ў ГУУС па вусным тэлефанаваньні і сказала, што прыйдзе калі ёй дашлюць позву, у якой будзе ўказана, у якасьці каго і для чаго яе хочуць бачыць. 14 ліпеня на яе імя была дасланая позва, ў якой яе запрашалі ў ГУУС у якасьці сьведкі. Калі Лырыса Бухаленка зьявілася ў міліцыю, каб высьветліць, сьведкай чаго яна зьяўляецца, усё той жа Кярлецкі А. паказаў ёй улёткі з інфарамацыяй пра яе і праграмай Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” -- “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”. Міліцыянт пачаў задаваць Л.Бухаленцы пытаньні пра яе палітычную дзейнасьць, пра тое, дзе друкуюцца ўлёткі, як дастаўляюцца ў Наваградак. Сп. Кярлецкі запытаў у Л. Бухаленкі, хто да яе прыходзіць у госьці і “каго ён можа сустрэць, калі прыйдзе ў яе кватэру ўначы”, затым паведаміў, што сёньня ўвечары 6 супрацоўнікаў міліцыі прыдуць да яе, каб правесьці вобыск. Л. Бухаленка адмовілася адказваць на пытаньні міліцыянта і падпісваць якія-небудзь паперы. Затым з Л.Бухаленка пажадаў паразмаўляць начальнік ГУУС г.Наваградку Зьмітрэвіч. Падчас размовы ён выказаў пажаданьне, каб у парламент патрапілі законапаслухмяныя грамадзяне, а не такія, як Ларыса Бухаленка. Увыніку, Ларысе Бухаленцы зачыталі “папярэджаньне”, у якім было сказана, што ёй “забараняецца распаўсюджваць друкаваную прадукцыю ня ў час агітацыйнага перыяду”. Ларыса Бухаленка напісала скаргу на дзеяньні супрацоўнкаў міліцыі ў наваградзкую пракуратуру і схадзіла на прыём да наваградзкага пракурора.

***13 ліпеня*** Людміла Гразнова атрымала з пашпартнага стала Партызанскага раёну дакумент наступнага зьместу: “На падставе арт. 5 Закону Рэспублікі Беларусь ад 02.06.1992 году “Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзянаў Рэспублікі Беларусь” выезд за мяжу Вам часова абмежаваны. Дадзеныя абмежаваньні дзейнічаюць да прыпыненьня абставінаў, якія перашкаджаюць выезду”. “Абставіны”, якія не даюць магчымасьці Людміле Гразновай выязджаць за мяжу, зьвязаныя з яе палітычнай дзейнасьцю – у красавіку Людміла Гразнова зьяўлялася адным з арганізатараў “Чарнобыльскага шляху”, яе абвінавацілі ў парушэньні артыкулу 167-1 ч.2 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў), і судзьдзя суда Савецкага раёну Руслан Казадаеў аштрафаваў яе на 225 базавых велічыняў (больш за 2000 даляраў). Людміла Гразнова абскарджвала гэтае рашэньне, але Менскі гарадзкі суд не задаволіў яе скаргу.

***13 ліпеня*** старшыня гарадзкой арганізацыі Свабоднага прафсаюзу прадпрымальнікаў Тацяна Марчанка атрымала ў Цэнтральным судзе Гомелю пастанову судзьдзі Яраслава Парэмскага пра адміністратыўнае пакараньне – штраф памерам 1 мільён 900 тысячаў рублёў. Штраф вынесены за несанкцыянаваны сход падчас чэрвеньскага страйку ў падтрымку дэпутатаў-галадоўнікаў. У той жа дзень судзьдзя Парэмскі абвясьціў рашэньне ў дачыненьні прадпрымальніка Уладзіміра Няпомняшчых. Як і Тацяна Марчанка, спадар Няпомняшчых аштрафаваны на 1 мільён 900 тысячаў рублёў. Ён таксама прызнаны вінаватым у правядзеньні несанкцыянаванага сходу на Цэнтральным рынку падчас чэрвеньскага страйку ў падтрымку дэпутатаў-галадоўнікаў. Тацяну Марчанку і Уладзіміра Няпомняшчых міліцыя абвінаваціла не ў арганізацыі страйку, а ў правядзеньні на рынку 17 чэрвеня несанкцыянаванага сходу.

***14 ліпеня*** міністр юстыцыі Віктар Галаванаў паведаміў, што калі кааліцыя “Пяцёрка-плюс” тэрмінова не зарэгіструецца як грамадзкае аб’яднаньне, будуць зробленыя захады пакараньня як да парушальнікаў заканадаўства. В. Галаванаў выказаў упэўненасьць, што ніякіх перашкодаў для рэгістрацыі няма, і сказаў, што да сярэдзіны жніўня пытаньне з рэгістрацыяй мусіць быць вырашана. Калі партыі гэтага ня выканаюць, то іх паводзіны, па словах міністра юстыцыі, будуць расцэньвацца як парушэньне дзеючага заканадаўства.

***14 ліпеня*** да дэпутата Мастоўскага раённага Савету дэпутатаў, сябра партыі ПКБ, прыйшоў участковы міліцыі, які паведаміў, што яму дадзенае ўказаньне скласьці на Аляксандра Будаўкіна пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па ч.3 арт. 172 КаАП Рэспублікі Беларусь (распаўсюд друкаванай прадукцыі без

выходных дадзеных). Згодна са складзеным пратаколам, А. Будаўкіна абвінавачваюць у тым, што ён распаўсюджваў друкаваныя матэрыялы без выходных дадзеных з праграмай Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. Акрамя таго, на імя Аляксандра Будаўкіна прыйшла позва з Мастоўскай пракуратуры, у якой паведамляецца пра тое, што ён выклікаецца да пракурора раёну. Аляксандр Будаўкін лічыць, што ціск з боку праваахоўных органаў і органаў пракуратуры зьвязаны з ягонымі намерамі балатавацца ў якасьці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

***14 ліпеня*** ў Жыровічах (Слонімскі раён) участковы затрымаў кіраўніка грамадзкага аб’яднаньня “Ветразь” Алеся Масюка з сябрам, якія раздавалі ўлёткі кааліцыі “Пяцёрка-плюс”. Хлопцаў дапытаў супрацоўнік КДБ, які адмовіўся прадставіцца.

***14 ліпеня*** індуісцкая суполка крышнаітаў накіравала ліст на імя старшыні КДБ Леаніда Ерына: вернікі просяць спыніць кампанію, распачатую супраць іх у дзяржаўным друку і ў Міністэрстве адукацыі. На думку сяброў суполкі, апошнім часам абразьлівыя эпітэты на адрас індуісцкіх рэлігійных меншасьцяў зьявіліся невыпадкова. Гэтым разам крышнаіты занепакоеныя зьместам публікацыяў у дзяржаўным друку і ў падручніках для сярэдняй школы, дзе іх называюць небясьпечнай таталітарнай сектай.

***16 ліпеня*** кіраўнік Жодзінскай арганізацыі Партыі БНФ Аляксей Лапіцкі па тэлефоне быў выкліканы ў міліцыю для дачы тлумачэньняў па факту зьяўленьня ўлётак Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” у г.Жодзіне. Супрацоўнікі міліцыі распытваліся, адкуль зьявіліся ўлёткі, ці мае ён да іх якое-небудзь дачыненьне.

***19 ліпеня*** міжнароднага каардынатара Грамадзянскай ініцыятывы "Хартыя’97" Андрэя Саньнікава выклікалі ў пракуратуру Беларусі. Прычынаю стала публікацыя артыкулу "Тэрарыстычныя стасункі Беларусі" ў чэрвеньскім нумары амерыканскай газеты "Washington Post". Старэйшы памочнік пракурора Сяргей Новікаў прапанаваў Андрэю Саньнікаву даць тлумачэньні наконт высноваў, зробленых у газетнай публікацыі. Андрэй Саньнікаў і Марк Лэнзі ў аналітычным артыкуле "Тэрарыстычныя стасункі Беларусі" – ён выйшаў яшчэ 12 чэрвеня – абвінавацілі Аляксандра Лукашэнку ў падтрымцы сувязяў з тэрарыстычнымі дзяржавамі. Андрэй Саньнікаў патлумачыў, што скарыстаўся матэрыяламі, раней надрукаванымі ў розных беларускіх і замежных выданьнях.

***19 ліпеня*** ў Наваполацку сябры арганізацыі Свабоднага прафсаюзу зладзілі пікет супраць гвалтоўнай кантрактызацыі, а таксама супраць звальненьня з працы

прафсаюзнах актывістаў. Пікет быў дазволены ўладамі і ладзіўся каля гарадзкога Палацу культуры ў звычайным фармаце: са сьцягамі Свабоднага прафсаюзу, з плакатамі, раздавалі мінакам ліпеньскі нумар прафсаюзнага бюлетэню “Рэгіён” ды іншую дэмакратычную прэсу.

***19 ліпеня*** Менскі гарадзкі суд адхіліў касацыйную скаргу старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Процькі на ранейшае рашэньне Першамайскага раённага суда. Гаворка ідзе пра рашэньне не задаволіць зыск Тацяны Процькі да Белдзяржтэлерадыёкампаніі і журналіста Юрыя Пракопава. Нагадаем, у лістападзе 2003 году ў праграме спадара Пракопава “Взгляд в мир” сьцвярджалася, нібыта зьніклі 900 тысячаў даляраў, якія Беларускі Хельсінкскі камітэт атрымаў у якасьці замежнай дапамогі. Пацьвердзіць тыя зьвесткі на тэлебачаньні ня здолелі, між тым, суд не прызнаў, што гэтак была нанесеная зьнявага Тацяне Процьцы. Аналагічнае рашэньне прыняў і Менскі гарадзкі суд.

***20 ліпеня*** стала вядома, што з мемарыяльнага каменя ў Курапатах зьнікла шыльда з нагадваньнем пра будучы помнік ахвярам палітычных рэпрэсіяў. Міліцыя Менскага раёну завяла крымінальную справу па факце зьнікненьня шыльды. Надпіс на той сьціплай таблічцы паведамляў, што, паводле Пастановы ўраду ад 1989 году, у Курапатах мусіць зьявіцца помнік ахвярам рэпрэсіяў 30-40 гадоў мінулага стагодзьдзя. Нават міліцыянты выказваюць сумнеў у матэрыяльных матывах злодзеяў, паколькі каштоўнасьці мемарыяльная дошка не ўяўляла.

***20 ліпеня*** ў Берасьцейскае абласное аддзяленьне Праваабарончага цэнтру “Вясна” зьвярнулася вядомая на Берасьцейшчыне апазіцыйная дзяячка Паліна Панасюк – органы ўнутраніх справаў адмовілі ёй у выдачы дазволу на выезд за мяжу (пячаткі ў пашпарт “ва ўсе краіны сьвету”). Падставай да адмовы паслужыў аргумент, што гр. Панасюк не сплаціла грашовае пакараньне ў памеры 1.500.000 рублёў за ўдзел у “Ланцугу неабыякавых людзей” яшчэ ў 2002 годзе. Аднак прысуд, вынесены завочна судзьдзёй суда Ленінскага раёну г. Берасьця Міранюком А.С., адменены Берасьцейкім абласным судом “за адсутнасьцю складу правапарушэньня”.

***21 ліпеня*** да справы пра публічную абразу прэзідэнта Лукашэнкі, якую вядзе Ленінская раённая пракуратура Гародні, дадалася новая крымінальная справа, распачатая адразу адносна чатырох асобаў – Валерыя Леванеўскага і Аляксандра Васільева, якіх спачатку абвінавачвалі толькі ў публічнай абразе прэзідэнта, жонкі сп. Васільева Наталі Васільевай і 18-гадовага сына сп. Леванеўскага – Уладзіміра Леванеўскага. Усіх чатырох абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу 1 траўня і грубых парушэньнях грамадзкага парадку. Крымінальная справа

распачатая паводле артыкулу 342 Крымінальнага кодэксу. Прадугледжанае пакараньне – да трох гадоў зьняволеньня. У пастанове старэйшага сьледчага пракуратуры Альфрэда Танкевіча гаворыцца, што сп-ры Леванеўскі і Васільеў вырабілі і распаўсюдзілі мноства ўлётак з заклікам прыйсьці 1 траўня на мітынг. Далей азначана, што на пляцы Леніна адбыўся несанкцыянаваны мітынг, у якім актыўна ўдзельнічалі жонка Васільева Наталя і сын Леванеўскага Уладзімір. Сп. Васільеў лічыць: новая крымінальная справа распачатая таму, што вылучанае да іх з Леванеўскім абвінавачаньне ў абразе прэзідэнта – беспадстаўнае. Дагэтуль абвінавачаным не паведамлена, як дакладна, якімі словамі быў абражаны прэзідэнт Лукашэнка. Трэба нагадаць, што Гародня стала адзіным горадам Беларусі, дзе 1 траўня адбыўся мітынг з палітычнымі патрабаваньнямі: удзельнікі настойліва запатрабавалі адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі. 21 ліпеня Ленінскі раённы суд Гародні разгледзеў скаргу Валерыя Леванеўскага і ягонага адваката адносна меры стрыманьня. Сп. Леванеўскаму падоўжылі знаходжаньне пад вартай у сьледчым ізалятары да 15 жніўня. Суд пакінуў меру стрыманьня бяз зьменаў.

***21 ліпеня*** Сойм Партыі БНФ абскардзіў адмову ва ўзбуджэньні справы аб абароне дзелавой рэпутацыі да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь і журналіста Юрыя Пракопава. Нагадаем, што 8 ліпеня 2004 году судзьдзя Першамайскага р-ну г. Менску Н.Петух разгледзела зыскавую заяву Сойму Партыі БНФ да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь і Юрыя Пракопава аб абароне дзелавой рэпутацыі і адмовіла ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы па зыску ў сувязі з яго непадведамаснасьцю суду. У скарзе, накіраванай у судовую калегію па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда, патрабуецца адмяніць вызначэньне суда Першамайскага раёну г. Менску ад 8 ліпеня 2004 г. аб адмове ва ўзбуджэньні справы і перадаць пытаньне на новы разгляд у суд першай інстанцыі.

***21 ліпеня*** споўнілася 10 гадоў з дня прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі. Паводле Канстытуцыі 1994 году, па якой абіраўся першы прэзідэнт Беларусі, ён мог кіраваць краінай два тэрміны па 5 гадоў. Аднак пасьля ганебнага рэферэндуму 1996 году А.Лукашэнка перапісаў Канстытуцыю і падоўжыў свой "легітымны" тэрмін на два гады. Той рэферэндум не прызналі законным нідзе ў сьвеце (апроч Расіі, тагачаснае кіраўніцтва якой і дапамагло Лукашэнку захаваць уладу). І таму 21 ліпеня 2004 году беларускія дэмакратычныя сілы вырашылі нагадаць Лукашэнку, што час ягонага панаваньня скончыўся. Менскія гарадзкія ўлады дазволілі правядзеньне мітынгу на плошчы Бангалор. Аднак каля 18 гадзінаў вечару людзі пачалі зьбірацца на плошчы Якуба Коласа, каб потым прайсьці па горадзе шэсьцем да плошчы

Бангалор, дзе павінны былі адбыцца асноўныя мерапрыемствы і канцэрт вядомых беларускіх рок-гуртоў, а ўвогуле – каб падвесьці вынікі дзесяцігадовага кіраваньня краінай А.Лукашэнкі і выказаць сваю нязгоду з ягонай палітыкай і намерам зьмяніць Канстытуцыю і застацца прэзідэнтам на трэці тэрмін. Акцыя мела назоў "Твой адказ сістэме". Пасьля 18 гадзінаў шматлікія амапаўцы і супрацоўнікі міліцыі пачалі выцясьняць удзельнікаў акцыі з плошчы Якуба Коласа. Праход на плошчу быў зачынены. Непадалёку ад плошчы была зробленая спроба арыштаваць дэпутата, лідэра групы "Рэспубліка" ў парламенце, аднаго з арганізатараў акцыі Сяргея Скрабца. Аднак па камандзе "зьверху" дэпутата адпусьцілі. У 18.15 вялікая колькасьць амапаўцаў блакавала групу моладзі прыблізна з 50 чалавек. Пасьля кароткай сутычкі ўдзельнікі акцыі былі арыштаваныя і пасаджаныя ў аўтобус. Пры гэтым падлеткаў зьбівалі, кідалі на асфальт і білі нагамі. Актыўны ўдзел у арыштах бралі "людзі ў цывільным". Усё гэта рабілася на вачах у журналістаў. Арышты працягваліся і пасьля гэтага, а потым аўтобус адышоў у бок Савецкага РУУС. Нягледзячы на масавыя арышты, група моладзі здолела разгарнуць некалькі транспарантаў з надпісамі: "Беларусь – апошняя дыктатарская матрыца Еўропы", "Час вызваліць розум" і інш. На іх накінуліся амапаўцы, зноў было арыштавана некалькі чалавек. У 18.40 дзьве групы моладзі па некалькі сотняў чалавек кожная пачалі рух да плошчы Бангалор. Калоны ішлі бяз лозунгаў і сьцягоў, але моладзь увесь час скандавала лозунгі. Шмат маладых людзей былі апранутыя ў майкі: у белыя з партрэтам палітзьняволенага Міхаіла Марыніча з надпісам "Беларусь будзе вольнай!" і чорныя, на якіх на фоне знакамітага дажджу з лічбаў з фільму "Матрыца" быў лагатып "Зубра" і надпіс "Запрашаем у рэальны сьвет". Міліцыянты і "людзі ў цывільным" працягвалі выхопліваць дэманстрантаў з шэрагаў і арыштоўваць. Каля ўнівермагу "Рыга" на вуліцы Сурганава калоны аб’ядналіся, стала відавочна, што ў шэсьці ўдзельнічае каля двух тысячаў чалавек. Сярод дэманстрантаў ішлі дэпутаты з групы "Рэспубліка". У 19.15 калона дайшла да плошчы Бангалор, дзе сабралася ў гэты вечар ня менш за пяць тысячаў чалавек. Удзельнікі мітынгу трымалі лозунгі: "Улады большасьці краінаў лічаць яго небясьпечным злачынцам", "Час вызваліць розум!", "Ты можаш усё жыцьцё пражыць пры дыктатуры, калі будзеш слабым і пасіўным", "Свабоду Марынічу", "Вызваліць Леванеўскага", сьцягі дэмпартыяў, рухаў і Еўрасаюзу. Мітынг-канцэрт вёў вядомы музыкант Аляксандр Памідораў. Перад удзельнікамі акцыі выступіў дэпутат з групы “Рэспубліка” Уладзімір Парфяновіч, які сказаў, што за 10 гадоў Аляксандр Лукашэнка завёў краіну ў дрыгву. "Але мы будзем змагацца за сваю краіну", — сказаў Парфяновіч. Усяго ў гэты вечар было арыштавана ад 50 да 60 чалавек. Многія з іх зьбітыя, і ім патрэбная медыцынская дапамога.

Сярод затрыманых:

1. Павел Хівук – сябра Праваабарончага цэнтру "Вясна" з Берасьці (зацягнуты ў машыну 0739 МА);
2. Зьміцер Бандарэнка – каардынатар Грамадзянскай ініцыятывы "Хартыя-97";
3. Дзяніс Быстрык;
4. Павел Дземідзюк (Берасьце, зьбіты ў аўтобусе);
5. Фёдар Паўлючэнка;
6. Аляксей Ляўковіч;
7. Яўген Афнагель;
8. Павел Юхневіч;
9. Люба Кучынская;
10. Сяргей Сарагавец;
11. Настася Азарка;
12. Алесь Васілеўскі;
13. Андрэй Асмалоўскі (Маладэчна);
14. Ігар Кліўко;
15. Дзьмітры Вайтко;
16. Сяргей Летка;
17. Павел Мікуловіч;
18. Руслан Харкевіч;
19. Артур Фінькевіч
20. Максім Вінарскі;
21. Анатоль Бельскі (Барысаў);
22. Ігар Жэзаўцаў;
23. Павел Беланоўскі;
24. Алег Корбан;
25. Алесь Моніч;
26. Аляксандр Беланоўскі;
27. Аляксандр Козік;
28. Зьміцер Моніч;
29. Мікалай Шаплыга;
30. Яўген Палішчук;
31. Іван Шутко;
32. Аляксей Малчанаў;
33. Каця Сьмірнова;
34. Кірыл Рабыкін;

35. Марк Шубараў;
36. Глеб Маліноўскі;
37. Арцём Скарабагаты;
38. Максім Козел (Наваградак);
39. Яраслаў Еўдачкоў;
40. Міхаіл Кандрашоў;
41. Максім Громаў;
42. Аляксей Васьковіч;
43. Юля Гарачка;
44. Зьміцер Дашкевіч;
45. Барыс Гарэцкі;
46. Віктар Янцурэвіч;
47. Валеры Мазынскі;
48. Уладзімір Кішкурна;
49. Антон Кішкурна.

***21 ліпеня*** ў 20.20 на санкцыянаваным мітынгу на плошчы Бангалор затрыманая машына Уладзіміра Кішкурны. Супрацоўнікі міліцыі адканваявалі машыну са сьцягамі, плакатамі і кіроўцам Уладзімірам Кішкурнам да РУУС Савецкага раёну. У 21.15 у Менску супрацоўнікі міліцыі затрымалі машыну дэпутата Менскага райсавету Юрася Зянковіча, які вяртаўся з акцыі пратэсту. Пасьля заканчэньня акцыі каля 40 чалавек накіраваліся да РУУС Савецкага раёну. Па дарозе яны былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі і вывезеныя ў лес за 20 кіламетраў ад Менску ў накірунку г. Барысаву. Затрыманых пакінулі ў лесе. Па дарозе супрацоўнікі міліцыі зьдзекваліся з затрыманых і білі іх. Позна ўвечары стала вядома, што суды над затрыманымі ўдзельнікамі акцыі 21 ліпеня ў Менску адбудуцца 22 ліпеня ў судзе Савецкага раёну. Шматлікія затрыманыя правялі ноч ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на вуліцы Акрэсьціна.

***21 ліпеня*** пратэсты супраць аўтарытарнага кіраваньня краінай А.Лукашэнкам прайшлі па ўсёй Беларусі.

У Гомелі акцыя пратэсту прайшла без затрыманьняў. Акцыя мела жартоўны характар. У 18.00 да Цэнтральнага ўнівермагу г.Гомелю выйшла моладзь, трымаючы ў руках партрэты А. Лукашэнкі і быццам бы “выказваючы вялікую любоў да прэзідэнта”. Але пры гэтым выявы прэзідэнта былі апушчаныя ніжэй поясу. Начальнік міліцыі Цэнтральнага раёну Стрыжнёў пагражаў пачаць затрыманьні, але пасьля перадумаў, бо стаяць з партрэтамі А.Лукашэнкі ў публічным месцы не забаронена.

У Віцебску прайшоў пікет, прымеркаваны да 10-х угодкаў кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі. Людзі выйшлі на цэнтральную вуліцу гораду з партрэтамі зьніклых Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага ды Дзьмітрыя Завадзкага. Мэта акцыі – нагадаць землякам, што зьнікненьне іх суграмадзянаў таксама зьяўляецца паказьнікам тае палітыкі, якую праводзіць у Беларусі А.Лукашэнка. Падчас акцыі разам з удзельнікамі пікету міліцыянты затрымалі карэспандэнтку Радыё Свабода Браніславу Станкевіч. Журналістка паказала службовае пасьведчаньне, а таксама пасьведчаньне “Беларускай асацыяцыі журналістаў”, але яе разам з пікетоўцамі пасадзілі ў міліцэйскі аўтамабіль і адвезьлі ў Чыгуначны райаддзел міліцыі. Пры затрыманьні міліцыянты сябе не называлі. З Чыгуначнага райаддзелу міліцыі Браніславу Станкевіч адпусьцілі пасьля праверкі дакументаў. На трох удзельнікаў пікету — Улада Токарава, Людмілу Церашонак, Розу Пушкарову складзеныя пратаколы аб адміністратыўных правапарушэньнях.

***21 ліпеня*** актывісту руху “Зубр” Міхаілу Аўдзееву, які трапіў у бальніцу пасьля зьбіцьця на акцыі, зробленая аперацыя. 17-гадовы актывіст “Зубра” быў шпіталізаваны ў першае траўматалагічнае аддзяленьне бальніцы хуткай дапамогі з падазрэньнем на разрыў селязёнкі. У той жа дзень яму была зробленая аперацыя. Падазрэньні на разрыў не пацьвердзіліся, але была выяўленая і выдаленая буйная гематома ў раёне селязёнкі, якая зьявілася ў выніку ўдару.

***21 ліпеня*** беларускі ўрад паведаміў кіраўніцтву Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, што ён скасоўвае дамовы на арэнду памяшканьняў ЕГУ, дзе рэалізуецца большасьць ягоных акадэмічных праграмаў. Гэты крок накіраваны на тое, каб дамагчыся адстаўкі рэктара Анатоля Міхайлава, прымусіць ЕГУ спыніць сваю дзейнасьць і ўвогуле паставіць пад пагрозу будучыню ўнівэрсітэту, яго студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама іх унёсак у інтэлектуальнае жыцьцё і акадэмічныя свабоды ў Беларусі.

***22 ліпеня*** судзьдзі Савецкага раёну г. Менску, якія разглядалі адміністратыўныя правапарушэньні, працавалі ў рэжыме канвееру. Да судоў над ўдзельнікамі акцыі 21 ліпеня падключыліся судзьдзі, якія сьпецыялізаваліся па крымінальных і грамадзянскіх справах. Так, аднаго з моладзевых актывістаў “Зубра” Паўла Юхневіча судзіў судзьдзя Аляксандр Абдулін, які займаўся перад гэтым крымінальнымі і грамадзянскімі справамі.

Вынікі судоў:

***Зьміцер Бандарэнка***, адзін з лідэраў “Хартыі-97”, асуджаны судзьдзём Казадаевым Русланам на 15 сутак зьняволеньня;

***Корбан Алег*** асуджаны судзьдзёй Скугаравай Наталяй на 10 сутак зьняволеньня;

***Вайтко Дзьмітры*** асуджаны судзьдзём Сякліцкім Сяргеем на штраф у дзесяць базавых адзінак (каля 90 даляраў);

***Бельскі Анатоль*** асуджаны судзьдзёй Скугаравай Наталяй на 3 сутак зьняволеньня;

***Беланоўскі Аляксандр*** асуджаны судзьдзёй Лазавіковай Інэсай на штраф у 20 базавых велічыняў (каля 180 даляраў);

***Беланоўскі Павел*** асуджаны судьдзёй Лазавіковай Інэсай на штраф у 40 базавых велічыняў (каля 360 даляраў);

***Юхневіч Павел*** асуджаны на 10 сутак зьняволеньня;

***Моніч Алесь*** асуджаны судзьдзьём Р. Казадаевым на 3 сутак зьняволеньня;

***Ляўковіч Аляксей*** асуджаны судзьдзёс С. Сякліцкім на штраф у 50 базавых велічыняў (каля 450 даляраў);

***Азарка Настася*** асуджаная на 5 сутак зьняволеньня;

***Кучынская Любоў*** асуджаная на штраф 20 базавых велічыняў, судзьдзя Н. Скугарава;

***Сянкевіч Артур*** асуджаны на 10 сутак арышту, судзьдзя Р.Казадаеў;

***Лятко Сяргей*** асуджаны на штраф у 20 базавых велічыняў, судзьдзя Абдулін;

***Кліўко Ігар*** асуджаны на 3 сутак зьняволеньня, судзьдзя Р.Казадаеў;

***Афнагель Яўген*** асуджаны на 10 сутак зьняволеньня, судзьдзя Н.Скугарава;

***Мікуловіч Павел*** асуджаны на штраф у 20 базавых велічыняў, судзьдзя Р. Казадаеў;

***Незаўцаў Ігар*** асуджаны на 5 сутак зьняволеньня, судзьдзя Н. Скугарава;

***Паўлючэнка Фёдар*** папярэджаны судзьдзём Р. Казадаевым;

***Козік Аляксандр*** асуджаны на 3 сутак зьняволеньня;

***Сарагавец Сяргей*** асуджаны на штраф у 30 базавых велічыняў;

***Дзем’янюк Павел*** атрымаў папярэджаньне ад судзьдзі Н.Скугаравай;

***Васілеўскі Алесь*** асуджаны на 5 сутак зьняволеньня, судзьдзя Р.Казадаеў;

***Быстрык Дзяніс*** асуджаны на 3 сутак арышту, судзьдзя Крайчык;

***Асмалоўскі Андрэй*** асуджаны на штраф у 30 базавых велічыняў, судзьдзя Н.Скугарава;

***Хівук Павел*** асуджаны на 3 сутак арышту, судзьдзя С.Баразна;

***Максім Вінарскі*** асуджаны на 10 сутак, судзьдзя Н.Скугарава.

***22 ліпеня*** Праваабарончы цэнтр "Вясна" выказаў меркаваньне, што судовыя пакараньні ў адносінах да ўдзельнікаў акцыі пратэсту 21 ліпеня неапраўдана жорсткія. Старшыня Праваабарончага цэнтру "Вясна" Алесь Бяляцкі назваў фактам неапраўданага дзікунства пакараньне адной з удзельнікаў акцыі Настасі Азаркі. Тым больш, што рашэньне пра арышт на 5 сутак у адносінах да дзяўчыны вынесла судзьдзя-жанчына – Алена Крайчык. "У прыёмніку-разьмеркавальніку няма ніякіх умоваў дзеля ўтрыманьня жанчын, – кажа Алесь Бяляцкі. — Апроч судовага пакараньня дадаюцца яшчэ пакуты бытавога зьместу, якія прыніжаюць асобу. Я думаю, што судзьдзя ніколі б не прымала такога рашэньня, калі б хоць на нейкі час сама апынулася на месцы пакараных. Урэшце, увесь судзейскі склад сёньняшняга "судзілішча" бярэ на сябе занадта вялікую адказнасьць, бо гісторыя нашай краіны не канчаецца толькі панаваньнем Лукашэнкі. І калі-небудзь учарашнія падзеі і сёньняшнія суды атрымаюць зусім іншую прававую ацэнку", -- лічыць праваабаронца.

***22 ліпеня*** расійскі МЗС выступіў з заявай з нагоды намеру беларускіх уладаў зачыніць карпункт тэлеканалу “Россия” ў Менску. Па словах афіцыйнага прадстаўніка міністэрства Аляксандра Якавенкі, гэта магло б негатыўна адбіцца на магчымасьці расіянаў атрымліваць інфармацыю з нашай краіны. У МЗС лічаць, што асьвятленьне тых ці іншых падзеяў у Беларусі карэспандэнтамі тэлеканалу РТР ня могуць быць падставай дзеля падобных крокаў. Аб закрыцьці менскага карпункту тэлеканалу “Россия” напярэданьні ўвечары паведаміла БТ са спасылкай на Міністэрства замежных справаў Беларусі. Рашэньне прынятае ў сувязі з тым, што расійскія журналісты нібыта даюць скажоную інфармацыю пра тое, што адбываецца ў Беларусі. Размова ішла пра рэпартаж, які прайшоў у прамым эфіры праграмы "Вести" 21 ліпеня. Карэспандэнт Дзьмітрый Пятроў, распавядаючы пра акцыю пратэсту беларускай апазіцыі, паведаміў, што ў мерапрыемстве ўдзельнічаюць некалькі тысячаў чалавек. Беларускія ж улады налічылі меней – толькі 193 чалавекі.

***22 ліпеня*** кіраўніка беларускіх праграмаў “Фундацыі імя Стэфана Баторыя” (Польшча) Агнешку Камароўску, якая прыбыла ў рабочую камандзіроўку ў Менск, не пусьцілі на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікі пашпартна-візавай службы аэрапорту “Менск-2” паведамілі А.Камароўскай, што ў Беларусі яна непажаданая асоба, і папрасілі пакінуць краіну. Яны настойвалі на тым, каб спн. Камароўска за свой кошт набыла квіток да Вены і адтуль дабіралася да Варшавы. Агнешка Камароўска правяла ноч з 22 на 23 ліпеня ў аэрапорце “Менск-2”.

***22 ліпеня*** калегія Менскага гарадзкога гаспадарчага суда пачала разгляд касацыйнай скаргі падаткавікоў на прысуд па справе Беларускага Хельсінкскага камітэту. Нагадаем: два тыдні таму гарадзкі гаспадарчы суд прызнаў беспадстаўнымі прэтэнзіі да БХК, паводле якіх праваабаронцы мусілі заплаціць амаль 80 тысячаў даляраў падаткаў з грашовай дапамогі ў межах праграм TACIS. Аднак падоткавая інсьпекцыя Маскоўскага раёну Менску з гэтым рашэньнем не пагадзілася. Судзьдзі зноў запатрабавалі ад ураду дакументы аб парадку выдаткаваньня грантаў TACIS.

***23 ліпеня*** праваабарончая арганізацыя "Міжнародная Амністыя" усім арыштаваным за ўдзел у акцыі, прысьвечанай дзесяцігодзьдзю прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі, надала статус вязьняў сумленьня.

***23 ліпеня*** Міністэрства адукацыі запатрабавала ад кіраўніцтва Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту неадкладнай адстаўкі рэктара, прафесара Анатоля Міхайлава. Напачатку міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў прапанаваў кіраўніцтву ўніверсітэту правесьці перамовы пра гарантыі існаваньня ВНУ ў выпадку адстаўкі Анатоля Міхайлава. Аднак раптоўна ён спыніў перамовы і запатрабаваў адстаўкі рэктара ва ўльтыматыўнай форме, пагражаючы вялікімі непрыемнасьцямі. Паводле кіраўніцтва ЕГУ, Анатоль Міхайлаў, які знаходзіцца на стажыроўцы за межамі краіны, папрасіў выкладчыцкі калектыў выказаць сваё стаўленьне да гэтай сітуацыі, і па-ранейшаму атрымаў падтрымку. Нагадаем: упершыню міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў запатрабаваў ад акадэміка Анатоля Міхайлава – заснавальніка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту – вызваліць пасаду рэктара на пачатку студзеня. Калектыў універсітэту тады заявіў, што гвалтоўная адстаўка спадара Міхайлава паставіць пад пытаньне само існаваньне ВНУ і негатыўна паўплывае на імідж Беларусі ў сьвеце. На падтрымку Анатоля Міхайлава таксама выступілі амбасадары шэрагу Еўрапейскіх краінаў у Беларусі.

***23 ліпеня*** адвакатка М. Марыніча Вера Страмкоўская зьвярнулася да Генеральнага пракурора В. Шэймана з просьбай тэрмінова зьмяніць меру стрыманьня зьняволенаму. Абаронца спасылаецца на зьвесткі пра пагаршэньне

стану здароўя арыштаванага ва ўмовах летняй сьпякоты. Вера Страмкоўская перакананая, што далейшае ўтрыманьне Міхаіла Марыніча ў ізалятары КДБ небясьпечнае для ягонага здароўя. Абаронца спасылаецца на дадзеныя нядаўняга медыцынскага агляду Міхаіла Марыніча і на свае асабістыя ўражаньні ад апошняй сустрэчы з ім у ізалятары.

***26 ліпеня*** МЗС афіцыйна абвясьціў, што дзейнасьць журналістаў РТР у Беларусі спыненая. Прычына – неаднаразовае непраўдзівае асьвятленьне беларускіх падзеяў і тэндэнцыйны рэпартаж з акцыі апазіцыі 21 ліпеня, і, у паасобку, названая карэспандэнтам РТР колькасьць яе ўдзельнікаў, якая нібыта была перабольшаная. Але з Менску ў Маскву дагэтуль не паступіла ніякіх дакументаў пра закрыцьцё карпункту. У кіраўніцтве РТР ведаюць на гэты конт толькі тое, што паведаміла БТ.

***26 ліпеня*** кіраўніца Офісу грамадзкага абвінаваўцы ў нямецкім горадзе Эсьлінгэне Людміла Карпенка – удава вядомага беларускага палітыка Генадзя Карпенкі – зьвярнулася з лістом да амбасадара Грэцыі ў Расіі і Беларусі. Яна просіць не выдаваць візы міністру спорту і турызму Юрыю Сівакову, які, магчыма, датычны да зьнікненьняў вядомых беларускіх палітыкаў. Міністр Сівакоў узначальвае беларускую спартовую дэлегацыю, якая накіроўваецца ў Афіны, дзе з 13 да 29 жніўня пройдуць чарговыя летнія Алімпійскія гульні.

***26 ліпеня*** Міністэрства адукацыі Беларусі пазбавіла ліцэнзіі Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт. Іншымі словамі, яго дзейнасьць забароненая. Яшчэ 21 ліпеня з міністэрства паступіў загад да 5 жніўня вызваліць займаны ЕГУ будынак. (Свайго будынку ўніверсітэт збудаваць так і ня змог, бо яму ня выдзелілі для гэтага ўчастку). Як толькі стала вядома пра забарону навучальнай дзейнасьці для ЕГУ, частка студэнтаў тэрмінова зьвярнуліся з просьбай аб пераводзе ў іншыя ВНУ. У першыя два дні ўсім адмовілі. Абітурыенты, якія яшчэ ўчора сталі першакурсьнікамі прэстыжнай ВНУ, не пасьпявалі падаць дакументы ў іншыя універсітэты – там ужо поўным ходам здавалі іспыты. На некалькі дзён сітуацыя завісла ў няпэўнасьці. Кожная зацікаўленая асоба, студэнт ці выкладчык, шукала для сябе выйсьце – новыя месцы вучобы і працы. З 28 ліпеня ЕГУ лічыцца афіцыйна зачыненым, і фармальна перавод адтуль у іншую ВНУ немагчымы. Такім чынам, за месяц да пачатку новага навучальнага году ўлады Беларусі стварылі праблемы прыблізна для тысячы чалавек.

***26 ліпеня*** студэнты Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту наладзілі акцыю пратэсту супраць закрыцьця ВНУ. Многія з іх адмаўляюцца пераходзіць у іншыя навучальныя ўстановы і намерваюцца адстойваць свае права навучацца ў сьценах

ЕГУ. Адначасова кіраўніцтва ўніверсітэту правяло прэс-канферэнцыю, падчас якой паведаміла, што Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт будзе працягваць існаваньне – у іншых формах. Акцыю пратэсту студэнты наладзілі ў выглядзе мастацкага перфомансу – з выкарыстаньнем канспектаў, плакатаў, творчых працаў. Студэнты называюць дзеяньні ўладаў палітычна матываванымі і падтрымліваюць выкладчыцкі калектыў, рэктара ЕГУ Анатоля Міхайлава. Але адначасова выказваюць і незадаволенасьць дзеяньнямі педкалектыву. Анатоль Міхайлаў і ягоны намесьнік Уладзімір Дунаеў знаходзяцца ў ЗША, дзе праводзяць перамовы з фундатарамі міжнародных адукацыйных цэнтраў пра магчымасьць захаваньня ЕГУ.

***26 ліпеня*** дэпутаты Еўрапарламенту выказалі сваю занепакоенасьць “захадамі беларускіх уладаў, якія імкнуцца зьліквідаваць Беларускую партыю працы і Партыю БНФ. Ініцыятары звароту – два дэпутаты Еўрапейскага парламенту з Польшчы ад партыі “Закон і справядлівасьць” Конрад Шыманьскі і Марцін Лібіцкі, дэпутат ад Літвы, вядомы палітык Вітаўтас Ландсьбергіс, а таксама два дэпутаты ад Чэхіі і Вугоршчыны.

***26 ліпеня*** Дзярждэпартамэнт ЗША выказаў сваю занепакоенасьць атакамі на Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і разгонам дэманстрантаў 21 ліпеня. "Злучаныя Штаты глыбока занепакоеныя рэпрэсіямі супраць грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі, у прыватнасьці – нядаўняй атакай беларускага ўраду на акадэмічныя свабоды і права на сходы", -- гаворыцца ў заяве.

***26 ліпеня*** стала вядома, што пасьля ўдзелу ў канцэрце падчас акцыі 21 ліпеня артыстаў гурту “Палац” звольнілі з дзяржаўнай арганізацыі “Белканцэрт”. На дзяржаўным радыё супрацоўнікам рэкамендавалі не ўключаць у эфір кампазіцыі “Палацу”. А ў рэдакцыі радыё “Сталіца” пра непажаданасьць гучаньня ў эфіры “Палацу” было нават вывешаная адпаведная папера – праўда, без подпісу і пячаткі. Як распавядаюць некаторыя супрацоўнікі, афіцыйнай забароны не было, але ж у такіх выпадках і рэкамендацыі дастаткова.

***27 ліпеня*** калегія Гарадзенскага абласнога суда пакінула меру стрыманьня для Валерыя Леванеўскага ранейшаю: ён будзе сядзець у сьледчым ізалятары да сярэдзіны жніўня. У абласным судзе разглядалася скарга сп. Леванеўскага і ягонага адваката на пастанову Ленінскага раённага суда, які вырашыў, што ўтрыманьне абвінавачанага пад вартай працягнутае да 15 жніўня на законных падставах. Самога Леванеўскага ў судзе не было, ён шосты дзень галадуе, пратэстуючы супраць умоваў, у якіх яго ўтрымліваюць.

***28 ліпеня*** з Валерыя Леванеўскага зьнятае абвінавачаньне ў арганізацыі 1 траўня ў Гародні несанкцыянаванага мітынгу. Па-ранейшаму кіраўніка страйкаму прадпрымальнікаў абвінавачваюць у нанясеньні публічнай абразы прэзідэнту Лукашэнку. Новую пастанову аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачваемага атрымаў паплечнік Леванеўскага Аляксандр Васільеў. У ягонай пастанове цяпер два абвінавачаньні — у публічнай абразе прэзідэнта і ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу.

***29 ліпеня*** кіраўніцтва Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, закрытага паводле загаду Міністэрства адукацыі, распачало працэс пераводу студэнтаў у іншыя навучальныя ўстановы Менску. Адмысловае распараджэньне Міністэрства адукацыі – пра абавязковы прыём студэнтаў ЕГУ – падпісалі рэктары ўсіх ВНУ. Аднак дзяржаўныя ВНУ не гатовыя іх прыняць – з адсутнасьці дадатковай матэрыяльнай базы. Студэнты-выдатнікі, якія па прычыне неплацёжаздольнасьці бацькоў вучыліся ва ўніверсітэце бясплатна, цяпер магчымасьці сацыяльнага навучаньня пазбаўленыя. Яны кажуць, што па гэтай прычыне будуць вымушаныя спыніць далейшую адукацыю. Многія студэнты ЕГУ наогул засталіся бяз выбару. Бо ў Беларусі няма ніводнага ўніверсітэту, у якіх меліся б адпаведныя факультэты і навучальныя праграмы.

***29 ліпеня*** ў гаспадарчым судзе Менску было абвешчанае рашэньне па касацыйнай скарзе падатковай інсьпекцыі на рашэньне суда першай інстанцыі. Касацыйная інстанцыя пацьвердзіла неабгрунтаванасьць фінансавых санкцыяў, накладзеных на Беларускі Хельсінкскі камітэт за нявыплату падаткаў з грантаў, атрыманых па праграме TACIS. Цяпер апраўдальнае для БХК судовае рашэньне набыло законную сілу.

***29 ліпеня*** апоўдні каля беларускай амбасады ў Варшаве прайшла акцыя пратэсту супраць парушэньня палітычных правоў грамадзянаў Беларусі, у якой, сярод іншых, узялі ўдзел каля 50 дэпутатаў і віцэ-сьпікер польскага Сейму ад партыі “Грамадзянская платформа”, якая арганізавала акцыю. Прысутныя трымалі плакаты “Лукашэнку пад суд!”, “Стоп Лукашэнка!”. Варта адзначыць, што ліберальная партыя “Грамадзянская платформа” цяпер найбольш папулярная палітычная сіла ў Польшчы.

***29 ліпеня*** ў Менску міліцыянты забралі пашпарт у грамадзяніна Вялікабрытаніі Алана Флаўэрза. Доктар Алан Флаўэрз – выкладчык ядзернай фізікі ў Кінгстанскім універсітэце ў Лондане, з 1992 году займаўся пытаньнямі, зьвязанымі з Чарнобыльскай катастрофай, радыяцыяй, аздараўленьнем беларускіх дзяцей,

гуманітарнымі кантактамі. Доктар Флаўэрз знаходзіўся ў Беларусі па запрашэньні Сахараўскага інстытуту, дзе чытаў курс лекцыяў. Апрача таго, доктар Флаўэрз – адзін з заснавальнікаў і куратараў Еўрапейскага моладзевага парламенту. Доктар Флаўэрз выказаў меркаваньне, што беларускія ўлады рыхтуюць яго дэпартацыю і што, верагодна, ён будзе вымушаны пакінуць Беларусь. Прафесар Флаўэрз зьяўляецца ганаровым прафесарам Сахараўскага інстытуту, у будынку якога і адбыўся гэты інцыдэнт. Супрацоўнікі беларускага КДБ і міліцыі забралі ў яго пашпарт. Улады абвінавачваюць яго ў парушэньні правілаў знаходжаньня іншаземцаў у Беларусі. Алан Флаўэрз заяўляе, што ён знаходзіцца ў Беларусі з легальнай візай і рэгістрацыяй. Магчымыя прычыны – незадаволенасьць уладаў дзейнасьцю доктара Фаўлза, у прыватнасьці, ягоным удзелам у летніку Моладзевага еўрапейскага парламенту (European Youth Parliament) у Кобрыне, які адбыўся ў ліпені.

***29 ліпеня*** наваполацкімі актывістамі Свабоднага прафсаюзу быў зладжаны пікет супраць масавага пераводу работнікаў дзяржпрадпрыемстваў на кантрактную форму працы. Па ліку гэта чатырнаццатая "антыкантрактная" вулічная акцыя Свабоднага прафсаюзу ў рэгіёне. Пікет прайшоў без эксцэсаў і доўжыўся 1,5 гадзіны.

***29 ліпеня*** стала вядома, што большасьць выпускнікоў Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паедуць вучыцца ў Польшчу, Чэхію і Літву. Частка выпускнікоў зрабіла свой выбар на карысьць навучаньня на Бацькаўшчыне. Амаль палова выпускнікоў паступалі ў дзяржаўныя ВНУ. Некаторыя паступалі выключна дзеля таго, каб праверыць свае здольнасьці і магчымасьці, іншыя – каб паступіць і атрымаць адукацыю на Радзіме. Цяпер у ліцэі ідуць уступныя экзамены. Набіраецца група навучэнцаў на першы курс падпольнага ліцэю.

***30 ліпеня*** ў Вярхоўным судзе пачаўся працэс па справе ліквідацыі Беларускай партыі працы. Адпаведны зыск падало ў суд Міністэрства юстыцыі. Чыноўнікі абвінавачваюць апазіцыйную партыю ў шматлікіх парушэньнях Грамадзянскага кодэксу і ўласнага Статуту. Чыноўнік Мінюсту Аляксандр Харытон тлумачыў, што Партыя працы доўгі час ня мела юрыдычнага адрасу; са шматлікімі парушэньнямі правяла свой апошні зьезд, прызнаны Мінюстам нелегітымным; падала недакладныя зьвесткі пра сваіх сяброў, а таксама несвоечасова паставіла на ўлік рэгіянальныя структуры ў Навагрудку, Гародні, Віцебску і раённыя ў Менску. Акрамя гэтага, Аляксандр Харытон абвінаваціў партыю ва ўдзеле ў кааліцыі “Пяцёрка-плюс”, у парушэньні заканадаўства ў сувязі з выданьнем газеты “Рабочая салідарнасьць” і за нібыта незаконнае супрацоўніцтва з прафсаюзамі. Чыноўнік неаднаразова падкрэсьліваў, што Мінюст доўгі час спрабаваў дапамагчы Партыі працы выправіць дапушчаныя парушэньні закону, але партыя, маўляў, упарта адмаўлялася ад гэтай

дапамогі. Таму і не засталося іншага выйсьця, як прасіць Вярхоўны суд зьліквідаваць партыйную структуру. Лідэр Партыі працы Аляксандр Бухвостаў прызнаў, што невялікія парушэньні заканадаўства мелі месца, але яны былі своечасова выпраўленыя, а таму прычына памкненьня зьліквідаваць партыю – палітычная. Рашэньне па гэтай справе будзе прынятае праз некалькі дзён.

***30 ліпеня*** МЗС Беларусі запатрабаваў, каб супрацоўнікі расійскай тэлекампаніі РТР у Менску здалі акрэдытацыйныя пасьведчаньні. МЗС Беларусі пазбавіў акрэдытацыі увесь склад карпункту расійскай тэлекампаніі РТР у Менску. Кіраўніка карпункту Андрэя Качуру 29 ліпеня ўвечары выклікалі ў МЗС і запатрабавалі вярнуць акрэдытацыйныя пасьведчаньні. Супрацоўнікі МЗС зачыталі Андрэю Качуру выпіску з паседжаньня калегіі МЗС Беларусі. У ёй гаворыцца пра "неправамоцнасьць дзейнасьці ў Беларусі прадстаўніцтва ВГТРК у сувязі з парушэньнем ім закону аб СМІ. Такім чынам, дзейнасьць карпункту РТР у Беларусі забароненая. Раней МЗС Беларусі прыняў рашэньне адкласьці разгляд заяўкі на рэгістрацыю прадстаўніцтва тэлекампаніі ў Менску. Гэтыя рашэньні адбыліся пасьля сюжэту тэлекампаніі РТР аб акцыі апазіцыі 21 ліпеня ў дзясятую гадавіну прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі. Беларускія ўлады заявілі, што журналіст РТР Дзьмітрый Пятроў завысіў колькасьць удзельнікаў акцыі і запатрабавалі ад РТР прабачэньняў. Прабачэньняў ад тэлекампаніі няма дагэтуль.

***30 ліпеня*** актывісты нямецкіх аддзяленьняў міжнароднай праваабарончай арганізацыі "Amnesty International" і "Асацыяцыі свабодных студэнтаў" правялі акцыю супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. У амбасады Беларусі ў Боне і Берліне былі накіраваныя сотні факсаў з выражэньнем пратэсту супраць рэпрэсіяў у адносінах да актывістаў руху "Зубр", закрыцьця няўрадавых арганізацыяў. Прадстаўнікі міжнародных праваабарончых арганізацыяў патрабуюць таксама вызваленьня былога рэктара Гомельскага медінстытуту, прафесара Юрыя Бандажэўскага. Таксама ў факсах утрымліваецца заклік да беларускіх уладаў правесьці незалежнае расьсьледваньне зьнікненьняў палітычных апанентаў рэжыму і адмяніць сьмяротнае пакараньне.

***30 ліпеня*** суд Маларыцкага раёну Берасьцейскай вобласьці задаволіў зыск Партыі БНФ аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі да начальніка аддзелу па ідэалагічнай працы Маларыцкага райвыканкаму Сяргея Строка, які публічна заявіў, што Партыя БНФ у гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічала з фашыстамі. Суд абвязаў С. Строка абвергнуть сваё выказваньне ў рэгіянальнай газеце, заснаванай Маларыцкім райвыкамам, і сплаціць дзяржпошліну ў памеры 95 тыс. рублёў і 4160 у даход дзяржавы. Прадстаўнкамі Партыі БНФ у працэсе выступалі

юрысты Праваабарончага цэнтру “Вясна” Уладзімір Лабковіч і Валянцін Стэфановіч. Уладзімір Лабковіч пракаментаваў судовае рашэньне: “Мы вельмі задаволеныя бездакорным вядзеньнем працэсу і прафесійным кіраваньнем беларускім заканадаўствам з боку суда”.

***31 ліпеня*** супрацоўнікі пашпартна-візавай службы Партызанскага раёну Менску завяршылі працэдуру дэпартацыі Алана Флаўэрза. Яго азнаёмілі з пастановай, згодна з якой прафесар мусіць пакінуць межы Беларусі да 3 жніўня. У пашпарт паставілі штамп, паводле якога спадару Флаўэрзу забаронена перасякаць беларускую мяжу на працягу пяці гадоў. Навукоўцу дазволілі пакінуць Беларусь самастойна, за свой кошт, бо ён меў пры сабе квіток на самалёт на 2 жніўня з Вільні ў Лондан. Прафесар Алан Флаўэрз ня можа зразумець, чаму ён зрабіўся “персонай нон грата”. Навукоўцы, дзеячы мастацтва, студэнты, якія ведаюць прафесара, таксама зьбянтэжаныя. Алан Флаўэрз ня мае прэтэнзіяў да супрацоўнікаў міліцыі.

## ЖНІВЕНЬ

***2 жніўня*** рашэньнем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь была ліквідаваная Партыя працы. Міністэрства юстыцыі абвінаваціла Партыю працы ў парушэньні заканадаўства, а менавіта: партыя доўгі час ня мела юрыдычнага адрасу, апошні партыйны зьезд, на думку Мінюсту, прайшоў з парушэньнямі закону і таму нелегітымны, шэраг рэгіянальных структураў партыі былі зарэгістраваныя несвоечасова ці неналежным чынам, партыя ўмешвалася ў дзейнасьць прафсаюзаў. Усе абвінавачаньні судзьдзя Ганна Сакалоўская прызнала абгрунтаванымі і вынесла рашэньне аб ліквідацыі партыі. Лідэр Партыі працы Аляксандр Бухвостаў так пракаментаваў судовае рашэньне: “Я лічу, што гэта палітычная замова – пачатак ліквідацыі апазіцыйных палітычных партыяў. Мы будзем аспрэчваць гэтае рашэньне, пададзім скаргу ў Вярхоўны суд. Але з іншага боку, гэтае рашэньне нас ня спыніць. Мы ўсё роўна будзем удзельнічаць у выбарчай кампаніі”.

***2 жніўня*** судовыя выканаўцы Ленінскага раённага суда г.Менску апісалі маёмасьць рэдакцыі газеты "Народная воля" – усяго на суму 59 мільёнаў рублёў. Гэта было зроблена дзеля выкананьня двух судовых рашэньняў аб кампенсацыі маральных стратаў: па зыску прадпрымальніка Сяргея Атрошчанкі з газеты патрабуюць 15 млн. рублёў, а па зыску былога кіраўніка БТ Ягора Рыбакова – 50 млн. рублёў. Рэдакцыя "Народнай волі" працягвае працу ў звычайным рэжыме, хаця і на апісанай аргтэхніцы. Газеце далі 10 дзён на тое, каб выплаціць С. Атрошчанку суму кампенсацыі. У адваротным выпадку частку апісанай маёмасьці на суму 15 млн. рублёў могуць забраць і рэалізаваць. Тэрміны выплаты кампенсацыі на карысьць Ягора Рыбакова судовыя выканаўцы пакуль ня вызначылі, паколькі той знаходзіцца пад сьледзтвам.

***2 жніўня*** ўначы невядомыя аблілі чырвонай фарбай дзьверы і вокны сядзібы Партыі БНФ. Яны таксама пакінулі на асфальце побач з будынкам малюнак сярпа і молата ды надпіс на рускай мове: “Рукі прэч ад бацькі! АКМ”. Савецкі райаддзел міліцыі Менску праводзіць праверку гэтага здарэньня. Лідэры БНФ лічаць, што гэта справа рук нейкіх падлеткаў, якія трапілі пад уплыў антыапазіцыйнай прапаганды ў дзяржаўных СМІ і праўрадавых моладзевых арганізацыях.

***2 жніўня*** ў адной з вёсак каля расійскай радыёлакацыйнай станцыі “Волга” міліцыя затрымала дзесятак удзельнікаў экалагічна-палітычнага маршу пратэсту супраць прысутнасьці расійскіх вайсковых аб’ектаў, арганізаванага Партыяй БНФ. Маладыя людзі правялі ноч у лесе пад наглядам міліцыі, а 3 жніўня былі

дастаўленыя ў клецкую міліцыю. Клецкая міліцыя прымусіла непаўнагадовых удзельнікаў акцыі – шасьцёх чалавек – вярнуцца дадому, а Павел Батуеў атрымаў позву ў суд,

***2 жніўня*** Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт падрыхтаваў зыск у гаспадарчы суд да Міністэрства адукацыі, у якім патрабуе прызнаць незаконным пазбаўленьне ЕГУ ліцэнзіі. Але каб зварот быў прыняты да разгляду, патрэбныя дакументальныя абгрунтаваньні самога факту пазбаўленьня памяшканьня іануляваньня ліцэнзіі, якіх уладныя структуры выдаваць не сьпяшаюцца. Тым ня менш, кіраўніцтва ЕГУ зьбіраецца судзіцца, хоць і ўпэўнена, што спробы адстаяць правы ў судзе будуць бясплёнными і называе гэты крок маральным абавязкам у справе адстойваньня прынцыпаў універсітэцкай аўтаноміі і акадэмічных свабодаў.

***2 жніўня*** на Кастрычніцкай плошчы Менску адбылася несанкцыянаваная акцыя студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту. Яны пратэставалі супраць закрыцьця ЕГУ і пераводу студэнтаў у іншыя навучальныя ўстановы. Акцыя пратэсту праходзіла ў выглядзе вулічных чытаньняў: некалькі дзесяткаў студэнтаў прыйшлі на Кастрычніцкую плошчу з кнігамі, разгарнулі іх, селі на зямлю і пачалі чытаць. Ахоўнікі правапарадку прысутнічалі на акцыі, але нікога не затрымалі. Яны падыходзілі да студэнтаў, пыталіся, што яны робяць і навошта, папярэджвалі пра незаконнасьць правядзеньня акцыі на Кастрычніцкай плошчы, але ніякага гвалту над пратэстуючымі не ўчынялі. Студэнты ўвесь час падкрэсьліваюць, што дыстанцуюцца ад палітыкі, што іх акцыі мастацкія, культурніцкія і ні ў якім разе не палітычныя. Менавіта з гэтай прычыны яны не прынялі прапанову навучэнцаў Беларускага ліцэю пра супольную акцыю пратэсту, запланаваную на 5 жніўня, бо лічаць, што, нібыта, змаганьне ліцэістаў за сваю Alma Mater мае палітычнае адценьне.

***2 жніўня*** ў Гародні скончана сьледзтва па крымінальнай справе аб публічнай абразе прэзідэнта Лукашэнкі. Абвінавачаных двое – гэта кіраўнікі незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі і Аляксандр Васільеў. У гэты дзень яны ўпершыню ўбачылі матэрыялы сваёй крымінальнай справы, якія склалі шэсьць тамоў. Сьледзтва вёў старшы сьледчы Ленінскай раённай пракуратуры Альфрэд Танкевіч.

***3 жніўня*** трое актывістаў Салігорскай арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі зладзілі пікет супраць трэцяга тэрміну прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі ў цэнтры беларускай сталіцы. Усіх пікетоўцаў затрымалі супрацоўнікі АМАПу. А 6-й вечара на Кастрычніцкім пляцы Менску сябры АГП з Салігорску Аляксей Прыходзька, Тацяна Ларыёнава і Наталя Зубарэвіч разгарнулі расьцяжку: “10 гадоў дыктатуры.

Сыдзі, Лукавы!”. Яны пасьпелі раздаць мінакам частку ўлётак пад загалоўкам: “Куды пайшлі 10 гадоў нашага жыцьця?”. У тэксьце ўлёткі згадваліся прозьвішчы зьніклых вядомых грамадзкіх дзеячоў, а таксама людзей, супраць якіх вядуцца крымінальныя справы. Супрацоўнік АМАПу па рацыі выклікаў дапамогу, і пікетоўцы былі затрыманыя. У міліцыі Цэнтральнага раёну паведамілі, што ўсіх затрыманых адвязуць у сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік на вуліцы Акрэсьціна, а назаўтра даставяць у суд Цэнтральнага раёну. Іх абвінавачваюць у парушэньнях падчас правядзеньня вулічнага масавага мерапрыемства.

***4 жніўня*** суд Цэнтральнага раёну Менску асудзіў актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі з Салігорску за правядзеньне пікету на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Актывіст АГП Аляксей Прыходзька арыштаваны на 15 сутак, а Наталя Зубарэвіч – на 10 сутак. У Тацяны Ларыёнавай сямігадовае дзіця, і, паводле беларускага заканадаўства, суд ня мае права караць яе арыштам. Судзьдзя Леанід Ясіновіч аштрафаваў Тацяну на 30 базавых велічыняў (гэта 570 000 рублёў).

***4 жніўня*** адзін з арганізатараў акцыі “РЛС – пагроза для Беларусі” Павел Батуеў атрымаў позву ў суд Клецкага раёну на 9 чэрвеня. Увечары 4 жніўня ўдзельнікі акцыі былі ізноў затрыманыя. Гэтым разам расійскімі вайскоўцамі на чале з палкоўнікам. Паводле ўдзельніка акцыі Юрася Зянковіча, затрыманьне адбылося, калі група пакідала тэрыторыю Клецкага раёну ў накірунку Ганцавічаў. Група моладзі спынілася ў пяцістах метрах ад расійскай вайсковай радыёлакацыйнай станцыі "Волга". Праз некалькі хвілінаў іх затрымалі і перадалі клецкай міліцыі.

З ***4 жніўня*** беларускім радыёстанцыям забаронена ставіць у эфір музыку ў выкананьні гуртоў, што гралі на мітынгу 21 ліпеня. Гэткую інфармацыю ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ) неафіцыйна пацьвердзілі на некалькіх камерцыйных і дзяржаўных радыёстанцыях. Слухачы Першай праграмы Беларускага радыё, радыё "Сталіца" і нават фармальна недзяржаўных радыёстанцыяў FM-дыяпазону могуць больш не пачуць у эфіры гуртоў "Палац", "N.R.M.", "Zet", "Помидор/off", "Drum Ecstasy" і "Нейро Дюбель". Аднак супрацоўнікі Аддзелу аналізу і каардынацыі дзейнасьці электронных СМІ Міністэрства інфармацыі сьцьвярджаюць, што гэтая інфармацыя не адпавядае рэчаіснасьці. "Ніякага дакументу няма", — заявіў прэс-службе БАЖ супрацоўнік аддзелу Дзьмітрый Конанаў. Па зьвестках ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў", супрацоўнікі дзяржаўнага радыё атрымалі вусную рэкамендацыю не ставіць у эфір песні ў выкананні вышэйзгаданых музыкаў. Ёсць інфармацыя, што кампазіцыі ў іх выкананьні нават выдаленыя з фанатэкі ў студыйных кампутарах. Газеце "Комсомольская правда в Белоруссии" стала вядома, што на радыё "Сталіца"

тыдзень таму зьявіўся ў надрукаваным выглядзе "чорны" сьпіс гуртоў, якія забаронена даваць у эфір. Аднак, як толькі журналісты пачалі выказваць цікавасьць да гэтага дакумента, сьпіс зьнік. Вуснае распараджэньне "зьверху" прыбраць з эфіру названых музыкаў атрымалі таксама супрацоўнікі некаторых менскіх FM-радыёстанцыяў. Каментуючы гэтую інфармацыю, адзін з "адлучаных" ад эфіру музыкаў, лідэр "N.R.M." і "Zet" Лявон Вольскі зазначыў, што бачыць у гэтым жаданьне пэўных чыноўнікаў выслужыцца перад кіраўніцтвам. "Яны робяць больш, чым ад іх патрабуюць: пачуўшы з вуснаў кіраўніка дзяржавы пра "палацы" і "дзюбелі", яны пачалі татальную "зачыстку". Тое, што дзяржаўныя радыёстанцыі падпарадкоўваюцца распараджэньням "зьверху", выглядае цалкам натуральна. А вось камерцыйнае, недзяржаўнае радыё – гэта зусім іншая рэч. Выконваючы гэткія загады і распараджэньні, яны "закапаюць" саміх сябе”, – лічыць Лявон Вольскі.

***4 жніўня*** маці зьніклага ў ліпені 2000 году тэлеаператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага Вольга Завадзкая накіравала ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь заяву з патрабаваньнем узнавіць вытворчасьць па справе яе сына “ў сувязі з наноў адкрыўшыміся абставінамі” і дапытаць А. Лукашэнку ў якасьці сьведкі. На прэс-канферэнцыі 20 ліпеня А.Лукашэнка, у прыватнасьці, заявіў: "И вот что удивляет: ну если так родственники переживают, ну вы ко мне придите. Пришел один человек, женщина — понимаете, по какой причине я не могу назвать ее фамилию. Она пришла ко мне, я ее принял, спросила об одном человеке, опять не называю фамилию. Меня поразила эта женщина. Молодец. Я с ней три часа беседовал. Я ей показал некоторые документы. Но если я их сейчас обнародую, то дело Завадского превратится в "антидело". Это, кстати, моя боль единственная — Дима Завадский. Я бы многое отдал для того, чтобы узнать о судьбе этого человека". 4 жніўня заяву ў рэспубліканскай пракуратуры прыняў і зарэгістраваў дзяжурны пракурор Барыс Жыльдзецкі.

***4 жніўня*** Чыгуначны раённы суд Віцебску прысудзіў Барысу Хамайду штраф за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасьць, якой нібыта той займаецца. Словы распаўсюдніка пра тое, што ён ня мае ніякіх прыбыткаў ад гэтага занятку, а таксама паказаньні сьведкаў, якія штодня бачаць Барыса Хамайду ля “Сіняга дому”, судзьдзя да ўвагі не прыняў. Спадар Хамайда лічыць гэты прысуд незаконным і сваю распаўсюдніцкую дзейнасьць прыпыняць не зьбіраецца. Ля “Сіняга дому” разам з апошнім нумарам “БДГ” ён раздаваў віцяблянам і апошні выпуск сваёй газеты “Выбар”, якая выходзіць у Віцебску з 1990 году.

***4 жніўня*** недзяржаўная газета "Рабочая салідарнасьць" спыняе сваё існаваньне ў сувязі з тым, што 2 жніўня Вярхоўны суд Беларусі прыняў рашэньне аб ліквідацыі

Беларускай партыі працы (БПП). У аддзеле рэгістрацыі Мінінфармацыі пацьвердзілі, што, паколькі БПП выконвала функцыю рэдакцыі "Рабочай салідарнасьці", то ліквідацыя газеты адбудзецца аўтаматычна. Найбліжэйшым часам Міністэрства падрыхтуе адпаведны загад.

***4 жніўня*** ўвечары некалькі дзесяткаў студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту прыйшлі да будынку ўніверсітэту, каб сімвалічна з ім разьвітацца – правесьці там усю ноч. Але да іх пад’яжджалі супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным і казалі, што тут нельга заставацца, што яны будуць затрыманыя за адміністратыўныя правапарушэньні. Студэнты разышліся, і ўсё ж некалькі чалавек правялі там усю ноч.

***5 жніўня*** выхад незалежнай газеты “Народная воля” быў сарваны судовымі выканаўцамі, якія арыштавалі банкаўскі рахунак газеты і паперу, на якой мусіў быць надрукаваны наклад. Дырэктару друкарні "Чырвоная зорка" забаронена друкаваць "Народную волю", пакуль газета цалкам ня сплоціць грашовую кампенсацыю маральнай шкоды прадпрымальніку Сяргею Атрошчанку і былому кіраўніку Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі Ягору Рыбакову.

***5 жніўня*** Грэцыя не дазволіла ўезд на сваю тэрыторыю міністру спорту і турызму Беларусі Юрыю Сівакову, які меўся ўзначальваць беларускую дэлегацыю на Алімпійскіх гульнях у Афінах. Падставай дзеля гэтага паслужыла справаздача дакладчыка Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Хрыстаса Пургурыдэса, дзе гаворыцца пра магчымую датычнасьць Ю.Сівакова да зьнікненьняў вядомых людзей. Як паведаміў адзін з чыноўнікаў Еўрасаюзу, рашэньне грэчаскіх уладаў было ўзгодненае з прадстаўнікамі ўсіх іншых краінаў Саюзу. Нагадаем, у 1999 годзе зьніклі былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка, былы старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар і яго сябра – бізнэсоўца Анатоль Красоўскі. У 2000 годзе зьнік журналіст Дзьмітры Завадзкі. Сярод рэкамендацыяў у справаздачы дакладчыка Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Хрыстаса Пургурыдэса была прапанова распачаць крымінальнае расьсьледваньне, каб высьветліць мажлівую датычнасьць службовых асобаў у Беларусі да зьнікненьняў. Сярод іх, акрамя Ю. Сівакова, які ў свой час быў міністрам унутраных справаў, цяперашні Генеральны пракурор Віктар Шэйман і палкоўнік унутраных войскаў Дзьмітрый Паўлічэнка. Рашэньне аб забароне на ўезд Юрыя Сівакова ў Грэцыю каментуе старшыня камісіі па справах Беларусі Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Ёнас Чэкуоліс: “Гэтае рашэньне можа быць вынікам дыскусіяў, якія мы мелі ў Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы ў сёлетнім красавіку, калі абмяркоўвалі сітуацыю са зьніклымі грамадзкімі дзеячамі ў Беларусі. У справаздачы спадара

Пургурыдэса ў гэтым пытаньні якраз і называліся прозьвішчы асобаў, якія могуць быць датычнымі да гэтых зьнікненьняў. Сівакоў – адно з гэтых прозьвішчаў. Мы ўдзячныя еўрапейскім арганізацыям, еўрапейскім дзяржавам за тое, што яны зьвярнулі ўвагу на нашую выснову, на выснову Рады Еўропы”. Апрача Сівакова, Грэцыя забараніла ўезд на сваю тэрыторыю міністрам спорту Бірмы і Зімбабвэ. Гэтым чыноўнікам забаронены ўезд у краіны Еўрасаюзу з прычыны іх датычнасьці да парушэньня правоў чалавека ў сваіх краінах.

***5 жніўня*** Генеральны пракурор Беларусі Віктар Шэйман адхіліў хадайніцтва пра зьмяненьне меры стрыманьня быламу міністру зьнешнеэканамічных сувязяў, Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму амбасадару Рэспублікі Беларусь Міхаілу Марынічу. Пра гэта адвакату Веры Страмкоўскай паведаміў супрацоўнік Пракуратуры Рэспублікі Беларусь Іван Сухаверка. Па ягоных словах, для вызваленьня Марыніча “няма падставаў”. Хадайніцтва пра зьмяненьне меры стрыманьня адвакат Вера Страмкоўская падала 21 ліпеня. Адвакат сьвярджае, што для ўтрыманьня М. Марыніча ў СІЗА КДБ няма падставаў: артыкул, па якім ён абвінавачваецца (незаконнае захоўваньне зброі), не патрабуе абавязковага ўтрыманьня пад вартай, а на допыты палітыка не выклікаюць.

***6 жніўня*** ў Баранавічах у кватэры актывісткі руху “Зубр” Насты Васіленкі адбыўся вобыск. Супрацоўнікі міліцыі прыйшлі з санкцыяй пракурора на вобыск і патлумачылі, што вядуць сьледчыя мерапрыемствы ў сувязі з крадзяжом мабільнага тэлефону, і ёсьць канкрэтныя падазрэньні, што скрадзены тэлефон знаходзіцца менавіта ў гэтай кватэры. Падчас вобыску тэлефону не знайшлі, але канфіскавалі незалежныя выданьні і ўлёткі, сярод якіх былі газэты “Зубр” і “Освобождение”. Асаблівую занепакоенасьць выклікае тое, што ў Насты Васіленкі была канфіскаваная яе запісная кніжка з адрасамі і тэлефонамі сяброў. Вобыск ў Насты Васіленкі – частка спланаванай кампаніі запалохваньня апазіцыі і актывістаў маладзёвага руху напярэдадні парламенцкіх выбараў.

***6 жніўня*** дэпутат Валеры Фралоў зьвярнуўся ў суд Маскоўскага раёну Менску з пазовам аб абароне гонару, годнасьці і кампенсацыі маральнай шкоды з нагоды публікацыі ў “Обозревателе” 15 жніўня 2003 году артыкулу пад назвай “Дэпутаты Касьян, Навасяд і Фралоў – асабовыя антысеміты?”. У публікацыі са спасылкай на словы старшыні Саюзу габрэйскіх арганізацыяў і суполак Беларусі Леаніда Левіна сьцьвярджалася, што дэпутаты Фралоў і Навасяд вызнаюць асабовы антысемітызм, да таго ж “прапаведуюць нелюбоў да габрэяў паўсюль, дзе ні знаходзіліся б”. Пасьля выхаду публікацыі Леанід Левін затэлефанаваў дэпутатам Фралову і Навасяду і сказаў, што ён такога ніколі не гаварыў. Леанід Левін накіраваў ліст у рэдакцыю з

патрабаваньнем абвержаньня. Але яно не было надрукавана. Дэпутат Валеры Фралоў патрабуе ад рэдакцыі “Обозревателя” надрукаваць абвержаньне і выплаціць яму 100 мільёнаў рублёў кампенсацыі маральнай шкоды.

***9 жніўня*** Калегія па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда не задаволіла прыватную скаргу Сойму Партыі БНФ. Скарга была пададзеная на рашэньне суда Першамайскага раёну, які 12 ліпеня адмовіў Партыі БНФ ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы па зыску да Белтэлерадыёкампаніі і журналіста Юрыя Пракопава за паклёпніцкія выказваньні ў адрас партыі, якія прагучалі ў эфіры 25 красавіка 2004 году. У вызначэньні суда Першамайскага раёну было сказана: “Гэтая спрэчка адносіцца да сферы палітычнай дыскусіі, якая ўплывае на фармаваньне палітычных поглядаў у грамадзянаў і не падлягае разгляду ў судзе”. 9 жніўня Калегія па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда пакінула гэтае вызначэньне ў сіле. Юрыст Праваабарончага цэнтру “Вясна” Валянцін Стэфановіч сказаў: “Мы ня згодныя з гэтым рашэньнем. Нас пазбавілі права на правасудзьдзе. Што значыць палітычная дыскусія? Гэта распаўсюд інфармацыі, якая не адпавядае рэчаіснасьці”.

***9 жніўня*** на Чыгуначным вакзале ў Менску за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў быў затрыманы сябра Міёрскай раённай арганізацыі АГП Валеры Каралёў, які распаўсюджваў інфармацыйныя матэрыялы Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” (“Пяць крокаў да лепшага жыцьця” і “Куды пайшлі 10 гадоў нашага жыцьця”) і недзяржаўную прэсу. В. Каралёў быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і дастаўлены ў аддзяленьне, дзе быў складзены пратакол канфіскацыі друкаванай прадукцыі. Апрача таго, дзяжурны супрацоўнік міліцыі адразу патэлефанаваў у КДБ, адкуль адразу ж прыбылі два супрацоўнікі, якія прысутнічалі пры складаньні “тлумачальнай” і задавалі пытаньні. Супрацоўнікі КДБ цікавіліся колам інтарэсаў і знаёмстваў В. Каралёва, а таксама, з якой мэтай ён нядаўна езьдзіў у Польшчу.

***9 жніўня*** Міністэрства спорту і турызму зьмясьціла на сваім вэб-сайце (www.mst.by) заяву міністра Юрыя Сівакова ў сувязі з тым, што Еўрапейскі Саюз і ўлады Грэцыі забаранілі яму ўезд на сваю тэрыторыю. Каментуючы рашэньне Еўрасаюзу, міністр Сівакоў адзначыў, што з пункту гледжаньня маральна-псіхалагічнага гэта сур’ёзная траўма, і ня толькі асабіста для яго. Ён абвінаваціў амерыканскае кіраўніцтва і Еўрасаюз, якія быццам бы “адкрыта парушаюць прынцыпы алімпійскага руху”. “Мы, славяне, на чале з Расіяй, павінны праяўляць больш актыўнасьці ў абароне ўстаноўленых міжнародных нормаў і правілаў, а не заставацца пасіўнымі пабочнымі назіральнікамі”, — піша міністр у сваёй заяве. “З пункту гледжаньня прэзумпцыі невінаватасьці і сутнасьці праблемы, вакол якой

разгарэўся ўвесь гэты сыр-бор, магу сказаць толькі адно, — працягвае міністр Юры Сівакоў, — ніхто ня мае права называць чалавека злачынцам і выносіць яму прысуд без рашэньня суда. Калі б у чыноўнікаў Еўрасаюзу былі важкія доказы супраць мяне, то іх дзеяньні, адназначна, былі бы зусім іншымі".

***9 жніўня*** Клецкі раённы суд пачаў разгляд справы сябра Партыі БНФ Паўла Батуева, якога абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыяванага шэсьця па вёсках Клецкага раёну. Удзельнікі акцыі пратэставалі супраць расійскай радыёлакацыйнай станцыі (РЛС) "Волга". 9 жніўня суд абавязаў міліцыянтаў удакладніць, у чым канкрэтна яны абвінавачваюць Паўла Батуева: у арганізацыі ці ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсьці.

***10 жніўня*** міністр спорту і турызму Юры Сівакоў заявіў, што не паедзе ў Афіны. Кіраваць алімпійскай дэлегацыяй ён зьбіраецца з Менску. Тым часам на афіцыйным вэб-сайце Міністэрства спорту зьмешчаная новая, падкарэктаваная версія заявы міністра Сівакова. У прыватнасьці, раней Сівакоў абвінаваціў амерыканскае кіраўніцтва і Еўрасаюз у тым, што яны "адкрыта парушаюць прынцыпы алімпійскага руху". Цяпер Сівакоў выказваецца інакш. Паводле яго, у амерыканскага кіраўніцтва і Еўрапейскага Саюзу свая мадэль дэмакратыі. У сталай штаб-кватэры Міжнароднага алімпійскага камітэту (МАК) у Швейцарыі заявілі, што ніякіх пратэстаў ад афіцыйнага Менску або міністра спорту Юрыя Сівакова не атрымлівалі.

***11 жніўня*** Берасьцейскі абласны суд адмяніў папярэджаньне, вынесенае судом Маларыцкага раёну дэпутату мясцовага райсавету, юрысту Праваабарончага цэнтру "Вясна", сябру Партыі БНФ Уладзіміру Малею. Папярэджаньне было вынесенае Уладзіміру Малею за правядзеньне 25 красавіка ў вёсцы Струга сустрэчы з выбаршчыкам, якая тычылася будаўніцтва могільніку радыёактыўных адкідаў. Нязгодны з судовым рашэньнем, Уладзімір Малей напісаў скаргу на імя старшыні Берасьцейскага абласнога суда. У выніку пастанова суда Маларыцкага раёну была адмененая ў сувязі з тым, што "згодна ч.2 арт.247 КаАП РБ пры разглядзе справаў аб адміністратыўным правапарушэньні, прадугледжаным арт. 167-1 КаАП, прысутнасьць асобы, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасьці, абавязковая". Адміністратыўная справа Уладзіміра Малея накіраваная на новы разгляд – "у той жа суд іншаму судзьдзі". "Пры новым разглядзе трэба прыняць рашэньне ў адпаведансьці з законам", сказана ў пастанове.

***11 жніўня*** сенатару Джону МакКэйну забаранілі ўезд у Беларусь. "Я расчараваны, але, шчыра кажучы, ня зьдзіўлены апошнім антыдэмакратычным захадам беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. У гэтым месяцы я зьбіраўся

ўзначаліць дэлегацыю амерыканскіх сенатараў у Беларусь, дзе мы планавалі правесьці некалькі сустрэчаў, у тым ліку і з прэзідэнтам. Баючыся, што мы будзем крытыкаваць ягоную таталітарную ўладу, спадар Лукашэнка адмовіў нам у візах і не дазволіў нам уехаць у краіну".

***11 жніўня*** абвешчана, што Дзьмітры Паўлічэнка, які падазраецца ў выкраданьнях і магчымым забойстве палітычных апанентаў Лукашэнкі, узнагароджаны Расійскай праваслаўнай царквой ордэнам Сьвятога раўнаапостальнага князя Уладзіміра трэцяй ступені. Такой высокай царкоўнай узнагароды падпалкоўнік Паўлічэнка ўдастоены за актыўны ўдзел у будаўніцтве храму на тэрыторыі вайсковай часткі, камандзірам якой ён зьяўляецца. Мітрапаліт Філарэт хадайнічаў перад Патрыярхам Маскоўскім і Усяе Русі Алексіем II, каб гэты ордэн далі менавіта Паўлічэнку. Настаяцель прыходу Аляксандр Яцкевіч патлумачыў, што Паўлічэнка “непасрэдна браў удзел у будаўніцтве, фізічна і маральна падтрымліваў”. На пытаньне, ці вядома царкве, што імя Паўлічэнкі фігуруе ў дакладзе Хрыстаса Пургурыдэса сярод асобаў, датычных да зьнікненьня вядомых у Беларусі апазіцыйных палітыкаў, бізнэсоўцы і аператара ОРТ, айцец Аляксандр адказаў: “Я абсалютна нічога ня ведаю, ні царква, ні наш прыход не прымаюць удзелу ні ў якіх палітычных акцыях, нічога агульнага мы з гэтым ня маем і ня ведаем нічога”. Тым часам сваякі зьніклых абураныя тым фактам, што Расійская праваслаўная царква ўзнагародзіла Паўлічэнку. Жонка зьніклага палітыка Зінаіда Ганчар сказала: “Я нічога не разумею ў гэтай сітуацыі. Паўлічэнку падазраюць у жудасных злачынствах, гэта праходзіць па ўсіх дакументах. У гэтай сітуацыі патрэбнае нейкае праясьненьне. У мяне такое ўражаньне, што мы знаходзімся ў дурдоме. Узнагароджваць людзей з заплямленай рэпутацыяй і тлумачыць гэта тым, што царква па-за палітыкай — гэта, прынамсі, глупства. Калі царква па-за палітыкай, то яна павінна быць і па-за хваробай”. Вольга Завадзкая, маці зьніклага аператара Дзьмітрыя Завадзкага адзначыла: “Гэта абуральна. Усё ж такі Філарэт асоба дзяржаўная. І каб так — не разабраўшыся ў сітуацыі, плюнуць людзям у душу, ва ўсякім разе — мне”.

***12 жніўня*** на пасту дзяржаўтаінсьпекцыі ў Жлобіне ў 19 гадзінаў вечару быў затрыманы прыватны легкавік намесьніка старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Уладзіміра Кацоры. У райаддзеле міліцыянты ўчыніліператрус у аўтамабілі, здымаючы ўвесь працэс на відэакамеру. Пасьляператрусу міліцыянты канфіскавалі некалькі тысячаў асобнікаў незалежнай газеты "Время" і ўлёткі "Пяць крокаў да лепшага жыцьця".

***12 жніўня*** Валеры Леванеўскі — кіраўнік незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў краіны, які знаходзіцца ў сьледчым ізалятары гарадзенскай турмы №1, выказаў намер вылучацца ў Палату прадстаўнікоў шляхам збору подпісаў. Кіраўніком яго ініцыятыўнай групы мяркуецца сын Уладзімір. Вылучацца Валеры Леванеўскі зьбіраецца ў Гарадзенскай-Паўночнай выбарчай акрузе №53 — па месцы жыхарства. У акруговай выбарчай камісіі ягонаму сыну Уладзіміру сказалі, што бацька вылучацца можа, хаця знаходзіцца ў сьледчым ізалятары. Праўда, паводле Выбарчага кодэксу кандыдат павінен падаць дакументы ў камісію асабіста. Але Уладзіміру таксама сказалі, што іх можа здаць ён, калі бацька падпіша паперы.

***13 жніўня*** стала вядома, што ініцыятыўныя групы Валерыя Леванеўскага і Аляксандра Васільева не зарэгістравалі. Фармальная падстава адмовы для Леванеўскага – дакументы ў акруговую выбарчую камісію прадставіў ягоны сын Уладзімір, а ня ён сам. Праўда, спадар Леванеўскі аформіў даверчы ліст на сына, але гэты ліст ня быў засьведчаны начальнікам турмы. Аляксандру Васільеву адмовілі ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы нібыта таму, што няправільна былі аформлены здадзеныя ў камісію дакументы.

***16 жніўня*** ў судзе Першамайскага раёну Менску працягнуты разгляд зыску старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі да тэлекампаніяў БТ, ОНТ і СТВ. Лідэр АГП абвінавачвае гэтыя тэлеканалы ў абразе ягонага гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі. Непасрэднай прычынай судовага зыску стала дэманстрацыя фільму “Шлях у нікуды”. Увесь сюжэт фільму “Шлях у нікуды” скіраваны на тое, каб давесьці гледачу, якая дрэнная беларуская апазіцыя. Тым ня менш, у сваім зыску Анатоль Лябедзька выдзеліў адзін фрагмент, у якім аўтары, што хаваюцца за псеўданімамі Аляксандр Уюгін, Гяоргі Козыраў, Віктар Нікольскі, Уладзімір Жаваранак, Надзея Бывалая, Агаф’я Красачка і Сяргей Усатаў, непасрэдна абразілі ягоныя гонар і годнасьць. Так, у адным з месцаў фільму на фоне кадраў з Анатолем Лябедзькам, закадравы голас паведамляе пра тое, што калі шэф “Газпраму” Аляксей Мілер загадаў “у 20 градусны мароз спыніць у Беларусь пастаўкі газу”, каб нібыта такім чынам прымусіць беларускае кіраўніцтва аддаць яму за бясцэнак канцэрн “Белтрансгаз”, то ў падтрымку гэтай акцыі выступіў “псеўдапатрыёт Лябедзька”. Паводле аўтараў “Шляху ў нікуды”, лідэр АГП таксама “паліваў брудам сваю краіну, паклёпнічаў на прэзідэнта і такім чынам дапамагаў спадарам кшталту Сванідзэ маральна апраўдаць гэтую бесчалавечную акцыю”. “Толькі ў жудасным сьне можна ўявіць, як хутка распрадаў бы гэты малойчык наш нацыянальны набытак сваім сябрам-алігархам, калі б нейкім цудам ён атрымаў уладу ў Беларусі”, робяць выснову аўтары фільму. Гэты фільм быў паказаны па БТ 11

траўня, а праз некалькі дзён яго паўтарылі каналы ОНТ і СТВ. У сваім зыску Анатоль Лябедзька патрабуе ад тэлеканалаў абвергнуць гэтую няпраўдзівую інфармацыю, а таксама назваць сапраўдныя імёны і прозьвішчы аўтараў фільму. Гэта ўжо другое судовае паседжаньне па гэтай справе. Першае адбылося 26 ліпеня і скончылася празь некалькі хвілінаў пасьля пачатку. У суд не зьявіліся прадстаўнікі ОНТ і СТВ. Судзьдзя Аніскевіч тады зачытаў адказ на афіцыйны запыт першага намесьніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Мартыненкі. Ён паведаміў суду, што аўтары фільму “Шлях у нікуды” не зьўляюцца штатнымі супрацоўнікамі тэлеканалу, ніколі імі не былі, ганарараў не атрымлівалі, таму даведацца якія іхныя сапраўдныя прозьвішчы немагчыма.

***16 жніўня*** на 95 тысячаў рублёў аштрафаваны каардынатар руху “Зубр” Аляксей Шыдлоўскі. Рашэньне пра штраф было прынятае 28 ліпеня адміністратыўнай камісіяй Савецкага выканкаму. А.Шыдлоўскі быў затрыманы 6 ліпеня ў раёне плошчы Якуба Коласа ў Менску за распаўсюд ўлётак пра акцыю 21 ліпеня, прысьвечаную заканчэньню дзесяцігадовага тэрміну прэзідэнцтва А. Лукашэнкі.

***16 жніўня*** в.а. старшыні Менскай абласной арганізацыі Партыі БНФ, дэпутат Менскага раённага Савету Юрась Зянковіч быў запрошаны ў Савецкі РУУС г.Менску, дзе на яго быў складзены пратакол за непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі пасьля акцыі 21 ліпеня. Юрась Зянковіч мусіць 17 жніўня ў 14:30 зьявіцца ў Савецкі РУУС, каб адтуль ехаць на суд. Нагадаем, што 21 ліпеня мікрааўтобус, якім кіраваў Юрась Зянковіч, быў затрыманы пасьля канцэрту ў парку Дружбы народаў. Інсьпектар ДАІ хацеў агледзець салон мікрааўтобусу, таму што лічыў, што ў гэтым аўтамабілі перавозіліся ўлёткі, якія раздаваліся на акцыі. Юрась Зянковіч адмовіўся прадставіць аўтамабіль для агляду і прад’явіў інсьпектару сваё дэпутацкае пасьведчаньне. Супрацоўнікі міліцыі палічылі, што яно падробленае, і даставілі сп.Зянковіча і ягоную жонку ў Савецкі РУУС.

***16 жніўня*** міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч падпісаў загад аб прыпыненьні недзяржаўнай "Новой газеты Сморгони", якую выдае індывідуальны прадпрымальнік Рамуальд Улан. Выдаўца абвінавачваюць у парушэньні артыкулаў 10 і 20 закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Прапярэджаньне выдаўцу газеты за гэтыя ж парушэньні было вынесена днём пазьней – 17 жніўня. Заснавальнік і выдавец газеты ўпэўнены, што міністэрства знайшло фармальныя падставы для прыпыненьня "Новой газеты Сморгони". Ён зьвяртае ўвагу на блытанасьць прыведзеных міністэрствам тлумачэньняў і бачыць у іх шэраг унутраных супярэчнасьцяў. У прыватнасьці, ён сьцьвярджае, што яго газета з моманту свайго заснаваньня выдавалася індывідуальным прадпрымальнікам, а не

"юрыдычнай асобай". Акрамя гэтага, у распрацаванай міністэрствам "Памятцы аб парадку рэгістрацыі перыядычных выданьняў" сьцьвярджаецца, што калі ў якасці рэдакцыі выступае заснавальнік-грамадзянін, то рэдакцыя ў якасці юрыдычнай асобы і Статут не ствараюцца.

***16 жніўня*** Валерыю Леванеўскаму працягнулі тэрмін знаходжаньня ў сьледчым ізалятары. 15 жніўня ў 21.20 скончаўся тэрмін ягонага арышту, родныя нічога ня ведалі аб тым, што яго ня выпусьцяць, яны прыйшлі ўвечары да турмы. Аднак дзяжурны сказаў, што спадар Леванеўскі застанецца ў сьледчым ізалятары. Тэрмін знаходжаньня ў сьледчым ізалятары Валерыю Леванеўскаму працягнуў Ленінскі раённы суд, дзе будзе разглядацца справа аб публічнай абразе прэзідэнта Лукашэнкі.

***17 жніўня*** сябра ініцыятыўнай групы прадпрымальніка Алега Тычыны, які прапануецца для вылучэньня ў якасьці кандыдата, Уладзімір Мацюшэнка быў разьмеркаваны ў Лепель пасьля заканчэньня педагагічнага ўніверсітэту. Але калі У. Мацюшэнка зьвярнуўся ў Лепельскі РАНА, каб яго накіравалі на працу ў школу, загадчык райана Нікіцін заявіў: “Пасьля таго, як ты палез у ініцыятыўную групу, цябе ня возьме на працу ні адзін дырэктар”. Такім чынам, маладому сьпецыялісту было адмоўлена ў працаўладкаваньні па сьпецыяльнасьці, нягледзячы тое, што, паводле працоўнага заканадаўства, у выніку разьмеркаваньня працоўнае месца мусіць быць прадастаўлена ў абавязковым парадку.

***17 жніўня*** суд Першамайскага раёну Менску не задаволіў зыск аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі лідэра Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі. Зыск быў пададзены да тэлеканалаў БТ, ОНТ і СТВ і аўтараў фільму “Шлях у нікуды”, паказанага гэтымі тэлеканаламі. Рашэньне суда Першамайскага раёну аб незадавальненьні зыску будзе абскарджанае ў Менскім гарадзкім судзе.

***18 жніўня*** дэпутат Менскага райсавету ад Партыі БНФ Юрась Зянковіч аштрафаваны на 5 базавых велічыняў судзьдзёй Наталяй Скугаровай. Юрась Зянковіч мае намер падаць наглядную скаргу ў Менскі гарадзкі суд, а таксама заяву на ўзбуджэньне крымінальнай справы супраць судзьдзі Скугаровай за вынясеньне відавочна прадузятай пастановы.

***18 жніўня*** пракурор Маларыцкага раёну вынес касацыйны пратэст на рашэньне суда Маларыцкага раёну, які задаволіў зыск Партыі БНФ аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі. У касацыйным пратэсьце пракурор Маларыцкага раёну Ліцкевіч сьцьвярджае, што “рашэньне суда падлягае адмене па прычыне яго

неабгрунтаванасьці, бо пры разглядзе справы судом ня ўлічаныя ўсе факты, якія ўваходзяць у прадмет доказваньня. Адказчык Строк С.І іскавыя патрабаваньні не прызнаў і ўказаў, што правёў аналогію паміж дзейнасьцю беларускіх нацыяналістаў ў гады Вялікай Айчыннай вайны і дзейнасьцю Партыі БНФ. У сувязі з гэтым суду неабходна было ўдакладніць, пра якую канкрэтна дзейнасьць (!) указанных палітычных партый ішла размова і ці зьневажаюць (!) узгадкі пра дадзеную дзейнасьць дзелавую рэпутацыю БНФ. У гэтай сувязі суду неабходна было пашырыць кола сьведкаў з мэтай удакладненьня зьместу выступу адказчыка".

***19 жніўня*** ў Бярозе пачаўся суд над адным з юрыстаў Праваабарончага цэнтру "Вясна" Аляксандрам Шавелем. 18 жніўня Аляксандр Шавель ўдзельнічаў у грамадзянскім працэсе і выказаў крытыку ў адрас пракурора, пасьля чаго быў абвінавачаны ў непавазе да суда. З залы суда А.Шавель быў дастаўлены ў РУУС, дзе на яго быў складзены пратакол за ўчыненьне правапарушэньня. Падчас разгляду адміністратыўнай справы Аляксандр Шавель запатрабаваў адваката. Яму прапанавалі трох дзяржаўных з "тых, якія былі ў наяўнасьці". Шавель адмовіўся, пасьля гэтага разгляд справу перанесьлі на 23 жніўня. Абараняць Шавеля будзе адвакат Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў Аляксандр Галіеў.

***20 жніўня*** судзьдзя Гомельскага абласнога суда Анатоль Дудзіч задаволіў зыск упраўленьня юстыцыі наконт ліквідацыі грамадзкага жаночага аб'яднаньня "Ініцыятыва". Абласное жаночае аб'яднаньне "Ініцыятыва" стала шаснаццатай грамадзкай арганізацыяй у рэгіёне, зачыненай паводле прэтэнзіяў упраўленьня юстыцыі. Найчасьцей гэтыя прэтэнзіі датычылі разьмяшчэньня юрыдычных адрасоў арганізацыяў у кватэрах яе кіраўнікоў. З гэтай прычыны атрымлівала пісьмовыя папярэджаньні і жаночае аб'яднаньне "Ініцыятыва". Сябра аб'яднаньня, кандыдат юрыдычных навук Ірына Кучвальская, якая прадстаўляла інтарэсы сваёй арганізацыі ў судзе, лічыць, што юрыдычныя адрасы — штучна створаная перашкода. Пераадолець яе грамадзкія арганізацыі ня могуць. Большая частка памяшканьняў зьяўляецца ўласнасьцю дзяржавы. Працэдура здачы іх у арэнду грамадзкім структурам ня вызначаная. З іншага боку, у саміх арганізацыяў няма сродкаў на арэнду памяшканьняў. Юрыдычны адрас для ўладаў стаў інструментам зьнішчэнньня актыўных грамадзкіх фармаваньняў.

***20 жніўня*** дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня Сяргей Антончык сустракаўся з палітычнымі і грамадзкімі актывістамі г. Сьветлагорску па пытаньнях, зьвязаных з выбарчай кампаніяй у парламент. Падчас сустрэчы ў памяшканьне, дзе яна адбывалася, прыйшлі двое супрацоўнікаў міліцыі (Аляксандр Гарошкаў і Сяргей Ражкоў), а таксама чалавек у цывільным з відэакамерай, які не назваўся. Нагодай

дзеля візіту была названая “праверка дакументаў”. Ва ўсіх прысутных, акрамя Вадзіма Болбаса, пры сабе аказаліся пашпарты, таму толькі яго павялі ў адзяленьне міліцыі “дзеля высьвятленьня асобы”. Аднак шлях у паструнак праходзіў побач з домам В. Болбаса, і ён прапанаваў зайсьці да яго дадому, каб зьняць пытаньне пра ягоную “асобу”. Падчас праверкі дакументаў усіх прысутных у памяшканьні здымалі на відэакамеру. Удзельнікі сустрэчы лічаць, што сачылі за Сяргеем Антончыкам яшчэ з Менску, паколькі ў Сьветлагорску падобных ініцыдэнтаў яшчэ не было.

***21 жніўня*** затрыманьнем і канфіскацыяй кніжак скончылася імпрэза, якую наладзіў Андрэй Клімаў у Менску. У рэстарацыі “Журавінка” былы прадпрымальнік і дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня сабраў прыхільнікаў, каб агучыць ідэю свайго ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах 2006 году, а таксама прэзентаваць новую кніжку “Прогулки с вампиром”. Позна ўвечары – пасьля дзесятай -- міліцыянты спынілі аўтамабіль, у якім знаходзіліся Андрэй Клімаў з жонкай Тацянай. Міліцыянты адабралі дакументы ва ўладальніка аўтамабілю Леаніда Малахава і канфіскавалі з багажніку каля дзьвюх сотняў кніжак “Прогулки с вампиром” і “Очевидные истины”. Андрэя Клімава тры гадзіны пратрымалі ў Цэнтральным РУУС.

***23 жніўня*** шэраг буйных менскіх крамаў адмовіліся прадаваць вядучыя недзяржаўныя выданьні, у тым ліку "Белорусский рынок", "Белорусскую деловую газету", "Белорусскую газету" і "Народную волю". Сярод крамаў, якія адмовіліся распаўсюджваць недзяржаўную прэсу, – "Preston-market" і ўніверсам "Нацыянальны". Як паведаміў выканаўчы дырэктар "Белорусской газеты" Віктар Бандарэнка, нягледзячы на тое, што з усімі крамамі ў рэдакцыі былі заключаныя дамовы, кіраўніцтва гандлёвых прадпрыемстваў скасавала іх у аднабаковым парадку без усялякага папярэджаньня. Па словах В. Бандарэнкі, яны ня ўтойваюць, што атрымалі адпаведнае ўказаньне ад Менгарвыканкаму.

***23 жніўня*** Вярхоўны суд Беларусі адмовіў кіраўніцтву Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту ў задавальненьні зыску да Міністэрства адукацыі па пытаньні ануляваньня ліцэнзіі на ажыцьцяўленьне адукацыйнай дзейнасьці. Кіраўніцтва ЕГУ зьбіраецца падаць у Вярхоўны суд новы зыск да Галоўнага гаспадарчага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзідэнта, якая незаконна скасавала дамову на арэнду будынку. Тым самым ЕГУ быў пазбаўлены матэрыяльнай базы, што і стала прычынай ануляваньня ліцэнзіі.

***23 жніўня*** ў Барысаве невядомыя абрабавалі офіс кандыдата ў дэпутаты Зьміцера Бародкі. Нявядомыя выламалі дзьверы, вынесьлі з офісу кампутар, факс і прынтэр. Па факце злачынства ўзбуджаная крымінальная справа.

***23 жніўня*** ў судзе Бярозаўскага раёну адбыўся разгляд адміністратыўнай справы юрыста Аляксандра Шавеля, які быццам бы абразіў раённага пракурора Курыловіча. Суд вынес рашэньне – штраф у памеры 2 базавых велічыняў.

***23 жніўня*** ў Вярхоўным судзе пачаўся разгляд зыску Сойму Партыі БНФ да Міністэрства юстыцыі Беларусі. Аўтары зыску просяць суд адмяніць папярэджаньне Мінюсту, якое было вынесенае 1 ліпеня за тое, што прадстаўнікі кааліцыі “Пяцёрка-плюс” на старонках “Народнай волі” заклікалі людзей узяць удзел у несанкцыянаванай акцыі салідарнасьці з газетай “Ланцуг неабыякавых чытачоў”. Юрысты Партыі БНФ Уладзімір Лабковіч і Юры Чавусаў у судзе сьцьвярджалі, што аргументы Мінюсту неабгрунтаваныя. Партыя БНФ, як юрыдычная асоба, не прымала рашэньняў аб уваходжаньні ў кааліцыю “Пяцёрка-плюс” і аб удзеле ў акцыі.

***24 жніўня*** офіс Гомельскага абласнога грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянскія ініцыятывы”, у 2003 годзе пазбаўленага афіцыйнай рэгістрацыі, быў агледжаны супрацоўнікамі абласной падатковай службы і ўпраўленьня фінансававых расьследваньняў Камітэту дзяржкантролю Гомельскай вобласьці. Візіцёры прыйшлі даведацца, што знаходзіцца ў гэтым будынку. “Грамадзянскія ініцыятывы” займаюць памяшканьне былой крамы ўжо шмат гадоў, але гаспадар памяшканьня чамусьці не здымае шыльду. Каб ня ўводзіць патэнцыйных пакупнікоў у зман, супрацоўнікі “Грамадзянскіх ініцыятываў” проста вывешваюць на ўваходных дзьвярах абвестку “Тут крамы няма”. Тым ня менш, Уладзімір Кацора ня лічыць, што дадзены візіт – звычайная цікавасьць ці выпадковасьць. На ягоную думку, ён можа быць зьвязаны з тым, што старшыня арганізацыі Віктар Карніенка зьбіраецца балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, і ягонымі патэнцыйнымі супернікамі выступаюць высокапастаўленыя чыноўнікі.

***25 жніўня*** Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь пакінуў у сіле папярэджаньне, вынесенае Міністэрствам юстыцыі Партыі БНФ. Свае доказы міністэрства ў асобе сьпецыяліста Неанілы Фішкнай пабудавала на публікацыях у СМІ, дзе паведамлялася пра стварэньне Народнай кааліцыі, а таксама былі скарыстаныя некалькі інтэрвью старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, дзе ён вызказваўся ад імя кааліцыі “Пяцёрка-плюс”.

***25 жніўня*** Працоўнай групе ААН адмоўлена ў сустрэчы з палітвязьнем Міхаілам Марынічам. Сустрэча прадстаўнікоў Працоўнай групы ААН па адвольных затрыманьнях з Міхаілам Марынічам была запланаваная на вечар 25 жніўня, але хадайніцтва Групы не было задаволенае.

***25 жніўня*** ўплывовая міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў" выступіла з асуджэньнем новых атакаў на незалежную беларускую прэсу напярэдадні парламенцкіх выбараў. "Рэпарцёры" пратэстуюць супраць рашэньня міністра інфармацыі РБ прыпыніць на 3 месяцы недзяржаўную "Новую газету Сморгони", а таксама выказваюць заклапочанасьць з нагоды адмовы шэрагу гандлёвых кропак Менску прадаваць недзяржаўныя выданьні. Арганізацыя накіравала міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу ліст, у якім, у прыватнасці, гаворыцца: "Гэта непрымальная сітуацыя для незалежных медыяў - быць вымушанымі маўчаць напярэдадні выбараў, якія маюць такое вялікае значэньне для краіны". "Усе абставіны гавораць на карысьць таго, што "Новая газета Сморгони" зьяўляецца ахвярай афіцыйнага ўціску. Мы заклікаем Вас перагледзець сваё рашэньне аб прыпыненьні гэтай газеты і ўстрымацца ад падобных крокаў ў дачыненьні да іншых медыяў", — гаворыцца ў пасланьні "Рэпарцёраў бяз межаў”.

***26 жніўня*** старшыня Вярхоўнага суда РБ прыняў рашэньне ня ўносіць пратэст на рашэньні ніжэйстаячых судоў аб адмове ў рэгістрацыі Гомельскага абласнога грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянская альтэрнатыва”. У стварэньні арганізацыі ўзялі ўдзел 209 жыхароў Гомельскай вобласьці, якія былі сябрамі аб’яднаньня “Грамадзянскія ініцыятывы”. Разумеючы, наколькі складаным можа быць працэс рэгістрацыі, першапачаткова заснавальнікі “Грамадзянскай альтэрнатывы” распрацавалі свой Статут на аснове Статута ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”. Замест бесьперашкоднага праходжаньня рэгістрацыі, Статут “Грамадзянскай альтэрнатывы” быў прызнаны ўпраўленьнем юстыцыі Гомельскага аблвыканкаму неадпаведным заканадаўству па 7 пунктах. Гэта стала прычынай адмовы няўрадавай арганізацыі ў рэгістрацыі. Апеляцыі “альтэрнатыўшчыкаў” да арыгіналу – Статуту БРСМ – сітуацыю не зьмянілі. Аб’яднаньне, зьвярнуўшыся ў Гомельскі абласны суд, прайграла працэс. Але сітуацыя адносна Статуту і парушэньняў у ім крыху прасьвятлілася ў касацыйнай інстанцыі Вярхоўнага суда. У прыватнасьці, пракурор рэспубліканскай пракуратуры РБ Анатоль Лыцін, які ўдзельнічаў у паседжаньні, паведаміў, што ў статутах зарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў “могуць утрымлівацца парушэньні дзеючага заканадаўства”. Па словах Уладзіміра Кацоры, сябры арганізацыі будуць рыхтаваць скаргі ў Камітэт па правах чалавека ААН, бо беларускія ўлады груба парушылі права на свабоду аб’яднаньняў.

***26 жніўня*** начальнік сьледчага аддзелу КДБ па Менску і Менскай вобласьці Ніканові паведаміў пра працягненьне на месяц тэрміну ўтрыманьня пад вартай Міхаіла Марыніча. Па словах адваката Веры Страмкоўскай, узбуджаная і новая крымінальная справа – па факце крадзяжу абсталяваньня ва ўзначальваемай М.

Марынічам арганізацыі "Дзелавая ініцыятыва" — па арт. 210 ч. 4 КК РБ. Гэты артыкул прадугледжвае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін ад 8 да 15 гадоў.

***26 жніўня*** Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь пакінуў у сіле папярэджаньне Міністэрства юстыцыі, вынесенае Аб’яднанай грамадзянскай партыі. Судовае разьбіральніцва адбывалася па зыску Аб’яднанай грамадзянскай партыі, якая патрабавала адмены папярэджаньня, вынесенага на пачатку ліпеня. Папярэджаньне было вынесенае за тое, што партыя ў якасьці ўдзельніка незарэгістраванага аб’яднаньня Народная кааліцыя “Пяцёрка-плюс” на старонках газеты “Народная воля” заклікала людзей прыняць удзел у несанкцыянаванай акцыі салідарнасьці з газетай “Ланцуг неабыякавых чытачоў”. На думку юрыстаў АГП, папярэджаньне Мінюсту было неабгрунтаванае.

***26 жніўня*** намесьнік старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Гары Паганяйла па запрашэньні Леаніда Невара, аднаго з лідэраў РГА “Персьпектыва”, патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, наведаў г. Рэчыцу дзеля азнаямленьня з праблемамі, з якімі сутыкнулася ягоная ініцыятыўная група. Сябры групы скардзіліся на перашкоды з боку райвыканкаму. У прыватнасьці, кіраўніцтва выканкаму ў працоўны час не знаходзіцца на працоўным месцы, што стварае цяжкасьці падчас завярэньня подпісаў сяброў ініцыятыўнай групы па вылучэньні кандыдата ў дэпутаты на падпісных лістах. Леанід Невар і Гары Паганяйла наведалі старшыню акруговай выбарчай камісіі, намесьніка старшыні райвыканкаму Віталя Атаманчука і ўказалі яму на шэраг праблемаў. У прыватнасьці – незаконнасьць сумяшчэньня абавязкаў намесьніка старшыні выканкаму і старшыні акруговай камісіі. На час выкананьня абавязкаў старшыні выбарчай камісіі В. Атаманчук павінен сысьці ў адпачынак на асноўным месцы працы. Акрамя таго, у склад камісіі ўваходзяць яшчэ некалькі супрацоўнікаў выканкаму. Калі Леанід Невар і Гары Паганяйла вярнуліся дадому да Невара, дзе сабраліся сябры ініцыятыўнай групы, у двор уварваліся супрацоўнікі міліцыі ў бронежылетах, узброеныя аўтаматамі на чале з намесьнікам начальніка РУУС падпалкоўнікам міліцыі Паўлам Рыжко. Супрацоўнікі міліцыі адмовіліся прадставіцца Леаніду Невару і назваць мэту візіту. Пасьля таго, як Невар прадставіў Гары Паганяйлу як свайго прадстаўніка, юрыста, супрацоўнікі міліцыі ўступілі ў перамовы і прад’явілі службовыя пасьведчаньні і працэсуальныя дакументы аб правамоцнасьці іх дзеяньняў. Як высьветлілася, пасьля атрыманьня “сігналу аб сталяніне ў доме” падпалкоўнік П. Рыжко вынес пастанову пра агляд дому, які быў санкцыянаваны міжрайпракурорам В. Будковым, дзеяньні праводзіў капітан міліцыі А. Грыцок сумесна з оперупаўнаважаным лейтэнантам Г. Малюціным, відэаздымкі праводзіў лейтэнант В. Капусьняк. Супрацоўнікі міліцыі

агледзелі пабудовы ў двары, усе памяшканьні ў доме, праверылі сумкі, партфелі, кішэні прысутных на наяўнасьць зброі і іншых прадметаў, забароненых для нашэньня і захаваньня. Праз гэтую прыніжальную працэдуру прайшлі ўсе сябры ініцыятыўнай групы, а таксама намесьнік старшыні БХК Гары Паганяйла і старшыня РГА “Персьпектыва” Анатоль Шумчанка. У многіх прысутных у двары былі ўзятыя тлумачэньні, з якой мэтай яны там знаходзяцца, хто іх запрасіў, чым займаюцца і г.д. За дзеяеньнямі супрацоўнікаў міліцыі на працягу трох гадзінаў назіралі суседзі Невара і мінакі. Скончыўшы вобыск і апытаньне, супрацоўнікі міліцыі ўказалі, што ніякіх незаконных прадметаў ня знойдзена і нічога ня будзе вымацца. Супрацоўнікі міліцыі адмовіліся запратакаліраваць вусныя скаргі на свае дзеяньні, а таксама пакінуць копію складзенага пратаколу агляду памяшканьня. Копію пратаколу выдаў начальнік РУУС пасьля таго, як туды прыбылі Невар і Паганяйла. Па інфармацыі Гары Паганяйлы, агляд праводзіўся павярхоўна і фармальна, без мэты пошуку зброі. Леанід Невар і Гары Паганяйла падалі скаргу на незаконныя дзеяньні міліцыі міжрайпракурору. БХК лічыць, што характар дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі сьведчыць пра тое, што фактычна праводзілася “аперацыя” па запалохваньні сяброў ініцыятыўнай групы і дыскрэдытацыі патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Леаніда Невара.

***26 жніўня*** ў Гародні пачаўся судовы працэс па крымінальнай справе паводле артыкулу 368 ч.2 КК РБ — аб публічнай абразе прэзідэнта Лукашэнкі. Абвінавачваемых двое — кіраўнік страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі і ягоны намесьнік Аляксандр Васільеў. Іх абвінавачваюць у распаўсюдзе ўлётак з вершам, які нібыта ўтрымвае абразу прэзідэнта. Васільева таксама абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў 1 траўня. Валерыя Леванеўскага даставілі ў суд пад вартай са сьледчага ізалятару, яго трымаюць за кратамі амаль чатыры месяцы. На суд прыйшлі толькі родныя Валерыя Леванеўскага і некалькі журналістаў. Тым ня менш, будынак Ленінскага раённага суда ўзмоцнена ахоўвалі. Міліцыянты паставілі перад уваходам металічныя бар’еры. Журналістам сказалі, што іх ня пусьцяць, што трэба загадзя пісаць заяву на імя судзьдзі, хаця працэс — адкрыты. Урэшце міліцыянты журналістаў пусьцілі, але забаранілі праносіць фотаапараты. У выніку затрымкі прадстаўнікі прэсы патрапілі ў залу са спазьненьнем на паўгадзіны. Валеры Леванеўскі сядзеў у “клетцы”. Яго ахоўвалі тры ўзброеныя міліцыянты, якія зьмяняліся кожныя паўгадзіны. Напачатку ён хадайнічаў, каб паводле гэтай крымінальнай справы суд прызнаў пацярпелым Аляксандра Лукашэнку, каб ён мог прысутнічаць на працэсе. Пракурор Панасюк на гэта адказаў, што заява пацярпелага Аляксандра Лукашэнкі і ягоная прысутнасьць непатрэбныя, паколькі ён зьяўляецца кіраўніком дзяржавы і атаясамліваецца з

самой дзяржавай. Леванеўскі і Васільеў сваю віну не прызналі і папрасілі ўдакладніць — якімі канкрэтна словамі верша з улёткі яны абразілі Лукашэнку і абвінавацілі яго ў “незаконным выкарыстаньні дзяржаўных сродкаў”. Для прысутных на працэсе таксама засталося няясным: за якія словы судзяць Леванеўскага і Васільева.

***27 жніўня*** ў цэнтры Менску адбылася акцыя ў падтрымку Міхаіла Марыніча і Валерыя Леванеўскага, якую правялі актывісты незарэгістраванай арганізацыі “Зубр”. Больш за трыццаць юнакоў і дзяўчат сталі ў ланцуг уздоўж прасьпекту Скарыны насупраць КДБ, а потым прайшлі некалькі кругоў вакол пляцоўкі побач з будынкам. Закладзеныя за галаву рукі рабілі іх падобнымі да вязьняў. Кашулі ўдзельнікаў акцыі мелі надпіс “Свабоду Міхаілу Марынічу!”. Акцыя працягвалася 20 хвілінаў. Ніхто з яе ўдзельнікаў на месцы ня быў затрыманы. У гэты дзень споўнілася роўна чатыры месяцы з часу арышту і зьмяшчэньня ў ізалятар КДБ Міхаіла Марыніча. Большасьць апытаных інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў экспертаў выказаліся на карысьць палітычнай версіі крымінальнага перасьледу М. Марыніча.

***27 жніўня*** міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч падпісаў загад аб прыпыненні выхаду газеты "Навінкі" тэрмінам на тры месяцы. Выданьне абвінавачваюць у парушэньні некалькіх артыкулаў Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Паводле Мінінфармацыі, рэдакцыя запозна паведаміла пра зьмену юрыдычнага адрасу, не дасылала "кантрольных" нумароў газеты ў дзяржаўныя органы, указала няпоўныя выходныя дадзеныя, а таксама дапусьціла пэўныя фінансавыя парушэньні. Кіраўнік аддзелу рэгістрацыі міністэрства Віктар Гурэцкі лічыць, што санкцыі супраць "Навінак" за дапушчаныя парушэньні маглі б быць і больш жорсткімі. У сваю чаргу, галоўны рэдактар газеты Паўлюк Канавальчык упэўнены, што "новыя цкаваньні выданьня з боку ўладаў тлумачацца іх жаданьнем выключыць "Навінкі" з інфармацыйнага поля і грамадзкага жыцьця напярэдадні і падчас правядзеньня парламенцкіх выбараў". Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджаным газетай прэс-рэлізе. Выданьне ўжо прыпынялася на такі ж самы тэрмін 22 траўня 2003 году былым міністрам інфармацыі Міхаілам Падгайным. Перад гэтым газета была двойчы папярэджаная па артыкуле 5 Закону аб друку: за "распаўсюд зьвестак, якія зьневажаюць гонар і годнасьць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" і за "замах на маральнасьць, гонар і годнасьць грамадзянаў". Пасьля аднаўлення дзейнасьці "Навінак" з імі доўгі час адмаўляліся супрацоўнічаць друкарні, а таксама перашкаджалі "гаспадарчыя праблемы, у сувязі з чым рэдакцыя

толькі адносна нядаўна зноў наладзіла сваю працу", — гаворыцца ў прэс-рэлізе "Навінак ".

***27 жніўня*** Вярхоўны суд Беларусі пакінуў у сіле папярэджаньне Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамадзе. Аўтары зыску прасілі суд адмяніць папярэджаньне Мінюсту, вынесенае БСДГ і яшчэ тром партыям за тое, што прадстаўнікі кааліцыі “Пяцёрка-плюс” на старонках “Народнай волі” заклікалі людзей узяць удзел у несанкцыянаванай акцыі салідарнасьці з газетай “Ланцуг неабыякавых чытачоў”. Старшыня партыі Станіслаў Шушкевіч давёў суду, што кааліцыя “Пяцёрка-плюс” з’яўляецца грамадзкім рухам, у які ўваходзяць сябры разнастайных палітычных і грамадзкіх арганізацыяў. Яны і запрасілі чытачоў газеты прыйсьці на акцыю. Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада ніякіх заклікаў не рабіла, а таму папярэджаньне Мінюсту незаконнае. Тым ня менш, судзьдзя Філіманіхіна скаргу БСДГ не задаволіла. Вось як гэта пракаментаваў спадар Шушкевіч: “Абвінаваціць партыю немагчыма, але ж вы бачылі, што робіцца: паколькі кааліцыя не зьяўляецца юрыдычнай асобай, не існуе, то няма каму абвесьціць папярэджаньне. Дык давайце абвесьцім папярэджаньне палітычнай партыі. Я думаю, што гэта найлепшы анекдот”.

***27 жніўня*** ў клубе “Бліндаж” павінна была адбыцца імпрэза “Рок пасьля вакацыяў”, падчас якой планавалася прэзентацыя альбому “Я люблю ліцэй: веру ў цябе”. Пра адмену канцэрту стала вядома за некалькі гадзінаў да пачатку імпрэзы. Як паведаміў мэнэджэр праекту навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэю Франак Вячорка, у клуб “Бліндаж” патэлефанавалі з упраўленьня культуры адміністрацыі Фрунзенскага раёну і загадалі адмяніць канцэрт. Па ягоных словах, было прададзена больш за 200 квіткоў на канцэрт. Ліцэісты зьбіраліся выканаць частку песень з ліцэйскага дыску, у тым ліку беларускія апрацоўкі сусьветнай класікі і рок-хіты. У канцэрце зьбіраліся ўзяць удзел і вядомыя беларускія рок-гурты “ZET”, “Garadzkija”, пераможца фэсту “Басовішча’2004” гурт “Тарпач” ды іншыя. Як распавёў лідэр гурту “ZET” Лявон Вольскі, музыканты зьбіраліся бясплатна выступіць у падтрымку ліцэю, закрытага ўладамі.

***29 жніўня*** было пастаўленае пад пагрозу правядзеньне зьезду Аб’яднанай грамадзянскай партыі па вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты адміністрацыяй гатэлю “Менск”, ахова якога не дапусьціла дэлегатаў у канферэнц-залу, арэнда якой была аплачаная партыяй. З гэтай нагоды АГП падрыхтаваў заяву ў пракуратуру з патрабаваньнем прыцягнуць кіраўніцтва гатэлю да крымінальнай адказнасьці. Дырэктар гатэлю называе гэты выпадак непаразуменьнем і просіць у АГП прабачэньня.

***30 жніўня*** ў Жлобінскім раённым судзе пачаўся працэс па адміністратыўнай справе намесьніка старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Уладзіміра Кацоры, якога абвінавачваюць у “дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі”. Пра абставіны справы распавядае Уладзімір Кацора: “Я ехаў з Менску у Гомель, вёз газету “Время” і ўлёткі “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”. Перад Жлобінам заўважыў, што за мной палююць супрацоўнікі міліцыі. Каля вёскі Лебядзёўка на стацыянарным пасту ДАІ мяне спынілі, сказалі, што мая машына падобная на машыну, якая лічыцца ва ўгоне. Праверылі дакументы, нумар машыны, сказалі, што ўсё роўна ня ўсё ясна, што мне трэба праехаць у райаддзел міліцыі ў г. Жлобін. Там даішнікі мяне здалі ў рукі супрацоўнікаў РУУС, якія правялі дагляд машыны, склалі пратакол выняцьця і пратакол парушэньня Адміністратыўнага кодэксу паводле арт. 167-10 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Пад незарэгістраванай арганізацыяй яны мелі на ўвазе Народную кааліцыю “Пяцёрка-плюс”. Пратакол перадалі ў Жлобінскі раённы суд. 30 жніўня я прадставіў суду дакументы, што газета “Время” зарэгістраваная, але судзьдзя выказала сумнеў, што Аб’яднаная грамадзянская партыя зарэгістраваная, сказала, каб я прывёз копію пасьведчаньня пра рэгістрацыю партыі”.

***30 жніўня*** Аляксандр Васільеў афіцыйна адмовіўся ў судзе ад сваіх былых паказаньняў, якія ён даваў ва ўпраўленьні КДБ. Ён заявіў, што толькі пад прэсінгам быў вымушаны даваць паказаньні супраць сябе і Валерыя Леванеўскага.

***30 жніўня*** стала вядома, што Дэпартамент фінансавых расьсьледваньняў Камітэту дзяржкантролю Беларусі не спыніў крымінальную справу супраць старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Тацяны Процькі і галоўнага бухгалтара арганізацыі Тацяны Руткевіч. 23 чэрвеня гаспадарчы суд Менску пастанавіў, што праваабаронцы ня мусілі плаціць падаткаў з грантаў TACIS, але, як стала вядома ў БХК, крымінальную справу на падставе гэтага рашэньня не закрылі.

***31 жніўня*** судзьдзя Жлобінскага раённага суда Алена Ярмольчык аштрафавала на 585 тысячаў рублёў намесьніка старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Уладзіміра Кацору. Штраф накладзены за перавоз на ўласным легкавіку з Менску ў Гомель 15 тысячаў улётак “Пяць крокаў да лепшага жыцьця” і звыш тысячы асобнікаў газеты “Время”. Судзьдзя расцаніла перавоз як дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. 15 тысячаў улётак “Пяць крокаў да лепшага жыцьця” судзьдзя Ярмольчык пастанавіла зьнішчыць. Што тычыцца газеты “Время”, то міліцыя абавязаная правесьці дадатковую праверку дзеля высьвятленьня паходжаньня друкаванага выданьня. Суд прыняў рашэньне пра

вынясеньне штрафу пасьля таго, як атрымаў з Міністэрства юстыцыі інфармацыю, што арганізацыі "Пяцёрка-плюс" не існуе.

***31 жніўня*** прадстаўнікі цыганскай нацыянальнай меншасьці зьвярнуліся ў Міністэрства адукацыі з просьбай адкрыць цыганскую школу ў г.Менску. На дадзены момант у Рэспубліцы Беларусь пражываюць каля 70 тысячаў цыганоў, але няма ніводнай школы ці класу з выкладаньнем на цыганскай мове. У цыганскіх сем’ях прынята размаўляць на цыганскай мове, і калі дзіця ідзе ў школу, яно проста не разумее, пра што з ім гавораць, што ў далейшым адбіваецца на пасьпяховасьці. 93% цыганоў у Беларусі ня маюць поўнай сярэдняй адукацыі, існуюць вялікія праблемы з атрыманьнем вышэйшай адукацыі. Міністэрства ніякім чынам не адрэагавала на зварот прадстаўнікоў нацыянальнай маншасьці, адказу заяўляльнікі так і не атрымалі.

***31 жніўня*** сябра Аб’яднананай грамадзянскай партыі Уладзімір Зьвернік быў азнаёмлены з загадам пра скасаваньне з ім працоўнага кантракту. У. Зьвернік працаваў трэнерам у дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе ў пасёлку Чысьць. Звальненьне адбылося пасьля таго, як Зьвернік заявіў пра свой намер удзельнічаць у выбарах у якасьці кандыдата.

## ВЕРАСЕНЬ

***1 верасьня*** на Шаркоўшчыне на некалькі гадзінаў быў затрыманы жыхар Міёраў, сябра АГП Валеры Каралёў, які на кірмашы распаўсюджваў газеты "Згода", "Новы час", "Тут і цяпер", а таксама ўлёткі перадвыбарчае кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Старшыню Віцебскай абласной арганізацыі АГП Генадзя Ананьева міліцыянты затрымалі на кірмашы Воршы, дзе ён раздаваў прадпрымальнікам і пакупнікам газету "Время". Спадару Ананьеву, які зьяўляецца рэдактарам гэтай газеты, давялося даводзіць міліцыянтам ня толькі тое, што "Время" афіцыйна зарэгістраванае выданьне, якое можна распаўсюджваць без абмежаваньняў, ён мусіў пераконваць іх яшчэ і ў тым, што распаўсюд газеты не зьвязаны з ягоным удзелам у парламенцкіх выбарах, і што гэта не зьяўляецца перадвыбарчай агітацыяй. Аршанскія міліцыянты пратрымалі Генадзя Ананьева ў пастарунку каля гадзіны. Ягонаму таварышу па партыі з Міёраў Валерыю Каралёву давялося правесьці ў Шаркоўшчынскім райаддзеле міліцыі каля дзьвюх гадзінаў. Цягам гэтага часу міліцыянты некуды тэлефанавалі ды раіліся, што рабіць з распаўсюднікам. Урэшце яго адпусьцілі, пакінуўшы сабе па адным асобніку кожнага выданьня. Нічога супрацьзаконнага ў дзейнасьці абодвух распаўсюднікаў міліцыянты выявіць ня здолелі.

***1 верасьня*** Партыя БНФ накіравала скаргу старшыні Менскага гарадзкога суда ў парадку нагляду на вызначэньне суда Першамайскага р-ну г.Менску. Такім чынам, партыя працягвае дабівацца прыцягненьня да адказнасьці за зьнявагу дзелавой рэпутацыі партыі журналіста Юрыя Праковава і Белдзяржтэлекампаніі.

***1 верасьня*** ў 16.00 на Кастрычніцкай плошчы ў Менску пачалася моладзевая акцыя ў падтрымку беларускай мовы "Хочам вучыцца па-беларуску!". У ёй прынялі ўдзел каля 100 чалавек – у асноўным навучэнцы зачыненага Беларускага гуманітарнага ліцэю, сябры "Задзіночаньня беларускіх студэнтаў", а таксама актывісты моладзевага руху “Зубр” і іншых моладзевых арганізацыяў. Падчас спробы моладзі разгарнуць плакаты пачалося затрыманьне ўдзельнікаў акцыі. Быў зьбіты і затрыманы кіраўнік ліцэйскага самакіраваньня Франак Вячорка, на ім парванае адзеньне. Вядома толькі адно прозьвішча супрацоўніка міліцыі, які зьдзяйсьняў затрыманьне ліцэіста – Ліпінскі. Падчас спробы заступіцца за Франака Вячорку затрыманы юрыст Праваабарончага цэнтру “Вясна” Валянцін Стэфановіч. Менавіта ён і паведаміў, знаходзячыся ў міліцэйскай машыне, што там яшчэ акрамя іх з Вячоркам знаходзіцца актывіст моладзевагу руху “Зубр” Яўген Афнагель. Супрацоўнікі міліцыі адабралі плакаты ў моладзі. Удзельнікі акцыі, трымаючы ў руках толькі кветкі, накіраваліся ў сквер Янкі Купалы да помніка беларускаму

песьняру. Падчас руху ў напрамку скверу затрыманы выкладчык ліцэю Лявон Баршчэўскі.

***2 верасьня*** Аляксей Лукашэвіч, юрыст міжрэгіянальнай незарэгістраванай праваабарончай арганізацыі “Вясна Паазерья” аштрафаваны на 3 базавыя велічыні. Штраф быў накладзены адміністратыўнай камісіяй Наваполацкага гарвыканкаму за тое, што 3 ліпеня Лукашэвіч разам з іншымі актывістамі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” праводзіў у Наваполацку грамадзкае галасаваньне адносна трэцяга прэзідэнцкага тэрміну (вынік: 84,17% апытаных -- супраць трэцяга тэрміну). Зьміцер Салаўёў, старшыня арганізацыі “Вясна Паазерья”, падаў скаргу ў суд на рашэньне той жа адміністратыўнай камісіі Наваполацкага гарвыканкаму аб спагнаньні штрафу ў памеры 5 базавых велічыняў, які быў накладзены за тое, што ён распаўсюджваў улёткі супраць трэцяга тэрміну прэзідэнта.

***2 верасьня*** Вінцук Вячорка падаў скаргу ў пракуратуру Цэнтральнага раёну г.Менску на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі, якія затрымлівалі і зьбівалі ягонага непаўнагадовага сына Франака падчас акцыі 1 верасьня “Хочам вучыцца па-беларуску!”.У скарзе гаворыцца: “01.09.2004г. мой сын Францішак Вячорка, 1988 г. нараджэньня, на выхадзе са станцыі метро “Кастрычніцкая” ў раёне Палацу прафсаюзаў каля 16.05 быў затрыманы супрацоўнікамі АМАП у цывільным і дастаўлены ў РУУС Цэнтральнага раёну г.Менску. У працэсе затрыманьня супрацоўнікі міліцыі не прадставіліся, не растлумачылі матывы сваіх дзеяньняў. Майму сыну стала вядома, што ён затрыманы супрацоўнікамі міліцыі, толькі пасьля дастаўкі яго ў РУУС Цэнтральнага раёну. У працэсе затрыманьня невядомыя асобы ў цывільным ужылі супраць непаўнагадовага грубую фізічную сілу, а менавіта – заломвалі рукі, білі па нагах, зьбівалі пры зацягваньні ў аўтобус. Аўтобус ня меў апазнавальных знакаў дачыненьня да органаў унутраных справаў. У аўтобусе майго сына, які ляжаў на падлозе, працягвалі зьбіваць. Падчас затрыманьня майму сыну былі пашкоджаныя кашуля і штаны, далейшае іх выкарыстаньне немагчымае.Таксама ў аўтобус былі зацягнутыя Стэфановіч Валянцін Канстанцінавіч і Афнагель Яўген Ігаравіч. Пасьля дастаўкі ў РУУС Цэнтральнага раёну г.Менску супрацоўнікі міліцыі, не складаючы пратаколаў затрыманьня і пратрымаўшы ня больш за дзьве гадзіны, вызвалілі затрыманых. Падчас затрыманьня майму сыну стала вядома прозьвішча аднаго з тых, хто праводзіў затрыманьне: гэта нехта Ліпінскі, супрацоўнік 8-га ўзводу АМАП ГУУС г.Менску. Яшчэ аднаго супрацоўніка АМАП у чырвонай майцы, які ўдзельнічаў у затрыманьні, ягоныя калегі называлі мянушкай “Маразільнік”. На вуліцы і ў аўтобусе асобы, якія праводзілі затрыманьне, выкарыстоўвалі ў адрас непаўнагадовага нецэнзурную лаянку і выказвалі яму

пагрозы. Супрацоўнікі міліцыі абражалі майго сына, зьневажалі яго чалавечую годнасьць.Трэба адзначыць, што майму сыну так і не растлумачылі прычыну затрыманьня. Акрамя таго, ня быў складзены пратакол аб адміністратыўным затрыманьні, што парушае патрабаваньне арт. 240 КаАП Рэспублікі Беларусь. У парушэньне патрабаваньняў арт. 240 КаАП аб месцазнаходжаньні сына не было паведамлена ні мне, ні маёй жонцы. Лічу, што дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі ў дачыненьні да майго сына зьяўляюцца незаконнымі, перавышаюць службовыя паўнамоцтвы супрацоўнікаў міліцыі і парушаюць Закон Рэспублікі Беларусь "Аб міліцыі", нормы КаАП Рэспублікі Беларусь, законныя правы дзіцяці. Ніякіх законных падставаў, прадугледжаных арт. 19 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб міліцыі", дзеля выкарыстаньня фізічнай сілы з боку супрацоўнікаў міліцыі не было.Таксама незаконна, без складаньня пратаколу выняцьця, былі забраныя асабістыя рэчы майго сына. Ён не аказваў супраціўленьня і іншага супрацьдзеяньня не аказваў. У сувязі з вышэйсказаным, кіруючыся арт. 6 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб міліцыі", Законам Рэспублікі Беларусь "Аб пракуратуры", прашу: 1. Правесьці пракурорскую праверку названых фактаў; 2. Прыцягнуць вінаватых асобаў да вызначанай законам адказнасьці. У працэсе праверкі выкладзеных фактаў апытаць відавочцаў незаконнага затрыманьня майго сына: Стэфановіча Валянціна Канстанцінавіча і Афнагеля Яўгена Ігаравіча".

***3 верасьня*** судзьдзя Наталя Вайцяховіч з Цэнтральнага суду Менску адхіліла скаргу на незаконнае ўтрыманьне пад вартай Міхаіла Марыніча. Вызваленьня Марыніча дамагалася ягоная адвакатка Вера Страмкоўская. Яна спасылалася на адсутнасьць актыўных сьледчых дзеяньняў і аспрэчвала верагоднасьць ягоных уцёкаў з-пад сьледзтва ў выпадку зьмены меры стрыманьня. Судзьдзя пагадзілася з пастановай пракуратуры, паводле якой Міхаіл Марыніч павінен заставацца ў сьледчым ізалятары КДБ да 26 верасьня. Адвакат Вера Страмкоўская сьцьвярджае, што стан здароўя Міхаіла Марыніча ў турме рэзка пагоршыўся: ён пастаянна скардзіцца на боль у сэрцы. На рашэньне Цэнтральнага суда Вера Страмкоўская падала скаргу ў гарадзкі суд Менску.

***3 верасьня*** стала вядома, што Міністэрства юстыцыі другі раз адмовіла ў рэгістрацыі Партыі свабоды і прагрэсу. Старшыня партыі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Навасяд паведаміў, што сваё рашэньне Мінюст матываваў "парушэньнем парадку стварэньня партыі". Спадар Навасяд падкрэсьліў, што пасьля мінулай адмовы ў міністэрства былі прадстаўленыя ўсе дадатковыя дакументы. Гэтым разам прычынай адмовы была названая несапраўднасьць подпісаў. Паводле Уладзіміра Навасяда, з заключэньня Міністэрства юстыцыі вынікае, што ўсе 1000

подпісаў былі праверaныя Інстытутам крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай эксьпертызы.

***3 верасьня*** кіраўнік аддзелу рэгістрацыі і кантролю за выкананьнем заканадаўства аб друку Міністэрства інфармацыі Віктар Гурэцкі пацьвердзіў зьвесткі аб прыпыненьні тэрмінам на 3 месяцы выхаду выданьняў "Время", "Предпринимательская газета" і яшчэ некалькіх недзяржаўных медыяў. Гэткія масавыя санкцыі ў міністэрстве тлумачаць жаданьнем "навесьці парадак" у сферы друкаваных СМІ. Па словах сп-ра Гурэцкага, загад аб прыпыненьні газеты "Время" быў падпісаны 24 жніўня. Выданьне абвінавачваюць у парушэньні артыкулаў 10 і 26 Закону "Аб друку і іншых СМІ": прэтэнзіі міністэрства тычацца юрыдычнага адрасу рэдакцыі, які нібыта няправільна ўказаны ў выходных дадзеных газеты і ўвогуле адсутнічае ў заяве аб рэгістрацыі. Кіраўніцтва рэдакцыі сьцьвярджае, што дагэтуль не атрымала афіцыйнага паведамленьня пра прыпыненьне газеты. "Предпринимательская газета", якая пасьля доўгага перапынку аднавіла працу ўвесну, была прыпыненая 20 жніўня. Выданьне абвінавацілі ў парушэньні арт. 11 Закону аб друку: В. Гурэцкі сказаў, што газета зьмяніла тэматыку (з "вытворча-прававой" на "масава-палітычную"), а таксама перыядычнасьць выхаду, не паведаміўшы пра гэта Міністэрству інфармацыі. (Нагадаем, што "Предпринимательскую газету" ўжо прыпынялі 19 чэрвеня 2003 году, абвінаваціўшы ў распаўсюдзе несапраўдных зьвестак. Санкцыі былі ўжытыя пасьля таго, як газета прадставіла свае плошчы журналістам прыпыненай "БДГ").

***4 верасьня*** рэдакцыя газеты "Время" атрымала па пошце паведамленьне Міністэрства інфармацыі пра тое, што выпуск газеты прыпынены з 24 жніўня. Рэдакцыя сьцьвярджае, што пералічаныя ў загадзе міністра Русакевіча парушэньні адбыліся не па віне газеты, і зьбіраецца абскарджваць дзеяньні Мініінфармацыі. У загадзе гаворыцца, што з 1 жніўня 2004 г. была скасаваная дамова арэнды памяшканьня, заключаная паміж ААТ "Белремстройсвязь" і прыватным унітарным прадпрыемствам "Издательский дом "Время", які выступае ў якасьці рэдакцыі газеты. Падставай для папярэджаньня і прыпыненьня выданьня стала тое, што рэдакцыя выпусьціла 2 нумары (12 і 19 жніўня) з указаньнем несапраўднага адрасу, што зьяўляецца парушэньнем арт. 10 і 26 Закону аб друку. Паводле намесьніка дырэктара выдавецкага дому "Время" А. Цынкевіча, у рэдакцыі нічога ня ведалі пра скасаваньне дамовы арэнды: ліст, у якім ААТ "Белремстройсвязь" паведамляў пра гэта арандатару, быў адпраўлены толькі 19 жніўня, і гэта пацьвярджаецца ўсімі паштовымі дакументамі. У той жа дзень выдавецкі дом заключыў новую дамову арэнды і ў наступным нумары газеты ўказаў ужо новы адрас. "Газета нічога не

парушыла, – упэўнены А. Цынкевіч. – Для прыпыненьня выданьня ў міністэрства не было ніякіх законных падставаў". Ён мяркуе, што дзеяньні Мінінфармацыі зьвязаныя з набліжэньнем парламенцкіх выбараў, а таксама, магчыма, з правядзеньнем "яшчэ нейкіх палітычных мерапрыемстваў" у краіне.

***6 верасьня*** пракурор Эдуард Панасюк запатрабаваў асудзіць старшыню агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага да трох гадоў пазбаўленьня волі ў калоніі агульнага рэжыму за абразу гонару і годнасьці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Намесьніка старшыні страйкаму прадпрымальнікаў Аляксандра Васільева – да трох гадоў пазбаўленьня волі ў калоніі агульнага рэжыму і двух гадоў за арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця і мітынгу ў Гародні 1 траўня. З-за паглынаньня меншага тэрміну большым, пракурор запатрабаваў асудзіць А.Васільева да трох гадоў калоніі.

***6 верасьня*** ў кавярні заводу “Амкадор” на менскай вуліцы Гікалы сабраліся некалькі дзесяткаў крышнаітаў, каб адзначыць сваё сьвята і раздаць традыцыйныя пачастункі мінакам. Аднак супрацоўнікі Савецкага РУУС запатрабавалі ад іх разысьціся. Разам з міліцыянтамі былі людзі ў цывільным, якія адмовіліся паказаць дакументы. Сябры крышнаіцкай суполкі падпарадкаваліся міліцыі, якая пагражала затрымаць іх з прычыны адсутнасьці дазволу Менскага гарвыканкаму на правядзеньне сходу. Цяпер крышнаіты зьбіраюцца падаць у пракуратуру скаргу на дзеяньні міліцыянтаў.

***6 верасьня*** стала вядома, што Беларускае прадстаўніцтва амерыканскага грамадзкага "Аб’яднаньня камітэтаў у абарону яўрэяў у былым Савецкім Саюзе" (UCSJ) зьбіраецца абскардзіць у судзе адмову Міністэрства замежных справаў Беларусі працягнуць тэрмін рэгістрацыі. Па словах юрыста прадстаўніцтва Артур Ліўшыца, тэрмін папярэдняй рэгістрацыі скончыўся 14 жніўня, і МЗС адмовіўся яго працягваць. Па ягоных словах, на працягу трох гадоў прадстаўніцтва выканала значную працу: “Сумесна з беларускімі і замежнымі гісторыкамі прадстаўніцтва выдала два зборнікі "Беларусь у XX стагоддзі", удзельнічала ў арганізацыі навуковых канферэнцый, дасьледаньняў у галіне гісторыі беларускіх яўрэяў і ва ўшанаваньні ахвяраў Халакосту”.

***7 верасьня*** старшыня агульнарэспубліканскага страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі і яго намесьнік Аляксандр Васільеў былі асуджаныя Ленінскім судом г.Гародні да двух гадоў пазбаўленьня волі за абразу Аляксандра Лукашэнкі, зьвязаную з абвінавачаньнямі ва ўчыненьні цяжкага злачынства (арт. 368, ч. 2 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь -- "публічная абраза прэзідэнта

Рэспублікі Беларусь"). Аляксандр Васільеў асуджаны яшчэ і за арганізацыю акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 1 траўня. Суд таксама пастанавіў канфіскаваць “на карысьць дзяржавы” кампутары, забраныя ў Леванеўскага і Васільева. Апрача гэтага, кожны з іх абавязны сплаціць судовыя выдаткі ў памеры 643 тыс. 278 рублёў (300 даляраў ЗША).

***7 верасьня*** Вярхоўны суд пакінуў у сіле папярэджаньне, вынесенае Партыі камуністаў Беларускай Міністэрствам юстыцыі. Суд пагадзіўся з міністэрскімі чыноўнікамі, якія прыйшлі да высновы, што партыя ўдзельнічае ў незарэгістраванай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” і заклікала людзей браць удзел у несанкцыянаваным пікеце салідарнасьці з газетай “Народная воля”. Кіраўніцтва партыі спрабавала даказаць, што гэтае папярэджаньне неабгрунтаванае, паколькі ПКБ не прымала рашэньняў ні аб уваходзе ў кааліцыю, ні аб удзеле ў акцыі. Вярхоўны суд не прызнаў гэтых аргументаў слушнымі. Лідэр ПКБ Сяргей Калякін лічыць, што гэта толькі пачатак наступу на апазіцыйныя палітычныя партыі: “Я разумею, навошта гэта зроблена. Наступным крокам будзе атака на партыі, забарона партыяў за тое, што яны стварылі, з пункту гледжаньня суда, незаконную кааліцыю”.

***7 верасьня*** ў 21.00 усе чатыры беларускія тэлеканалы — БТ, “Лад”, ОНТ і СТВ — трансьлявалі зварот кіраўніка дзяржавы. У сваім тэлевізійным звароце Лукашэнка абвесьціў правядзеньне рэферэндуму, каб застацца прэзідэнтам на трэці тэрмін насуперак Канстытуцыі. Нагадаем, у 81-м артыкуле беларускай Канстытуцыі запісана: "Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў... Адна і тая ж асоба можа быць прэзідэнтам ня больш, чым два тэрміны". Як вядома, Аляксандр Лукашэнка ўжо двойчы абіраўся прэзідэнтам Беларусі – на выбарах 1994 і 2001 гадоў. Аляксандр Лукашэнка прызначыў рэферэндум на 17 кастрычніка, той самы дзень, калі адбудуцца выбары ў беларускі парламент. Фармулёўка пытаньня, якое выносіцца на рэферэндум, гучыць наступным чынам: "Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку ўдзельнічаць ў якасьці кандыдата на Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта, і ці прымаеце частку першую артыкулу 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: "Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і наўпроставага выбарчага права таемным галасаваньнем?".

***7 верасьня*** на Кастрычніцкай плошчы Менску павінен быў прайсьці антытэрарыстычны мітынг у знак салідарнасьці з пацярпелымі падчас тэрактаў у Беслане. З гэтай нагоды на плошчы сабралі навучэнцаў некалькіх школаў і каледжаў гораду разам з выкладчыкамі, а таксама актывістаў БРСМ. У 21.00 перад сабранымі

на ўсталяваным на плошчы тэлеэкране трансьляваўся зварот Лукашэнкі пра рэферэндум аб працягненьні прэзідэнцкіх паўнамоцтваў. Пасьля заканчэньня трансьляцыі два дзесяткі маладых людзей пачалі скандаваць “Ганьба!”. Да іх падбеглі супрацоўнікі АМАПу і міліцыі ў цывільным. У выніку быў затрыманы актывіст “Маладога Фронту” Зьміцер Дашкевіч, якога літаральна на руках унесьлі ў аўтобус і павезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну г. Менску.

***7 верасьня*** стала вядома, што актывіста "Маладога Фронту" з Жодзіна Сяргей Савіча, які ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі, выключылі з акадэміі ўнутраных справаў. Кіраўніцтва акадэміі лічыць несумяшчальнымі навучаньне і палітычную дзейнасьць. Сяргей Савіч, які вучыўся на факультэце права, улетку браў удзел у акцыі пратэсту супраць разьмяшчэньня пад Ганцавічамі расійскай вайсковай радыёлакацыйнай станцыі. Цяпер займаецца выбарчымі справамі. Сяргей Савіч правучыўся ў міліцэйскай акадэміі два гады. Ён меў намер стаць дэпутатам Жодзінскага гарсавету і дапамагчы абрацца ў Палату прадстаўнікоў лідэру філіі “Маладога Фронту” Паўлу Красоўскаму.

***8 верасьня*** Міжнародная Хельсінкская Федэрацыя асудзіла прысуд Валерыю Леванеўскаму і Аляксандру Васільеву. Выканаўчы дырэктар Федэрацыі Аарон Роўдз назваў судовы працэс у Гародні палітычна матываваным. Міжнародная Хельсінкская Федэрацыя адзначыла, што беларускія ўлады парушаюць права ствараць апазіцыйную партыю ды арганізоўваць страйкам.

***8 верасьня*** актывіст “Маладога Фронту” Зьміцер Дашкевіч судом Цэнтральнага раёну г. Менску асуджаны на 10 сутак адміністратыўнага арышту за ўдзел у мітынгу 7 верасьня на Кастрычніцкай плошчы сталіцы. Малады чалавек быў затрыманы падчас мітынгу і ўсю ноч правёў у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на вул. Акрэсьціна.

***8 верасьня*** каля 20 гадзінаў у Жодзіне пры расклейцы ўлётак з надпісам “Супраць трэцяга тэрміну” быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі вучань 11 класу, сябра “Маладога Фронту” Яўген Валкавец. Пракурор г. Жодзіна В. Літвіненка палічыў, што сваімі дзеяньнямі Яўген парушыў ч.8 арт. 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь, паколькі на ўлётках адсутнічалі выходныя дадзеныя, і ўзбудзіў у адносінах да маладафронтаўца адміністратыўную справу аб парушэньні арт. 167-3 КаАП. Матэрыялы справы накіраваныя ў суд.

***8 верасьня***, у Міжнародны дзень салідарнасьці журналістаў, прадстаўнікі расейскага тэлеканалу ОРТ уручылі прэміі імя Дзьмітрыя Завадзкага "За мужнасьць і прафесіяналізм" сваім беларускім калегам. Лаўрэатамі гэтай узнагароды сталі

Марына Коктыш, інфармацыйнае агенцтва БелаПАН (кіраўнік Алесь Ліпай), Леанід Міндлін, Ірына Халіп.

***8 верасьня*** ў Менску быў зьбіты праваабаронца Валеры Шчукін. Увечары на яго напалі два чалавекі і нанесьлі некалькі ўдараў па галаве. Нічога з рэчаў не было скрадзена. Сам Валеры Шчукін зьвязвае напад са сваімі выступамі супраць рэферэндуму аб працягненьні прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі.

***9 верасьня*** восем чалавек затрыманыя за распаўсюд газеты “Зубр”: каардынатар руху “Зубр” Аляксей Шыдлоўскі, прэс-сакратар Аляксандр Атрошчанкаў, актывісты руху Надзея Халадзінская, Марына Лебедзева, Максім Громаў, Дар’я Малдаванава і Аляксандр Ушко. На ўсіх складзеныя пратаколы па арт. 172 КаАП (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных).

***9 верасьня*** адна з фракцыяў Еўрапейскага парламенту вылучыла беларускі моладзевы рух “Зубр” на прэмію Сахарава, якой парламент штогод узнагароджвае змагароў за правы чалавека ў сьвеце. Вось як патлумачыў гэтую намінацыю адзін з сяброў фракцыі “Саюз за Еўропу нацыяў”, польскі дэпутат Конрад Шыманскі: “Я думаю, што парушэньні правоў чалавека і палітычных правоў у Беларусі, каля межаў Еўрасаюзу, павінны быць сярод нашых прыярытэтаў. І гэта галоўная прычына намінаваць "Зубр" на гэтую ўзнагароду. Другая прычына – увогуле прыцягнуць увагу еўрапейскіх палітыкаў да падзеяў у Беларусі. На жаль, вельмі часта еўрапейскія палітыкі глядзяць удалечыню і ня бачаць, што ў адносінах да найбліжэйшых суседзяў мы маем вялікія праблемы, і адпаведна, вялікую адказнасьць".

***9 верасьня*** ў Ісык-кулі падчас правядзеньня 2-й рэгіянальнай сустрэчы НДА Цэнтральнай Азіі і Еўропы "Грамадзянскія масты" адбылася кароткая сустрэча беларускіх праваабаронцаў з Праваабарончага цэнтру "Вясна" Алеся Бяляцкага і Валянціна Стэфановіча з былым прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным. На пытаньне праваабаронцаў, як Б.Ельцын ставіцца да абвешчанага А.Лукашэнкам рэферэндуму аб магчымасьці для яго ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах у трэці раз, былы расійскі прэзідэнт адказаў коратка: "Отрицательно. Менять Конституцию под себя — это недостойно для настоящего политика".

***10 верасьня*** лідэр агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі абвясьціў галадоўку ў сьледчым ізалятары г. Гародні ў сувязі з тым, што яго перавялі ў другую камеру са значна горшымі ўмовамі, чым у той, дзе ён знаходзіўся раней.

***10 верасьня*** амбасада Злучаных Штатаў Амерыкі выказала вялікую занепакоенасьць у сувязі з нядаўнім судом і прысудам Аляксандру Васільеву і Валерыю Леванеўскаму. І “злачынства” – публікацыя вершу, і “пакараньне” -– два гады папраўчых работ — выглядаюць як грандыёзная маніпуляцыя беларускім правасудзьдзем, накіраваная на падаўленьне свабоды слова беларускіх грамадзянаў. Амбасаду таксама непакоіць тое, што судзьдзя не дазволіў прадстаўнікам абароны выклікаць сьведкаў. Ніводны працэс ня можа быць справядлівым, калі прадстаўнікам абароны не дазволена прадставіць свае аргументы і калі прадстаўлены толькі адзін пункт гледжання. Дзеяньні беларускіх судовых уладаў супраць гэтых двух палітычных дзеячоў выглядаюць палітычна матываванымі і выклікаюць сур’ёзныя сумненні наконт намеру беларускіх уладаў дазволіць адкрыты палітычны працэс напярэдадні парламенцкіх выбараў у Беларусі.

***10 верасьня*** аўтарытэтная праваабарончая арганізацыя "Міжнародная Амністыя" асудзіла прысуд, вынесены 7 верасьня старшыні агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыю Леванеўскаму і яго намесьніку Аляксандру Васільеву. "Міжнародная Амністыя" прызнала гэтых людзей вязьнямі сумленьня.

***10 верасьня*** стала вядома, што паездка прадстаўніка АБСЕ па пытаньнях свабоды СМІ Міклаша Харашці ў Беларусь, якая была запланаваная на пачатак верасьня, можа ўвогуле не адбыцца. М.Харашці меў намер падчас візіту вывучыць сітуацыю з мас-медыя ў Беларусі і даць ёй ацэнку ў адмысловай справаздачы. Яшчэ ў пачатку ліпеня сп-р Харашці паведаміў міністру замежных справаў Беларусі, а таксама афіцыйнаму прадстаўніку Беларусі ў АБСЕ Віктару Гайсёнку пра свой намер наведаць Беларусь. У ліпені-жніўні ён неаднаразова абмяркоўваў дэталі візіту з прадстаўнікамі Беларусі ў Вене і беларускім МЗС у Менску. Па просьбе беларускіх уладаў візіт быў перанесены на больш позьні тэрмін – з тым, каб сумясьціць яго з правядзеньнем у Менску семінару па праблемах СМІ. Затым беларускі бок прапанаваў зьмяніць структуру семінару, аб’яднаўшы яго з іншай сустрэчай. Праз пэўны час семінар па праблемах СМІ быў наогул адменены. Тым ня менш, сп-р Харашці па-ранейшаму зьбіраўся наведаць Беларусь. Каб атрымаць уязную візу ў нашую краіну, прадстаўніку АБСЕ трэба дачакацца папярэдняй згоды ад афіцыйнага Менску. Аднак ніякага адказу на гэты конт ён не атрымаў. Нагадаем, што ў верасьні 2003 г. у падобнай сітуацыі апынуўся былы прадстаўнік АБСЕ па пытаньнях свабоды прэсы Ф. Дувэ, на чый візіт беларускія ўлады таксама не далі згоды."Адсутнасьць адказу на дыпламатычнай мове заўсёды абазначае адмову. Тое, што на працягу году прадстаўнікі АБСЕ па пытаньнях свабоды СМІ ня могуць трапіць у Беларусь, можна патлумачыць толькі тым, што сітуацыя са свабодай слова ў нас сапраўды крызісная",

– так пракаментавала падзею старшыня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Жана Літвіна.

***11 верасьня*** ў Гомелі супрацоўнікі мясцовага ўпраўленьня КДБ і міліцыі сарвалі семінар маладых сацыял-дэмакратаў, прысьвечаны рэферэндуму і парламенцкім выбарам. У актавай зале гатэлю “Кастрычніцкі”, дзе ладзіўся семінар, сьпецслужбы ўчынілі дагляд ягоных удзельнікаў. Асаблівую цікавасьць супрацоўнікі КДБ праявілі да госьця семінару, маладога сацыял-дэмакрата са Швецыі Альбэна Далена. Яго завялі ў асобны кабінет і здымалі на відэакамеру.

***13 верасьня*** лідэр барысаўскага маладзёвага цэнтру "Волат" Зьміцер Барадка быў вымушаны напісаць заяву пра звальненьне з пасады гандлёвага прадстаўніка кандытарскай кампаніі "Ивкон". Заяву прымусіла пісаць кіраўніцтва кампаніі, якое паведаміла, што з таго часу, як іх супрацоўнік заявіў пра намер балатавацца ў дэпутаты, на кіраўнікоў кампаніі аказваецца моцны ціск з боку афіцыйных уладаў.

***13 верасьня*** Польскі Сейм асудзіў парушэньні правоў чалавека ў Беларусі. “Польскі Сейм з занепакоенасьцю глядзіць на апошнія падзеі ў Беларусі, якія сьведчаць аб парушэньнях правоў чалавека і абмежаваньнях правоў беларускіх грамадзянаў”, гаворыцца ў заяве польскага Сейму. Польскія парламентары ўнесьлі ў тэкст дакументу канкрэтныя выпадкі, як забарона Беларускай партыі працы і ліквідацыя Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту. У заяве гаворыцца, што ў камуністычныя часы падтрымка Захаду была вельмі важная для польскіх дэмакратычных сілаў, таму цяпер яны салідарызуюцца з тымі беларусамі, хто змагаецца за свабоду і дэмакратыю ў сваёй краіне.

***13 верасьня*** кіраўніцтву трох беларускіх тэлеканалаў: Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі РБ, ЗАТ “Другі нацыянальны тэлеканал, ЗАТ “Сталічнае тэлебачаньне” – Зінаіда Ганчар накіравала запыты з просьбай прадаставіць ёй магчымасьць 16 верасьня, у пятую гадавіну выкраданьня яе мужа Віктара Ганчара, выступіць на гэтых тэлеканалах. Зінаіда Ганчар чакае адказу ад службовых асобаў тэлеканалаў, на які яна мае права разьлічваць згодна з законам “Аб зваротах грамадзянаў”.

***13 верасьня*** Рэспубліканскае грамадзкае аб’яднаньне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" накіравала лісты ўладам у сувязі з актам вандалізму на надмагільным помніку Народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу, пахаванаму на Вайсковых могілках у Менску. На помніку былі зробленыя надпісы чорнага колеру гатычным шрыфтам.

***14 верасьня*** супрацоўнікі крымінальнага вышуку Цэнтральнага аддзелу міліцыі Менску спынілі каардынатараў моладзевага руху “Зубр” Аляксея Ляўковіча і Мікіту Сасіма на вуліцы і абшукалі іх. У сумках знайшлі некалькі асобнікаў газеты “Зубр”. Нягледзячы на тое, што хлопцы газетаў не распаўсюджвалі, міліцыянты склалі пратаколы за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Аляксея Ляўковіча суд аштрафаваў на 30 базавых велічыняў.

***14 верасьня*** Салігорскі суд аштрафаваў удзельнікаў несанкцыянаванай акцыі Яўгена Валадзько, Сяргея Ададурава і Вячаслава Сінгарава. Дзень таму ля будынку гарвыканкаму яны правялі пікет супраць рэферэндуму пра падаўжэньне прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. Судзьдзя Салігорскага гарадзкога суда Таццяна Лапанік, якая разглядала справу, паведаміла, што акцыя на цэнтральнай плошчы гораду прызнаная незаконнай, і таму яе ўдзельнікі аштрафаваныя на 20 базавых велічыняў кожны.

***14 верасьня*** прадстаўнікі Асамблеі дэмакратычных няўрадавых аб’яднаньняў прэзентавалі ў Менску кнігу “Сьведчаньні перасьледу беларускіх няўрадавых арганізацыяў”. У выданьні паведамляецца пра факты перасьледу няўрадавых арганізацыяў з боку ўладаў і нагадваюцца прозьвішчы чыноўнікаў, якія да гэтых фактаў спрычыніліся. За 2003-2004 гады беларускія суды розных інстанцыяў па просьбе Міністэрства юстыцыі ліквідавалі 56 няўрадавых арганізацыяў. Яшчэ 78 пад ціскам уладаў былі вымушаныя самаліквідавацца. Прадстаўнікі Асамблеі вырашылі сабраць у адной кнізе ўсе факты і прычыны ліквідацыі недзяржаўных аб’яднаньняў, а таксама апублікаваць новыя дакументы, якія сьведчаць аб сапраўдных прычынах ліквідацыі і адмове ў рэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў. Акрамя гэтага, у кнізе зьмешчаная частка службовай перапіскі міністра юстыцыі Віктара Галаванава з намесьнікам кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Алегам Праляскоўскім, які ўзначальвае адмысловую Камісію па рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў. Міністр называе Праляскоўскаму арганізацыі, якія можна зарэгістраваць (у асноўным спартовыя клубы), і якія рэгістраваць нельга (гэта пераважна арганізацыі, заснавальнікамі якіх зьяўляюцца апазіцыйна настроеныя грамадзкія дзеячы). Некаторыя арганізацыі, як, напрыклад, “Аб’яднаньне прадпрымальнікаў Магілёўскай вобласьці”, міністр Галаванаў просіць зарэгістраваць таму, што за яго хадайнічае старшыня Магілёўскага аблвыканкаму Барыс Батура.

***15 верасьня*** навучэнцаў Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа зноў намагаюцца пазбавіць памяшканьня. Міліцыянты разам з начальнікам менскага ЖЭС №5 наведалі кватэру, у якой дзеці атрымліваюць кансультацыі выкладчыкаў і робяць хатнія заданьні. Яны патрабавалі, каб дзеці пакінулі

памяшканьне, але тыя не падпарадкаваліся. Кватэру ў доме на праспекце Францішка Скарыны арэндуе Віктар Савіцкі, бацька ліцэісткі Каці Раковіч. Дзеці прыходзілі на кватэру, каб сустрэцца там з выкладчыкамі для кансультацыяў. Жыхаркі пад’езду, калі даведаліся, што гэта навучэнцы таго самага закрытага ліцэю, напісалі заяву ў выканкам. Выкладчыкам яны патлумачылі, што дзеці ім не перашкаджаюць, але дакласьці пра гэта ўладам для іх — справа прынцыпу. Начальнік ЖЭС папярэдзіў, што абавязкова знойдзе доказы нямэтавага выкарыстаньня жыльля і на гэтай падставе выселіць арандатара.

***15 верасьня*** Беларускі Хельсінкскі камітэт зьвярнуўся ў Вярхоўны суд з патрабаваньнем прызнаць дзеяньні Аляксандра Лукашэнкі па выданьні Указу №431 "Аб прызначэньні рэспубліканскага рэферэндуму" неправамоцнымі і прызнаць дадзены Указ нядзейсным з моманту яго выданьня. БХК зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд, а таксама да Палаты прадстаўнікоў, Савету Рэспублікі, Вышэйшага гаспадарчага суда, Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь – да органаў, надзеленых правам звароту ў Канстытуцыйны суд, -- з просьбай узьняць пытаньне пра адпаведнасць Указу Канстытуцыі. Хельсінкскі камітэт нагадаў, што дзеяньні па зьменах канстытуцыйнага ладу і дасягненьню дзяржаўнай улады гвалтоўнымі метадамі, а таксам шляхам парушэньня законаў Рэспублікі Беларусь, могуць быць кваліфікаваныя як захоп альбо ўтрыманьне ўлады неканстытуцыйным шляхам.

***16 верасьня*** “Задзіночаньне беларускіх студэнтаў” арганізавала акцыю "Шэсьце бяздомных студэнтаў", прысьвечаную актуальнай праблеме беларускага студэнта – праблеме інтэрнатаў. Акцыя "Шэсьце бяздомных стэдэнтаў" мела на мэце прыцягнуць увагу да праблемаў і недасканаласьці сістэмы адукацыі. Улады краіны робяць прыгожыя заявы з экранаў тэлевізараў пра штогадовае павелічэньне колькасьці студэнтаў з сельскай мясцовасьці. Пры гэтым нічога ня робіцца, каб забясьпечыць іх жыльлём на час навучаньня. Удзельнікі акцыі разам з сімваламі бяздомнага жыцьця (раскладушкамі, намётамі, спальнікамі, рондлямі, лямпамі, лыжкамі і г.д.) планавалі прайсьці па шляху Чыгуначны вакзал (прытулак бяздомных) – Фізічны корпус БДУ, БДПУ ім. М.Танка – Міністэрства адукацыі (вул. Савецкая 9). Але акцыя была перапыненая каля Фізічнага корпусу БДУ – супрацоўнікі міліцыі затрымалі некалькіх чалавек, якія несьлі раскладушку. Затрыманыя разам з раскладушкай былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну г.Менску. Сярод затрыманых — Сяржук Семянюк, сябра Рады ЗБС, Юры Сідун, сістэмны адміністратар ЗБС, Алесь Васілеўскі. Ім прад’яўленае абвінавачаньне ў парушэньні артыкулу 166 Адміністратыўнага кодэксу – супраціўленьне патрабаваньням міліцыі.

***16 верасьня*** галоўнага рэдактара гарадзенскай незалежнай газеты “Биржа информации” Алену Раўбецкую абвінавацілі ў распаўсюдзе зьвестак, зьневажаючых гонар і годнасьць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Алену Раўбецкую выклікалі ў Ленінскую раённую пракуратуру з нагоды публікацыі ў нумары за 9 верасьня, прысьвечанай абвешчанаму рэферэндуму. На журналістку заведзеная справа паводле артыкулу 172 ч.10 Адміністратыўнага кодэксу (распаўсюд зьвестак, зьневажаючых гонар і годнасьць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Па словах Алены Раўбецкой, прэтэнзіі былі прад’яўленыя да словаў яе матэрыялу: “Рэферэндум (а без яго трэцяга тэрміну не атрымаць), абвешчаны спадаром прэзідэнтам – гэта выклік грамадзтву. Трэба мець ня толькі адсутнасьць сумленьня, але і "панскую" пагарду да плебсу…". Справа адразу перададзеная ў суд. Алене Раўбецкай пагражае штраф ад 50 да 100 базавых велічыняў.

***16 верасьня***, у пятую гадавіну з дня гвалтоўнага выкраданьня віцэ-сьпікера Вярхоўнага Савету 13 скліканьня Віктара Ганчара і кіраўніка фірмы "Красіка" Анатоля Красоўскага, каля Рэспубліканскай пракуратуры ў Менску затрыманыя праваабаронцы Тацяна Рэвяка (Праваабарончы цэнтр "Вясна") і Гары Паганяйла (Беларускі Хельсінкскі камітэт). Правабаронцы былі затрыманыя падчас акцыі, мэтай якой было патрабаваньне аб’ектыўнага расьсьледваньня абставінаў гвалтоўных выкраданьняў. Жонка Віктара Ганчара Зінаіда і праваабаронцы прыйшлі да Рэспубліканскай пракуратуры ў 8.30 – у той час, калі супрацоўнікі пракуратуры ідуць на працу. Тацяна Рэвяка раздавала супрацоўнікам пракуратуры кнігу "Беларусь: нераскрытыя злачынствы навейшай гісторыі", у якой надрукаваная справаздача сьпецыяльнага дакладчыка палітычнага камітэту ПАРЕ Хрыстаса Пургурыдэса "Пра зьніклых асобаў у Беларусі" з доказамі датычнасьці да злачынстваў прадстаўнікоў афіцыйных уладаў, у тым ліку і Генеральнага пракурора Віктара Шэймана. Праз дваццаць хвілінаў Тацяна Рэвяка і Гары Паганяйла былі затрыманыя супрацоўнікамі АМАПу і дастаўленыя ў Цэнтральны РУУС г. Менску, дзе на іх былі складзеныя пратаколы па арт. 172.3 (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных).

***16 верасьня*** ўвечары на стужцы навінаў БЕЛТА зьявілася інфармацыя, што Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь накіравала ў Вярхоўны суд зыск аб ліквідацыі Рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня "Беларускі Хельсінкскі камітэт". БХК абвінавачаны ў шматлікіх і сістэматычных парушэньнях Канстытуцыі, заканадаўства аб грамадзкіх арганізацыях і ўласнага Статуту. У чым абвінавачвае Міністэрства юстыцыі сяброў Хельсінкскага камітэту, яны ведаюць толькі з паведамленьня БЕЛТА, паколькі ніякіх афіцыйных папераў пакуль не атрымлівалі. Распавядае юрыст праваабарончай арганізацыі Алег Гулак: “Мінюст падкрэсьлівае,

што БХК парушыў артыкулы 5, 52 і 53 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Артыкул 5 гаворыць, што ўсе партыі і грамадзкія аб’яднаньні дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і законаў, а дзейнасьць грамадзкіх аб’яднаньняў і партыяў, якія маюць за мэту прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай ці рэлігійнай варожасьці, забароненая. Якім чынам гэта датычыць нашай дзейнасьці – мы пакуль патлумачыць ня можам. У артыкуле 52 сказана, што кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны выконваць Канстытуцыю і законы, паважаць нацыянальныя традыцыі, у артыкуле 53 – кожны павінен паважаць годнасьць, правы і законныя інтарэсы іншых людзей. Тут, відаць, маецца на ўвазе, што мы правы прэзідэнта не паважаем. Што датычыць наступных абвінавачаньняў – у парушэньні артыкулаў 4 і 5 Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, дзе гаворыцца, што мы павінны будаваць сваю дзейнасьць на падставе Канстытуцыі і Статуту, а таксама ня ўмешвацца ў дзейнасьць дзяржаўных органаў і службовых асобаў, то атрымліваецца, што мы гэта ўжо зрабілі – умяшаліся. Нам будзе цікава паглядзець, якім чынам у самой зыскавай заяве гэтыя абвінавачаньні будуць раскрытыя, якая будзе матывацыя”. Алег Гулак упэўнены, што Мінюст таксама разумее, што такія абвінавачаньні проста “прыцягнутыя за вушы”, таму ў яго выклікае зьдзіўленьне сьцьверджаньне пра “сістэматычнае” парушэньне грамадзкім аб’яднаньнем заканадаўства. Праваабаронца гаворыць, што чыноўнікам з Мінюсту павінна быць добра вядома, што з 1995 году, за 9 гадоў свайго існаваньня, арганізацыя мела толькі 2 папярэджаньні, апошняе з якіх — летам 2003 году, якое ўжо ня мае ніякай юрыдычнай сілы, і гэта нельга лічыць "сістэматычным". “Праблемы з падаткамі, якія БХК меў на працягу мінулага году, мы пераадолелі, дабіліся прызнаньня нашага права праз суд, таму гэта проста лухта і мана, што мы сістэматычна парушаем заканадаўства, — гаворыць Алег Гулак. — Акрамя таго, бачачы, што і гэтага недастаткова, Мінюст сьцьвярджае, што дзейнасьць БХК “ня мае нічога агульнага з умацаваньнем дэмакратыі, абаронай правоў і свабодаў грамадзянаў, што супярэчыць прынцыпам, сфармуляваным у заключным акце паседжаньня па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе і мэтам, да якіх імкнецца АБСЕ”. Па ўсім бачна, суду было відавочна, што гэтую справу разглядаць будзе цяжка, і ён вырашыў вярнуць зыск на дапрацоўку”.

***16 верасьня***, у пятую гадавіну выкраданьня Віктара Ганчара ягоная жонка Зінаіда Ганчар накіравала зварот да прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. У звароце гаворыцца: “Паважаны Уладзімір Уладзіміравіч! Падзеі, якія адбыліся ў Расіі за апошні час, не пакінулі абыякавымі нікога, у тым ліку і маю сям’ю. Я і мой сын нарадзіліся ў Расіі, там да гэтага часу жыве мая маці, таму ўсё, што там адбываецца, мы прапускаем праз сваё сэрца. Нам як нікому зразумелыя боль і пакуты людзей,

якія перажылі тэракты і страцілі сваіх блізкіх. Вось ужо пяць гадоў, як мы, родныя і блізкія Віктара Ганчара, выкрадзенага 16 верасьня 1999 году, знаходзімся ў становішчы закладнікаў палітычнага тэрору, які ажыцьцяўляецца ў адносінах да нашай сям'і. Вось ужо пяць гадоў мы намагаемся знайсьці адказы на пытаньні: дзе наш муж, бацька і сын, які ягоны лёс і хто вінаваты ў ягоным выкраданьні. Усе гэтыя гады мы сутыкаемся з глухой сьцяной маўчаньня і бязьдзеяньня з боку беларускага кіраўніцтва і праваахоўных органаў краіны. Просім Вас як чалавека, які мае вялікі аўтарытэт у сьвеце, чалавека, які сваімі вачыма бачыў сьлёзы, боль і пакуты, чалавека, у якога ёсьць сям'я і дзеці, выкарыстаць свае магчымасьці дзеля аказаньня дапамогі ў найцяжэйшай для нас сітуацыі".

***16 верасьня*** ў Стакгольме каля будынку парламента Швецыі прайшоў пікет з нагоды пяці гадоў зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Пікет арганізавалі беларусы, якія жывуць у гэтай краіне. Разам з імі ў пікеце, які працягваўся гадзіну, у знак салідарнасьці знаходзіліся і дэпутаты швецкага парламенту Сесілія Вігстром ад Ліберальнай партыі, Лейф Бьёрнлуд ад Партыі зялёных і сацыял-дэмакрат Урбан Алін, старшыня парламенцкай камісіі па міжнародных справах. У руках удзельнікі акцыі трымалі партрэты зьніклых, нацыянальныя сьцягі, а мінакам раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра зьніклых беларускіх палітыкаў – апанентах сёньняшняму рэжыму. Як заявіла Сесілія Вігстром, якая тройчы была ў Беларусі, швецкія палітыкі заклапочаныя сітуацыяй у краіне.

***16 верасьня*** ў Салігорску падчас акцыі, прымеркаванай да пятай гадавіны зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, былі затрыманыя Яўген Валадзько і Уладзімір Пятровіч, якіх даставілі ў Салігорскі ГРУУС, дзе былі складзеныя пратаколы пра адміністратыўнае правапарушэньне.

У ***ноч з 16 на 17 верасьня*** ў Менску ў раёне вул. Раманаўская слабада за расклейку самаробных улётак супраць рэферэндуму затрыманыя Аляксей Чарняеў і Алена Валынец-Чарняева. Яны былі дастаўленыя ў РУУС Маскоўскага раёну, дзе быў складзены пратакол па арт.143 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях (антысанітарыя). Праз гадзіну затрыманых адпусьцілі.

***17 верасьня*** таварыства "Альянс-медыя", заснавальнік газеты "Обозреватель", зьвярнулася ў суд Ленінскага раёну Менску з зыскам аб кампенсацыі каля 1 мільёну рублёў дадатковых судовых выдаткаў па справе, зьвязанай з артыкулам у недзяржаўнай газеце "Народная воля" "Как "Обозреватель" Сергея Атрощенко по-бандитски обошелся с Леонидом Левиным". У лютым суд Ленінскага раёну Менску

часткова задаволіў зыск Сяргея Атрошчанкі да “Народнай волі”. Газета зьвярнулася з касацыйнай скаргай, якую суд не задаволіў. Таварыства “Альянс-медыя”, якім валодае Сяргей Атрошчанка, сьцьвярджае, што судовыя выдаткі ў выніку разгляду касацыйнай скаргі склалі 836 тысячаў рублёў, і хоча спагнаць іх з “Народнай волі”.

***17 верасьня*** у Магілёве за распаўсюд друкаванай прадукцыі затрыманыя актывісты маладзёвага руху “Зубр” Мікалай Ільін, Яўген Сувораў і яшчэ адзін непаўнагадовы. Яны былі затрыманыя пасьля таго, як раздалі газеты “Зубр” ва ўнiверсiтэце. У Цэнтральным РУУС г.Магілёву ў адносінах “зуброўцаў” былі складзеныя пратаколы па арт.172 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных). Супрацоўнікі міліцыі сказалі затрыманым, каб чакалі позваў у суд і паведамілі, што падчас таго, як яны раздавалі газеты, вяліся аператыўная відэаздымкі.

***17 верасьня*** восем актывістаў моладзевага руху “Зубр” былі затрыманыя падчас канцэрту Вячаслава Бутусава ў Менску. Дар’я Малдаванава, Аляксандр Ушка, Мікіта Сасім, Максім Громаў затрыманыя за тое, што падчас выступу рок-музыканта ўзьнялі тры сьцягі з лагатыпам руху “Зубр”. Алена Корбач, Зінаіда Крыванос, Арцём Салаўёў былі затрыманыя за распаўсюд газеты “Зубр”.

***17 верасьня*** Камітэт па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы і Генеральны сакратар ПАРЕ Тэры Дэвіс падвергнулі рэзкай крытыцы дзеяньні беларускіх уладаў у сувязі з затрыманьнем 16 верасьня ў Менску Тацяны Рэвякі і Гары Паганяйлы, актывістаў-праваабаронцаў, якія распаўсюджвалі даклад ПАРЕ пра асобаў, зьніклых бяз зьвестак. Паводле меркаваньня Генеральнага сакратара ПАРЕ, арышты праваабаронцаў – парушэньне свабоды выказваньня і распаўсюду інфармацыі ў Беларусі. "Такія дзеяньні могуць прывесьці толькі да далейшай ізаляцыі краіны ад еўрапейскай і сусьветнай супольнасьці”, — заявіў Генеральны сакратар.

***18 верасьня*** на плошчы Бангалор у Менску адбыўся мітынг пратэсту арганізаваны рэлігійным аб’яднаньнем цэркваў Хрысьціянаў поўнага Евангельля. Для ўдзелу ў акцыі ў Менск прыехалі вернікі з Гародні, Ліды, Барысаву, Вілейкі, Мазыра, Осіповічаў, Дзяржынску і іншых гарадоў Беларусі. На мітынгу пратэставалі супраць закону аб свабодзе сумленьня, які быў прыняты Палатай прадстаўнікоў у чэрвені 2002 году. Вернікі лічаць новы Закон дыскрымінацыйным, паколькі ён істотна абмяжоўвае правы грамадзянаў на вызнаньне і пропаведзь любога рэлігійнага вучэньня ў Беларусі. Сход пратэсту на плошчы Бангалор адбыўся пад лозунгамі: “Конституция -- основной закон!”, “Залы, из которых нас выгнали –

пустуют!”, “Свободу распространению Евангелия!”, “Чиновник не закон, а слуга!”, “ДА Конституции! НЕТ произволу!”.

***19 верасьня*** за распаўсюд улётак на Калгасным рынку ў Лідзе быў затрыманы адзін з сыноў старшыні агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага. Дзьмітрый Леванеўскі быў дастаўлены ў дзяжурную частку Лідзкага РУУС, дзе ўчастковы іньспектар правёў асабісты дагляд Дзьмітрыя Леванеўскага. Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі ў Дзьмітрыя ўсю друкаваную прадукцыю (бюлетэнь “Прадпрымальнік” і ўлёткі).

***20 верасьня*** амбасада Італіі ў Менску, якая зьяўляецца прадстаўніцтвам Еўрасаюзу ў Беларусі, выступіла з заявай, у якой выказвае занепакоенасьць асуджэньнем Валерыя Леванеўскага і Аляксандра Васільева за нібыта абразу Аляксандра Лукашэнкі. Прадстаўніцтва Еўрасаюзу ў Менску разглядае гэты выпадак як “дыспрапорцыю паміж правапарушэньнем і пакараньнем” і нагадвае, што суд не дазволіў асуджаным выклікаць на працэс сваіх сьведкаў, якія маглі б іх абараніць. Прадстаўніцтва Еўрасаюзу паставіла пад сумнеў дакладнае выкананьне прававых нормаў справядлівага судовага працэсу. Сам працэс у Гародні ацэнены як “палітычна матываваная акцыя з мэтай атакі на свабоду выказваньняў і на грамадзянскія правы насельніцтва Беларусі”.

***20 верасьня*** Вольга Завадзкая падала ў суд на Рэспубліканскую пракуратуру, якая праігнаравала яе патрабаваньне ўзбудзіць крымінальную справу “па наноў адкрыўшыхся абставінах” па справе гвалтоўнага выкраданьня яе сына Дзьмітрыя Завадзкага. Нагадаем, што Вольга Завадзкая падала заяву ў Рэспубліканскую пракуратуру з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу “па наноў адкрыўшыхся абставінах” пасьля прэс-канферэнцыі А. Лукашэнкі 20 ліпеня, падчас якой кіраўнік дзяржавы абвесьціў, што валодае матэрыяламі, якія маглі б пераўтварыць “справу Завадзкага” ў “антысправу”.

***20 верасьня*** суд Ленінскага раёну Гародні вынес рашэньне пра спагнаньне штрафу ў памеры 10 базавых адзінак (180 тыс. руб.) у адносінах кіраўніка рэгіянальнага прадстаўніцтва прафссаюзу работнікаў РЭПАМ па Гарадзенскай вобласьці Івана Рамана. Прафсаюзны актывіст быў затрыманы 3 жніўня за распаўсюд бюлетэня прафсаюзу. Суд палічыў, што Іван Раман парушыў арт.167-10 КаАП РБ (дзеяньні ад імя арганізацыі, якая не прайшла рэгістрацыю).

***20 верасьня*** ў Гарадзенскі гарвыканкам пададзеная заяўка на пікет, мэта якога — інфармаваць гараджанаў аб узмацненьні ціску на незалежную прэсу Беларусі. Заяву падаў ад імя сяброў “Беларускай асацыяцыі журналістаў” Павел Мажэйка.

Паводле яго, падставай для яе стала адміністратыўная справа супраць галоўнага рэдактара газеты “Биржа информации” Алены Раўбецкай. Яе абвінавачваюць у парушэньні патрабаваньняў артыкулу 5 Закону аб друку, якім не дапускаецца выкарыстаньне сродкаў масавай інфармацыі для распаўсюду зьвестак, якія зьневажаюць гонар і годнасьць прэзідэнта краіны.

***20 верасьня*** віцебскія сябры КХП-БНФ Уладзімір Плешчанка, Аляксандр Салаўян і Барыс Хамайда праводзілі ў цэнтры гораду другі пікет супраць выбараў і рэферэндуму 17 кастрычніка. Міліцыянты з Чыгуначнага РУУС перапынілі акцыю праз гадзіну ад яе пачатку, забраўшы ў пастарунак усіх трох удзельнікаў. На кожнага з пікетоўцаў быў складзены пратакол затрыманьня, з якога вынікае, што яны парушылі закон аб правядзеньні вулічных акцыяў, зладзіўшы ў цэнтры гораду несанкцыянаваны пікет.

***20 верасьня*** звольнілі з працы Ніну Буйніцкую, намесьніцу галоўнага рэдактара шклоўскай раённай газеты "Ударны фронт" (заснавальнік – Шклоўскі райвыканкам). Паводле словаў галоўнага рэдактара выданьня Аляксандра Бялясава, яна пакінула працу "па ўласным жаданьні". У той жа час, па інфармацыі службы маніторынгу БАЖ, прычынай звальнення стала публікацыя "неправеранага матэрыялу". У нумары за 18 верасьня ў газеце "Ударны фронт" быў надрукаваны ліст чытача за подпісам "Б.Касьцюк, ветэран працы". Пасланьне было зьмешчанае пад загалоўкам "Рэферэндум – правільнае рашэньне": аўтар ліста горача выказваўся ў падтрымку ідэі плебісцыту і ўхваляў імкненьне А. Лукашэнкі зьвярнуцца да народу. "Б. Касьцюк, ветэран працы" дадаў да ліста вершаваны зварот да кіраўніка дзяржавы, у якім выказваў яму сваю падтрымку. Аднак пасьля выхаду газеты высьветлілася, што апублікаваны паэтычны твор зьяўляецца "акравершам": першыя літары ўтвараюць асобны сказ, зьмест якога кардынальна адрозьніваецца ад зьместу самога пасланьня "Б. Касьцюка". Адказнасьць за зьяўленьне публікацыі ўсклалі на спн. Буйніцкую, паколькі галоўны рэдактар выданьня ў той момант адсутнічаў. Цяпер раённае кіраўніцтва шукае аўтара скандальнага пасланьня. Пошукі ўскладняюцца тым, што ў рэдакцыі згубілі канверт ад ліста, які, да таго ж, быў набраны на друкарскай машынцы.

***21 верасьня*** ўпраўленьні юстыцыі абласных выканкамаў распачалі пазапланавыя праверкі арганізацыйных структураў Партыі БНФ. Па дадзеных Управы Партыі БНФ, у гэты дзень праверкам падвергліся больш за 10 арганізацыйных структураў партыі. Правяраючых з упраўленьняў юстыцыі найперш цікавілі пратаколы аб вылучэньні дэлегатаў на зьезд Партыі БНФ, на якім прымаліся рашэньні аб вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Адначасова з

гэтым, на адрас Сойму Партыі БНФ паступіў ліст з Міністэрства юстыцыі за подпісам міністра В.Р. Галаванава, у якім гаворыцца, што “ў сувязі са службовай неабходнасьцю” партыі прапануецца ў трохдзённы тэрмін прадаставіць усе дакументы, датычныя зьезду партыі. Варта адзначыць, што Партыя БНФ па запыце Міністэрства юстыцыі ўжо прадастаўляла дакументы адносна з’езду, які адбыўся 29.08.2004 г. Акрамя таго, сам зьезд праходзіў пад пільным кантролем прадстаўнікоў Міністэрства юстыцыі Н. Фішкінай і А. Харытона. Вельмі паказальна, што Міністэрства юстыцыі распачало дадзеныя праверкі менавіта падчас правядзеньня выбарчай кампаніі. Сітуацыю каментуе сакратар Управы Партыі БНФ Уладзімір Лабковіч:“Учора я і старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка былі выкліканыя на размову да намесьніка начальніка ўпраўленьня па справах грамадзкіх аб’яднаньняў Міністэрства юстыцыі сп. Сьліжэўскага. У асноўным размова датычылася дзейнасьці грамадзкай ініцыятывы “Пяцёрка-плюс”. Спадар Сліжэўскі некалькі разоў падкрэсьліў, што Міністэрства юстыцыі жадае канструктыўна супрацоўнічаць з палітычнымі партыямі, не выказваў ніякіх прэтэнзіяў да дзейнасьці Партыі БНФ. Таму мы са зьдзіўленьнем усрпынялі патрабваньні Міністэрства юстыцыі, тым больш, што дадзеныя аб пераліку арганізацыйных структураў партыі мы прадстаўляем Міністэрству юстыцыі ўжо трэці раз за бягучы год. У мяне складаецца ўражаньне, што камусьці любымі шляхамі і метадамі хочаццца прызнаць вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты ад нашай партыі несапраўдным. Напэўна, улады не задаволеныя колькасьцю зарэгістраваных кандыдатаў ад дэмакратычных партыяў”.

***21 верасьня*** дзьверы віцебскага офісу партыі БСДГ, у якім звычайна праводзіліся нарады віцебскай ініцыятывы “Дзеля абароны Канстытуцыі”, аказаліся апячатаныя. Пячаткі былі і на дзьвярах офісаў БСДП (Народная грамада) і АГП, якія месьцяцца ў тым самым будынку па вуліцы Герцэна. Яшчэ ў чэрвені віцебскія партыйцы атрымалі афіцыйныя лісты ад кіраўніцтва будаўнічага трэсту №9, якому належыць гэты будынак, дзе паведамлялася пра скасаваньне арэндных дамоваў. Асобныя прадстаўнікі будаўнічае арганізацыі, не называючы канкрэтных імёнаў, прызнаваліся ў тым, што “выселіць” з ведамаснага памяшканьня палітычныя партыі ім загадалі з гарвыканкаму. Але тады сітуацыю давялося выправіць юрыстам, якія давялі, што гэткае скасаваньне дамоваў ня мае законнае сілы. Цяпер, калі ў горадзе стала шырока вядома пра зьяўленьне грамадзянскай ініцыятывы, створанай дзеля супрацьстаяньня абвешчанаму Аляксандрам Лукашэнкам рэферэндуму, віцебскія партыйцы ўжо ня ўпэўненыя, што стасункі з кіраўніцтвам будтрэсту №9 можна будзе ўрэгуляваць такім самым “мірным” шляхам. Прынамсі, нараду з прадстаўнікамі рэгіёнаў, якія зьехаліся ў Віцебск, давялося праводзіць проста на вуліцы.

***21 верасьня*** галоўнаму рэдактару недзяржаўнай газеты "Ганцавіцкі час" Пятру Гузаеўскаму (ТАА “Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс") адмовілі ў праве на атрыманьне інфармацыі. У гэты дзень ён прыйшоў на адкрытае паседжаньне 10-й сесіі раённага Савету дэпутатаў, на парадку дня якой было пытаньне добраўпарадкаваньня гораду Ганцавічы і раёну. Аднак старшыня Савету дэпутатаў Барыс Асаўцоў, прэзентуючы мясцовых дэпутатаў і гасьцей сесіі, у самым пачатку паседжаньня зьвярнуў увагу прысутных на тое, што ў зале знаходзіцца рэдактар недзяржаўнай газеты. Ён жа прапанаваў вырашыць пытаньне прысутнасьці журналіста на сесіі шляхам галасаваньня. За тое, каб дазволіць П. Гузаеўскаму прысутнічаць на паседжаньні, не прагаласаваў ніхто; супраць — пяцёра (у зале прысутнічалі каля ста чалавек). За выдаленьне журналіста з залы актыўна выступаў старшыня Ганцавіцкага райвыканкаму Уладзімір Столяр, а начальнік Ганцавіцкага РАУС пагражаў сп-ру Гузаеўскаму адміністратыўнай адказнасьцю. Аргументы журналіста наконт таго, што ён выконвае свае прафесійныя абавязкі, не былі ўлічаныя. У той жа час, карэспандэнты раённай газеты "Советское Полесье" прысутнічалі на сесіі раённага Савету дэпутатаў ад пачатку да канца. Аналагічны выпадак з адмовай П. Гузаеўскаму ў інфармацыі адбыўся 28 жніўня. Міліцыя не дазволіла журналісту прысутнічаць на раённай канферэнцыі работнікаў адукацыі, што праходзіла ў будынку сярэдняй школы №3.

***22 верасьня*** суд Ляхавіцкага раёну Берасьцейскай вобласці задаволіў зыск карэспандэнта недзяржаўнай газеты "Ганцавіцкі час" Соф’і Ясько супраць рэдакцыі раённай газеты "Советское Полесье" і яе галоўнага рэдактара Галіны Мазінай. Суд прызнаў, што афіцыйнае раённае выданьне распаўсюдзіла несапраўдныя зьвесткі, якія зневажаюць гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю журналісткі недзяржаўнай газеты. Нагодай для зыску, які журналістка спачатку падала ў суд Ганцавіцкага раёну, стаў артыкул Г. Мазінай "Оглянись на себя, или О бревне в собственном глазу и куриной слепоте", які зьявіўся 19 траўня 2004 г. у газеце "Советское Полесье". Аўтарка публікацыі абвінавачвала карэспандэнтку недзяржаўнага выданьня ў маральнай нягрэблівасьці, непрафесіяналізме, непавазе да дзяржаўных сімвалаў і г.д. Адбылося некалькі судовых паседжаньняў, пасьля чаго слуханьні былі перанесеныя ў суд Ляхавіцкага раёну і абвешчаныя закрытымі. У выніку суд Ляхавіцкага раёну пад старшынствам А.І. Гушчына абавязаў рэдакцыю газеты "Советское Полесье" і Г. Мазіну апублікаваць абвержаньне артыкулу на першай паласе выданьня і прынесці Соф’і Ясько і чытачам газеты прабачэньні. Акрамя гэтага, суд пастанавіў спагнаць на карысьць С. Ясько з "Советского Полесья" і Галіны Мазінай па 49 тысячаў рублёў на кампенсацыю судовых выдаткаў. Рашэньне можа быць абскарджанае напрацягу 10 дзён у Берасьцейкі абласны суд.

***22 верасьня*** падчас пікету ля Віцебскага райвыканкаму міліцыянты затрымалі сяброў КХП-БНФ Уладзіміра Плешчанку, Аляксандра Салаўяна і Барыса Хамайду, якія агітавалі байкатаваць выбары і рэферэндум 17 кастрычніка. З Чыгуначнага РУУСу Віцебску іх павезьлі ў суд, адкуль спадара Хамайду неўзабаве адпусьцілі: ён не пасьпеў разгарнуць плакат, і сьведкі-міліцыянты ня мелі аргументаў, каб давесьці ягоны ўдзел у пікетаваньні. Падставаю для пакараньня стаў плакат: "Пустыя выбарчыя ўчасткі — найлепшы сродак супраць фальсіфікацыяў". Судзьдзя Алена Грабянчук прызнала Уладзіміра Плешчанку вінаватым у несанкцыянаваным пікетаваньні і прысудзіла яму штраф 160 базавых велічыняў — каля 3 мільёнаў рублёў. Аляксандру Салаўяну загадана зьявіцца ў суд 27 верасьня.

***23 верасьня*** каля 18 гадзінаў у Берасьці быў затрыманы пры раздачы ўлётак "Скажы Лукашэнку НЕ" непаўнагадовы Аляксандр Ражалоўскі. Малады чалавек быў дастаўлены ў РУУС Маскоўскага раёну г. Берасьця, дзе ягонай справай займаліся трое супрацоўнікаў крымінальнага вышуку, а таксама прадстаўнік камісіі па справах непаўнагадовых ст. лейтэнант Наталя Кадзенская. Намесьнік начальніка РУУС Віталь Базылевіч загадаў скласьці на Аляксандра Ражалоўскага пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па арт. 172-3 (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму ладу, правам і законным інтарэсам грамадзянаў). Справа перададзеная на разгляд у камісію па справах непаўнагадовых.

***23 верасьня*** Вярхоўны суд вярнуў на дапрацоўку зыск Мінюсту супраць Беларускага Хельсінкскага камітэту. Два тыдні даў Вярхоўны суд Беларусі чыноўнікам Мінюсту на дапрацоўку іх зыску. Праваабаронцы лічаць гэта сьведчаньнем неабгрунтаванасьці прэтэнзіяў да іх з боку ўстановы, якая рэгіструе грамадзкія арганізацыі. У Вярхоўным судзе Беларусі вырашылі, што зыск Міністэрства юстыцыі да Беларускага Хельсінкскага камітэту афармлены неналежным чынам. Тыдзень таму Мінюст зьвярнуўся ў Вярхоўны суд з просьбай ліквідаваць Беларускі Хельсінкскі камітэт нібыта з прычыны "парушэньняў Канстытуцыі, Закону аб грамадзкіх арганізацыях і ўласнага Статуту". Гэтыя парушэньні адмыслоўцы Мінюсту ўбачылі ў звароце БХК да грамадзянаў краіны з заклікам "сказаць "не" рэферэндуму". У БХК прэтэнзіі Мінюсту адразу назвалі неабгрунтаванымі. Старшыня БКХ Тацяна Працька ня лічыць, што цяперашняе рашэньне Вярхоўнага суда сьведчыць пра тое, што ўлады вырашылі зусім адчапіцца ад БХК.

***23 верасьня*** ў Берасьцейскім абласным судзе адбыўся разгляд касацыйнага пратэсту пракуратуры Маларыцкага раёну на рашэньне Маларыцкага раённага суда

па справе абароны дзелавой рэпутацыі Партыі БНФ. На пачатку працэсу прадстаўнік Партыі БНФ Валянцін Стэфановіч заявіў тры хадайніцтвы, у тым ліку і пра прагляд відэастужкі з выступам С. Строка, і менавіта гэтае хадайніцтва “за-за адсутнасьці тэхнічных магчымасьцяў” было адхіленае. Валянцін Стэфановіч у сваім выступе падкрэсьліў, што Партыя БНФ лічыць рашэньне суда Маларыцкага раёну абсалютна законным, абгрунтаваным, а касацыйны пратэст не павінен быць задаволены, выказаўшы па кожным з пунктаў гэтага пратэсту абсалютна юрыдычна абгрунтаваныя пярэчаньні. Прадстаўніца пракуратуры падтрымала пратэст у сваім выступе, але абгрунтаваньні яе былі не зусім зразумелыя нават юрыстам, але сэнс зразумелы – Сяргей Строк не вінаваты, ён хацеў удакладніць свае словы, але яму проста не далі. Пасьля перапынку было зачытанае рашэньне касацыйнай інстанцыі: задаволіць пратэст пракуратуры Маларыцкага раёну, адмяніць рашэньне суда, а таксама цалкам адмовіць Партыі БНФ у задавальненьні зыскавых патрабаваньняў. Каментуе Валянцін Стэфановіч: “Гэта цалкам палітычна матываванае рашэньне. А пэўная інфармацыя з Маларыты дазваляе апасацца за далейшы лёс і працу судзьдзі Барычэўскага, які прыняў справядлівае рашэньне па гэтай справе ў ліпені. З сёньняшняга рашэньня Берасьцейскага абласнога суда лагічна выцякае, што Партыя БНФ сапраўды супрацоўнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны з фашысцкай Германіяй. Мы, безумоўна, будзем абскарджваць гэтае рашэньне на імя старшыні Берасьцейскага абласнога суда, а калі ён не задаволіць нашую скаргу – на імя старшыні Вярхоўнага суда. Гэта проста абуральна і якрава падкрэсьлівае залежнасьць судовай сістэмы, якую мы маем сёньня ў нашай краіне”.

***23 верасьня*** амбасада Беларусі ў Расіі зьвярнулася да кіраўнікоў і карэспандэнтаў расійскіх СМІ з нагоды асьвятленьня імі кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і правядзеньні рэферэндуму. Беларускі бок "з жалем канстатаваў", што "асобныя расійскія журналісты выкарыстоўваюць і прэзентуюць у сваіх рэпартажах неаб’ектыўную інфармацыю пра падзеі, што адбываюцца сёньня ў Беларусі". Аўтары звароту выказалі надзею, што ў будучым гэтыя журналісты будуць "праяўляць карэктнасьць і ўзважанасьць пры асьвятленьні падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў і рэферэндуму... і працэсу беларуска-расійскай інтэграцыі". "Выклікае зьдзіўленьне, што некаторыя карэспандэнты актыўна "рэтрансьлююць" пункт гледжаньня беларускіх апазіцыянераў, якія ня маюць рэальнай падтрымкі сярод насельніцтва і не адлюстроўваюць грамадзкае меркаваньне ў краіне, — гаворыцца ў звароце. -- Нам уяўляецца дзіўным бачыць на старонках газетаў і тэлеэкранах людзей, якія не хаваюць сваіх антырасійскіх настрояў, якія негатыўна ацэньваюць палітыку цяперашняга расійскага кіраўніцтва ў дачыненьні да Беларусі", — падкрэсьліваюць аўтары дакументу. "Разьлічваем, што ў

далейшым у аналізе дачыненьняў паміж нашымі краінамі ўсе сродкі масавай інфармацыі (як расійскія, так і беларускія) будуць несьці канструктыўны, аб’ядняўчы пачатак", — гаворыцца ў звароце беларускай амбасады да расійскіх СМІ.

***23 верасьня*** Міхаілу Марынічу прад’яўленыя два новых абвінавачаньні – па ч. 2 арт. 377 (раскраданьне ці пашкоджаньне дакументаў, штампаў, пячатак) і па ч.4 арт. 210 (крадзёж шляхам злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі, зьдзейсьненымі арганізаванай групай ці ў асабліва вялікім памеры) Крымінальнага кодэксу. Пра гэта паведаміла адвакатка М. Марыніча Вера Страмкоўская. Яе падабароннаму, у прыватнасьці, ставіцца ў віну крадзёж дакументаў, якія быццам бы ўяўляюць дзяржаўную таямніцу, а таксама авалодваньне аргтэхнікай, якая была бязвыплатана перададзеная ў часовае карыстаньне ўзначальваемай М. Марынічам грамадзкай арганізацыі “Беларуская асацыяцыя “Дзелавая ініцыятыва”. Нагадаем, што раней М. Марынічу было прад’яўленае абвінавачаньне па ч.2 арт. 295 (незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, баезапасаў і ўзрыўных рэчываў) Крымінальнага кодэксу. Па словах В. Страмкоўскай, прад’яўленьне двух новых абвінавачаньняў стала для яе падабароннага поўнай нечаканасьцю. М. Марыніч, паведаміла яна, проста на пастанове напісаў свой пратэст і адмовіўся даваць паказаньні, паколькі лічыць, што дадзеныя дзеяньні “маюць палітычны матыў” і перасьледуюць мэту не дапусьціць ягонага ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах 2006 году. Такое адбудзецца, калі М.Марыніч будзе асуджаны нават умоўна. Як лічыць адвакат, усе абвінавачаньні, прад’яўленыя М. Марынічу, “ня маюць пад сабой глебы і неабгрунтаваныя”. У прыватнасьці, па яе словах, тэрмін сакрэтнасьці дакументаў, знойдзеных у яго, даўно выйшаў, а што датычыць аргтэхнікі, то яна зьяўляецца маёмасьцю амбасады ЗША, якая ніякіх абвінавачаньняў супраць палітыка не вылучала. Зараз, адзначыла В. Страмкоўская, амбасада ЗША будзе праходзіць па гэтай справе як пацярпелы бок. Адвакат нагадала, што 26 верасьня сыходзіць тэрмін утрыманьня М.Марыніча пад вартай. Аднак яго, хутчэй за ўсё, працягнуць, паколькі вылучаныя супраць палітыка абвінавачаньні па ч.4 арт. 210 КК зьяўляюцца цяжкімі, і санкцыя прадугледжвае тэрмін пазбаўленьня волі ад 7 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасьці.

***23 верасьня*** Салігорскі гарвыканкам забараніў Незалежнаму прафсаюзу гарнякоў РУП “ПО “Беларуськалий” праводзіць пікет супраць парушэньня правоў незалежных прафсаюзаў.

***24 верасьня*** Валерыя Шчукіна затрымалі за распаўсюд улётак супраць датэрміновага галасаваньня. Вядомы апазіцыянер распаўсюджваў улёткі ў віцебскім мікрараёне Поўдзень-3. Паводле словаў спадара Шчукіна, ён надрукаваў іх за ўласныя грошы накладам 290 асобнікаў. Але міліцыянты завезьлі яго ў Першамайскі

РАУС, дзе палічылі неабходным скласьці пратакол пра парушэньне грамадзкага парадку, абвінаваціўшы апазіцыянера ў незаконным распаўсюдзе незарэгістраваных выданьняў. Разьбіральніцтва гэтага інцыдэнту будзе праводзіць раённая адміністратыўная камісія, дату паседжаньня якой міліцыянты спадару Шчукіну пакуль не назвалі. Але далучылі да пратаколу ў якасьці “рэчавых доказаў” адабраныя 137 улётак. На думку Валерыя Шчукіна, менавіта іх зьмест прыцягнуў увагу міліцыянтаў, якія вырашылі любым шляхам перапыніць пашырэньне пададзеных там зьвестак: ва ўлётках гаварылася пра магчымыя фальсіфікацыі падчас папярэдняга галасаваньня, а таксама пра тое, якіх кандыдатаў па ўсіх чатырох віцебскіх акругах актыўна прасоўваюць улады.

***24 верасьня*** міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч падпісаў загад аб прыпыненьні на тры месяцы выхаду недзяржаўнай беларускамоўнай "Рэгіянальнай газеты". Тым жа днём датаваныя і два папярэджаньні, вынесеныя Міністэрствам інфармацыі заснавальніку і рэдакцыі выданьня. Іх абвінавачваюць у парушэньні адразу некалькіх артыкулаў Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Галоўны рэдактар і сузаснавальнік выданьня Аляксандр Манцэвіч бачыць у дзеяннях міністэрства палітычную матывацыю і наўпрост зьвязвае іх з набліжэньнем выбараў і рэферэндуму. Паводле загаду міністра, рэдакцыя парушыла арт. 9 Закону аб друку: выпусьціла накладам 9100 асобнікаў незарэгістраваны дадатак -- газету "Тэлетыдзень" -- і распаўсюдзіла яе разам з "Рэгіянальнай газетай" (№32 ад 6-га жніўня). Рэдакцыю абвінавачваюць таксама ў парушэньні арт.10 Закону аб друку: Мініфармацыі палічыла, што газета не выконвае ўмоваў сваёй рэгістрацыі. Зарэгістраваная як "масава-палітычнае выданьне", у выходных дадзеных яна называе сябе "інфармацыйна-рэкламным" і замест 7 разоў на тыдзень выходзіць толькі адзін раз. Акрамя гэтага, падкрэсьлівае Мінінфармацыі, газета паводле ўмоваў рэгістарцыі павінна распаўсюджвацца "ў Рэспубліцы Беларусь і краінах сьвету", а распаўсюджвалася толькі "ў рэгіёне" (Маладэчна, Вілейка, Смаргонь, Ашмяны, Валожын, Мядзель, Астравец, Менск). Тыя ж самыя прэтэнзіі міністэрства выстаўляе заснавальніку газеты: яго абвінавачваюць у тым, што ён на працягу месяца не паведаміў пра зьмену перыядычнасьці выпуску і тэрыторыі распаўсюду -- "дзеля ўнясеньня адпаведных зьменаў у пасьведчаньне аб рэгістрацыі выданьня". Гэта, на думку Мінінфармацыі, парушае арт.11 Закону аб друку і Пастанову Савету Міністраў ад 30 траўня 2003 г. №727 "Аб памерах і парадку правядзеньня рэгістрацыйнага збору за рэгістрацыю СМІ ў РБ". Адзін з заснавальнікаў выданьня (ён жа - галоўны рэдактар) Аляксандр Манцэвіч лічыць прэтэнзіі да сваёй газеты надуманымі. Па ягоных словах, укладка "Тэлетыдзень" ня можа лічыцца самастойным выданьнем, нягледзячы на адрозны фармат паперы, бо мае

"скразную" нумарацыю старонак з пазнакай "Рэгіянальная газета" на кожнай. А. Манцэвіч акцэнтуе ўвагу на тым, што шэраг дзяржаўных выданьняў выпускаюць аналагічныя дадаткі, зьмяняючы ня толькі фармат паперы, але і мову (да прыкладу, "Маладзечанская газета"), і гэта не выклікае ніякіх пярэчаньняў з боку Мінінфармацыі. А. Манцэвіч дапускае, што недакладнае ўказаньне тэматыкі выдання ў выходных дадзеных можна лічыць памылкай газеты. Але ж, на яго думку, прыпыненьне газеты зьяўляецца занадта жорсткім пакараньнем. Паводле заснавальніка, прэтэнзіі адносна тэрыторыі распаўсюду зусім ня маюць пад сабою падставаў: у Мініфармацыі нават ня ведалі, што ў газеты існуе дамова з РУП "Белпошта" на распаўсюд і дастаўку падпісных накладаў па тэрыторыі Беларусі, і што газета прысутнічае ў рэспубліканскім падпісным каталогу. У аддзеле рэгістрацыі міністэрства прызналі, што гэта "пракол". А. Манцэвіч падкрэсьлівае, што зараз "Рэгіянальная газета" зьяўляецца адзіным цалкам беларускамоўным масавым недзяржаўным рэгіянальным выданьнем у краіне.

***24 верасьня*** Міністэрства інфармацыі прыпыніла на 3 месяцы выхад недзяржаўнай газеты "Народный предприниматель". Галоўны рэдактар выданьня Валерый Шаўчэнка даведаўся пра гэта 1 кастрычніка, атрымаўшы па пошце папярэджаньне аб парушэньні Закону аб друку і загад аб прыпыненні (№166 ад 24 верасьня). Сп. Шаўчэнка, які зьяўляецца лідэрам Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП), лічыць прычыны прыпыненьня сваёй газеты фармальнымі і зьвязвае дзеяньні Мініфармацыі з набліжэньнем выбараў і рэферэндуму. Міністэрства абвінаваціла рэдакцыю газеты ў парушэньні некалькіх артыкулаў Закону "Аб друку і іншых СМІ". Паводле папярэджаньня, газета "Народный предприниматель" не рабіла абавязковай рассылкі выданьня па бібліятэках і афіцыйных установах; не паведаміла рэгіструючаму органу пра зьмену перыядычнасьці выхаду і мовы выданьня; у выходных дадзеных ня ўказвала, дзе надрукаваная газета, калі падпісаная ў друк і г.д. (арт. 11, 26, 27). Газета "Народный предприниматель" выдаецца з 2000 году і дагэтуль не атрымлівала ніводнага папярэджаньня. Галоўны рэдактар заявіў, што выданьне будзе выходзіць у выглядзе інфармацыйнага бюлетэня полацкай рэгіянальнай арганізацыі прадпрымальнікаў Беларускага незалежнага прафсюзу.

***24 верасьня*** Аляксандр Салаўян і Уладзімір Плешчанка чарговы раз выйшлі да “Сіняга дому “ ў Віцебску з плакатамі “Пустыя выбарчыя ўчасткі – найлепшы сродак супраць фальсіфікацыяў” і “Не хадзіце на выбары ды рэферэндум – усё адно падмануць”. Праз гадзіну каля пікетоўцаў спынілася міліцэйская машына. Байцы АМАПу, якія везьлі апазіцыянераў у Чыгуначны РАУС, адкрыта прызнаваліся, што

маюць адпаведны загад свайго кіраўніцтва – затрымліваць пікетоўцаў і зрываць іх акцыі. Пасьля першага затрыманьня, 20 верасьня, апазіцыянераў паабяцалі выклікаць у суд за парушэньне закону пра правядзеньне вулічных акцыяў ды адпусьцілі. Пасьля другога затрыманьня, 22 верасьня, Уладзіміра Плешчанку судзілі і аштрафавалі амаль на тры мільёны рублёў. Суд па затрыманьні 24 верасьня адбыўся без адтэрміноўкі. Судзьдзя Чыгуначнага раённага суда прызнаў абодвух сяброў КХП-БНФ вінаватымі ў арганізацыі несанкцыяванага пікету, прычым ужо не ўпершыню, і прысудзіў Уладзіміру Плешчанку і Аляксандру Салаўяну па 10 сутак арышту. Адбываць пакараньне ім давядзецца ў ізалятары часовага ўтрыманьня, куды іх завезьлі адразу з пастарунку. Уладзіміру Плешчанку нават не дазволілі ўзяць з дому неабходныя лекі, нягледзячы на тое, што ён інвалід, хворы на сэрца.

***24 верасьня*** афіцыйная газета "Звязда" апублікавала інфармацыю, якая адносна аднаго з каардынатараў руху "Зубр" Мікіты Сасіма. У "Звяздзе" было надрукаванае інтэрв’ю з другім сакратаром ЦК БРСМ Ігарам Бузоўскім, у якім ён заявіў: "... Узяць хаця б прыклад з Баранавічамі. Маладыя людзі, навучэнцы каледжу, у якіх не было магчымасьці атрымаць рэальную, праўдзівую інфармацыю аб існуючых моладзевых арганізацыях, паддаліся на правакацыю чыстай вады — і запісаліся ў "Зубр"... А галоўны завадатар інцыдэнту, спадар Сасім, у хуткім часе аказаўся... за мяжой, дзе зараз працягвае вучобу…". Моладзь Беларусі сапраўды ня мае магчымасьці атрымаць праўдзівую інфармацыю аб існуючых моладзевых арганізацыях. У краіне даўно няма незалежных электронных СМІ, і амаль не засталося незалежнай прэсы. Гэта вынік мэтанакіраванай кампаніі супраць свабоды слова. Дзесяткі незалежных газетаў былі ліквідаваныя, некалькі журналістаў адправіліся за краты. Таму молодзь вымушаная будаваць свае меркаваньні аб сітуацыі ў краіне па хлусьні, якая публікуецца на старонках "Звязды" і іншых рупараў афіцыйнай прапаганды. Між тым, Мікіта Сасім, які быў выключаны з баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці за сваю палітычную дзейнасьць, нікуды ня зьехаў. Малады патрыёт знаходзіцца ў Беларусі і працягвае барацьбу супраць дыктатарскага рэжыму. "Мяркуючы па ўсім, афіцыйная прэса зразумела, што ніякага кампрамату на беларускіх змагароў за свабоду яна ня знойдзе, і перайшла да адкрытай хлусьні. Падчас падзеяў у Баранавічах на маладых людзей, якія выказалі свой пратэст прымусоваму загону у "лукамол", афіцыйная прэса выліла столькі бруду, што зараз я ня зьдзіўлены. Я больш зьдзіўлены ўзроўнем некампетэнтнасьці прыдворных прапагандыстаў, якія сьмеюць называць сябе журналістамі," — пракаментаваў публікацыю "Звязды" Мікіта Сасім.

***25 верасьня*** актывіста "Зубра" Станіслава Кучынскага затрымалі за распаўсюд незарэгістраванай газеты. У пастарунку малады чалавек правёў каля шасьці гадзінаў. Увесь гэты час міліцыянты раіліся з кіраўніцтвам наконт таго, што рабіць з хлопцам. Яму казалі, што супраць яго будзе ўзбуджаная крымінальная справа па факце графіці, якія апошнімі днямі зьявіліся ў Івацэвічах. Каля дзевяці гадзінаў вечару ў дачыненьні да яго быў складзены пратакол за парушэньне часткі 3 172 артыкулу Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях (распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных). Прыблізна ў 22 гадзіны Кучынскага адпусьцілі. Наступнай раніцай ў нядзелю дахаты да маладога чалавека прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і зноў даставілі яго ў Івацэвіцкі ГУУС, дзе быў складзены пратакол па 143-м артыкуле КаАП (антысанітарыя).

***26 верасьня*** ў Пінску на рынку "Сонечны" затрыманы адзін з сыноў старшыні агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага. Прапаршчык міліцыі А. Ліпскі і невядомая асоба ў цывільным даставілі Дзьмітрыя Леванеўскага спачатку ў памяшканьне адміністрацыі рынку, а затым у Пінскі ГУУС. Допыт праводзіў супрацоўнік міліцыі, які прадставіўся Віктарам Грынько. Калі Дзьмітры Леванеўскі папрасіў патлумачыць яму адно з зададзеных пытаньняў, Грынько моцна ўдарыў яго па сьпіне. Працягнуў допыт малодшы ўчастковы інсьпектар Ліпскі, які склаў пратакол асабістага дагляду і пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па арт.172 ч.3 КаАП РБ (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных). У ходзе асабістага дагляду было канфіскавана 112 бюлетэняў “Прадпрымальнік” №73-76 (213-216) і 245 улётак з апісаньнем судовага працэсу па крымінальнай справе старшыні агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага і яго намесьніка Аляксандра Васільева, асуджаных на два гады калоніі агульнага рэжыму за “публічную абразу прэзідэнта А.Лукашэнкі”.

***26 верасьня*** ўтрыманьне Міхаіла Марыніча пад вартай працягнутае яшчэ на месяц. “Калі выпусьціць Міхаіла Марыніча пад падпіску аб нявыезьдзе, ён можа ўцячы ад сьледзтва і нечым перашкодзіць высьвятленьню праўды па ягонай крымінальнай справе”, – менавіта з такой фармулёўкай пракуратура Беларусі працягнула яшчэ на месяц тэрмін утрыманьня пад вартай Міхаіла Марыніча. У сьледчым ізалятары КДБ “амерыканка” Міхаіл Марыніч ўтрымліваецца з 24 красавіка. Яго абвінавачваюць у незаконных дзеяньнях са зброяй, а з 23 верасьня яшчэ і ў крадзяжы сакрэтных дакументаў ды маёмасьці. Паводле гэтых абвінавачваньняў яму пагражае да 15 гадоў турмы. Адвакат Вера Страмкоўская ня згодная з рашэньнем пракуратуры аб далейшым утрыманьні Марыніча: “Лічу, што

гэтае рашэньне неабгрунтаванае і ня мае юрыдычнага сэнсу. А таксама яно вельмі шкодзіць здароўю Марыніча”. Адвакат заявіла, што будзе абскарджваць рашэньне пракуратуры ў судзе. Міхаіл Марыніч не прызнае сябе вінаватым.

***27 верасьня*** прадстаўнікі цыганскай нацыянальнай меншасьці зьвярнуліся ў Міністэрства культуры з просьбай прадставіць магчымасьць адчыніць выставу, прысьвечаную гісторыі, культуры і побыту цыганоў у Беларусі. Адказу з міністэрства заяўляльнікі не атрымалі.

***27 верасьня*** ў Берасьці адбыўся ператрус на кватэры, якую здымае кандыдат у дэпутаты ад Партыі БНФ па 13-ай выбарчай акрузе Уладзімір Малей. У выніку канфіскаваныя ўлёткі Народнай кааліцыі “Пяцёрка-плюс” — “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”, “Скажы Лукашэнку “НЕ”, а таксама 150 асобнікаў маніторынгу парушэньняў правоў чалавека ў Берасьцейскай вобласьці.

***27 верасьня***, у дзень, калі споўнілася пяць месяцаў з моманту арышту палітыка Міхаіла Марыніча, дзьве акцыі салідарнасьці правёў рух "Зубр". Падчас акцыі ў Баранавічах чатыры актывісты руху былі затрыманыя. Акцыя прайшла ў самым цэнтры гораду каля Вечнага агню і пачалася ў 16.00. Падчас яе моладзь, апранутая ў "зуброўскія" саколкі, трымалі партрэты палітыка з надпісам "Свабоду Марынічу!". Акцыя доўжылася 20 хвілінаў, пасьля чаго міліцыянты пачалі арышты. Затрыманых Насту Васіленку, Арцёма Ластавецкага, Алену Петрашку і Марыю Гансецкую даставілі ў Баранавіцкі РАУС. Там на іх былі складзеныя пратаколы па артыкуле 167-1 (парушэньне заканадаўства аб вулічных акцыях). Акцыя ў Менску пачалася ў 17.45. Чатыры актывісты "Зубра" падышлі да будынку КДБ і замацавалі паміж дрэвамі плакат са словамі "Свабоду Марынічу!" і разышліся. Плакат правісеў каля пятнаццаці хвілінаў, пасьля чаго яго сарвалі ахоўнікі, якія выйшлі з будынку КДБ. Ніхто з удзельнікаў менскай акцыі ня быў затрыманы.

***27 верасьня*** ўвечары кіраўніцтва Еўрасаюзу ў Брусэлі прыняло Дэкларацыю па Беларусі. У дакуменце выказваецца сур’ёзная заклапочанасьць тым, што Беларусь так і не правяла поўнага, незалежнага і вартага даверу расьсьледваньня справаў аб выкраданьні і магчымым забойстве беларускіх апазіцыйных лідэраў – былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, віцэ-сьпікера Віктара Ганчара, а таксама бізнэсоўцы Анатоля Красоўскага і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага, бясьсьледна зьніклых ў 1999-2000 гадах, а таксама мажлівага дачыненьня да гэтых злачынстваў беларускіх высокапастаўленых чыноўнікаў. Сама Дэкларацыя ня выклікала б такой бурнай рэакцыі кіраўніцтва нашай краіны – колькі ўжо прымалася рознымі міжнароднымі структурамі рэзалюцыяў адносна гэтых гучных справаў, —

каб не рашэньне “абмежаваць доступ на сваю тэрыторыю тым высокапастаўленым чыноўнікам з Беларусі, якія лічацца найбольш адказнымі за няздольнасьць арганізаваць расьсьледваньне і пакараньне за ўчыненыя злачынствы, а таксама тым, хто ў дакладзе Хрыстаса Пургурыдэса лічыцца ключавымі дзеючымі асобамі па справах зьнікненьняў і далейшым іх утойваньні”. Візавая забарона Еўрасаюзу, сказана ў Дэкларацыі, тычыцца Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Віктара Шэймана, міністра спорту і турызму Юрыя Сівакова, міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава і падпалкоўніка Дзьмітрыя Паўлічэнку. Таксама Еўрасаюз выказаўся супраць прысутнасьці гэтых асобаў на публічных сустрэчах ва ўстановах Еўрапейскага Саюзу альбо ў ягоных дзяржавах-сябрах. Да гэтай заявы далучыліся Балгарыя, Румынія, Турцыя, Харватыя, Албанія, Босьнія і Герцагавіна, Македонія, Сербія і Чарнагорыя, Ісландыя, Ліхтэнштэйн і Нарвегія. Такім чынам, забаранілі ўезд на тэрыторыю сваіх краінаў вышэйшых службовых асобаў з Беларусі ўсяго 37 еўрапейскіх краінаў.

***28 верасьня*** суд Заводзкага раёну Менску аштрафаваў сябру Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ Генадзя Пляшко на 10 базавых адзінак (190 тысячаў рублёў). 21 верасьня яго затрымалі ля прахадной падшыпнікавага заводу. Ён распаўсюджваў улёткі з заклікам байкатаваць выбары ў Палату прадстаўнікоў і не галасаваць на рэферэндуме.

***28 верасьня*** ў друкарню “Топ Тайп” наведаліся прадстаўнікі ўпраўленьня барацьбы з эканамічнай злачыннасьцю. Кіраўніцтва фірмы лічыць, што такая цікавасьць праваахоўных органаў да прадпрыемства невыпадковая. Афіцыйнай нагодай дзеля праверкі стаў той факт, што друкарня пачала выконваць замову на выпуск передвыбарчых улётак да таго, як Цэнтрвыбаркам перавёў грошы паводле адпаведных рахункаў-фактураў. Друкарня “Топ Тайп” пачала ўжо выконваць замову, бо кандыдатам у дэпутаты патрэбныя агітацыйныя ўлёткі, але ж высьветлілася, што яна такім чынам парушае заканадаўства. У друкарні “Топ Тайп” замову на выпуск агітацыйных улётак разьмясьцілі чатыры кандыдаты: Сьвятлана Каралёва, Аляксей Кароль, Алег Волчак і Генадзь Ананьеў. Дырэктар прадпрыемства лічыць, што такім чынам улады спрабуюць перашкодзіць кандыдатам падчас выбарчай кампаніі.

***28 верасьня*** ў Магілёве быў затрыманы Зьміцер Салаўёў, намесьнік старшыні Рады Магілёўскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ і сябра Сойму Партыі БНФ. Каля 23.00 Зьміцер Салаўёў наляпіў на слуп налепку “Народная кааліцыя “Пяцёрка-плюс”, пасьля чаго быў затрыманы нарадам міліцыі. Сп. Салаўёў быў дастаўлены ў Ленінскі РАУС г. Магілёву, дзе быў пратрыманы тры гадзіны. На яго быў складзены пратакол аб парушэньні арт. 172-3 КаАП РБ “распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з

парушэньнем усталяванага парадку і ня маючых выходных дадзеных, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзянаў”, што прадугледжвае пакараньне штрафам у памеры да 5 базавых адзінак. У сп. Салаўёва былі канфіскаваныя некалькі асобнікаў налепак, улётак, брашура з вершамі, артыкулы і 2 кампутарныя дыскеты.

***28 верасьня*** павінен быў адбыцца суд па зыску Валерыя Фралова да газеты “Обозреватель” і Ганны Мураўскай у сувязі з яе публікацыяй “Дэпутаты Касьян, Навасяд і Фралоў — асабовыя антысеміты?”. Валеры Фралоў запатрабаваў 100 мільёнаў рублёў кампенсацыі за тое, што ў публікацыі яго абвінавацілі ў антысемітызме. Але судовае паседжаньне было перанесенае на 20 кастрычніка з той прычыны, што журналістка падала сустрэчны зыск аб тым, што ў сваім звароце ў суд Валерый Фралоў абразіў яе сьцьверджаньнем аб тым, што яна наўмысна прыпісала кіраўніку Беларускага аб’яднаньня габрэйскіх арганізацыяў і суполак Леаніду Левіну словы пра антысемітызм Фралова. Сама ж журналістка лічыць, што яна добрасумленна выконвала свае прафесійныя абавязкі. Уладальнік “Обозревателя” і сама Мураўская ў суд не прыйшлі.

***28 верасьня*** Наваполацкі гарадзкі суд адмяніў пастанову адміністратыўнай камісіі гарвыканкаму аб прыцягненьні сябра Праваабарончага цэнтру “Вясна” Зьміцера Салаўёва да адказнасьці. Зьміцер Салаўёў і яшчэ двое новапалачанаў былі затрыманыя падчас распаўсюду ўлётак супраць трэцяга прэзідэнцкага тэрміну. Праз некалькі дзён на Зьміцера Салаўёва работнікамі аддзелу ўнутраных справаў быў складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні згодна з часткай 3 артыкулу 172 КаАП РБ (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных), і справа была накіраваная на разгляд адміністратыўнай камісіі гарвыканкаму. Камісія, не запрасіўшы затрыманага на паседжаньне, вынесла яму пакараньне ў выглядзе штрафу памерам пяць базавых адзінак, абвінаваціўшы ў парушэньні артыкулу 173 КаАП, дзе гаворка ідзе аб незаконным набыцьці і захоўваньні гладкаствольнай паляўнічай зброі. Спадар Салаўёў абскардзіў гэтае рашэньне ў судзе, і гарадзкі суд на сваім паседжаньні адмяніў рашэньне адміністратыўнай камісіі гарвыканкаму, накіраваўшы справу на дадатковы разгляд.

***28 верасьня*** за правядзеньне акцыі “Шэсьце бяздомных студэнтаў” 16 верасьня ў Менску, аштрафаваныя на 7 базавых велічыняў (133 тысячы рублёў) яго ўдзельнікі Сяржук Семянюк, Юры Сідун, Алесь Васілеўскі. Такое рашэньне прыняў суд Маскоўскага раёну г.Менску. Адзін з затрыманых студэнтаў на суд не зьявіўся. Судовы разгляд справы пачаўся 17 верасьня, але студэнты запатрабавалі ўдзелу адваката, і з гэтай прычыны суд быў перанесены на 28 верасьня.

***28 верасьня*** каардынатары моладзевага руху “Зубр” заявілі, што менавіта КДБ удзельнічае ў рэпрэсіях супраць актывістаў арганізацыі, бо апошнія затрыманьні і ператрусы ў кватэрах адбываліся з удзелам супрацоўнікаў службы бясьпекі. На працягу тыдня некалькіх сяброў моладзевага руху “Зубр” затрымалі на вуліцы з мэтай дагляду. На затрыманых складалі пратаколы ў міліцэйскіх пастарунках паводле розных адміністратыўных артыкулаў, у тым ліку за дробнае хуліганства. Але аб’ядноўвае гэтыя справы тое, што ніводнага чалавека не затрымалі падчас вулічнай акцыі. Міхася Аўдзеева, Максіма Громава, Мікіту Сасіма і Аляксея Ляўковіча спынілі людзі ў цывільным і папрасілі паказаць, што ў заплечніках. Усе асобнікі газеты “Зубр” засталіся ў міліцыі, а хлопцаў судзілі за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак і за дзеяньні ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Мікіту Сасіма і Глеба Вязоўскага затрымалі ўначы, калі хлопцы ішлі на кватэру Глеба. У заплечніках знайшлі балончыкі з фарбай — гэтага было дастаткова, каб абвінаваціць юнакоў у дробным хуліганстве. Каардынатары руху адзначаюць, што ва ўсіх выпадках падчас допытаў і даглядаў прысутнічалі супрацоўнікі КДБ. Прэсавы сакратар “Зубра” Аляксандр Атрошчанкаў заявіў, што сьпецслужбы атрымалі адмысловы загад на час выбарчай кампаніі. 16-гадовага Станіслава Кучынскага затрымалі на вуліцы ў Івацэвічах. У хлопца былі асобнікі газеты “Зубр”. Пакуль Станіслава Кучынскага дапытвалі ў міліцыі, на кватэры рабілі ператрус. Допыт доўжыўся больш за пяць гадзінаў. Кіраваў ім супрацоўнік КДБ. У Бялынічах на кватэры Барыса Вырвіча праводзілі ператрус, калі яго не было дома. Жонцы Барыса маёр КДБ пагражаў, што яе звольняць з працы за апазіцыйную дзейнасьць мужа.

***29 верасьня*** Уладзімір Вялічкін, кіраўнік Берасьцейскага абласнога аддзяленьня Праваабарончага цэнтру “Вясна”, быў выкліканы ў апорны пункт міліцыі. На пачатку “размовы” намесьнік участковага параіў Уладзіміру Вялічкіну памяняць месца знаходжаньня офісу, бо ў іх ад яго “галаўны боль”. Потым на У. Вялічкіна быў складзены пратакол аб парушэньні ч.1 арт. 167-10 КаАП РБ “дзейнасьць ад імя незарэгістраваных ці неперарэгістраваных палітычных партыяў, прафесійных саюзаў ці іншых грамадзкіх аб’яднаньняў”. Падставай да прыцягненьня да адміністратыўнай адказнасьці была брашура “Маніторынг парушэньняў правоў чалавека ў Берасьцейскай вобласьці ў 2003-2004 гг.”, 137 асобнікаў якой былі канфіскаваныя падчас ператрусу ў выбарчым штабе кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Малея, які зьяўляецца юрыстам “Вясны”. Участковы таксама выказаў жаданьне “паразмаўляць” з кандыдатам. У. Вялічкін лічыць, што ператрус і складаньне пратаколу – гэта чарговая спроба ціску на кандыдата і яго каманду з мэтай адхіленьня ад удзелу ў выбарах.

***29 верасьня*** стала вядома, што старшыня Парламенцкай Асамблеі Савету Еўропы Петэр Шыдэр накіраваў ліст Камітэту Міністраў Савету Еўропы, у якім заклікаў гэты выканаўчы орган прадухіліць удзел беларускага міністра спорту і турызму Юрыя Сівакова ў 10-й канферэнцыі еўрапейскіх міністраў спорту, якая плануецца ў Будапешце 14–15 кастрычніка. У сваім лісьце еўрапейскі палітык нагадаў, што ўжо раней на падставе рэзалюцыі ПАСЕ Еўрапейскі саюз прадухіліў наведваньне сп. Сіваковым Алімпійскіх гульняў.

***29 верасьня*** ў Магілёве затрымалі Мікалая Ільіна і Яўгена Суворава, якія распаўсюджвалі газету “Зубр” у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Куляшова. Спачатку маладыя людзі раздавалі газеты студэнтам у аўдыторыях і калідорах універсітэту, а пасьля заканчэньня заняткаў – каля вучэбнага корпусу. На вуліцы іх затрымалі дзьве жанчыны, якія паведамілі, што зьяўляюцца сябрамі камісіі па справах выхаваньня моладзі, і выклікалі міліцыю. “Зуброўцаў” даставілі ў пастарунак, дзе склалі пратакол аб адміністратыўным парушэньні – распаўсюдзе друкаваных матэрыялаў без выходных дадзеных. Праз дзьве гадзіны маладых людзей адпусьцілі.

***29 верасьня*** стала вядома, што адміністрацыя Маскоўскага раёну г.Менску адмаўляе евангельскім хрысьціянам у арэндзе памяшканьняў. Менскія цэрквы “Новае Жыцьцё” і “Царква Ісуса Хрыста” (Аб’яднаньне цэркваў хрысьціянаў Поўнага Евангельля), а таксама “Новы Запавет” і “Надзея Збаўленьня” (Саюз хрысьціянаў веры Евангельскай) атрымалі адмову ў арэндзе залаў для багаслужэньняў. Прычынай адмовы стала недастатковае забесьпячэньне рэлігійнымі абшчынамі “мераў па ажыцьцяўлены кантрольна-прапускнога рэжыму ў цэрквах, забесьпячэньні грамадзкай бясьпекі і медыцынскага абслугоўваньня”. Дагэтуль веруючыя зьбіраліся ў будынках у цэнтры гораду на вул. Берсана 1а і вул. Мясьнікова 39в. Дакумент аб адмове падпісалі глава адміністрацыі Маскоўскага раёну Дукар Я. М. і кіраўнік справамі раёну Бажэнаў Н. У. Пастары евангельскіх цэркваў назвалі патрабаваньні ўладаў абсурднымі і выказалі меркаваньне, што ў стасунках мясцовых адміністрацыяў і цэркваў зараз пераважае т.зв.“тэлефоннае права”. “У такой сітуацыі дзіўна гучаць заявы Камітэту па справах рэлігіяў аб тым, што ў Беларусі захоўваецца спакойная сітуацыя ў галіне рэлігійных правоў і свабодаў,” – заявіў Барыс Чарнаглаз, пастар Менскай “Царквы Ісуса Хрыста”.

***29 верасьня*** адзін з каардынатарыў руху "Зубр" Мікіта Сасім арыштаваны на 15 сутак. Супрацоўнікі міліцыі спынілі М. Сасіма на вуліцы 22 верасьня і знайшлі ў яго ў пляцаку балончыкі з фарбай. М.Сасіма пратрымалі ў міліцыі ўсю ноч. Суд адбыўся без удзелу Мікіты Сасіма 24 верасьня. Каардынатара "Зубра" абвінавацілі ва

ўчыненьні дробнага хуліганства (арт. 156 КаАП). 29 верасьня Мікіту Сасіма затрымалі ў цэнтры Менску і адвезьлі ў сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік. Паводле меркаваньня актывістаў руху "Зубр", асноўная мэта арышту М. Сасіма – "нейтралізацыя лідэраў руху напярэдадні рэферэндуму".

***30 верасьня*** штраф у памеры 70 базавых велічыняў (1 млн. 300 тыс. рублёў) пастанавіў спагнаць з галоўнага рэдактара газеты "Биржа информации" Алены Раўбецкай суд Ленінскага раёна г. Гародні. З такім вынікам скончыліся слуханьні адміністратыўнай справы, якую завяла супраць журналісткі пракуратура Ленінскага раёну Гародні. Судзьдзя Наталя Козел палічыла, што яна распаўсюдзіла праз СМІ несапраўдныя зьвесткі, якія зьневажаюць гонар і годнасьць прэзідэнта РБ (ч. 10 арт. 172 -1 КаАП). Пастанова канчатковая і абскарджаньню ў парадку вытворчасьці па справах аб адміністратыўных правапарушэньнях не падлягае. Слуханьні па справе пачаліся 28 верасьня. Сьведкамі выступалі журналістка "Биржи информации" Наталя Макушына і галоўны рэдактар газеты "День" Мікола Маркевіч. Прадстаўніком спн. Раўбецкай у судзе выступаў кіраўнік Цэнтру прававой абароны СМІ пры ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Міхаіл Пастухоў. Сьведкі даводзілі, што ў публікацыі няма іншых зьвестак, акрамя ўсім вядомага паведамленьня пра рэферэндум, а ўсё астатняе зьяўляецца меркаваньнем журналіста. Аднак гэтыя аргументы суд не палічыў аб`ектыўнымі на падставе таго, што сьведкі зьяўляюцца калегамі А. Раўбецкай і "зацікаўленыя ў выніку справы". Хадайніцтва адваката Аляксандра Бірылава аб правядзеньні лінгвістычнай эксьпертызы публікацыі судзьдзя не задаволіла.

## КАСТРЫЧНІК

***1 кастрычніка*** стала вядома, што сябра Рады “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў” Сержука Семянюка выключаюць з Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэту (БДАТУ). 29 верасьня прадстаўнік сьпецслужбаў патэлефанаваў Сержуку на мабільны тэлефон, нумар якога ўзяў у дэканаце. Ён прадставіўся Вадзімам і сказаў наступнае: “Я ведаю, што ў цябе праблемы з навучаньнем, я магу іх вырашыць. Давай сустрэнемся”. Сяржук катэгарычна адмовіўся. На тэлефоне Сержука застаўся нумар, з якога тэлефанаваў так званы Вадзім. Паводле базы дадзеных МГТС, гэты нумар належыць будынку па адрасе пр-т Скарыны 17, дзе месьціцца КДБ. Увесну супрацоўнікі КДБ наведалі дэканат факультэту Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэту, на якім вучыцца Сяржук Семянюк і спрабавалі прымусіць яго распавесьці пра міжнародную і праваабарончую дзейнасьць “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў” (ЗБС). Пасьля катэгарычнай адмовы супрацоўнічаць са сьпецслужбамі Сяржук атрымаў нездавальняючую адзнаку па адным прадмеце. Цяпер выкладчык адмаўляецца прымаць іспыт у студэнта. А дэканат не дазволіў Сержуку здаваць іспыт на камісіі. Выкладчык БДАТУ Мікалай Зайко ў пачатку верасьня заявіў, што Сержуку Семянюку здавальняючую адзнаку на іспыце ён не паставіць ні ў якім разе. Сяржук пяць разоў падыходзіў да выкладчыка, але той увогуле адмаўляўся прымаць іспыт. Тады Сяржук напісаў заяву ў дэканат з просьбаю здаваць іспыт камісіі, паколькі лічыць адзнаку неаб’ектыўнай і ўпэўнены ў сваіх ведах. Менавіта для вырашэньня непаразуменьняў між студэнтам і выкладчыкам і існуе ў адукацыйным працэсе такое паняцьце як “здача іспыту камісіі”. 22 верасьня адбылося паседжаньне кафедры і дэканату, па выніках якога дэканат адмовіў у просьбе Сержука Семянюка. Відавочна, дэканат кіраваўся не прынцыпамі справядлівасьці і законнага права студэнтаў на аб’ектыўную ацэнку ведаў, а звычайным баязьлівым паслухмянствам перад загадамі ўладаў. 22 верасьня дэканат вывесіў сьпісы адлічаных – Сержука Семянюка сярод іх не было. С. Семянюк зьяўляецца актыўным сябрам ЗБС, займае пасаду сябра Рады ЗБС і рэгіянальнага каардынатара. Падчас апошняй акцыі Задзіночаньня “Шэсьце бяздомных студэнтаў” ён быў затрыманы яшчэ з двума сябрамі ЗБС. 28 верасьня ў судзе яго прызналі вінаватым у парушэньні артыкулу 166 КаАП РБ – супраціўленьне пры затрыманьні, хоць сьведкі пацьвярджаюць, што супраціву з боку Сержука не было. Сяржук атрымаў штраф у памеры 7 базавых велічыняў. Спроба сьпецслужбаў націснуць на Сержука праз відавочна незаконнае выключэньне з ВНУ расцэньваецца кіраўніцтвам ЗБС як імкненьне ўладаў нанесьці шкоду арганізацыі ў цэлым. Але Рада ЗБС заяўляе, што будзе змагацца за правы як

сяброў ЗБС, так і ўсіх беларускіх студэнтаў на годнае навучаньне ў ВНУ. З гэтага навучальнага году Сяржук Семянюк пачне навучаньне ў Віленскім педагагічным універсітэце на факультэце беларускай філалогіі і будзе працягваць актыўную дзейнасьць у межах Задзіночаньня.

***1 кастрычніка*** ў Менску затрыманы актывіст руху "Зубр" Аляксей Шыдлоўскі. Яго затрымалі на станцыі метро "Пушкінская" за распаўсюд улётак, якія запрашаюць прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу ў Менску 18 кастрычніка – у дзень пасьля правядзеньня выбараў і рэферэндуму. А. Шыдлоўскі быў дастаўлены ў РУУС Фрунзенскага раёну г.Менску, дзе быў складзены пратакол за парушэньне арт 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Згодна з пратаколам аб адміністратыўным правапарушэньні, А.Шыдлоўскі абвінавачаны ў парушэньні арт. 8 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах" (распаўсюджваў друкаваную прадукцыю з заклікам прыняць удзел у масавым мерапрыемстве да афіцынага дазволу на яго правядзеньне).

***1 кастрычніка*** журналіст і праваабаронца Валеры Шчукін быў незаконна абшуканы на Віцебскімі чыганачным вакзале. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі Валерыя Шчукіна, адвялі ў пакой міліцыі, абшукалі і запатрабавалі паказаць, што знаходзіцца ў партфелі. Яны ўважліва агледзелі ўсе дакументы. У асноўным гэта была перапіска Валерыя Шчукіна з пракуратурай, куды ён скардзіўся на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі, і яго скаргі ў Цэнтральную выбарчую камісію і офіс АБСЕ на парушэньні выбарчага заканадаўства.

***2 кастрычніка*** ў офісе Свабоднага прафсаюзу каля 30 чалавек сабраліся на сход, каб абмеркаваць пытаньні па запланаваным устаноўчым зьезьдзе новай грамадзкай арганізацыі. Праз паўгадзіны ў офіс увайшлі людзі ў цывільным і перакрылі ўсе выхады. Пасьля іх прыйшлі міліцыянты і пачалі ўсіх прысутных здымаць на відэакамеру. Нягледзячы на тое, што спадар Антончык — сябра СПБ, і ніякага дазволу ўладаў на правядзеньне сходаў у офісе сваёй арганізацыі яму ня трэба, міліцыянты склалі на яго пратакол за арганізацыю несанкцыянаванай акцыі. У судзе супрацоўнікі міліцыі свае дзеяньні аргументавалі толькі тым, што на правядзеньне сходу не было дазволу Менгарвыканкаму. Ніякія аргументы адваката Тацяны Станкевіч аб тым, што дазвол на правядзеньне сходу ініцыятыўнай групы законам не прадугледжаны, на міліцыянтаў не паўплывалі. Згодна з законам, перад устаноўчым зьездам грамадзкай арганізацыі мусіць сабрацца ініцыятыўная група, каб вызначыць заснавальнікаў і мэты аб'яднаньня. Усе чакалі, што судзьдзя спыніць гэтую справу. Таму прысуд — 15 сутак арышту — стаў поўнай нечаканасьцю для

прысутных. “Гэта, канечне, беспрэцэдэнтна, бо яшчэ ніколі ў Беларусі не прысуджалі арышт за правядзеньне сходу аргкамітэту па стварэньні грамадзкай арганізацыі. І гэта ў памяшканьні з дазволу кіраўніка і ўласьніка памяшканьня”, — заявіў Сяргей Антончык пасьля вынясеньня прысуду.

***2 кастрычніка*** машыну Хрыстафора Жэляпава пад Бешанковічамі спынілі супрацоўнікі ДАІ па надуманай падставе, маўляў, яна лічыцца ва ўгоне, начальнік Бешанковіцкага РУУС загадаў разабрацца і г.д. і не дазволілі рухацца далей. Міліцыянты адчынілі багажнік машыны і знайшлі там улёткі з заклікам сказаць “Не!” на рэферэндуме. Улёткі канфіскаваныя.

***3 кастрычніка*** ў Берасьці супрацоўнікамі батальёна патрульна-паставой службы быў затрыманы настаўнік адной са школаў горада за распаўсюд улётак антыпрэзідэнцкага зьместу.

***4 кастрычніка*** ў вёсцы Крупіца ўчастковы інсьпектар затрымаў Генадзя Таляронка, Аляксея Сычыка і Аляксея Радамана за распаўсюд улётак супраць рэферэндуму.

***4 кастрычніка*** ў Віцебску актывіста Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі Барыса Хамайду аштрафавалі на 380 тысячаў рублёў. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі Барыса Хамайду 1 кастрычніка каля Віцебскага райвыканкаму, дзе ён распаўсюджваў “Белорусскую деловую газету”, маючы невялікі плакат “Ня пойдзем на падманны рэферэндум ды псеўдавыбары”. Адразу з пастарунку, дзе на спадара Хамайду склалі пратакол за несанкцыянаванае пікетаваньне, яго даставілі ў Чыгуначны раённы суд. Але судзьдзя Алена Грабянчук адмовілася разглядаць справу паводле затрыманьня, але вырашыла завяршыць судовы працэс, адкладзены 27 верасьня па прычыне таго, што міліцыянты няправільна афармілі дакументы. Алена Грабянчук прасудзіла Барысу Хамайду штраф 20 базавых велічыняў.

***4 кастрычніка*** Гарадзенскі гарадзкі выканаўчы камітэт адмовіў старшыні мясцовай філіі БАЖ Паўлу Мажэйку ў правядзеньні 4 кастрычніка пікету пратэсту ў гарадзкім парку імя Жылібера. У адмове, падпісанай намесьнікам старшыні гарвыканкаму Валянцінам Лявонавым, адзначаецца: “Гарадзенскі гарадзкі выканаўчы камітэт ня можа даць згоды на правядзенне 4 кастрычніка 2004 году... ў сувязі з парушэньнем артыкулу 5 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”. Што канкрэтна парушыў журналіст, складаючы заяўку на пікетаванне, у лісьце не гаворыцца. Падставай пікетаваньня стала судовая справа распачатая пракуратурай супраць галоўнага рэдактара газеты “Биржа информации” Алены Раўбецкай па абвінавачаньні ў зьнявазе гонару і

годнасьці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 30 верасьня Ленінскі раённы суд пакараў журналістку штрафам у памеры 1 мільён 300 тысячаў рублёў. Пікетам пратэсту гарадзенскія журналісты мелі намер інфармаваць жыхароў горада аб чарговым узмацненні ціску на незалежную прэсу ў Беларусі.

***4 кастрычніка*** ў 12.00 пяць гарадзенскіх журналістаў сталі ў пікет на вуліцы Савецкай, пратэстуючы супраць узмацненьня ціску на незалежную прэсу. Нагодай дзеля правядзеньня акцыі стаў прысуд рэдактару газеты "Биржа информации" Алене Раўбецкай па абвінавачаньні ў распаўсюдзе абразьлівай для прэзідэнта Беларусі інфармацыі. Журналісты трымалі ў руках аркушы паперы са словамі "У Гародні судзяць журналістаў!!!". Ірына Чарняўка, Анатоль Макушын, Наталя Макушына, Павел Мажэйка і Юлія Коцкая прастаялі каля 15 хвілінаў, пасьля чаго да іх падышлі супрацоўнікі Ленінскага РАУС і запатрабавалі разысьціся. Пасьля 10-хвілінных дыскусіяў журналісты пайшлі па Савецкай вуліцы такім самым шэрагам, трымаючы лозунг. Увесь час за імі ішлі міліцыянты, адзін з якіх здымаў пікетоўцаў на відэакамеру. Пратэст журналістаў выклікаў цікавасьць мінакоў, яны спыняліся, чыталі лозунг і падыходзілі з пытаньнямі.

***5 кастрычніка*** на тры месяцы прыпыненая дзейнасьць ліцэнзіі на выданьне штотыднёвіка “Рэгіянальныя ведамасьці”. Гэтая незалежная газета выдаецца ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласьці і мае наклад 4 тысячы асобнікаў. Міністэрства інфармацыі і друку прад’явіла газеце шэраг прэтэнзіяў. У міністэрстве лічаць, што цяперашняя тэматыка, тэрыторыя распаўсюду, перыядычнасьць і мова “Рэгіянальных ведамасьцяў” не адпавядаюць інфармацыі, якая была заяўленая пры рэгістрацыі. У дэмакратычным асяродзьдзі Горак прычыны прыпыненьня ліцэнзіі лічаць фармальнымі і гавораць пра палітычныя матывы, бо “Рэгіянальныя ведамасьці” выказвалі адрозны ад афіцыйнага пункт гледжаньня на палітычную сітуацыю ў краіне — у прыватнасьці, на рэферэндум.

***5 кастрычніка*** зьніклага аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага запрасілі прыняць ўдзел у выбарах і рэферэндуме 17 кастрычніка 2004 году. Пра гэта ў Праваабарончы цэнтр “Вясна” паведаміла маці Дзьмітрыя Завадзкага – Вольга Завадзкая, якая атрымала па пошце запрашэньне на выбары для сына, які ў 2003 годзе ў судовым парадку быў прызнаны памерлым і на гэтай падставе выпісаны з кватэры. Гэты факт сьведчыць пра тое, што ўчастковыя камісіі не прынялі мераў для ўдакладненьня сьпісаў выбарашчыкаў, у тым ліку і шляхам звароту ў ЗАГСы альбо іншым чынам. Участковыя камісіі абавязаны займацца ўдакладненьнем сьпісаў выбаршчыкаў, згодна з патрабаваньнямі Выбарчага кодэксу.

***5 кастрычніка*** суд Ленінскага раёну Менску скончыў разгляд чарговага зыску ТАА "Альянс-Медиа" да рэдакцыі газеты "Народная воля" і Леаніда Левіна. Суд задаволіў зыскавыя патрабаваньні ў поўным аб`ёме і пастанавіў спагнаць з рэдакцыі 840 тысячаў рублёў на кампенсацыю дадатковых судовых выдаткаў зыскоўцы. Большую частку гэтай сумы складае аплата паслугаў адваката ТАА "Альянс-Медиа" за ўдзел у разглядзе касацыйнай скаргі рэдакцыі. (Скарга тычылася рашэньня Ленінскага раённага суда ад 18 лютага па справе аб публікацыі "Как "Обозреватель" Сергея Атрощенко по-бандитски обошёлся с Леонидом Левиным"). Нагадаем, што аналагічнае рашэньне было вынесенае судом Ленінскага раёну 29 верасьня, калі разглядаўся зыск да "Народнай волі" прадпрымальніка Сяргея Атрошчанкі. Тады судзьдзя пастанавіла спагнаць з рэдакцыі 776 тысячаў рублёў на кампенсацыю дадатковых судовых выдаткаў зыскоўцы. (Справа тычылася публікацыі "Какому бизнесу в Беларуси хорошо?").

***5 кастрычніка*** рэдакцыя недзяржаўнай газеты "Молодежный проспект" даведалася, што 20 верасьня выхад выданьня быў прыпынены на 3 месяцы загадам міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча. Міністэрства лічыць, што газета дапусьціла грубыя парушэньні артыкулу 10 Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". У сваю чаргу, галоўны рэдактар газеты Сяргей Казлоўскі ўпэўнены, што "Молодежный проспект" "стаў чарговай ахвярай зачысткі незалежных СМІ напярэдадні рэферэндуму. Як паведаміў С. Казлоўскі, "грубымі парушэньнямі" Мінінфармацыі палічыла зьмену мовы выданьня, перыядычнасьці выхаду і бясплатны распаўсюд двух сьпецнумароў газеты ў ліпені ў мікрараёне "Серабранка". Паводле С. Казлоўскага, у сьпецнумарах закраналася тэма будучых выбараў у парламент: у прыватнасьці, зьмяшчаўся выступ дзеючага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Навасяда (сузаснавальніка выданьня) і юрыста, які даваў парады грамадзянам адносна таго, як яны могуць зьменшыць верагоднасьць фальсіфікацыяў падчас выбараў. У жніўні галоўнаму рэдактару патэлефанавалі з Мінінфармацыі і зьвярнулі ўвагу на тое, што выключна руская мова і бясплатны распаўсюд не былі прадугледжаныя пры рэгістрацыі выданьня. Адразу пасьля гэтага рэдакцыя накіравала ў Мінінфармацыі ўсе дакументы, неабходныя для ўнясеньня зьменаў у рэгістрацыйнае пасьведчаньне. Газета "Молодежный проспект" заснаваная Рэспубліканскай грамадзкай моладзевай арганізацыяй "Грамадзянскі форум" і Уладзімірам Навасядам. Ён лічыць, што прыпыненьне газеты прадыктаванае апасеньнямі тых, хто парушае выбарчае заканадаўства падчас падрыхтоўкі да выбараў і рэферэндуму, убачыць свае прозьвішчы на старонках "Молодежного проспекта".

***6 кастрычніка*** Міністэрства інфармацыі прыпыніла тэрмінам на 3 месяцы выпуск недзяржаўнай газеты “Неделя”. Рэдакцыя змагла выпусьціць толькі адзін нумар выданьня. Загад падпісаў міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч 4 кастрычніка. Аднак намесьнік дырэктара прыватнага ўнітарнага прадпрыемства “Выдавецкі дом “Время”, якое выдае “Неделю”, Аляксандр Цынкевіч зазначыў, што ніякай інфармацыі аб прэтэнзіях да газеты яму не паступіла. 5 кастрычніка газету правярала падатковая інсьпекцыя, але размова інсьпектароў з кіраўніцтвам газеты была перанесеная. Юрыдычных падставаў дзеля перасьледу выданьня няма, заявіў спадар Цынкевіч, толькі палітычныя: “Рэжым гэта робіць не ад сваёй сілы, а ад сваёй слабасьці. Улада не адчувае сваёй упэўненасьці, і для таго, каб перакрыць крыніцы інфармацыі для народу, яны закрываюць прэсу”. Як паведаміў спадар Цынкевіч, газета "Неделя" вымушаная была друкавацца ў Смаленску, бо ва ўсіх беларускіх друкарнях, у якія зьвярталася кіраўніцтва рэдакцыі, з імі адмовіліся супрацоўнічаць, “Белсаюздрук” і “Белпошта” адмаўляліся заключаць дамовы на распаўсюд газеты.

***6 кастрычніка*** праваабаронцу Тацяну Рэвяку аштрафавалі на 5 базавых велічыняў (95 тысячаў рублёў) за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных. Штраф вынесены адміністратыўнай камісіяй пры адміністрацыі Першамайскага раёну г. Менску.

***6 кастрычніка*** зьніклага пяць гадоў таму палітыка Віктара Ганчара запрасілі прыняць удзел у рэферэндуме. На хатні адрас, дзе жыў Віктар Ганчар, прыйшло адрасаванае яму запрашэньне прыйсьці на выбары і рэферэндум. Жонка зьніклага палітыка лічыць гэта паказчыкам “чысьціні” будучага апытаньня насельніцтва адносна трэцяга тэрміну Аляксандра Лукашэнкі. Зінаіда Ганчар атрымала запрашэньне прыйсьці 17 кастрычніка на выбарчы ўчастак разам з мужам Віктарам Ганчаром і сынам Андрэем. Жонка зьніклага пяць гадоў таму віцэ-спікера заяўляе, што для яе гэта ёсьць паказчыкам сумленнасьці тых, хто арганізуе выбары і рэферэндум. Менавіта жыльлёва-камунальныя службы пастаўляюць у выбарчыя камісіі зьвесткі, на падставе якіх складаюцца сьпісы выбаршчыкаў. Зінаіда Ганчар згадала 1990-я гады, калі супрацоўнікі ЖЭСаў удакладнялі гэтыя зьвесткі, адмыслова наведваючыся ў кватэры. Цяпер, паводле Зінаіды Ганчар, ніхто такой карэктыроўкі не рабіў.

***6 кастрычніка*** ў Гомелі супрацоўнікі міліцыі затрымалі старшыню рэгіянальнага аддзяленьня Беларускага Хельсінкскага камітэту Алеся Яўсеенку. Ён перавозіў з кіроўцам на мікрааўтобусе 30 тысячаў асобнікаў інфармацыйнага бюлетэню Грамадзянскай ініцыятывы “Партнёрства”. Бюлетэнь цалкам прысьвечаны выбарам і рэферэндуму наконт працягу паўнамоцтваў Аляксандра

Лукашэнкі. Адзін з цэнтральных артыкулаў бюлетэню называецца “Референдум вне закона”. У міліцэйскім пастарунку Чыгуначнага раёну Гомелю Алеся Яўсеенку трымалі амаль тры гадзіны. На яго складзены пратакол аб парушэньні артыкулу 172 Адміністратыўнага кодэксу – распаўсюд друкаваных выданьняў, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку.

***6 кастрычніка*** Гомельскі гарвыканкам не дазволіў 11 гараджанам ладзіць пікеты супраць пажыцьцёвага прэзідэнцтва Лукашэнкі.

***7 і 8 кастрычніка*** супрацоўнікі праваахоўных органаў Гомелю і рэгіёну правялі некалькі сьпецыяльных аперацыяў супраць сяброў ліквідаванага Гомельскага абласнога грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянскія ініцыятывы” і незарэгістраванай уладамі “Грамадзянскай альтэрнатывы”. Міліцыя падазравала грамадзкіх актывістаў у крадзяжы рэчаў і ўгоне аўтамабіля, а пасьля шукала ў офісе арганізацыі бомбу. 7 кастрычінка ў офіс “Грамадзянскіх ініцыятываў” прыйшоў участковы, які паведаміў, што ў мікробусе юрысконсульта арганізацыі Леаніда Судаленкі знаходзяцца скрадзеныя рэчы. Абвесьціўшы, што аўтобус мусіць быць абшуканы, участковы выклікаў падмацаваньне. Але калі каля офісу зьявіліся дадатковыя сілы міліцыі, высьветлілася, што мікробус бясьсьледна зьнік. Праз дзьве гадзіны ён такім жа таямнічым чынам зьявіўся перад ганкам офісу. Па словах старшыні аб’яднаньня “Грамадзянская альтэрнатыва” Уладзіміра Кацоры, з салону мікробусу нічога ня зьнікла і не зьявілася нічога лішняга. На наступны дзень, 8 кастрычніка, Леанід Судаленка, якога не зарэгістравалі ў якасьці кандыдата ў дэпутаты, на тым жа аўтобусе выехаў у Хойнікі. Там ён меў намер падзякаваць выбарцам за аказаную падтрымку і агітаваць іх галасаваць “супраць” на рэферэндуме. На пад’езьдзе да Хойнікаў мікробус сп.Судаленкі быў заблакаваны міліцыяй і ДАІ. Супрацоўнікі праваахоўных органаў заявілі, што аўтобус угнаны. У выніку сп.Судаленку затрымалі, а машына была абшуканая. Тым часам у Гомелі ў офісе “Грамадзянскіх ініцыятываў” зьявіўся маёр міліцыі, які паведаміў, што ў будынку знаходзіцца выбуховае прыстасаваньне. Праз некалькі хвілінаў будынак быў ачэплены міліцыяй, актывісты арганізацыі пакінулі памяшканьне. Па ацэнках Уладзіміра Кацоры, які ў гэты час пад’язджаў да офісу арганізацыі, у аперацыі па абяшкоджаньні прыстасаваньня было задзейнічана ня менш за 80 чалавек, сярод якіх былі начальнік РУУС і пракурор Савецкага раёну Гомелю. “Дзьверы ў памяшканьне аказаліся зачыненымі, і міліцыя ўжо хацела іх узломваць, калі пад’ехаў я”, — расказаў сп.Кацора. Ён пагадзіўся адчыніць дзьверы пры ўмове, што ўнутр увойдуць толькі сьпецыяліст-выбухатэхнік і два міліцыянты. Але калі дзьверы адчынілі, то ў офіс рванулася больш за дзесятак супрацоўнікаў міліцыі. Выбуховага прыстасаваньня ў офісе не было знойдзена, што

супрацоўнікі міліцыі адлюстравалі ў пратаколе агляду. У заўвагах да пратаколу сп.Кацора запісаў, што ў будынку пры аглядзе было шмат пабочных людзей. Як мяркуюць актывісты “Грамадзянскіх ініцыятываў”, падзеі 7 і 8 кастрычніка мелі “прафілактычны” характар і былі скіраваныя ў першую чаргу на канфіскацыю інфармацыйных матэрыялаў, падрыхтаваных да мітынгу 10 кастрычніка. Дадзенае мерапрыемства, арганізаванае дэмакратычнымі сіламі рэгіёну, скіраванае супраць рэферэндуму.

***7 кастрычніка*** супрацоўнікі міліцыі затрымалі актывістаў выбарчых штабоў кандыдатаў у дэпутаты Зінаіды Бандарэнкі ў Смаргоні і Юрыя Хадыкі ў Менску. Затрыманых абвінавацілі ў парушэньні грамадзкага парадку і склалі пратаколы паводле розных артыкулаў Адміністратыўнага кодэксу. Да 10-й гадзіны вечара Зінаіда Бандарэнка заставалася ў Смаргонскім аддзеле міліцыі разам з чатырма сваімі памочнікамі. Хлопцаў затрымалі, калі яны раскідвалі выбарчыя ўлёткі ў паштовыя скрыні. Міліцыянты патлумачылі, што ўлёткі выраблены нібыта не ў друкарні, што супярэчыць выбарчаму заканадаўству. Увесь наклад пакінулі ў міліцыі, а на затрыманых склалі пратаколы. Зінаіда Бандарэнка прад’явіла кіраўніку міліцыі ліцэнзію, але ён яе праігнараваў. Дзьве гадзіны правялі ў дзяжурнай частцы міліцыі трое ўдзельнікаў дазволенага агітацыйнага пікету Юрыя Хадыкі. Ларысу Ляпарскую абвінавацілі ў распаўсюдзе друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак за налепку на рукаве “Скажы – не”. Яшчэ двух удзельнікаў пікету абвінавацілі ў тым, што яны трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі.

***7 кастрычніка*** актывістаў выбарчай кампаніі і кіраўніка берасьцейскай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) некалькі гадзінаў пратрымалі ў міліцэйскім пастарунку, дзе спрабавалі давесьці, што яны ня маюць права займацца агітацыяй. У Камянец актывісты ініцыятыўнай групы Анатоля Ляўковіча, які вылучаўся кандыдатам у дэпутаты ў Белавежскай выбарчай акрузе №7, прыехалі, каб распаўсюдзіць афіцыйныя агітацыйныя матэрыялы пра свайго кандыдата. Аднак мясцовыя міліцыянты спынілі гэтыя дзеяньні, спаслаўшыся на загад свайго начальніка Васіля Якімука. Затрыманых адвезьлі ў пастарунак, дзе прымусілі пісаць тлумачальныя запіскі.

***8 кастрычніка*** Венецыянская камісія Рады Еўропы вынесла заключэньне аб тым, што прапанаванае Аляксандрам Лукашэнкам пытаньне рэферэндуму не адпавядае еўрапейскім стандартам. На падставе каментароў двух экспертаў, італьянца Серджыа Бартоле і ірландца Мэцью Расела, Венецыянская камісія ўхваліла выснову, якая зазначае, што “вынесенае на рэферэндум пытаньне выклікае шэраг пярэчаньняў, у прыватнасьці:

- яно часткова знаходзіцца ў наўпроставай супярэчнасьці з выбарчым заканадаўствам;
- яно зьмешвае незаконны прывілей для адной асобы з пытаньнем большай, агульнай значнасьці;
- яго прыняцьце далей пагоршыць дэфіцыт дэмакратыі ў краіне, які ўжо характэрызуецца празьмернымі паўнамоцтвамі прэзідэнта без адэкватных стрымліваньняў і супрацьвагаў;
- існуе заклапочанасьць адносна таго, ці будзе магчымае свабоднае і справядлівае галасаваньне”.

Венецыянская камісія таксама адзначае, што “некаторых, аднак ні ў якім разе ня ўсіх з гэтых заклапочанасьцяў і пярэчаньняў можна было б лёгка пазьбегнуць, калі б прэзідэнт абмежаваў рэферэндум канстытуцыйным пытаньнем, заявіўшы сваю кандыдатуру на трэці тэрмін пасьля таго”. Паводле камісіі, “тое, што ён зрабіў гэта ня так, уводзячы дадаткова відавочна незаконны асабісты элемент у пытаньне рэферэндуму, паказвае падыход да функцыянаваньня дзяржавы, які наўпрост супярэчыць еўрапейскім дэмакратычным стандартам”.

***8 кастрычніка*** ў Першамайскім раённым судзе Віцебску Валерыя Шчукіна прызналі вінаватым у аказаньні супраціву міліцыянтам, якія выконвалі службовыя абавязкі. Паводле сьведчаньня Валерыя Шчукіна, ніякага супраціву міліцыянтам, якія затрымлівалі яго 7 кастрычніка, ён не аказваў, а міліцыянты самі справакавалі той інцыдэнт, які адбыўся на прасьпекце Будаўнікоў. На судзе міліцыянты-сьведкі самі не адмаўлялі таго, што вакол іх быў утварыўся вялікі натоўп, што людзі абураліся такім гвалтам над немаладым ужо чалавекам, і што яны, каб не прыцягваць залішне ўвагу грамадзкасьці, мусілі як хутчэй запхнуць спадара Шчукіна ў машыну ды адвезьці ў пастарунак. У Першамайскім райаддзеле на яго склалі пратакол аб тым, што ён адмаўляўся падпарадкоўвацца загадам супрацоўнікаў міліцыі. Судзьдзя Першамайскага суду Валянціна Кісьмярошкіна цалкам падзяліла пазіцыю міліцыянтаў і прызнала Валерыя Шчукіна вінаватым. З улікам таго, што за распаўсюд улётак яго затрымлівалі ўжо неаднаразова, спадарыня Кісьмярошкіна прысудзіла апазіцыянеру 10 сутак арышту.

***8 кастрычніка*** ў Барысаве за распаўсюд кнігі “Случайный президент” на 10 сутак арыштаваны актывіст руху “Зубр” Аляксандр Казакоў. Ноч з 8 на 9 кастрычніка ён правёў ў КПЗ Барысаўскага ГУУС, а 11 кастрычніка асуджаны па арт.156 КаАП (дробнае хуліганства) на 10 сутак.

***8 кастрычніка*** стала вядома пра факт выкарыстаньня цэнзуры ў менскім Палацы мастацтваў. З традыцыйнай выстава Саюзу мастакоў “Восень-2004” зьнятая карціна кіраўніка суполкі “Пагоня” Аляксей Марачкіна пад назвай “Якія самі, такі і наш Саня, або Падман-2004”. Сам Марачкін схільны называць інцыдэнт нават не забаронай твору, а яго арыштам, прынамсі – часовым затрыманьнем: “Гэтую карціну я напісаў якраз да выбараў і рэферэндуму. Я там супаставіў як бы дзьве эпохі. Гэта – 50-я гады, такі дакументальны фотаздымак 50-х гадоў, калі журналіст расставіў на выбарчым участку людзей. І гэты здымак прайшоўся па ўсіх газетах. Я паказаў там як бы ў двух вымярэньнях, што ў нас фактычна ёсьць дзьве Беларусі: адна Беларусь застрашаная, каторая падаўляецца сродкамі масавай інфармацыі, замбіруецца. Другая Беларусь, якая ня хоча жыць пад такім ціскам, хоча быць вольнай і свабоднай”.

У ***ноч з 8 на 9 кастрычніка*** ў Менску за расклейку ўлётак супраць рэферэндуму быў затрыманы Юрый Чавусаў. Затрыманага даставілі ў РУУС Савецкага раёну, дзе быў складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па артыкуле 143 КаАП “парушэньне правілаў добраўпарадкаваньня населеных пунктаў”. Таксама міліцыянты канфіскавалі больш за 250 супрацьрэферэндумных улётак. Праз дзьве гадзіны затрыманага адпусьцілі.

***10 кастрычніка*** ў Менску прайшоў перадвыбарчы і антырэферэндумны мітынг дэмакратычнай апазіцыі. Гэтая акцыя праходзіла пад лозунгам: “Беларусі – так, Лукашэнку – не!”. Міліцыя канфіскавала некалькі транспарантаў і затрымала трох удзельнікаў гэтай акцыі. У мітынгу на плошчы Бангалор, дазвол на правядзеньне якога ад гарадзкіх уладаў атрымаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Скрабец, удзельнічала каля паўтысячы чалавек. Міліцыянты адразу пачалі паводзіць сябе даволі жорстка. У многіх людзей правяралі асабістыя рэчы, шукаючы антырэферэндумныя транспаранты. Такім чынам затрымалі маладафронтаўцаў Зьміцера Дашкевіча і Барыса Гарэцкага. У хлопцаў забралі транспарант з надпісам “Не трэцяму тэрміну!” і адвезьлі ў пастарунак. Затрымалі і сябра ПКБ Уладзіміра Карпухіна. Гурту “Палац” забаранілі выступаць на мітынгу. Амапаўцы таксама забралі вялікі транспарант з надпісам “Беларусі – так, Лукашэнку – не!”.

***10 кастрычніка*** ў Гомелі каля паўтысячы гараджанаў узялі ўдзел у мітынгу супраць трэцяга тэрміну прэзідэнта. Гарвыканкам дазволіў акцыю ля Палацу глухіх на вуліцы Юбілейнай. На мітынгу, які праходзіў пад лозунгам: “Беларусі –так! Лукашэнку – не!”, выступілі кандыдаты ў дэпутаты ад кааліцыі “Пяцёрка-плюс” Алесь Карніенка, Юрый Варонежцаў, Віктар Хоміч ды іншыя. Падчас мітынгу распаўсюджвалася кніга П.Шарамета і С.Калінкінай “Случайный президент”. Пасьля

мітынгу міліцыя затрымала легкавік сябра АГП Уладзіміра Кацоры. Яго прымусілі ехаць у Чыгуначны РАУС, дзе ўчынілі пeратрус: шукалі кнігу. Аднак у легкавіку міліцыянты знайшлі толькі падшыўкі старых газетаў.

***11 кастрычніка*** Міністэрства юстыцыі адхіліла скаргу АГП па пытаньні ануляваньня Васняцоўскай пярвічнай арганізацыі Заводзкага раёну г. Менску. Кіраўніцтва партыі лічыць, што дадзеная структура была ліквідаваная 10 верасьня 2004 году незаконна, паколькі “па інфармацыі, якая маецца ў прэс-службы АГП, 10 верасьня ўдзень упраўленьне юстыцыі прыняло рашэньне аб ліквідацыі, а праверку правяло толькі ўвечары таго ж дня”. У выніку гэтых дзеяньняў прэтэндэнт у кандыдаты па Васьняцоўскай акрузе, першы міністр абароны незалежнай Беларусі Павел Казлоўскі ня быў зарэгістраваны. Скарга на дзеяньні ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму была накіраваная ў Міністэрства юстыцыі, але яно адмовіла ў разглядзе па той прычыне, што нібыта ў сябра партыі, на кватэры якога зарэгістраваная “пярвічка”, няма асобнага ўваходу.

***11 кастрычніка*** ў Віцебску за распаўсюд улётак затрымалі непаўнагадовага Вячаслава Андрэева. Вучань віцебскай сярэдняй школы №6 і актывіст моладзевай суполкі “Сёмая грань” распаўсюджваў улёткі з заклікам сказаць “не” на рэферэндуме. Вячаслаў Андрэеў раскладаў улёткі па паштовых скрынях. Міліцыянты з Кастрычніцкага райаддзелу падпільнавалі хлопца на вуліцы, затрымалі яго і завезьлі ў пастарунак. Там усе ўлёткі, якія былі пры ім – а гэта некалькі сотняў асобнікаў – канфіскавалі, а на самога Вячаслава Андрэева склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных. Праз некалькі гадзінаў хлопца адпусьцілі, сказаўшы, што паведамяць пра ягонае правапарушэньне ў камісію па справах непаўнагадовых.

***11 кастрычніка*** ў віцебскага бізнэсмена канфіскавалі 8 тысячаў асобнікаў кнігі Сьвятланы Калінкінай і Паўла Шарамета “Случайный президент”. На думку кіроўцы, які перавозіў кнігі, за ягонай машынай сачылі. Бо як толькі ён спыніўся, каб зрабіць дробны транспартны рамонт каля вёскі Бабінічы недалёка ад Віцебску, да яго тут жа пад’ехалі супрацоўнікі раённай міліцыі і аддзелу па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. У пастарунку ён правёў амаль 12 гадзінаў, спадзеючыся, што яму або вернуць кнігі, або хаця б складуць пратакол пра тое, што іх насамрэч забралі міліцыянты. Супрацоўнікі міліцыі адмовіліся складаць такі пратакол, затое кожны з іх ужо прачытаў твор Сьвятланы Калінкінай і Паўла Шарамета падчас свайго дзяжурства.

***11 кастрычніка*** супрацоўнікі міліцыі затрымалі двух сяброў моладзевай арганізацыі “Задзіночаньне беларускіх студэнтаў” за распаўсюд улётак з заклікам да студэнтаў ня ўдзельнічаць у датэрміновым галасаваньні. Сержука Семянюка і Васіля Лепеша затрымалі ў двары дома, дзе месьціцца офіс арганізацыі. Затрымаў іх міліцыянт, які нёс службу каля Латвійскай амбасады. Ён выклікаў патрульную машыну. У хлопцаў у заплечніках знайшлі каля дзьвюх сотняў улётак, на якіх вялізнымі літарамі напісана “Не заганяйся!”, а таксама заклік ня ўдзельнічаць у датэрміновым галасаваньні. Міліцыянты патлумачылі юнакам, што не дапусьцяць, каб гэтыя ўлёткі трапілі па прызначэньні. Хлопцаў даставілі ў РУУС Савецкага раёну. Іх абвінавацілі ў адміністратыўным правапарушэньні (арт. 172.3 КаАП РБ – распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных).

***12 кастрычніка*** суд адмовіўся разглядаць скаргу Вольгі Завадзкай на дзеяньні службовых асобаў рэспубліканскай пракуратуры, а заяву маці выкрадзенага журналіста аб узбуджэньні справы “па наноў адкрыўшыхся абставінах” забраў асабіста Генеральны пракурор РБ В.Шэйман. Маці выкрадзенага ў ліпені 2000 году тэлеаператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага Вольга Рыгораўна атрымала адказ з суда Цэнтральнага раёну г. Менску на яе скаргу на дзеяньні службовых асобаў Пракуратуры Рэспублікі Беларусь. У сваёй скарзе Вольга Завадзкая прасіла суд абавязаць супрацоўнікаў пракуратуры даць ёй матываваны адказ на заяву аб узбуджэньні крымінальнай справы па справе яе сына “па наноў адкрыўшыхся абставінах” у сувязі з выступам А. Лукашэнкі. Пракуратура Рэспублікі Беларусь ніяк не адрэагавала на заяву маці Дзьмітрыя Завадзкага, і яна падала скаргу на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў пракуратуры. З суда прыйшоў адказ – рашэньне судзьдзі Цэнтаральнага раёну г. Менску Ганчар С.В., у якім сказана: “....паколькі заяўнікам абскарджваюцца дзеяньні службовых асобаў Пракуратуры Рэспублікі Беларусь (...), скарга не падлягае разгляду ў судзе у сувязі з яе непадведамаснасьцю”. У Рэспубліканскай Пракуратуры Вользе Рыгораўне сказалі, што адказу на яе заяву ня будзе, паколькі заяву забраў асабіста Генпракурор Віктар Шэйман, і ніякага распараджэньня па гэтай справе супрацоўнікам пракуратуры не даваў. Вольга Рыгораўна будзе абскарджваць адмову на імя старшыні суда Цэнтральнага раёну, а пры неабходнасьці – у судзе вышэйшай інстанцыі.

***12 кастрычніка*** Міністэрства інфармацыі адмяніла свой загад аб прыпыненні на 3 месяцы недзяржаўнай маладзечанскай "Рэгіянальнай газеты". Сузаснавальнік і галоўны рэдактар выданьня Аляксандр Манцэвіч не выключае, што гэта зьвязана з вялікай колькасьцю чытацкіх скаргаў, якія паступілі на адрас Міністэрства інфармацыі пасьля прыпыненьня газеты. У загадзе міністра У. Русакевіча аб адмене

папярэдняга загаду апошняе рашэньне ніяк не аргументуецца. У той жа час, як паведаміў А. Манцэвіч, нядаўна ў рэдакцыю патэлефанаваў супрацоўнік мінінфармацыі, які паведаміў, што ў іх ужо назьбіраўся цэлы стос лістоў пратэсту ад чытачоў "Рэгіянальнай газеты" ў сувязі з яе прыпыненьнем. Акрамя гэтага, сам галоўны рэдактар пасьля прыпыненьня газеты пачаў збор подпісаў за адмену загаду. (Толькі за адзін дзень ён назьбіраў 235 подпісаў). Яшчэ адной з магчымых прычынаў перагляду міністэрствам свайго рашэньня Аляксандр Манцэвіч лічыць тое, што выданьне аператыўна адрэагавала на выстаўленыя прэтэнзіі. Яшчэ ў канцы верасьня рэдакцыя падала ў Мінінфармацыі ўсе неабходныя дакументы для ўнясеньня зьменаў у рэгістрацыйнае пасьведчаньне і адразу ж аплаціла рэгістрацыйны збор.

***12 кастрычніка*** Міжнародная асацыяцыя газетаў і Міжнародны форум рэдактароў у лісьце да Аляксандра Лукашэнкі выказалі занепакоенасьць кампаніяй уладаў Беларусі па закрыцьці незалежных выданьняў. 5 кастрычніка міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч прыпыніў выхад газеты “Неделя” на тры месяцы. Ніякіх прычынаў часовага закрыцьця выданьня не было названа. Міжнародная асацыяцыя газетаў і Міжнародны форум рэдактароў выказалі заклапочанасьць закрыцьцём газеты “Неделя” як часткай кампаніі ўладаў па ўціску крытыкі падчас парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. “За апошнія месяцы прынамсі пяць выданьняў былі часова альбо назаўжды зачыненыя”, – сказана ў звароце. Апрача “Недели”, гэта “Рэгіянальная газета”, “Навінкі”, “Новая газета Сморгони” і “Рабочая салідарнасьць”. Міжнародная асацыяцыя газетаў і Міжнародны форум рэдактароў рэкамендуюць дасылаць свае пратэсты прэзідэнту Беларусі і нагадаць яму, што закрыцьцё “Недели” і іншых выданьняў зьяўляецца відавочным парушэньнем свабоды выказваньня, якая гарантуецца шэрагам міжнародных пагадненьняў, у тым ліку Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека. Міжнародныя журналісцкія арганізацыі заклікалі кіраўніка Беларусі адмяніць закрыцьцё шэрагу выданьняў і зрабіць усе неабходныя крокі, каб у будучыні Беларусь цалкам паважала міжнародныя стандарты свабоды выказваньняў,

***12 кастрычніка*** на сем сутак за правядзеньне пікету арыштаваны жыхар Гародні Генадзь Скрабоўскі, які правёў у цэнтры гораду пікет супраць пажыцьцёвага праўленьня Аляксандра Лукашэнкі. Выйсьці на пікет, па словах Генадзя, яго вымусіла “нахабная агітацыйная кампанія, якая праводзіцца ў дзяржаўных СМІ”.

***12 кастрыніка*** старшыня Віцебскай-Горкаўскай акруговай выбарчай камісіі Сьвятлана Мянжынская адмовілася прадаставіць інфармацыю журналісту недзяржаўнай газеты "Витебский курьер" Уладзіміру Жыгулову. Спачатку

Мянжынская пагадзілася на размову, але пасьля заявіла, што ня будзе адказваць на пытаньні журналіста і наогул "не жадае мець справаў з прэсай". "Пакуль ня прыме рашэньня Цэнтрвыбаркам, я нічога ня буду гаварыць", -- заявіла старшыня камісіі. Тэмай размовы мелася стаць пазбаўленьне камісіяй рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты ПП НС Паўла Севярынца пасьля ягонага выступу на абласным радыё. Мянжынская нагадала, што пазбаўлены рэгістрацыі кандыдат паскардзіўся на дзеяньні камісіі ў пракуратуру, і дала суразмоўцу зразумець, што вельмі незадаволеная гэтым учынкам.

***13 кастрычніка*** міністра спорту і турызму Юрыя Сівакова не дапусьцілі да ўдзелу ў канферэнцыі міністраў спорту еўрапейскіх краінаў у Будапешце 14–15 кастрычніка.

***13 кастрычніка*** адміністратыўная камісія Чыгуначнага раёну г.Гомелю вынесла папярэджаньне старшыні Гомельскага аддзяленьня БХК Алесю Яўсеенку, машыну якога 6 кастрычніка спынілі на адным з пастоў ДАІ і канфіскавалі наклад бюлетэню, накіраванага супраць рэферэндуму.

***13 кастрычніка*** ў Віцебску пры распаўсюдзе улётак, зьмест якіх датычыць пытаньняў, што вынесеныя на рэферэндум, быў затрыманы супрацоўнікам Першамайскага РУУС актывіст Праваабарончага цэнтру “Вясна” Міхаіл Паўлаў. Затрыманы дастаўлены ў Першамайскі РАУС, дзе складзены пратакол па парушэньні арт. 172-3 (распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных). Пры асабістым даглядзе ў М. Паўлава знайшлі 12 таблетак "Метыянін", якія свабодна прадаюцца праз аптэкі і не зьяўляюцца наркатычным альбо моцнадзейсным сродкам. Нягледзячы на даведкі, атрыманыя з аптэкаўпраўленьня супрацоўнікамі міліцыі па тэлефоне, пратакол выняцьця лекавага сродку ўсё ж склалі, а лекі адправілі на эксьпертызу. Пратакол адміністратыўнага правапарушэньня накіравалі на разгляд адміністратыўнай камісіі. Падчас знаходжаньня ў памяшканьні Першамайскага РАУС Міхаіл Паўлаў пачуў, як дзяжурны афіцэр капітан Абрамовіч аддаваў па тэлефоне загад міліцыянтам на выбарчых участках наступнага зьместу: неадкладна паведамляць яму, афіцэру дзяжурнай часткі Першамайскага РАУС, дадзеныя аб усіх назіральніках, якія прыбываюць на выбарчыя ўчасткі.

***13 кастрычніка*** на станцыі метро “Няміга” быў затрыманы актывіст Аб’яднанай грамадзянскай партыі Андрэй Козел. Суд Цэнтральнага раёну г.Менску вынес рашэньне пра 4 сутак адміністратыўнага арышту за “хуліганства”. А. Козел накіраваны адбываць пакараньне ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку, але,

паведамляючы ў офіс АГП пра сваё затрыманьне, Андрэй адзначыў, што ён не рабіў ніякіх дзеяньняў, якія можна кваліфікаваць як адміністратыўнае правапарушэньне.

***13 кастрычніка*** міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч вынес папярэджаньне рэдакцыі недзяржаўнай газеты "Бобруйский курьер". У рэдакцыі пра гэта даведаліся, атрымаўшы ліст з міністэрства. Выданьне абвінавачваюць у тым, што яно публікуе рэкламныя абвесткі пра дзейнасьць, якая патрабуе ліцэнзіі, "без пацьверджаньня рэкламадаўцам права на ажыцьцяўленьне такой дзейнасьці" (парушэньне арт. 30 Закону аб друку). На думку галоўнага рэдактара “Бобруйского курьера” Анатоля Санаценкі, санкцыі міністэрства сталі следзтвам нядаўняй публікацыі вынікаў вулічнага апытаньня бабруйчанаў наконт іх стаўленьня да рэферэндуму. Акрамя гэтага, у газеце некалькі разоў зьяўляліся артыкулы з крытыкай у адрас мясцовага кіраўніцтва. А. Санаценка паведаміў, што будзе спрабаваць абскардзіць вынесенае папярэджаньне.

***14 кастрычніка*** Міністэрства юстыцыі Беларусі часова адмовілася ад прэтэнзіяў да Беларускага Хельсінкскага камітэту. У Міністэрстве юстыцыі Беларусі фактычна прызналі, што паўторны зыск у Вярхоўны суд аб ліквідацыі Беларускага Хельсінкскага камітэту ня будзе накіраваны. У сярэдзіне верасьня ў Вярхоўны суд быў накіраваны зыск аб ліквідацыі БХК, аднак Вярхоўны суд зыск Мінюсту накіраваў на дапрацоўку, адвёўшы на гэта 2 тыдні. Мінула нават больш часу, але новы зыск у Вярхоўным судзе не зьявіўся. У прыватных размовах чыноўнікі Мінюсту прызнаюць, што “перабольшылі” з прэтэнзіямі да БХК, аднак публічна пра гэта не выказваюцца.

***14 кастрычніка*** Беларускі дом друку адмовіўся друкаваць газету "Товарищ" – выданьне Цэнтральнага камітэту Партыі камуністаў Беларускай. Напачатку рэдакцыі паведамілі, што ў друкарні "няма тэхнічных магчымасьцяў" надрукаваць нумар, а потым заявілі, што рэдакцыйнае кіраўніцтва павінна было загадзя падаць заяўку на выпуск выданьня большым накладам. 13 кастрычніка рэдакцыя замовіла замест звычайных сямі тысячаў выпуск 30 тысячаў асобнікаў газеты. 23 з іх планавалася распаўсюдзіць бясплатна. Друкарня без усялякіх пытаньняў прыняла гэтую замову. Аднак ужо раніцай 14 кастрычніка рэдактару выданьня Сяргею Вазьняку заявілі, што пры замове "павышанага" накладу трэба загадзя падаваць адмысловую заяўку. У гэтым нумары "Товарища" быў зьмешчаны тэкст "прамой лініі" лідэра ПКБ, кандыдата ў дэпутаты ПП НС Сяргея Калякіна з чытачамі па пытаньнях выбараў і рэферэндуму. Асноўным "слоганам" нумару меўся стаць заклік "Беларуси – да, Лукашенко – нет!". Сп. Вазьняк упэўнены, што рэдакцыі адмовілі пасьля таго, як кіраўніцтва друкарні азнаёмілася са зьместам нумару.

***14 кастрычніка*** ў Баранавічах былі затрыманыя тэлежурналісты з Польскай інфармацыйнай групы Першага тэлеканалу. Польскія тэлежурналісты прыехалі ў Беларусь, каб асьвятляць падзеі, зьвязаныя з выбарамі і рэферэндумам. Уначы на польска-беларускай мяжы ў Берасьці іх сустракаў консул. Яны кіраваліся ў Менск, каб атрымаць акрэдытацыю, дакументы на якую папярэдне былі дасланыя ў беларускі МЗС, але па дарозе заехалі ў Баранавічы. У Баранавічах яны сустрэліся з кандыдатам у дэпутаты ад АГП Сяргеем Андрушчанкам, а таксама з сябрамі Праваабарончага цэнтру “Вясна” і некаторымі іншымі мясцовымі дэмакратычнымі актывістамі. Пасьля сустрэчы журналісты разам з кіраўніком Баранавіцкага аддзяленьня “Вясны” Сяргеем Гоўшам выйшлі на вуліцу з офісу, каб там зрабіць здымкі. На вуліцы іх ужо чакалі трое супрацоўнікаў міліцыі, у тым ліку адзін палкоўнік. Яны запатрабавалі прадставіць акрэдытацыю. Журналісты пачалі тлумачыць, што яны накіроўваюцца ў Менск дзеля яе атрыманьня, але іх слухаць ня сталі, а пасадзілі ў міліцэйскую машыну і павезьлі ў аддзяленьне міліцыі. Пасьля праверкі дакументаў у аддзяленьні міліцыі польскіх тэлежурналістаў адпусьцілі. Правяралі іх ня толькі міліцыянты, але і супрацоўнік КДБ.

***14 кастрычніка*** пракуратура г. Менску адмовілася ўзбудзіць крымінальную справу супраць антысеміцкіх выдаўцоў. З позвай у пракуратуру кіраўніцтва Саюзу беларускіх габрэйскіх аб’яднаньняў і грамадаў зьвярнулася ў пачатку сакавіка. Арганізацыя прасіла распачаць крымінальную справу супраць фірмы “Праваслаўная ініцыятыва" за распаўсюд зьвестак, што распальваюць рэлігійную і нацыянальную варожасьць, а таксама скіраваных на прыніжэньне нацыянальных гонару і годнасьці габрэйскага народу. Саюз зьвяртаў увагу на кнігу “Война по законаа подлости”, выдадзеную “Праваслаўнай ініцыятывай”. Старшыня Саюзу габрэйскіх арганізацыяў Беларусі Я.Басін назваў адмову пракуратуры "дастаткова тэндэнцыйнай, якая не адлюстроўвае сапраўднага становішча з праявамі антысемітызму ў краіне". Кіраўніцтва Саюзу мае намер абскарджваць рашэньне сталічнай пракуратуры ў вышэйшых інстанцыях.

***15 кастрычніка*** Міністэрства інфармацыі Беларусі прыпыніла на адзін месяц выхад ваўкавыскай недзяржаўнай “Местной газеты”. Улады абвінавачваюць рэдакцыю ў парушэньні шэрагу артыкулаў Закону “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі”. Галоўны рэдактар “Местной газеты” Андрэй Шантаровіч зьвязвае прыпыненьне выданьня з выбарчай і рэферэндумнай кампаніяй і абяцае, што газета неўзабаве выйдзе пад другой назвай. У загадзе міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча гаворыцца, што рэдакцыя “Местной газеты” вінаватая ў распаўсюдзе несапраўдных зьвестак аб прыпыненьні выхаду “Новой газеты Сморгони”. Рашэньне

Міністэрства інфармацыі па справе смаргонскага тыднёвіка “Местная газета” назвала незаконным. Ваўкавыскае выданьне таксама абвінавачваюць у публікацыі рэкламных абвестак пра дзейнасьць, якая патрабуе ліцэнзаваньня. Міністр таксама лічыць, што “Местная газета” дагэтуль не зьмяніла статусу з гарадзенскага рэгіянальнага на раённы. Таму на месяц выхад газеты спынены.

***15 кастрычніка*** ў Менску за расклейку антыпрэзідэнцкіх плакатаў затрыманы Юрый Чавусаў. У 3 гадзіны ночы міліцыянты схапілі Юрыя Чавусава ля стэнду з агітацыйнымі афішамі, дзе ён наклейваў плакат “Лукашенко зажрался”. Затрыманага даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе быў складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні па артыкуле 143 КаАП і акт выманьня 6 плакатаў.

***15 кастрычніка*** гарадзенская міліцыя распачала паляваньне на валанцёраў Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў, якія праводзяць апытаньне ля выбарчых участкаў – гэтак званы “экзіт-пул”. Аляксей Салей быў затрыманы і дастаўлены ў Ленінскі РАУС. У кватэры астатніх наведалася міліцыя з патрабаваньнем выдаць мабільныя тэлефоны. Фармальнай падставай для перасьледу валанцёраў стала ананімная інфармацыя, што мабільныя тэлефоны, якімі яны карыстаюцца, быццам бы крадзеныя. Толькі позна ўвечары быў вызвалены Аляксей Салей, адзін з каардынатараў правядзеньня ў Гародні “экзіт-пулу”, сацыялагічнага апытаньня ля выбарчых участкаў людзей, якія ўжо прагаласавалі. Супрацоўнікі сьпецслужбаў, якія прадставіліся афіцэрамі міліцыі з менскага аддзелу па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю, спрабавалі завербаваць Аляксея Салея, але ён адмовіўся ад супрацоўніцтва са сьпецслужбамі.

***15 кастрыніка*** амбасада Злучаных Штатаў Амерыкі зрабіла каментар наконт шэрагу праграмаў, паказаных па беларускім дзяржаўным тэлебачаньні, мэтай якіх было ў негатыўным сьвятле прадставіць паводзіны супрацоўнікаў амерыканскай амбасады, што працуюць у Беларусі. У прыватнасьці, амбасада адвяргае абвінавачаньні, выказаныя ў праграме “В центре внимания”, дзе сьцьвярджалася, што амерыканскія супрацоўнікі займаліся ў Беларусі незаконнай ці падрыўной дзейнасьцю. Відавочна, што гэтыя тэндэнцыйныя праграмы рабіліся дзеля таго, каб стварыць скажоны і адмоўны імідж Злучаных Штатаў, настроіць народ Беларусі супраць ЗША, іх народу і палітыкі. Злучаныя Штаты вітаюць крытыку і адкрыты дыялог, аднак інсінуацыі ды напад на годнасьць амерыканскіх дыпламатаў абсалютна непрымальныя. Амбасада Злучаных Штатаў выступае за разьвіцьцё моцных сяброўскіх сувязяў паміж нашымі краінамі. Супрацоўнікі амбасады заўсёды

паводзілі і будуць паводзіць сябе з пачуццём прафесійнай і ўласнай годнасьці і ў адпаведнасьці з законамі Злучаных Штатаў і Беларусі.

***16 кастрычніка*** пракуратура Менску распачала крымінальную справу па факце прэсавай канферэнцыі аб мажлівых фальсіфікацыях падчас галасаваньня. Прадстаўнікі ініцыятывы “За справядлівыя выбары” і лідэры апазіцыйных партыяў прадэманстравалі журналістам узоры пратаколаў участковых выбарчых камісіяў з гатовымі лічбамі, а таксама зводныя табліцы па акрузе з разьмеркаваньнем галасоў на ўчастках. Копіі падрыхтаваных пратаколаў і табліц паралельна патрапілі да актывіста ініцыятывы “За справядлівыя выбары” Анатоля Фёдарава і да лідэра ПКБ Сяргея Калякіна. У пратаколах ужо запісаныя вынікі на карысьць А. Лукашэнкі і кандыдатаў ад улады. 15 кастрычніка на гэта адрэагаваў пракурор Менску Мікалай Кулік, які ў інтэрв’ю Беларускаму тэлебачаньню заявіў пра гэту прэс-канферэнцыю наступнае: “Яе ўдзельнікамі распаўсюджаныя ад пачатку ілжывыя і ганебныя для прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншых службовых асобаў прыдумкі, якія датычацца маючых адбыцца рэспубліканскага рэферэндуму і выбараў”. Пракурор Кулік дадаў, што “матэрыялы ўтрымліваюць дастатковыя зьвесткі, якія паказваюць на прыкметы злачынстваў” паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу – аб паклёпе і аб паклёпе на прэзідэнта. Таму пракуратура Менску распачала па гэтых артыкулах адпаведную крымінальную справу.

***16 кастрычніка*** віцебскія актывісты Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі Уладзімір Плешчанка і Барыс Хамайда арыштаваныя на 10 сутак за пікет каля Віцебскага райвыканкаму. Барыс Хамайда трымаў у руках толькі белы аркуш з намаляваным на ім чорным квадратам. Тлумачэньні былі прыблізна такія: “Гэткім чорным будзе нашае жыцьцё, калі прагаласуем “за” на рэферэндуме”, або “Такога колеру будзе нашая доля пра новых абраньніках”. Міліцыянты палічылі гэта дастатковай падставаю дзеля таго, каб завезьці апазіцыянераў спачатку ў Чыгуначны РУУС, а потым адразу ў раённы суд. Адзінымі сьведкамі на абодвух судовых працэсах былі міліцыянты. Абодвум апазіцыянерам прысудзілі 10 сутак арышту і завезьлі ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

***16 кастрычніка*** невядомыя ў цывільным запатрабавалі ад чэшскага журналіста Міраслава Карася сьцерці стужку з відэаматэрыяламі. Міраслаў Карась — журналіст Чэшскай тэлевізіі, акрэдытаваны Міністэрствам замежных справаў для асьвятленьня рэферэндуму і выбараў у Беларусі. Інцыдэнт здарыўся каля будынку Цэнтрвыбаркаму пасьля таго, як Міраслаў Карась запісаў інтэрв’ю з сябрам Парыті БНФ Алесем Міхалевічам, якога выбарчая камісія за некалькі дзён да выбараў пазбавіла рэгістрацыі. Паводле Міраслава Карася, невядомыя людзі, якія не

называлі сваіх імёнаў, забаранілі яму здымаць Цэнтарвыбаркам, завялі ў будынак і запатрабавалі зьнішчыць адзьняты матэрыял. Міраслаў Карась адмовіўся выканаць патрабаваньні невядомых і быў адпушчаны толькі пасьля таго, як заявіў, што будзе зьвяртацца па дапамогу ў амбасаду Чэхіі.

***16 кастрычніка*** Быхаўскія міліцыянты затрымалі польскую журналістку Ганну Гарасімовіч. Спадарыня Ганна, якая прадстаўляе "Інфарматар культуральны", езьдзіла на выбарчыя ўчасткі Быхаўскай акругі разам з групай падтрымкі кандыдата ў дэпутаты парламенту ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Кірыла Шарапкіна. Ганна Гарасімовіч на ўчастках цікавілася, колькі людзей прагаласавала датэрмінова, што моцна нервавала сяброў выбарчых камісіяў. На ўчастак у Быхаўскім раённым шпіталі пад'ехалі міліцыянты і прапанавалі спадарыні Ганьне праехаць з імі ў аддзяленьне. Яны выпытвалі ў журналісткі, хто яна, адкуль, якую мае візу і чаму цікавіцца галасаваньнем. Быхаўскія міліцыянты пратрымалі польскую журналістку болей за гадзіну.

***16 кастрычніка*** ў Смаргоні ў акрузе, дзе кандыдатам у дэпутаты ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі зарэгістраваная Зінаіда Бандарэнка, Народная артыстка Беларусі, былі затрыманыя 6 назіральнікаў ад АБСЕ. Іх на працягу гадзіны дапытвалі ў мясцовым аддзяленьні міліцыі.

***16 кастрычніка*** на Кастрычніцкую плошчу выйшлі маладыя людзі з чорнымі павязкамі на рукавах. Стаўшы ў шэраг яны разгарнулі нумар "Советской Белоруссии" з надпісам на першай паласе – "Прагаласуйце!", і сталі рабіць выгляд, што ўважліва чытаюць. Удзельнікі акцыі таксама трымалі чырвона-зялёныя сьцяжкі з надпісамі "НЕ" і "Жыве Беларусь". Такім чынам удзельнікі флэш-мобу хацелі нагадаць людзям пра небясьпеку рэферэндуму наконт зьмены Канстытуцыі. Амапаўцы спынілі Макара Ваўчка (непаўнагадовы) і Алега Ларычава (студэнт), бо ў іх былі чорныя стужкі на рукавах (стужкі сьведчылі пра ўдзел у флэш-мобе). Пасьля вобыску ў торбах у затрыманых амапаўцы знайшлі антыпрэзідэнцкія ўлёткі. Ваўчок і Ларычаў былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну.

***16 кастрычніка*** ў Віцебску быў зьбіты фотакарэспандэнт газеты "Витебский курьер" Аляксей Вронскі. Інцыдэнт адбыўся каля 20.00 у двары дому на вуліцы Гагарына, дзе жыве журналіст. Першы ўдар быў нанесены ззаду (як мяркуецца, кастэтам). Сам А. Вронскі, які мае добрую спартыўную падрыхтоўку, лічыць, што нападнік дзейнічаў прафесійна. Зьбіцьцём той не абмежаваўся, а забраў у фотакарэспандэнта фотакамеру і ўсе прыналежнасьці разам з сумкай. У той жа

вечар пацярпелы зьвярнуўся ў міліцыю, але знайсьці злачынцу праваахоўным органам адразу не ўдалося.

***17 кастрычніка*** карыстальнікі Інтэрнэту ў Беларусі сутыкнуліся з праблемай: шэраг сайтаў, якія размяшчаюць у рэжыме on-line найбольш вострую грамадзка-палітычную інфармацыю, аказаліся недаступныя. Сярод "заблакаваных" апынуліся web-старонкі "Хартыі-97", Радыё Свабода, Праваабарончага цэнтру "Вясна", Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Раніцай названыя Інтэрнэт-рэсурсы працавалі ў звычайным рэжыме, аднак пасьля 12-й гадзіны старонкі перасталі "грузіцца". Web-майстры ня маюць сумневаў, што праблемы маюць штучнае паходжанне. Тэхнічна гэткія перашкоды можа ствараць толькі нацыянальны аператар электрасувязі РБ "Белтэлеком" -- манапаліст на доступ да Інтэрнэту ў Беларусі. Калектыў заблакаванага сайту www.charter97.org выступіў з адмысловай заявай з гэтай нагоды. "Мы заяўляем, што ўсім спробам уладаў перашкодзіць свабоднаму распаўсюду інфармацыі ў Інтэрнэце наканаваны правал. Можна заблакаваць працу некалькіх вэб-сайтаў унутры краіны, аднак паралізаваць вядучыя сусьветныя і расійскія Інтэрнэт-СМІ беларускі рэжым яўна ня ў стане", -- гаворыцца ў заяве. Калектыў інтэрнэт-рэсурсу таксама звяртаецца да прадстаўнікоў сусьветных мас-медыя з заклікам працягваць усебаковае асьвятленьне падзеяў у Беларусі.

***17 кастрычніка*** ў Менску на ўчастку №579 у мікрараёне Уручча супрацоўнікі міліцы ў цывільным спрабавалі затрымаць здымачную групу расійскага тэлеканалу Ren-TV.

***17 кастрычніка*** ў Менску супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы і дастаўлены ў РУУС Савецкага раёну кіраўнік аддзелу сьпецпраектаў расійскай тэлекампаніі ОРТ Павел Шарамет. Затрыманьне адбылося адразу пасьля бойкі, якую распачалі з П. Шараметам невядомыя маладыя людзі ў цывільным. П. Шарамета абвінавацілі ў дробным хуліганстве. На думку журналіста, інцыдэнт напрамую зьвязаны з арганізаванай у Менску тэрміновай прэс-канферэнцыяй па папярэдніх выніках выбараў і рэферэндуму. Павел Шарамет быў дастаўлены ў аддзяленьне нейрахірургіі 9-й клінікі з падазраньнем на чэрапна-мазгавую траўму. Кіраўнік упраўленьня інфармацыі і грамадзкіх сувязяў МУС Генадзь Глебчык лічыць інцыдэнт з журналістам расійскага каналу Паўлам Шараметам "пабытовай" сітуацыяй. У міністэрстве ўпэўненыя, што журналіст сам зьдзейсьніў напад на маладых людзей, а пра паходжаньне яго ўласнай траўмы нічога ня ведаюць. Па версіі МУС, увечары 17 кастрычніка ў двары дома № 53 па прасьпекце Скарыны да Шарамета падыйшлі двое маладых людзей ("рабочыя" 1981 і 1982 гг. нараджэньня) і папрасілі закурыць. Па словах сп-ра Глебчыка, П. Шарамет, настроены вельмі "агрэсіўна", адказаў на

просьбу нецэнзурнай лаянкай і ўдарыў аднаго з маладых людзей. Маладыя людзі нібыта самі пачалі клікаць міліцыю, і ў хуткім часе пад'ехала машына і забрала ўсіх траіх у Савецкі РАУС. На пытаньне, адкуль тады ўзялася траўма ў журналіста, Г. Глебчык сказаў, што "яму самому было б цікава даведацца пра яе паходжаньне". Кіраўнік упраўленьня інфармацыі паведаміў, што з РАУС дваіх маладых людзей адпусьцілі, таму што тыя "па пратаколе не рабілі супрацьпраўных дзеяньняў", а П. Шарамета да рашэньня суда вырашылі трымаць у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку, "паколькі ён не зьяўляецца грамадзянінам РБ". Г. Глебчык сказаў, што суд над Шараметам павінен быў адбыцца адразу, але той паскардзіўся на галаўны боль і з Акрэсьціна быў дастаўлены ў бальніцу. Сакратар амбасады Расіі ў Беларусі А. Фралоў паведаміў, што амбасада трымае гэты інцыдэнт на кантролі. Па словах сакратара, прадстаўнікі амбасады зьвязваліся з міністрам унутраных справаў Беларусі Уладзімірам Навумавым, які заявіў ім, што Шарамет затрыманы за ўдзел у бойцы, і што суд над ім адбудзецца 20 кастрычніка. Па словах сп-ра Фралова, сам П. Шарамет па дапамогу расійскага прадстаўніцтва не зьвяртаўся. У суд прадстаўнік амбасады пойдзе толькі тады, калі П. Шарамет зьвернецца з адпаведнай просьбай. Артыкул 156 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях, па якім журналіста спрабуюць прыцягнуць да адказнасьці, прадугледжвае ў якасьці пакарання арышт да 15 сутак, штраф памерам да двух базавых велічыняў альбо папраўчыя работы на тэрмін ад 1 да 2 месяцаў.

***17 кастрычніка*** ў Менску затрыманы актывіст руху “Зубр” Аляксей Ляўковіч, які распаўсюджваў улёткі з заклікам прыйсьці 18 кастрычніка на Кастрычніцкую плошчу і выказаць пратэст супраць сфальсіфікаваных вынікаў выбараў і рэферэндуму. У адносінах яго складзены пратакол па арт. 167-1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых акцыяў).

***17 кастрычніка*** ў Магілёве затрыманы назіральнік Мікалай Лабанаў, які быў вылучаны ад ГА "БНФ "Адраджэньне" ва ўчастковую выбарчую камісію №109 Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №73. М.Лабанаў знаходзіўся на выбарчым участку №109, дзе назіраў за ходам галасаваньня. Паколькі месцы для назіральнікаў былі ўсталяваныя такім чынам, што з іх немагчыма было бачыць скрыняў для галасаваньня, сп. Лабанаў зрабіў заўвагу аб гэтым старшыні камісіі Галіне Каліновіч. Тая, аднак, ніякіх захадаў не прадпрыняла. Неўзабаве ўчастак наведалі назіральнікі АБСЕ, якім М.Лабанаў выклаў сітуацыю. Пасьля сыходу назіральнікаў АБСЕ на участку зьявіўся нарад міліцыі (л-т Хонін Сяргей Уладзіміравіч, л-т Мішэрнік Арцём Аляксандравіч, Антошкін Віктар Фёдаравіч), які затрымаў сп.

Лабанава і даставіў у Кастрычніцкі РАУС г. Магілёву. У РАУСе М.Лабанаў быў пратрыманы тры гадзіны, пасьля чаго вызвалены.

***17 кастрычніка*** кіраўніца Рабочай групы па Беларусі ПА АБСЕ Ута Цапф, якая прыбыла ў Менск у якасьці афіцыйнай назіральніцы за выбарамі ў Беларусі, падчас спробы наведаць адзін з мясцовых выбарчых участкаў была літаральна выкінутая за дзьверы старшынёй выбаркаму. Пра гэты інцыдэнт спадарыня Цапф паведаміла прадстаўнікам нямецкіх СМІ. Паводле словаў нямецкай парламентаркі, яна і яе калегі, назіральнікі АБСЕ, сутыкнуліся таксама з нежаданьнем сяброў выбаркамаў адказваць на пытаньні. “Мы адчулі надзвычайныя перашкоды ў часе сваёй працы”, -- паведаміла Ута Цапф. Паводле яе словаў, падчас рэферэндуму і парламенцкіх выбараў дзейнасьці афіцыйных заходніх назіральнікаў быў нанесены адчувальны ўрон. Прэзідэнт Лукашэнка фактычна зрабіў немагчымым назіраньне паводле стандартаў АБСЕ.

***18 кастрычніка*** афіцыйны Менск зноў зьдзівіў увесь сьвет – спачатку нечуванымі вынікамі рэферэндуму і выбараў у парламент (нават сам прэзідэнт Лукашэнка назваў іх "ашаламляльнымі"), а потым жорсткаю расправаю над сотнямі людзей, што выйшлі на Кастрычніцкую плошчу сталіцы Беларусі, каб выказаць свой пратэст супраць масавых фальсіфікацыяў, што адбываліся на выбарчых участках. На Кастрычніцкай плошчы сабралася каля пяці тысячаў чалавек. У 18.00 яны паглядзелі на вялікім тэлеэкране трансьляцыю абвяшчэньня афіцыйных вынікаў рэферэндуму. "Ганьба!" – гучала над плошчай, як рэзюме. Да 18.30 з удзельнікаў акцыі сфармавалася калона, над якой зьявіліся сьцягі Еўрасаюзу і нацыянальныя бел-чырвона-белыя. Скандуючы "Жыве Беларусь!" і "Лукашэнка, ты прайграў!" людзі рушылі ў бок плошчы Незалежнасьці і Дому ўраду. Шлях дэманстрантам перакрылі амапаўцы. Пачаліся масавыя затрыманьні і зьбіцьцё людзей, зацягваньне іх у аўтобусы. Калона рушыла да будынку Адміністрацыі прэзідэнта. Зьявілася расьцяжка "Не – трэцяму тэрміну!". "Далоў Луку!", "У адстаўку!" – скандуюць удзельнікі акцыі. На плошчы перад Палацам рэспублікі адбыўся мітынг. Быў зачытаны ліст былога прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гавела і чэшскага "Камітэту за свабодную Беларусь" з падтрымкай дэмакратычных сілаў Беларусі і яе народу ў змаганьні за свабоду. У 19.30 калона дэманстрантаў рушыла да будынку КДБ, бо стала вядома, што там утрымліваюцца затрыманыя, у тым ліку і адзін з лідэраў моладзевага руху "Зубр" Яўген Афнагель. "КДБ, вярні людзей!" – гучала над калонай. Мелася на ўвазе і тое, што на Беларусі цягам апошніх гадоў зьнікалі вядомыя палітыкі, прадпрымальнік, журналіст. Да ўдзельнікаў стыхійнага мітынгу выйшаў старшыня КДБ Леанід Ерын. Размаўляць з людзьмі ён адмовіўся, сказаў, што

можа адказаць на пытаньні журналістаў у сябе ў кабінеце. Разам з некалькімі журналістамі ў будынак прайшоў і кіраўнік «Маладога Фронту» Павел Севярынец. Гутарка ішла пра лёс зьніклых. Л. Ерын не сказаў нічога канкрэтнага, але ягоныя словы: "Прыйдзе час, і мы даведаемся праўду", – прагучалі афарыстычна. Тым часам дэманстранты вярнуліся на Кастрычніцкую плошчу. Па іх патрабаваньні быў выпушчаны Яўген Афнагель. Астатнія арыштаваныя правялі ноч у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку.

***19 кастрычніка*** ўвечары на Кастрычніцкай плошчы Менску зноў адбылася акцыя пратэсту супраць сфальсіфікаваных вынікаў рэферэндуму і выбараў. Амапаўцы яшчэ больш жорстка расправіліся з яе ўдзельнікамі. Было арыштавана больш за 50 чалавек, сярод якіх непаўнагадовыя. Былі зьбітыя некалькі сотняў, уключаючы журналістаў і лідэраў партыяў. Старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька атрымаў цяжкія чэрапна-мазгавыя траўмы і патрапіў у бальніцу. "Амапаўцы зьбілі мяне да страты прытомнасьці", – распавёў ён пасьля. Пацярпеў ад супрацоўніка прэзідэнцкай аховы карэспандэнт беларускай службы Радыё Свабода Юры Сьвірко; быў затрыманы, але потым адпушчаны фотакарэспандэнт агенцтва Associated Press Сяргей Грыц. Пасьля таго, як міліцыя схапіла і зацягнула ў памяшканьне рэстарану "Патыё піцца" лідэра АГП Анатоля Лябедзьку, туды здолелі прарвацца аператары НТВ і REN-TV Канстанцін Марозаў і Уладзімір Косьцін. У памяшканьні было шмат супрацоўнікаў АМАПу, якія, відавочна, увайшлі ў рэстаран праз чорны ўваход. АМАПаўцы паклалі журналістаў на падлогу і "не давалі падняць галавы": яны білі па камерах, але журналісты таксама атрымалі цялесныя пашкоджаньні. У. Косьцін паведаміў, што яму ўдалося прыкрыць сваю тэлекамеру і такім чынам захаваць яе ад пашкоджаньняў, у той час як большую па памеры камеру НТВ міліцыя разьбіла. Пасьля гэтага журналістаў выкінулі на вуліцу. Паводле відавочцаў, твар К. Марозава быў акрываўлены. Карэспандэнт Радыё Свабода Юры Сьвірко запісваў інтэрв’ю са спадаром Марозавым, калі ўбачыў, што за ім стаіць супрацоўнік Службы бясьпекі Аляксандра Лукашэнкі. Карэспандэнт Свабоды папрасіў яго таксама пракаментаваць сітуацыю, але той замест адказу ўдарыў сп-ра Сьвірко ў жывот. Людзі, што стаялі побач, паспрабавалі стрымаць ахоўніка, але той, ударыўшы адну з дзяўчын, зьбег у бок прэзідэнцкай рэзідэнцыі. Ю. Сьвірко падрыхтаваў скаргу на імя Генеральнага пракурора Віктара Шэймана, патрабуючы ўзбудзіць крымінальную справу па артыкуле "незаконнае супрацьдзеяньне працы журналіста". Карэспандэнт Свабоды паведаміў, што менавіта гэты супрацоўнік прэзідэнцкай аховы (Сяргей) кантраляваў працу прэсы каля дому дэпутата Валерыя Фралова падчас галадоўкі, а таксама не пускаў журналістаў на паседжаньне Палаты прадстаўнікоў, дзе абмяркоўваліся

прапанаваныя дэпутатамі-галадоўнікамі папраўкі да Выбарчага кодэксу. Тады, у чэрвені 2004 г., гэты самы ахоўнік на вачах у кіраўніка Рабочай групы па Беларусі ПА АБСЕ Уты Цапф зьнішчыў запісы ў дыктафоне Юрыя Сьвірко і ўдзельнічаў у выдаленьні журналіста з будынку парламенту. Стала вядома, што беларускае тэлебачаньне не дазваляе ўсім расійскім журналістам перадаваць свае рэпартажы ў Маскву. А па ўсіх беларускіх тэлеканалах тым часам ідзе ганьбаваньне беларускай апазіцыі і "нячэсных" расійскіх журналістаў.

***19 кастрычніка*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" зьвярнулася да Міністра ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь Навумава У.У. і Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Шэймана В.У. са "Зваротам у сувязі са зьбіцьцём і затрыманьнем журналіста Паўла Шарамета". У звароце сказана: "20 кастрычніка чакаецца разгляд справы кіраўніка сьпецпраектаў грамадзкага расійскага "Першага каналу" Паўла Шарамета судом Савецкага раёну г. Менску. Разгляду справы можа перашкодзіць стан здароўя журналіста. Вядомага тэлежурналіста абвінавачваюць ва ўчыненьні адміністратыўнага правапарушэньня, прадугледжанага арт. 156 КаАП (дробнае хуліганства). Па версіі работнікаў міліцыі, якія склалі пратакол, 17 кастрычніка Павел Шарамет без усялякіх прычынаў накінуўся на двух маладых людзей (1981 і 1982 г.н.), якія папрасілі ў яго закурыць, ударыў іх, пасьля чаго яны выклікалі міліцыю. Супрацоўнікі Савецкага РУУС даставілі П. Шарамета спачатку ў аддзяленьне, а затым у сьпецпрыёмнік МУС, дзе журналіст павінен быў утрымлівацца да разгляду справы. Версія міліцыі разыходзіцца са сьведчаннямі відавочцаў (у Савецкім РУУС ня толькі адмовіліся іх заслухаць, але нават не запісалі іх пашпартных дадзеных), і ніяк не тлумачыць факту нанясеньня журналісту чэрапна-мазгавой траўмы, якая стала прычынай перамяшчэньня яго са сьпецпрыёмніка ў лякарню. Грамадзкае аб'яднаньне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" лічыць, што П. Шарамет стаў ахвярай правакацыі, якая мела на мэце перашкодзіць яму ажыцьцявіць журналісцкае назіраньне за выбарамі, запалохаць яго і, у выніку, ізаляваць (напачатку -- да разгляду справы аб адміністратыўным правапарушэньні, а потым -- на тэрмін адміністратыўнага арышту). Такога ж меркаваньня прытрымліваецца вядомая журналісцкая арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў". Мы зьвяртаемся ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь і Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь з патрабаваньнем:

- правесьці дадатковую праверку матэрыялаў гэтай справы;
- праверыць асобы двух затрыманых за напад на П. Шарамета, але адпушчаных з Савецкага РУУС;

– ацаніць законнасьць дзеяньняў супрацоўнікаў Савецкага РУУС г. Менску, якія замест аказаньня дапамогі зьбітаму журналісту (грамадзяніну Расійскай Федэрацыі) затрымалі яго і накіравалі ў сьпецпрыёмнік".

***19 кастрычніка*** Калегія па крымінальных справах Гарадзенскага абласнога суда пакінула ў сіле прысуд старшыні агульнарэспубліканскага страйкаму прадпрымальнікаў Валерыю Леванеўскаму і ягонаму намесьніку Аляксандру Васільеву. Гэта азначае, што ў бліжэйшыя дні лідэры прадпрымальнікаў будуць пераведзеныя з Гарадзенскага СІЗА ў калонію.

***19 кастрычніка*** журналіст Павел Шарамет выпісаны з 9 менскай больніцы. Кансіліюм беларускіх медыкаў пацьвердзіў наяўнасьць у Шарамета чэрапна-мазгавой траўмы, аднак адмовіў яму ў далейшым знаходжаньні ў стацыянары. Яны заявілі, што грамадзяне Расіі могуць разьлічваць толькі на аказаньне экстранай дапамогі, а такую дапамогу П. Шарамет ужо атрымаў.

***20 кастрычніка*** суд над журналістам расійскага "Первого канала" Паўлам Шараметам, прызначаны на гэты дзень, не адбыўся. Судзьдзя, які павінен быў разглядаць справу Шарамета, нечакана адмовіўся ад удзелу ў працэсе, пасьля чаго старшыня суда Савецкага р-на г. Менску паведаміў П.Шарамету, што дакументаў па яго справе ў судзе няма. Раніцай 20 кастрычніка каля суда Савецкага р-на Менску сабраліся некалькі дзесяткаў журналістаў беларускіх і замежных СМІ (у тым ліку расійскіх тэлеканалаў), прадстаўнікі дэмакратычнай апазіцыі, а таксама некаторыя замежныя наіральнікі. Усім ім дазволілі ўвайсьці ў будынак суда, дзе ў 9.00 павінен быў пачацца разгляд справы аб адміністратыўным правапарушэньні П. Шарамета. У чаканьні судзьдзі П. Шарамет падзяліўся з прысутнымі сваім стаўленьнем да апошніх падзеяў у Беларусі. У прыватнасьці, журналіст выказаў удзячнасьць медыкам, якія, рыхтуючы яго да выпіскі, пацьвердзілі яго дыягназ (хаця ад іх, па інфармацыі Паўла Шарамета, патрабавалі адваротнага). Ён таксама падзякаваў усім сваім калегам, знаёмым і незнаёмым людзям, якія падтрымлівалі яго пасьля інцыдэнту 17 кастрычніка. Адвакат П. Шарамета Вера Страмкоўская нагадала прысутным, што днямі накіравала ў пракуратуру Савецкага раёну скаргу на дзеяньні міліцыянтаў, якія пакінулі заяву П. Шарамета аб нападзе без увагі, не ўзялі паказаньняў у сьведкаў інцыдэнту і затрымалі журналіста. Адвакат патрабуе прыняць да міліцыянтаў адпаведныя захады, а таксама распачаць адміністратыўную вытворчасьць па заяве самога П. Шарамета. З невялікім спазьненьнем у калідоры зьявіўся судзьдзя Руслан Казадаеў і запрасіў журналіста з адвакатам у свой кабінет. Праз 10 хвілінаў П. Шарамет выйшаў і паведаміў, што Казадаеў, які нечакана аказаўся яго старым знаёмым, адмовіўся ад разгляду справы. Пасьля перамоваў са

старшынём Савецкага раённага суда журналіст паведаміў сабраным, што матэрыялаў па ягонай справе ў судзе няма. П. Шарамету заявілі, што ён "можа быць свабодны".

***20 кастрычніка*** РУП "Выдавецтва "Беларускі дом друку" ў аднабаковым парадку скасавала дамову з рэдакцыяй газеты "Товарищ". Генеральны дырэктар прадпрыемства Раман Алейнік у сваім афіцыйным лісьце тлумачыць гэта тым, што выдавецтва "па тэхнічных прычынах… ня ў стане друкаваць малатыражныя газеты". Галоўны рэдактар выданьня Сяргей Вазьняк, між тым, падкрэсьлівае, што калі раней газета выходзіла накладам 3-7 тысячаў, то ў некалькіх апошніх заяўках рэдакцыя замаўляла выпуск 30 000 асобнікаў выданьня. С. Вазьняк распавёў, што яшчэ раніцай друкарня без усялякіх пытаньняў аформіла замову на выпуск "Товарища". Праз паўтары гадзіны з Беларускага дому друку даслалі лаканічны факс з інфармацыяй пра скасаваньне дамовы з газетай. Галоўны рэдактар упэўнены, што прычынай гэткіх дзеяньняў стаў зьмест нумару: у ім планавалася разьмясьціць тэкст "прамой лініі" лідэра ПКБ, былога кандыдата ў дэпутата ПП НС Сяргея Калякіна з чытачамі па пытаньнях выбараў і рэферэндуму. Гэты матэрыял рэдакцыя планавала апублікаваць яшчэ ў мінулым, перадвыбарным выпуску газеты. Аднак 13 кастрычніка рэдакцыі паведамілі, што ў друкарні "няма тэхнічных магчымасьцяў" надрукаваць нумар і заявілі, што рэдакцыйнае кіраўніцтва павінна было загадзя падаць заяўку на выпуск выданьня "павышаным" накладам. Рэдакцыя аператыўна аформіла адпаведную заяўку на наступны нумар, аднак гэта не перашкодзіла кіраўніцтву друкарні скасаваць з ёй дамову.

***20 кастрычніка*** заснавальнік і галоўны рэдактар прыпыненай Міністэрствам інфармацыі ваўкавыскай і смаргонскай "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч абвесьціў бестэрміновую галадоўку. Ён заяўляе, што будзе галадаць, пакуль не адменяць загад аб прыпыненьні яго выданьня і пакуль Ваўкавыскі райвыканкам ня дасьць узгадненьня на разьмяшчэньне рэдакцыі газеты. Акрамя гэтага, А. Шантаровіч патрабуе, каб кампетэнтныя органы прынялі да разгляду матэрыялы з фактамі парушэньняў выбарчага заканадаўства падчас выбараў і рэферэндуму, што аказаліся ў яго распараджэньні. У заяве А. Шантаровіча, распаўсюджанай з нагоды абвяшчэньня галадоўкі, гаворыцца, што прыпыненьне "Местной газеты" — "гэта ня першы факт праявы ціску на выданьне". Паводле галоўнага рэдактара, газету абмяжоўваюць у свабодным продажы, забараняючы гандлёвым арганізацыям заключаць дамовы на яе рэалізацыю. За час свайго існаваньня (са жніўня 2001 г.) газета вымушаная была зьмяніць 4 друкарні, таму што з ёй спынялі супрацоўніцтва "па прамых званках з Ваўкавыскага райвыканкаму". Газета дагэтуль ня можа

атрымаць узгадненьня на разьмяшчэньне рэдакцыі ў Ваўкавыску, — падкрэсьлівае галоўны рэдактар. Ён лічыць невыпадковым тое, што выданьне прыпынілі напярэдадні абвяшчэньня вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. А. Шантаровіч лічыць гэта зьдзекам над чытачамі і супрацоўнікамі рэдакцыі. Зварот галоўнага рэдактара ў Міністэрства інфармацыі скончыўся тым, што яму прапанавалі пісьмова "пакаяцца". "А ў чым каяцца? — пытаецца А. Шантаровіч. — У тым, што нас чытаюць без "указак" зьверху? У тым, што нашую газету не прымушаюць выпісваць? У тым, што мы пішам праўду? У тым, што наклад і папулярнасьць нашай газеты перавышаюць наклад і папулярнасьць газеты раённай? У гэтым мы вінаватыя?"

***20 кастрычніка*** ўвечары беларуская моладзь зноў выйшла на акцыю пратэсту. На Кастрычніцкай плошчы зьявіліся лозунгі: "Ты можаш усё жыцьцё пражыць пры дыктатуры, калі будзеш пакорлівым і слабым" і "Што будзе далей – вырашаць будзем мы". Некаторыя ўдзельнікі акцыі трымалі партрэты жорстка зьбітага амапаўцамі лідэра АГП Анатоля Лябедзькі. Зноў пад’ехалі аўтобусы і амапаўцы пачалі арышты. Затрымана каля 20 чалавек. Увесь дзень працягваліся суды над затрыманымі 18-19 кастрычніка.

***20 кастрычніка*** прэс-сакратар прадстаўніка Еўрасаюзу па справах агульнай замежнай палітыкі і бясьпекі Хаўера Саланы Крысьціна Гэляк ад імя Еўрапейскага Саюзу асудзіла зьбіцьцё і затрыманьні дэманстрантаў у Менску, а таксама гвалтоўныя дзеяньні ў дачыненьні да журналістаў, якія асьвятлялі гэтую акцыю. Крысьціна Гэляк таксама паведаміла, што 19 кастрычніка ўвечары ў Брусэлі амбасадары ўсіх краін Еўрасаюзу абмеркавалі сітуацыю ў Беларусі.

***21 і 22 кастрычніка*** акцыі пратэсту працягваліся. Дэманстранты трымалі ў руках партрэты арыштаваных у папярэднія дні: каардынатара "Зубра" Яўгена Афнагеля, удзельніка Еўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" Зьміцера Бародкі, лідэраў АГП Анатоля Лябедзькі і БСДП (Народная Грамада) Міколы Статкевіча, а таксама лозунгі "Вызвалі свой розум", "Свабоду палітзьняволеным!" і бел-чырвона-белыя сьцягі...

Вынікі судоў над затрыманымі ўдзельнікамі акцыяў 18-22 кастрычніка ў Менску:

1. Алесь Каліта — 10 сутак адміністратыўнага арышту;
2. Павел Севярынец – 15 сутак адміністратыўнага арышту;
3. Зьміцер Пазьняк – штраф 50 базавых велічыняў;
4. Зьміцер Захарка — штраф 50 базавых велічыняў;
5. Дар’я Малдаванава – 10 сутак адміністратыўнага арышту;

6. Міхаіл Кандрашоў – 10 сутак адміністратыўнага арышту;
7. Руслан Харкевіч — 10 сутак адміністратыўнага арышту;
8. Павел Хівук – 10 сутак адміністратыўнага арышту;
9. Дзяніс Арцюшкевіч — 5 сутак адміністратыўнага арышту;
10. Павел Юхневіч – 10 сутак адміністратыўнага арышту;
11. Марыя Гамсецкая – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
12. Зьміцер Захарка — штраф 50 базавых велічыняў;
13. Канстанцін Екель — штраф 50 базавых велічыняў;
14. Сяргей Красоўскі – штраф 20 базавых велічыняў;
15. Андрэй Баранаў – штраф 50 базавых велічыняў;
16. Артур Фінькевіч – 15 сутак адміністратыўнага арышту;
17. Мікола Статкевіч (старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада)) – 10 сутак адміністратыўнага арышту; рашэньне вынесенае судзьдзёй Церашковай;
18. Сяргей Рылькоў — 3 сутак адміністратыўнага арышту;
19. Мікалай Ганчароў – 3 сутак адміністратыўнага арышту;
20. Мікалай Арцюхоў – штраф 40 базавых велічыняў;
21. Ігар Хаткоўскі — штраф 40 базавых велічыняў;
22. Сяргей Манкевіч – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
23. Сяргей Міхаленка – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
24. Яўген Ваўкавец – 10 сутак адміністратыўнага арышту;
25. Юры Фабішэўскі – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
26. Уладзімір Шыдлоў – 3 сутак адміністратыўнага арышту;
27. Ірына Пярвойкіна – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
28. Яраслаў Навуменка – 3 сутак адміністратыўнага арышту; зьбіты пры затрыманьні;
29. Васіль Парфянкоў – 7 сутак адміністратыўнага арышту;
30. Аляксандра Гаеўская – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
31. Максім Вінярскі – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
32. Міхаіл Кузьняцоў – 3 сутак адміністратыўнага арышту;
33. Таццяна Елавая – 5 сутак адміністратыўнага арышту;
34. Павел Красоўскі – 10 сутак адміністратыўнага арышту;
35. Уладзімір Навельскі -– 3 сутак адміністратыўнага арышту;
36. Зьміцер Чарткоў – 3 сутак адміністратыўнага арышту; зьбіты пры затрыманьні, у выніку чаго дастаўлены ў Менскую абласную клінічную бальніцу, у аддзяленьне нейрахірургіі, дзе яму пастаўлены дыягназ "пашкоджаньне мяккіх тканкаў галавы і канечнасьцяў".

***21 кастрычніка*** "Міжнародная Амністыя" і Міжнарожданая Федэрацыя Правоў Чалавека (FIDH) прызналі ўсіх затрыманых удзельнікаў акцыяў пратэсту ў Менску "вязьнямі сумленьня".

***22 кастрычніка*** юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна" Валянцін Стэфановіч, які з 1998 году прымае ўдзел у абароне затрыманых падчас акцыяў пратэсту і выступае ў судах у якасьці прадстаўніка затрыманых удзельнікаў, адзначыў, што рашэньні суда Ленінскага раёну гэтым разам былі адметныя — вызначаліся асаблівай жорсткасьцю да ўдзельнікаў акцыяў 18-21 кастрычніка: "На працягу апошніх двух гадоў судзьдзі не прымаюць апраўдальных рашэньняў, не спыняюць вытворчасьці па справах. Яны прызнаюць усіх вінаватымі і не рэагуюць ні на якія аргументы, – гаворыць Валянцін Стэфановіч. — 20 кастрычніка ў Ленінскім судзе людзей прызнавалі вінаватымі нават тады, калі яны адмаўлялі свой удзел у акцыі і казалі, што апынуліся на месцы правядзеньня акцыі выпадкова і былі памылкова затрыманыя. Адметнасьцю апошніх судоў стала тое, што судзьдзі не выклікалі сьведкаў, выносілі рашэньні на падставе пісьмовых сьведчаньняў, якія былі ў справе – пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні, рапарт супрацоўнікаў міліцыі — і ўсё на гэтым. Хаця судзьдзя павінен прымаць меры для ўсебаковага разгляду справы і для ўстанаўленьня ісьціны па справах. Таму судзьдзі павінныя былі выклікаць сьведкаў. У тым ліку і асобаў, якія складалі пратакол. Мяне ўразіла і тая жорсткасьць, з якой судзьдзі выносілі рашэньне пра арышты, асабліва людзям, якія прыцягваліся па першай частцы арт.167 КаАП – гэта значыць, што да гэтага яны ніколі не прыцягваліся да адміністратыўнай адказнасьці. Тое самае тычыцца людзей, якія сваю віну не прызналі і сьцьвярджалі, што былі затрыманыя выпадкова. Я прасіў судзьдзяў улічыць гэты факт і абмежавацца папярэджаньнямі, але яны ўсё адно выносілі арышты ад 3 да 10 сутак. Прычым самае цікавае, што 10 сутак выносілі тым, хто не прызнаваў сваю віну. Адзін чалавек заявіў хадайніцтва аб адвакаце. Прыйшла дзяжурны адвакат, у выніку чалавек атрымаў арышт 10 сутак. Атрымліваецца, што права на абарону насамрэч можа прывесьці да большага пакараньня. Пасадзілі пяць дзяўчат. Мяне зьдзіўляюць судзьдзі, якія самі жанчыны, яны павінны разумець, як складана дзяўчатам знаходзіцца ў антысанітарных умовах. У іх была магчымасьць прыняць іншае рашэньне, але відаць па ўсім, што ў іх была ўстаноўка на жорсткае пакараньне ўдзельнікаў акцыі. Судзьдзя Драбышэўская мяне наогул уразіла. Спачатку яна не дапусьціла мяне ў працэс па абсалютна незразумелых для мяне прычынах. А судзіла яна хлопца, які стаіць на ўліку ў псіхіятрычным дыспансеры. Яго вельмі доўга шукалі бацькі. У сьпецпрыёмніку адказвалі, што яго там няма, у міліцыі таксама. Давялося тэлефанаваць у бюро няшчасных выпадкаў. Бацькі вельмі хваляваліся. Урэшце яго прывезьлі ў суд.

Аказалася, што ён быў у сьпецпрыёмніку разам з усімі астатнімі. Гэта таксама вельмі цікавы момант, што ў сьпецпрыёмніку і ў міліцыі не даюць інфармацыі, калі ім тэлефануюць. Інфармацыі не даюць нават родным. Хлопец адназначна хворы. На судзе было бачна, што ён перажыў вельмі моцны стрэс, зьвязаны з затрыманьнем і ноччу, праведзенай у сьпецпрыёмніку. Судзьдзя ўсё гэта бачыла, але не дапусьціла мяне да працэсу, каб я мог бараніць гэтага чалавека. Не дапусьціла да працэсу і ягоную маці. Потым яна стала тлумачыць яму, што гэты артыкул Адміністратыўнага кодэксу прадугледжвае толькі штраф да 50 базавых велічыняў (прыблізна 450 $) і арышт. Я проста ня вытрымаў і сказаў: “Не падманвайце людзей. Па гэтым артыкуле ёсьць такая санкцыя, як папярэджаньне”. Нягледзячы на тое, што хлопец хворы, і бацькі казалі, што яму ўвесь час трэба прымаць нейкія таблеткі, судзьдзя Драбышэўская вынесла рашэньне – 3 сутак арышту. Я лічу, што такім чынам судзьдзя Драбышэўская ўзяла на сябе адказнасьць за яго далейшы стан здароўя. Калі нешта з ім здарыцца, яна будзе несьці адказнасьць. Але ня толькі жорсткасьць судзьдзяў уразіла мяне. Мяне ўразілі судзьдзі ўвогуле, якія лічаць сябе юрыстамі і дэманструюць паказное “правасудзьдзе”, у той час, калі Канстытуцыя двойчы перапісаная, растаптаная і выкінутая. Вось гэта мяне сапраўды ўразіла, бо нашы суды як былі “ленінскія”, так па сваёй сутнасьці “ленінскімі і засталіся”.

***22 кастрычніка*** Праваабарончы цэнтр “Вясна” прыняў заяву: “У Беларусі распачаты новы віток масавых палітычных рэпрэсіяў”. У заяве гаворыцца: “Парламенцкія выбары і рэспубліканскі рэферэндум у Беларусі прайшлі са шматлікімі грубымі парушэньнямі нацыянальнага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў. Фальсіфікацыі і маніпуляцыі, дапушчаныя ў ходзе выбарчай кампаніі, выклікалі хвалю справядлівага пратэсту грамадзянаў краіны, і як следзтва – беларускі аўтарытарны рэжым распачаў шалёны наступ на правы і свабоды чалавека. За ўдзел у мірных акцыях пратэсту 18, 19 і 20 кастрычніка было затрымана больш за 60 чалавек, 29 з іх арыштаваныя, сямёра падвергнутыя вялікім штрафам. Некаторыя з удзельнікаў былі жорстка зьбітыя супрацоўнікамі міліцыі, у тым ліку непаўнагадовыя і дзяўчаты. У выніку зьбіцьця шпіталізаваны з сур’ёзнымі траўмамі лідэр АГП Анатоль Лябедзька, у непрытомным стане дастаўленая ў бальніцу актывістка моладзевага дэмакратычнага руху. ГУУС Менгарвыканкаму ўзбудзіў крымінальную справу па факце правядзеньня акцыяў пратэсту ў г. Менску, распачаты крымінальны перасьлед актывістаў апазіцыйных партыяў Марыны Багдановіч, Аляксандра Цынкевіча, праваабаронцы Алега Волчака, якія прымалі ўдзел у выбарах у якасьці кандыдатаў у дэпутаты. У краіне з нарастаючай сілай працягваюць парушацца асноўныя правы і свабоды грамадзянаў: права на свабоднае выражэньне сваіх меркаванняў, свабоду слова, свабоду сходаў і

асацыяцыяў, усталявана жорсткая сістэма цэнзуры, іншадумцы падвяргаюцца перасьледу. Праваабарончы цэнтр “Вясна” расцэньвае сітуцыю, якая склалася ў краіне, як новы віток палітычных рэпрэсіяў, скіраваны на поўнае падаўленьне грамадзянскіх правоў і свабодаў беларускіх грамадзянаў і ўсталяваньне дыктатарскага рэжыму.”

***22 кастрычніка*** стала вядома паводле сьведчаньняў затрыманага 19 кастрычніка ўдзельніка акцыі Яраслава Навуменкі, што амапаўцы ўжывалі катаваньні ў адносінах да дэманстрантаў. У аўтобусах затрыманых “кідалі на падолгу і білі”. Пра гэта Я. Навуменка заявіў на судзе, але судзьдзя Ленінскага суда Церашкова не зьвярнула на факт катаваньня ніякай увагі і вынесла рашэньне пра 3 сутак арышту. Другі затрыманы, студэнт аднаго з менскіх ВНУ, заявіў на судзе, што іх кінулі ў аўтобусе на падлогу і “добра пахадзілі нагамі”. Але і гэты факт не зацікавіў судзьдзяў. Юрыст Праваабарончага цэнтру “Вясна” Валянцін Стэфановіч, які выступаў у судзе ў якасьці прадстаўніка затрыманых, адзначыў, што суды вызначаліся тым, што судзьдзі адмаўляліся выклікаць сьведкаў. “Мы будзем устанаўліваць факты катаваньняў, – гаворыць Валянцін Стэфановіч. -- Мы будзем дапамагаць людзям пісаць скаргі ў пракуратуру. Будзем патрабаваць праверкі фактаў катаваньня, устанаўленьня асобаў, якія займаліся катаваньнямі. А пасьля патрабаваць узбуджньня крымінальных справаў супраць іх. Акрамя таго, імёны гэтых асобаў будуць абнародаваныя, а факты будуць перададзеныя ў Камітэт ААН “Супраць катаваньняў”.

***22 кастрычніка*** капітан міліцыі, старэйшы інсьпектар аддзелу прафілактыкі і аховы правапарадку Ленінскага РАУС Гародні Пётр Ленец у тэлефоннай размове з кіраўніком Гарадзенскай філіі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ) Паўлам Мажэйкам запрасіў яго прыйсьці ў аддзел міліцыі і даць тлумачэньні адносна правядзеньня акцыі 4 кастрычніка. Журналіст заявіў, што будзе рэагаваць толькі на афіцыйныя патрабаваньні супрацоўнікаў міліцыі. Журналістка Юлія Коцкая, якая таксама брала ўдзел у акцыі пратэсту, паведаміла, што ўвечары 21 кастрычніка па адрасе яе прапіскі прыходзілі тры супрацоўнікі міліцыі. Таксама міліцыянты шукаюць іншых удзельнікаў пікету: Ірыну Чарняўку, Наталю і Анатоля Макушыных. Пяць гарадзенскіх журналістаў 4 кастрычніка зладзілі пікет на самай люднай вуліцы Гародні -- Савецкай, пратэстуючы супраць узмацненьня ціску на незалежную прэсу. Нагодай для правядзеньня акцыі стаў абвінаваўчы прысуд рэдактарцы "Биржи информации" Алене Раўбецкай, якой інкрымінавалі распаўсюд абразьлівай для прэзідэнта інфармацыі. Журналісты трымалі ў руках аркушы паперы са словамі "У Гародні судзяць журналістаў!!!".

У ***ноч на 22 кастрычніка*** невядомыя скралі ноўтбук, мабільны тэлефон і грошы ў аднаго з лідэраў Партыі БНФ Алеся Міхалевіча. У партатыўным кампутары Алеся Міхалевіча захоўвалася партыйная інфармацыя. Па факце крадзяжу міліцыя завяла крымінальную справу.

***22 кастрычніка*** абрабаваная кватэра старшыні Віцебскай гарадзкой арганізацыі АГП Алены Залескай, якая не выключае палітычнае матывацыі гэтага злачынства, бо з кватэры зьніклі кампутар і факс, якія на передвыбарчы перыяд было вырашана перанесьці сюды з партыйнага офісу. Цяпер гарадзкая арганізацыя АГП засталася без тэхнічных сродкаў і ня можа дзейнічаць так актыўна, як раней.

***23 кастрычніка*** лекары трох менскіх клінік аглядалі былога міністра зьнешнеэканамічных сувязяў, амбасадара і дэпутата Вярхоўнага Савету Міхаіла Марыніча, які знаходзіцца пад вартай у КДБ з 26 красавіка. Паводле адваката Веры Страмкоўскай, яны зафіксавалі шэраг прыкметаў пагаршэньня здароўя былога міністра. Вера Страмкоўская падала скаргу ў пракуратуру з патрабаваньнем спыніць крымінальны перасьлед.

***24 кастрычніка*** не адбыўся запланаваны ў Менску ўстаноўчы сход па стварэньні новай масавай грамадзкай арганізацыі “Айчына”. Кіраўніцтва Лядовага палацу, што на вуліцы Прытыцкага, па ініцыятыве міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава скасавала папярэднія дамоўленасьці на арэнду будынка для сходу, у якім чакаўся ўдзел каля трох тысячаў прадстаўнікоў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

***25 кастрычніка*** на рэдактара газеты "Навінкі" Паўлюка Канавальчыка напалі невядомыя. Пацярпелы патрапіў у рэанімацыю менскага шпіталю №2. Невядомыя падышлі ды пырснулі ў вочы Паўлюку Канавальчыку з газавага балончыка ў цэнтры Менску, непадалёк станцыі метро "Няміга". Адразу пасьля нападу Паўлюк Канавальчык цалкам страціў зрок. Праз пэўны час выпадковыя мінакі дапамаглі пацярпеламу дабрацца да шпіталю. У 1997 годзе на галоўнага рэдактара сатырычнай газеты "Навінкі" адбыўся напад, яго жорстка зьбілі. Пра цяперашні напад Паўлюк Канавальчык мае некалькі версіяў: альбо хуліганства, альбо перасьлед паводле палітычных матываў. Варта заўважыць, што нядаўна "Навінкі" прэзентавалі сатырычна агучаны фільм "Анастасія Слуцкая". Сваю версію "навінкаўцы" назвалі "Александрыя Шклоўская". Паўлюк Канавальчык адмовіўся ад узбуджэньня крымінальнай справы, бо ня ўстане апазнаць злачынцаў.

***26 кастрычніка*** старшыня агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі накіраваны ў калонію агульнага рэжыму № 22

у пасёлку Даманава Івацэвіцкага раёну Берасьцейскай вобласьці, а ягоны намесьнік Аляксандр Васільеў -- у калонію № 8 г. Ворша Віцебскай вобласьці.

***26 кастрычніка*** Генеральны дырэктар ЮНЕСКО Каіціра Мацуура выказаў занепакоенасьць фактамі "уціску свабоды СМІ на працягу апошніх месяцаў" у Беларусі і асудзіў "нядаўнія нападкі на беларускіх і замежных журналістаў".

***27 кастрычніка*** каля 12.30 ў Гародні міліцыя затрымала кіраўніка гарадзенскай філіі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" журналіста зачыненай газеты "Пагоня" Паўла Мажэйку. Пра гэта паведаміла гарадзенская журналістка Ірына Чарняўка, якой Павел пасьпеў патэлефанаваць пасьля затрыманьня. Як пасьпеў паведаміць па тэлефоне П. Мажэйка, затрыманьне праводзіў капітан міліцыі старшы інсьпектар Пётр Лянец. Журналіст знаходзіцца ў аддзеле прафілактыкі і аховы правапарадку Ленінскага РАУС Гародні. Між тым, дзяжурны Ленінскага РАУС заявіў, што ні пра якое затрыманьне ня ведае; тэлефон ў аддзеле аховы правапарадку ўвогуле не адказвае. Затрыманьне П. Мажэйкі зьвязанае з пікетам, які гарадзенскія журналісты правялі 4 кастрычніка.

***27 кастрычніка*** ў Ваўкавыску да галадоўкі галоўнага рэдактара "Местной газеты" Андрэя Шантаровіча далучыўся Мікалай Аксаміт — давераная асоба на мінулых выбарах мясцовага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча. Спадар Аксаміт пратэстуе супраць вынікаў выбараў. Мікалай Аксаміт напісаў заяву ў райвыканкам, ён прыводзіць прыклады парушэньняў падчас выбарчай кампаніі. Адпаведныя заявы ў Цэнтрвыбаркам вынікаў не далі, таму ён рашыўся на галадоўку. Ён патрабуе расьсьледаваць усе факты парушэньняў і пакараць вінаватых. Спадар Аксаміт меў магчымасьць назіраць за выбарамі і рэферэндумам у Ваўкавыскай 50-й акрузе, дзе балатаваўся прадпрымальнік Аўтуховіч (паводле афіцыйных дадзеных, ён набраў 28% галасоў). Галоўны рэдактар "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч галадуе ўжо сёмы дзень. Ён пратэстуе супраць таго, што 14 кастрычніка Міністэрства інфармацыі прыпыніла выхад газеты на месяц.

***27 кастрычніка*** на філфаку БДУ перастала існаваць кафедра беларускай літаратуры XX стагодзьдзя. Гэтая кафедра аб’яднаная з кафедрай гісторыі культуры. Кіраўніцтва факультэту сьцьвярджае, што зроблена гэта ў межах адмысловай праграмы рэструктурызацыі БДУ. Пісьменьнік і літаратуразнаўца Міхась Тычына, які шмат гадоў выкладаў на ўжо фактычна скасаванай кафедры, згадвае, што зусім нядаўна праходзілі яе ўнутраныя праверкі, і іх вынікі былі вельмі станоўчыя. Відавочных падставаў да кардынальнай рэвізіі не было, а таму спадар Тычына называе аб’яднаньне штучным: “Кафедра беларускай літаратуры XX стагодзьдзя —

гэта каранёвая кафедра, з якой увогуле філфак узьнік. Прынамсі, вядома, што ўсе астатнія кафедры так ці інакш вырасьлі з яе, ня кажучы ўжо пра імёны загадчыкаў, якія там працавалі. Так што я лічу, гэта штучнае абʼяднаньне, бо ўсё ж розныя рэчы — міфалогія і літаратура”. Міхась Тычына выказаў меркаваньне, што такія захады кіраўніцтва БДУ, падтрыманыя кіраўніцтвам філалагічнага факультэту, можна паставіць у адзін шэраг з ліквідацыяй Беларускага гуманітарнага ліцэю і Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту.

***28 кастрычніка*** стала вядома, што менскія кніжныя крамы адмаўляюцца прадаваць часопіс "Arche" пасьля выхаду нумара, прысьвечанага 10-годдзю кіраваньня А. Лукашэнкі (№4 за 2004 г.). Гэтую інфармацыю пацьвердзіў галоўны рэдактар выданьня Валерка Булгакаў. Адміністрацыя некаторых крамаў запатрабавала, каб рэдакцыя забрала ў іх таксама ўсе папярэднія нумары часопісу. Нумар, прысьвечаны юбілею прэзідэнцтва А. Лукашэнкі, паступіў у продаж у канцы верасьня. З пачатку кастрычніка яго адмовіліся прадаваць РУП "Белкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Веды", "Падпісныя выданьні". В. Булгакаў, тым ня менш, лічыць, што дагэтуль дзеяньні адміністрацыі гандлёвых прадпрыемстваў не наносяць вялікай шкоды часопісу: адмовы паступалі пакуль толькі з Менску; да таго ж кіёскі "Белсаюздруку" па-ранейшаму супрацоўнічаюць з выданьнем. Улетку 2003 году выданьне ўжо сутыкалася з падобнай праблемай: Менская кніжная крама "Акадэмкніга" адмаўлялася прымаць часопіс на рэалізацыю. Тады дырэктар кнігарні Софʼя Жыбулеўская заявіла, што ў крамы "мала плошчаў". У сярэдзіне жніўня 2003 г. у Віцебску на складзе прадпрыемства "Аблкнігагандль" таксама адмовіліся прымаць на рэалізацыю 25 асобнікаў выданьня. Як патлумачылі таваразнаўцы прадпрыемства, распараджэньне зыходзіла ад намесьніцы міністра Ліліі Ананіч. Падчас візіту на фестываль "Славянскі базар" спн. Ананіч пабачыла "Arche" у гандлёвым шапіку, які працаваў на "Сьвяце славянскай паэзіі". Вярнуўшыся ў Менск, чыноўніца патэлефанавала намесьніку дырэктара "Аблкнігагандлю" і зрабіла яму вымову за "службовую халатнасьць". Намесьніца міністра падкрэсьліла, што часопіс "Arche" мае правамоцную ліцэнзію на рэалізацыю, але службовыя асобы "мусяць разумець, чым і дзе варта гандляваць".

***28 кастрычніка*** Міхаіла Марыніча пакінулі ў ізалятары КДБ яшчэ на месяц “у інтарэсах сьледзтва”. Дазвол на працяг утрыманьня пад вартай дадзены ў Пракуратуры Беларусі.

***28 кастрычніка*** лідэр Абʼяднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, жорстка зьбіты амапаўцамі падчас акцыі пратэсту наведаў пракуратуру. Праверку па справе зьбіцьця Анатоля Лябедзькі амапаўцамі праводзіць старшы сьледчы

пракуратуры Ленінскага раёну Менску Юры Варонка. Ён дапытаў калегаў Лебедзькі з АГП Аляксандра Дабравольскага, Кацярыну Ткачэнку і Антаніну Кавалёву. Лідэр АГП патрабуе, каб амапаўцаў прыцягнулі да крымінальнай адказнасьці.

***29 кастрычніка*** скончыўся тэрмін адміністратыўных арыштаў тых удзельнікаў акцыі пратэсту супраць сфальсіфікаваных вынікаў рэферэндуму, хто 20 кастрычніка быў арыштаваны на 10 сутак. Але сябры і родныя, якія прыехалі да сьпецпрыёмніку на вул. Акрэсьціна ў Менску, каб сустрэць сваіх блізкіх, чакалі дарэмна. Яны даведаліся, што каля 10 арыштаваных былі адвезеныя ў сьледчае ўпраўленьне ГУУС Менгарвыканкаму для допытаў. Сярод іх знаходзіцца і старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікола Статкевіч.

***29 кастрычніка*** ў Гародні затрыманыя яшчэ двое журналістаў — Анатоль і Наталя Макушыны.

***29 кастрычніка*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ) даведалася, што стала лаурэатам прэміі імя А. Сахарава за свабоду думкі (Sakharov Prize for Freedom of Thought), якую штогод уручае Еўрапарламент. Імя пераможцы, якое лідэры палітычных групаў Еўрапарламенту выбралі сярод трох прэтэндэнтаў, было агучанае 28 кастрычніка ў Брусэлі. БАЖ быў прапанаваны ў якасьці кандыдата на атрыманьне прэміі групай парламентароў ад Еўрапейскай народнай партыі. Цырымонія ўзнагароджаньня павінна адбыцца ў сьнежні. "Беларуская асацыяцыя журналістаў” праяўляе сябе як змагар за незалежныя медыі", — гаворыцца ў афіцыйным прэс-рэлізе, распаўсюджаным з гэтай нагоды. Прэзідэнт Еўрапарламенту Джозэп Борэл заявіў, што "прысуджэньне прэміі Сахарава-2004 “Беларускай асацыяцыі журналістаў”, якая змагаецца за свабоду інфармацыі насуперак спробам прэзідэнта Лукашэнкі задушыць яе, зьяўляецца вельмі станоўчай падзеяй. Вынікі апошніх выбараў у гэтай краіне паказалі, што тыя, хто змагаецца за свабоду інфармацыі ў Беларусі і ва ўсім сьвеце, заслугоўваюць нашай падтрымкі", — заявіў Дж. Борэл. Сахараўская прэмія ўручаецца штогод, пачынаючы з 1988 г., "за дасягненьні ў справе змаганьня за правы і асноўныя свабоды чалавека, за абарону правоў меншасьцяў, павагу да міжнароднага права, унёсак у разьвіцьцё дэмакратыі і адстойваньне вяршэнства закону". Першым лаўрэатам прэміі Сахарава (у 1988 г.) быў Нэльсан Мандэла; у 2003 г. узнагароду прысудзілі Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў.

***29 кастрычніка*** ў Беларусі спыніла дзейнасьць прадстаўніцтва карпарацыі "Каунтэрпарт Интэрнэшнл" і яго праграма "Альянс Партнерства Каунтэрпарт".

***29 кастрычніка*** паводле рашэньня суда Цэнтральнага раёну г. Менску асуджаны на 15 сутак арышту Сяргей Мацкойць — удзельнік акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў. Акцыя адбылася ўвечары 28 кастрычніка на Кастрыніцкай плошчы.

***30 кастрычніка*** месца масавых пахаваньняў ахвяраў сталінскага генацыду Курапаты наведаў амбасадар ЗША ў Беларусі Джордж Крол, які дзесяць гадоў таму, у 1994 годзе, разам з Білам Клінтанам прысутнічаў пры адкрыцьці мемарыяльнай лаўкі – гэтага "вечнага сімвалу спачуваньня паміж нашымі народамі", як сказаў Дж. Крол. Шмат разоў вандалы спрабавалі разбурыць крыжы памяці, пастаўленыя ў крывавым урочышчы, зьбівалі шыльды і надпісы з памятных камянёў і мемарыяльнай лаўкі. Але кожны раз сюды прыходзяць простыя грамадзяне, каб аднавіць разбуранае варварамі, каб захаваць памяць пра бязьвінных ахвяраў.

У ***ноч з 30 на 31 кастрычніка*** ў Маладэчне невядомымі абрабаваны офіс Партыі БНФ. Паводле словаў актывіста маладэчанскай суполкі Партыі БНФ Алеся Капуцкага, злодзеі залезьлі ў хату праз выбітае акно. Выявілася, што частка аргтэхнікі зьнікла: сістэмны блок кампутара, факс, ксеракс, магнітола, мадэм, сканер, радыётэлефон.

***31 кастрычніка*** беларусы адзначылі “Дзяды”. Да месца масавых пахаваньняў ахвяраў сталінскага генацыду ў Курапатах прыйшлі калоны людзей пад гістарычнымі бел-чырвона-белымі сьцягамі. У Курапатах сабралася каля тысячы чалавек, каб ушанаваць памяць прадстаўнікоў усіх канфесіяў, што пахаваныя тут. У Курапаты прыйшло шмат моладзі.

***31 кастрычніка*** ў мястэчку Сьвіслач затрыманыя ўдзельнікі традыцыйнага ўшанаваньня памяці братоў Каліноўскіх. Былі затрыманыя старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Сяргей Мальчык, сябра Партыі БНФ Вадзім Саранчукоў, старшыня абласной арганізацыі БСДГ Віктар Сазонаў. З іх узятыя тлумачэньні ў сувязі з "выкарыстаньнем незарэгістраванай сімволікі" — дзяржаўнага сьцягу краіны ў перыяд з 1991 па 1995 гады.

## ЛІСТАПАД

***1 лістапада*** ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" накіравала адкрыты ліст міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу з просьбай адмяніць загад аб прыпыненьні выхаду недзяржаўнай "Местной газеты", галоўны рэдактар якой у знак пратэсту галадае на гэты час ужо 13 дзён. Арганізацыя заклікае міністра ў бліжэйшы час сустрэцца з кіраўніцтвам БАЖ і рэдактарамі недзяржаўных друкаваных выданьняў, каб абмеркаваць сітуацыю ў сферы СМІ. Па падліках БАЖ, з пачатку 2004 г. Міністэрства інфармацыі прыпыняла выхад 19 недзяржаўных друкаваных выданьняў. "У якасьці нагодаў дзеля прымяненьня такіх жорсткіх захадаў у загадах называліся парушэньні, факт якіх у шэрагу выпадкаў ня быў нічым пацьверджаны, – падкрэсьліваецца ў звароце. – Але нават калі гэтыя парушэньні і мелі месца, яны маглі б быць лёгка ліквідаваныя". Гэтаксама і парушэньні, указаныя ў загадзе аб прыпыненьні "Местной газеты", "ня могуць быць падставай дзеля закрыцьця, няхай і часовага, газеты, якую чакаюць 8,5 тысячаў чытачоў", – лічыць арганізацыя. "Мы ўвогуле супраць пазасудовага прыпыненьня выпуску газетаў. Лічым, што падобныя рашэньні... парушаюць міжнародна-прававыя абавязацельствы РБ ў галіне свабоды слова і перашкаджаюць ажыцьцяўленьню дэклараваных Канстытуцыяй правоў на свабоднае атрыманьне і распаўсюд інфармацыі", – гаворыцца ў звароце БАЖ. "Выдаўцы і журналісты незалежных газетаў ня просяць і не чакаюць ад дзяржавы эканамічнай падтрымкі. Яны толькі хочуць, каб ім не перашкаджалі спакойна працаваць". Аўтары дакументу падкрэсьліваюць, што журналісты "Местной газеты", якіх рашэньне міністэрства пазбавіла працы, гатовыя далучыцца да галадоўкі Андрэя Шантаровіча.

***1 лістапада*** стала вядома, што Пракуратура РБ накіравала ў пракуратуру г. Менску зварот Праўленьня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" адносна неправамоцных дзеяньняў міліцыі ў дачыненьні да Паўла Шарамета. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным лісьце, дасланым у БАЖ пракурорам аддзелу П. Радзівонавым. 19 кастрычніка ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" накіравала зварот Генеральнаму пракурору РБ Віктару Шэйману і міністру ўнутраных справаў Уладзіміру Навумаву ў зьвязку са зьбіцьцём і затрыманьнем журналіста расійскага "Первого канала" Паўла Шарамета. Арганізацыя патрабуе правесьці дадатковую праверку матэрыялаў гэтай справы; праверыць асобы двух затрыманых за напад на журналіста, але адпушчаных з Савецкага РУУС маладых людзей; ацаніць законнасьць дзеяньняў супрацоўнікаў Савецкага РУУС г. Менску, якія замест аказаньня дапамогі зьбітаму журналісту затрымалі яго і накіравалі ў сьпецпрыёмнік на Акрэсьціна.

***1 лістапада*** на сем сутак арыштаваны паводле рашэньня суда Ленінскага раёну г. Гародні Павел Мажэйка – кіраўнік Гарадзенскага аддзяленьня "Беларускай асацыяцыі журналістаў", журналіст забароненай уладамі газеты "Пагоня". Суд Ленінскага раёну Гародні прызнаў яго вінаватым у парушэньні ч. 1 арт. 167-1 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, пікетаваньняў). У знак пратэсту журналіст абвясьціў галадоўку. Мяркуецца, што журналіст будзе адбываць пакараньне ў ізалятары часовага ўтрыманьня Ленінскага РАУС. Слуханьні адміністратыўнай справы П. Мажэйкі пачаліся 27 кастрычніка. За дзьве з паловай гадзіны да гэтага ён быў затрыманы міліцыяй у цэнтры Гародні. Затрыманьне П. Мажэйкі зьвязанае з пікетам, які ён і яшчэ чатыры гарадзенскія журналісты правялі 4 кастрычніка.

***1 лістапада*** ў мястэчку Сьвіслач мусіў адбыцца суд над Віктарам Сазонавым (старшыня Гарадзенскага абласнога аддзяленьня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады), Сяргеем Мальчыкам (старшыня Гарадзенскага абласнога аддзяленьня Партыі БНФ) і Вадзімам Саранчуковым (актывіст Партыі БНФ), якія былі затрыманыя 31 кастрычніка падчас ўшанаваньня памяці братоў Каліноўскіх (шэсьце з нацыянальнымі сьцягамі ў мястэчку Сьвіслач). Суд быў прызначаны на 10.00, але пачаўся толькі ў 16.00. На судзе нечакана высьветлілася, што пратаколы, складзеныя 31 кастрыніка за выкарыстаньне "незарэгістраванай сімволікі" зьніклі, а замест іх зьявіліся пратаколы па ч.1 арт. 167.1 КаАП -- "парушэньне парадку правядзеньня і арганізацыі масавых мерапрыемстваў". Але і гэтыя пратаколы былі складзеныя са шматлікімі памылкамі, сьведкі-міліцыянты блыталіся ў паказаньнях, "правапарушальнікі" заявілі хадайніцтва пра ўдзел у працэсе адваката. У сувязі з гэтым судовыя працэсы перанесеныя.

***1 лістапада*** Партыя БНФ атрымала ліст ад Міністэрства юстыцыі, у якім патрабуецца да 1 лютага 2005 году зьмяніць юрыдычныя адрасы шэрагу арганізацыйных структураў. Паводле патрабаваньня Мінюсту, разьмяшчэньне юрыдычных адрасоў палітычных партыяў у прыватных кватэрах грамадзянаў і ў прыватных дамах забараняецца, калі яны ня маюць асобнага ўваходу ў офіс арганізацыі. Ліст падпісаны міністрам юстыцыі Віктарам Галаванавым і датаваны 18 кастрычніка 2004 году. У выпадку невыкананьня гэтага распараджэньня Мінюст пагражае рэагаваць згодна з дзеючым заканадаўствам — гэта значыць, размова можа ісьці пра ліквідацыю партыяў. Абсалютная большасьць структураў дэмакратычных палітычных партыяў, а таксама многіх няўрадавых арганізацыяў зарэгістраваныя менавіта ў жыльлёвым фондзе. Цяпер яны вымушаныя шукаць іншыя юрыдычныя адрасы, што даволі складана. Патрабаваньне Мінюсту закранае

амаль 90% партыйных структураў, і фізічна немагчыма яго выканаць у вызначаны тэрмін. Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка лічыць, што падставы дзеля гэтага патрабаваньня Мінюсту — палітычныя: “Гэта значыць, што ўступае ў сілу вядомая лукашэнкаўская заява — “не пакінуць каменю на камені…” Гэта, фактычна, спроба пачаць зьнішчэньне палітычных партыяў зьнізу. Але мы гэтага не баімся. БНФ дзейнічаў і ў незарэгістраваным стане і, калі гэта адбудзецца, будзем дзейнічаць так, як нам будзе падказваць сумленьне”.

***3 лістапада*** пайшлі пятнаццатыя суткі, як працягвае галадаць Андрэй Шантаровіч, галоўны рэдактар недзяржаўнай “Местной газеты” з Ваўкавыску. У апошні дзень ён моцна саслабеў, у яго зьбіваецца дыханьне, баліць галава. За час галадоўкі Андрэй страціў 15 кілаграмаў вагі. Ніякай рэакцыі на патрабаваньне Андрэя Шантаровіча адмяніць загад Міністэрства інфармацыі аб прыпыненьні ягонай газеты тэрмінам на тры месяцы ад уладаў няма.

***3 лістапада*** ў Цэнтральным судзе г. Менску пачаўся разгляд адміністратыўнай справы супраць суполкі крышнаітаў. Вернікі апынуліся перад пагрозай страты будынку, у якім адбываюцца набажэнствы. Інсьпектар аддзелу грамадзкай бясьпекі Цэнтральнага раёну Менску капітан Несьцяровіч абвінаваціў крышнаітаў у тым, што яны ў прыватным доме на вуліцы Паўлава ладзяць свае набажэнствы, што нібыта забаронена дзеючым заканадаўствам. Міліцыянт спаслаўся на адсутнасьць дазволу з боку райвыканкаму. Сябры суполкі ў судзе патлумачылі, што чатырнаццаць гадоў зьбіраюцца ў гэтым прыватным доме, гэта юрыдычны адрас суполкі. Дагэтуль ніякіх прэтэнзіяў да іх не было. Яны лічаць, што з гэтай судовай справы можа пачацца працэдура закрыцьця крышнаіцкай суполкі.

***3 лістапада*** Берасьцейскі гарвыканкам забараніў антыфашысцкі пікет. З ініцыятывай правесьці пікет выступілі сябры Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада). Меркавалася, што акцыя адбудзецца 6 лістапада на стадыёне “Будаўнік”, і яе ўдзельнікі выкажуць сваё стаўленьне да распаўсюду фашызму ў сучаснай Беларусі і сьвеце. Аднак у гарвыканкаме адмовілі ў правядзеньні пікету, спаслаўшыся на тое, што ў заяўцы не пазначаныя захады, каб забясьпечыць грамадзкі парадак і бясьпеку, медыцынскае абслугоўваньне і ўборку тэрыторыі пасьля масавага мерапрыемства.

***3 лістапада*** стала вядома, што дзяржаўнае выдавецтва "Мастацкая літаратура" адмовілася выдаваць васьмітомнік Васіля Быкава. Такі лёс задуманаму сябрамі выданьню Васіль Быкаў прадказваў ад самога пачатку працы над першым томам яшчэ тры гады таму. У тое, што дзяржаўнае выдавецтва ў цяперашніх умовах

выдасьць збор ягоных твораў, аўтар ня верыў – і не памыліўся. Запланаваны васьмітомнік дырэктар “Мастацкай літаратуры” Уладзіслаў Мачульскі рэкламаваў у прысутнасьці Васіля Быкава на міжнародным кніжным кірмашы ў Франкфурце-на-Майне яшчэ ў 2002 годзе, аднак выданьне першага тому неаднаразова пераносілася. Тым ня менш, цалкам падрыхтаваны да друку першы том ня выйшаў.

***3 лістапада*** суд Ленінскага раёну Гародні пастанавіў спагнаць 20 базавых велічыняў (220 даляраў) з Наталі Макушынай і столькі ж – з Анатоля Макушына. Судзьдзя Вікторыя Кулакоўская прызнала гарадзенскіх журналістаў вінаватымі ў парушэньні ч.1 арт. 167-1 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, пікетаваньняў). Наталя Макушына заявіла, што вынясеньне жорсткіх судовых рашэньняў у дачыненьні да журналістаў сьведчыць пра імкненьне ўладаў адрадзіць "бальшавіцкі рэжым" і задушыць свабоду слова ў краіне. Прадстаўнікоў прэсы, якія прыйшлі ў суд з бэйджамі "Свабоду Мажэйку!", міліцыя не пускала ў залу паседжаньняў, прымушаючы зьняць надпісы. Наталю і Анатоля Макушыных міліцыя затрымала 29 лістапада ў зале Ленінскага раённага суда, які ў той дзень разглядаў адміністратыўную справу Паўла Мажэйкі. Разам з П.Мажэйкам і яшчэ двума журналістамі яны ўдзельнічалі ў несанкцыянаваным пікеце 4 кастрычніка, пратэстуючы супраць узмацненьня ціску на незалежную прэсу. Нагодай да правядзеньня акцыі стаў абвінаваўчы прысуд рэдактарцы "Биржи информации" Алене Раўбецкай, якой інкрымінавалі распаўсюд абразьлівай для прэзідэнта інфармацыі. Журналісты ішлі па ходніку вуліцы Савецкай, трымаючы ў руках аркушы паперы са словамі "У Гародні судзяць журналістаў!!!".

***3 лістапада*** сябры Гарадзенскай філіі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ) прынялі заяву пратэсту ў сувязі асуджэньнем на 7 сутак адміністратыўнага арышту старшыні філіі Паўла Мажэйкі. "Мы, сябры Гарадзенскай філіі БАЖ, заяўляем пратэст супраць арышту нашага сябра і калегі!", -- гаворыцца ў заяве. "Мы лічым арышт Паўла Мажэйкі парушэньнем артыкулу 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і чарговай акцыяй палітычнага ўціску, што знаходзіцца ў адным шэрагу з гвалтоўным закрыцьцём незалежных выданьняў, са штрафаваньнем, зьбіцьцём і забойствамі беларускіх журналістаў". Аўтары заявы нагадваюць супрацоўнікам Ленінскага РАУС і судзьдзям Ленінскага раённага суда, што іх дзейнасьць знаходзіцца пад пільнай грамадзкай увагай, і запэўніваюць службовых асобаў, што "іх імёны захоўваюцца, а іх дзеяньні атрымаюць належную маральную і прававую ацэнку". "Мы патрабуем ад органаў унутраных справаў і судовых органаў адмовіцца ад ганебнай ролі выканаўцаў брудных загадаў палітычных зачыстак і спыніць кампанію па перасьледу

незалежных журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі!", -- гаворыцца ў заяве Гарадзенскай філіі БАЖ.

***3 лістапада*** Міжнародны інстытут прэсы заклікаў прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку спыніць перасьлед незалежных сродкаў масавай інфармацыі. У прыватнасьці, арганізацыя раскрытыкавала пакараньне, атрыманае беларускім журналістам Паўлам Мажэйкам за ўдзел у несанкцыянаванай дэманстрацыі – 7 сутак адміністратыўнага арышту.

***3 лістапада*** суд Цэнтральнага раёну Менску вынес папярэджаньне Аляксандру Карзову – старшыні рэлігійнай суполкі крышнаітаў. Аляксандра Карзова абвінавацілі ў тым, што набажэнствы ладзіліся ў прыватным доме без дазволу ўладаў. Судзьдзя Аляксей Бычко два дні разглядаў адміністратыўны пратакол, складзены інсьпектарам міліцыі Цэнтральнага раёну Менску Ігарам Несьцяровічам. Міліцыянт у судзе патлумачыў, што ў прыватным доме на вуліцы Паўлава ён бачыў некалькіх чалавек, якія сьпявалі песьні і гралі на, як ён выказаўся, “рэлігійных” інструментах. Сьпецыяліст Менгарвыканкаму Ала Мартынава патлумачыла, што паводле новага закону аб рэлігіі сябры індуісцкай суполкі мусяць браць дазвол, каб ладзіць сумесныя набажэнствы ў прыватным доме. Папярэджаньне — найменшае пакараньне, прадугледжанае законам аб масавых мерапрыемствах. Вернік Сяргей Малахоўскі лічыць, што гэты судовы працэс над імі не апошні: “Разумеем, што нас, як нібыта новы рэлігійны рух, хочуць прыбраць з тэрыторыі Беларусі, каб не было канкурэнтаў той асноўнай рэлігіі, якой даюць “зялёнае сьвятло”. Гэта адбываецца на карысьць праваслаўнай царквы, што мае манапольнае права прадстаўляць Бога ў Беларусі — краіне, дзе перамагло праваслаўе”. Сябры міжнароднай суполкі Сьвядомасьці Крышны заявілі, што будуць пісаць скаргу ў Камітэт па правах чалавека ААН.

***3 лістапада*** пасьля 15-сутачнага адміністратыўнага арышту лідэр "Маладога Фронту" Павел Севярынец быў дапытаны ў КДБ. Супрацоўнікі КДБ задавалі пытаньні пра вулічныя падзеі 18-19 кастрычніка.

***3 лістапада*** ўласны карэспандэнт газеты "Народная воля" Ірына Макавецкая ня здолела патрапіць на сумеснае паседжаньне Прэзідыюму Вярхоўнага суда і калегіі Міністэрства юстыцыі, якое праходзіла ў Гомелі. Пра магчымасьць узяць удзел у ім І.Макавецкая пацікавілася ў супрацоўніка ўпраўленьня ідэалагічнай працы Гомельскага аблвыканкаму Валерыя Ахлесьціна. Сп-р Ахлесьцін паведаміў, што яму патрэбна ўдакладніць гэтае пытаньне ва ўпраўленьні юстыцыі. 2 лістапада ён патэлефанаваў І.Макавецкай і паведаміў, што прэсу на паседжаньне дапускаць ня

будуць. Журналістка прапанавала, каб пасьля паседжаньня міністр юстыцыі выйшаў да журналістаў і адказаў на іх пытаньні. Аднак выхаду міністра да прэсы не было. Тэма сумеснага паседжаньня была важнай для рэгіёну: "Вынікі праверкі арганізацыі працы Гомельскага абласнога суда, упраўленьня юстыцыі аблвыканкаму і раённых судоў".

***4 лістапада*** суд ў гарадзкім пасёлку Сьвіслач спагнаў з Віктара Сазонава і Сяргея Мальчыка штраф у памеры 70 базавых адзінак. Суд прызнаў В. Сазонава і С. Мальчыка вінаватымі ў парушэньні двух артыкулаў Адміністратыўнага кодэксу – выкарыстаньне незарэгістраванай сімволікі і парушэньне арганізацыі і парадку правядзеньня масавых акцыяў і шэсьцяў. Рэгіянальныя партыйныя лідэры былі затрыманыя падчас ушанаваньня нацыянальных герояў Беларусі – Віктара і Кастуся Каліноўскіх.

***4 лістапада*** ў Беларусь не дапусьцілі ўезд кіраўніка рэгіянальнага бюро Фонду імя Фрыдрыха Эберта ва Украіне, Малдове і Беларусі Гельмута Курта. Стала вядома, што Гельмут Курт уключаны ў так званы "чорны сьпіс" замежнікаў, якіх беларускія ўлады рэкамендавалі не ўпускаць у Беларусь.

***4 лістапада*** калектыў рэдакцыі газеты "Народная воля" накіраваў адкрыты ліст міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу, у якім сказана: «Уладзімір Васільевіч! Мы ня можам маўчаць, калі жыцьцё нашага калегі ў небясьпецы. Мы ня можам маўчаць, калі ўлады робяць выгляд, што нічога надзвычайнага не адбываецца. На жаль, адбываецца – шаснаццаты дзень трымае галадоўку рэдактар "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч. Уяўляеце: не другі, ня трэці, а шаснаццаты дзень. Наш калега з Ваўкавыску пайшоў на адчайны крок, страціўшы ўсялякую надзею адстаяць свае прафесійныя правы. Ён пайшоў на адчайны крок, абараняючы правы кожнага грамадзяніна на праўдзівую, аб’ектыўную інфармацыю. Няўжо мы, журналісты, павінны абараняць сваё права на працу, рызыкуючы ўласным здароўем і нават жыцьцём? Прыпыненьне выхаду "Местной газеты", адмаўленьне ў рэгістрацыі па ваўкавыскім адрасе – адно са зьвеньняў у ланцугу рэпрэсіўных захадаў супраць незалежных мас-медыя. Па надуманых прычынах непадуладныя газеты выкідваюцца з друкарняў, для іх устаноўленыя дыскрымінацыйныя тарыфы на паслугі сувязі, распаўсюджваньня, мацнее ўціск на падпісчыкаў, рэкламадаўцаў. Калі Андрэй Шантаровіч ня спыніць галадоўку, ён можа памерці. Калі пазбавіць беларускі народ свабоднага слова – ён таксама можа памерці. Каб не памерці ўсім, давайце, спадар міністр, дзейнічаць! Дзейнічаць у абарону Канстытуцыі, якая гарантуе свабоду слова! Дзейнічаць у абарону правоў кожнага чалавека! Скажыце сваё слова – ня дайце памерці Андрэю Шантаровічу. Ня дайце памерці "Местной

газеце"! Ня дайце памерці іншым незалежным выданьням! Вы – міністр інфармацыі, а не кат свабоднага слова”.

***5 лістапада*** да гарадзенскага журналіста Паўла Мажэйкі, які працягвае галадоўку пратэсту ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку Кастрычніцкага раёну Гародні выклікалі хуткую дапамогу. Але па словах супрацоўнікаў адміністрацыі прыёмніка-разьмеркавальніку, стан здароўя журналіста не пагоршыўся — за дзень журналісту Мажэйку прыносяць 6-7 перадачаў, асабліва шмат вады, газетаў, раздрукоўак з Інтэрнету. Павел Мажэйка адмовіўся ад ежы і абвясьціў пра галадоўку ў знак пратэсту супраць рашэньня суда.

***5 лістапада*** група расійскага бюро французскага тэлеканалу TF1, якая здымала ў Менску акцыю пратэсту руху супраціву "Зубр", была затрыманая і пазбаўленая акрэдытацыі пры Міністэрстве замежных справаў Беларусі. Французскіх журналістаў пратрымалі дзьве гадзіны ў міліцыі, а пасьля забралі відэакасету і сьцёрлі запіс.

***5 лістапада*** стала вядома, што прадстаўнік Ваўкавыскай праваабарончай арганізацыі “Аслона” Мікола Аксаміт шпіталізаваны і спыняе галадоўку пратэсту супраць сфальсіфікаваных вынікаў выбараў і рэферэндуму. Мікола Аксаміт, які галадаў два тыдні, па прычыне праблемаў з ціскам і сэрцам выклікаў "хуткую дапамогу". Яго шпіталізавалі, увялі глюкозу і параілі спыніць галадоўку, бо яе працяг быў бы небясьпечным для жыцьця. Спадар Аксаміт пачаў выхад з галадоўкі. Ён лічыць сваю акцыю патрэбнай. Іншай магчымасьці дзеля выказваньня пратэсту няма, кажа спадар Аксаміт: “Дзякуючы галадоўцы пра парушэньні і фальсіфікацыі на выбарах і рэферэндуме цяпер ведае ўвесь наш горад, і ўвесь горад гэтым абураецца. Такім чынам, хоць гэтая мэта дасягнутая. Я ня меў ніякіх ілюзіяў, ідучы на галадоўку, што ўлады прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці тых людзей, якія рабілі фальсіфікацыі. Самі ж сябе яны судзіць ня будуць”.

***5 лістапада*** адзін з каардынатараў руху "Зубр" Мікіта Сасім быў арыштаваны ў Баранавічах на падставе пастановы суда Цэнтральнага раёну г. Менску, у адпаведнасьці з якой ён ужо адбыў арышт 15 сутак у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку.

***5 лістапада*** Міхаілу Марынічу прад’явілі канчатковае абвінавачаньне і прапанавалі азнаёміцца з крымінальнай справай напярэдадні яе накіраваньня ў суд. Абвінавачаньне Міхаілу Марынічу складаецца цяпер з чатырох эпізодаў. Былы міністр і амбасадар нібыта вінаваты ў незаконным захоўваньні зброі, крадзяжы маёмасьці і сакрэтных дакументаў ды ў невяртаньні пячаткі. Гэтыя абвінавачаньні разам з матэрыяламі справы сьледчыя КДБ прад’явілі Міхаілу Марынічу дзеля

азнаямленьня. Яму было заяўлена, што пасьля справа трапіць у суд. Паводле словаў адваката Веры Страмкоўскай, Міхаіл Марыніч у адказ заявіў пратэст і сказаў, што ўлады помсьцяць яму за апазіцыйную дзейнасьць. Варта нагадаць, што пасьля арышту Міхаіла Марыніча ў красавіку сьледчыя падазравалі яго і ў падробцы грошай, але потым адмовіліся ад гэтага абвінавачаньня. Між тым, адабраныя падчас затрыманьня 90 тысячаў даляраў Міхаілу Марынічу гэтак і не вярнулі.

***5 лістапада*** з патрабаваньнем вызваліць Паўла Мажэйку, а таксама іншых палітычных вязьняў у адмысловым лісьце да А.Лукашэнкі зьвярнуўся Нарвежскі Хельсінкскі камітэт. "Рашэньне суда Ленінскага раёну ад 1 лістапада – не навіна, але хутчэй праява Вашай прэзідэнцкай палітыкі, скіраванай на стрыманьне свабоды перакананьня, свабоды слова і права на правядзеньне мірных сходаў, у спробе падавіць апазіцыю цяперашняму рэжыму", – гаворыцца ў лісьце, падпісаным Генеральным сакратаром Нарвежскага Хельсінкскага камітэту Б’ёрнам Енгеслandам. Нарвежскі Хельсінкскі камітэт заклікае ўлады пакласьці канец рэпрэсіям супраць уласнага насельніцтва і вызваліць усіх вязьняў, асуджаных па палітычна-матываваных абвінавачаньнях, уключаючы Паўла Мажэйку, і прывесьці заканадаўства ў адпаведнасьць міжнародным стандартам і канвенцыям, падпісаным Беларусьсю. У прыватнасьці, заканадаўства мусіць відавочным чынам гарантаваць права на вольнае выражэньне ўласных перакананьняў, “нават калі ўрад Беларусі можа не падзяляць гэтыя перакананьні", – гаворыцца ў звароце. Генеральны сакратар Нарвежскага Хельсінкскага камітэту Б’ёрн Енгесланд у звароце нагадвае пра закрыцьцё незалежных газетаў, палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў у Беларусі, арышты ўдзельнікаў дэманстрацыі ў Менску 19 кастрычніка, зьбіцьцё апазіцыйных лідэраў. Копіі Звароту таксама накіраваныя Міністэрству замежных справаў Беларусі, Нарвежскаму прэм’ер-міністру, Міністру замежных справаў, кіраўніку сталага Камітэту замежных справаў Паламенту Нарвегіі.

***5 лістапада*** ў Берасьці невядомыя апаганілі мемарыял ахвярам Халакосту – падпалілі штучныя кветкі вянкоў і пашкодзілі выяву зоркі Давіда на пліце помніка.

***8 лістапада*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне аб парушэньні Закону Рэспублікі Беларусь “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі” заснавальніку газеты “Курьер из Борисова” (ТДА “Пресс-сервис”). Папярэджаньне вынесенае на падставе парушэньня артыкулаў 11 і 2 Закону “Аб друку”. На думку міністэрства, парушэньне арт. 11 заключаецца ў тым, што рэдакцыя своечасова не паведаміла пра зьмену тэматыкі выданьня з даведачнай і рэкламнай на масава-палітычную. Парушэньнем арт. 2 міністэрства назвала тое, што кіраўніком рэдакцыі

зьяўляецца А.Удавічэнка, а ў выходных дадзеных галоўным рэдактарам пазначаная іншая асоба — Л. Атчанашанка.

***8 лістапада*** рэдакцыя баранавіцкай недзяржаўнай газеты “Intex-press” атрымала ліст, падпісаны пракурорам горада А.Смалем. "У сувязі з узьніклай неабходнасьцю, прашу тэрмінова інфармаваць пракуратуру г.Баранавічы аб былых публічных заявах, разьмешчаных у сродках масавай інфармацыі, былых кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб нібыта наяўных фальсіфікацыях вынікаў галасаваньня". Пракуратура просіць накіраваць інфармацыю пра зьмест падобных публікацыяў да 10 лістапада.

***8 лістапада*** вядомая беларуская журналістка, намесьніца рэдактара "Белорусской деловой газеты" Ірына Халіп была выкліканая ў пракуратуру г. Менску для дачы тлумачэньняў з нагоды разьмяшчэньня ў расійскай “Новой газете” артыкулу “Проголосовали мертвые души", прысьвечанага тэме масавых фальсіфікацыяў і парушэньняў закону падчас выбараў і рэферэндуму.

***9 лістапада***, на 21 дзень, спыніў галадоўку галоўны рэдактар ваўкавыскай “Местной газеты” Андрэй Шантаровіч. Рэдактар прыслухаўся да звароту кіраўніцтва “Беларускай асацыяцыі журналістаў” і галоўных рэдактароў 16 незалежных газетаў, якія заклікалі яго спыніць галадаваньне і паберагчы сілы для журналісцкай працы.

***9 лістапада*** стала вядома, што нямецкія сацыял-дэмакраты выказваюць пратэст ў сувязі з дзеяньнямі афіцыйнага Менску ў дачыненьні да Гельмута Курта – аднаго з кіраўнікоў Фонду Фрыдрыха Эбэрта. Адпаведную заяву ад імя кіруючай сацыял-дэмакратычнай фракцыі Бундэстагу зрабіла Ута Цапф. Паводле спадарыні Цапф, адмова ва ўезьдзе ў Беларусь Гельмуту Курту, кіраўніку рэгіянальнага бюро Фонду Эбэрта, надзвычай абцяжарвае далейшае супрацоўніцтва паміж Нямеччынай і Беларусьсю. Гельмут Курт, які меў беларускую візу, але пры гэтым, аднак, ня змог трапіць у Менск для ўдзелу ў міжнародным форуме Фонду Фрыдрыха Эбэрта, так і не атрымаў ад беларускіх уладаў адпаведных тлумачэньняў. Ён быў проста названы непажаданай персонай і мусіў правесьці ўсю ноч у менскім аэрапорце, каб на наступны дзень адляцець у Кіеў, гаворыццаў заяве. Як вынікае з дакументу, такое абыходжаньне з прадстаўніком нямецкага палітычнага Фонду – абсалютна непрымальнае. Беларускае кіраўніцтва мусіць даць тэрміновае тлумачэньне, чаму спадару Курту не дазволілі ўехаць у краіну. Падкрэсьліваецца, што праз два тыдні пасьля правядзеньня ў Беларусі недэмакратычных парламенцкіх выбараў палітычны дыялог з афіцыйным Менскам яшчэ больш ускладніўся. Нямецкія сацыял-

дэмакраты, аднак, выказваюць надзею, што падобны рэгрэс у нямецка-беларускіх дачыненьнях усё ж не зьяўляецца мэтай менскага кіраўніцтва.

***9 лістапада*** стала вядома, што зьняволены прафесар Юры Бандажэўскі накіраваны ў 1-ы клінічны шпіталь у Менску. У яго знайшлі гепатыт, лекары высьвятляюць паходжаньне вірусу. Жонка прафесара Галіна Бандажэўская не выключае, што заражэньне гепатытам магло адбыцца падчас аперацыі, якую раней перанёс зьняволены прафесар ва ўмовах калоніі. Былы рэктар Гомельскага медыцынскага інстытуту Юры Бандажэўскі адбывае пакараньне ў Гезгалах Лідзкага раёну. Яшчэ на працягу двух гадоў ён мусіць знаходзіцца на пасяленьні. Сусьветна навукоўца вучоны адбывае пакараньне ва ўстановах пенітэнцыярнай сістэмы пяты год. На пасяленьні ў Гезгалах прафесар працуе начным вартаўніком, ахоўвае склад. Калі Бандажэўскаму стала дрэнна, адміністрацыя калоніі вырашыла накіраваць яго на лячэньне па месьцы жыхарства сям'і, у Менск. Прафесара-патолагаанатама Юрыя Бандажэўскага абвінавацілі ў хабарніцтве і асудзілі да пазбаўленьня волі. Навукоўцы розных краінаў сьвету высока ацанілі працу прафесара, які даказваў сувязь сьмяротных паталогіяў з наступствамі чарнобыльскай катастрофы. З патрабаваньнем адпусьціць прафесара на свабоду выступілі праваабарончыя арганізацыі. “Міжнародная Амністыя” прызнала яго палітычным вязьнем. Юры Бандажэўскі зьяўляецца ганаровым грамадзянінам некалькіх французскіх гарадоў. Зьняволены прафесар Юры Бандажэўскі абраны ганаровым доктарам Марсельскага ўнівэрсітэту. Пра гэта жонцы прафесара, Галіне Бандажэўскай, паведамілі ў амбасадзе Францыі. Выкладчыкі Марсельскага ўнівэрсітэту азнаёміліся з працамі Ю.Бандажэўскага ў галіне радыяцыйнай медыцыны і прызналі іх надзвычай важнымі для разьвіцьця навукі.

***9 лістапада*** пракуратура пачала выклікаць на допыты былых кандыдатаў у дэпутаты. У палітычнай некарэктнасьці ўлады найперш абвінавачваюць сяброў АГП Марыну Багдановіч і Аляксандра Цынкевіча, праваабаронцу і сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады Алега Волчака, якія былі зьнятыя з перадвыбарчай гонкі рашэньнем выбарчых камісіяў. Марыне Багдановіч патэлефанаваў сьледчы Ленінскага раёну Гарадзенскай пракуратуры Сяргей Шэстаў і запрасіў прыехаць для дачы паказаньняў. Сьледчы патлумачыў, што даваць паказаньні спадарыня Багдановіч будзе наконт свайго радыёвыступу, у якім быццам бы ёсьць абраза прэзідэнта. Пра тое, ці ўзбуджаная крымінальная справа, сьледчы нічога не сказаў. Раней Лідзкая міжраённая пракуратура прыслала спадарыні Багдановіч ліст, у якім гаворыцца, што яе справа перададзеная ў Гарадзенскую абласную пракуратуру. Марына Багдановіч сказала, што грошы ад продажу няўлічанай зброі ідуць на

“Мерсэдэсы” для чыноўнікаў і на прэзідэнцкі “Боінг”. Алега Волчака абвінавачваюць у паклёпе на службовых асобаў, Аляксандра Цынкевіча – за ўлётку, у якой гаварылася, што ў краіне ідзе халодная грамадзянская вайна.

***10 лістапада*** прадпрыемства "Белсаюздрук" датэрмінова скасавала дамову на распаўсюд часопісу "ARCHE-Пачатак". Распараджэньне набывае моц з 2 сьнежня. Яго падпісаў дырэктар "Белсаюздруку", былы міністр інфармацыі Беларусі Міхаіл Падгайны. Прычына скасаваньня дамовы -- у нізкіх аб’ёмах продажу выданьня. Заснавальнік часопісу Андрэй Дынько аспрэчвае тэзу аб малым попыце на выданьне: за 6 гадоў сьпісвалася 10-30% асобнікаў часопісу. У кастрычніку гэтага году дамову на распаўсюд выданьня скасавала прадпрыемства "Белкніга". Такім чынам, "ARCHE" пазбавілася шляхоў распаўсюду 80% свайго накладу. Застаўся пакуль шлях – распаўсюд праз падпіску. Наклад кожнага нумару "ARCHE" складае 1100 асобнікаў.

***10 лістапада*** адміністратыўная камісія Перашамайскага раёну Віцебску папярэдзіла вядомага праваабаронцу і журналіста Валерыя Шчукіна. У кастрычніку ён быў тройчы затрыманы за распаўсюд улётак з заклікам сказаць “НЕ!” на рэферэндуме 17 кастрычніка. В.Шчукіна выклікалі на камісію за распаўсюд улётак, якія ён сам склаў ды надрукаваў за ўласныя сродкі. Старшыня Першамайскага райвыканкаму Жана Мацкевіч, якая ўзначальвае раённую адміністратыўную камісію, адразу ж забараніла журналістам прысутнічаць на паседжаньні. Разьбіральніцтва за зачыненымі дзьвярыма ішло амаль паўтары гадзіны. Урэшце, пасьля вывучэньня трох міліцэйскіх пратаколаў і працяглых спрэчак, сябры камісіі прызналі спадара Шчукіна вінаватым і абвясьцілі яму папярэджаньне.

***11 лістапада*** Вярхоўны суд Беларусі не задаволіў скаргу заснавальнікаў Партыі свабоды і прагрэсу Уладзіміра Навасяда, Сяргея Казлоўскага і Аляксандра Мельнікава, якія лічылі, што Міністэрства юстыцыі нематывавана адмовіла партыі ў рэгістрацыі. Міністэрства юстыцыі ўжо двойчы адмаўляла партыі ў рэгістрацыі, спасылаючыся на тое, што быў парушаны парадак стварэньня партыі, і шэраг устаноўчых дакументаў утрымліваў несапраўдныя зьвесткі. Паводле Уладзіміра Навасяда, партыя, якую ён спрабуе стварыць, — ліберальнага накірунку. У яе хочуць увайсьці ў асноўным сябры моладзевага грамадзкага аб’яднаньня “Грамадзянскі форум”, якое ўзначальвае Уладзімір Навасяд.

***11 лістапада*** адміністратыўная камісія Маскоўскага раёну Менску пакарала вядомага адваката, праваабаронцу, намесьніка старшыні Беларускага Хельсінкскага камітэту Гары Паганяйлу грашовым штрафам у памеры пяці мінімальных заробкаў.

Адміністратыўныя камісія вырашыла, што вядомы праваабаронца распаўсюджваў незарэгістраванае выданьне — даклад Хрыстаса Пургурыдэса “Зьніклыя асобы ў Беларусі”.

***11 лістапада*** гаспадарчы суд Берасьцейскай вобласьці задаволіў зыск Лунінецкага прадпрыемства "Палесьсеэлектрамаш" да газеты "Брестский курьер". Кіраўніцтва прадпрыемства палічыла неадпаведнымі рэчаіснасьці факты, прыведзеныя газетай у публікацыі "Трясина долгов" за верасень 2004 г. пра заработную плату, крэдытарскую запазычанасьць, колькасьць звольненых сёлета працаўнікоў. Пярэчаньні дырэктара Р.Міценева былі надрукаваныя на старонках "Брестского курьера", але кіраўніцтва прадпрыемства падало зыск у суд аб абароне дзелавой рэпутацыі. Судзьдзя А.Гарбацкі прыняў рашэньне задаволіць зыск і абавязаў газету сплаціць судовыя выдаткі 95 тысячаў рублёў.

***11 лістапада*** ў Баранавічах судовыя выканаўцы апісалі маёмасьць бацькоў актывісткі руху “Зубр” Марыі Гамбецкай. Марыя Гамбецкая была аштрафаваная за ўдзел у акцыі “Свабода Марынічу”, якая адбывалася 27 верасьня ў Баранавічах. Суд вынес рашэньне па арт.167-1. ч.1 (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Штраф – 30 базавых велічыняў.

***12 лістапада*** Вышэйшы гаспадарчы суд Рэспублікі Беларусь прызнаў несапраўдным загад аб прыпыненьні дзейнасьці газеты "Время" на 3 месяцы.

***12 лістапада*** ў Жлобіне судзьдзя раённага суда Алена Ярмольчык разглядала адміністратыўную справу супраць старшыні раённай арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Пятра Мірашнічэнкі і вынесла рашэньне аштрафаваць яго на 120 тысячаў рублёў за нібыта незаконны выраб і распаўсюд перыядычных выданьняў. Да судовай справы супраць Пятра Мірашнічэнкі спрычыніліся жлобінскія міліцыя, пракуратура, раённы Савет дэпутатаў і рэдактар дзяржаўнай газеты “Новы дзень”. Віна спадара Мірашнічэнкі ў тым, што ў сябе дома ён набраў на ўласным кампутары і надрукаваў на прынтары артыкул, прысьвечаны рэферэндуму: “Скажам – “не” пажыцьцёвай дыктатуры!”. У актывіста ўчыніліператрус, адабралі кампутар і завялі адміністратыўную справу.

***15 лістапада*** ваўкавыская галадоўніца, пенсіянерка Валянціна Салдатава зьмешчаная ў шпіталь — пагоршылася здароўе. Цягам 19 дзён 67-гадовая пенсіянерка адмаўлялася ад ежы ў знак пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў, перасьледу незалежнай “Местной газеты” і бязьдзеяньня ўладаў у вырашэньні жыцьцёвых праблемаў. Валянціна Садатава хварэе на цукровы дыябет, і на шпіталізацыі настоялі лекары. Але жанчына пагадзілася толькі на дзённы

стацыянар, бо мусіць даглядаць непаўнагадовую ўнучку-школьніцу. Спадарыня Салдатава прымае лекі і працягвае галадоўку.

***15 лістапада*** ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласьці дастаўлены ў суд і пакараны трыма суткамі адміністратыўнага арышту актывіст Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады Дзям’ян Франкоўскі. Яго абвінавацілі ў “распаўсюдзе ўлётак, якія выраблены з парушэньнем устаноўленага парадку”. Справа актывіста стала шырока вядомая ў Горках таму, што на Дзям’яна Франкоўскага, які перадаваў у партыйныя арганізацыі кааліцыйныя ўлёткі “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”, паскардзіўся чыноўнікам "вертыкалі" і міліцыянтам пільны кіраўнік мясцовай ветэранскай арганізацыі.

***15 лістапада*** судовыя выканаўцы апісалі маёмасьць бабулі былога кандыдата ў дэпутаты Аляксея Шэіна. Коштам гэтай маёмасьці яны зьбіраюцца пагасіць штраф, накладзены на Аляксея за ўдзел у апазіцыйнай акцыі. Бабуля Аляксея Шэіна жыве ў Ракаве. Аляксей прапісаўся ў яе хаце ў ліпені, а ў жніўні зарэгістраваўся ў якасьці прэтэндэнта ў кандыдаты па Маладэчанскай акрузе. Вось тады ўлады і згадалі, што Аляксей вінен дзяржаве грошы — 1 мільён 250 тысячаў рублёў. Гэта штраф, якім пакараў маладафронтаўца Маскоўскі суд у 2001 годзе за тое, што ён разам з паплечнікамі ўсклаў кветкі каля Менскага СІЗА, каб ушанаваць памяць расстраляных фашыстамі менскіх падпольшчыкаў. Бабуля Аляксея згадала 1933 год. Тады яе ў трохгадовым узросьце разам з бацькамі выслалі ў Сібір, і перад высылкай людзі ў цывільным таксама апісвалі маёмасьць. Аляксей Шэін зьбіраецца аспрэчваць дзеяньні судовых выканаўцаў у абласным судзе.

***16 лістапада*** адміністрацыя Маскоўскага раёну Менску адмовіла ў перарэгістрацыі рэлігійнай суполцы Царква “Новае жыцьцё" Аб’яднаньня абшчынаў хрысьціянаў поўнага Евангельля ў Рэспубліцы Беларусь.

***16 лістапада*** барысаўская пракуратура распачала крымінальную справу. Як вынікае з пастановы, галоўны рэдактар “Барысаўскіх навінаў” Анатоль Букас дапусьціў абразу і паклёп на рэдактара дзяржаўнай барысаўскай газеты. “Я зьмясьціў артыкул “Зьвездануты пастрэл усюды пасьпеў, альбо Маўчаньне ягнятаў”, у якім расказаў пра тое, што Пратасевіч Вера Мікалаеўна, якая зьяўляецца рэдактарам мясцовай афіцыйнай газеты, так бы мовіць, няроўна дыхае ў мой бок. За паўгады яна надрукавала ў газеце “Адзінства” тры вялізныя артыкулы, дзе абразіла мяне. Называла пеўнем, студэнтам-недавукам і г. д.”, — гаворыць спадар Букас. Паводле спадара Букаса, ягоная публікацыя стала адказам на выказваньні рэдактара выданьня Барысаўскага гарвыканкаму. Дарэчы, публікацыя, якая справакавала

крымінальную справу, зьявілася ў “Барысаўскіх навінах” яшчэ ў сакавіку. Але чаму менавіта цяпер — праз восем месяцаў — журналісцкі канфлікт зацікавіў барысаўскую пракуратуру? “Рэч у тым, што спадарыня Пратасевіч абразіла ня толькі мяне, але і яшчэ аднаго барысаўчаніна, Аляксандра Моніча. Яна сказала, што ён паводзіў сябе на выбарчым участку, як “пячорны чалавек”. Спадар Аляксандр падышоў да мяне ў рэдакцыю, і я сказаў, каб ён падрыхтаваў заяву ў пракуратуру. Магчыма, пра гэта даведалася Пратасевіч і, у сваю чаргу, напісала заяву супраць мяне”, — зазначыў на гэты конт Анатоль Букас.

***16 лістапада*** Праваабарончы цэнтр “Вясна” прыняў заяву, у якой канстатуе, што Рэспубліка Беларусь не выконвае абавязацельстваў па арт. 2 “Канвенцыі супраць катаваньняў ды іншых бесчалавечных альбо прыніжаючых відах абыходжаньня і пакараньняў” ад 10 сьнежня 1984 году, ратыфікаваную нашай дзяржавай 21 студзеня1987 году. У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр “Вясна” лічыць неабходным візіт у Рэспубліку Беларусь сьпецыяльнага прадстаўніка Камітэту ААН супраць катаваньняў. Праваабарончы цэнтр “Вясна” падрыхтаваў “Папярэдні маніторынг па фактах выкарыстаньня катаваньняў ды іншых бесчалавечных відаў абыходжаньня ў адносінах да грамадзянаў Беларусі” і прапануе разгледзець яго на паседжаньні Камітэту ААН супраць катаваньняў.

***16 лістапада*** гарадзенская міліцыя ізноў актывізавала пошук журналістаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі пратэсту супраць узмацненьня ціску на незалежную прэсу. Як паведаміў сябра Гарадзенскай філіі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Андрэй Кусяльчук, у гэты дзень офіс адной з мясцовых грамадзкіх арганізацыяў наведаў капітан міліцыі, старшы інсьпектар аддзелу прафілактыкі і аховы правапарадку Ленінскага РАУС Гародні Пётр Ленец. З ягоных словаў вынікала, што ён шукае журналістку Ірыну Чарняўку, каб узяць тлумачэньні адносна ўдзелу ў акцыі пратэсту і скласьці пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні. Міліцыя ўжо затрымлівала трох з пяці ўдзельнікаў акцыі. У выніку Павел Мажэйка быў пакараны судом Ленінскага раёну Гародні на сем сутак адміністратыўнага арышту, а Наталя і Анатоль Макушыны атрымалі па 480 тысячаў рублёў штрафу. Нагадаем, што пяцёра гарадзенскіх журналістаў 4 кастрычніка зладзілі пікет на вул. Савецкай г.Гародні, пратэстуючы супраць узмацненьня ціску на незалежную прэсу. Журналісты трымалі ў руках аркушы паперы са словамі "У Гародні судзяць журналістаў!!!". Пасьля папярэджаньняў міліцыянтаў журналісты згарнулі пікет і, трымаючы аркушы ў руках, прайшлі па цэнтральнай вуліцы гораду. Нагодай дзеля правядзеньня акцыі стала прыцягненьне да адміністратыўнай адказнасьці рэдактара газеты "Биржа

информации" Алены Раўбецкай, якой інкрымінавалі распаўсюд абразьлівай для прэзідэнта інфармацыі.

***16 лістапада*** ў пасёлку Сьвіслач адбыўся адміністратыўны суд па справе сябра Партыі БНФ Вадзіма Саранчукова. Судзьдзя вынес рашэньне – штраф памерам 70 базавых адзінак. Напярэдадні, 16 лістапада, у Гародні Вадзім Саранчукоў быў затрыманы разам са Зьміцерам Міхалюком і Максімам Губарэвічам па падазрэньні ў распаўсюдзе ўлётак з тлумачэньнямі, як адбываліся фальсіфікацыі падчас выбараў. Затрыманыя былі дастаўленыя ў Ленінскі РУУС г.Гародні. Пры высьвятленьні асобаў супрацоўнікі міліцыі даведаліся, што Вадзім Саранчукоў падлягае адміністратыўнай адказнасьці, бо быў затрыманы 31 кастрычніка ў мястэчку Сьвіслач падчас традыцыйнага ўшанаваньня памяці братоў Каліноўскіх. Пасьля гэтага Зьміцер Міхалюк і Максім Губарэвіч былі адпушчаныя без складаньня пратаколу, а Вадзім Саранчукоў правёў ноч у міліцыі. 17 лістапада яго павезьлі ў мястэчка Сьвіслач на суд. Нагадаем, што 31 кастрычніка ў мястэчку Сьвіслач былі затрыманыя старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Сяргей Мальчык, сябра Партыі БНФ Вадзім Саранчукоў, старшыня абласной арганізацыі БСДГ Віктар Сазонаў. Затрыманьні адбыліся падчас ушанаваньня нацыянальных герояў Беларусі – Віктара і Кастуся Каліноўскіх (на могілках у Сьвіслачы пахаваны Віктар Каліноўскі, а на плошчы стаіць помнік Кастусю Каліноўскаму). Удзельнікі ўшанаваньня памяці былі затрыманыя па шляху ад магілы да помніку. 4 лістапада суд ў гарадзкім пасёлку Сьвіслач спагнаў з Віктара Сазонава і Сяргея Мальчыка штраф у памеры 70 базавых адзінак. У той дзень Вадзім Саранчукоў на суд не зьявіўся, а цяпер атрымаў пакараньне ў такім жа памеры.

***17 лістапада*** рэдактар ваўкавыскай "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч быў выкліканы ў міліцыю. У Ваўкавыскім РУАС у яго ўзялі тлумачэньні адносна правядзеньня "несанкцыянаванай акцыі" — галадоўкі, якую ён праводзіў з 20 кастрычніка па 9 лістапада ў знак пратэсту супраць рашэньня Міністэрства інфармацыі прыпыніць выданьне. Супрацоўнікаў міліцыі цікавілі падрабязнасьці галадоўкі, а таксама ўлёткі, якія зьявіліся ў Ваўкавыску і паведамлялі пра галадоўку рэдактара.

***17 лістапада*** ў пракуратуру Заводзкага раёну г.Менску быў выкліканы журналіст Аляксандр Коктыш. Памочніка пракурора Заводзкага раёну Сяргея Бандарэнку цікавіў удзел журналіста ў прэс-канферэнцыі, якая адбылася 21 лістапада ў Маскве ў памяшканьні рэдакцыі газеты "Московский комсомолец". Удзел у ёй узялі дэпутат групы "Рэспубліка" Валерый Фралоў, беларускі праваабронца Алег Волчак, старшыня апякунскай рады беларуска-расійскага фонду

"За новую Беларусь" Васіль Лявонаў, грамадзкі дзеяч Уладзімір Колас і намесьнік старшыні АГП Аляксандр Дабравольскі. Падчас прэс-канферэнцыі былі зробленыя выказваньні, якія не супадаюць з афіцыйнай пазіцыяй беларускай дзяржавы наконт праведзеных парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. А.Коктышу былі патлумачаныя палажэньні артыкулаў 188 і 400 Крымінальнага кодэксу, якія датычаць падману і наўмасна ілжывага даносу. Ніякіх абвінавачаньняў да журналіста пракуратура не вылучае.

***18 лістапада*** галоўны рэдактар ваўкавыскай недзяржаўнай "Местной газеты" Андрэй Шантаровіч атрымаў пісьмовае паведамленне ад кіраўніцтва друкарні "Плутас-маркет". Гаворка ў ісьце ішла пра тое, што друкарня разрывае з рэдакцыяй выданьня дамову на друк. Прычынай прынятага рашэньня названая запазычанасьць рэдакцыі перад друкарняй, памерам некалькі большым за 1 млн. рублёў (прыкладна $500). Рэдактар "Местной газеты" вымушаная шукаць іншую друкарню. Разрыў дамовы адбыўся пасьля спробы выдаць чарговы нумар газеты з інфармацый пра вынікі парламенцкіх выбараў і рэферэндуму, які не выйшаў у сувязі з прыпыненнем выданьня на 1 месяц па рашэньні Міністэрства інфармацыі.

***18 лістапада*** стала вядома, што пракуратура не вяртае канфіскаваную маёмасьць сям'і Леванеўскіх. Жонка кіраўніка агульнанацыянальнага старайкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскага, які быў асуджаны да двух гадоў калоніі нібыта за абразу прэзідэнта, звярнулася да Генеральнага пракурора і шэрагу іншых дзяржаўных органаў і службовых асобаў з патрабаваньнем вырашыць лёс канфіскаванай у сям'і Леванеўскіх маёмасьці. У Леванеўскіх канфіскавалі маёмасьць больш чым на 15 тысячаў даляраў ЗША. Акрамя таго, падчас перaтрусу, які праводзіўся гарадзенскай управай КДБ, з кватэры зьнікла 10 тысячаў даляраў ЗША.

***18 лістапада*** стала вядома, што чатыром буйным цэрквам Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў на Берасьцейшчыне пагражае ліквідацыя. Улады прымушаюць іх унесьці зьмены ў Статут, якія б забаранялі праводзіць рэлігійную дзейнасьць па-за межамі месца, дзе зарэгістраваная царква. Пра сваю нязгоду з патрабаваньнямі мясцовых уладаў абвясьцілі кіраўнікі цэркваў Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў Берасьця, Камянца, вёсак Чарнаўчыцы і Астрамечава. Паводле іхняга меркаваньня, калі пагадзіцца на прапанаваныя ўмовы, пратэстанцкім цэрквам будзе забаронена весьці гаспадарчую дзейнасьць па-за межамі свайго памяшканьня, адчыняць летнікі для моладзі, браць удзел у гуманітарных акцыях. Паводле зьвестак саміх пратэстантаў, прадстаўнікі Савету па справах рэлігіяў ужо аддалі загад Берасьцейскаму гарвыканкаму зачыніць малітоўныя памяшканьні, калі цэрквы не пажадаюць уносіць зьмены ў свой Статут.

***18 лістапада*** Хойніцкі суд разгледзеў пратаколы на двух сяброў Аб’яднанай грамадзянскай партыі – Мікалая Ісачэнку і Леаніда Судаленку. Яны прызнаныя вінаватымі ў парушэньні арт. 172 ч.3 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях. Пратаколы былі складзеныя 10 кастрычніка за распаўсюд улётак, у якіх утрымліваўся заклік галасаваць супраць пытаньня, вынесенага А.Лукашэнкам па рэферэндум. На падставе міліцэйскіх пратаколаў кіраўнік справамі Хойніцкагага райвыканкаму Фёдар Гвозьдзеў, як упаўнаважаная раённым Саветам службовая асоба, склаў пратаколы аб адміністратыўных правапарушэньнях. Улёткі, якія ўяўляюць сабою ксеракопіі газеты "Народная воля", брашуры "Паважаныя землякі" і "Пяць крокаў да лепшага жыцьця", названыя сродкамі масавай інфармацыі. Старшыня суда Людміла Дзямбоўская, якая разглядала пратакол у адносінах да Мікалая Ісачэнкі, і судзьдзя Міхаіл Гарашчанка, які разглядаў адміністратыўную справу Леаніда Судаленкі, таксама палічылі ўлёткі за сродкі масавай інфармацыі. А.Ісачэнка быў аштрафаваны на 5 базавых велічыняў (120 тысячаў рублёў), Л. Судаленка -- на 6 базавых велічыняў (144 тысячы рублёў).

***19 лістапада*** намесьніка галоўнага рэдактара "Белорусской деловой газеты" Ірыну Халіп выклікалі ў пракуратуру Партызанскага раёну г.Менску. Сьледчы Сяргей Бародзька задаваў журналістцы пытаньні адносна зьместу яе артыкулу "Рэвалюцыя апалага лісьця", нарукаванага ў расійскім часопісе "Новый очевидец" і прысьвечанага акцыям пратэсту, якія прайшлі ў беларускай сталіцы пасьля абвяшчэньня вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. Паволе словаў І.Халіп, гаворка журналісткі і пракурорскага работніка ішла пра стылістычныя асаблівасьці артыкулу: ці ня лічыць аўтар абразьлівымі для некаторых персанажаў (А.Лукашэнка, У.Рушайла) прыведзеныя ў ім параўнаньні і эпітэты. Са словаў І.Халіп, узяць тлумачэньні з журналісткі і даць прававую ацэнку яе артыкулу сьледчаму пракуратуры даручыла пракуратура г.Менску.

***19 лістапада*** пракуратура г. Баранавічы (Берасьцейская вобласьць) вынесла папярэджаньне былому кандыдату ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Аркадзю Блінкоўскаму, які балатаваўся па Усходняй выбарчай акрузе №5 г. Барананавічы. Папярэджаньне вынесенае за артыкул "Кандыдат каментуе", апублікаваны ў недзяржаўнай газеце "Intex-press" (№43 ад 21.10.2004 г.). У артыкуле было заяўлена пра фальсіфікацыі вынікаў выбараў.

***19 лістапада*** старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка затрыманы на памежным пераходзе “Каменны лог”. Ён накіроўваўся ў Літву на рэйсавым аўтобусе “Менск-Вільнюс-Рыга”. Ніхто са службовых асобаў Ашмянскай мытні не пагадзіўся пракаментаваць гэтае здарэньне.

***19 лістапада*** амбасада ЗША выступіла з заявай наконт закрыцьця прадстаўніцтва "Каўнтэрпарт". Амбасада ЗША выражае шкадаваньне з нагоды рашэньня беларускага Міністэрства замежных справаў адмовіць у рэгістрацыі прадстаўніцтву "Каўнтэрпарт Інтэрнэшнл" (CAP) у Беларусі. Амбасада ня лічыць, што праграмная дзейнасьць "Каўнтэрпарт" парушала якія-небудзь беларускія законы ці правілы. Прадстаўніцтва "Каўнтэрпарт" ішло на супрацоўніцтва ў выпадках шматлікіх падатковых і юрыдычных праверак і да паведамленьня аб адмове ў рэгістрацыі не атрымлівала паведамленьняў аб парушэньнях з ніводнага беларускага органу ўлады. У Беларусі "Каўнтэрпарт" ажыцьцяўляў сваю дзейнасьць у рамках двухбаковага пагадненьня паміж Злучанымі Штатамі Амерыкі і Беларусьсю. У адпаведнасьці з гэтым пагадненьнем, усе дзейныя праграмы ў Беларусі былі ўхваленыя беларускімі ўладамі рэзалюцыяй Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 чэрвеня 2001 г. Гэтыя праграмы падтрымлівалі дзейнасьць у разьвіцьці гуманітарнай сферы і супольнасьцяў. Праграмы і ініцыятывы "Каўнтэрпарт" былі карыснымі для многіх асобных беларускіх грамадзянаў і арганізацыяў з цэлага спектру беларускага грамадзтва. "Альянс Партнёрства Каўнтэрпарт" (CAP) і "Праграма гуманітарнай дапамогі Каўнтэрпарт" (CHAP) працуюць у рамках "Каўнтэрпарт Інтэрнэшнл Інкарпарэйтэд", амерыканскай грамадзкай арганізацыі, якая мае доўгую гісторыю паляпшэньня эканамічных, экалагічных і грамадзкіх умоваў чалавечага разьвіцьця ў больш як 60 краінах, уключаючы дзяржавы былога Савецкага Саюзу. Урад Злучаных Штатаў Амерыкі заўсёды шукаў і шукае магчымасьці канструктыўнага супрацоўніцтва з Беларусюсю у справе падтрымкі дасягненьня мэтаў разьвіцьця гуманітарнай сферы і супольнасьцяў. Праграмы "Каўнтэрпарт" спрыялі дасягненьню гэтых мэтаў і прадстаўлялі станоўчае супрацоўніцтва паміж Злучанымі Штатамі Амерыкі і Беларусьсю. Амбасада Злучаных Штатаў выказала беларускім уладам сваё расчараваньне з нагоды рашэньня спыніць гэтую дзейнасьць і папрасіла перагледзець гэтае рашэньне. Гэтае рашэньне відавочна ставіць у невыгоднае становішча толькі беларускае грамадзтва, якое на працягу доўгага часу атрымлівала карысьць ад праграмаў “Каўнтэрпарт” і падтрымлівала іх.

***23 лістапада*** крымінальная справа грамадзкага і палітычнага дзеяча Міхаіла Марыніча перададзеная ў Менскі раённы суд.

***24 лістапада*** ў Менску затрыманы актывіст руху "Зубр" Мікіта Сасім за раздачу прахожым аранжавых стужачак у падтрымку лідэра "Нашай Украіны" Віктара Юшчанкі.

***25 лістапада*** калегія Менскага гарадзкога суда пад старшынствам судзьдзі Лугіной адхіліла скаргу Вольгі Завадзкай. Маці зьніклага ў ліпені 2000 году аператара ОРТ абскарджвала адмову суда Цэнтральнага раёну разгледзець яе скаргу на дзеяньні Рэспубліканскай пракуратуры. 20 ліпеня падчас прэс-канферэнцыі А.Лукашэнка заявіў, што мае "некаторыя дакументы", якія могуць ператварыць справу Завадзкага ў "антысправу". На падставе гэтай інфармацыі маці журналіста Вольга Завадзкая 4 жніўня падала ў Рэспубліканскую пракуратуру заяву аб узбуджэньні крымінальнай справы ў сувязі з "наноў адкрытымі" абставінамі па справе аб зьнікненьні яе сына. Пракуратура ніяк не адрэагавала на зварот, і 17 верасьня В. Завадзкая падала ў суд Цэнтральнага раёну Менску скаргу на незаконныя дзеяньні пракурорскіх работнікаў. Паколькі Цэнтральны суд у лістападзе адмовіўся разглядаць зварот у сувязі з "непадведамаснасьцю" справы, В. Завадзкая падала скаргу ў суд вышэйшай інстанцыі.

***25 лістапада*** Ляхавіцкі райвыканкам адмовіў у акрэдытацыі журналістам газеты "Ляхавіцкі час" (заснавальнік – выдавецкі дом "Інтэкс-прэс") Алене Верабей і Вользе Асос. У лісьце, які журналісты атрымалі ад старшыні Ляхавіцкага райвыканкаму А. Сакуна, гаворыцца, што райвыканкам лічыць іх акрэдытацыю "немэтазгоднай". "Дзейнасьць раённага выканаўчага камітэту, яго аддзелаў і службаў, пытаньні эканамічнага, культурнага, спартыўнага жыцьця раёну ў поўнай меры асьвятляюцца газетамі "Зара", "Ляхавіцкі весьнік" і раённым радыё", - сьцьвярджаецца ў лісьце старшыні райвыканкаму. Гэта ўжо другая па ліку адмова ў акрэдытацыі журналістам "Ляхавіцкага часу" за паўтара гады існавання газеты (яна выдаецца з траўня 2003 г.). У мінулы раз райвыканкам матываваў сваё рашэньне тым, што карэспандэнты выданьня могуць атрымаць любую інфармацыю ў райвыканкаме і без акрэдытацыі. Журналісты, аднак, сьцьвярджаюць, што гэта не заўсёды адпавядае рэчаіснасьці.

***26 лістапада*** 50 базавых велічыняў (1 млн. 200 тыс. рублёў) пастанавіў спагнаць з Андрэя Шантаровіча Ваўкавыскі раённы суд, разгледзеўшы яго адміністратыўную справу. Судзьдзя Юры Якімовіч палічыў галадоўку заснавальніка і галоўнага рэдактара "Местной газеты" несанкцыянаваным пікетам. Начальнік аддзелу Ваўкавыскага РАУС Аляксандр Глебаў, які 17 лістапада склаў пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні А. Шантаровіча (арт. 167 ч.1 КаАП РБ), у судзе аргументаваў сваю пазіцыю тым, што па ўсім горадзе (у тым ліку і ў вакне рэдакцыі "Местной газеты") былі вывешаныя плакаты з інфармацыяй пра галадоўку. На яго думку, гэта надало акцыі публічнасьці і ператварыла яе ў несанкцыянаваны пікет. Адвакат журналіста А. Бірылаў сказаў, што міліцыя не прадставіла ў суд ніякіх

доказаў віны А. Шантаровіча, і папрасіў спыніць судовы працэс. Сам галоўны рэдактар "Местной газеты" ў судзе заявіў, што, як грамадзянін Беларусі, ён мае права абвяшчаць галадоўку, калі захоча, і інфармаваць пра гэта грамадзкасьць. Нагадаем, што 20 кастрычніка Андрэй Шантаровіч у знак пратэсту супраць рашэньня Міністэрства інфармацыі прыпыніць на месяц выданьне ягонай газеты абвесьціў бестэрміновую галадоўку пратэсту, якую 21 дзень трымаў у памяшканьні карпункту "Местной газеты" ў Ваўкавыску.

***29 лістапада*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне і прыпыніла на 3 месяцы недзяржаўную гарадзенскую газету "Биржа информации". Санкцыі ўжытыя да выданьня за публікацыю, прысьвечаную рэферэндуму, за якую галоўны рэдактар выданьня Алена Раўбецкая ў верасьні была аштрафаваная. Міністэрства палічыла, што ў артыкуле "Предательство именем народа" (№ 36 ад 9 верасьня 2004 г.) парушаныя артыкулы 5, 32 і 40 Закону аб друку. У загадзе аб прыпыненьні і ў папярэджаньні сьцьвярджаецца, што ў публікацыі "ўтрымліваюцца несапраўдныя зьвесткі, якія не адлюстроўваюць законнай падставы прызначанага… рэферэндуму, якія зьневажаюць гонар і годнасьць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". За гэтую ж публікацыю А. Раўбецкая ўжо прыцягвалася да адміністратыўнай адказнасьці па ч. 10 арт. 172-1 КаАП. Заведама ілжывымі зьвесткамі, якія зневажаюць гонар і годнасьць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, суд прызнаў фразу: "Референдум (а без него третьего срока не получить), объявленный господином президентом -- это вызов обществу. Нужно обладать не только отсутствием совести, но и "господским" пренебрежением к плебсу, абсолютной уверенностью, что "плебс" ничего не понимает". А. Раўбецкая і яе прадстаўнікі на судовым працэсе сьцьвярджалі, што гэтая фраза ня ўтрымлівае якіх-небудзь зьвестак, апрача інфармацыі пра абвяшчэньне рэферэндуму, і ўяўляе сабой выказваньне асабістай думкі А. Раўбецкай. 30 верасьня А. Раўбецкая была аштрафаваная на 70 базавых велічыняў (больш за 500 еўра) і да канца лістапада ўжо выплаціла частку гэтых грошай. Галоўны рэдактар упэўненая, што газету наўмысна прыпынілі напярэдадні падпісной кампаніі, каб яна страціла аўдыторыю. "Я ня ведаю, як напрацягу трох месяцаў утрымаць памяшканьне, супрацоўнікаў, чытачоў", -- зазначае А. Раўбецкая. Яна абураная тым, што загад аб прыпыненьні падпісаны адначасова з папярэджаньнем, хаця газета мае законнае права абскардзіць апошняе напрацягу месяца. Кіраўнік Цэнтру юрыдычнай падтрымкі СМІ пры ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Міхаіл Пастухоў бачыць у гэтым працяг кампаніі барацьбы з недзяржаўнай прэсай, якая была распачатая напярэдадні выбараў і рэферэндуму. "Улады працягваюць распраўляцца з выданьнямі, якія мелі сьмеласьць зьмясьціць

крытычныя меркаваньні адносна вынесенага на рэферэндум пытаньня", -- лічыць М. Пастухоў.

***26 лістапада*** Пракуратура Ленінскага раёну Менску адмовілася ўзбуджаць крымінальныя справы па фактах зьбіцьця 19 кастрычніка лідэра Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі і журналістаў расійскіх тэлеканалаў НТВ і Ren-TV. Супрацоўнікі пракуратуры не знайшлі складу злачынства ў дзеяньнях міліцыянтаў, якія разганялі акцыю пратэсту апазіцыі супраць фальшаваньня вынікаў выбараў і рэферэндуму. Прадстаўнікі АГП гавораць, што гэта не азначае, што крымінальная справа супраць амапаўцаў ня будзе заведзеная пасьля таго, як у Беларусі зьменіцца ўлада.

***28 лістапада*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне незалежнай газеце "Кур’ер з Барысава". Барысаўскае выданьне, паводле Міністэрства інфармацыі, парушыла закон аб друку. Як паведаміла рэдактар “Кур’еру з Барысава” Людміла Атчанашанка, газеце прад’яўленае падвойнае абвінавачаньне. “Па-першае, яны палічылі, што калі мы рэкламна-інфармацыйная газета, то не павінны друкаваць інфармацыі масава-палітычнага зьместу. Хаця нідзе не вызначана, што гэта за такая інфармацыя. Па-другое, заснавальнік нібыта мусіць значыцца ў выходных дадзеных, як і рэдактар газеты”, — гаворыць рэдактарка.

***29 лістапада*** суд Цэнтральнага раёну Менску вынес рашэньне пра арышт Ягора Баброва на 3 сутак. Міліцыянты згадалі, што ён 28 кастрычніка на Кастрычніцкай плошчы быў разам з іншымі ўдзельнікамі акцыі пратэсту супраць вынікаў галасаваньня і трымаў бел-чырвона-белы сьцяг. Міліцыянты прыехалі па Ягора раніцай 29 лістапада. Яму патлумачылі, што павязуць у суд, каб разгледзець адміністратыўны пратакол за парушэньне падчас правядзеньня масавага вулічнага мерапрыемства. Ягора Барова затрымалі разам з лідэрам Беларускай партыі Свабоды Сяргеем Высоцкім, Вячаславам Сіўчыкам, Настай Азаркай, Алесем Васілеўскім, Уладзімірам Беглікам і двума непаўнагадовымі хлопцамі. У той раз непаўнагадовых і Ягора Баброва адпусьцілі.

***30 лістапада*** аператары кабельнага тэлебачаньня ў Берасьці спынілі рэтрансьляцыю трох польскіх каналаў (TVP-1, TVP-2, POLSAT). Падставай дзеля гэтага стаў ліст з Міністэрства інфармацыі Беларусі за подпісам намесьніка міністра Сяргея Булацкага. Аператараў кабельнага тэлебачаньня папярэдзілі, што яны парушаюць “Палажэньне аб прыёмных сістэмах тэлебачаньня і радыёвяшчаньня”, зацьверджанае Пастановай Савету Міністраў РБ ад 30.06.2003 №885. Парушэньне заключаецца ў тым, што аператарамі ажыцьцяўляецца "несанкцыянаваная

рэтрансляцыя польскіх тэлеканалаў... пры адсутнасьці ўзгадненьня з Міністэрствам інфармацыі РБ". У лісьце таксама паведамляецца, што ў выпадку паўторнага парушэньня Мінінфарм накіруе ў Міністэрства сувязі папярэджаньне аб прыпыненьні дзейнасьці ліцэнзіі гэтых аператараў кабельнага тэлебачаньня.

***30 лістапада*** Гары Паганяйлу выклікалі ў пракуратуру Менску, дзе яму паведамілі, што супраць яго Рэспубліканскай пракуратурай яшчэ тыдзень таму ўзбуджаная крымінальная справа паводле 367 артыкулу Крымінальнага кодэксу. Праваабаронцу абвінавачваюць у паклёпе на прэзідэнта Беларусі. Падставай стала інтэрв’ю Гары Паганяйлы, якое ў ліпені ён даў швецкаму тэлеканалу “ТВ-4”. У прыватнасьці, у гэтым інтэрв’ю Гары Паганяйла паўтарыў падазрэньні, якія і раней выказваў у бок вышэйшых кіраўнікоў дзяржавы, уключаючы Аляксандра Лукашэнку. Праваабаронца лічыць, што А. Лукашэнка нібыта таксама можа быць датычным да зьнікненьняў і магчымых забойстваў беларускіх апазіцыянераў. Каментуючы абвінавачаньні, якія супраць яго вылучыла пракуратура, Гары Паганяйла адзначае своеасаблівасьць дзеяньняў беларускіх уладаў у гэтай справе: “Яны мусілі б зрабіць усё, каб даказаць сваю невінаватасьць. А яны, наадварот, хаваюць гэтую справу, не вядуць расьсьледваньня”. Гары Паганяйла заявіў, што гатовы прадставіць суду шэраг дакументаў, якія дакажуць справядлівасьць падазрэньняў адносна кіраўнікоў Беларусі ў датычнасьці да зьнікненьняў лідэраў апазіцыі.

***30 лістапада*** пінская рэгіянальная друкарня ў чарговы раз адмовілася супрацоўнічаць з недзяржаўнай газетай "Мясцовы час". Больш за год пінскае выданьне вымушана друкавацца ў Баранавічах, што вымагае ад рэдакцыі дадатковых выдаткаў і адбіваецца на аператыўнасьці. Паводле галоўнага рэдактара выданьня Віктара Ярашука, дырэктар КУП "Пінская рэгіянальная друкарня" А. Пракопаў спасылаецца на перагружанасьць друкарні. Між тым, друкарня валодае новым паліграфічным абсталяваньнем, якое дазваляе друкаваць у дзень да дзесятка розных газетаў. Штотыдзень друкарня выпускае наклады васьмі рэгіянальных выданьняў. Акрамя гэтага, "Мясцовы час" адмаўляюцца прадаваць у Пінскіх кіёсках "Белсаюздруку". Начальнік мясцовага аддзяленьня "Белсаюздруку" Ніна Навумчык заяўляе, што кіёскі настолькі перагружаныя перыёдыкай, што для "Мясцовага часу" ня знойдзецца месца. Віктар Ярашук лічыць, што ўлады гэткім чынам "разьлічваюцца" з газетай за вострыя публікацыі.

## СЬНЕЖАНЬ

***1 сьнежня*** Міжнародная журналісцкая арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў" накіравала міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу ліст пратэсту з нагоды трохмесячнага прыпыненьня недзяржаўнай газеты "Биржа информации". "Рэпарцёры" выказалі заклапочанасьць з нагоды ўціску недзяржаўнай прэсы ў Беларусі ў цэлым і названага выданьня -- у прыватнасьці, і запатрабавала адмяніць загад аб яго прыпыненьні. Арганізацыя зьвяртае ўвагу на тое, што за артыкул, які стаў нагодай для прыпыненьня газеты, галоўны рэдактар выданьня Алена Раўбецкая раней ужо была аштрафаваная на суму каля 500 еўра. "Рэпарцёры бяз межаў" разглядаюць прыпыненьне "Биржи информации" у шэрагу іншых падобных выпадкаў і нагадваюць, што некалькі незалежных газетаў былі прыпыненыя па фармальных бюракратычных прычынах напярэдадні кастрычніцкага рэферэндуму і парламенцкіх выбараў, якія ператварыліся ў шырокамаштабную кампанію перасьледу мас-медыя.

***1 сьнежня*** судзьдзя Ленінскага суда г.Гародні Вікторыя Кулакоўская пакарала 15 суткамі адміністратыўнага арышту лідэра дэмакратычнага руху “Гарадзенскі выбар” Дзьмітрыя Іваноўскага. Яго прызналі вінаватым у распаўсюдзе ўлётак, зьмест якіх накіраваны на тое, каб прынесьці шкоду канстытуцыйнаму ладу і грамадзкаму парадку. Дз. Іваноўскі распаўсюджваў улёткі, дзе заклікаў прадпрымальнікаў прыйсьці 29 лістапада на плошчу Леніна, каб зьбіраць подпісы за недавер мясцовай адміністрацыі. Замест збору подпісаў у парку Жылібера адбыўся несанкцыянаваны мітынг гарадзенскіх прадпрымальнікаў. Удзел у ім прынялі каля 70 чалавек. Прадпрымальнікі патрабавалі адмены рашэньня Гарадзенскага аблвыканкаму, згодна з якім іх прымусілі ўсталяваць касавыя апараты і забаранілі гандаль кандытарскімі вырабамі. У той час, як адбываўся мітынг, Дзьмітрый Іваноўскі знаходзіўся ў судзе Ленінскага раёну, куды яго даставілі міліцыянты, каб ня даць яму магчымасьці прыняць удзелу ў акцыі пратэсту.

***1 сьнежня*** суд Полацку разгледзеў зыск Свабоднага прафсаюзу Беларускага да Наваполацкага гарадзкога выканкаму. Прафсаюзу адмоўлена ў задавальненьні скаргі. СПБ спрабаваў абскардзіць рашэньне ўладаў, што адмовіліся рэгістраваць тры прафсаюзныя структуры – Наваполацка-Полацкую рэгіянальную арганізацыю, а таксама пярвічкі на ААТ “Нафтан” і Наваполацкай цеплаэлектрацэнтралі. Да траўня 2003 году “пярвічкі” СПБ мелі легальны статус. Але пасьля зьезду СПБ, дзе былі прынятыя зьмены ў Статут арганізацыі, у рэгіянальных і пярвічных падразьдзяленьняў прафсаюзу пачаліся праблемы ў перарэгістрацыі. Першы раз

навапалачане безвынікова спрабавалі зарэгістравацца ў жніўні 2003 году. Тады Наваполацкі гарвыканкам знайшоў хібы ў прадстаўленай дакументацыі. Пасьля другога і трэцяга разоў Статут прафсаюзу ня быў прыняты да рэгістрацыі. СПБ доўгі час спрабаваў аспрэчыць рашэньне выканкаму, але з красавіка 2004 году судовыя ўлады не маглі вызначыцца, якая з судовых інстанцыяў мусіць разглядаць справу. У выніку доўгіх пeратурбацыяў судзьдзя Полацкага гарадзкога суда Зоя Плакса вынесла рашэньне, паводле якога прафсаюзу адмоўлена ў задавальненьні скаргі. Падставай для такога вердыкту сталі заявы (пазьней адкліканыя складальнікамі) двух работнікаў Наваполацкай ЦЭЦ, нібыта яны ніколі не былі сябрамі СПБ, а іх тайна ўключылі ў прафаб’яднаньне і нават абралі ў кіруючыя органы. Суд параіў прадстаўнікам прафсаюзу “яшчэ раз падаць усе неабходныя дакументы для рэгістрацыі”.

***2 сьнежня*** на працягу больш як 12 гадзінаў запар была паралізаваная праца інтэрнэт-сайту Аб’яднанай грамадзянскай партыі. "Невядомыя ... скарысталі недапрацоўкі ў сістэме абароны сайту", — паведаміла прэс-служба АГП. Прадстаўнікі партыі разглядаюць гэты інцыдэнт у адным шэрагу з нядаўняй спробай узламаць дзьверы ў офіс АГП. АГП падкрэсьлівае, што сайт зьяўляецца папулярнай крыніцай інфармацыі сярод карыстальнікаў Інтэрнэту: штодня на яго "заходзіць" 800-1000 чалавек. "Мы разумеем, каму выгадна, каб альтэрнатыўны пункт гледжаньня на палітычныя і эканамічныя працэсы, што адбываюцца ў Беларусі, замоўчваўся. Раней ужо былі спробы зьнішчыць наш сайт, але мы працягваем працаваць, і так будзе надалей", -- гаворыцца ў паведамленьні прэс-службы.

***2 сьнежня*** старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька быў выкліканы ў пракуратуру Цэнтральнага раёну г.Менску. Анатоля Лябедзьку выклікалі для дачы тлумачэньняў з нагоды публікацыі ў польскім выданьні Gazeta Wyborcza. Пракуратуру зацікавіў артыкул, дзе ёсьць спасылка на Анатоля Лябедзьку. У артыкуле распавядаецца пра нараду ў Адміністрацыі прэзідэнта, якая адбылася напярэдадні выбараў. Старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька адмовіўся даваць паказаньні работнікам пракуратуры, бо лічыць яе "інструментам палітычнага перасьледу апанентаў улады". Пра гэта лідэр АГП заявіў намесьніку пракурора Цэнтральнага раёну г. Менску А. Рамашэўскаму, які хацеў узяць у А. Лябедзькі тлумачэньні па факце публікацыі ў польскай газеце. Палітык заявіў, што лічыць амаральным узаемадзейнічаць з пракуратурай пасьля таго, як яна адмовілася ўзбуджаць крымінальную справу па факце яго збіцьця міліцыянтамі падчас вулічнай акцыі 19 кастрычніка.

***2 сьнежня*** пракуратура Савецкага раёну Менску вынесла папярэджаньне Першаму сакратару ЦК Партыі камуністаў Беларускай Сяргею Калякіну. Пракурор Мікалай Платніцкі ўручыў лідэру апазіцыйных камуністаў папярэджаньне “пра недапушчальнасьць распаўсюду паклёпніцкіх домыслаў”. Сяргей Калякін мяркуе, што папярэджаньне стала вынікам публікацыяў у польскім друку за чатыры дні да рэферэндуму і парламенцкіх выбараў некаторых зьвестак пра іх вынікі. “Я не правідца і ня мог за чатыры дні да галасаваньня прадказаць вынікі рэферэндуму і выбараў па большасьці выбарчых участкаў 106 Коласаўскай выбарчай акругі. Але факт застаецца фактам: прыведзеныя мною лічбы практычна супалі з афіцыйнымі выніковымі зьвесткамі. Таму я перакананы: вынікі рэферэндуму і выбараў былі прадвызначаныя”, – заявіў Сяргей Калякін.

***2 сьнежня*** стала вядома, што Ірына Макавецкая, уласны карэспандэнт "Народнай волі" па Гомельскай вобласьці, можа быць прыцягнутая да адміністратыўнай адказнасьці за тое, што хацела прысутнічаць на адкрытым судовым паседжаньні. Ёй можа быць выстаўлена абвінавачаньне ў непавазе да суда. Слуханьні адміністратыўнай справы, пра якую зьбіралася рыхтаваць матэрыял журналістка, распачаліся ў судзе Чыгуначнага раёну Гомелю. У самым пачатку паседжаньня старшыня суда Тацяна Адрыбец заявіла, што не дазваляе І. Макавецкай прысутнічаць у зале суда. Журналістка адмовілася выйсьці, зазначыўшы, што будзе падпарадкоўвацца толькі законным патрабаваньням. Тады судзьдзя выклікала нарад міліцыі, які даставіў І. Макавецкую ў Чыгуначны РАУС.

***3 сьнежня*** Мінюст вынес другое папярэджаньне Радзе Грамадзкага аб’яднаньня “Саюз беларускіх пісьменьнікаў”. Нагода для вынясеньня папярэджаньня –фармальная. “У Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь паступіла інфармацыя з Інсьпекцыі па падатках і зборах па Ленінскім раёне г. Берасьця аб тым, што Берасьцейскае абласное аддзяленьне Грамадзкага аб’яднаньня “Саюз беларускіх пісьменьнікаў” доўгі час, з чэрвеня па цяперашні час не прадастаўляе ў падатковую Інсьпекцыю штомесячную справаздачнасьць, чым груба парушае пункт 1б артыкулу 8 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасьці”. Пры такіх абставінах і кіруючыся арт.28 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” Радзе Грамадзкага аб’яднаньня “Саюз беларускіх пісьменьнікаў” выносіцца пісьмовае папярэджаньне”. Першае папярэджаньне Саюзу пісьменьнікаў было вынесенае ў чэрвені 2004 году. У дзеяньнях Мінюсту праглядаецца палітычная замова, мэта якой -- расправа з незалежнай творчай арганізацыяй, жаданьне дзяржавы стварыць паслухмяную пісьменьніцкую арганізацыю на базе Менскай гарадзкой арганізацыі, якая дзейнічае

пры холдынгу – “Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве “Літаратура і мастацтва”. Атрыманае папярэджаньне супала па часе з фактычнаю забаронаю пісьменьнікам выкарыстоўваць вялікую залу Дому літаратара для сваіх імпрэзаў і пагрозаю высяленьня з гэтага будынку сакратарыяту Саюзу пісьменьнікаў.

***6 сьнежня*** Полацкі гарадзкі суд вынес пакараньне назіральніку ад Беларускага Хельсінкскага камітэту Уладзіміру Амосаву — штраф у памеры 2 базавых велічыняў (48 тысячаў рублёў). Суд інкрымінаваў спадару Амосаву паклёп на службовую асобу. Уладзімер Амосаў зьяўляўся назіральнікам на 89-й Фарынаўскай акрузе (Полацкі раён). 13 кастрычніка, падчас папярэдняга галасаваньня, ён патэлефанаваў у раённы аддзел міліцыі і паведаміў, што старшыня камісіі, зачыніўшыся ў асобным пакоі, ужывае разам з сябрамі сьпіртныя напоі. Праз тры гадзіны міліцыя прыехала на ўчастак, і старшыню камісіі, з ягонай згоды, адвезьлі на медыцынскую эксьпертызу, якая, паводле афіцыйнай версіі, алкаголю ў крыві не знайшла. З гэтай нагоды назіральнік ад БХК быў абвінавачаны ў паклёпе, і супраць яго была распачатая судовая справа. Паводле сьведчаньня спадара Амосава, справа гэтая інсьпіраваная ўладамі, пры гэтым сьведкі, якія знаходзіліся 13 кастрычніка на ўчастку і мусілі выступіць у судзе ў ягоную падтрымку, пад псіхалагічным ціскам на судовае паседжаньне не зьявіліся.

***6 сьнежня*** амбасада ЗША выступіла з заявай наконт рэпрэсіўных мераў супраць грамадзянскай супольнасьці. Злучаныя Штаты Амерыкі адзначылі, што яны з узрастаючай занепакоенасьцю назіраюць за ўзмацненьнем нападаў на незалежную грамадзянскую супольнасьць у Беларусі. У апошнія два гады ЗША неаднаразова выказваліся супраць сістэматычных дзеяньняў ураду Лукашэнкі па ўдушэньні незалежных галасоў у краіне. Сітуацыя пасьля кастрычніцкіх выбараў, якія самі былі відавочна недэмакратычнымі, паказала, што гэты ўціск расьце. Пакуль беларускі ўрад імкнецца ўпісаць свае рэпрэсіўныя дзеяньні ў прававое поле, добра бачна, што гэтыя дзеяньні накіраваныя супраць нямногіх незалежных галасоў, што яшчэ засталіся ў Беларусі.

***7 сьнежня*** ноччу ў Ваўкавыску (Гарадзенская вобласьць) арыштаваны на 5 сутак старшыня рэгіянальнай праваабарончай арганізацыі "Аслона" Мікола Аксаміт. Праваабаронца і мастак Мікола Аксаміт быў затрыманы каля пад’езду свайго дому з намаляванай уласнаручна карцінай. Супрацоўнікі міліцыі абвінавацілі яго ў крадзяжы карціны. Пасьля складаньня пратаколу М. Аксаміт быў асуджаны на 5 сутак.

***7 сьнежня*** журналістку Ірыну Халіп выклікалі ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь за публікацыю пра сьмяротныя пакараньні. Пракуратуру зацікавіла публікацыя ў расійскай “Новой газете” пад назваю “П’яныя каты”. У гэтым артыкуле нагадвалася, што Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, дзе яшчэ існуе сьмяротнае пакараньне. У сваім артыкуле Ірына Халіп апісала падрабязнасьці расстрэлаў у Беларусі. Між іншым журналістка напісала пра падрабязнасьці візіту ў 1999 годзе камандзіра брыгады сьпецназу Міністэрства ўнутраных справаў Дзьмітрыя Паўлічэнкі ў сьледчы ізалятар Менску, калі там выконваліся сьмяротныя пакараньні. Пракуроры Станіслаў Новікаў і Сьвятаслаў Голік спрабавалі высьветліць, адкуль Ірына Халіп брала факталагічны матэрыял для свайго расьсьледваньня, а таксама ўзялі з яе афіцыйныя тлумачэньні па гэтай справе. Гэта ўжо ня першы выпадак выкліку Ірыны Халіп, іншых журналістаў, а таксама апазіцыйных палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў у пракуратуру — асабліва пасьля выбараў і рэферэндуму. Спадарыня Халіп лічыць, што вышэйшыя беларускія чыноўнікі, хутчэй за ўсё, загадалі сваім падначаленым нейкім чынам разабрацца з тымі, хто дапускаў рэзкія выказваньні ў адрас улады, і тыя загад выконваюць.

***7 сьнежня*** стала вядома, што кіраўнікі Мінінфармацыі не жадаюць сустракацца з прадстаўнікамі недзяржаўных СМІ. "У бліжэйшы час сустрэчы кіраўніцтва Міністэрства інфармацыі з сябрамі Праўленьня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" і рэдактарамі недзяржаўных выданьняў... не плануюцца". Гэткім чынам міністэрства адказала на афіцыйную прапанову БАЖ спаткацца і абмеркаваць сітуацыю ў сферы сродкаў масавай інфармацыі. У звароце, які БАЖ даслаў на імя міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча 1 лістапада, арганізацыя прасіла таксама адмяніць загад аб прыпыненьні дзейнасьці ваўкавыскай "Местной газеты". Міністэрства ў адказ заявіла, што "ня бачыць" юрыдычных падставаў для адмены свайго рашэньня.

***8 сьнежня*** Еўрасаюз забараніў уезд на сваю тэрыторыю старшыні Цэнтрвыбаркаму Рэспублікі Беларусь Лідзіі Ярмошынай і начальніку менскага АМАПу Юрыю Падабеду. Гэтае рашэньне прынятае ў межах санкцыяў у адносінах да беларускіх уладаў пасьля правядзеньня 17 кастрычніка рэферэндуму адносна працягу тэрміну прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі.

***8 сьнежня*** Пракуратура Беларусі вынесла папярэджаньне журналісту Радыё Свабода Альгерду Невяроўскаму. Падставай для гэтага стаў артыкул на сайце радыё, у якім пададзеныя фотаздымкі з выбарчага ўчастку падчас папярэдняга галасаваньня на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і рэферэндуму, зробленыя 16 лістапада. У артыкуле гаворка ішла пра тое, што выбаршчыкам выдавалі бюлетэні

з ужо пазначаным адказам "так" на пытаньне рэферэндуму. У пракуратуры журналісту паведамілі, што распаўсюджаныя ім зьвесткі не адпавядаюць рэчаіснасьці: нібыта гэта былі бюлетэні з адзнакаю пра адмену рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты В.Палевіковай. А.Невяроўскага азнаёмілі з артыкулам 40 Закону “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі" і папярэдзілі пра неабходнасьць праверкі распаўсюджваемых зьвестак. Журналісту патлумачана, што пры паўтарэньні падобнага выпадку можа быць пастаўленае пытаньне пра пазбаўленьне яго акрэдытацыі.

***8 сьнежня*** лідэр "Маладога Фронту" Павел Севярынец дапытаны ва ўпраўленьні сьледчага камітэту МУС па горадзе Менску ў якасьці сьведкі па справе аб масавых беспарадках у сталіцы 18-19 кастрычніка. Справа была ўзбуджаная па арт. 342 Крымінальнага кодэксу -- "арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх".

***10 сьнежня***, у дзень чарговай гадавіны прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, увечары сотні менчукоў выйшлі на Кастрычніцкую плошчу сталіцы, каб выказаць свой пратэст супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. Пасьля пікетаваньня яны прайшлі да будынку КДБ і прымацавалі на калоны і дзьверы будынку партрэты зьніклых.

***10 сьнежня***, у Дзень правоў чалавека, беларускія праваабаронцы накіравалі зварот Генеральнаму пракурору, у якім выказалі занепакоенасьць станам правоў чалавека ў краіне і меркаваньне, што ў дадзенай сітуацыі пракуратура павінная адыгрываць асаблівую ролю ў абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзянаў. Зварот прыняў дзяжурны пракурор Барыс Жыльдзецкі. Да звароту быў прыкладзены даклад Хрыстаса Пургурыдэса “Зьніклыя асобы ў Беларусі”.

***10 сьнежня*** суд Фрунзенскага раёну спагнаў з актывіста руху “Зубр” Андрэя Баранава штраф у памеры 150 базавых велічыняў. Актывістаў руху "Зубр" Андрэя Баранава і Максіма Вянярскага затрымалі 7 сьнежня за распаўсюд газеты з заклікам прыходзіць 10 сьнежня на Кастрычніцкую плошчу на акцыю, прысьвечаную ўгодкам абвяшчэньня Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Ноч пасьля затрыманьня маладыя людзі правялі ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на вул. Акрэсьціна ў Менску.

***12 сьнежня*** стала вядома, што мясцовыя ўлады ў Дзяржынску адмовілі ў перарэгістрацыі Саюзу цэркваў хрысьціянаў Поўнага Евангельля “Слова праўды”. Афіцыйная прычына адмовы – быццам бы дакументы на перарэгістрацыю пададзеныя пазьней тэрміну. На думку пастара Мікалая Козела, сапраўдная

прычына адмовы зьвязаная з яго палітычнай дзейнасьцю — ён вылучаўся кандыдатам ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

***13 сьнежня*** ўначы на кватэры, якую наймае намесьнік дырэктара НІСЭПД Аляксандр Сасноў, быў праведзеныператрус. 13 сьнежня былі апублікаваныя вынікі лістападаўскага агульнанацыянальнага сацыялагічнага апытаньня, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў (НІСЭПД). Паводле зьвестак сацыёлагаў, за зьмену Канстытуцыі на кастрычніцкім рэферэндуме галасавала меншасьць апытаных – 49%. У той жа дзень на менскай кватэры, якую наймае намесьнік дырэктара гэтага інстытуту Аляксандр Сасноў, супрацоўнікі КДБ правяліператрус. Тры супрацоўнікі КДБ на чале з маёрам на працягу паўгадзіны вельмі бегла агледзелі пакоі, сталы, тумбы, паперы. Бачна было, што яны не цікавіліся справамі інстытуту, а шукалі нейкія “прылады злачынства” (так было запісана ў пратаколе) паводле крымінальнай справы бізнэсоўца, жонка якога тры гады таму тут нібыта наймала офіс. Па крымінальнай справе гэтага нікому невядомага бізнэсоўца, уласна, і быў прызначаны ператрус. У іх нават не было адпаведнай санкцыі пракурора, толькі рэзалюцыя намесьніка старшыні КДБ. Чамусьці яны вельмі сьпяшаліся, нават ня мелі з сабою чыстых бланкаў пратаколаў ператрусу, так што адзін з іх пісаў на чыстым аркушы ад рукі. Відавочна, што нешта зьвязанае з гэтым бізнэсоўцам, якога абвінавацілі ў наўмысным банкруцтве фірмы, знайсьці тут, у кватэры, якую ўжо тры гады наймае супрацоўнік НІСЭПД, не маглі, ды не асабліва і хацелі. Так што працэдура скончылася фармальна безвынікова, нічога не знайшлі. На думку Алега Манаева, дырэктара інстытуту, сувязь ператрусу з вынікамі апошняга сацапытаньня, згодна з якім большасьць рэспандэнтаў не пацьвердзіла, што яны галасавалі за зьмену ў Канстытуцыі – навідавоку, бо матэрыялы апошняга сацапытаньня былі шырока распаўсюджаныя сярод СМІ, амбасадаў, арганізацыяў. Алег Манаеў дапускае, што ўлады вырашылі правесьці застрашальную акцыю.

***13 сьнежня*** ў Жодзіне супрацоўнікі міліцыі апячаталі офіс “Маладога Фронту”. Сябры “Маладога Фронту” арандавалі прыватную кватэру пад офіс сваёй арганізацыі. 13 сьнежня на кватэру прыйшлі намесьнік кіраўніка аддзелу па справах непаўнагадовых Гарошка і выканаўца абавязкаў начальніка жодзінскай міліцыі Ільыч. Паводле іх словаў, у міліцыю паступіла заява аб тым, што кватэра выкарыстоўваецца пад офіс. Маладафронтаўцаў папярэдзілі, што за спробу зноў заняць офіс іх прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці.

***14 сьнежня*** стала вядома, што будынак менскай пратэстанцкай Царквы “Новае жыцьцё” (Саюз цэркваў хрысьціянаў Поўнага Евангельля) апынуўся пад пагрозай

зруйнаваньня. Адміністрацыя Маскоўскага раёну г.Менску запатрабавала, каб да 1 студзеня было ліквідаванае “самавольнае будаўніцтва, якое вядзе рэлігійная абшчына” на сваім зямельным участку па адрасе Кавалёва,72 у Менску (раён былой вёскі Сухарава). Інакш ліквідацыя забудовы будзе зьдзейсьненая “сіламі камунальных службаў”. Аб гэтым рашэньні адміністрацыя Маскоўскага раёну паведаміла ў лісьце. “Мы не вядзем ніякіх будаўнічых работ,” – кажа адміністратар царквы Васіль Юрэвіч. Паводле сп. Юрэвіча, ужо некалькі гадоў царква намагаецца атрымаць ад уладаў дазвол на рэканструкцыю і перабудову кароўніка ў адпаведнасьці са сваімі патрэбамі. “Мы лічым, што ў Менгарвыканкаме распрацаваны план з мэтай забраць у царквы зямлю і будынак. Нам адмаўляюць ў перарэгістрацыі, пастара пастаянна выклікаюць у міліцыю. Пагроза зьнішчыць пабудову – чарговы крок ціску з боку ўлады”, – кажа Васіль Юрэвіч.

***14 сьнежня*** ў Барысаве супрацоўнікі КДБ папярэдзілі Зьміцера Бародку пра магчымасьць пакараньня за апазіцыйную дзейнасьць. Зьміцер Бародка вымушаны быў наведаць барысаўскі аддзел КДБ паводле пісьмовай позвы: “Оперупаўнаважаны капітан КДБ Дзяніс Якубоўскі растлумачыў мне, што ўсе мае дзеяньні, пачынаючы з 2002 году, могуць патрапляць пад дзейнасьць крымінальнага артыкулу 342 – нешта накшталт арганізацыі і актыўнага ўдзелу ў масавых беспарадках. Згадаў усе затрыманьні мяне супрацоўнікамі міліцыі аж да апошняга – 20 кастрычніка пасьля так званага рэферэндуму”, — сказаў З. Бародка.

***16 сьнежня*** міжнародная праваабарончая арганізацыя “Amnesty International” выдала адмысловае паведамленьне, у якім канстатуе істотнае пагаршэньне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі пасьля кастрычніцкіх выбараў і рэферэндуму. “Amnesty International” таксама нагадвае, што Расія ў Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў заблакавала абмеркаваньне сітуацыі ў Беларусі. На думку міжнароднай праваабарончай арганізацыі, свабода выказваньняў, крытыка ўладаў робяцца ў Беларусі ўсё больш небясьпечнай справай. У паведамленьні “Amnesty International” прыгадваюцца выпадкі перасьледу за крытыку: пагроза прыцягненьня Гары Паганяйлы да крымінальнай адказнасьці за інтэрв’ю шведзкай тэлевізіі, абвінавачаньне Анатоля Лябедзькі ў паклёпе на прэзідэнта, прыпыненьне выхаду гарадзенскай газеты “Биржа информации” і накладаньне штрафу на яе рэдактара Алену Раўбецкую, адміністратыўны арышт журналіста Паўла Мажэйкі, выклік у пракуратуру журналісткі Ірыны Халіп. У паведамленьні “Amnesty International” адзначаюцца жорсткія дзеяньні міліцыі супраць удзельнікаў мірных маніфестацыяў пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў і рэферэндуму, зьбіцьцё Анатоля Лябедзькі, адміністратыўныя арышты і штрафы 40 удзельнікаў гэтых акцыяў пратэсту.

Міжнародная праваабарончая арганізацыя заклікае міжнародную супольнасьць аказаць ціск на беларускія ўлады, каб прымусіць іх спыніць парушэньне правоў чалавека.

***17 сьнежня*** карэспандэнту Інтэрнэт-сайту "Прафсаюзны рух Беларусі" Ірыне Бут-Гусаім не дазволілі прысутнічаць на прэс-канферэнцыі старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) Леаніда Козіка, якая праходзіла ў зале паседжаньняў Дому прафсаюзаў. Супрацоўнік прэс-службы, параіўшыся з кіраўніцтвам, спаслаўся на адсутнасьць у карэспандэнта папярэдняй акрэдытацыі. Тэма прэс-канферэнцыі была "Вынікі рэалізацыі праграмы дзейнасьці ФПБ у 2004 годзе. Прыярытэтныя напрамкі дзейнасьці ФПБ, прынятыя на 2005 год".

***17 сьнежня*** суд Фрунзенскага раёну вынес рашэньне па адміністратыўнай справе актывіста руху "Зубр" Максіма Вінярскага – 15 сутак арышту за распаўсюд газеты. Нагадаем, што Максіма Вінярскага і Андрэя Баранава затрымалі 7 сьнежня за распаўсюд газеты “Выбар”. У газеце была інфармацыя пра акцыю 10 сьнежня, прысьвечаную Міжнароднаму дню правоў чалавека. М. Вінярскі і А. Баранаў былі абвінавачаныя ў парушэньні арт. 167-1 КаАП (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў) і правялі ноч у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку.

***17 сьнежня*** намесьнік галоўнага рэдактара "Народнай волі" Аляксандр Сіліч папрасіў палітычнага прытулку ў Бельгіі. Гэтую інфармацыю пацьвердзіла Галіна Мацюшына, каардынатар Федэрацыі "Салідарнасьць", якая аб’ядноўвае суполкі ўцекачоў з краінаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі. Паводле яе словаў, Аляксандр Сіліч знаходзіцца ў лагеры для ўцекачоў. Яго зварот разглядае міжнародная Камісія па справах уцекачоў, а таксама Міністэрствы замежных і ўнутраных справаў Бельгіі. Паводле Г. Мацюшынай, з 2001 году працэдура разгляду такіх зваротаў была паскораная, аднак пакуль што немагчыма сказаць, калі атрымае адказ беларускі журналіст. Г. Мацюшына выказала надзею, што просьба такой вядомай асобы, як А. Сіліч, будзе задаволеная. Кіраўнікі Беларускага цэнтру ў Бельгіі спадзяюцца, што ягоны досьвед і здольнасьці дапамогуць істотна актывізаваць працу суполкі. Журналіст заявіў пра сістэматычны ціск на яго з боку беларускіх уладаў. Ала Сіліч, жонка журналіста, заявіла, што яе мужу пагражала небясьпека: па іх назіраньнях, за домам сачылі, праслухоўвалі тэлефоны. Па словах сп-ні Сіліч, гэтыя падзеі пачаліся пасьля таго, як два гады таму ён задаў А. Лукашэнку пытаньне пра існаваньне пазабюджэтнага прэзідэнцкага фонду. 17 верасьня 2002 г. А. Сіліч спытаў у кіраўніка дзяржавы, чаму прэзідэнцкі фонд закрыты ад грамадзкасьці, колькі ў ім грошай і ці трапляюць у гэты фонд грошы ад гандлю зброяй. На гэта Аляксандр

Лукашэнка адказаў: "Калі такі фонд існуе, я заўтра не прэзідэнт. Але калі яго няма, то "Народнай волі" таксама ня будзе. Вы згодны з гэтым? Дык вось, фонду няма".

***19 сьнежня*** ў Міжнародным адукацыйным цэнтры ў Менску павінна была адбыцца навукова-практычная канферэнцыя “Беларусь пасьля выбараў і рэферэндуму: персьпектывы разьвіцьця”. У канферэнцыі планавалі ўзяць удзел 250 былых кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад дэмакратычных сілаў, якія прыехалі ў Менск з розных рэгіёнаў Беларусі. Але дзьверы ў памяшканьне былі зачыненыя. Старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька сказаў, што ў пятніцу ўвечары арганізатарам канферэнцыі патэлефанавалі чыноўнікі з Менскага гарвыканкаму і паведамілі, што “мерапрыемства ня будзе, яно забароненае”. Удзельнікі канферэнцыі выказалі свой пратэст з нагоды забароны мерапрыемства. Адзін з арганізатараў мерапрыемства, Анатоль Лябедзька, сказаў: “Раней я думаў, што беларуская ўлада хлусьлівая, а цяпер я бачу, што яна яшчэ і баязьлівая. Сёньня – гэта нішто іншае, як дэманстрацыя страху. Нам проста не даюць магчымасьці сустрэцца. Гэта значыць, што было прынятае палітычнае рашэньне, і я разумею чаму. Бо гэтыя 250 кандыдатаў, якія тут сабраліся – гэта рэальная сіла”. Анатоль Лябедзька гаворыць, што за гэтых 250 чалавек паставілі свае подпісы паўмільёна беларускіх грамадзянаў, і, паводле сацыялагічных дасьледваньняў, ня менш як 40 чалавек з іх павінны былі атрымаць дэпутацкі мандат. Яны маюць свае каманды і гатовыя працаваць. А ў Менск яны прыехалі, каб падтрымаць адзіную стратэгію дзеяньняў дэмакратычных сілаў у падрыхтоўцы да прэзідэнцкіх выбараў. Першую сесію ўдзельнікі канферэнцыі правялі проста на прыступках Міжнароднага адукацыйнага цэнтру. Выступалі Анатоль Лябедзька, Вінцук Вячорка, Сяргей Калякін, Станіслаў Шушкевіч і іншыя апазіцыйныя палітыкі, якія заклікалі былых кандыдатаў тлумачыць людзям у сваіх рэгіёнах, што прыхільнікаў пераменаў у Беларусі большасьць. Адзіным рэальным вынікам гэтай сустрэчы было прыняцьце рэзалюцыі. Арганізатары заявілі, што другая сесія канферэнцыі пройдзе ў 2005 годзе за межамі Беларусі. На ёй плануецца правесьці дыскусію аб уроках выбарчай кампаніі 2004 году і бліжэйшых мэтах і задачах дэмакратычных сілаў.

***22 сьнежня*** падчас правядзеньня брыфінгу ў гатэлі “Беларусь”, які быў прысьвечаны арганізацыі назіраньня за выбарамі прэзідэнта Украіны, супрацоўнікамі АМАПу былі затрыманыя каля 70 яго ўдзельнікаў – прадстаўнікоў няўрадавых арганізацыяў Беларусі, якія ўвечары павінныя былі адбыць ва Украіну для ўдзелу ў назіраньні за выбарамі ў межах міжнароднай місіі ENEMO. Адзначым, што ўсе беларускія назіральнікі ўжо акрэдытаваныя ў Цэнтральнай выбарчай камісіі Украіны ў якасьці міжнародных назіральнікаў, і ўжо прымалі ўдзел у назіраньні 21

лістапада, калі адбыўся другі тур выбараў, адменены потым рашэньнем Цэнтрвыбаркаму. Сярод затрыманых — старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі, юрыст Уладзімір Лабковіч і яшчэ каля 40 сяброў “Вясны”. Усё затрыманьне фіксавалася асобамі ў цывільным на відэа. Усе затрыманыя былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну г. Менску, дзе з усіх прысутных былі ўзятыя тлумачальныя, адбіткі пальцаў, праведзеныя відэаздымкі, дагляд рэчаў і асабісты дагляд. Па тлумачэньнях супрацоўнікаў міліцыі, усе затрыманыя былі дастаўленыя ў РУУС у сувязі з неабходнасьцю “высьвятленьня асобаў”. Нягледзячы на пратэсты затрыманых, іх пратрымалі больш за тры гадзіны і адпусьцілі з РУУС каля 21.30 без складаньня пратаколаў аб адміністратыўным затрыманьні і правапарушэньні. Між тым, цягнік у Кіеў, на якім мусілі дабірацца да Украіны беларускія назіральнікі, адышоў у 21.07. Нягледзячы на гэта, усе сябры Праваабарончага цэнтру “Вясна” здолелі ўначы выехаць ва Украіну на аўтобусе і своечасова дабрацца ў сталіцу Украіны. Сябры Праваабарончага цэнтру “Вясна” ажыцьцяўлялі назіраньне ў Палтаўскай, Луганскай і Харкаўскай абласьцях Украіны.

У сьнежні курсанта Алеся Смольскага выключылі з Менскай сувораўскай вайсковай вучэльні за сяброўства ў “Маладым Фронце” і за збор подпісаў пад патрабаваньнем надаць вучэльні імя Тадэвуша Касьцюшкі. Нагадаем, што ў 1993–1994 гадах часткай дэпутатаў Вярхоўнага Савету 12 скліканьня ўздымалася пытаньне аб перайменаваньні сувораўскай вучэльні. Алесь Смольскі вучыцца на трэцім курсе. Ён ініцыяваў збор подпісаў курсантаў за тое, каб вучэльня насіла імя Тадэвуша Касьцюшкі. Алесь так патлумачыў сваю пазіцыю: “Чаму імя Суворава павінна насіць вучэльня, у якой вучацца тыя людзі, якія будуць абаронцамі сваёй Айчыны? Касьцюшка выступаў за тое, каб Беларусь была незалежнай. Сувораў патапіў паўстаньне ў крыві. Тое, што вучэльня мае імя Суворава, зьяўляецца абразай беларусаў і тых, хто тут вучыцца. Лепей было б, каб насіла імя Касьцюшкі. Дзеля гістарычнай справядлівасьці”. Як паведаміў Алесь Смольскі, "контрвыведка" вучэльні даведалася аб тым, што ў жніўні ён уступіў у “Малады Фронт”. Яго пачалі выклікаць да кіраўнікоў і праводзіць сапраўдныя допыты. А потым папярэдзілі, што выключаць з вучэльні. “Мяне папярэдзілі, што выключаць з вучэльні. Сёньня я ўжо хадзіў да начальніка. Ён сказаў, што такога ня будуць трымаць. Ён сказаў, што я паступіў як сабака, які кусае за руку таго, хто яго корміць. Я не хачу быць сабакам! Я хачу быць чалавекам, які сам будуе сваё жыцьцё, а ня тым, каго кормяць, пояць, апранаюць, і за гэта ён павінен аддаваць сваё жыцьцё! Я сам маю сваю думку. Я думаю, што нашая вучэльня папросту павінна насіць імя Тадэвуша Касьцюшкі — сапраўднага героя Беларусі”. Да начальніка вучэльні выклікалі бацьку Алеся Сяргея Смольскага, каб ён паўплываў на свайго сына альбо напісаў заяву, каб яго адлічылі

па ўласным жаданьні. Сяргей Смольскі лічыць, што выключэньне сына будзе незаконным і несправядлівым. Ён заявіў, што ў выпадку адлічэньня сына гатовы аспрэчваць гэты загад у судзе.

***22 сьнежня*** каля 20.20 у Менску быў затрыманы аператар расійскай тэлекампаніі REN-TV Уладзімір Косьцін. Журналіста пратрымалі ў РУУС Савецкага раёну каля 2,5 гадзінаў і пашкодзілі тэлекамеру. Затрыманьне У. Косьціна адбылося падчасператрусу, які праводзілі міліцыянты ў менскім офісе Грамадзянскай ініцыятывы "Партнёрства". Міліцыянты затрымалі журналіста амаль адразу ж пасьля прыезду здымачнай групы на месьца падзеяў. Аператара прымусілі сесьці ў машыну і адвезьлі ў Савецкае РУУС, дзе ўзялі з яго тлумачэньні. Паводле словаў карэспандэнта тэлеканалу Алены Слаў, супрацоўнікі РУУС пашкодзілі тэлекамеру, з якой працаваў У. Косьцін. Эксьперты зафіксавалі шэраг пашкоджаньняў, але адзьнятыя відэматэрыялы захаваліся, і пасьля рамонту тэлекамера знаходзіцца ў працоўным стане. 22 сьнежня журналісты падалі начальніку РУУС скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі. За некалькі гадзінаў да інцыдэнту журналісты тэлеканалу вялі здымкі на акцыі апазіцыі ў раёне пл. Якуба Коласа, дзе з дахаў прылеглых дамоў раскідвалі ўлёткі з заклікам "Свабоду Марынічу!". Акцыя была прымеркаваная да пачатку судовага працэсу над палітыкам. Па словах А. Слаў, падчас гэтай акцыі міліцыя таксама рабіла спробу затрымаць журналістаў, аднак здымачнай групе ўдалося пазьбегнуць затрыманьня і перагнаць ў Расію адзьняты відэматэрыял. У. Косьцін і А. Слаў працягваюць працаваць у судзе над М. Марынічам. Нагадаем, што У. Косьцін быў у ліку тых, хто пацярпеў ад дзеяньняў АМАПу падчас разгону акцыі апазіцыі 19 кастрычніка.

***24 сьнежня*** галоўны рэдактар "БДГ" Пётр Марцаў быў выкліканы ў Пракуратуру РБ, дзе яму ўручылі афіцыйнае папярэджаньне, падпісанае намесьнікам Генеральнага пракурора РБ Мікалаем Купрыянавым. Нагодай для вынясеньня папярэджаньня стала публікацыя ў "БДГ" № 88 ад 12 лістапада, якая называлася "Под ударом. Прокуратура республики инициировала разработку ближайшего окружения Тозика". Аўтар артыкулу, які выступаў пад псеўданімам Гяоргі Дань, распавядаў пра ўзбуджэнне крымінальнай справы ў дачыненні да супрацоўніка Камітэту дзяржкантролю Чараднічэнкі. Пракуратура палічыла, што аўтар публікацыі "без спасылкі на канкрэтныя крыніцы інфармацыі зрабіў... заявы ў катэгарычнай форме". (Пракуратура мае на ўвазе сьцьверджаньне журналіста, што ўзбуджэнне крымінальнай справы ўхваліў асабіста Генеральны пракурор, а таксама што "пачатую распрацоўку называюць неабгрунтаванай і зьвязваюць з супрацьстаяньнем двух уплывовых дзяржаўных мужоў". У папярэджаньні таксама

гаворыцца, што сьледчы па справе Чараднічэнкі не даваў інтэрв’ю журналістам. Пракуратура палічыла, што аўтар публікацыі ня выканаў патрабаваньняў артыкулаў 32 і 40 Закону аб друку (не забясьпечыў права грамадзянаў на атрыманьне праўдзівых зьвестак пра дзейнасьць дзяржаўных органаў і не праверыў сапраўднасьці атрыманых ім зьвестак). У папярэджаньні пракуратуры сьцьвярджаецца, што П. Марцаў "адмовіўся назваць аўтараў згаданай публікацыі і не прадставіў дадзеных, якія пацьвярджалі праўдзівасьць выкладзеных у артыкуле зьвестак". На падставе гэтага, а таксама кіруючыся ч. 2 арт. 22 і арт. 39 Закону "Аб пракуратуры РБ", намесьнік пракурора вынес галоўнаму рэдактару "БДГ" папярэджаньне.

***24 сьнежня*** пяцёра актывістаў “Маладога Фронту” пікетавалі будынак Менскай сувораўскай вайсковай вучэльні. Яны пратэставалі супраць адлічэньня Алеся Смольскага. Хлопцы і дзяўчаты стаялі насупраць кантрольна-прапускнога пункту сувораўскай вучэльні з транспарантам: “Рукі прэч ад Смольскага”.

***25 сьнежня*** ў Беларусь не пусьцілі сьпецдакладчыка Камісіі ААН па правах чалавека Адрыяна Севярына, у мінулым — старшыні Парламенцкай Асамблеі АБСЕ. Ягоны візіт у Беларусь быў запланаваны на сьнежань.

***28 сьнежня*** ў Менску ў парку Янкі Купалы супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманыя каля 20 чалавек, якія раздавалі мінакам аранжавыя стужкі і віншавалі іх з Новым годам. Усе затрыманыя дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну г. Менску. Сярод затрыманых -- актывістка АГП Марына Багдановіч, журналістка “Народнай волі” Вольга Класкоўская, актывістка руху “Зубр” Ірына Тоўсьцік. Сярод затрыманых быў і адзін чалавек, апрануты Дзедам марозам. Нагадаем, што ў гэты дзень планавалася наладзіць віншаваньне менчукоў з Новым годам, абмен аранжавых стужак на апельсіны, устаноўка намёту, які быў падараваны менчукам кіеўскімі студэнтамі. Нягледзячы на тое, што ў дзеяньнях прысутных не было прыкметаў парушэньня заканадаўства, яны “на ўсялякі” выпадак былі затрыманыя міліцыяй.

***28 сьнежня*** Менгарвыканкам не дазволіў крычаўскай недзяржаўнай газеце "Вольны горад" зарэгістраваць у сталіцы юрыдычны адрас. Шэраг газетаў на працягу гэтага году сутыкнуліся з гэткай жа праблемай. Гарадзкія ўлады лічаць, што, паколькі газета крычаўская, то яна павінна рэгістравацца ў сваім рэгіёне - Магілёўскай вобласьці. Сталічныя чыноўнікі ў сваім адказе спасылаюцца на артыкулы 10 Закону аб друку. Юрысты ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ), аднак, лічаць, што дзеяньні сталічных уладаў не адпавядаюць нормам дзеючага заканадаўства і ствараюць штучныя перашкоды ў разьвіцьці недзяржаўных СМІ. Намесьнік старшыні

БАЖ Андрэй Бастунец падкрэсьліў, што "дзейнасьць суб’ектаў гаспадараньня распаўсюджваецца на ўсю тэрыторыю Беларусі, і таму газета магла б выходзіць па ўсёй краіне", незалежна ад месцазнаходжаньня выдаўца. Рэдакцыя "Вольнага гораду" неаднаразова спрабавала зарэгістраваць выданьне ў Магілёўскай вобласьці, аднак увесь час атрымлівала адмовы. "Вольны горад" выходзіць накладам у 299 асобнікаў, і яго выдаўцы хацелі пашырыць тэрыторыю распаўсюду і павялічыць наклад. Мясцовыя ўлады адмовілі ў атрыманьні юрыдычнага адрасу таксама рэдакцыям недзяржаўных газетаў "Афиша" са Смаргоні, "Новой газеты Сморгони", "Собственный комментарий" з Крычаву. Зарэгістраваныя выданьні таксама сутыкаюцца з падобнымі праблемамі. "Местную газету", якая хацела перамясьціць рэдакцыю са Смаргоні ў Ваўкавыск, Мінінфармацыі прымусіла атрымаць узгадненьне ў мясцовых уладаў. На працягу году рэдакцыя выданьня спрабавала гэта зрабіць. У канцы лістапада, атрымаўшы чарговую нематываваную адмову з Ваўкавыскага райвыканкаму, заснавальнік і галоўны рэдактар газеты Андрэй Шантаровіч даслаў кіраўнікам мясцовай “вертыкалі” заяву пратэсту, у якой запатрабаваў тэрмінова вырашыць пытаньне з юрадрасам газеты, абяцаючы ў адваротным выпадку зьвярнуцца ў суд. Паколькі на працягу месяца рэдакцыя не атрымала адказу, А. Шантаровіч зьбіраецца ажыцьцявіць свой намер.

***28 сьнежня*** Ганцавіцкі раённы вузел электрасувязі адмовіў рэдакцыі недзяржаўнай газеты "Ганцавіцкі час" у разьмяшчэньні ў эфіры раённага радыёвяшчаньня аб’явы, датычнай правядзеньня падпіскі на газету. Вузел сувязі спаслаўся на адсутнасьць тэхнічнай магчымасьці. Між тым, трансьляцыю радыёперадачаў па мясцовым радыёвяшчаньні Ганцавіцкае раённае ўпраўленьне электрасувязі (РУЭС) вядзе ня менш за 2 разы на тыдзень. Гэта ўжо ня першы выпадак адмовы ганцавіцкай РУЭС разьмясьціць у эфіры інфармацыю, датычную падпіскі на "Ганцавіцкі час". Паўгады таму рэдакцыя выданьня зьвярталася з падобнай просьбай да РУЭС і, атрымаўшы згоду, пералічыла за гэтую паслугу грошы. Аднак аб’ява прагучала толькі адзін раз і больш не паўтаралася.

***29 сьнежня*** ў Віцебску затрымалі двух сяброў Партыі БНФ. Кастусь Горны і Уладзіслаў Токараў былі затрыманыя міліцэйскім патрулём на пляцы Волі за тое, што распаўсюджвалі ўлёткі "Праўда пра рэферэндум і выбары на Беларусі", а таксама раздавалі каляндарыкі з раскладам праграмаў “Радые Свабода". Да актывістаў падышлі двое міліцыянтаў і, не назваўшы сябе, запатрабавалі, каб абодва хлопцы ехалі з імі ў пастарунак. Прадставіліся міліцыянты толькі пасьля патрабаваньняў Уладзіслава Токарава, а свой загад паехаць з імі ў Кастрычніцкі райаддзел міліцыі яны матывавалі тым, што спадары Токараў і Горны, на іх думку,

распаўсюджваюць незаконна выдадзеную друкаваную прадукцыю. Такое самае абвінавачаньне ў пастарунку было запісанае і ў пратаколы, хаця хлопцы спрабавалі давесьці, што ўлёткі маюць выходныя дадзеныя і надрукаваныя ў Менску законным чынам. Міліцыянты забралі каля трох соцень улётак, а таксама каляндарыкі ад “Радыё Свабода”. Адміністратыўнае парушэньне, якое, на думку віцебскіх міліцыянтаў, зьдзейснілі Кастусь Горны і Уладзіслаў Токараў, будзе цяпер разглядаць камісія Кастрычніцкага раёну. Позвы выпісаныя на 12 студзеня 2005 году.

***30 сьнежня*** суд Менскага раёну вынес прысуд палітзьняволенаму Міхаілу Марынічу – 5 гадоў пазбаўленьня волі. Такім чынам, можна канстатаваць: задача, пастаўленая ўладамі, выкананая "самым справядлівым у сьвеце" беларускім судом пасьпяхова. Пры гэтым асноўныя пункты абвінавачаньня: незаконнае захоўваньне зброі і эпізод, зьвязаны з канфіскацыяй у яго 90 тысячаў даляраў ЗША, зьнятыя (канфіскаваныя грошы пакінутыя ў даход дзяржавы), а асуджаны М.Марыніч за нібыта крадзёж кампутараў у амбасады ЗША, якая, дарэчы, ня мае да яго ніякіх прэтэнзіяў. Варта нагадаць, што М.Марыніч быў арыштаваны 26 красавіка 2004 году і абвінавачаны па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь: ч.2 арт.295 (незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боезапасаў і ўзрыўных рэчываў) і ч.4 арт. 210 (крадзёж шляхам злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі, учынены арганізаванай групай альбо ў асабліва буйным памеры). Пры арышце ў М.Марыніча былі канфіскаваныя 90 тысячаў даляраў ЗША і пісталет. Адвакатам Марыніча ўдалося падчас сьледзтва даказаць, што да знойдзенага ў яго на лецішчы пісталету Марыніч ня мае ніякіх адносінаў, і што зброя была падкінутая (было ўстаноўлена, што за некалькі дзён да арышту на лецішчы пабывалі "невядомыя", апроч таго, на пісталеце ня знойдзена адбіткаў пальцаў Марыніча). Падсудны ўрэшце быў абвінавачаны толькі па адным пункце — па незаконным авалоданьні аргтэхнікай, якая была бязвыплатна перададзеная амбасадай ЗША ў часовае карыстаньне грамадзкай арганізацыі "Беларуская асацыяцыя "Дзелавая ініцыятыва", якую ўзначальваў М.Марыніч. Нягледзячы на тое, што ў суд быў перададзены ліст амбасадара ЗША ў Беларусі Джорджа Крола і сьпецыяльная заява Дзяржэпартаменту ЗША пра тое, што яны ня маюць да М.Марыніча ніякіх прэтэнзіяў наконт узятага ў арэнду абсталяваньня, судзьдзя гэтую інфармацыю праігнараваў. Да суда М. Марыніч сем месяцаў утрымліваўся ў сьледчым ізалятары. І хаця ўрачы выдалі заключэньне пра значнае пагаршэньне стану здароўя М.Марыніча, а родныя неаднаразова зьвярталіся з просьбай зьмяніць меру стрыманьня падсьледнага з-за хваробаў сэрца, сьледчыя органы на гэта адказалі адмовай. Сам М.Марыніч назваў і суд, і прысуд палітычнай замовай і перасьледам

за дэмакратычныя погляды, за ягоную актыўную працу па стварэньні ў Беларусі грамадзянскай супольнасьці, за вылучэньне яго кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах, за бачаньне еўрапейскага шляху разьвіцьця для Беларусі. Ён заявіў, што крымінальная справа была сфабрыкаваная толькі па гэтых прычынах. За гадзіну да пачатку працэсу будынак суда запоўнілі невядомыя людзі ў цывільным, якія не пускалі ў залу нікога, у тым ліку і журналістаў. Удалося прайсьці толькі родным Марыніча, дыпламатам і некалькім журналістам. Тыя ж "людзі ў цывільным" груба вывелі на вуліцу журналіста Мікалая Халезіна. Увесь час, пакуль адбываўся судовы працэс, каля будынку суда дзяжурылі дзесяткі сяброў моладзевага руху "Зубр" у майках з надпісам "Свабоду Марынічу!", а таксама палітыкі і прадстаўнікі грамадзкасьці. Вестку пра прысуд яны сустрэлі крыкамі "Ганьба!". Абсалютная большасьць апытаных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў людзей і экспертаў выказаліся на карысьць палітычнай версіі крымінальнага перасьледу М.Марыніча і назвалі яго адным з самых персьпектыўных кандыдатаў на пост прэзідэнта Беларусі.

***30 сьнежня*** актывіст магілёўскага аддзяленьня руху “Зубр” Павел Угрыновіч быў звольнены з працы за подтрымку Міхаіла Марыніча. П.Угрыновіча выкдлікаў да сябе начальнік РУП “Магілёўскі домабудаўнічы камбінат”, дзе ён працаваў зваршчыкам, і паведаміў пра звальненьне. Начальнік не хаваў, што прычынай звальненьня зьяўляецца палітычная дзейнасьць маладога чалавека. Дырэктар сказаў, што яму неаднаразова тэлефанавалі з міліцыі з нагоды ўдзелу П. Угрыновіча ў палітычных акцыях.

# Зьмест

УСТУП: АБАГУЛЬНЕНЬНІ І ВЫСНОВЫ ....2
ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЬЛЕД І АБМЕЖАВАНЬНІ ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ....4
АБМЕЖАВАНЬНЕ СВАБОДЫ СЛОВА....9
АБМЕЖАВАНЬНЕ СВАБОДЫ АСАЦЫЯЦЫЯЎ....15
АБМЕЖАВАНЬНЕ АДУКАЦЫЙНЫХ СВАБОДАЎ І ПРАЦОЎНЫХ ПРАВОЎ....23
СТУДЗЕНЬ ....25
ЛЮТЫ ....41
САКАВІК ....68
КРАСАВІК ....92
ТРАВЕНЬ ....122
ЧЭРВЕНЬ ....148
ЛІПЕНЬ....177
ЖНІВЕНЬ....206
ВЕРАСЕНЬ ....228
КАСТРЫЧНІК....261
ЛІСТАПАД ....297
СЬНЕЖАНЬ ....319
ЗЬМЕСТ....335